ЖЛОБІН. ЖЛОБІНСКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2000

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), В.Ф.БЯЛЬКОВІЧ, У.К.ЕРАФЕЕЎ, С.П.САМУЭЛЬ, Б.В.УЛЬЯНКА, Г.А.ФАТЫХАВА, А.К.ФЯДОСАЎ.

Раённая камісія
па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:

У.К.ЕРАФЕЕЎ (старшыня), В.Ф.БЯЛЬКОВІЧ, М.Е.ГРЫЦОК, У.М.ІВАНЧЫКАЎ, Я.В.КАРЦАЎ, В.А.КАСЦЕЙКАЎ, П.Я.КІРЫЧЭНКА, А.С.ШОЛАК, П.Б.ШУТАЎ.

Рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»:

С.П.САМУЭЛЬ (заг. рэдакцыі), Р.Р.БЛАШКО, В.В.ГЕТАЎ, М.А.МАЎЗОН, Н.П.РАКІЦКАЯ, А.В.СКАРАХОД, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ.

Укладальнік: С.П.САМУЭЛЬ.

Мастак: Э.Э.ЖАКЕВІЧ.

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі: В.А.РАГАЛЕВІЧА.

ISBN 985-11-0186-9

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 2000
© Афармленне. Э.Э.Жакевіч, 2000

У ваколіцах Стрэшына. Рака Днепр.

35—10 тысяч гадоў да нашай эры	Верагоднасць першапачатковага пранікнення старажытнага чалавека на Жлобіншчыну.
9—5-е тысячагоддзі да нашай эры	Тэрыторыю раёна абжывалі плямёны днепра-дзяснінскай культуры. Паселішчы каля вёсак Гарадок, Васілевічы, Шыхаў.
7—3-е тысячагоддзі да нашай эры	На тэрыторыі раёна рассяліліся плямёны мілаградскай культуры. Паселішчы каля вёсак Адрубы, Гарадок, Чырвоная Горка.
5—3-е тысячагоддзі да нашай эры	Эпоха неаліту (новы каменны век). З'яўленне на тэрыторыі раёна плямёнаў днепра-данецкай культуры. Паселішчы каля вёсак Гарадок, Васілевічы, Таўстыкі, Шчытнае.
3 (канец) — 2-е (пачатак) тысячагоддзі да нашай эры	Паселішчы мілаградскай культуры каля вёсак Акцябр і Чырвоная Горка.
2-е тысячагоддзе да нашай эры	Паселішчы сярэднедняпроўскай культуры каля вёсак Верхняя Алба, Малыя Рагі, Праскурні, Саланое, Таўстыкі.
9—13 стагоддзі нашай эры	Тэрыторыя раёна з'яўлялася пагранічнай зонай паміж дрыгавічамі і радзімічамі. Селішчы каля вёсак Адраджэнне, Дзяніскавічы, Новая Каменка і Старая Каменка.
1399 г., 3 красавіка	Вялікі літоўскі князь Вітаўт выдаў віленскім канонікам даравальную грамату на бярэзінскую зямлю паміж Стрэшынам і Рагачовам.
14 стагоддзе	У пісьмовых крыніцах упамінаецца Стрэшын. Тут на правым беразе Дняпра знаходзіўся замак, які стаў асновай мястэчка.

Краявіды сучаснага Жлобіна.

15 стагоддзе	Паданне аб невялікім паселішчы (цяперашні Жлобін) на правым беразе Дняпра. Магчыма, існавала ў язычніцкія часы. Належала беларускаму магнацкаму роду Хадкевічаў.
1535 г.	Жлобін разбураны войскамі вялікага князя літоўскага Сігізмунда Аўгуста, якія ваявалі Гомель.
1654 г., ліпень	У час вайны з Польшчай казацкія палкі пад камандаваннем І.Н.Залатарэнкі, якія выступалі на баку Расіі, спалілі замкі Жлобін і Стрэшын.
1793 г.	Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай Жлобін аднесены да Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні.
1812 г., 20 ліпеня — верасень	Акупацыя Жлобіна і навакольных вёсак напалеонаўскімі войскамі.
1847 г., 29 верасня	Паводле звестак Магілёўскага губернскага камітэта маёнтак Жлобін з'яўляўся вотчынай памешчыкаў Вайзбунаў.
1865 г.	У мястэчку Жлобін 263 двары, 1576 жыхароў, дзейнічалі праваслаўная царква (пабудавана ў 1863), сінагога, паштовая станцыя. Штогод з 1 па 9 кастрычніка праводзіўся кірмаш.
1868 г.	У Жлобіне адкрыта народнае вучылішча, навучалася 39 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак.

Усясвяцкая царква ў в. Пірэвічы.

1870 г.	У Стрэшыне адкрыта народнае вучылішча з трохгадовым тэрмінам навучання.
1873 г.	Праз тэрыторыю Жлобіншчыны пралягла Лібава-Роменская чыгунка (станцыі Жлобін, Салтанаўка, Хальч, Чырвоны Бераг). 16 лістапада на станцыю Жлобін прыбыў першы поезд.
	Першыя звесткі пра мястэчка Карпілаўка, якое размяшчалася па-за лініяй чыгункі.
1875 г., 15 кастрычніка	У в. Лукі адкрыта школа першапачатковых ведаў.
1880 г., 13 мая	У выніку пажару ў Жлобіне згарэла 359 дамоў, 65 крам з таварамі, хлебазапасны магазін, народнае вучылішча, царква.
1890 г.	У мястэчку Жлобін пачаў працаваць дыпламаваны ўрач.
1896 г., лістапад	У маёнтку пана Шапілава (цяпер в. Майскае) адкрыта школа для навучання вясковых дзяцей.
1897 г.	У Жлобіне 3356 жыхароў, з іх 1760 яўрэяў.
1898 г.	У Жлобіне створана сацыял-дэмакратычная група.
1902 г., 24 снежня	Адкрыты рух поязда ў на ўчастку Віцебск—Жлобін.
1903 г., 1 мая	Чыгуначнікі і рабочыя Жлобіна правялі дэманстрацыю працоўнай салідарнасці.

Царква ў г. п. Стрэшын.

1905 г., 12 кастрычніка	Чыгуначнікі Жлобіна падтрымалі забастоўку чыгуначнікаў Гомеля і патрабавалі 8-гадзіннага працоўнага дня, свабоды слова, друку, павелічэння заработнай платы.
1905 г., кастрычнік — лістапад	У Жлобіне ўзніклі прафсаюзныя арганізацыі.
1905 г., 9—29 снежня	Забастоўка жлобінскіх чыгуначнікаў.
1909 г.	Пажар амаль дашчэнту знішчыў мястэчка Жлобін.
1915 г.	Адкрыты рух паяздоў на ўчастку Жлобін — Шапятоўка.
1917 г., сакавік	У Жлобіне створаны Савет.
1917 г., красавік	У Жлобіне створана бальшавіцкая ячэйка. На прадпрыемствах устанаўліваецца 8-гадзінны працоўны дзень.
1917 г., 25 чэрвеня	Чыгуначнікі Жлобіна разам з рабочымі і салдатамі выйшлі на вуліцы мястэчка з лозунгамі: «Далоў вайну!», «Уся ўлада — Саветам!».
1917 г., верасень	Жлобінскія чыгуначнікі ўдзельнічалі ў забастоўцы і дабіліся павышэння заработнай платы ў сярэднім на 40 працэнтаў.

У Жлобінскім парку.

1917 г., 19 лістапада (2 снежня н ст.)	У Жлобіне і Стрэшыне абвешчана аб пераходзе ўлады да Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Ствараюцца ваенна-рэвалюцыйныя камітэты.
1918 г., студзень	Адбылося аб'яднанне рабочых і сялянскіх Саветаў Жлобіна
1918 г., 22 студзеня — 13 лютага	Войскі корпуса Доўбар-Мусніцкага захапілі Жлобін і навакольныя населеныя пункты.
Люты — сакавік	Сфарміраваны Жлобінскі чырвонагвардзейскі атрад, які пазней рэарганізаваны ў полк. Ваяваў у Сярэдняй Азіі.
2 сакавіка — 24 лістапада	Жлобін акупіраваны нямецкімі войскамі.
Снежань	Мястэчка Стрэшын і навакольныя вёскі вызвалены ад нямецкай акупацыі.
1919 г., 9 мая	Мястэчка Жлобін стала цэнтрам аднайменнай воласці. Скасавана Лукаўская воласць.
14 ліпеня	На станцыі Жлобін выступіў з прамовай старшыня ВЦВК М.І.Калінін
15 верасня	У маёнтку Чырвоны Бераг адкрыта ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча. Першы выпуск адбыўся ў канцы 1921 г. Дакументы аб заканчэнні вучылішча па спецыяльнасці «Аграном» атрымалі 12 чалавек.

Помнік воінам 63-га стралковага корпуса 21-й арміі ў Жлобіне.

11 лістапада	Валасныя выканаўчыя камітэты Жлобіна і Стрэшына рэарганізаваны ў рэўкомы.
1922 г.	У Чырвоным Беразе адкрыты сельскагаспадарчы тэхнікум.
1924 г., 17 ліпеня	Утвораны Жлобінскі і Стрэшынскі раёны. 20 ліпеня яны падзелены на сельсаветы (у Жлобінскім раёне іх створана 14, у Стрэшынскім — 7)
1924 г.	Заснавана Жлобінская метэастанцыя. У 1930 г. стала дзейнічаць па праграме метэастанцый 2-га разраду. У в. Майскае створаны калгас «Рассвет».
1925 г., 3 ліпеня	Мястэчка Жлобін атрымала статус горада.
1927 г., 4 жніўня	Скасаваны Стрэшынскі раён. Яго тэрыторыя далучана да Жлобінскага раёна.
1930 г., 26 ліпеня	Жлобінскі раён увайшоў у 4-ы занальна-эканамічны (Гомельска-Магілёўска-Крычаўскі або ўсходні) падраён.
1931 г., 5 чэрвеня	Пачала выдавацца раённая газета «Шлях сацыялізму» (з 11.1991 г. носіць назву «Новы дзень»).
1933 г.	У мяст. Шчадрын створана машынна-трактарная станцыя.

Жлобін. Чыгуначны вакзал.

1938 г., 28 верасня	Стрэшыну нададзены статус гарадскога пасёлка.
1939 г., 28 чэрвеня	Створаны Стрэшынскі раён. Яму перададзена 8 сельсаветаў Жлобінскага раёна.
1939 г.	У Жлобіне 19,3 тыс. жыхароў.
1941 г., 24 чэрвеня	У сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны з 18 гадзін чыгуначны вузел перайшоў на спецыяльны графік работы.
27 чэрвеня	Створаны Жлобінскі знішчальны батальён.
3 ліпеня	Нямецка-фашысцкія войскі акупіравалі заходнюю частку раёна і г. Жлобін.
6 ліпеня	Па загаду камандзіра 63-га корпуса Л.Р.Пятроўскага воіны 117-й стралковай дывізіі правялі разведку боем, захапілі Жлобін і вызвалілі шэраг населеных пунктаў. Але перад пераважаючымі сіламі ворага адступілі.
13 ліпеня	154-я стралковая дывізія ў складзе 3 палкоў разам з іншымі часцямі 63-га корпуса штурмам авалодала Жлобінам і адкінула акупантаў на захад на 30 км.
14 жніўня	Часці Чырвонай Арміі пакінулі Жлобін і адступілі на левабярэжжа Дняпра.
17 жніўня	Тэрыторыя раёна поўнасцю акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Жлобін. Будынак краязнаўчага музея.

Верасень — кастрычнік	На тэрыторыі Жлобіна і раёна ўзнікаюць падпольныя патрыятычныя групы.
1942 г., 8 сакавіка	Каля в. Шчадрын гітлераўцы расстралялі больш за тысячу мясцовых яўрэяў, камуністаў, камсамольцаў, савецкіх актывістаў.
12 красавіка	На паўночнай ускраіне Жлобіна нямецка-фашысцкія карнікі расстралялі 1200 яўрэяў.
14 красавіка	Там жа расстраляна 400 яўрэяў са Стрэшынскага раёна. У брацкай магіле пахаваны таксама забітыя беларусы, рускія, цыганы, іншыя — усяго больш 2500 чалавек.
Красавік	На чыгуначным вузле Жлобін пачала дзейнічаць патрыятычная група, якая створана па ініцыятыве разведчыкаў в/ч 38629 («Іграўцы»).
3 ліпеня	Зацверджаны Жлобінскі падпольны міжрайком КП(б)Б.
24 верасня	Створаны партызанскі атрад «Смерць фашызму».
Кастрычнік	Пачаў дзейнічаць Жлобінскі падпольны міжрайком ЛКСМБ.
1943 г., 14—15 красавіка	Баі партызанскага атрада «Смерць фашызму» з карнікамі, прарыў блакады.



У электрасталеплавільным цэху Беларускага металургічнага завода.

6 мая	З партызан, вылучаных атрадам «Смерць фашызму», створаны партызанскі атрад «Жалязняк».
Май	Створаны Жлобінскі і Стрэшынскі падпольныя райкомы КП(б)Б.
10 верасня	Партызанскі атрад «Жалязняк» разгорнуты ў брыгаду з той жа назвай.
Верасень	На базе атрада «Смерць фашызму» створана партызанская брыгада імя П.К.Панамарэнкі.
23 лістапада	Воіны 48-й арміі фарсіравалі Бярэзіну і ў наступальных баях 29 лістапада вызвалілі г.п. Стрэшын, вёскі Шыхаў і Касакоўка, пасёлкі Дружны, Садовы, Ліпы, Марс і Першамайскі.
2 снежня	Воіны 3-й арміі пачалі вызваленне левабярэжнай часткі Жлобінскага раёна. У гэты дзень ад ворага вызвалена в. Пірэвічы.
1944 г., 21—26 лютага	У ходзе Жлобінска-Рагачоўскай наступальнай аперацыі воіны 115-га ўмацаванага раёна ліквідавалі існаваўшы на левабярэжжы Дняпра плацдарм гітлераўцаў і вызвалілі вёскі Майскае, Антонаўка, Цупер, Лугавая Вірня.
1 сакавіка	У крытычны момант бою за вышыню каля в. Мормаль камандзір узвода 13-га асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна лейтэнант Мікалай Пятровіч Жуйкоў сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота. А калі той «ажыў», подзвіг камандзіра паўтарыў яго намеснік старшы сяржант Мікалай Пятровіч Мазілін.

У асартыментным кабінеце Жлобінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

26—27 чэрвеня	Горад Жлобін і раён поўнасцю вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тром вайсковым злучэнням прысвоена ганаровае найменне «Жлобінскіх», 3 узнагароджаны ордэнамі.
1944 г., кастрычнік	Адкрыта тэхнічная школа па падрыхтоўцы машыністаў, памочнікаў машыністаў і качагараў паравозаў, сувязістаў і іншых спецыялістаў для чыгуначнага вузла.
1945 г	У 1941—45 гг. у абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінула больш за 10 тыс. воінаў Чырвонай Арміі. У барацьбе з ворагам загінула звыш 7 тыс. землякоў. Акупанты расстралялі, спалілі, адправілі на катаржныя работы ў Германію амаль 2 тыс. ўраджэнцаў горада і раёна.
1949 г., 28 ліпеня	Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб узнагароджанні ўрадавымі ўзнагародамі работнікаў за доўгатэрміновую і бездакорную працу на чыгуначным транспарце» па Жлобінскім вузле ўзнагароджаны: ордэнам Леніна 59 чал., «Працоўнага Чырвонага Сцяга» — 38, «Знак Пашаны» — 1, медалём «За працоўную доблесць» — 72 чал.
1950 г., 29 красавіка	З Рагачоўскага раёна ў Жлобінскі перададзены Кіраўскі сельсавет.

Жлобін. Заняткі ў дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва.

1956 г., 17 снежня	Скасаваны Стрэшынскі раён. Яго тэрыторыя далучана да Жлобінскага раёна.
1961 г.	Адкрыта Жлобінская фабрыка мастацкай інкрустацыі на базе цэха інкрустацыі саломкай Гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.
1962 г., люты	На базе электрастанцыі створаны сеткавы раён, які ў 1968 г ператвораны ў прадпрыемства электрычных сетак.
1962 г., 25 снежня	У склад Жлобінскага раёна перададзены Шчадрынскі сельсавет Светлагорскага раёна.
1963 г., 7 сакавіка	Жлобін аднесены да гарадоў абласнога падпарадкавання.
1963 г.	На базе пашывачнага цэха арцелі «Аб'яднаная праца» адкрыта швейная фабрыка.
1967 г., 15 снежня	Пабудаваны рамонтна-механічны завод па выпуску тэхнікі і абсталявання для будаўнічай індустрыі.
1967 г	На базе райпрамкамбіната пачала дзейнічаць мэблевая фабрыка па вытворчасці кухоннай мэблі.
1978 г., 25 снежня	Прынята ў эксплуатацыю першая чарга Жлобінскай фабрыкі штучнага футра.
	Адкрыта Жлобінскае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча № 143 трыкатажнікаў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці Чырвонабярэжскага Дома культуры.

1982 г., 19 сакавіка	Падпісаны кантракт на будаўніцтва Беларускага металургічнага завода (БМЗ) у г. Жлобін, якое ажыццявілі аўстрыйская фірма «Фест-Альпіне» і італьянская «Даніэлі».
1984 г., 15 кастрычніка	На БМЗ пушчаны ў эксплуатацыю электрасталеплавільны цэх і зроблена першая плаўка.
1985 г., красавік—май	На БМЗ пачалося будаўніцтва комплексу металакорду.
1993 г., красавік	На базе раённай друкарні заснавана выдавецка-паліграфічнае прадпрыемства «Тэхнічная кніга».
1993 г.	У Жлобіне пабудаваны Палац культуры металургаў.
1995 г., 14 кастрычніка	Асвячоны новы будынак Свята-Троіцкай царквы.
1996 г., 1 верасня	Пры БМЗ адкрыты тэхнікум.
1997 г., 1 верасня	У Жлобіне адкрыты філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

Да чытача

Паважаныя чытачы! Перад Вамі новае выданне з серыі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» і прысвечана яно гораду Жлобіну і раёну. Гэта кніга расказвае аб мінуўшчыне і сучаснасці часткі Прыдняпроўскага краю, яна — даніна памяці тым, хто аддаў самае дарагое — жыццё за лепшую будучыню. Кніга ствараласяна падставе шматлікіх матэрыялаў з дзяржаўных і асабістых архіваў, навуковых даследаванняў, публікацый у газетах, часопісах, успамінаў людзей, якія з'яўляюцца сведкамі падзей, што маюць прамое ці ўскоснае дачыненне да гісторыі Жлобіншчыны.

Асноўная частка матэрыялаў кнігі прысвечана Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг., калі жлобінцы адстойвалі свабоду і незалежнасць роднай зямлі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, змагаючыся непасрэдна ў часцях Чырвонай Арміі, у партызанскіх атрадах і антыфашысцкім падполлі, у гета і канцэнтрацыйных лагерах, несучы баявую вахту на працоўным фронце. Змешчаны спісы загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, а таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі, што загінулі і пахаваны на тэрыторыі раёна.

Даюцца таксама звесткі пра неабгрунтавана рэпрэсіраваных землякоў, пра воінаў, якія загінулі ў Афганістане. Ёсць у кнізе матэрыялы пра знакамітых землякоў — герояў працы, вядомых пісьменнікаў, мастакоў, дзеячаў культуры і навукі і інш.

Зразумела, што ахапіць у адной кнізе ўсе бакі жыцця Жлобіншчыны на працягу значнага перыяду немагчыма. Штосьці не знайшло ў ёй свайго адлюстравання. Пакінем гэта наступным даследчыкам, бо з выхадам гісторыка-дакументальнай хронікі краязнаўчая і пошукавая работа на Жлобіншчыне, спадзяёмся, атрымае новы імпульс.

У стварэнні кнігі «Памяць» прынялі ўдзел супрацоўнікі дзяржаўных устаноў і мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея, пісьменнікі і навучэнцы школ, спецыялісты розных галін народнай гаспадаркі, многія жыхары горада і сяла, людзі розных узростаў, хто зацікаўлены ўзняць пласты гісторыі, па магчымасці з'яднаць у адзінае цэлае ўсё тое, што ў розных крыніцах апавядае пра наш край. Без ведання сваёй гісторыі нельга ствараць будучыню, без учарашняга не можа быць заўтрашняга.

Раённая камісія па напісанні кнігі і выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі выказваюць сваю шчырую ўдзячнасць установам, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў зборы матэрыялаў, падрыхтоўцы і выданні кнігі «Памяць. Жлобін. Жлобінскі раён».



ЖЛОБІНСКІ РАЁН, размешчаны на паўночным усходзе Гомельскай вобласці. Мяжуе з Рагачоўскім, Буда-Кашалёўскім, Рэчыцкім і Светлагорскім раёнамі Гомельскай вобласці, Бабруйскім — Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. (у сучасных межах з 1962). Да ліпеня 1930 г. ў складзе Бабруйскай акругі. З 15.1.1938 г. ў Гомельскай вобласці. Плошча 2,1 тыс. км^2. Насельніцтва 34,1 тыс. чал. (на 1.1.2000; без Жлобіна). Населеных пунктаў 155, у т.л. г. Жлобін (цэнтр раёна, 71,7 тыс. чал.), гарадскі пасёлак Стрэшын (1,3 тыс. чал.), Стрэшынскі пасялковы Савет, 16 сельсаветаў: Акцябрскі, Верхне-Албянскі, Дабрагошчанскі, Кабанаўскі, Кароткавіцкі, Кіраўскі, Луцкі, Майскі, Малевіцкі, Навамаркавіцкі, Папаратнянскі, Пірэвіцкі, Салонскі, Стараруднянскі, Чырвонабярэжскі, Шчадрынскі.

Паверхня раёна раўнінная з агульным нахілам з поўначы на поўдзень. Раён размешчаны пераважна ў межах Гомельскага Палесся, паўночна-заходняя частка ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Уздоўж Дняпра вылучаюць Прыдняпроўскую нізіну. Раён выцягнуты з захаду на ўсход на 65 км, з поўначы на поўдзень на 48 км. На 1.1.2000 г. ў раёне 18 калгасаў, 9 саўгасаў, птушкафабрыка, Чырвонабярэжскі саўгас-тэхнікум, падсобная гаспадарка. Сельскагаспадарчая спецыялізацыя: малочна-мясная жывёлагадоўля са значным развіццём ільнаводства; пашыраны пасевы збожжавых і бульбы.

Працуюць Беларускі металургічны завод, дослядны рамонтна-механічны, крухмала-патачны, торфабрыкетны заводы, Беларускае футравае аб'яднанне, эксперыментальная швейная фабрыка, фабрыкі швейная і мастацкай інкрустацыі, прадпрыемствы харчовай, будаўнічых матэрыялаў, кормавытворчай прамысловасці, чыгуначны вузел. Аўтапрадпрыемства. Будаўнічы трэст. Вячэрні філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога. Металургічны тэхнікум, Вышэйшае аграрна-тэхнічнае і тэхнічна-трыкатажнае вучылішчы, 49 сярэдніх, 6 базавых, 7 пачатковых школ, спецшкола-інтэрнат, 40 дашкольных устаноў; цэнтральная раённая, гарпасялковая і 7 участковых бальніц, 4 урачэбныя амбулаторыі і пункт аховы здароўя, раённая і стаматалагічная паліклінікі, медсанчасць пры Беларускім металургічным заводзе, 29 ФАПаў, тубдыспансер, скурна-венералагічны і наркалагічны дыспансеры; 32 клубныя ўстановы, 41 бібліятэка, 5 музычных школ.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгункі Мінск—Гомель і Орша—Калінкавічы, аўтадарогі Бабруйск—Гомель, Рагачоў—Светлагорск. Суднаходства па Бярэзіне і Дняпры. У раёне знаходзяцца помнік прыроды — Чырвонабярэжскі парк, гідралагічны заказнік «Выдрыца». Выдаюцца аб'яднаная газета «Новы дзень», шматтыражная газета «Металург», штотыднёвік «Информобзор», газета ААТ «Тэлекомп «Ню-

анс», мясцовая студыя кабельнага тэлебачання. Дзейнічае Жлобінскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: Пакроўская царква (1807) у г.п. Стрэшын, Царква Усіх Святых (1902) у в. Пірэвічы, ветраны млын (19 ст.) каля в. Ляды.

Населеныя пункты Жлобінскага раёна

Горад ЖЛОБІН

Стрэшынскі пасялковы Савет: гарадскі пасёлак Стрэшын, вёскі Зломнае, Новая Каменка, Радуцін.

Акцябрскі сельсавет: вёскі Акцябр (да 1936 г. П а п к і), Грабск (да 1932 г. Г р а б с к і я Х у т а р ы), Затон, Праскурні; пасёлак Горкі.

Верхне-Албянскі сельсавет: вёскі Гарадок, Верхняя Алба, Ніжняя Алба, Шыхаў.

Дабрагошчанскі сельсавет: вёскі Абольцы, Васілевічы, Дабрагошча, Дарагінь, Заброддзе, Курган, Мормаль, Падхваёва, Пірэвічы, Сельнае, Старына, Яшчыцы; пасёлак Яшчыцкі (з 21.1.1969); чыг. ст. Мормаль, Яшчыцы.

Кабанаўскі сельсавет: вёскі Адрубы, Вялікі Лес, Кабанаўка, Ляды.

Каротквіцкі сельсавет: вёскі Антонаўка, Дуброва, Забалоцце, Каротквічы, Плесавіцкая Слабодка, Плесавічы.

Кіраўскі сельсавет: вёскі Кірава (да 20.4.1939 г. С в я т о е), Піцераўка (да 1962 г. Г у р с к а я), Селівонаўка, Шапарня.

Луцкі сельсавет: вёскі Беліца, Грачухі, Дуброва, Зялёная Даліна, Зялёны Краж, Кабанаўка, Лебядзёўка, Лукі, Рэкта; пасёлкі Вярбічаў, Грушачка, Луцкі, Новыя Лукі, Чырвоная Горка; чыг. ст. Луцкае.

Майскі сельсавет: вёскі Антонаўка, Асінаўка, Бабоўка, Баршчоўка, Даліна, Дзяніскавічы, Лугавая Вірня, Майскае (да 1924 г. Ш а п і л а в а), Падлессе, Цупер, Чорная Вірня; пасёлкі Аляксандраўка, Асое, Малыя Казловічы.

Малевіцкі сельскі Савет: вёскі Казімірава, Малевіцкая Рудня, Малевічы, Навікі; пасёлкі Вязок, Вясёлы, Рубеж; чыг. раз'езды (назвы маюць з 1964 г.) Казімірава, Малевічы (б. Заграддзе).

Навамаркавіцкі сельсавет: вёскі Жыркаўка, Калінаўка, Новавінаградаў, Новыя Маркавічы, Прыбудак, Рудня, Таўстыкі; пасёлак Глушыца.

Папаратнянскі сельсавет: вёскі Адраджэнне (да 5.8.1968 Э р ш т э р м а й), Гелін, Касакоўка, Новая Карма, Папаратнае; пасёлкі Барэц, Дубовая Града.

Пірэвіцкі сельсавет: вёскі Кругавец, Новая Слабада, Пірэвічы, Рудзенка, Салтанаўка, Скепня, Шчытнае; пасёлкі Баравуха, Верны, Зялёны Рог, Колас, Любоў, Нясоеў Барок, Сухі Востраў; чыг. ст. Салтанаўка.

Салонскі сельсавет: вёскі Александроў, Вялікія Рагі, Істопкі, Казёл, Лясань, Малыя Рагі, Нівы, Саланое, Салонская Карма.

Старарудняскі сельсавет: вёскі Баранаўка, Завад, Калыбаўка, Савецкая (да 30.7.1964 г. А м е р ы к а), Старая Рудня, Чацвярня; пасёлкі Асінавіца, Глушыца, Хальч; чыг. ст. Хальч; чыг. раз'езды Калыбаўка, Старая Рудня.

Чырвонабярэжскі сельсавет: вёскі Баршчоўка, Гарбачоўка, Змяёўка, Казіміраўская Слабодка, Клімаўка, Кругі, Курганне, Марусенька, Радуша, Святое, Чарцёж, Чырвонабярэжская Слабада, Чырвоная Слабодка, Чырвоны Бераг; пасёлак Лобск; чыг. ст. Чырвоны Бераг.

Шчадрынскі сельсавет: вёскі Аляксандраўка, Брусава, Бяльчо, Дабравольшча, Дворышча, Замен-Рыння, Зарэчча, Кіцін, Людгардаўка, Малінаўка, Навозы, Новая Мар'еўка, Пякалічы, Салоцін, Селішчы, Скарына, Сцяпы, Сыцін, Сяліба, Усполішчы, Шчадрын; пасёлак Эрд.

Населеныя пункты Жлобінскага раёна, якія не існуюць

Горад Жлобін: пасёлкі Ветка-Вір, Жлобін-Падольскі, Рабочы.

Стрэшынскі пасялковы Савет: вёска Старая Каменка; пасёлкі Воран-Гаёк, Грымячы Мох, Ліпы, Ніўкі, Новы Свет.

Верхне-Албянскі сельсавет: пасёлкі Дружны, Зораўскі, Равішча, Садовы.

Дабрагошчанскі сельсавет: пасёлкі Бор, Садовы, Цэнтральная сядзіба саўгаса «Мормаль».

Каротквіцкі сельсавет: вёскі Браткі, Галы, Гармавічы, Грушка, Залессе, Залужжа, Замосце, Кастрычнік, Краснаўка; пасёлкі Буда, Вадзіцкі, Васход.

Кіраўскі сельсавет: пасёлак Ленінскі.

Луцкі сельсавет: вёскі Акцябрская (да 1.7.1964 г. Тапіла), Вялікі Лес, Новы Мазалаў; пасёлкі Гуляйполе, Красная Звязда, Чырвоны Рог, Леніна, Лісі Лог, Надзежда, пасёлак пеньказавода, пасёлак торфабрыкетнага завода «Луцкі».

Майскі сельсавет: вёска Казловічы; пасёлкі Бабоўскі (да 30.7.1964 г. Сядзіба Хальчанскай МТС), Прывітанне, Хлебароб.

Малевіцкі сельсавет: вёскі Карма, Касагі; пасёлкі Жальвін, Заваднае, Заграддзе, Калееў Груд, Прыдарожжа.

Навамаркавіцкі сельсавет: вёскі Белая Ветка, Закараў, Кавалёўка, Мікулічы; пасёлкі Вітаў, сядзіба Каменскай МТС.

Папаратнянскі сельсавет: вёска Восава-Буда; пасёлкі Вішанькі, Дубіна, Каліноўск, Ліпаў, Луганск, Ляды, Марс, Новая Паляна, Новыя, Першамайск, Пятрова Паляна, Работка, Рэкорд, Савін, Чачанёў.

Пірэвіцкі сельсавет: пасёлкі Акцябр (да 7.8.1962 г. Б я з б о ж н і к), Гуцішча, Ліцвінаўка, Маладняк, Малінаўка, Машок, Мікольскі, Парасля, пасёлак спіртзавода, Першамайскі, Сазонаўка, Селянін, Узлессе.

Салонскі сельсавет: вёскі Гнілая Лужа, Залужжа; пасёлкі Зямлянкі, птушкааддзяленне саўгаса «Жлобін».

Старарудняскі сельсавет: вёска Зарэчча; пасёлкі Верны, Талстоўскі.

Чырвонабярэжскі сельсавет: вёска Прыстань; пасёлкі Ключ, Новы Александроў, пасёлак вучгаса «Чырвоны Бераг», пасёлак крухмала-патачнага завода, пасёлак чыгуначнай станцыі «Чырвоны Бераг», Ямнае; хутары Кадзішча, Прырэчча, Рассвет, Цёсы.

Шчадрынскі сельсавет: вёска Печкі, Скарынава Слабодка.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Прырода Жлобінскага раёна

Паверхня раёна плоска-хвалістая, радзей хвалістая, пераважна ў межах Гомельскага Палесся. Ваганні адносных вышынь — 3—5 м/км^2. У даліне Дняпра выразная пойма і 2 надпоймавыя тэрасы. Пойма (выш. 2—3 м) грывістая, месцамі плоска-грывістая, складзена з дробных і сярэднезярністых пяскоў. Першая надпоймавая тэраса (выш. 5—6 м) складзена з алювіяльных пяскоў, аснова другой (выш. 12—18 м) — з марэны, перакрытай алювіяльнымі адкладамі. Паверхня тэрас слабахвалістая, ускладненая дзюнамі, астанцамі марэны ў выглядзе ўзгоркаў, лагчынамі, западзінамі. На паўночным захадзе раён заходзіць у межы Цэнтральнабярэзінскай раўніны з плоскім рэльефам. 98% тэрыторыі раёна на выш. 130—145 м над узроўнем мора. Агульны нахіл тэрыторыі з поўначы на поўдзень. Найвышэйшы пункт 151,5 м (на поўдні, каля в. Дабрагошча); найменшая абс. адз. 118 м (на паўднёвым усходзе, урэз Дняпра). Характэрны плоскія нізінныя ўчасткі, на паўночным захадзе забалочаныя. У тэктанічных адносінах тэрыторыя раёна прымеркавана да Жлобінскай седлавіны і Гарадоцка-Хацецкай ступені Прыпяцкага прагіну. Пароды крышталічнага фундамента пахаваны на глыбіні 800 м. Платформавы чахол складзены пераважна з верхнепратэразойскіх (больш за 60%) адкладаў. Вышэй залягаюць сярэднедэвонскія, юрскія, мелавыя, палеагенавыя, неагенавыя ўтварэнні. Пароды антрапагенавага ўзросту маюць магутнасць 20—40 м, у ледавіковых лагчынах да 80—100 м. На тэрыторыі раёна 114 радовішчаў торфу з агульнымі запасамі 68,7 млн. т, 5 радовішчаў глін для грубай керамікі з агульнымі запасамі 11 млн. м^3, 4 радовішчы пяскоў. Знойдзены невялікія запасы нафты. Сярэдняя тэмпература ў студз. -6,9 °С, ліп. 18,4 °С. Абсалютны мінімум тэмпературы паветра -38 °С, абсалютны максімум 38 °С (адзначаецца прыкладна адзін раз у 20 гадоў). Вегетацыйны перыяд 193 дні. Сярэдняя скорасць ветру 3,4 м/сек, у лютым 4,0 м/сек, у жніўні 2,7 м/сек. Ападкаў 595 мм за год. Адзін раз у 8 гадоў назіраюцца павышана-вільготныя гады (ападкаў больш за 710 мм), у асобныя засушлівыя гады не больш за 400 мм ападкаў. Сярэдняя максімальная вышыня снегу за зіму 15 см, у асобныя гады 33 см. Вільготных дзён за год 125, сухіх — 12. Сярэдняя колькасць сутак з мяцеліцай за год 16, максімальная — 29, з туманам — 50 і 81, з навальніцай — 24 і 38, з градам — 2 і 6. За год у сярэднім бывае 12 сутак з галалёдам і 18 сут з шэранню. Рэкі: Дняпро з правымі прытокамі Бярэзіна (на мяжы са Светлагорскім і Рэчыцкім раёнамі), Дабасна і левымі прытокамі Окра і Ржаўка; Ала, левы прыток Бярэзіны. Густата натуральнай рачной сеткі 0,37 км/км^2. Даўжыня асушальнай сеткі 8,5 тыс. км, у т.л. адрэгуляваных водапрыёмнікаў больш за 100 км, магістральных і падводных каналаў 881 км, рэгуляцыйных

каналаў 601 км. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў: дзярнова-падзолістыя 35,2%, дзярнова-падзолістыя забалочаныя 27,9, дзярнова і дзярнова-карбанатныя забалочаныя 6,1, поймавыя (алювіяльныя) 13,4, тарфяна-балотныя 17,4; паводле мех. складу: сугліністыя 18,3, супясчаныя 40,8, пясчаныя 23,5, тарфяныя 17,4%. Плоскасная эрозія на 5,8% плошчы ворных зямель. Расліннасць належыць пераважна да Бярэзінска-Перадпалескай геабатанічнай акругі, паўднёвая частка раёна — да Палеска-Прыдняпроўскай геабатанічнай акругі. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 47,6% тэрыторыі раёна, у т.л. пад ворывам 31,1%. Асушана 1408 га тарфяна-балотных глеб. Лугі невялікімі ўчасткамі, агульная плошча іх каля 40 тыс. га. Сухадолы займаюць 9,1%, нізінныя лугі — 52,9%, заліўныя лугі 38%, пераважна ў поймах рэк. Пад лясамі, якія адносяцца да падзон грабава-дубова-цемнахвойных і шыракаліста-хваёвых лясоў, 31% тэрыторыі раёна, пашыраны пераважна на поўдні і захадзе. Склад лясоў: хваёвых 75%, бярозавых 10,6, чорнаальховых 8,7, дубовых 2,8, яловых 1,6% і інш. 35% лясоў — штучныя насаджэнні, пераважна хваёвыя. 114 балот (пераважна нізінных) агульнай плошчай 28,4 тыс. га. Найбольшыя балотныя масівы: Стрэшына-Мормальская група балот, Дубаўка, Макушкі, Дабасна. З паляўніча-прамысловых жывёл водзяцца лось, дзік, ліс, заяц-бяляк і заяц-русак, янотападобны сабака, вавёрка, чорны тхор, лясная куніца, воўк, выдра, гарнастай, андатра, крот.

І.Я.Афнагель.

Археалагічнае даследаванне Жлобіншчыны

Пранікненне старажытнага чалавека на тэрыторыю Жлобінскага раёна адбывалася, магчыма, у канцы эпохі верхняга палеаліту. З заканчэннем ледавіковага перыяду ў 9-м тысячагоддзі да н.э. пачаўся сучасны геалагічны перыяд — галацэн. Закончылася фарміраванне рэльефу: рэкі, азёры, раслінны і жывёльны свет набылі рысы, блізкія да сучасных. Рассяленне старажытных людзей на тэрыторыі раёна адбывалася з поўдня па Дняпры, Бярэзіне і іншых рэках.

У эпоху мезаліту (сярэдні каменны век; 9—5-е тысячагоддзі да н.э.) тэрыторыя была абжыта плямёнамі днепра-дзяснінскай археалагічнай культуры. Да гэтай культуры адносяцца паселішчы каля вёсак Васілевічы, Гарадок, Шыхаў, дзе знойдзены прылады працы з крэйдавага і валуннага крэменю.



Рэшткі посуду, знойдзеныя на месцах стаянак далёкіх продкаў.

Найбольш раннім паселішчам эпохі мезаліту з'яўляецца стаянка каля в. Шыхаў, размешчаная на правым беразе Дняпра. Тут знойдзена больш за 700 крамянёвых прадметаў: абломкі наканечнікаў стрэл (3), скрабкі (9), свердзел (1), праколкі (2), сячэнні пласцін (12), прылады з выемкамі (8). Падставай для датавання гэтага помніка раннім мезалітам з'яўляецца адсутнасць трапецападобных і другіх геаметрычных мікралітаў — спецыфічных прылад, распаўсюджаных толькі ў 2-й палове эпохі мезаліту ў мезалітычных комплексах лясной зоны еўрапейскай часткі былога СССР.

Больш позняя мезалітычная стаянка знойдзена каля в. Гарадок на левым беразе Бярэзіны, непадалёку ад упадзення яе ў Дняпро. Паселішча займае ўчастак 1-й надпоплаўнай тэрасы, які перавышае летні межанны ўзровень ракі на 5—6 м. Гарадок-4, а магчыма разам з ім і Васілевічы-2 з'яўляюцца трэцім (познамезалітычным) этапам развіцця днепра-дзяснінскай культуры.

Людзі сярэдняга каменнага веку сяліліся на невялікіх паселішчах-стаянках, паблізу ад вады, але на недаступным у час разліву

ўзроўні. Асноўнымі іх заняткамі былі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва.

У мезаліце ўдакладняюцца прыёмы апрацоўкі крэменю і вырабу з яго прылад працы. З'яўляецца мікралітычная і ўкладышавая тэхніка вырабу крамянёвых прылад, якая дазваляе атрымліваць камбінаваныя вырабы. Пашыраецца і разнастайнасць саміх прылад працы.

На змену эпохі мезаліту прыходзіць неаліт (новы каменны век), які працягваўся на тэрыторыі раёна, як і на большай частцы тэрыторыі рэспублікі, з канца 5-га тысячагоддзя да н.э. да канца 3-га тысячагоддзя да н.э. Галоўнымі рысамі, якія карэнным чынам адрозніваюць неаліт ад папярэдняга перыяду, з'яўляюцца вынаходніцтва глінянага посуду (керамікі) і паступовае распаўсюджванне вытвараючых форм гаспадаркі — земляробства і жывёлагадоўлі — пры захаванні вядучага значэння паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Прылады працы, як і раней, выраблялі з крэменю. Але і ў гэтай галіне матэрыяльнай культуры таксама адбываюцца змены, што выяўляецца ў скарачэнні вытворчасці ножападобных пласцін і мікралітаў і замене гэтых тэхналагічных аперацый тэхнікай двухбаковай апрацоўкі. Выраблялі прылады працы і рэчы з рогу, косці і дрэва.

Берагі Бярэзіны, Дняпра і іх прытокаў у гэты час засялялі плямёны днепра-данецкай археалагічнай культуры. Паселішчаў ранняга неаліту на тэрыторыі раёна пакуль што не знойдзена. Але добра прадстаўлена 2-я палавіна гэтага перыяду (прыкладна 2-я палавіна 3-га тысячагоддзя да н.э.). Да позняга неаліту адносяцца паселішчы каля вёсак Васілевічы, Таўстыкі, Гарадок, Шчытнае.

Найбольш значнае неалітычнае паселішча на ніжняй Бярэзіне знойдзена каля в. Васілевічы. Сярод знаходак асабліва характэрна кераміка. Носьбіты ўсходне-палескага варыянта днепра-данецкай культуры, ускраінай якога з'яўляюцца неалітычныя паселішчы Жлобіншчыны, выраблялі ляпны посуд — шыракагорлыя адкрытыя вастрадонныя гаршкі вялікіх або сярэдніх памераў. Венчыкі посуду былі прамыя або крыху адагнутыя вонкі, падкрэсліваліся радам ямак. Тулава злёгку выпуклае. Верхнія часткі гаршкоў упрыгожаны арнаментам, элементамі якога з'яўляліся адбіткі грэбеня, наколы і пракрэсленыя лініі. Элементы, у сваю чаргу, складаліся ў матывы ў выглядзе гарызантальных і дыяганальных радоў, ёлачных узораў, касой сеткі, трохвугольнікаў, хвалістых і прамавугольных фігур. Цікавая знаходка — выкананая адступаючымі наколамі выява (магчыма антрапаморфная) з унутранага боку прыдоннай часткі аднаго з гаршкоў. Крамянёвыя прылады працы прадстаўлены трохвугольнымі і паўромбападобнымі наканечнікамі стрэл, нажамі, прыладамі, якімі секлі, скрабкамі і інш.

Уяўляе цікавасць і кераміка з паселішча ва ўрочышчы Багданава гара каля в. Таўстыкі. Большая частка знойдзеных тут абломкаў ляпнога посуду мае цеста з дамешкамі крававіка. Асноўнымі элементамі арнамента, якім упрыгожаны посуд, былі ўзаемаперакрыжаваныя расчосы і лапчастыя ўціскванні, выкананыя канцом палачкі, абвітай вяровачкай. Прысутнічаюць таксама і адбіткі грэбеня, і наколы, але ў меншай колькасці, чым на паселішчы каля вёскі Васілевічы. Разнастайны крамянёвы інвентар. Тут знойдзены трохвугольныя і чарашковыя наканечнікі стрэл, праколкі, нажы, сякеры, скрабкі і інш.

У сярэдзіне 3-га тысячагоддзя да н.э. паселішчы ніжняй Бярэзіны і адпаведнага ўчастка Дняпра знаходзіліся пад уплывам паўночных і ўсходніх суседзяў — носьбітаў верхнедняпроўскай археалагічнай культуры і ўваходзілі ў склад пагранічна-кантактнай зоны 2 археалагічных культур — днепра-данецкай і верхнедняпроўскай.

Калектыўная праца неалітычных плямён была абумоўлена агульнай уласнасцю на асноўныя сродкі здабычы матэрыяльных каштоўнасцей і суправаджалася калектыўным спажываннем. З пераходам у канцы неаліту ад прысвойваючых да вытвараючых галін гаспадаркі пачаўся працэс распаду мацярынска-родавых адносін. З мацярынскай абшчыны пачалі вылучацца асобныя сем'і, якія паранейшаму мелі кроўныя сувязі, але ўжо набывалі пэўную эканамічную незалежнасць.

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку Жлобіншчыны, уступіла ў бронзавы век. Асноўным зместам новай эпохі было імклівае распаўсюджванне жывёлагадоўлі і земляробства, ператварэнне іх у пануючыя формы гаспадаркі. Развіваліся больш рэгулярныя менавыя зносіны, паступова адбывалася замена мацярынска-родавых адносін патрыярхатам. З'явіліся медныя і бронзавыя вырабы. Але з-за таго, што старажытныя цэнтры здабычы руды і выплаўкі металу знаходзіліся далёка па-за межамі тэрыторыі Бела-

русі, большасць прылад працы па-ранейшаму выраблялася з крэменю, рогу і косці.

Развіваліся не толькі новыя прыёмы апрацоўкі крэменю, такіх, як доўгая струменістая рэтуш або пілаватая, якімі завастраліся лёзы рэжучых прылад ці зброі. Паступова некаторыя вырабы пачынаюць набываць іншыя формы, з'яўляюцца новыя тыпы — свідраваныя матыкі і сякеры, крамянёвыя выгнутыя сярпы, булавы. Адначасова з крэменем шырока выкарыстоўваюцца іншыя пароды каменю.

Больш паспяхова, чым у неалітычную эпоху, выкарыстоўваюцца шліфаванне, паліраванне, свідраванне і піленне каменю. Самымі шматлікімі выпадковымі знаходкамі бронзавага веку амаль на ўсёй тэрыторыі рэспублікі лічацца крамянёвыя або каменныя сякеры-кліны, якія вучоныя часцей за ўсё адносяць да рабочых прылад працы. Побач з імі новым і таксама шматлікім тыпам сякераў сталі каменныя свідраваныя сякеры, зашліфаваныя і часам нават запаліраваныя па ўсёй паверхні. Яны былі, хутчэй за ўсё, зброяй, і, верагодна, прадметам культу.

Пашыраецца керамічная вытворчасць. Вялікі посуд неаліту змяняе меншы па памерах, але больш разнастайны па форме і прызначэнню. Гэты посуд танкасценны, дамешкамі цеста ў асноўным былі жарства і іншыя неарганічныя рэчывы. Найбольш характэрная рыса гаршкоў — пласкадоннасць.

У канцы 3-га — пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. ў складзе насельніцтва паўднёва-ўсходняй Беларусі адбываюцца значныя перамены. Яны былі выкліканы рассяленнем з правабярэжжа Сярэдняга Падняпроўя сярод мясцовага познанеалітычнага насельніцтва жывёлагадоўча-земляробчых плямён сярэднедняпроўскай культуры, якая адносіцца да культур шнуравой керамікі.

Археалагічныя помнікі сярэднедняпроўскай культуры на тэрыторыі раёна прадстаўлены паселішчамі каля вёсак Праскурні, Малыя Рагі, Верхняя Алба, Саланое, Таўстыкі. Паселішчы размяшчаліся па краю надпоплаўнай тэрасы, нярэдка на месцы папярэдніх познанеалітычных паселішчаў. Таму даволі цяжка ўстанавіць з дапамогай толькі параўнальнага аналізу фрагментаў керамікі, да якога часу адносіліся тыя ці іншыя вырабы. Напрыклад, каля в. Таўстыкі дзякуючы карэнным зменам у тэхналогіі і арнаментацыі посуду, удалося вылучыць невялікую колькасць фрагментаў посуду эпохі ранняй бронзы з ледзь пазначанай шыйкай і пукатым туловам, упрыгожаным гарызантальнымі радамі лінейнага штампа.

Паселішчы сярэднедняпроўскай культуры ўяўлялі сабой невялікія пасёлкі з наземнымі, магчыма, драўлянымі жытламі з агнішчамі ўнутры. Адзін з такіх пасёлкаў выяўлены на ўсходняй ускраіне в. Малыя Рагі, на невялікім мысе, утвораным паваротам р. Дабасна пры ўпадзенні яе ў Дняпро. Павярхоўныя зборы і раскопкі на невялікай плошчы, праведзеныя ў 1958 г. І.І.Арцёменкам, далі нешматлікую калекцыю керамікі і крамянёвых прылад. Найбольш значнай знаходкай былі 16 абломкаў адной пасудзіны. Відавочна, пласкадоннай баначнай формы, з прамым венчыкам, край якога быў коса зрэзаны ўнутр. Паверхня пасудзіны жоўтая, унутраная закураная. Маса пясчаністая, з дамешкамі дробнага кварцу. На знешнім і ўнутраным баках відаць сляды ад загладжвання. Пасудзіна неарнаментаваная.

Больш яркае ўяўленне аб матэрыяльнай культуры эпохі ранняй бронзы Верхняга Падняпроўя даюць помнікі на тэрыторыі суседняга са Жлобінскім Рагачоўскага раёна (паселішчы каля вёсак Лучын і Ходасавічы, курганны могільнік непадалёку ад паўночнай граніцы Жлобінскага раёна паблізу ад в. Ходасавічы). Пахавальны інвентар могільніка: вырабы з металу (медныя сякеры, нажы, наканечнікі дзідаў, шылы; упрыгожанні — падвескі, скроневыя кольцы, бранзалеты); крэменю (нажы, клінападобныя сякеры, наканечнікі стрэл і дзідаў), каменю (свідраваныя сякеры, паліраваныя пліты) і пласкадонныя, акругладонныя пасудзіны, арнаментаваныя адбіткамі вяровачкі, шнура, лінейнага штампа і наразнымі лініямі.

Сярэднедняпроўская культура існавала да сярэдзіны 2-га тысячагоддзя да н.э. На змену ёй прыйшла т.зв. сосніцкая культура, якая сфарміравалася на падставе ўзаемаўздзеяння сярэднедняпроўскіх і познанеалітычных плямён. Час складвання і развіцця сосніцкай культуры ў асноўным супадае з сярэднім перыядам бронзавага веку (1500—1200 гг. да н.э.). Але археалагічныя помнікі Жлобіншчыны гэтага перыяду, як і перыяду позняга бронзавага веку, яшчэ не выяўлены.

Каля 2500 год назад старажытныя жыхары Жлобіншчыны пачалі асвойваць спосабы атрымання жалеза і вытворчасці з яго разнастайных вырабаў. Балотныя і азёрныя руды, з якіх у старажытнасці здабывалі жалеза, былі шырока распаўсюджаны ў Беларусі, што

давала магчымасць наладзіць масавую вытворчасць гэтага металу.

Далейшае развіццё жывёлагадоўлі і лядная земляробства, ужыванне металічных вырабаў прывялі да росту лішкаў прадуктаў; узрасла маёмасная няроўнасць паміж асобнымі родамі.

У 7—3 ст. да н.э. тэрыторыю Гомельшчыны, а таксама і Жлобінскага раёна, займалі плямёны мілаградскай культуры, якая атрымала назву па найбольш даследаванаму гарадзішчу каля в. Мілаград суседняга Рэчыцкага раёна.

Рост узброеных сутычак, выкліканых сацыяльна-эканамічнымі зрухамі, прывёў да таго, што ў пачатку жалезнага веку насельніцтва пачало ўмацоўваць свае паселішчы, ператвараючы іх у гарадзішчы. На Жлобіншчыне мілаградскія ўмацаваныя паселішчы выяўлены каля вёсак Адрубы, Чырвоная Горка, Гарадок. Даследавалася гарадзішча каля в. Гарадок. Знойдзены абломкі ляпнога гліняная посуду мілаградскай культуры і косці жывёл.

Асноўным тыпам жылля мілаградскіх плямён былі паўзямлянкавыя і наземныя, крыху заглыбленыя ў зямлю, жытлы. Характэрная іх адзнака — спецыфічны выступ прамавугольнай, авальнай ці круглай формы ў адной са сцен або ў кутку.

Пры даследаванні помнікаў мілаградскай культуры выяўлена значная колькасць разнастайных прадметаў матэрыяльнай культуры. Своеасаблівы гліняны посуд і грузікі. Кераміка прадстаўлена кругладоннымі ляпнымі пасудзінамі з шарападобным і яйцападобным тулавам, невысокай прамой ці абагнутай шыйкай. Сустракаюцца гаршкі без шыйкі з прамым альбо адагнутым унутр краем.

Навукоўцы лічаць, што вядучымі галінамі гаспадаркі мілаградскіх плямён былі земляробства і жывёлагадоўля. Падсобнымі заставаліся паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва.

У канцы 3 — пачатку 2-га ст. да н.э. склалася зарубінецкая культура. Яна займала тэрыторыю, на якой раней жылі мілаградскія плямёны. На Жлобіншчыну прыпадае, магчыма, верхнедняпроўскі варыянт гэтай культуры. Зарубінецкія матэрыялы выяўлены на гарадзішчах каля вёсак Акцябр і Чырвоная Горка. Помнікі зарубінецкага часу не даследаваліся.

Зарубінецкае насельніцтва рассялілася на пабудаваных у мілаградскі час гарадзішчах, жыло таксама і на неўмацаваных пасёлках-селішчах. Жылыя пабудовы наземныя або паглыбленыя ў мацярык. Жытлы невялікага памеру, квадратныя ці прамавугольныя. У зарубінецкіх жытлах сустракаюцца і глінабітныя агнішчы.

Вядучымі галінамі гаспадаркі зарубінецкіх плямён былі земляробства і жывёлагадоўля. Знойдзены жалезныя сярпы, каменныя зерняцёркі, клінападобныя сякеры-кельты. Земляробства ў асноўным было лядным. Астэалагічныя дадзеныя сведчаць, што развітой галіной гаспадарчай дзейнасці плямён была жывёлагадоўля. Паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва былі падсобнымі.

Зарубінецкія плямёны валодалі прыёмамі атрымання і апрацоўкі каляровых металаў і жалеза. Посуд разнастайны па форме: пласкадонныя грубаляпныя гаршкі з адагнутым вонкі краем, пазначанай шыйкай і круглаватым тулавам, глянцаваныя гаршкі, грубаляпныя і глянцаваныя неарнаментаваныя міскі.

Зарубінецкія плямёны знаходзіліся на стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу і складвання тэрытарыяльнай абшчыны. Па этнічнай прыналежнасці многія даследчыкі лічаць зарубінецкую культуру старажытнаславянскай.

З сярэдзіны 2 ст. н.э. зарубінецкія старажытнасці паўсюдна пачалі знікаць, саступаючы месца помнікам, якія ў Беларускім Падняпроў'і атрымалі назву старажытнасцей тыпу Абідні-Тайманава (2—5 ст. н.э.) па назвах населеных пунктаў у Быхаўскім раёне, дзе праводзіліся раскопкі. Новая культура сфарміравалася на аснове зарубінецкай на познім этапе яе развіцця. Магчыма, што археалагічныя помнікі Жлобіншчыны 2-й і 3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. знаходзіліся ў арэале распаўсюджання помнікаў тыпу Абідні-Тайманава і больш позняй калочынскай культуры (па назве гарадзішча Калочын-1 на Дняпры ў Рэчыцкім раёне). Матэрыяльная культура старажытнага насельніцтва раёна гэтага перыяду не даследавалася.

Пераход да класавага грамадства на тэрыторыі Жлобіншчыны, як і па ўсёй тэрыторыі рэспублікі, адбываўся ў 6—9 ст. У працэсе распаду родаплемянных сувязей грамадства пераходзіла ад стадыі ваеннай дэмакратыі да феадалізму.

Кроўныя сувязі паміж членамі патрыярхальнай родавай абшчыны паступова страчвалі сваё значэнне. На змену ім прыходзілі суседска-тэрытарыяльныя сувязі. Патрыяр-

хальная вялікасямейная абшчына змянілася на сельскую абшчыну, у якой перавагу мае індывідуальная сям'я. Эканамічныя і тэрытарыяльныя сувязі сельскіх абшчыннікаў садзейнічалі росту прыватнай уласнасці і развіццю класавага грамадства. Сельскія абшчыны спрыялі стварэнню саюзаў плямён — новых грамадскіх арганізацый, галоўнай мэтай якіх была ўзброеная абарона агульных інтарэсаў. У гэты час узмацняецца ўлада племянной знаці над абшчынамі, што з'яўлялася адной з перадумоў стварэння дзяржавы.

Басейн ніжняй Бярэзіны і яе міжрэчча з Дняпром у 9—13 ст. з'яўляўся пагранічнай зонай паміж плямёнамі дрыгавічоў і радзімічаў.

Археалагічныя помнікі, пакінутыя змешаным насельніцтвам з радзімічаў і дрыгавічоў, прадстаўлены на Жлобіншчыне селішчамі, курганнымі могільнікамі і адзіночнымі курганамі. Селішча 11—13 ст. знаходзіцца за 1 км на захад ад курганнага могільніка каля в. Курганне.

Курганныя могільнікі Жлобіншчыны пачаў даследаваць з 1905 г. Е.Р.Раманаў. Каля в. Акцябр ён раскапаў 6 курганоў, выяўлены пахаванні з абрадам трупапалажэння на гарызонце галавой на захад і выцягнутымі рукамі ўздоўж тулава (курган № 2). У кургане № 5 выяўлены сляды труны. У пахаваннях знойдзены буйназярнёныя пацеркі ад завушніцы (курган № 3), жалезнае паяснае кольца (курган №2), гліняны гаршчок (курган №5). У кургане № 6 рэчаў не знойдзена, у кургане № 4 пахавання не выяўлена. У кургане № 1 вышынёй 3,5 м і дыяметрам каля 20 м выяўлены адно пахаванне ў насыпе і двайное пахаванне ў труне. Усе пахаванні арыентаваны галавой на захад, рукі ўздоўж тулава ў верхнім пахаванні і скрыжаваны ўнізе жывата — у ніжніх пахаваннях. Сярод рэчаў сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, жалезная і бронзавая грыўні, бранзалеты, завушніцы, пярсцёнкі, спражкі, паясныя кольцы.

Курганы радзімічаў у Гомельскай вобласці, у тым ліку і ў Жлобінскім раёне, з 1973 г. вывучаў У.У.Багамольнікаў. Ён даследаваў могільнікі каля в. Дзяніскавічы, якія належалі радзімічам, і каля в. Курганне, пакінутыя змешаным насельніцтвам з радзімічаў і дрыгавічоў.

Этнавызначальнымі рэчамі дрыгавічоў з'яўляліся бронзавыя зярнёныя пацеркі, радзімічаў — сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы. Гэтыя ўпрыгожанні знойдзены на даследаваных помніках.

Сельскія паселішчы ранняга феадалізму дрыгавічоў і радзімічаў вывучаны слаба. Асновай іх гаспадаркі ў канцы 1-га тысячагоддзя з'яўляліся земляробства (двух- і трохполле) і жывёлагадоўля. Насельніцтва займалася таксама паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам. Паступова развіваліся гандлёвыя сувязі. Далейшае развіццё атрымала рамяство. Аддзяленне яго ад сельскай гаспадаркі спрыяла зараджэнню гарадоў. Адным з такіх гарадоў на Жлобіншчыне, які ўзнік не пазней 12 ст., быў Стрэшын. *І.М.Язэпенка.*

На дрыгавіцка-радзіміцкім сумежжы ў 9—13 стагоддзях

Жлобінскі раён багаты на археалагічныя помнікі ранняга сярэднявечча: паселішчы, гарадзішчы, курганы. Іх вывучэнне дапамагае высветліць, якое насельніцтва знаходзілася на яго тэрыторыі, як жылі, чым займаліся яго старажытныя жыхары.

Як устаноўлена вучонымі, да сярэдзіны 1-га тысячагоддзя на асноўнай тэрыторыі Беларусі жылі балцкія (лета-літоўскія) плямёны. Пазней тут з'явіліся славяне. Яны выцеснілі абарыгенаў або змяшаліся з імі. Славянскае насельніцтва на працягу стагоддзяў прасоўвалася з поўдня на поўнач у лясную зону Усходняй Еўропы.

У апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі ў Верхнім Падняпроўі і Падзвінні сфарміраваліся аб'яднанні ўсходніх славян: дрыгавічы, радзімічы, крывічы-палачане. Тэрыторыя Жлобінскага раёна знаходзіцца на дрыгавіцка-радзіміцкім сумежжы. На правым беразе Дняпра асноўным насельніцтвам былі дрыгавічы, на левым — радзімічы.

У Густынскім летапісе пра дрыгавічоў гаворыцца, што яны рассяліліся паміж Прыпяццю, Дняпром і Дзвіною. У адрозненне ад іншых летапісаў тут адзначана ўсходняя мяжа дрыгавічоў, якая ішла па левым беразе Дняпра на поўнач ад упадзення ў яго Прыпяці. Але трэба адзначыць, што паміж гэтымі плямёнамі стабільнай мяжы не існавала, яна

часта мянялася, паколькі плямёны ўвесь час былі ў стане ўзаемапранікнення і абодва засялялі паўднёва-ўсходнюю частку Беларусі. Таму зразумела, чаму некалькі паселішчаў радзімічаў зафіксавана ў Жлобінскім раёне таксама на правым беразе Дняпра.

Распаўсюджана думка, што назва «дрыгавічы» утварылася ад слова «дрыгва» (балота). Дрыгавічы — жыхары балоцістай, сырой мясцовасці. Аднак некаторыя даследчыкі прыводзяць довады, што назва дрыгавічы паходзіць ад славянскага імя Драгавіт, як радзімічы ад Радзіма і вяцічы ад Вятка, і больш правільнай формай назвы трэба лічыць «драгавічы» (М.Ермаловіч. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 23). Рассяленне дрыгавічоў на вялікай прасторы ў Папрыпяцці, Падняпроўі, Панямонні і Пабужжы мела ў далейшым надзвычай важныя вынікі для гісторыі Беларусі. У апошні раз дрыгавічы названы ў летапісе пад 1149 г.

Курганы дрыгавічоў 9—10 ст. з крэмацыяй памёршых і ляпной керамікай вядомы на Дняпры, Прыпяці, у вярхоўях Случы і Арэсы. У Жлобінскім раёне курганы з крэмацыяй выяўлены каля пас. Колас Пірэвіцкага сельсавета, вёсак Старая Рудня, Акцябр.

Паводле язычніцкіх вераванняў, агонь з'яўляўся свяшчэннай ачышчальнай сілай. Яму аддавалі цела памёршага разам з рэчамі, якімі ён карыстаўся раней. Лічылася, што прылады працы, упрыгожанні, зброя спатрэбяцца нябожчыку ў замагільным жыцці, у якое верылі славяне. Насельніцтва, асабліва ў вёсцы, у 10—13 ст. працягвала хаваць памёршых пад курганамі, аднак пасля прыняцця хрысціянства з канца 10 ст. іх больш не спальвалі ў агні. Праз некаторы час пахавальны абрад трупапалажэння канчаткова выцясніў крэмацыю.

На тэрыторыі Жлобінскага раёна курганы з пахаваннямі па абраду трупапалажэння 11—12 ст. вывучаліся каля вёсак Адраджэнне (былая в. Эрштэрмай), Дзяніскавічы, Курганне, Праскурні, Саланое, Новая Каменка. У адных курганах пахаваны дрыгавічы, у другіх — радзімічы.

У дрыгавічоў сярод жаночых упрыгожанняў былі распаўсюджаны зярнёныя пацеркі, якія рабіліся з медзі і серабра. Зверху пацерка была аздоблена напаянымі дробнымі сярэбранымі шарыкамі — зерню. Зярнёныя металічныя пацеркі лічацца характэрнай адзнакай дрыгавічоў. Адной ці трыма такімі пацеркамі упрыгожваліся кольцы, якія насіліся каля скроняў і таму называюцца скроневымі кольцамі. На тэрыторыі Жлобінскага раёна металічныя зярнёныя пацеркі знойдзены пры раскопках курганоў каля вёсак Курганне, Праскурні, Саланое.

На тэрыторыі рассялення дрыгавічоў узніклі гарады Тураў, Пінск, Слуцк, Клецк, Рагачоў, Мазыр і інш. У канцы 10 ст. склалася Тураўскае княства. Такім чынам, асноўная частка Жлобінскага раёна, якая знаходзіцца на правым беразе Дняпра і была населена дрыгавічамі, уваходзіла ў склад Тураўскага княства. Іншым быў гістарычны лёс радзіміцкіх паселішчаў, размешчаных на левым беразе Дняпра. Яны разам з гарадамі Рэчыцай, Гомелем і Чачэрскам адносіліся да буйнога Чарнігаўскага княства.

Радзімічы — усходнеславянская этнічная супольнасць, землі якой размяшчаліся ў паўднёва-ўсходняй частцы сучаснай Беларусі (усход Гомельскай і Магілёўскай абласцей). Як сказана ў летапісе, назва этнічнай супольнасці паходзіць ад імя Радзім, на чале з якім радзімічы прыйшлі з заходнеславянскіх зямель і пасяліліся на рацэ Сож. Найбольш даследаванымі археалагічнымі помнікамі радзімічаў з'яўляюцца курганныя могільнікі. Шмат курганоў вывучана ў суседнім Рагачоўскім раёне. У Жлобінскім раёне курганы радзімічаў выяўлены каля вёсак Праскурні і Курганне.

Для радзіміцкіх жанчын найбольш характэрным было ўбранне, дзе ў розных варыянтах спалучаліся сяміпрамянёвыя ды пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы, круглыя падвескі, якія сімвалізавалі нябесныя святілы, пласцінкавыя шыйныя грыўні. Па рэчавых знаходках вылучаюць 3 перыяды фарміравання радзімічаў ад 2-й паловы 10 ст. да 1-й чвэрці 12 ст. У гэтыя перыяды адбывалася славянізацыя радзімічамі ўсходнебалцкага (лета-літоўскага) насельніцтва.

Некаторы час радзімічы плацілі даніну хазарам, якія далёка на поўдні стварылі сваю дзяржаву — Хазарскі каганат. У 2-й палавіне 9 ст. адбыўся заняпад гэтай дзяржавы. У 885 г. кіеўскі князь Алег вызваліў радзімічаў ад залежнасці хазарам і абклаў іх данінай. У 907 г. радзіміцкае апалчэнне ўдзельнічала ў складзе войска Алега ў паходзе на Візантыю. У пачатку 970-х гг. радзімічы выйшлі з-пад улады кіеўскіх князёў.

У летапісе пад 984 г. паведамляецца пра паход кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча на радзімічаў. Перадавы атрад княжацкага

войска ўзначальваў ваявода Воўчы Хвост. Радзімічы былі разбіты на рацэ Пяшчань у Пасожжы. У 11 ст. тэрыторыя радзімічаў была ў складзе Чарнігаўскага княства. З пачатку 12 ст. яе паўночная частка знаходзілася пад уладай Смаленска.

Да 12 ст. адносяцца пісьмовыя звесткі пра гарады на зямлі радзімічаў — Гомель, Крычаў, Слаўгарад (Прапойск), Чачэрск. Яны існавалі ўжо ў 10 ст. Найбольш буйным і значным быў Гомель, што пераканаўча пацвердзілі археалагічныя раскопкі. Апошні раз у летапісе радзімічы ўпамінаюцца пад 1169 г.

На тэрыторыі Жлобінскага раёна знаходзіцца цікавы археалагічны помнік, аб якім сярод вучоных не сціхаюць спрэчкі дагэтуль. Гэта археалагічны комплекс у гарадскім пасёлку Стрэшын, дзе ёсць 2 старажытныя раёны, вядомых пад назвай Старога і Новага Гарадка. Стары Гарадок захаваў прыкметы старажытнага гарадзішча. Ён размешчаны на мысе высокага берага Дняпра. Глыбокі роў аддзяляе яго ад карэннага берага ракі, дзе знаходзіцца Новы Гарадок. Пляцоўка гарадзішча (75 × 30 м) выцягнута ўздоўж ракі. У 1966 г. Э.М.Загарульскі даследаваў на гарадзішчы ўчастак 10 × 10 м, дзе магутнасць культурнага пласта дасягае 1,6 м. Былі выяўлены жалезныя наканечнікі стрэл, сашнікі, шкляныя бранзалеты — любімае ўпрыгожанне гараджанак у 12 — 1-й палавіне 13 ст., оўручскія праселкі для верацёнаў, пацеркі, каспяныя грабяні, вялікая колькасць керамікі, косці хатніх і дзікіх жывёл. У паўднёвай частцы гарадзішча культурны пласт выяўлены пад валам. Паселішча ўзнікла ў 12 ст. на гарадзішчы, якое мела з боку поля магутныя земляныя ўмацаванні. Невялікае паселішча існавала ў гэты час і на тэрыторыі Новага Гарадка. Некаторыя даследчыкі атаясамліваюць Стрэшын з старажытным горадам Полацкай зямлі Стрэжавым, які ўпершыню ўпамінаецца ў Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1127 г. (у Іпацьеўскім летапісе пад 1128 г.) у сувязі з паходам кааліцыі паўднёварускіх князёў на Полацкую зямлю: «... а Всеволоду Ольговичю (чарнігаўскаму князю) повеле ити с своею братею на Стрежев к Борисову». Іпацьеўскі летапіс называе яшчэ раз гэты горад пад 1159 г., калі полацкі князь Рагвалод аддае як спадчыну Стрэжаў князю Усеваладу. На сёння Стрэжаў дакладна не лакалізаваны. Некаторыя даследчыкі лічаць, што летапісны Стрэжаў размяшчаўся на месцы сучаснага г.п. Стрэшын. Стрэшын знаходзіцца на значнай адлегласці ад звычайна вызначаемай паўднёва-ўсходняй мяжы Полацкай зямлі. Але ў перыяд феадалізму не выключалася цераспалоснасць уладанняў і таму верагодна, што ў летапісе размова ішла менавіта аб гэтым пункце, які тады называўся Стрэжавым. Пошукі Стрэжава ў іншых месцах станоўчага выніку не мелі. *Г.В.Штыхаў.*

Помнікі археалогіі

Адраджэнне (да 1968 г. Эрштэрмай; Папаратнянскі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,8 км на ПнУ ад вёскі. Захавалася 36 насыпаў вышынёй 0,5—2,5 м, дыяметрам 6—15 м. Многія пашкоджаны. У 1960 г. разбураныя курганы абследаваў Г.В.Штыхаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Знойдзены бронзавыя змеегаловыя бранзалеты (цэлы і 2 абломкі), шкляныя пацеркі, у т.л. пазалочаныя, ганчарны гаршчок «з карнізікам». Належаў радзімічам, датуецца 11 ст.

Адрубы (Кабанаўскі сельсавет). Гарадзішча. За 0,5 км на ПнЗ ад вёскі, на левым карэнным беразе Бярэзіны. Выявіў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Пляцоўка гарадзішча памерам 105 х 75 м выцягнута ўздоўж ракі з поўначы на поўдзень з невялікім нахілам на захад. Умацавана ровам глыбінёй 3,5 м, добра захавалася. Раскопкі не праводзіліся.

Акцябр (Акцябрскі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,3—0,4 км на Пн ад вёскі каля дарогі ў в. Малыя Рагі. 2 насыпы вышынёй да 2,5 м, дыяметрам 8—10 м.

Паселішча. За 1 км на ПнУ ад вёскі, на левым беразе ручая Цемча. Пляцоўка памерам 80 × 40 м, пашкоджана. Культурны пласт 0,3 м. Сабраны фрагменты керамікі бронзавага веку і старажытнарускага часу.

Гарадзішча. За 3 км на ПдЗ ад вёскі, на беразе воз. Гораўна, каля сучасных могілак. Пляцоўка памерам 95 × 90 м. Паўночная частка абмежавана ярам, паўднёвая і паўднёва-ўсходняя ўмацаваны валам вышынёй каля 5 м і ровам глыбінёй 1,5 м. Выявіў у 1900 г.

Е.Р.Раманаў, абследавалі ў 1951—1953 гг. Ю.У.Кухарэнка, у 1957 г. І.І.Арцёменка, у 1958 г. Л.Д.Побаль, у 1978 г. Н.М.Дубіцкая. У агаленнях прасочаны культурны пласт 0,15—0,2 м. Знойдзены 2 кувадлы, 3 малаткі, абцугі. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку, датуецца 6—2 стагоддзямі да н.э.

У 1994 г. амаль у цэнтры пляцоўкі быў закладзены шурф памерам 2 × 2 м, арыентаваны па баках свету. Культурны пласт цёмнашэрага колеру 0,5—0,8 м. Знойдзена грубаляпная кераміка мілаградскай і зарубінецкай культур, фрагменты глінянага катушкападобнага грузіка, ганчарнай керамікі старажытнарускага часу. Частка керамікі ранняга жалезнага веку мае штрыхоўку.

У літаратуры гарадзішча вядома пад назвай Праскурні.

Васілевічы (Дабрагошчанскі сельсавет). Паселішча-1. За 0,5 км на У ад вёскі, на дзюнным пагорку першай надпоплаўнай тэрасы левага берага р. Бярэзіна. Плошча 600 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1 м. Знойдзены крамянёвыя адшчэпы, нуклеусы, скрабкі. Адносіцца да каменнага веку.

Паселішча-2. За 0,7 км на У ад вёскі. За 0,2 км на ПдЗ ад паселішча-1. Плошча 200 м^2. Абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,15 м. Знойдзены крамянёвыя пласціны, адшчэпы, вастрыё яніславіцкага тыпу. Адносіцца да позняга мезаліту, датуецца 6—5-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-3. На ПнУ ад вёскі, на дзюнным пагорку. Плошча 400 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У агаленнях культурны пласт 0,15 м. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі, крамянёвыя скрабкі, адшчэпы, пласціны і інш. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-4. За 0,7 км на ПнЗ ад вёскі. Плошча 100 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт ва ўсходняй частцы паселішча 0,15 м. Знойдзены крамянёвыя адшчэпы, ножападобныя пласціны, вастрыі, скрабкі. Адносіцца да позняга мезаліту, датуецца 6—5-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-5. За 0,8 км на ПнЗ ад вёскі, на астанцы 1-й надпоплаўнай тэрасы. Плошча 400 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,2 м. Знойдзены больш за 200 фрагментаў ляпной керамікі, у т.л. рэшткі танкасценнага посуду, арнаментаванага наколамі і адбіткамі грэбеня, наразнымі лініямі і ямкамі на шыйках, крамянёвыя скрабкі, ножападобныя пласціны, адшчэпы, нуклеусы, наканечнік стралы трохвугольнай формы, вастрыё, сякерападобныя прылады працы. Адносіцца да эпохі неаліту і бронзавага веку, датуецца 4—1-м тысячагоддзямі да н.э.

Верхняя Алба (Верхне-Албянскі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,5 км на У ад вёскі ва ўрочышчы Курганне, паміж в. Верхняя Алба і былым пасёлкам Сасновым, за могілкамі. 8 насыпаў вышынёй 1,5—2 м, дыяметрам 6—8 м. Абследавала ў 1983 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Паселішча. За 0,3 км на Пн ад могілак, на правым беразе Дняпра. Выявіў і даследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1 м. У раскопе агульнай плошчай 42 м^2 знойдзены крамянёвыя вырабы і грабеньчата-накольчатая кераміка. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Гарадок (Верхнеалбянскі сельсавет). Гарадзішча. За 0,2 км на ПнУ ад вёскі, ва ўрочышчы Тарэлка, на левым беразе безназоўнай рэчкі (прыток р. Бярэзіна). Пляцоўка памерам 47 × 53 м^2, здзірванелая, умацавана валам вышынёй 1,5—2 м, шырынёй каля асновы 8 м. З вонкавага боку ад вала прасочаны сляды рова, а з захаду — уезд на пляцоўку. Даследавала ў 1983 г. Н.М.Дубіцкая на плошчы 16 м^2. Культурны пласт 0,7 м. Знойдзена ляпная кераміка і косці жывёл. Адносіцца да мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку.

Паселішча-1. За 0,5 км на ПдУ ад вёскі, ва ўрочышчы Ляды, у пойме левага берага р. Бярэзіны. Плошча 1100 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1—0,15 м. Знойдзены больш 200 фрагментаў ляпной керамікі, упрыгожаных адбіткамі грэбеня, і каля 300 крамянёвых вырабаў (адшчэпы і пласціны, у т.л. прылады працы з рэтушшу). Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-2. За 1,2 км на Пд ад вёскі, на дзюнным пагорку ў пойме р. Бярэзіна. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,15 м прасочаны на плошчы 500 м^2. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі, крамянёвыя прылады працы і зброя (адшчэпы, ножападобныя пласцінкі, наканечнік

стралы, трапецыя, скрабок). Адносіцца да бронзавага веку. Датуецца канцом 3-га — пачаткам 1-га тысячагоддзя да н.э.

Паселішча-3. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі. Плошча 300 м². Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1 м. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі з арнаментам у выглядзе адбіткаў грэбеня і наразных ліній, крамянёвыя прылады працы і зброя (адшчэпы з рэтушшу, наканечнік стралы, пласціны і інш.). Адносіцца да бронзавага веку. Датуецца канцом 3-га — пачаткам 1-га тысячагоддзя да н.э.

Паселішча-4. За 3 км на ПдЗ ад вёскі ва ўрочышчы Вітаўт, на першай надпоплаўнай тэрасе. Плошча 1400 м². Выявіў і даследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. На плошчы 44 м² ускрыты 2 культурныя пласты 0,3 і 0,4 м з рэшткамі агнішчаў і гаспадарчых ям, якія адносяцца да эпохі мезаліту (ніжні) і неаліту (верхні). Знойдзены крамянёвыя прылады працы і зброя (наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, вастрыё, праколкі, трапецыі, пласціны з рэтушшу, нуклеусы і інш.). Датуецца 7—5-м тысячагоддзямі да н.э. (ніжні пласт) і 4—2-м тысячагоддзямі да н.э. (верхні пласт).

Паселішча-5. На ПдЗ ад могілак, на дзюнным пагорку. Плошча 400 м². Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У культурным пласце 0,2 м знойдзены рэшткі грубаляпной таўстасценнай керамікі. Адносіцца да ранняга жалезнага веку, датуецца першымі стагоддзямі н.э.

Гарбачоўка (Чырвонабярэжскі сельсавет). Гарадзішча. За 0,15 км на У ад вёскі. Пляцоўка прамавугольная, памерам 140 × 90 м, выцягнута з захаду на ўсход. Захаваўся вал вышынёй 2 м і роў глыбінёй 1,5 м, шырынёй 2 м. Вядома з 1873 г. Абследавала ў 1978 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Курганны могільнік-1. На гарадзішчы. 3 насыпы дыяметрам 7—14 м, вышынёй 0,5—3 м. Курганы зараслі хмызняком. Вядомы з 1873 г., абследавалі ў 1977 г. У.У.Багамольнікаў, у 1978 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Курганны могільнік-2. На У ускраіне вёскі. 7 насыпаў дыяметрам 7—12 м, вышынёй 1—1,25 м. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1976 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Даліна (Майскі сельсавет). Курганны могільнік-1. За 0,5—0,8 км на ПдЗ ад вёскі, ва ўрочышчы Курганне. 14 насыпаў вышынёй 1—2,5 м, дыяметрам 8—12 м. Зараслі лесам, многія пашкоджаны. Выявіў у 1971 г. і абследаваў у 1976 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Курганны могільнік-2. За 0,7 км на ПдЗ ад вёскі. 21 курган вышынёй 1—2,5 м, дыяметрам 8—12 м. Многія насыпы зараслі лесам, пашкоджаны. Выявіў у 1971 г. і абследаваў у 1976 г. У.У.Багамольнікаў, абследаваў у 1994 г. А.І.Драбушэўскі. Раскопкі не праводзіліся. Захавалася 5 насыпаў.

Дзяніскавічы (Майскі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,3 км на ПнЗ ад вёскі. Захаваўся 31 курган вышынёй 2 м, дыяметрам 10—12 м. Многія пашкоджаны, большасць зарасла кустамі. Вядомы з 1873 г. У 1975 г. У.У.Багамольнікаў даследаваў 4 курганы. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У адным знойдзены косці чалавека, абломкі керамікі, крыжык, 2 ганчарныя гаршкі, пацеркі, лунніцы, у 3 іншых знойдзены пахаванні часоў позняга феадалізму, у 2 пахаваны жанчыны галавою на захад, знойдзены пазалочаныя шкляныя бочкападобныя пацеркі, дробны бісер, металічныя прызматычныя пацеркі, біэліпсоідная падвеска. У 3-м пахаваны мужчына галавою на ўсход, рэчаў не знойдзена. Датуецца 11 ст., належаў радзімічам.

Жлобін. Паселішча. За 2 км на У ад горада. На левым беразе р. Дняпро. Плошча 0,5 га. Культурны пласт 0,1—0,2 га, пашкоджаны. У настаўніка гісторыі мясцовай школы А.Лянькова захоўваецца калекцыя керамікі і прасліц з гэтага паселішча. Адносіцца да сярэдневякоўя.

Паселішча-2. За 2 км на У ад горада. На левым беразе р. Дняпро, за 0,1 км на ПдУ ад паселішча-1. Плошча 75 × 40 м. Культурны пласт 0,5 м. Знойдзены прылады працы з крэменю, кераміка бронзавага веку.

Паселішча-3. За 2 км на У ад горада, за 100 м на Пд ад паселішча-2. Памер 210 × 25 м. Знойдзены фрагмент керамікі бронзавага веку.

Жырхаўка (Навамаркавіцкі сельсавет). Паселішча. На У ад вёскі, на схіле далiны Дняпра. Плошча 500 м². Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У культурным пласце 0,2 м, на плошчы 80 м² знойдзена ляпная кераміка з арнаментам у выглядзе наразных ліній і адбіткаў ямак, крамянёвыя вырабы (адшчэпы, пласціны, нуклеусы, скрабкі, фрагмент наканечніка стралы). Адносіцца да бронзавага веку, датуецца канцом 3 — пачат-

кам 1-га тысячагоддзя да н.э. Раскопкі не праводзіліся.

Замен-Рыння (Шчадрынскі сельсавет). Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 5 км на ПнУ ад вёскі, ва ўрочышчы Божы Брод. Пляцоўка авальнай формы, памерам 82 × 62 м. Умацавана 2 валамі і ровам. Вышыня першага вала (вонкавага) 2 м, шырыня 6 м, другога (унутранага) адпаведна 1,6 × 2,5 м. Глыбіня рова 2 м, шырыня 1 м. Гарадзішча зарасло лесам, мясцовасць вакол яго забалочана. Вядома з 1924 г. Абследавала ў 1981 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Затон (Акцябрскі сельсавет). Паселішча-1. На паўднёвай ускраіне вёскі. Памер 30 × 200 м. Культурны пласт 0,2—0,3 м. Вядома з 1935 г. Знойдзены фрагменты грубаляпной керамікі кіеўскага тыпу і ганчарнай старажытнарускага перыяду.

Паселішча-2. На ўсходняй ускраіне вёскі. Памер 80 × 40 м. Культурны пласт 0,2—0,3 м. Знойдзена грубаляпная і ганчарная кераміка.

Паселішча-3. На Пн ад паселішча-2. Памер 50 × 100 м. Культурны пласт 0,2—0,3 м. Знойдзена ганчарная кераміка старажытнарускага часу.

Кароткавічы (Кароткавіцкі сельсавет). Гарадзішча. За 4 км на ПдЗ ад вёскі, сярод балота. Пляцоўка авальная, памерам 48 × 40 м, умацавана кольцападобным валам вышынёй 2,5 м, шырынёй 3,5 м. Другі вал дзеліць пляцоўку на 2 часткі. Вядома з 1924 г. Абследаваў у 1975 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Колас (Пірэвіцкі сельсавет). Курганны могільнік. На Пд ускраіне пасёлка 6 пашкоджаных курганоў дыяметрам 10 м, вышынёй 2 м. Выявіў і даследаваў у 1974 г. У.У.Багамольнікаў, раскапаны адзін курган. Пахавальны абрад — трупаспаленне. Знойдзены абломкі 2 ляпных слабапрафіляваных гаршкоў. Датуецца 6—7 стагоддзямі н.э.

Курганне (Чырвонабярэжскі сельсавет). Курганныя могільнікі. На Пд ускраіне вёскі ўздоўж р. Дабасна (прыток Дняпра).

Могільнік-1. Паміж в. Курганне і р. Дабасна. 55 курганоў вышынёй 0,5—2,5 м, дыяметрам 10—12 м. Выявіў і даследаваў у 1972—1976 гг. У.У.Багамольнікаў, раскапаны 28 насыпаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне галавою на захад, у адным выпадку галавою на ўсход, у другім — трупаспаленне. Адзін курган быў пусты. У многіх курганах знойдзены ганчарныя гаршкі, скроневыя кольцы (у т.л. сяміпрамянёвыя), пацеркі (дробны бісер, шкляныя пазалочаныя цыліндрычныя і бочачкападобныя сердалікавыя біпірамідальныя, прызматычныя бурштынавыя і інш.), каса, серп, прасліцы, крэсівы, ліра падобныя спражкі, паясныя кольцы, крыж-складзень, кручок-падвеска з выявамі конскіх галовак. Датуецца 11 — 1-й трэццю 12 ст., належаў радзімічам.



Спражка і паясное кольца з магільніка ранняга жалезнага веку. Курганне Жлобінскага раёна.

Могільнік-2. Побач з могільнікам-1, на З ад яго. 35 курганаў вышынёй 1—2 м, дыяметрам 10—12 м. Выявіў і даследаваў у 1972 г. У.У.Багамольнікаў. Раскапана 7 насыпаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце і ў яме. Знойдзены шкляныя пазалочаныя і сердалікавыя біпірамідальныя пацеркі, нож, пярсцёнак, ганчарная кераміка, металічная буйназярністая пацерка. Датуецца 11—12 ст., належаў дрыгавічам.

Могільнік-3. За 1 км на З ад могільніка-2. 3 курганы вышынёй 2 м, дыяметрам 12—13 м. Выявіў і абследаваў у 1972 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Лугавая Вірня (Майскі сельсавет). На левым беразе р. Ржаўка знойдзены фрагменты кафлі і манеты 17—19 ст. Магчыма, тут знаходзіўся завод па вырабу кафлі.

Лясань (Салонскі сельсавет). Курганны могільнік. За 2 км на З ад вёскі. 27 насыпаў вышынёй 0,5—3 м, дыяметрам 3—14 м. Курганы здзірванелыя, зараслі лесам, асобныя пашкоджаны. Выявіла і абследавала

ў 1978 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Малыя Рагі (Салонскі сельсавет). Паселішча. На ПнЗ ускраіне вёскі, ва ўрочышчы Балонне, на правым беразе р. Дняпро. Плошча каля 1 га. Знойдзены фрагменты грубаляпной керамікі. Адносіцца да позняга этапу зарубінецкай культуры.

Бескурганны могільнік. За 0,2 км на Пд ад вёскі. Знойдзены фрагменты грубаляпной керамікі.

Ніжняя Алба (Верхне-Албянскі сельсавет). Паселішча-1. За 0,15 км на ПнЗ ад вёскі, каля могілак. Паселішча часткова пашкоджана. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У агаленнях культурны пласт 0,87 м на плошчы 80 м^2. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі і крамянёвыя адшчэпы. Адносіцца да бронзавага і ранняга жалезнага вякоў.

Паселішча-2. За 0,2—0,3 км на ПдУ ад вёскі, на правым беразе р. Дняпро, ва ўрочышчы Паляна. Памер 5 × 12 м. Культурны пласт 0,2—0,3 м. Адносіцца да ранняга жалезнага веку.

Паселішча-3. За 0,5 км на ПнЗ ад вёскі. Памер 40—60 × 150—200 м. Культурны пласт слаба выражаны, 0,2—0,3 м. Сабраны фрагменты грубаляпной керамікі 1-га тысячагоддзя н.э. і ганчарнай старажытнарускага перыяду.

Новая Каменка (Стрэшынскі пасялковы савет). Курганны могільнік. Паміж вёскамі Новая Каменка і Старая Каменка (не існуе). Захаваліся 32 насыпы вышынёй 0,2—2,5 м, дыяметрам 8—18 м. Вядомы з 1873 г. Даследаваў у 1905 г. Е.Р.Раманаў, раскапана 8 курганоў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне галавою на захад, трапляюцца пахаванні арыентаваныя на ўсход. Пад галаву адной з пахаваных жанчын пакладзена дошка. Чатыры курганы без рэчаў, у астатніх знойдзены сяміпрамянёвыя і адно сямілапчастае кольцы, гладкія і арнаментаваныя лунніцы (месячніцы), пятлістыя падвескі, кручаная шыйная грыўня з гранёнымі галоўкамі на канцах, розныя тыпы пярсцёнкаў, 2 гладкія і 1 кручаны бранзалеты, скроневыя кольцы з завітком на адным канцы, розныя пацеркі (дробны бісер, сінія шкляныя і інш.), тачыльны камень з крэмнем, ліпападобная спражка і жалезнае паясное кальцо, разбіты гаршчок. Абследаваў у 1975 г. У.У.Багамольнікаў. Могільнік датуецца 11—12 стагоддзямі, належаў радзімічам.

Матэрыялы даследавання Е.Р.Раманава захоўваюцца ў Дзяржаўным Эрмітажы ў г. Санкт-Пецярбург.

Новыя Лукі (Луцкі сельсавет). Курганны могільнік. За 2 км на У ад вёскі. 7 паўсферычных у плане насыпаў дыяметрам 4—12 м, вышынёй 1—2 м. Курганы здзірванелыя, зараслі хмызняком. Вядомы з 1873 г. Абследавала ў 1978 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Плесавічы (Кароткавіцкі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,8 км на У ад вёскі. Захавалася 5 курганоў вышынёй 1—2,5 м, дыяметрам да 15 м, 2 з іх пашкоджаны. Вядомы з 1924 г. Абследаваў у 1975 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Праскурні (Акцябрскі сельсавет). Селішча. За 0,4 км на ПдУ ад вёскі, на правым беразе р. Дняпро. Плошча 50 × 150 м. Даследавалі ў 1994—95 гг. А.І.Драбушэўскі, А.І.Штэменка. Выяўлены паўзямлянкі з печамі-каменкамі і славянская кераміка 6—7 ст., а таксама матэрыялы 8—13 ст.

Г.В.Штыхаў.

Саланое (Салонскі сельсавет). Курганны могільнік. За 1 км на Пд ад вёскі. Захаваліся 2 курганы. Вышыня аднаго 1,5 м, дыяметр 8 м, другога адпаведна 1,8 м і 10 м. Вядомы з 1893 г. У 1905 г. Е.Р.Раманаў раскапаў 10 курганоў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на спіне, галавой на захад. У большасці курганоў было па аднаму нябожчыку. У адным кургане выяўлена труна з 2 шкілетамі. Знойдзены пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы з завіткамі, буйназярністыя металічныя пацеркі, заходнееўрапейская (кёльнская) сярэбраная манета 10 ст., пярсцёнкі, шкляныя і сердалікавыя пацеркі, гаршчок з хвалістым арнаментам, абломкі урны з арнаментам у выглядзе ёлачкі і інш. Датуюцца 11 ст., належалі дрыгавічам. Абследаваў у 1976 г. У.У.Багамольнікаў.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Дзяржаўным Эрмітажы ў Санкт-Пецярбургу.

Стрэшын. Гарадзішча. На паўднёвай ускраіне пасёлка на мысе правага берага Дняпра. Пляцоўка няправільнай формы, выцягнута ўздоўж ракі. З паўднёвага боку абрываецца (амаль пад прамым вуглом), з паўночнага і заходняга — вышыня схілаў над поплавам Дняпра 20—25 м. З усходу — пакаты спуск. Даследаваў у 1966 г. Э.М.Загарульскі на плошчы 100 м^2. Культурны пласт 1,6 м. Знойдзены сланцавыя (шыферныя)

Гарадзішча на мысе правага берага Дняпра каля г.п. Стрэшын.

прасліцы, шкляныя бранзалеты, кераміка і інш. З боку поля гарадзішча мела магутныя земляныя ўмацаванні (не захаваліся). Пасяленне ўзнікла не пазней 12 ст. Мяркуецца, што гэта гарадзішча старажытнага горада Полацкай зямлі Стрэжава, які ўпамінаецца ў летапісах пад 1127—1128 гг.

Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Археалагічным музеі БДУ у Мінску.

Таўстыкі (Навамаркавіцкі сельсавет). Курганны могільнік. За 0,1 км на Пн ад вёскі, каля дамбы, у хвойніку. 12 насыпаў вышынёй 0,6—2,1 м, дыяметрам 4—8 м. Абследавала ў 1983 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Чорная Вірня (Майскі сельсавет). Курганны могільнік. За 2 км на ПдУ ад вёскі, ва ўрочышчы Мышалоўка. Захавалася 14 курганоў вышынёй 0,6—2,5 м, дыяметрам 6—15 м, зараслі рэдкім лесам. Вядомы з 1873 г. Абследаваў у 1975 г. У.У.Багамольнікаў. Раскопкі не праводзіліся.

Чырвоная Горка (Луцкі сельсавет). Паселішча-1. За 0,5 км на Пн ад вёскі, на правым беразе р. Дняпро. Культурны пласт 0,2 м. Знойдзены фрагменты грубаляпной керамікі. Датуецца 1-м тысячагоддзем н.э.

Паселішча-2. За 0,4 км на Пн ад вёскі, каля паселішча-1. Культурны пласт 0,3—0,5 м. Знойдзены фрагменты ляпнога посуду. Адносіцца да бронзавага веку.

Паселішча-3. За 1,5 км на Пд ад вёскі. Вядома з 1935 г. Абследаваў у 1981 г. Н.В.Бычкоў. Знойдзены фрагменты грубаляпной і ганчарнай керамікі.

Гарадзішча. За 2 км на ПдУ ад вёскі. Займае высокую (20—25 м над наваколлем) граду правага берага Дняпра. Пляцоўка авальная, памерам 90 × 35 м, з поўначы і ўсходу ўмацавана валам вышынёй каля 3 м і ровам глыбінёй 1 м, шырынёй 8 м. Вядома з 1935 г. Абследавалі ў 1958 г. Л.Д.Побаль, у 1978 г. Н.М.Дубіцкая. У агаленнях культурны пласт 0,15 м, знойдзены рэшткі ляпной керамікі з адбіткамі на шыйцы, насечкай па краі венчыка і штрыхамі па паверхні посуду. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку, датуецца 6 ст. да н.э. — 2 ст. н.э.

Шыхаў (Верхне-Албянскі сельсавет). Паселішча. За 0,5 км на Пн ад вёскі, на правым беразе Дняпра, на другой надпоплаўнай тэрасе. Плошча каля 2000 м^2. Выявілі ў 1966 г. У.Ф.Ісаенка і І.М.Ціханенкаў. Даследавалі ў 1971 г. У.Ф.Капыцін, у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У агаленнях сабраны каменныя прылады працы, выяўлены рэшткі 6 агнішчаў. У раскопе плошчай 50 м^2 таксама знойдзены каменныя прылады працы і рэшткі агнішча. Датуецца 8—5-м тысячагоддзямі да н.э.

Майстэрня. За 0,4 км на Пд ад могілак. Плошча 300 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Знойдзены нуклеусы, ножападобныя пласціны і адшчэпы. Адносіцца да каменнага веку. Раскопкі не праводзіліся.

Шчытнае (Пірэвіцкі сельсавет). Паселішча-1. За 3 км на З ад вёскі, ва ўрочышчы Бярозавая Града, у паўднёвай частцы астанца першай надпоплаўнай тэрасы левага бе-

рага Дняпра. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. На плошчы 50 м^2 прасочаны культурны пласт 0,1 м. Знойдзены крамянёвыя адшчэпы, ножападобныя пласціны, нуклеусы. Адносіцца да позняга мезаліту. Датуецца 6—4-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-2. За 3 км на З ад вёскі, за 250 м на Пд ад паселішча-1. Плошча 500 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1—0,15 м. Знойдзены фрагменты ляпнога посуду. Паверхня танкасценных гаршкоў упрыгожана гарызантальнымі лініямі наколаў. Знойдзены крамянёвыя адшчэпы, ножападобныя пласціны, трапецыі, фрагмент наканечніка стралы трохвугольнай формы, скрабок. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Паселішча-3. За 2,7 км на З ад вёскі, за 0,2 км на У ад паселішча-2. Плошча 50 м^2. Выявіў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. Культурны пласт 0,2 м прасочаны ў агаленнях. Знойдзены крамянёвыя прылады працы. Адносіцца да каменнага веку.

Паселішча-4. За 2,6 км на З ад вёскі, за 350 м на ПдУ ад паселішча-3. Плошча 1000 м^2. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У.П.Ксяндзоў. У культурным пласце 0,15 м знойдзены крамянёвыя ножападобныя пласціны, адшчэпы, скрабкі, наканечнікі стрэл. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4—3-м тысячагоддзямі да н.э.

Эрд (Шчадрынскі сельсавет). Курганны могільнік-1. За 250 м на З ад пасёлка, ва ўрочышчы Курганне. 116 насыпаў вышынёй 0,5—3 м, дыяметрам 5—18 м. Каля асновы курганоў прасочваюцца раўкі. Выявіла і абследавала ў 1981 г. Н.М.Дубіцкая.

Курганны могільнік-2. Мясцовая назва Напалеонаўскія Капцы. За 1,5—2 км на ПнУ ад пасёлка. 27 насыпаў вышынёй 0,5—3 м, дыяметрам 6—14 м. Могільнік зарос кустамі, насыпы здзірванелыя. Захаванасць добрая. Выявіла і абследавала ў 1981 г. Н.М.Дубіцкая.

Курганны могільнік-3. За 1,5 км на ПдУ ад пасёлка. 55 насыпаў вышынёй 0,5—3 м, дыяметрам 6—14 м. Курганы здзірванелыя, зараслі кустамі. Захаванасць добрая. Выявіла і абследавала ў 1981 г. Н.М.Дубіцкая. Раскопкі не праводзіліся.

Манетныя скарбы, знойдзеныя на тэрыторыі Жлобінскага раёна

ВЁСКА БАБОЎКА (Майскі сельсавет). Знойдзены ў 1896 г., 291 экз. (грош, 1,5-грошавікі, 6-грошавікі, орт Рэчы Паспалітай, $^1/_4$ талера іспанскіх Нідэрландаў, соліды Прусіі, 1,3 талера Саксоніі, талер Злучаных Правінцый, соліды, 1,5-грошавікі Шведскай Прыбалтыкі; білон, серабро, ухаваны ў 1651.

ВЁСКА ЗАТОН (Акцябрскі сельсавет). Знойдзены ў 1891 г., 1000 экз. (паўгрошы Вял. кн. Літоўскага; серабро), ухаваны ў 3-й чвэрці 16 ст.

ВЁСКА ЗЯЛЁНЫ КРАЖ (Луцкі сельсавет). Знойдзены ў 1962 г., 58 экз. (двайныя дынарыі, трайны грош Вял. кн. Літоўскага, 1,5-грошавікі, трайныя грошы Рэчы Паспалітай, драйпёлкеры курфюрства Брандэнбург, Прусіі, Шведскай Прыбалтыкі, $^1/_8$ талера герцагства Гольштэйн—Готтарп, трайны крэйцэр герцагства Шцірыі; білон, серабро), ухаваны ў 1648 г.

ВЁСКА НІЖНЯЯ АЛБА (Верхне-Албянскі сельсавет). Знойдзены ў 1902 г. 4 экз. (сярэбраныя манеты).

ВЁСКА ПІРЭВІЧЫ (Пірэвіцкі сельсавет). Знойдзены ў 1924, 12 экз., вядомы 4 экз. (орты Рэчы Паспалітай; серабро), ухаваны ў 1624. Знойдзены ў 1961 г., 89 экз. [орты Рэчы Паспалітай, талеры Нідэрландаў (імперскія гарады Зволле, Кампен і інш.), Злучаных Правінцый; серабро], ухаваны ў 1624 г.

ВЁСКА РАДУЦІН (Стрэшынскі пасялковы Савет). Знойдзены ў 1903 г., 7 экз. (5 кап., паўрубель, рубель Расіі; медзь, серабро), ухаваны ў 1798 г.

ВЁСКА САЛАНОЕ (Салонскі сельсавет). Знойдзены ў 1905, 1 экз. (дынарый г. Кёльна; серабро), ухаваны ў 10 ст.

ВЁСКА ШАПІЛАВА (Майскае; Майскі сельсавет). Знойдзены ў 1923 г., вядомы 4 экз. (солід, грош, 1,5-грошавік Рэчы Паспалітай, солід Шведскай Прыбалтыкі; білон, серабро), ухаваны ў 3-й чвэрці 17 ст.

Друкуецца па кн.: Гомель. Энциклопедический справочник. Мн., 1991. С. 306.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Розныя прычыны знешняга і ўнутранага характару прывялі да стварэння дзяржавы, якая атрымала назву Вялікае княства Літоўскае. Ужо ў 2-й палавіне 14 ст. ў яго склад увайшло ўсё Беларускае Падняпроўе, у тым ліку і землі сучаснай Жлобіншчыны, што размяшчаліся паміж рэкамі Бярэзіна і Днепр і па абодва яго бакі.

З красавіка 1399 г. вялікі князь ВКЛ Вітаўт выдаў віленскім канонікам даравальную грамату на Бярэзінскую зямлю паміж Стрэшынам і Рагачовам, якія існавалі ўжо пэўны гістарычны час. Стрэшын у той перыяд займаў даволі значнае месца сярод гарадоў навакольля, хаця сам насіў званне мястэчка, бо меў насельніцтва менш чым 1500 чал. Тут былі развіты рамяство і гандаль, што прыцягвала людзей з блізкіх і далёкіх месцаў. Ажыццяўляўся і бяспошлінны гандаль. На гэта, напрыклад, меў права менскі купец Церашкевіч, якому кароль польскі і вялікі князь ВКЛ Казімір IV 5 мая 1480 г. выдаў грамату — дазвол на правядзенне гэтай акцыі.

Частка насельніцтва Стрэшына займалася сялянскімі справамі. Мястэчка мела сваю гандлёвую плошчу, сваёй вядомасцю і багаццем пераўзыходзіла нават Гомель.

У 12—18 ст. існаваў Стрэшынскі замак, напачатку невялікі драўляны, які быў абкружаны валам шырынёй 10—12 м і ровам. Пад аховай замка знаходзілася неўмацаванае паселішча. У далейшым замак у Стрэшыне значна расшыраны і ўмацаваны. Паўстанні і войны 16—17 ст. паўплывалі на папаўненне замкавага арсенала. Інвентары Стрэшына за 1579, 1632 і 1635 гг. даюць уяўленне пра планіроўку і канструкцыі фартыфікацыйных збудаванняў замка, наяўнасць зброі ў яго цэйхгаўзе.

Паводле адміністрацыйнай рэформы 1564—1566 гг. Стрэшын увайшоў у склад Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ, і паколькі ім кіраваў капітул, то ён належаў да складу царкоўных мястэчак. Вядома, што ў 1570-я гады Стрэшын выплочваў капітулу за год па 25—27 коп грошаў літоўскіх.

Адміністрацыйнае кіраўніцтва ажыццяўлялася мясцовым войтам, якому дапамагалі падвойскі (намеснік), пісар і дзесяцкія. Справай апошніх было збіранне падаткаў, нагляд за выкананнем павіннасцей (паштовых, вартавых і інш.). Была свая служба кантролю за захаваннем законнасці і парадку. У 1579 г. ў Стрэшыне было 30 дамоў, драўляны замак, у якім размяшчаўся гарнізон салдат, дзейнічалі карчма і вадзяны млын.

Лівонская вайна, якую ў 1558 г. распачаў Іван IV Грозны, наклала на Стрэшын адмоўны адбітак, хоць ён і не прымаў непасрэднага ўдзелу ў ваенных дзеяннях. Мястэчка часова заняпала, і гэта з'явілася прычынай таго, што ў 1579 г. капітул не атрымаў належачыя яму 1629 грошаў.

Стрэшын, як і іншыя паселішчы на Дняпры, у даўнія часы перажываў складанасці жыцця ў парубежжы, што прыводзіла да вялікіх выдаткаў і разбурэння гаспадаркі. І ўсё ж выдаткі, асабліва на ваенныя мэты, хутка аднаўляліся, і зноў наглядаўся сацыяльна-эканамічны рост. Пра гэта сведчыць той факт, што ўжо ў 1599 г. ў Стрэшыне налічвалася каля 110 двароў, у якіх пражывала больш 500 чалавек.

У антыфеадальную вайну 1648—1651 гг. і ў вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. Стрэшын знаходзіўся ў цэнтры ваенных падзей. У ліпені 1654 г. казакі І.Залатарэнкі ўзялі горад штурмам, а замак спалілі. Пасля вайны замак быў адноўлены, аднак ранейшай магутнасці ўжо не меў і ў такім стане праіснаваў да 1793 г.

Лічыцца, што Жлобін вядзе сваё летавылічэнне з канца 14 ст. Гэта паселішча на Дняпры разам з Рагачовам належыла магнацкаму роду Хадкевічаў, прадстаўнікі якога ў 15—17 ст. займалі дзяржаўныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Старажытнае паселішча на Дняпры ўваходзіла ў склад ВКЛ, аднак з-за слабага эканамічнага развіцця не адыгрывала ніякай ролі на гандлёвых шляхах. Тым не менш, знаходзячыся ў парубежжы, яно неаднойчы падвяргалася спусташэнню.

Міждзяржаўныя канфлікты ў той час былі з'явай нярэдкай. Гэта не спрыяла ўмацаванню суседскіх адносін, вяло да знішчэння матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, тармазіла сацыяльнае развіццё краю. Для абароны ад знешніх нападаў у 15—17 ст. існаваў Жлобінскі замак, які размяшчаўся на правым беразе Дняпра, на адлегласці каля 100 м ад ўпадзення ў яго ручая Чорначка. Замак быў умацаваны земляным валам і драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі і брамамі. Ён неаднаразова пераходзіў з рук у рукі ў час вой-

наў Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1-й палавіны 16 ст. Так, у 1535 г. ў час вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ 1534—1537 гг. Жлобін і замак былі значна разбураны ў выніку аблогі Гомеля войскамі ВКЛ на чале з вялікім гетманам Ю.Радзівілам. І толькі дзякуючы нястомнай працы яго насельніцтва, хутка аднавіўся і ў 1566 г. лічыўся адным з буйнейшых пасяленняў Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства, ВКЛ.

Вялікае княства Літоўскае было дзяржавай моцнай, і тым не менш прымала меры па абароне сваёй тэрыторыі ад замахаў звонку. Таму вымушана было ўтрымліваць значнае войска. У Земскім запісу за 12 жніўня 1567 г. знаходзім: Мацей Сакалоўскі з Дзяніскавіч. Далей паведамляецца, што ён павінен быў мець з воінскай амуніцыі. Права служыць у войску Вялікага княства Літоўскага прадастаўлялася прадстаўнікам шляхецкіх родаў.

Летам 1654 г. пачалася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Цягнулася яна аж 13 гадоў, і ўвесь гэты перыяд пакутвалі людзі і паселішчы, што знаходзіліся ў парубежжы. На баку Расіі выступілі казацкія палкі (прыкладна 20 тыс. чал.) пад кіраўніцтвам І.Залатарэнкі. Войска рухалася ўздоўж Дняпра ўверх па цячэнню. Пры гэтым знішчалася ўсё, што не адносілася да Расійскай дзяржавы. Быў абложаны і ўзяты Гомель, разбураны і спалены замкі ў Горвалі, Стрэшыне, Жлобіне, іншых месцах, аб чым 15 ліпеня 1654 г. пісалася цару Аляксею Міхайлавічу.

У 1772 г. ў выніку падзелу тэрыторыі Рэчы Паспалітай усходняя частка зямель дзяржавы адышла да Расіі. З 1793 г. Жлобін у складзе Расійскай імперыі. *Т.П.Котава.*

Дакументы сведчаць

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ЛІТОЎСКАГА КНЯЗЯ ВІТАЎТА ВІЛЕНСКІМ КАНОНІКАМ НА БЯРЭЗІНСКУЮ ЗЯМЛЮ ПАМІЖ СТРЭШЫНАМ І РАГАЧОВАМ

3 красавіка 1399 г.

Мы, великий князь Витовт, даем веданье всем, кто на сей лист узозрить или слышить. Дали есмо землю кановником виленским на имя березьинская к Стрешину, што были есмо дали князю Юрью толочку от Рогачева оттойма. А в ту землю первописаную не уступатися никому, а ни рогачевцем, а ни иному кому, ниж держать кановником виленским к Стрешин [у] вечно, непорюшно, никимже.

А на то на все дали есмо на крепость сей лист и печать свою велели привесити. А писано у Троцех у четверг по велице дни под леты по рожстве господни 1000 и 300 и 9 десят и 9.

ГРАМАТА КАРАЛЯ КАЗІМІРА МІНСКАМУ КУПЦУ ЦЕРАШКОВІЧУ НА ДАЗВОЛ БЯСПОШЛІННАГА ГАНДЛЮ Ў ГАРАДАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

5 мая 1480 г.

Казимир божью милостью.

Князем нашим, и паном, и наместником, и тивуном, и бояром, и мытником, и всим заказником тот наш чоловек, мещанин менский Лука Терешкович, торгуеть нашим дубасом бобруйским троцкое половины и нашими пенязьми; а от того нам прибытку даёт. И вы бы от нашого дубаса и от его комяги мыта не брали бы. Есте в ... Стрешине ..., по всим нашим мытом, и по князским, и по панским, и по боярским, сухим и водою. А которыи бы хотели через наш лист силу ему чинити, а мыто взяти от нашого дубаса и от его комяг, тот нам великую вину заплатить...

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 261.

СКЛАД ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Земскі перапіс
1567 г.
... 5. Павет Рэчыцкі. Шляхта з Рагачова. — Месяца жніўня 12 дня.
Мацей Скакоўскі з Дзяніскавіч — конь, панцыр, прылбіца, сагайдак, шабля.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 287—288.

З БАРКУЛАБАЎСКАЙ ХРОНІКІ

Року 1592 июня, по старому 11 дня в неделю. Была брань великая, велми страшная: почавшы от западных краев, замков украинных Чернигов, Гомель, Любеч, Белая Церков, Переяславль, Стрешин, Речица, Рогачов, Крычов и иных многих мест и замков в тых всих [землех] по селах и местах и местечках немало збожя попсовала град и буря великая. А на бору, на лесе и по лугам со пчолами дерево бортное на воде угляды (?) згола, штось троха зостала, буря великая поламала; яко ж на тот час давали справу и жалосно поведали, иж дей, у водного мужа северского бортного дерева сто поломило, у другого двесте, у третьего триста, иж страшно о том слышати было; дороги каждый от села до села волостью прочищали, навет и тепер на лесах, на бору и по болотах поломатые [дерева] видети много.

Якож тот рок 92 был урожа[й]ный: [для] жита, овса, гречихи, хотя ж не росла, але добра, пшеницу иржа побила. Цена житу была таней: чверт по грошей пяти (л. 152 об.), мера жита по грошей двадцати...

Лета Божого нароженя 1595, месяца ноября 30 дня, в понеделок, за тыдень пред святым Николою — Севериян Наливайко, при нем было козаков 2000, дел 14, гаковныц [пропуск]. Место славное Могилев, место побожное, домы, крамы, острог выжгли, домов всех яно 500, а крамов з великими скарбами 400... Тепер же Литва, от козаков отступивши, до Могилева на болший луп поехали, а козаки на всю ноч схали до Быхова аж на низ (л. 154 об.). Литва за казаками гналася аж до Рогачева, да ничого згола не вчинили козаком, а Литва и Татары рушилися до Менска, до Новагорода и до Вилни, набравшися тутешнего краю лупу.

По выеханью козаков и Литвы, тогды было зиме ни зима, ни льто, ни осен, ни весна аж до месяца мая, до святаго Афанасия, снегу не было...

Року 1600. Панове волынские, панове литовские, также козаки Запорозкие, змовившися и знявшися вси вкупе. Волохи отгамовали, войска Могилево побили, армату отняли; воевода мултянский втек из Мигалем, трохи не поймали, и много за ним гонили (л. 161 об.) аж до границы мултянское. Троха ся было успокоило. За то была дана козаком лежа у Киеве; гетманом был Самуел Кошка. Лежали [козаки] у Гоми, в Речицы, в Рогачове, у Баркулабове на пристанство аж у ждали...

Того ж року 1601, месеца октября десятого дня, целую неделю снег силний и кгвалтовный ишол, выпал до полголени: также и буря силная была. Тогды пшеницы, ярицы, овес, гречиху, горохи и вси овощы, великое множество ярицы на полях непожатые, также и копы жатые снегом (л. 163) позаметала метелица, иж было жалостно и страшно гледети и выповедити уздыханя и плачу людей убогих, паншников немастных.

А так лежал тот снег 2 недели аж до Дмитровы суботы. Яко ж великих морозов река Днепр был замерз, и ездили по нем яко серед зимы. А потом за ласкою Всемилостивого Господа Бога для плачу и великого уздыханя снег ростал и река Днепр росплынулся. А потом почали жати-горовати по снегу у стужу. Были теж морозы великие, огне клали, сами грелися, иж страшно и жалосно было гледети: три—два человеки на ден ледво снопов 40 пажнут овса албо ярицы, бо велми к земли прилегло.

Люди убогие, ярь на весне жали-горевали, але вже толко для статку, а того много статками на весне сами господари свое збоже травили; маки, горохи, бобы, проса, репа — то все згола погинуло. А которые молотили ярь, зерня толко знак, а коли змелет, спечет, — то у печи испечется, а з лопаты у печ не зложит; с печи аж ополоником выберет. Также и жито велми было неумолотно. А коли муку житную у хлебе спекут, то тесто печеное солодко, а за скорину хотя ложки клади, а в печи не печется.

У восень роли (л. 164 аб.) и жито сеяли, которые старым житом, то предсе ни во што, а которые житом новым сеяли, тые ни жали. Яко ж две доле тых людей было, которых оралы и не сеяны были. На лето куповали жито чверть по грошей 35, яры по гр(ошей) 40, пшеницу куповали чверть 40 гр(ошей), овес по гр(ошей) 40, конопель чверть 20 грош(ей), горох чверть 20 гр(ошей). А тот гнев божий был и непогода, почавши от Менска до Полоцка к Витебску, до Орши, до Мстиславля, до Пропойска, до Рогачова, Могилева, Любошаны...

Того ж року 603, в месте Могилеве Иван Куцка здал з себе гетманство козацкое для того, иж у войску великое своволенство; што хто хочет, то броит ... Потом по Иване Куцку был гетманом Иван Косый. Тые козаки брали приставства у Полоцку, у Витебску, на Орши, у во Мстиславлю, у Крычове, у Могилеве, у Головчине, у Чечерску, у Гомли, у Любечу, у Речицы, у Быхове, у Рогачове и по всих местах...

Баркулабовская летопись // Могилевская старина: Сб. ст. «Могилевских губернских ведомостей». Могилев, 1900. Вып. 1.

Жлобінскія гарматы 18 ст.

Сярод шматлікіх дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь захоўваецца «Справа па адносіне Магілёўскага ўпраўлення пра дзве гарматы, знойдзеныя ў Рагачоўскім павеце ў маёнтку Вайзбуна».

Знаходка сама па сабе цікавая — старадаўнія медныя гарматы выяўлены на беларускай зямлі. Але галоўнае — адліты яны мясцовым майстрам. На гарматах цікавыя ўзоры. Значыць, гэта быў мастак высокай кваліфікацыі.

Першымі экспертамі, што агледзелі знаходкі, былі ваенныя чыноўнікі з канцылярыі магілёўскага генерал-губернатара. Паводле іх заключэння, ножная гармата «даўжынёй 1 аршын 11,5 вяршкоў, вагой 10 пудоў 19,5 фунтаў, з гербам і надпісам «года 1769 дня 19 ліпеня месяца ў Жлобіне Крыстоф Чахоўскі». Знайшлі гэтыя медныя аграмадзіны 11 верасня 1842 г. ля крыніцы Пянькі (напэўна, недалёка ад Жлобіна), ва ўладаннях Станіслава Вайзбуна. Стала вядома і імя беларускага майстра гарматнай зброі 18 ст. — Крыстоф Чахоўскі. Загадкай застаецца завод у Жлобіне, на якім мог адліваць гарматы Чахоўскі.

Які ж лёс жлобінскіх гармат? У выяўленай «Справе...» захоўваецца вялікая перапіска паміж рознымі адказнымі асобамі. Умяшаўся нават дэпартамент артылерыі ваеннага міністэрства Расіі. Было вырашана гарматы перадаць кіеўскаму арсеналу. Аднак прайшоў год, а «гарматы дагэтуль арсеналу не дастаўлены» — інфарміраваў з Кіева камандзір арсенала.

Перапіска вялася доўга, а гарматы тым часам заставаліся на месцы. Двойчы падключаўся Рагачоўскі земскі суд. Прапаноўваліся 2 варыянты перавозкі: па Дняпры або на конях пана Вайзбуна, які, дарэчы, рознымі спасылкамі адцягваў адпраўку гармат. Магчыма, ён хацеў пакінуць іх як памяць пра таленавітага майстра на Жлобіншчыне. Толькі праз 2 гады, у 1844 г., з Кіева паведамілі, што гарматы туды прыбылі. На гэтым справа са жлобінскімі гарматамі была закрыта, але іх гісторыя так і засталася нявысветленай.

Г.Каханоўскі.

«Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». № 4, 1976 г.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Па адміністрацыйнаму падзелу Расійскай імперыі 2-й палавіны 19 — пачатку 20 ст. тэрыторыя сучаснага Жлобінскага раёна знаходзілася на стыку Бабруйскага і Рэчыцкага паветаў Мінскай губерні, Гомельскага і Рагачоўскага паветаў Магілёўскай губерні. У яе ўваходзілі цалкам або часткова 2 воласці Бабруйскага павета (Сцепская і Туркаўская), 4 воласці Рагачоўскага павета (Гарадзецкая, Лукаўская, Стара-Руднянская і Стрэшынская), частка Якіма-Слабадской воласці і нязначная частка Горвальскай воласці Рэчыцкага павета. Гарадоў на тэрыторыі Жлобіншчыны тады не было. Жлобін, суседняя Карпілаўка, Стрэшын і Казіміра мелі статус мястэчак — населеных пунктаў пераходнага ад вёскі да горада тыпу, характэрнага для Беларусі. З агульнай масы сельскіх пасяленняў мястэчкі вылучаліся бойкасцю гандлю (кірмашы, крамы), складам насельніцтва (мяшчанская абшчына пераважна з яўрэяў і сялянская — з беларусаў) і наяўнасцю мяшчанскіх управ (з 1870-х гадоў).

Асаблівым і вельмі рэдкім тыпам паселішча быў Шчадрын. Як вядома, царызм увёў шмат розных забарон для яўрэяў, у тым ліку не дазваляў ім сяліцца ў сельскай мясцовасці і набываць там зямлю. З іншага боку, царскія ўлады тройчы, 9 снежня 1804 г., 13 красавіка 1835 г. і 26 снежня 1844 г., прымалі законы аб дазволе яўрэям пераходзіць да сельскагаспадарчай працы. Пры гэтым прадугледжвалася надзяленне жадаючых казённымі землямі, ільготы — вызваленне ад падаткаў і рэкруччыны на 10—25 гадоў, дапамога і г.д. Адведзеная зямля не падлягала продажу і здачы ў арэнду людзям не іудзейскага веравызнання. Так, у 1842 г. ўзнікла Сяліба — яўрэйская земляробчая калонія побач са Шчадрыным. У 1898 г. ў карыстанні каланістаў (274 сям'і, 1558 чалавек) было 1700 дзес. зямлі. Усяго ў Шчадрыне згодна з перапісам 1897 г. жыло 4234 чалавекі, у тым ліку 4022 яўрэі.

На працягу стагоддзяў Жлобіншчына заставалася пераважна сельскагаспадарчым

краем. Зямля і лясныя багацці кармілі людзей.

Яшчэ да адмены прыгоннага права элементы капіталістычных адносін праяўлялі сябе ў сельскай гаспадарцы. Для таго, каб атрымаць таварную сельгаспрадукцыю і грошы, павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў памешчыкі імкнуліся пашырыць свае запашкі за кошт скарачэння сялянскіх зямель і ўзмацнення баршчыны. У 1847 г. Магілёўскі губернскі камітэт, які займаўся пытаннямі інвентарызацыі памешчыцкіх маёнткаў, разгледзеў інвентар памешчыка Вайзбуна, уладальніка мястэчка Жлобін. У акце ўказвалася, што з 4000 дзесяцін зямлі ўвогуле за сялянамі лічыцца 1390 дзесяцін (гэта ворная, прысядзібная зямля і сенажаці), у памешчыка — 384 дзесяціны. Астатняя зямля — гэта лясы, азёры, рэкі і балоты. На прыдатных для землекарыстання землях пасвілі сялянскую і памешчыцкую жывёлу. Лясы знаходзіліся ў распараджэнні памешчыка. На цягло прыходзілася 0,5 дзесяціны прысядзібнай, 9 дзесяцін ворнай зямлі і 1,5 дзес. сенажаці. У акце адзначалася, што павіннасці сялян перавышалі норму на 6 руб. 9 кап. серабром. Для жыхароў Жлобіна, якія займаліся рамяством, дробным гандлем і адначасова апрацоўвалі агароды, выдзялялася па 0,5 дзесяціны прысядзібнай зямлі і па 1 дзесяціне сенажаці. З іх таксама збіраліся павіннасці, якія перавышалі норму на 4 руб. 28 кап. серабром. Акрамя гэтага сяляне павінны былі з кожнага двара аддаваць памешчыку па 2 курыцы, 20 яек і 100 штук грыбоў. Па выніках інвентарызацыі 29.9.1847 г. была прынята пастанова губернскага камітэта, у якой было вырашана галоўныя павіннасці для сялян вызначаць у тым выглядзе, у якім яны вызначаны ў інвентары, замест дадатковых павіннасцей вызначыць 28 дзён вупражных і столькі ж пешых у год, а грашовы падатак па 4 руб. з цягла і даніну не здымаць. Натуральныя і дадатковыя павіннасці з агароднікаў ліквідаваць, замест іх даць права ўладальніку зямлі атрымліваць ад іх 7 руб. серабром з участка ці адслужыць узамен 35 дзён вупражных і 36 пешых.

Маніфест 19 лютага 1861 г. аб вызваленні памешчыцкіх сялян ад прыгону і Агульнае палажэнне аб сялянах, якія выйшлі з прыгону, на паўстагоддзя вызначылі лёс краю і яго жыхароў. Па трапнаму выразу гісторыка Усевалада Ігнатоўскага, «парваўся вялікі ланцуг прыгону, адным канцом ён лёгка пагладзіў пана, а другім канцом моцна ўдарыў па вызваленым мужыку». Самі сяляне ацанілі царскую міласць так: «Ад прыгону аслабанілі і зноў пад пана пасадзілі».

Зямельнае пытанне было вырашана на карысць памешчыкаў. Згодна з «Агульным палажэннем» за імі прызнавалася права ўласнасці на ўсе дарэформенныя памешчыцкія землі, аднак частка іх адводзілася былым прыгонным сялянам за выкуп. У выніку дваранскае землеўладанне захавалася па-ранейшаму, а сяляне атрымалі асабістую свабоду і зямельныя надзелы, за якія яшчэ працяглы час выплочвалі былым прыгоннікам і іх нашчадкам грашовы выкуп.

Ажыццяўленне сялянскай рэформы 1861 г. на Беларусі і Літве адрознівалася ад агульнарасійскага. Справа ў тым, што царызм, напалоханы паўстаннем 1863 г., пайшоў на значныя ўступкі беларускім сялянам, бо засцерагаўся, каб нацыянальна-паўстанцкі рух не спалучыўся з хваляй сялянскіх выступленняў. Таму, у адпаведнасці з указамі імператара Аляксандра II ад 1 сакавіка і 2 лістапада 1863 г. ў беларуска-літоўскіх губернях датэрмінова спыняліся часоваабавязаныя адносіны, сяляне пераводзіліся ў разрад «уласнікаў» і на 20% зніжаліся выкупныя плацяжы. Былі зроблены і іншыя ўступкі, у тым ліку пацверджана права сялян на сервітуты. З прычыны гэтых паслабленняў на карысць мясцовых сялян, значная іх маса засталася ў баку ад паўстання. На Жлобіншчыне яно амаль што не адчувалася. Але сваёй мэты царызм дасягнуў толькі часова. Аграрнае пытанне засталося асноўным фактарам эканамічнага і грамадскага жыцця.

У тагачасных умовах Беларусі толькі надзел у 15—20 дзес. мог забяспечыць самастойнае вядзенне і адносны дабрабыт сялянскай гаспадаркі. Так, у пачатку 20 ст. прадстаўнікі сялян у Бабруйскім павятовым камітэце аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці заяўлялі, што яны «занадта цесна жывуць; для паспяховага вядзення гаспадаркі прызнаюць неабходным мець на двор не менш 15 дзесяцін зямлі». Дарэчы, і палеткі на Жлобіншчыне не былі такімі ўрадлівымі.

Велічыня сярэдняга надзелу ў цэлым па Беларусі з 1877 па 1905 г. паменшылася ў 1,4 раза — з 14,6 да 10,2 дзес. Асабліва пагоршылася становішча сялян у Магілёўскай губ., дзе сярэдні памер надзела скараціўся з 11,9 да 8,2 дзес. і ў Мінскай — з 17,2 да 9,1 дзес. На Магілёўскую губ. прыходзіўся і найбольш высокі працэнт малазямельнага, з надзелам да 15 дзес., сялянства — 97,6% агульнай колькасці двароў.

Апрача надзельнай зямлі, якую сяляне атрымалі пасля адмены прыгону і за якую выплочвалі выкуп, сяляне маглі мець і так званую купчую зямлю — зямлю набытую за грошы — уласныя або пазычаныя ў Сялянскім Пазямельным банку. З кожным годам плошча такіх купчых сялянскіх земляў на Беларусі няўхільна ўзрастала. Так, з 1877 па 1905 гг. яна павялічылася з 193 153 да 1 613 470 дзес., або ў 8,4 раза.

Шырокае распаўсюджанне ў беларускай вёсцы атрымала арэнда сялянамі пазанадзельнай, галоўным чынам памешчыцкай, зямлі.

Нягледзячы на сялянскія надзелы, магчымасць арэнды ці набыцця купчай зямлі, зямельны голад заставаўся асноўнай прыкметай беларускай вёскі. Сялянскія сем'і павялічваліся хутчэй, чым эканамічныя магчымасці сялянскіх гаспадарак.

І пасля адмены прыгоннага права працягвалася шматвяковая сялянская барацьба «за зямлю і волю». Так, вясной, 1864 г. хваля выступленняў супраць выкупных плацяжоў ахапіла Рагачоўскі павет. У Стрэшынскай воласці сяляне 6 вёсак адмовіліся ад унясення выкупных сумаў. Дзеля ўціхамірвання вяскоўцаў у воласць была накіравана рота салдат на чале з палкоўнікам Набокавым.

Пасля адмены прыгоннага права памешчыкі былі вымушаны весці сваю гаспадарку цалкам на капіталістычнай аснове. Не ўсім гэта было пад сілу. Адны разараліся, не здолеўшы перабудаваць жыццё ў сваіх маёнтках, другія змаглі прыстасавацца да замены бясплатнай працы прыгонных на працу наёмных работнікаў. Даходнасць большасці памешчыцкіх маёнткаў складалася з прыбыткаў ад паляводства, жывёлагадоўлі, лясной гаспадаркі і некаторых іншых, больш дробных галін. Такая шматгаліновасць надавала дваранскім гаспадаркам эканамічную ўстойлівасць.

З дапамогай архіўных дакументаў можна прывесці тыповыя прыклады памешчыцкай гаспадаркі. 12 ліпеня 1894 г. ў фальварку Сцепах памёрла ўдава Канстанцыя Прушаноўская, 77 гадоў, прыхажанка Бабруйскага касцёла і была пахавана на мясцовых могілках. Адна з двух яе дачок — Марыя, у той час ужо валодала маёнткам Новы Двор — былой часткай маёнтка Старыя Сцепы. Муж Марыі, Станіслаў Рамуальдавіч Мурашка звярнуўся за пазыкай у Мінскае аддзяленне Дзяржбанка, каб «купить живой инвентарь для откармливания такового, улучшить породу скота для молочного хозяйства и увеличить севооборот и осушку сенокосов». Маёнтак меў 130 дзес. ворыўнай зямлі, 90 дзес. сенажаці, 10 дзес. пашы і 260 дзес. пад лесам. Штогод засявалася 30 дзес. пад жыта, 14 дзес. пад авёс, 3 дзес. пад ячмень, 8 дзес. пад бульбу і 5 дзес. пад грэчку. Сена атрымлівалі прыкладна 8 тыс. пудоў. 40 дзес. ворыва здавалі ў арэнду за грошы — 180 руб. Мелі 76 галоў жывёлы, у тым ліку 12 коней і 35 кароў, агарод і фруктовы сад. Прыбытак у 1893 г. склаў 2590 руб., а выдаткі — 3155 руб., у тым ліку 475 руб. на наём 11 парабкаў (па 35—50 руб. кожнаму), 1300 руб. на набыццё 35 кароў (коштам 25—40 руб.), 600 руб. — за 12 коней. У сакавіку 1895 г. агульны кошт маёнтка Новы Двор ацэньваўся ў 5952 руб. Дарэчы, пазыку памерам 2 тыс. руб. на развіццё гаспадаркі С.Р.Мурашка атрымаў.

Не заўсёды прыбытак залежыў ад памераў маёнтка. У тым жа Бабруйскім павеце прадстаўнік таго ж рода Прушынскіх — Езехіль Альбертавіч Прушынскі — валодаў маёнткам Бельчо з фальваркамі Робертава і Наталін. У маёнтку было 210 дзес. ворыва, каля 300 дзес. сенажаці, 50 дзес. пашы і 4100 дзес. пад лесам. Дзяржалі 75 коней і 150 галоў буйной рагатай жывёлы. Агульны кошт маёнтка Бельчо ацэньваўся ў 44 960 руб., але прыбытку ў 1895 г. ён даў усяго 1500 руб. пры выдатках у 870 руб.

Некаторыя памешчыкі змаглі ператварыць свае маёнткі ва ўзорныя гаспадаркі. Такім быў маёнтак Асцерманск. У пачатку 20 ст. ім валодаў Міхаіл Францавіч Макржыцкі. Гаспадарка вялася арандатарам. Зямлі было 6565 дзес., у тым ліку сядзібнай і агароднай — 149 дзес., пад садам — 4 дзес., ворыва — 1200 дзес., пашы — 60 дзес., лугоў заліўных — 320 дзес., незаліўных — 655 дзес., лесу — 3100 дзес., няўдобіцы — 1068 дзес. Маёнтак падзяляўся на 4 фальваркі. У якасці рабочай жывёлы выкарыстоўваліся 40 коней. Буйная рагатая жывёла — 55 кароў — уяўляла помесь мясцовай пароды з халмагорскай. Дзейнічалі крухмальны завод, які штогод перарабляў да 120 тыс. пудоў бульбы, і 2 вадзяныя млыны. З канца 19 ст. Асцерманскам валодала Адэлаіда Аляксандраўна Друцкая-Саколінская, а гаспадарку вёў яе муж, князь М.М.Друцкі-Саколінскі. У 1917 г. ў маёнтку было 2323 дзес. зямлі, 2 вінакурных, дражджавы і малочны заводы, кузня, колавая майстэрня, паравая малатарня. Статак налічваў 287 галоў, у тым ліку 72 кані і 88 кароў. Уся гаспадарка вялася наёмнымі рабочымі і служачымі (63 чалавекі). На збор ураджаю наймаліся дадатковыя працаўнікі. Сярэдняя ўраджайнасць з дзесяціны складала 132 пуды жыта, 1000 пудоў бульбы, 95 пудоў аўса.

Маёнтак Чырвоны Бераг на працягу 19 ст. некалькі разоў мяняў гаспадароў. Так,

25.5.1824 г. ў памешчыка Іосіфа Фаміна яго набыў Іван Грыневіч. Апошні ў 1867 г. прадаў Чырвоны Бераг (965 дзес. зямлі, бровар і карчма, якая штогод давала 100 руб. прыбытку) за 6200 руб. палкоўніку бабруйскай крапасной артылерыі Аляксандру Іванавічу Багародскаму. Дарэчы, сам І.Грыневіч у той час жыў у Францыі. Праз дзесяць год ў А.І.Багародскага маёнтак (847 дзес.) набыў інжынер генерал-маёр Міхаіл Сямёнавіч Гатоўскі. Жыў генерал у Санкт-Пецярбургу, а ў маёнтку гаспадарыў яго павераны Іосіф Юр'евіч Райкевіч. У канцы 19 ст. ўладальніцай Чырвонага Берага стала Марыя Міхайлаўна Паклееўская-Козел. Пры ёй статак буйной рагатай жывёлы дасягнуў 200 галоў (помесь мясцовай пароды са швейцарскай), меўся пладовы сад на 8 дзес., да 1000 дзес. зямлі здавалася ў арэнду. Агульная плошча маёнтка складала 12 700 дзес. А сяляне суседніх вёсак Чырвоны Бераг і Чырвонабярэжская Слабодка мелі ў сваім распараджэнні ў 1900 г., адпаведна, 633 і 349 дзес. зямлі.

Вельмі прыбытковым заняткам памешчыкаў было ўтрыманне вінакурных заводаў. Такія заводы мелі маёнткі Чырвоны Бераг, Пірэвічы, Старая Рудня, Асцерманск.

Высокім узроўнем тэхнічнага ўзбраення вызначаўся маёнтак Старая Рудня памешчыка А.П.Войніч-Сяножацкага. У канцы 19 ст. ён пабудаваў лесапільны завод з лакамабілем. Дзейнічалі сенапрасавальны завод (у 1909 г. 40 рабочых, рухавік у 10 к.с., гадавая вытворчасць 20 400 руб.) і завод па вырабу чарапіцы (у 1909 г. 30 рабочых, рухавік 40 к.с., гадавая вытворчасць 4860 руб.). Сенапрасавальны завод меў у маёнтку Пірэвічы і памешчык А.А.Раговіч (у 1909 г. 35 рабочых, рухавік 8 к.с., гадавая вытворчасць 34 тыс. руб.).

Былі развіты рамесныя промыслы. Жлобін з'яўляўся вядомым цэнтрам па вырабу сельскагаспадарчых прылад. Усё пачалося ў 1890-х г., калі адзін жлобінскі каваль выпісаў з Рыгі плуг, разабраў яго на часткі, а потым пачаў рабіць гэтак жа па ўзору. Праз дзесяць год вырабам плугоў у Жлобіне займаліся 5 майстэрняў (20 рабочых). Плугі выраблялiся двух тыпаў: цалкам жалезныя і з некаторымі драўлянымі часткамі. Першыя ішлі на продаж па 3—3,5 руб. Больш танныя з драўлянымі часткамі каштавалі не больш 3 руб. Збыт быў наладжаны на месцы, а таксама ў Бабруйску і Рагачове. Падручны каваля пры 14-гадзінным працоўным дні атрымліваў 4 руб. ў тыдзень. Жлобінскія кавалі працавалі выключна на патрэбы сялян.

Стара-Руднянская воласць была вядома бондарамі. Штогод гэта магло даць селяніну да 20 руб. прыбытку. Саматужнікі сяла Лугавая Вірня рабілі на заказ скрыні і куфары, зараблялі ў год 80—100 руб. У в. Праскурні рабілі сялянскую мэблю: сталы, лавы, зэдлікі, крэслы, шафы. Іх заробак складаў 15 руб. У той жа вёсцы працавала цагельня, там можна было зарабіць да 100 руб. у год.

Рамесныя промыслы, адыходніцтва забяспечвалі сялян работай, дазвалялі атрымліваць дадатковы даход і кампенсаваць такім чынам вынікі існуючага малазямелля.

Галоўнымі сельскагаспадарчымі культурамі на Жлобіншчыне ў 2-й палове 19 ст., як і раней, былі жыта, авёс, грэчка, ячмень, бульба, зрэдку азімая пшаніца. Высокія ўраджаі давалі лён і каноплі. Да 1900 г. ў Рагачоўскім павеце, куды ў той час уваходзілі жлобінскія землі, сярэдні ўраджай жыта складаў 4 $^{1}/_{8}$ пуда, аўса — 9 $^{3}/_{4}$, ячменю — 4, грэчкі — 1 $^{1}/_{2}$, бульбы — 50 $^{1}/_{6}$, сена — 112 пудоў з дзесяціны.

Унутраны рынак Жлобіншчыны складалі кірмашы, базары і крамны гандаль. Самы буйны, Пакроўскі кірмаш праходзіў з 1 кастрычніка ў Жлобіне і доўжыўся 2 тыдні. На кірмашы гандлявалі збожжам, ільном, мясам і іншымі таварамі. У 1861 г. прывоз тавараў склаў па суме 6854 руб., а продаж — 1500 руб. Вызначаўся Жлобін і як прыстань на Дняпры. Невялікая прыстань была і ў Стрэшыне.

Як і ва ўсёй Беларусі, развіццё капіталістычных адносін ішло пры наяўнасці многіх пережыткаў феадалізму. Значная частка сялянства бяднела, пралетарызавалася. Адначасова расла колькасць заможных сялян, якія вялі таварную гаспадарку, адначасова займаліся ліхвярствам, пазычалі беднякам грошы пад вялікія працэнты (20—30%). Кулакі жлобінскіх вёсак трымалі крамы, будавалі або арэндавалі млыны, маслабойні, грыбаваркі, вінакурні і іншыя дробныя прадпрыемствы.

У 2-й палавіне 19 ст. Жлобін быў невялікім мястэчкам. «Жыхароў у мястэчку ў 1880 г. лічылася 904 душы мужчынскага і 1064 жаночага полу. Усе пабудовы былі драўляныя. Дамоў 392, лавак 67, праваслаўная царква пабудавана ў 1863; ... і 5 яўрэйскіх малітоўных школ», — запісана ў А.С.Дэмбавецкага ў «Апісанні прамысловых і населеных пунктаў Магілёўскай губерні за 1880—

Жлобін канца 19 ст. Вуліца Галоўная.

1881 гг.». Галоўным заняткам жыхароў мястэчка па-ранейшаму заставалася земляробства, мелася толькі некалькі невялікіх самастойных прадпрыемстваў (у т.л. цагельны завод, які даваў у год 100 тыс. штук цэглы; 4 рабочых). Скураная майстэрня з такой жа колькасцю рабочых апрацоўвала ў год да 150 шкур. Былі таксама крупарушка з валавым даходам 500 руб. у год, а таксама абутковая, шорная і шавецкая майстэрні.

Жлобінскі чыгуначны вузел

Значны ўплыў на эканоміку Беларусі 2-й паловы 19 ст. — пачатку 20 ст. аказала інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва, якое адлюстроўвала асаблівасці развіцця капіталізму ў Расіі. Будаўніцтва чыгунак выклікалася пошукам знешніх рынкаў збыту прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама дыктавалася ваенна-стратэгічнымі меркаваннямі, палітычнымі абставінамі. Блізкасць Беларусі да найбольш развітых раёнаў поўдня, цэнтра і паўночнага захаду Расіі таксама была ўмовай для больш хуткага ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі будаўніцтва чыгунак. Магчыма нават сказаць, што менавіта чыгункі як лакаматыў пацягнулі за сабой беларускую гаспадарку. Жлобіншчына належала да тых рэгіёнаў Беларусі, дзе гэты ўплыў адчуўся ў поўнай меры.

З мэтай павелічэння вывазу сельскагаспадарчай прадукцыі на экспарт праз Балтыйскае мора была пабудавана Лібава-Роменская чыгуначная магістраль (1869—74 гг.). У лістападзе 1873 г. пачаўся рэгулярны чыгунач-



Панарама будаўніцтва чыгункі ў Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музсі.

ны рух на ўчастку Бабруйск—Гомель, які прайшоў праз Жлобіншчыну. У Жлобіне пабудавалі станцыю з вакзалам і дэпо на 9 цягнікоў. Да прыстані вяла чыгуначная ветка ў 350 сажэняў. Другая чыгуначная ветка (пабудавана ў 1892 г.) ішла на вайсковую сенапрасавальню, адкуль сена везлі ў Дзвінск, Коўна, Сувалкі і г.д.

Будавала і пачало эксплуатацыю Лібава-Роменскай чыгункі прыватнае акцыянернае таварыства. Але потым яе выкупіла дзяржава, і з 1 мая 1891 г. чыгунка стала казённай.

У паравозным дэпо працавала 96 рабочых. Усяго ж на станцыі Жлобін налічвалася да 500 работнікаў. Склад чыгуначнікаў быў неаднародны па кваліфікацыі і сацыяльным паходжанні. 65,5% былі выхадцамі з сялян, якія прыйшлі на чыгунку з вёсак Саланое, Малевічы, Лукі, Папаратнае, Шыхаў, Папкі (в. Акцябр) і інш. Па кваліфікацыі яны падзяліліся на 3 групы: служба шляху і пабудоў, служба руху і тэлеграфа, служба рухомага складу і цягі. Да трэцяй групы адносілася цягніковая абслуга (машыністы, памочнікі і качагары), аглядчыкі і змазчыкі вагонаў, рабочыя чыгуначных майстэрняў і дэпо. На пачатку 20 ст. многія з іх былі ўжо патомнымі рабочымі, працоўны стаж якіх складаў 10—20 гадоў.

У майстэрнях і дэпо рабочы дзень быў 10—11 гадзін, паравозныя брыгады працавалі да 16 гадзін. У першыя гады (1873—1900) заработная плата чыгуначнікаў была параўнальна высокай. Гадавы заробак начальніка станцыі складаў 900 руб., трох яго памочнікаў 480—540 руб., білетны касір атрымліваў 360 руб., сцэпшчык цягнікоў 300 руб., стрэлачнік 144—240 руб., пуцявы майстар 480 руб. Дзеля параўнання скажам, што пара скураных ботаў у той час каштавала 4—7 руб. Але з цягам часу заробак чыгуначнікаў значна знізіўся.

Станцыя Жлобін была звязана з важнейшымі эканамічнымі цэнтрамі Расіі — Масквой, Санкт-Пецярбургам, Кіевам, Варшавай, а таксама з прыбалтыйскімі портамі Рыгай і Лібавай.

Магілёўскі губернатар у аглядзе за 1885 г. падкрэсліў: «Местечки, которые прежде были удалены от торговых путей и находились в торговле на самой низкой ступени, с проведением железных дорог и устройством возле них вокзалов, начали развивать свои торговые обороты и видимо улучшаться, как например местечко Жлобин Рогачевского уезда, расположенное при р. Днепре: с устройством в нем станции Либаво-Роменской железной дороги, повлекшим за собой и перевод туда бывшей в г. Рогачеве судоходной пристани, Жлобин стал быстро расти, отпускная торговля его сильно увеличилась, а торговое значение Рогачева упало».



Паравоз Лібава-Роменскай чыгункі. Канец 19 ст.

Такім чынам, Жлобін адразу зрабіўся транспартным вузлом на перакрыжаванні чыгункі і воднага шляху. Па р. Дняпро везлі муку, селядцы, сушаную рыбу, газу, скуры, вапну, будаўнічы камень. Уніз па цячэнню, на поўдзень галоўным чынам лес і лясныя матэрыялы, з поўдня — цукар, пшаніцу, соль. Шлях непаравых суднаў ад Жлобіна да Рагачова і назад займаў аднолькавы час — суткі, ад Жлобіна да Рэчыцы — 3 сутак, назад — да 6 сутак. Паравыя судны ішлі прыкладна ў 2 разы хутчэй. У 1909 г. па чыгунцы прыбыло 0,6 млн. пудоў грузаў, адпраўлена — 0,5, па воднаму шляху адпаведна 0,2 і 0,1 млн. пудоў.

У пачатку 1890-х г. быў складзены праект чыгункі ў 1024 вярсты: Кіеў — Чарнобыль— Жлобін — Рагачоў — Магілёў — Шклоў — Орша — Віцебск — Вялікія Лукі — Пецярбург. З чыгункай Лібава—Ромны яна была павінна злучыцца на станцыі Салтанаўка і забяспечыць шлях ад Пецярбурга да Кіева праз

Чыгуначны вакзал на станцыі Жлобін, пабудаваны ў 1902 г.

Магілёў. Агульны кошт будаўніцтва вызначаўся ў 55,5 млн. руб. Гэты праект не быў здзейснены. Аднак у снежні 1902 г. пачаўся рэгулярны рух па лініі Віцебск—Жлобін (262 вярсты). Чыгуначную сувязь апошнім сярод беларускіх губернскіх гарадоў атрымаў Магілёў, Жлобін стаў чыгуначным вузлом. Агульны кошт будаўніцтва новай чыгуначнай лініі склаў каля 18 млн. руб. (больш 60 тыс. руб. на вярсту). На станцыі Жлобін падоўжылі пасажырскую платформу.

У 1900 г. вайсковае ведамства дамагалася будаўніцтва Усходне-Палескай чыгункі ад Жлобіна да станцыі Шапятоўка, але здзейсніць план перашкодзіла руска-японская вайна. Потым абмяркоўваліся планы будоўлі сіламі чыгуначных войск лініі Жлобін—Кіеў праз Чарнігаў.

Інжынер шляхоў зносін І.І.Бернатовіч з Пецярбурга арганізаваў «Контору по изысканиям Жлобін — Старо-Константинов — Полонное — Жмеринка». Пошук па трасе будучай чыгункі вёўся ў 1909—10 гг. пры падтрымцы Санкт-Пецярбургскага Міжнароднага, Руска-Кітайскага і Паўночнага банкаў. 16.3.1910 г. за будаўніцтва магістралі выказаўся Савет Міністраў. «Заслуживающим внимания и весьма желательным к осуществлению» прызнаў праект і штаб Кіеўскай ваеннай акругі. 16.6.1910 г. Пецярбургскі Міжнародны банк адкрыў І.І.Бернатовічу крэдыт у памеры 5 тыс. руб. «для окончания им проекта».

Будучая чыгунка (407 вёрст) магла скараціць шлях з Пецярбурга да Кіева на 150 вёрст і з Пецярбурга да Адэсы на 200 вёрст. Зацікаўлена абмяркоўвала праект грамадскасць. У кастрычніку 1910 г. Мінскі губернскі камітэт па справах земскай гаспадаркі вырашыў «присоединиться к ходатайствам городов, земств, сельскохозяйственных обществ и промышленных групп о скорейшем осуществлении этой магистрали». Тагачасныя газеты нават пачалі называць праект часткай будучай «Славянскай чыгункі», якая «составит необходимое звено в прямом пути в Южные славянские земли».

Згодна з гэтым праектам Жлобін меў магчымасць атрымаць дадатковы моцны штуршок для развіцця. Але і без гэтага значэнне жлобінскага чыгуначнага вузла павышалася з кожным годам. Так, па звестках газеты «Северо-Западный голос» па лініі Пецярбург — Віцебск — Жлобін — Бахмач — Кіеў — Адэса з вясны 1911 г. штотыднёва сталі хадзіць вагоны-лядоўні.

У лістападзе 1902 г. жыхары Жлобіна і Карпілаўкі звярнуліся да магілёўскага губернатара з прашэннем, каб абодвум мястэчкам былі нададзены гарадскія правы. Супраць выступілі жыхары сялянскага саслоўя, яны не хацелі плаціць падаткі на гарадское самакіраванне і ўтрыманне паліцыі. 9.10.1906 г. ўлады вырашылі пакінуць хадайніцтва «без последствий».

Тым не менш, жлобінскі транспартна-чыгуначны вузел станоўча ўплываў на эканамічнае жыццё. У 1906 г. пачало дзейнічаць Жлобінскае пазыкова-ашчаднае таварыства (у 1913 г. 674 члены, выдана пазык на 145 431 руб.), у 1910 г. — Жлобінскае гандлёва-прамысловае таварыства ўзаемнага крэдыту (у 1914 г. 307 членаў, асноўны капітал 18 тыс. руб., гадавы абарот 10 млн. руб.), з 1913 г. — Жлобінскае крэдытнае таварыства (658 членаў, выдана пазык на 42 879 руб.).

Дзейнічалі з 1908 г. пазыкова-ашчаднае таварыства ў Стрэшыне (у 1913 г. 290 членаў, выдана пазык на 49 579 руб.), з 1912 г. — Стара-Руднянскае таварыства спажыўцоў.

У пачатку 1910 г. работу Лібава-Роменскай чыгункі правярала падкамісія Міністэрства шляхоў зносін Расіі. У акце камісіі было запісана, што станцыя Жлобін з'яўляецца станцыяй агульнага карыстання для Лібава-Роменскай і Рыга-Арлоўскай чыгунак. Прапускная здольнасць станцыі за 1909 г. (цягнікоў): няцотных — 15 з 705 вагонамі ў суткі, цотных — 14 з 655 вагонамі за суткі. Грузааварот за 1909 г.: нагружана сродкамі станцыі — 965 979 пудоў, перагружана — 4 836 085 пудоў, выгружана — 2 486 746 пудоў. Адзначалася, што ў Жлобіне на Рыга-Арлоўскую чыгунку перадаецца значная колькасць каменнага вугалю, газы, збожжа для Пецярбурга, Рыгі і іншых буйных цэнтраў Прыбалтыйскага краю. На ўчастку ад Жлобіна да Мінска да перавозкі прымаецца менш збожжа, затое значна павялічваецца колькасць лесаматэрыялаў. Гэты ўчастак з'яўляецца цэнтрам лясной прамысловасці Лібава-Роменскай чыгункі. Падкрэслівалася, што на станцыі Жлобін была дастатковая колькасць складоў і складскіх памяшканняў, меліся вагі для тавараў і багажу, у тым ліку вагонныя (2 штукі). Пры станцыі быў створаны таксама асобны парк пуцей па запасе вагонаў. У акце камісіі адзначалася таксама, што вышэйапісаная станцыя — гэта ёсць, менавіта, стары Жлобін, акрамя якога існуе яшчэ станцыя Новы Жлобін. Праект перабудовы станцыі Жлобін быў зац-

Паравоз СУ250-43, установлены ў сувязі са 120-годдзем з дня адкрыцця чыгуначнага руху праз ст. Жлобін (1873—1993), у гонар працоўных чыгуначнага вузла.

верджаны Інжынерным Саветам. На станцыі Жлобін знаходзіліся асноўнае дэпо жлобінскага ўчастка цягі для рамонту, стаянкі і прамыўкі паравозаў, а таксама майстэрня (механічнае, інструментальнае і машыннае аддзяленні), якая выконвала работы па рамонце цягнікоў, пасажырскіх і таварных вагонаў. На станцыі Новы Жлобін было 6 жылых дамоў і адна казарма.

Асвета

Да канца 1860-х г. на тэрыторыі Жлобіншчыны амаль адсутнічалі навучальныя ўстановы, за выключэннем некалькіх царкоўна-прыходскіх школ з 1—2-гадовым тэрмінам навучання. У школах вучыліся дзеці дваран, купцоў, духавенства. З 1864 г. пачалі адчыняцца пачатковыя народныя вучылішчы.

Сістэма народнай адукацыі Жлобіншчыны ў 2-й палове 19 ст. абмяжоўвалася царкоўна-прыходскімі школамі, школамі граматы (з 1884 г.) і народнымі вучылішчамі. Яўрэйскія падлеткі вучыліся ў так званых хедарах, дзе атрымлівалі першапачатковае рэлігійнае выхаванне і грамату.

Найбольш высокі ўзровень падрыхтоўкі давалі народныя вучылішчы. Утрымліваліся яны за кошт казны і мясцовых збораў. У вучэбную праграму ўваходзілі 4 прадметы: Закон Божы, чытанне і пісьмо на рускай мове, першыя чатыры дзеянні арыфметыкі і царкоўныя спевы. Настаўніцкае жалаванне, як тады называлі заработную плату, складала ад 250 да 360 руб. у год.

Аднакласныя і двухкласныя вучылішчы падпарадкоўваліся Міністэрству народнай адукацыі. Такія вучылішчы існавалі ў Жлобіне, вёсках Антонаўка, Бабоўка, Вялікія Рагі, Дзяніскавічы, Заводдзі, Затон, Зломнае, Істопкі, Калыбаўка, Кругавец, Лукі, Малевічы, Мормаль, Нівы, Пірэвічы, Папкі (зараз Акцябр), Праскурні, Саланое, Святое, Селіванаўка, Скепня, Цупер, Чацвярня, мястэчку Стрэшын.

Царкоўна-прыходскія школы і школы граматы знаходзіліся ў распараджэнні Святога Сінода і падпарадкоўваліся мясцовым настаўніцкім саветам. Узровень падрыхтоўкі ў іх быў ніжэй, чым у народных вучылішчах, аднак асновы пісьменнасці магчыма было атрымаць і там. У «Памятнай кніжцы Віленскай навучальнай акругі» за 1880/81 навучальны год ёсць звесткі пра адкрыццё народнага вучылішча ў мястэчку Жлобін: «Жлобінскае народнае вучылішча Лукаўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні адчынена ў 1868 г., размяшчаецца ў грамадскім будынку. На ўтрыманне вучылішча адпускаецца 145 руб. ад мясцовага сялянскага таварыства і 205 руб. з дзяржаўнай казны. Навучэнцаў 39 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак».

У 1870 г. было адчынена земскае вучылішча ў мястэчку Стрэшын. На ўсю Стрэшынскую воласць яно было адзіным, а толькі ў

самім мястэчку ў той час пражывала больш за 2500 чалавек.

15.10.1875 г. было адчынена народнае вучылішча ў пасёлку Лукі. Навучэнцаў ва ўзросце ад 9 да 14 год было 21 чалавек, усе хлопчыкі. Навучанне было платным, частку плацілі бацькі, астатняе за кошт земства і казны. На ўтрыманне вучылішча 250 руб. выдзяляла казна, 145 руб. уносіла сялянскае таварыства. Першым настаўнікам быў выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі Міхаіл Палікарпавіч. Яму выдаткоўвалася 200 руб. у год жалавання і кватэра ад таварыства. У 1877—1905 гг. Лукаўскую школу наведвалі ад 25 да 85 дзяцей амаль з усёй воласці. Закона аб навучанні ў той час не існавала, таму ў першы клас прыходзілі дзеці ад 8 да 15 гадоў. Навучальны год пачынаўся 15 кастрычніка і цягнуўся да Вялікадня, толькі выпускны клас заканчваў заняткі на два тыдні пазней. У 1895 г. Лукаўскае вучылішча стала чатырохкласным, у 1903 г. ў ім вучылася 60 дзяцей, у 1906—07 гг. каля 100 дзяцей. Паранейшаму асноўную колькасць навучэнцаў складалі хлопчыкі, дзяўчынак было 2—3%.

У 1900 г. адкрыта трохгадовая школа ў в. Старая Рудня. У ёй працавалі 3 настаўнікі. У вёсцы была таксама і царкоўна-прыходская школа. Усяго ў двух школах навучаліся каля 100 дзяцей. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны школа стала звацца Старарудняншкім народным вучылішчам Рагачоўскага павета. У вучылішчы было 4 класы, для яго быў пабудаваны новы будынак.

Так паступова, то ў адным, то ў другім сяле адчыняліся сельскія школы, але яны не маглі вырашыць праблему ўсеагульнай адукацыі. Так, у канцы 19 ст. большасць насельніцтва Жлобіна была непісьменнай. Згодна перапісу 1897 г. пісьменнымі сябе лічылі 17% жлабінчан (у сярэднім па Беларусі 32%). У 1916 г. ў Жлобінскім раёне 23% жыхароў мужчынскага полу маглі чытаць і пісаць, сярод жанчын гэты працэнт быў яшчэ ніжэйшы.

У архіўных дакументах канца 19 — пачатку 20 ст. пра развіццё народнай адукацыі на Жлобіншчыне неаднаразова сустракаецца прозвішча Еўдакіма Раманавіча Раманава, выдатнага беларускага этнографа і краязнаўцы, які па службовых справах неаднаразова прыязджаў у гэты край.

У сувязі з падрыхтоўкай да ўвядзення ў Расійскай імперыі агульнага пачатковага навучання ў 1907 г. ў Рагачоўскім павеце пад кіраўніцтвам інспектара народных вучылішч Г.Блешанкова быў распрацаваны план школьнай сеткі і праведзена статыстычнае даследаванне. Падлеткі школьнага ўзросту ў сельскай мясцовасці ў той час складалі 11—14% ад усяго насельніцтва. Гэтую лічбу магчыма прыняць і для ўсёй Жлобіншчыны.

У 1910 г. з хадайніцтвам да ўлад аб дазволе адчыніць у Жлобіне прыватную 4-класную жаночую навучальную ўстанову звярнулася А.Е.Мірановіч. На той час у Жлобіне існавалі народнае вучылішча Міністэрства народнай асветы, чыгуначнае вучылішча, прыватная яўрэйская жаночая 2-класная навучальная ўстанова Гародкінай. Дазвол быў атрыманы, і новая навучальная ўстанова хутка набыла папулярнасць: першы вучэбны год — 18 вучаніц, другі — 48, трэці — 76, чацвёрты — 97 (з іх 42 праваслаўнай веры, 18 — рымска-каталіцкай, 37 — іудзейскай і 1 стараверка). Размяшчалася каля вакзала, у мураваным і драўляным будынках. З чэрвеня 1914 г. ўстанова атрымала права прагімназіі. Плата за навучанне складала ад 50 да 70 руб. У ліпені 1915 г. прыватная 4-класная жаночая прагімназія А.Е.Мірановіч была пераўтворана ў 7-класную жаночую гімназію — падзея, якой жлобінцы могуць ганарыцца і сёння. У тыя гады нават не ўсе павятовыя гарады Беларусі мелі гімназіі.

Ахова здароўя

Медыцынскую дапамогу насельніцтву аказвалі ўрачы, якія працавалі прыватна. У Жлобіне добра ведалі С.Н.Шварца, які скончыў Кіеўскі універсітэт. Прыватнымі былі і аптэкі. Яны меліся ў Жлобіне і Стрэшыне.

Існавалі і нешматлікія казённыя лячэбніцы і ўрачэбныя прыёмныя пакоі. Чыгуначнікі карысталіся паслугамі сваёй сістэмы медыцынскай дапамогі.

Дзяржаўная ветэрынарная дапамога на пачатку 20 ст. толькі пачала рабіць першыя крокі. Сродкаў не хапала. Таму, калі для ветэрынарнага фельчарскага пункта ў в. Старая Рудня, які быў адчынены ў 1909 г., патрабавалася 115 руб., казна выдаткавала 30 руб.

Рэлігійнае жыццё

Рэлігія ў тыя гады заставалася важнейшай часткай грамадскага жыцця. Палітыка царызму ў гэтай сферы пасля падаўлення паўстання 1863—64 г. была даволі адназначнай: падтрымка праваслаўя, жорсткія адносіны да каталіцызму, строгі кантроль за іудзейскай верай. На Жлобіншчыне пераважала праваслаўе, якое лічылася вернай апорай прастолу. Таму неад'емнай часткай палітыкі русіфікацыі, якая ўзмацнілася пасля падаўлення паўстання 1863 г., стала значная дзяржаўная падтрымка пры аднаўленні і пабудове праваслаўных храмаў. На адбудову Крыжаўзвіжанскай царквы ў Жлобіне ў 1863 г. казна выдаткавала 3333 руб. Да таго часу старая драўляная царква са званіцай, якая існавала з 1771 г., нягледзячы на рамонт у 1811 г., канчаткова прыйшла ў заняпад. Яе прыхажанамі былі 630 сялян (110 дамоў), 12 дваровых, 11 дваран і 18 мяшчан Жлобіна і 245 сялян (29 дамоў) суседняй вёскі Лебядзёўка.

Каталікамі з'яўляліся пераважна мясцовыя памешчыкі і некаторыя чыноўнікі. Яўрэі строга прытрымліваліся сваёй іудзейскай веры і наведвалі малітоўныя дамы. У слабадзе Баршчоўка маёнтка Зміеўка Сцепскай воласці Бабруйскага павета жылі стараверы.

Дарэвалюцыйны Жлобін. Вуліца Царкоўная.

Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў пачатку 20 ст.

Пасля рэвалюцыі 1905—07 гг. расійскі прэм'ер-міністр П.А.Сталыпін, спрабуючы адначасова вырашыць праблемы захавання памешчыцкага землеўладання і перанасялення вёскі, разам з планамі перасялення часткі сялян на ўсход імперыі, за Уральскі хрыбет, разгарнуў праграмы хутарызацыі сялянства і аграрнай дапамогі ў арганізацыі сялянскіх гаспадарак.

Дарэчы, яшчэ да сталыпінскіх рэформ беларускія сяляне ў пошуках лепшай долі пакідалі радзіму. Толькі ў Сібір у 1895—1914 гг. па няпоўных звестках з 5 беларускіх губерняў выехалі 550 тыс. сялян. Гэта складала крыху больш паловы сялян-перасяленцаў з нечарназёмнай паласы Расійскай імперыі і больш 11% агульнарасійскіх перасяленцаў. Архіўныя дакументы сведчаць, што не засталіся на баку ад гэтага працэсу і сяляне Жлобіншчыны. Напрыклад, 60-гадовы селянін з в. Саланое Мірон Пракопаў Мажораў, пакутуючы ад малазямелля, падаў 17.2.1897 г. прашэнне на імя магілёўскага губернатара дазволіць яму з сям'ёй і яго жанатым сынам

перасяліцца ў Сухумскую акругу Кутаіскай губ. Яго сям'я — ён сам, жонка, сын Андрэй з жонкай і 2 дзецьмі і сын Рыгор мелі 6,5 дзес. зямлі, у сына Міхаіла (меў жонку і 4 дзяцей) было 4,5 дзес., у сына Уладзіміра (жонка і 3 дзяцей) — 2,25 дзес. У заяве Мажораў скардзіўся на малазямелле і адзначаў: «Местные заработки существуют, но в ограниченном количестве: весной работы на пристанях при реке Днепре, а зимой вывозка на пристани дров и мелкого лесного материала».

У сяле Лукі з 183 двароў у сярэдзіне 1901 г. дазвол на перасяленне ў Сібір атрымалі 12 гаспадароў. Прычына была тая ж — малазямелле і адсутнасць мясцовых дадатковых заробкаў. Тут на 823 мужчынскія душы прыходзілася 2002 дзес. не вельмі ўрадлівай зямлі, а купчай не было наогул. «Зямля наша пясчаная, і вельмі цяжка нам прыходзіцца жыць», — пісалі сяляне. У арэнду зямлю можна было ўзяць толькі пад 30% будучага ўраджаю.

Як і ўсё беларускае сялянства, жлобінскія гаспадары былі працавітымі і прадпрымальнымі, але малазямелле стрымлівала іх ініцыятыву. Прыкладам, селянін тых жа Лук Даніла Абрамаў Міхнеў (14 душ сям'і) меў 2 дамы, 2 амбары, 2 хлявы, навес, пуню, 4 коней, 4 каровы, цялушку, 8 авечак, 7 свіней, а зямлі толькі 15,3 дзес. Яго сусед Харытон Данілаў Зязюлін (12 душ сям'і) меў хату, 3 амбары, 3 хлявы, навес, 4 коней, 3 каровы, быка, 7 авечак, 7 свіней, а зямлі таксама толькі 15,3 дзес. Сям'я Яўцехія Савельева Ільіна з той жа вёскі (9 душ) мела хату, амбар, 2 хлявы, пуню, 3 коней, жарэбчыка, 3 каровы, 3 цялушкі, 3 авечкі, 5 свіней, 4 гускі і ўсяго 5,75 дзес. зямлі. У лютым 1902 г. з хадайніцтвам аб перасялен-

Дарэвалюцыйны Жлобін. Вуліца Дняпроўская.

Ворыва на каровах. Пачатак 20 ст.

ні з Лук у Енісейскую губерню звярнуліся яшчэ 22 чалавекі.

Такое ж становішча назіралася і ў іншых вёсках. На 594 мужчынскія душы ў в. Вышняя Олба Стрэшынскай воласці прыходзілася 1490 дзес. надзельнай зямлі і 656 купчай. Таму ў 1904 г. 5 сялянскіх сем'яў з гэтай вёскі праціліся на перасяленне ў Енісейскую губерню, а сям'я Пятра Міхайлавіча Шашкова (7 душ, 11 дзес. зямлі) следам за іншымі аднавяскоўцамі хацела перасяліцца ў Чарнаморскую вобласць.

На пачатку 20 ст. на Жлобіншчыне, як і па ўсёй Беларусі, былі заможныя сялянскія гаспадаркі. У красавіку 1913 г. селянін в. Пірэвічы Аўрам Уладзіміравіч Курганскі атрымаў дазвол на будаўніцтва млына з рухавіком у 35 к.с. пры 2 рабочых. У тым жа годзе жлобінскаму селяніну Цімафею Іванавічу Міхайлоўскаму дазволілі пабудаваць на яго сядзібе на вуліцы Малевіцкай млын з рухавіком у 10 к.с.

Нельга абмінуць і такую старонку мясцовай гісторыі, як пажары. Яны з'яўляліся страшэнным бедствам і былі той падзеяй, якая надоўга заставалася ў памяці. 13.5.1882 г. выгараў амаль што ўвесь Жлобін: 359 дамоў, праваслаўная царква, 5 яўрэйскіх малітоўных школ, 65 крам і складоў з таварамі, збожжазапасны магазін, народнае вучылішча. Агульныя страты склалі 219 тыс. руб. А казна выдаткавала пагарэльцам усяго 585 руб. У Стрэшыне ў ноч на 28.7.1890 г. згарэла 36 сялянскіх двароў з маёмасцю, усяго на суму 17 820 руб. 14.5.1893 г. ў в. Праскурні згарэла 112 двароў і будынак царкоўна-прыходскай школы, страты склалі 100 тыс. руб. 26.4.1898 г. пажар знішчыў 46 сялянскіх двароў, дом мясцовага землеўладальніка і казённую вінную краму ў в. Чорная Вірня. Страт нанесена на 14 тыс. руб. У Жлобіне дзейнічала пажарнае таварыства, а ў Стрэшыне пажарная дружына.

1.8.1914 г. пачалася сусветная вайна. Для сялян Жлобіншчыны яна азначала пастаўкі прадуктаў, фуражу і коней на патрэбы арміі, прыцягненне да тылавых работ, размяшчэнне на пастой раскватараваных войскаў, што падрывала і без таго бедную гаспадарку. Але, галоўнае, сялянскія сем'і пазбаўляліся сваіх карміцеляў, якіх прызывалі ў армію. У Магілёўскай губерні з вёсак было прызвана ў войска 50,7% працаздольных мужчын. Асабліва вызначыўся на франтах 1-й сусветнай вайны ўраджэнец в. Малыя Рагі П.І.Казятнікаў.

Сейбіт. Пачатак 20 ст.

Асобны артыкул пра яго гл. ў раздзеле «Імі ганарыцца Жлобіншчына».

У поўнай меры праявілася стратэгічнае значэнне жлобінскага чыгуначнага вузла. Пасля абвесткі аб мабілізацыі чыгуначная сетка Расійскай імперыі была падзелена на два раёны — Заходні, які падпарадкоўваўся Ваенна-Палявому Упраўленню, і Усходні, які застаўся ў распараджэнні Упраўлення чыгунак. Падзел паміж імі праходзіў на захад ад лініі Пецярбург—Балагое—Смаленск—Бахмач—Харкаў і далей на поўдзень. Амаль што адразу ўзнікла пытанне з палівам. Вугалю не хапала. Для цягнікоў сталі выкарыстоўваць торф і дровы. Нават правялі агульную рэквізіцыю дроў у межах 30-вёрстнай паласы ўздарож усіх чыгунак Заходняга раёна. Вугаль пачалі вазіць па Дняпры. Так, толькі з 27 сакавіка па 15 мая 1916 г. на жлобінскую прыстань з Крамянчуга і Чаркас прывезлі каля 600 тыс. пудоў каменнага вугалю і антрацыту. Водны шлях з Украіны да Жлобіна займаў прыкладна 2 тыдні.

Не спынілася і будаўніцтва чыгунак. Быў пракладзены другі пуць на лініі Віцебск—Орша—Жлобін. Пабудавалі лінію Жлобін—Калінкавічы—Карасцень—Шапятоўка, якую праектавалі яшчэ да вайны.

Для забеспячэння ўзрастаючых перавозак павялічыліся грузавыя саставы. У 1916 г. ваенныя перавозкі складалі да 50% усіх грузаў (у 1903 г. — 1%). Скараціліся перавозкі прыватных грузаў, былі адменены пасажырскія цягнікі і вагоны прамой сувязі. У сувязі з вайной значна ўзрос рух праз Жлобін. Усе запасныя пуці, якіх было 25, былі забіты вагонамі з рознымі грузамі. У Жлобіне вяліся работы па расшырэнні чыгуначнага вузла, пракладваліся новыя аб'язныя шляхі, будаваліся новыя тупікі. Менавіта з гэтага часу Жлобін становіцца буйным чыгуначным вузлом. На патрэбы абароны працавалі і жлобінскія прадпрымальнікі. Так, заказы Мінскага ваенна-акруговага інтэнданцкага ўпраўлення выконваў уладальнік пякарні Майзель. Толькі за снежань 1916 г. ён выпек 23 302 пуды хлеба на суму 7 035 руб.

Цяжкае становішча на фронце суседнічала з пачаткам эканамічнай разрухі ў тыле. Афіцыйны курс рубля да лютага 1917 г. знізіўся да 55 кап., а яго пакупная здольнасць — да 27 кап. Пачаліся салдацкія бунты.

Р.В.Дзмітрыеў, А.Л.Кіштымаў.

Дакументы сведчаць

РАПАРТЫ БАБРУЙСКАГА НІЖНЯГА ЗЕМСКАГА СУДА КІЕЎСКАМУ ВАЕННАМУ ГУБЕРНАТАРУ А.С.ФЕНЬШУ

3 лютага 1803 г.

В Бобруйском повете с 24-го истекшего генваря по нижеописанное число состояло благополучно, примечания достойного происшествия не оказалось, кроме что имения господина действительного бывшего двора польского камергера Фомы Гриневича в селе Красном Береге из 22-го на 23-е число прошедшего генваря хата и в оной душ пять людей сгорели, для узнания коего пожара причины отправился на место сего суда присутствующей, о чем Вашему Высокопревосходительству сей суд Честь имеет донести.

Заседатель Анатолий Булгак.

7 лютага 1803 г.

После донесения Вашему Высокопревосходительству о сгорении здешнего повета в вотчине помещика Гриневича в селе Красном Береге с 22-го на 23-е число ночью крестьянской хаты с пятью душами по съезде на место произведено следствие, из коего открылось, что оная хата загорелась в ночи от бывшего на полатях и печи льну поставленного для высушения из коей в рассуждении захваченныя сильным огнем уснувших первым сном крестьянина с семейством и бывших в затворенной двери на железном крючке никто избавится не мог кроме одного мальчика, который вылез через окошко и дал знать крестьянам кои хотя того времени собрались, но по окружении огнем всей избы никакой помочи зделать не могли, в оной же сгорели крестьянин Кондрат Семенов с сыном малолетним и сестра его Матрена с детьми сыном и дочерью малолетними. Определено: о сем Вашему Высокопревосходительству в покорности донесть.

И доносит

Заседатель Антоний Булгак.

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны, ф. 533, воп. 1, спр. 1633, л. 39, 46.

УСТАЎНАЯ ГРАМАТА СЯЛА КАЛЫБАЎКА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ ПАМЕШЧЫКА Г.М.ЗБОРАМІРСКАГА

23 красавіка 1862 г.

I

1) В селениях Бобовке, Колыбовке и части Луговой Вирни по 10-й народной переписи значится в общем владении Зборомирских мужеского пола 178 душ, из коих по раздель-

ной записи, совершенной в 1858 г. декабря 17 дня в Могилевской Палате Гражданского суда, во владении помещика Подполковника Голстора Максимилияновича Зборомирского осталось:

Дворовых при фольварке Вишенках мужеского пола 10 душ.

В деревне Колыбовке по 10-й народной переписи мужеского пола душ 70.

В селении Луговой Вирне мужеского пола 4 души.

В деревне Бобовке мужеского пола 4 души.

После ревизии отпущено на волю дворовых 2 души.

За тем на лицо

Дворовых 8 душ

Крестьян 78 душ.

2) Из числа значащихся в крестьянах, не подлежат наделению землею как отказавшиеся на основании 8 Ст. местного положения крестьянин деревни Бобовки Аверка Яковлев с семейством, проживающий в дворе и не пользующийся поземельным наделом, всего мужеского пола 4 души.

Затем должны на основании положения получить в пользование поземельный надел мужеского пола 74 души.

II

1) Всей земли состояло в пользовании крестьян до обнародования Положения о крестьянах около 407 десятин.

2) Так как усадебныя земли не отделены ясною чертою от прилегающих к селению конопляников и выгонов, то на основании 39 Ст. местного положения, к усадебной оседлости причисляется на конопляники и выгоны по 320 кв. сажень на душу, а затем под всею усадебною оседлостью крестьян кроме пространства занятого поселением состоит 9 десятин 2080 кв. сажень.

3) Для местности, где находится селение высшим местным положением о поземельном устройстве высший размер душевого надела в 5 десятин 1200 кв. сажень и по числу душ в селении высший размер душевого надела составляет 407 десятин.

4) На этом основании состоящее ныне в пользовании крестьян количество земли как равняющееся высшему размеру надела предоставляется в постоянное пользование крестьян весь существующий надел. Посреди крестьянского надела 1200 кв. сажень земли под шинковым домом и принадлежащим к оному огородом и выгоном остается в непосредственном распоряжении владельца.

Планы на землю и поверка земель, отведенных крестьянам, сделается при первой возможности.

III

1) Крестьянская усадьба в селе Луговой Вирни подлежит перенесению в деревню Колыбовку на основании 75 Ст. местного положения пункта 1-го как она состоит от господской мельницы и сукновальни в 50 сажень и 2-е неприурочена к крестьянскому полевому наделу, который состоит при деревне Колыбовке.

2) Размещающийся в деревне водопой и выгон остается в пользовании одних крестьян, но водопой не должен воспрещаться как проезжающим, так и проживающему в шинковом доме.

3) Рыбная ловля в озерах Синицах, Закареньи и Гадучах остается в распоряжении одного владельца.

4) Среди крестьянского надела остается в непосредственном распоряжении владельца: в обрубе деревни Колыбовки земли под шинковым домом 1200 сажень; Луговом обрубе жидовская пожня 3 д. 1200 сажень; неудобная земля, не вошедшая в состав крестьянского надела 10 десятин 1200 кв. сажень.

IV

1) За предоставленную в постоянное пользование крестьянам землю в количество 5 десятин 1200 кв. сажень на душу причитается на основании положения с каждого душевого надела оброка по 8 рублей серебром. А со всех 74 душевых наделов 592 рубля в год.

2) Срок для перехода крестьян с издельной повинности на оброк и для платежа оброка назначается 1 марта и 1 ноября. Крестьяне, желающие перейти на оброк, должны заявить

владельцу за год вперед. Обязаны при том полгодичный оброк внести за полгода перед сроком.

Примечание. С отменою издельной повинности остается однако ж на крестьянах обязанность о предмете 151 Ст. общего положения. Рабочих дней за представленную крестьянам землю причитается с каждого душевого надела.

24 мужских летних 18 женских летних
16 мужских зимних 12 женских зимних
А со всех 74 душевых наделов
1776 мужских летних 1332 женских летних
1184 мужских зимних 888 женских зимних

3) Из числа душевого оброка относится на усадьбу 2 рубля 50 копеек, так как она причисляется ко второму разряду, потому что деревня Колыбовка отстоит от судоходной реки Днепра в 5 верстах, где крестьяне имеют заработки от сплава купеческих лесных материалов, крестьяне живя в 6 верстах от местечка Жлобина во всякое время могут находить случай зарабатывать, при том и самая рыбная ловля даст немалую выгоду. Вследствие чего повинность за пользование всею усадебною оседлостью крестьян составляет 185 рублей в год, а выкупная сумма за всю усадебную оседлость 3083 рубля 33 копейки серебра. За исправное отбывание повинностей ответствует круговою порукою все крестьянское общество на основании правил, установленных местным положением.

На основании Ст. 10 и 21 положения о выкупе помещик заявляет: что принимает на себя обязанность предоставить крестьянам, когда они того пожелают, приобрести в собственность совокупно с усадьбами и отведенныя им в постоянное пользование полевыя угодья, но с условием, чтобы выкуп был произведен всем обществом одновременно, и чтобы после выкупа земли крестьянами право производить продажу горячих напитков в деревне Колыбовка навсегда оставалось исключительно за помещиком.

Подлинную подписал Помещик подполковник Гектор Максимильянович Зборомирский.

С подлинным верно Мировой посредник III участка Рогачевского уезда (подпіс)

Согласно указа правительствующего Сената от 23 ноября 1863 г. по настоящей Грамоте следует выкупных платежей

с Колыбовского общества	Годовой выкупной платеж		По полугодиям			
			1-я половина		2-я половина	
	руб.	коп.	руб.	коп.	руб.	коп.
	473	60	236	80	236	80

Мировой посредник (подпіс)

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2014, вып. 1, спр. 784, л. 34—35.

ЗВЕСТКІ ПРА ЦАРКВУ РАСТВА МАЦІ БОСКАЙ СЯЛА САЛАНОЕ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

у 1862 г.

1. Построена 1815-го года тщанием Его Сиятельства Графа Александра Ивановича Остерман-Толстого.
2. Зданием деревянная, ветха, с таковою ж колокольнею, требует постройки новой Церкви.
3. Престол в настоящей холодной один во имя Рождества Богородицы.
4. Утварью средственна.
5. Причты по штату положено: священник, диакон, дьячок и просфирня.
6. Земли при сей церкви тридцать шесть десятин, на каковые плана и межевых книг нет.
7. Деньги у Священнослужителей от прихожан. На содержание Священно и церковнослужителей жалования положено в год 324 рубля серебром.
8. Опись церковному имуществу с 1829 года есть.
9. Приходорасходные книги о суммах свечной и церковной за шнурозапечатанием Белицкого Духовного правления данные в 1849-м году хранятся при Церкви; церковной суммы к половине сего 1862 г. состоит пятьдесят восемь рублей и семьдесят три с половиною копейки серебром, из коих в билете приказа общественного призрения 31 рубль серебром, а остальные в наличности.

10. Копии метрических книг с 1796 г. и исповедных росписей с 1823 г. хранятся при церкви в целости.

Могилевской губернии, Рогачевского уезда по Солонскому приходу

Означение мест, числа крестьян по последней ревизии	Название церкви, какая она и на сколько душ вместимости	Число прихожан					
		Помещичьих		Казенных		Разных сословий	
		М	Ж	М	Ж	М	Ж
Село Солоное, помещицы княжны Голициной, где крестьян ея же временно обязанных	Рождество-Богородицкая, деревянная, душ, примерно 300	175	212				
крестьян:		31	34				
в м. Карпиловке		22	34				
в д. Рогах Малых		57	45				
Попках		151	170				
Проскурнях		190	211				
Папоротном		144	176				
Нивах		98	118				
Истобках		78	67				
Мормоле		163	174				
Ящицах		66	60				
Дворян и мещан						12	15
Военных						40	94
Итого:		1175	1301			52	109

По акту от 14 янв. 1864 г. новая церковь принята у подрядчика Матвея Андреева.

Владелица прихожан живет в Санкт-Петербурге.

Священник Иаков Воропаев. Диакон Мина Храмцов.

Имением Остерманск, частью которого было село Солоное, в 1862 г. управлял капитан Михаил Шульгин.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 1, спр. 880, л. 1—3, 17.

ПРЫГАВОР СЯЛЯН СКЕПЕНСКАГА СЕЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА СЯЛА СКЕПНІ СТАРА-РУДНЯНСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

5 верасня 1884 г.

Мы, нижеподписавшиеся Могилевской губернии, Рогачевского уезда, Старо-Руднянской волости, крестьяне собственники Скепенского сельского общества, села Скепни, быв сего числа собраны нашим сельским старостою Филимоном Ивановым на сельский сход из числа 106 домохозяев, имеющих право голоса на сходе 74 человек, где нашим Старо-Руднянским волостным старшиною Николаем Заичко предъявлен нам вновь составленный землемером Шиманским план распланированным усадебным нашим участком земли селения Скепни после случившегося пожара 3-го июля сего 1884 г. По рассмотрении означенного плана мы находим, что распланировка по оному наших усадебных земель между нами произведена правильно, спора между собою по сему предмету не имеем, так как оною остаемся довольными и напред не должны порушать, а по сему единогласно приговорили: записать о сем в настоящий приговор, в чем подписуемся:

1. Скепенский сельский староста Филимон Иванов, крестьяне села Скепни, 2. Ефим Исаев, 3. Тит Иванов, 4. Яков Анисимов, 5. Фома Иванов, 6. Леон Савельев, 7. Халимон Иванов, 8. Павел Карпеев, 9. Никифор Филиппов, 10. Иван Степанов, 11. Петр Никитин, 12.

Иван Денисов, 13. Кондрат Иванов, 14. Фома Титов, 15. Григорий Прокопов, 16. Прокоп Кондратов, 17. Илья Матвеев, 18. Егор Уласов, 19. Яков Васильев, 20. Халимон Иванов, 21. Петр Данилов, 22. Лукаш Самуйлов, 23. Прокоп Ларионов, 24. Федот Прохоров, 25. Осип Леонов, 26. Семен Иванов, 27. Ефим Евстратов, 28. Яков Терентьев, 29. Ларион Карнеев, 30. Яков Степанов, 31. Микита Логвинов, 32. Иван Фролов, 33. Иван Силин, 34. Авсей Фролов, 35. Антон Фролов, 36. Назар Никитин, 37. Иван Ларионов, 38. Наум Ануфриев, 39. Авсей Наумов, 40. Мартин Венедиктов, 41. Кондрат Борисов, 42. Улас Григорьев, 43. Федор Петров, 44. Никита Венедиктов, 45. Иван Демидов, 46. Федор Уласов, 47. Алексей Степанов, 48. Зот Никитин, 49. Кузьма Карпеев, 50. Апанас Иванов, 51. Лукаш Андреев, 52. Петр Иванов, 53. Тит Фомин, 54. Архип Иванов, 55. Иван Терентьев, 56. Егор Иванов, 57. Федот Иванов, 58. Иван Кузьмин, 59. Иван Андреев, 60. Юрий Тимофеев, 61. Карп Степанов, 62. Атрафим Логинов, 63. Василий Аверьянов, 64. Василий Андреев, 65. Андрей Ларионов, 66. Степан Борисов, 67. Игнат Фомин, 68. Семен Фомин, 69. Федос Семенов, 70. Кузьма Аврамов, 71. Филипп Иванов, 72. Яков Аврамов, 73. Степан Емельянов, 74. Григорий Максимов, а вместо их неграмотных по их просьбе расписался Константин Ясинский. Что действительно настоящий приговор составлен на сельском сходе крестьян селения Скепни в присутствии сельского старосты Филимона Иванова из числа 106 домохозяев, имеющих право голоса на сходе 74 человека и за всех их неграмотных, по их просьбе подписан Константином Ясинским, в том Старо-Руднянское волостное правление подписом и приложением казенной печати удостоверяет. Сентября 5-го дня 1884 г. Каковой приговор в книгу Скепенского сельского общества села Скепин под № 3-м записан.

(печать: Старо-Руднянский волостной старшина) Николай Заичко

Волостной писарь Ступин

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 3363, воп. 1, спр. 217, л. 3—4.

ПРЫГАВОР СЯЛЯН ВЫШНЕ-АЛБЯНСКАГА СЕЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА ВЁСКІ НІЖНЯЯ ОЛБА СТРЭШЫНСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

25 лютага 1898 г.

Мы, нижеподписавшиеся крестьяне Могилевской губернии, Рогачевского уезда, Стрешинской волости, Вышне-Олбянского сельского общества, д. Нижней Олбы, сего числа по распоряжению нашего сельского старосты Якова Титова были собраны на сельский сход из числа 72 домохозяев в числе 65 домохозяев, где рассматривали предъявленный нам Стрешинским Волостным Правлением план составленный частным землемером Александром Шиманским о распланировании в нашем селении Нижней Олбе усадебных участков как сгоревших, как равно уцелевших строений после бывшего пожара 13 августа 1897 г., по рассмотрении которого нашли, что в нем усадебные участки под население каждого из нас показаны в таком порядке и в тех местах, как таковые находятся в натуре, а также усадьба, принадлежащая владелице Каптелевой и что план составлен во всем правильно. Постановили: об этом составить настоящий приговор, утвердив нашими подписями, а копию с него представить куда следует на предмет утверждения названного плана, в чем и подписуемся. Подлинный подписами Вышне-Олбянский сельский староста Яков Титов, крестьяне д. Нижней Олбы. 1. Григорий Александров, 2. Иван Карнеев, 3. Гаврила Максимов, 4. Иван Макаров, 5. Ефим Матвеев, 6. Яким Яковлев, 7. Гардей Леонов, 8. Василий Матвеев, 9. Исак Сафанов, 10. Иван Осипов, 11. Константин Савостьянов, 12. Илья Савостьянов, 13. Григорий Архипов, 14. Максим Иванов, 15. Алексей Васильев, 16. Семен Климов, 17. Павел Яковлев, 18. Андрей Савостьянов, 19. Михаил Демьянов, 20. Трофим Иванов, 21. Лаврен Макаров, 22. Исак Максимов, 23. Иван Григорьев, 24. Илья Филиппов, 25. Андрей Иванов, 26. Михаил Иванов, 27. Фома Савельев, 28. Дорофей Антонов, 29. Евсей Авдеев, 30. Роман Павлов, 31. Никон Дорофеев, 32. Евтух Исаев, 33. Тимофей Алексеев, 34. Леон Андреев, 35. Логвин Андреев, 36. Игнат Сидоров, 37. Адам Осипов, 38. Захар Максимов, 39. Василий Осипов, 40. Карней Антонов, 41. Гаврила Павлов, 42. Устин Леонов, 43. Кондрат Киреев, 44. Василий Максимов, 45. Григорий Николаев, 46. Василий Иванов, 47. Аввакум Иванов, 48. Василий Макаров, 49. Степан Климов, 50. Пимен Моисеев, 51. Семен Яковлев, 52. Сидор Прокопов, 53. Гаврила Парфенов, 54. Карп Иванов, 55. Роман Прокопов, 56. Федор Моисеев, 57. Степан Яковлев, 58. Павел Антонов, 59. Андрей Антонов, 60. Яков Игнатов, а за их неграмотных по просьбе и за себя расписались 61. Степан Яковлев, 62. Яков Яковлев, 63. Трофим Яковлев, 64. Наум Архипов и 65. Авдей Дмитриев. Что настоящий приговор действительно составлен крестьянами д. Нижней Олбы на сельском сходе, собранном по распоряжению и в присутствии местного сельского старосты Якова Титова в числе домохозяев из числа имеющих право голоса на сходе и подписан за неграмотных крестьян по личной просьбе их и за

себя Степан Яковлев, а также грамотными Яковом Яковлевым, Трофимом Яковлевым, Наумом Архиповым и Авдеем Дмитриевым собственноручно, в том Стрешинское Волостное Правление свидетельствует февраля 25 дня 1898 г. подлинный подписали Стрешинский Волостной Старшина Никита Ступенев и Волостной писарь Твардовский.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 3363, воп. 1, спр. 532, л. 3—4.

ПРАШЭННЕ ЖЫХАРОЎ м. ЖЛОБІНА—КАРПІЛАЎКІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

14 лістапада 1902 г.

В м. Жлобин—Карпиловке насчитывается народонаселения до 11 тысяч, это местечко расположено на берегу реки Днепра, имеет протяжение около 9 квадратных верст. Здесь пролегают две железные дороги Либаво-Роменская и Витебск-Жлобинская. Все 11-тысячное народонаселение живет в нашем местечке в самой крайней нужде, а главное без всякой положительно защиты и надзора. Каждый из жителей днем и ночью подвергнут опасности и не изолирован от грабежа, убийства или другого какого-либо насилия, ни один из жителей не живет покоем и не может без опасности быть в своем собственном доме, так как не уверен, что днем или ночью не проскользнул каким-либо поездом в местечко вор или другой злоумышленник, готовый всегда напасть на домовладельца, зная что за ним со стороны власти нет надзора, а все это почему? А вот почему: несмотря на то, что м. Жлобин—Карпиловка имеет громадное народонаселение, занимает пространством 9 квадратных верст и где пролегают две железные дороги, движение пароходства (все это способствующее ворам и другим злоумышленникам проникать в местечко), а равно существует железнодорожное депо и производится постройка нового моста через реку Днепр, положительно отсутствует полиция и всякий надзор. В м. Жлобин—Карпиловке совсем нет полиции, так как хотя и есть один становой пристав, но он при всем старании и ревностном отношении к своему делу не имеет физической возможности всюду и везде присмотреть за такою громадную массою народа, тем более что он имея две должности, т.е. станового и судебного пристава да к тому стан более 100 вёрст в квадрате, большую часть находится в разъездах по стану, а полицейский урядник также всегда находится на участке. Таким образом местечко оставляется на произвол судьбы, а жители находятся без всякой защиты со стороны власти и надзора и в местечке творится полнейший беспорядок. Местечко Жлобин—Карпиловка основано на землях помещиков на правах арендных и чиншевых. Это право, т.е. арендное и чиншевое со дня предоставления его переходило по наследству, а собственность передавалась одним помещиком другому на тех же условиях, какие существовали на жителях местечка до перехода собственности, так что существование жителей было возможно. В настоящее же время жизнь и положение жителей находится в самом критическом и вопиющем положении, потому что владелец местечка, видя что жители с давних времен имеют оседлость и обзавелись хозяйством и постройками и в находящемся в пользовании куске земли (пляцевом) имеют нужду, прибегает к крайним мерам, т.е. требует, чтобы пользующимися была выкуплена его земля за плату от 1 р. 50 к. до 2 р. за сажень, т.е. такую плату, которую не в состоянии никто уплатить и у которого владельца меньше стоит все имущество, чем земля под пляцем, причем в случае несогласия какого-либо арендатора, то владелец земли через судебные процессы отнимает землю, разоряет постройки и все состояние человека, наживавшего целыми десятками лет и остающегося затем на произвол судьбы и в самом критическом и вопиющем положении, и эта участь обязательно постигнет все местечко, если не придет на помощь власть и не оградит местечко от ожидаемой гибели, не говоря уже о том, что жители местечка и в настоящее время угнетены и притеснены и не имеют никаких льгот, выгод и пр., как не пользуются ни прогонами, пастбищами и погостами, а за все это платят непосильную плату. Жалкое положение нашего местечка также и в отношении благоустройства, здесь нет ни тротуаров, ни фасадов фонарей и проч., и все потому, что каждый житель ожидает разорения от помещика, равным образом улицы везде и всюду изрыты и ископаны скотом, никому из домовладельцев не возможно посадить и вырастить дерева, так как скот бродит без всякого присмотра и причиняет вред. Из всего изложенного, Вы изволите усмотреть Ваше Превосходительство, что жизнь и положение жителей м. Жлобина—Карпиловки находится в самых жалких условиях, а в отношении землевладения на самой шаткой почве. Всем вышеупомянутым мы осмеливаемся сказать, что Жлобин—Карпиловка при таком громадном народонаселении, при железных дорогах и пр. безусловно подлежит преобразованию в городовое положение. При преобразовании этом местечко получит все права и преимущества города, улучшит быт и положение жителей как в материальном и торговом отношении, так и в видах благоустройства, а главное избавит жителей от всех тех нужд и невзгод, которые они ныне имеют и терпят и наконец

сбросит то бремя, которое наложено владельцем местечка. Преобразование это тем более необходимо ввиду того, что Жлобин—Карпиловка уже некоторым образом стоит на городском положении, так как здесь платят квартирный налог с недвижимых имуществ и другие губ. земские сборы, чего в других местечках не имеется. К тому же через преобразование увеличится состав полиции и тогда только жители будут в безопасности под надзором, везде порядок и благоустройство. Донося о всем вышеизложенном Вашему Превосходительству имеем честь все покорнейше просить ходатайства Вашего Превосходительства по настоящему нашему прошению: 1-е) о преобразовании м. Жлобин—Карпиловки в городовое положение с учреждением нужного состава полиции и 2-е) о приобретении на общем основании закона казной посредством выкупа земли, находящейся под местечком и распределения затем платежей казне за выкупленную землю согласно разверстки. О своем распоряжении по сему нашему ходатайству мы покорнейше просим Ваше превосходительство поставить нас в известность.

К сему прошению подписываемся жители м. Жлобина—Карпиловки
(98 подпісаў)

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2013, воп. 1, спр. 10, л. 1—5 адв.

ПРЫГАВОР СЯЛЯН МАЛЕВІЦКАГА СЕЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА СЯЛА МАЛЕВІЧЫ ЛУКАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

14 мая 1909 г.

Мы, нижеподписавшиеся крестьяне Могилевской губернии, Рогачевского уезда, Луковской волости, Малевичского сельского общества, села Малевич, состоящего из 77 наличных домохозяев, имеющих право голоса на сходе, по распоряжению нашего сельского старосты Терентия Байкачева, собрались сего числа на селенный сход в числе 57 человек, что составляет более $^{2}/_{3}$ общего числа домохозяев. На сходе этом, в присутствии Г.Земского Начальника 3 уч. Рогачевского уезда, нам предъявлено было заявление наших односельчан крестьян Антона Стасева и Григория Смоловского о выделении, в целях улучшения землепользования, принадлежащей им надельной земли, находящейся в черезполосном владении, к одним местам, для расселения на хутора. Ходатайство это постановлением Рогачевской Уездной Землеустроительной Комиссии 20 апреля сего года передано Члену названной Комиссии Г.Земскому Начальнику 3 уч. Рогачевского уезда для оказания Стасеву и Смоловскому содействия к удовлетворению их ходатайств. В виду чего предложено нам дать свое согласие к отводу просителям земли к одним местам. Выслушав ходатайство Стасева и Смоловского, и, принимая во внимание, что они согласны на выдел им земли к отдельным местам лишь в самых выгодных участках и не к границе общих наших полей, а посредине их, что для интересов остальных домохозяев крайне не выгодно и обидно, так как земля наша не одинакового качества, и есть значительные площади, совершенно неудобные, а потому приговорили: В ходатайстве Стасеву и Смоловскому о выделе им надельной земли к отдельным местам по их личному выбору — отказать. Подлинный за надлежащими подписями.

С подлинными верно (подпись).

... 19 июня 1909 г. с мнением крестьянского схода согласилась Рогачевская Уездная Землеустроительная Комиссия и отклонила ходатайство просителей.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2198, воп. 1, спр. 21, л. 4—6.

УВЕДАМЛЕННЕ НАЧАЛЬНІКА ВАЕННА-ДАРОЖНАГА АДДЗЯЛЕННЯ ЎПРАЎЛЕННЯ ВАЕННЫХ ЗНОСІН ШТАБА КІЕЎСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ ІНЖЫНЕРУ ШЛЯХОЎ ЗНОСІН СТАТСКАМУ САВЕТНІКУ БЕРНАТОВІЧУ

9 верасня 1910 г.
г. Кіеў

Вследствие отношения Вашего от 2-го сентября за № 266 имею честь уведомить, что проект Ваш устройства магистральной железной дороги Жлобин—Староконстантинов и Каменец—Подольск—Румынская граница, с веткою Полонное—Жмеринка, признаю заслуживающим внимания и весьма желательным к осуществлению.

Подлинный подписали: Начальник штаба Генерал-лейтенант Алексеев, Старший адъютант Генерального штаба Подполковник Агапеев.

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны, ф. 882, воп. 2, спр. 32, л. 9.

ДАКЛАД РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ ЗЕМСКАЙ ГАСПАДАРКІ РАГАЧОЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ УПРАВЫ ПА ПЫТАННІ АДКРЫЦЦЯ Ў с. СТАРАЯ РУДНЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ

28 лютага 1911 г.

Крестьяне Старо-Руднянской волости приговором своим от 28 ноября 1910 г. за № 18 постановили возбудить ходатайство об учреждении при народном училище курсов садоводства и огородничества, с отведением для последней цели одной десятины земли и постройкой вместо существующего, пришедшего в ветхость, нового здания народного училища. В последующих же приговорах от 14 декабря 1910 г. за № 19 и 12 января 1911 г. за № 5, сознавая необходимость открытия школы повышенного типа, постановили возбудить ходатайство об открытии в Старой Рудне 4-классного городского училища, с преподаванием садоводства и огородничества, Имени Царя Освободителя Императора Александра Второго. К ходатайству об открытии городского училища в с. Старой Рудне присоединяются и крестьяне Стрешинской волости, так как это училище с успехом могло бы обслуживать и соседние со Старо Рудней волости, в том числе и Стрешинскую волость, о чем крестьянами этой волости и составлен приговор от 7 января 1911 г. за № 17.

На постройку Городского училища и практического ведения садоводства и огородничества крестьяне Старо-Руднянской волости предоставляют три десятины земли (две из них подарены землевладельцем г. Сяноженским) и ассигновывают 1000 р. на постройку единовременно и по 500 р. ежегодно на содержание, кроме того в помощь крестьянам в деле открытия Городского училища приходят местные землевладельцы: разночинцы волости дают 1000 р. наличными деньгами, кр.(естьянин) Кондрат Каленков 20 000 кирпича и землевладелец А.П.Войнич-Сяноженский для крыши черепицу и на все печи — кафли, об отпуске же казенного лесного материала крестьянами возбуждено ходатайство перед Управлением Государственных Имуществ. Какого-либо определенного ходатайства о выдаче земством пособия на постройку Городского училища или же о передаче здания земству в приговорах не выражено. Нет в этих приговорах указаний или просьбы и о том, чтобы земство взяло на себя почин по испрошению ссуды или пособия из школьно-строительного фонда на постройку здания, не помещены в приговорах и условия, при которых только и возможно получение пособия или ссуды из школьно-строительного фонда, а именно: ремонтирование, страхование здания за счет общества, обязательство, что построенное здание будет служить лишь целям народного образования и пр., — нет ни плана здания, ни сметы, ни указаний о размерах и приблизительной стоимости этих зданий. Но в своем представлении от 13 декабря 1910 г. за № 3542 сам Земский Начальник 2-го участка поддерживая ходатайство об устройстве в Старой Рудне Городского училища, испрашивает пособие из земских средств в размере 10 000 руб. на постройку училища. Это ходатайство было уже на рассмотрении Уездного Комитета 14 декабря 1910 г. и для детальной разработки и доклада затем Комитету по предмету открытия в Старой Рудне Городского училища с общежитием, необходимым для учеников — детей хуторян, которых главным образом и должно будет обслуживать училище, — было передано в избранную длительную Комиссию. Последняя предметом своего суждения будет иметь главным образом вопрос об устройстве общежития при училище и настоящее дело только потому представляется вниманию Комитета, что оно признаётся спешным, что Земский Начальник лично высказывал намерение общества текущей же весной приступить к постройке главного здания школы, для чего необходимо знать принципиальный взгляд на это дело Уездного Комитета. Последующим сообщением своим от 4-го сего февраля за № 282, Земский Начальник указывает, что крестьяне Старо-Руднянской и Стрешинской вол., по получении ими надлежащих указаний, решили изменить свое первоначальное намерение и представлять в Комитет Приговоры об устройстве в Старой Рудне, в ознаменование 50-летия освобождения крестьян от крепостной зависимости, 4-классного сельскохозяйственного училища Имени Царя Освободителя Александра II. Последнее обстоятельство совпадает и с решением Уездного Комитета от 15 января 1909 г. коим село Старая Рудня предположена пунктом для профессиональной (хотя ремесленной) школы, с ассигнованием в пособие Правительству на оборудование — 800 р.

Изложив обстоятельства дела и сообщая, что чертежи и сметы на предполагаемую постройку зданий не могли быть составленными Уездной Управой за неназначением техника (прежний уволен 6-го января 1911 г., а с 20 декабря находился в отпуске), Уездная Управа имеет честь просить Уездный Комитет возбудить через Губернский Комитет ходатайство пред Министерством Народного Просвещения об открытии в с. Старой Рудне сельскохозяйственной школы повышенного типа, пред Управлением Земледелия и Государственных Имуществ о скорейшем отпуске казенных лесных материалов и ассигнований из земских сумм единовременно на постройку здания примерно — 5000 руб., на покупку или аренду дополнитель-

ного количества земли для нужд школы — 1000 руб. и на оборудование и содержание ежегодно — 1000 р.

Подлинный Подписали: Председатель Управы Пушкин и Члены: Л.Сухобоков и А.Клатцо.

Верно: Непременный Член (подпіс)

Сверял: Завед. делопроизводством.

Комитет единогласно постановил: просить Губернский Комитет об открытии в с. Старой Рудне, в ознаменование 50-летия со дня освобождения крестьян от крепостной зависимости не сельскохозяйственной школы, а Городского 4-классного училища с курсами садоводства и огородничества Имени Императора Александра II и об ассигновании из земских средств на постройку здания, а в том числе и квартир (общежития) для детей хуторян, в пособие местному населению 5000 руб. на покупку дополнительного количества земли или на аренду ся — 1000 руб., и на ежегодное содержание училища в пособие Министерству Народного Просвещения — 1000 р. К сему У. Комитет определяет, что вопрос открытия училища спешен и разрешение его необходимо к осени 1911 г. и, что необходимые чертежи и сметы должны быть представлены Уездной Управой в Губернскую на утверждение не позднее 1-го апреля 1911 г. В отношении отпуска казенных лесных материалов, предназначенных к выдаче на устройство в Старой Рудне 2-классного народного училища, — Комитет постановил: просить Губернский Комитет поддержать возбужденное волостным сходом ходатайство пред подлежащими учреждениями. Что же касается квартир учительского персонала, то последния с успехом и легко могут быть оборудованы в наемных помещениях, возможность к чему заявлена местным земским Начальником, а потому средства испрашиваются и будут затрачены исключительно на постройку зданий для классов и квартир учеников.

Верно: Непременный Член (подпіс)

Сверял: Завед. делопроизводством (подпіс)

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2079, воп. 1, спр. 119, л. 1—1 адв.

ПРАШЭННЕ ЎТРЫМАЛЬНІЦЫ ЖЛОБІНСКАЙ ПРЫВАТНАЙ 4-КЛАСНАЙ ЖАНОЧАЙ ПРАГІМНАЗІІ А.Я.МІРАНОВІЧ ПАПЯЧЫЦЕЛЮ ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУГІ

14 снежня 1914 г.

В м. Жлобине более 10 000 жителей, причем около 4000 железнодорожных служащих (Жлобин — узловая станция Либаво-Роменской, Риго-Орловской и вновь строящейся Подольской железной дороги). Ближайшими городами, где есть средние женские учебные заведения, являются города Рогачев (20 верст), Бобруйск (40 в.), Гомель (80 в.). Большинство жителей м. Жлобина по недостатку средств не имеет возможности давать образование своим дочерям в упомянутых выше городах. А потому, когда мною было открыто 4-классное училище, то почти все родители перевели своих дочерей из гимназий указанных выше городов в соответствущие классы содержимого мною учебного заведения. В настоящее время в гимназиях соседних городов учатся только дети более состоятельных родителей и то в старших классах, а именно в Рогачеве 10 девочек и в Бобруйске одна. Причем почти все девочки, обучающиеся в г. Рогачеве, ежедневно ездят на занятия по железной дороге, уезжая из дому в 6 часов утра и возвращаясь назад не ранее 6—7 часов вечера, что крайне вредно отражается и на здоровье и на успехах детей.

В виду всех этих обстоятельств местное население неоднократно обращалось ко мне с просьбой и даже требованием ходатайствовать перед начальством о преобразовании прогимназии в гимназию. Помимо того в марте месяце сего года с тем же ходатайством ездила в г. Вильну депутация от населения к Господину Попечителю Учебного Округа. На необходимость дальнейшего открытия классов указывает большой наплыв учащихся в IV-й класс, в котором в настоящее время имеется 36 учениц, тогда как в прошлом году до получения прогимназией прав для учащихся было в IV классе всего лишь 22 ученицы; некоторые из этих учениц, не имея возможности из-за недостатка средств родителей продолжать образование в других городах, остались в IV классе содержимой мной прогимназии на повторный курс в надежде, что прогимназия будет преобразована в гимназию. Несмотря на то, что до текущего учебного года прогимназия не давала учащимся никаких прав, и кто имел хоть малейшую возможность, старался определить своих детей в какие-нибудь учебные заведения с правами, — в содержимой мной прогимназии в настоящее время все же обучается 100 девочек; в том числе православных 41, католичек 13 и иудеек 46.

Все вышеизложенное свидетельствует о том, что для м. Жлобина необходимо иметь среднее женское учебное заведение, а потому честь имею почтительнейше просить Ваше Превос-

ходительство о преобразовании содержимой мною 4-классной прогимназии с правами для учащихся в 7-классную женскую гимназию.

Содержательница прогимназии А.Миронович.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2254, воп. 2, спр. 697, л. 70—71.

Барацьба за новую ўладу і жыццё

У канцы 19 — пачатку 20 ст. у Расійскай імперыі абвастрылася класавая барацьба, пачаліся выступленні рабочых і сялян. У чэрвені 1886 г. пачалася забастоўка рабочых механічных майстэрань Лібава-Роменскай чыгункі ў Гомелі і Жлобіне. У ёй прыняло ўдзел больш за 500 чалавек. На падаўленне забастоўкі былі пасланы войскі і паліцыя. Але ім не ўдалося спыніць выступленне рабочых. Тым больш, што апошніх падтрымалі працаўнікі іншых прадпрыемстваў. Адміністрацыі майстэрань прыйшлося задаволіць патрабаванні бастуючых.

Першыя перамогі ў барацьбе, пашырэнне марксісцкіх ідэй садзейнічалі аб'яднанню рабочых у гурткі. У 1891—93 гг. узнікаюць сацыял-дэмакратычныя гурткі ў Гомелі, Магілёве, Жлобіне. Яны налічвалі па 10—12 чалавек і аб'ядноўвалі ў асноўным найбольш актыўных рабочых і прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Летам 1897 г. з асобных гурткоў у Гомелі ствараецца сацыял-дэмакратычная група. Яе ўплыў распаўсюдзіўся на гарады і мястэчкі Гомельскага, Рагачоўскага, Рэчыцкага паветаў. Праз год такая група ўзнікла ў Жлобіне.

У сакавіку 1903 г. чыгуначнікі Жлобіна правялі мітынг пратэсту супраць расстрэлу рабочых Златауста. 1 мая таго ж года рабочыя Жлобіна выйшлі на дэманстрацыю. Улады жорстка расправіліся з дэманстрантамі, але хваляванні ў Жлобіне працягваліся. Росту самасвядомасці рабочых і сялян садзейнічала газета «Искра», асабістыя нумары якой даходзілі і да Жлобіна. У рабочых расце імкненне да ведаў. Сярод «рабочай інтэлігенцыі» ў Жлобіне вядомы машыніст паравоза А.М.Карповіч, абціршчыца вагонаў Н.С.Камякова, тэхнік вагоннага дэпо Р.А.Васільеў і інш.

Блізкасць чыгуначнікаў да сялянства па паходжанні (65,5% рабочых і служачых Лібава-Роменскай чыгункі — былыя вяскоўцы) і па месцы жыхарства (нямала працаўнікоў вузла жылі ў навакольных вёсках, а працавалі ў Жлобіне), вяртанне ў вёску рабочых-адыходнікаў, нарастанне рэвалюцыйнага руху ў гарадах, узмацненне работы сацыял-дэмакратаў сярод сялян — усё гэта ўплывала на пашырэнне сялянскага руху.

У студзені 1904 г. на аснове сацыял-дэмакратычных арганізацый і груп Гомеля, Магілёва, Жлобіна, Клінцоў і іншых гарадоў і мястэчак ствараецца Палескі камітэт РСДРП, які адыграў пэўную ролю ў актывізацыі рэвалюцыйнай дзейнасці рабочых. Працаўнікі Жлобінскага чыгуначнага вузла падтрымлівалі Гомельскую чыгуначную групу. У чыгуначных майстэрнях узмацняецца агітацыя, распаўсюджваюцца лістоўкі і пракламацыі.

У сакавіку 1905 г. ў Жлобіне на сходзе 80 рабочых была прынята рэзалюцыя супраць рэпрэсіўнай палітыкі самадзяржаўя. У ёй выказвалася ўпэўненасць у тым, што гэта ёсць апошнія «сутаргі царызму, які адчувае блізкасць свайго падзення». Арышты, якія сталі адказам на пачатак рэвалюцыйных падзей, не абмінулі і Жлобіншчыну. Паравознікі, вагоннікі і інш. ў 1905 г. прынялі ўдзел у першамайскіх мітынгах і дэманстрацыях пад лозунгам: «Далоў царскае самадзяржаўе!». Летам 1905 г. ў Жлобіне арганізоўваюцца баявыя дружыны, якія ўзялі на сябе функцыі па ахове і падтрыманню парадку на станцыі. У знак пратэсту супраць прымаемых з боку ўлад рэпрэсій праводзіліся мітынгі і дэманстрацыі.

Пачаліся і сялянскія хваляванні. 16.6.1905 г. магілёўскі губернатар паведамляў у Міністэрства ўнутраных спраў: «11 июня крестьяне д. Луговая Вирня Рогачевского уезда силой не допустили станового пристава к описи имущества крестьян на удовлетворение взысканий по суду в пользу помещицы Башмаченковой, владения которой были нарушены крестьянами, и заявили земскому начальнику и приставу, что землей будут владеть, что бы с ними не делали».

12 кастрычніка чыгуначнікі Жлобіна, падтрымліваючы чыгуначнікаў Гомеля, спынілі рух паяздоў і забаставалі. Яны патрабавалі 8-гадзіннага працоўнага дня, свабоды слова, друку, павелічэння заработнай платы. У пе-

рыяд забастоўкі ўзніклі стачачныя камітэты ў шэрагу месц Гомельшчыны, у т.л. і ў Жлобіне, якія пачалі дзейнічаць як першапачатковыя органы рэвалюцыйнай улады — Саветы.

У кастрычніку—лістападзе 1905 г. ў Жлобіне ўзніклі прафсаюзныя арганізацыі, якія сталі на абарону інтарэсаў рабочых.

Кіруючыся ўказаннямі Палескага камітэта РСДРП, чыгуначнікі Жлобіна затрымлівалі эшалоны з салдатамі, вернымі царскаму ўраду, вялі прапагандысцкую работу сярод вайскоўцаў, якія ехалі на падаўленне нарастаючага рэвалюцыйнага руху ў Расіі. Захапіўшы ўладу на чыгунцы, рабочыя прапускалі паязды праз Гомель і Жлобін толькі па свайму меркаванню, асобныя заганялі ў тупікі. Створаная па ініцыятыве Палескага камітэта РСДРП Жлобінская баявая рабочая дружына ахоўвала станцыю, раззбройвала невялікія атрады царскіх войск.

14 снежня 1905 г. начальнік управлення Лібава-Роменскай чыгункі тэлеграфаваў міністру шляхоў зносін: «Адпраўка паяздоў на Гомель спынена ... участак Гомель—Жлобін захоплены рабочымі майстэрань. Ранейшыя начальнікі службаў і начальнікі станцый пазніманы, паравозы ахалоджаны».

У гэты ж дзень начальнік Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення паведамляў, што Гомельскі камітэт Усерасійскага саюза чыгуначнікаў мае зносіны са Жлобінскім камітэтам. У яго ўвайшлі начальнік дэпо Юрый Адамавіч Баброўскі і тэлеграфіст Картанюк. Ён стаяў на чале аховы, быў дэлегатам ад камітэта Жлобіна ў Гомелі, падтрымліваў сувязь з гомельскім камітэтам.

15 снежня 1905 г. начальнік управлення Лібава-Роменскай чыгункі ў тэлеграме міністру шляхоў зносін прызнаваў бяссілле ўлад супраць бастуючых у Гомелі і Жлобіне і сведчыў: «У дапаўненне да папярэдніх паведамленняў даношу, што Гомель і Жлобін ва ўладзе забастоўшчыкаў; служачыя, жадаючыя працаваць, адхілены забаставаўшымі; высветліць прозвішчы агітатараў для перадачы іх пракурорскай уладзе не прадастаўляецца магчымым. Неабходна неадкладная пасылка войска, да прыбыцця якога парадак не можа быць адноўлены. Мае звяртанні да ваенных і жандарскіх улад застаюцца без выканання». 16 снежня ён зноў тэлеграфуе ў той жа адрас: «... рух паяздоў няправільны, на ўчастку Гомель—Жлобін па-ранейшаму распараджаюцца агітатары; без войск бяссільны...»

19 снежня 1905 г. дырэктар Гомельскіх чыгуначных майстэрань паведамляў Магілёўскаму губернатару, што «ўчастак Жлобін—Гомель знаходзіцца ў руках рэвалюцыянераў», і патрабаваў «самых рашучых мер для аднаўлення там парадку і ачышчэння станцыі ад мяцежнікаў».

Хваляванні Жлобінскіх чыгуначнікаў працягваліся 21 дзень — з 8 па 29 снежня 1905 г. Забастоўкай кіраваў Сцяпан Каларадзыо. Паліцыя імкнулася арыштаваць яго, але безвынікова. Хохаў, Дзепянчук, Баброўскі і іншыя, як найбольш актыўныя забастоўшчыкі, былі арыштаваны і высланы. Рабочы рух быў часова прыпынены.

З 1910 г. ў Жлобіне аднаўляецца дзейнасць сацыял-дэмакратычных гурткоў. З-за мяжы паступаюць газеты «Звезда», «Рабочая газета», «Социал-демократ». На пачатку 1912 г. бальшавікі Жлобіна накіравалі ссыльным у Сібіры пасылку, у якой было звыш 300 экз. газет «Социал-демократ» і «Рабочая газета».

Вясной 1912 г. ў знак пратэсту супраць палітыкі царскага самадзяржаўя, якое расстраляла рабочых на Ленскіх залатых прыісках, Жлобінскія чыгуначнікі арганізавалі і правялі дэманстрацыю рабочых. На працягу 1911—12 гг. адбылося некалькі выступленняў сялян супраць мясцовай памешчыцы дваранкі Вольгі Пятроўны Сазановіч.

Рабочыя-бальшавікі Жлобіна падтрымлівалі пастаянную сувязь з Палескім камітэтам РСДРП, распаўсюджвалі газету «Правда», праводзілі ў мястэчку і навакольных вёсках збор сродкаў на выданне гэтай газеты.

У 1913 г., пасля прыезду ў Гомель члена бальшавіцкай фракцыі ў 4-й Дзяржаўнай думе А.Я.Бадаева, Палескі камітэт РСДРП накіроўвае ў Жлобін свайго прадстаўніка для аказання дапамогі чыгуначнікам.

З пачаткам першай сусветнай вайны Жлобінскі чыгуначны вузел набыў асаблівае значэнне. Праз яго ішлі грузы і эшалоны на Паўночна-Заходні, Паўднёва-Заходні і Заходні франты. У Жлобіне было каля дывізіі царскіх войск, а ў раёне сучаснага льнозавода знаходзіўся размеркавальны пункт. Сярод салдат, што ехалі на фронт, вялася агітацыйная і растлумачальная работа. Незадаволенасць вайной і работа бальшавікоў вялі да непадпарадкавання афіцэрам ніжэйшых чыноў, сутычкам салдат з паліцыяй. 26 верасня 1915 г. салдаты 90-га запаснога батальёна на станцыі Жлобін збілі некалькіх паліцэйскіх, у аднаго з іх аднялі шашку і рэвальвер. Для

ўціхамірвання салдат была выклікана рота пяхоты мясцовага гарнізона. 4 мая 1916 г. салдаты зборнай каманды, якая ехала з Гомеля, на станцыі Жлобін закідала камянямі патруль 22-й роты 421-й пешай Палтаўскай дружыны. Эшалон з салдатамі, што ўзбунтаваліся, удалося адправіць толькі пасля таго, калі на дапамогу патрулю прыбыла ўзброеная каманда з 45 чалавек. Ва ўзнікшай перастрэлцы было паранена некалькі салдат.

У 1915 г. актывізуецца рабочы рух. Жлобінскія чыгуначнікі правялі буйныя забастоўкі. Іх падтрымалі працаўнікі іншых прадпрыемстваў. У 1916 г. баставалі рабочыя лесасклада і лесапільнага завода на пас. Ветцы-Вір.

У кастрычніку 1916 г. ў Гомелі ўспыхнула паўстанне салдат перасыльнага пункта. Вестка аб гэтым хутка дакацілася да Жлобіна, дзе знаходзілася вялікая колькасць войск. На мясцовым размеркавальным пункце сярод салдат пачаліся хваляванні. Незадаволенасць не перарасла ў адкрытае сутыкненне толькі таму, што ўлады прынялі тэрміновыя меры.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. з дапамогай Гомельскага гарадскога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў ствараюцца новыя органы ўлады на Гомельшчыне. Да канца сакавіка Савет узнікае таксама і ў Жлобіне. Аднаўляюць сваю дзейнасць прафсаюзныя арганізацыі (імі кіравала цэнтральнае бюро прафсаюзаў Гомеля) рабочых чыгуначнага вузла, фанернага завода ў пас. Ветка-Вір. На ўсіх прадпрыемствах устанаўліваецца 8-гадзінны працоўны дзень. У вёсцы разгортваецца барацьба за падзел памешчыцкай зямлі. У маі 1917 г. бальшавіцкая фракцыя была створана ў Жлобінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У пачатку сакавіка 1917 г. ў Жлобіне быў створаны «Камітэт грамадскай бяспекі» — орган Часовага ўрада. Аналагічныя камітэты ўтварыліся ў Рагачове, Гомелі, Мазыры.

Па ініцыятыве Палескага камітэта РСДРП(б) у канцы чэрвеня ў Гомелі адбылася нарада прадстаўнікоў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, дзе прысутнічаў прадстаўнік Жлобіна. Хутка ў Жлобін прыбывае прадстаўнік Мінскага рэвалюцыйнага камітэта з задачай арганізацыі кантролю за перакідкай войск і вядзення рэвалюцыйнай работы. Яго дзейнасць знайшла на месцы паразуменне і падтрымку. Устанаўліваецца рабочы кантроль над чыгуначным вузлом, пашыраецца работа сярод сялян. Так, у сярэдзіне чэрвеня 1917 г., калі суддзя прыцягнуў сялян в. Салтанаўка да адказнасці за самавольны захоп памешчыцкай зямлі, тыя арыштавалі крыўдзіцеля і адправілі яго ў Гомельскі Савет.

Памешчыкі Рагачоўскага павета ў тым жа месяцы вымушаны былі ў скарзе міністру земляробства пісаць: «Сяляне пад уплывам прамоў прыехаўшых з Петраграда дэпутатаў Усерасійскага сялянскага Саюза сякуць лясы прыватнага карыстання. Захопліваюць і дзеляць лугі і сенакосы, знімаюць рабочых і адхіляюць упраўляючых маёнткамі».

Да сярэдзіны 1917 г. ў Гомелі, Рагачове, Рэчыцы, Жлобіне, Мазыры і іншых населеных пунктах прыфрантавой паласы знаходзілася шмат войск. Карыстаючыся гэтым, бальшавікі праводзілі ў масах агітацыйную і растлумачальную работу, раскрываючы сутнасць вайны і яе ўплыў на жыццё народа. 8 чэрвеня ў Гомелі на праведзеным па ініцыятыве Палескага камітэта РСДРП(б) мітынгу была прынята рэзалюцыя, у якой адзначалася: «У імя міру, у імя выратавання соцен мільёнаў працоўных, якія стаяць на краю гібелі ад голаду і гаспадарчага разбурэння, у імя захавання вялікіх рэвалюцыйных заваёў народа ўся ўлада ў краіне павінна неадкладна перайсці ў рукі самога народа ў асобе яго рэвалюцыйных органаў — Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў».

Такая ж рэзалюцыя была прынята ў Жлобіне. Чыгуначнікі вузла выступілі супраць неапраўданай гібелі і калецтва тысяч людзей, яны разам з асноўнай масай рабочых і салдат Жлобіна 25 чэрвеня выйшлі на вуліцы мястэчка пад лозунгамі: «Далоў вайну!», «Уся ўлада — Саветам!»

Для барацьбы з карнілаўшчынай у жніўні 1917 г. ў Віцебск, Жлобін, Оршу, Магілёў, Бабруйск Мінскі камітэт РСДРП(б) накіраваў сваіх прадстаўнікоў. Яны ўзначалілі рэвалюцыйныя сілы на месцах. Прынятыя бальшавікамі меры ўскладнілі перакідку карнілаўскіх вайсковых падраздзяленняў па чыгуначнай лініі Гомель—Жлобін. Толькі за 6 дзён на ўчастку Гомель—Жлобін чыгуначнікі спынілі 25 эшалонаў урадавых войск. У Жлобін — важны транспартны вузел — прыбывае сацыялістычная рота, сфарміраваная Рэчыцкім Саветам у колькасці 150 чалавек, з задачай весці барацьбу з мяцежнікамі.

Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі насельніцтва мястэчка ў сярэдзіне верасня 1917 г. прымае ўдзел у палітычных акцыях. На чыгуначных станцыях Гомель і Жлобін, у механічных майстэрнях Лібава-Роменскай дарогі арганізуюцца забастоўкі, склікаюцца мі-

Удзельнікі мітынгу ў падтрымку Кастрычніцкай рэвалюцыі. 1917 г.

тынгі, паўсюдна праводзіцца растлумачальная работа.

25 кастрычніка 1917 г. выканком Мінскага Савета выдаў загад № 1, у якім паведамлялася аб сацыялістычнай рэвалюцыі, якая адбылася ў Петраградзе, і пераходзе ўлады ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Змест гэтага загада і бальшавіцкая газета «Буревестник» былі дастаўлены ў Жлобін паравозным машыністам Вагіным, які вярнуўся са службовай камандзіроўкі ў Мінск. У Жлобін прыбывае камісар-упаўнаважаны Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП(б) Васільеў з мэтай аказання дапамогі ва ўстанаўленні Савецкай улады. З Гомеля ў Жлобін прыбывае таксама прадстаўнік Палескага камітэта РСДРП(б) з аналагічнай задачай.

У лістападзе 1917 г. па ініцыятыве былых матросаў, брыгадзіра слесараў паравознага дэпо В.Г.Кульбакова, М.К.Паўлава была арганізавана баявая рабочая дружына. Чырвонагвардзейцамі запісаліся чыгуначнікі А.Карповіч (сын А.М.Карповіча, старшыні ВРК Жлобіна ў 1917—18 гг.), М.Каліноўскі, С.Камякоў, Я.Свірыдаў, І.Івашкевіч, салдаты воінскага поезда і ваенных майстэрань А.Кавалёў, М.Кучанаў, П.Чарняк. Жлобінскі чырвонагвардзейскі атрад налічваў 200 чалавек. Па прыкладу гамяльчан рабочыя паравознага і вагоннага дэпо Жлобіна зрабілі нешта накшталт браняпоезда: у прычэпленых вугляpках прарэзалі адтуліны для кулямётаў, унутры сцены абклалі мяшкамі з пяском.

17 лістапада, калі Гомельскі Савет прыняў рашэнне ўзмацніць надзейную ахову рэвалюцыйнага парадку, машыніст дэпо Гомеля Сцяпан Іванавіч Талпінскі прыбыў у Жлобін і ўстанавіў сувязь з чыгуначнікамі. Дружыну вузла прывялі ў баявую гатоўнасць і перавялі на казарменнае становішча. Яна несла каравульную службу на вузле і ў мястэчку, ахоўвала важнейшыя аб'екты, масты цераз Дняпро і Дабасну, удзельнічала ў сутычках з бандытамі, у т.л. і ў сельскай мясцовасці.

П.Я.Кірычэнка.

Дакументы сведчаць

ПРАДСТАЎЛЕННЕ ПРАКУРОРА МАГІЛЁЎСКАГА АКРУГОВАГА СУДА ПРАКУРОРУ КІЕЎСКАЙ СУДОВАЙ ПАЛАТЫ

11 лютага 1905 г.

Доношу Вашему Превосходительству, что Отдельного корпуса жандармов Ротмистром Крушинским приступлено к производству в порядке 1035 ст. Уст. Уг. Суд., дознания о противозаконной сходке евреев 24 января сего года в мест. Жлобине, в доме Шмуйлы Сахновича.

В качестве обвиняемого никто еще не привлечен.
Прокурор (подіс неразборливы).

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны, ф. 317, воп. 1, спр. 3129, л. 1.

ПРАДСТАЎЛЕННЕ ПРАКУРОРА МАГІЛЁЎСКАГА АКРУГОВАГА СУДА ПРАКУРОРУ КІЕЎСКАЙ СУДОВАЙ ПАЛАТЫ

30 чэрвеня 1905 г.

В течение июля сего года в различных местах Могилевской губернии происходили нарушения крестьянами частной собственности помещиков, по-видимому, на аграрной почве. Эти нарушения выражались в самовольной пастьбе скота на помещичьих землях, в тайных покосах владельческих лугов и лесных порубках. Кроме того, крестьяне при найме их на сельскохозяйственные работы устраивали стачки, требуя значительного повышения поденной платы, когда же помещики пытались заменить местных рабочих пришлыми, первые прогоняли с работы последних.

Такого рода недоразумения с крестьянами происходили уже в имениях землевладельцев — Чачкова и княгини Крапоткиной в Могилевском уезде, фон Валя и Гебеля — в Горецком уезде, графа Чернышова-Кругликова — в Рогачевском уезде и некоторых других.

До сих пор администрации удавалось восстанавливать порядок мирным путем, и лишь по поводу сопротивления власти при прекращении самовольного пользования лугом Гебеля и о самовольном покосе и увозе сена в имении княгини Крапоткиной — возбуждены предварительные следствия, о чем донесено особо.

Несомненно, что в некоторых случаях указанные выше поступки крестьян совершаются или под влиянием пропаганды еврейской революционной партии, члены которой принимают все меры, чтобы побудить крестьян к беспорядкам. Можно ожидать, что при созревании хлебов беспорядки усилятся.

Об изложенном имею честь донести Вашему Превосходительству.
Прокурор (подпіс неразборливы).

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны, ф. 317, воп. 1, спр. 2839, л. 8.

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ТАВАРЫШУ МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ, ЗАГАДЧЫКУ ПАЛІЦЫІ ПРА АГРАРНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ СЯЛЯН І ЗАБАСТОЎКУ БАТРАКОЎ У ПАВЕТАХ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

1905 г.

... О новых, полученных мною 16 июня 1905 г. сообщениях о самоуправных действиях крестьян докладываю следующее:

... 11 июня крестьяне дер. Луговой Вирни, того же уезда, силой не допустили станового пристава к описи имущества крестьян на удовлетворение взысканий по суду в пользу помещицы Башмаченковой, владения которой были нарушены крестьянами, и заявили земскому начальнику и приставу, что землей они будут владеть, что бы с ними не делали.

И.д. губернатора вице-губернатор (подпись)
Правитель канцелярии (подпись)

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 504—505.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Час барацьбы і выпрабаванняў

6(19) лістапада 1917 г. ў Жлобіне была абвешчана савецкая ўлада, створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі Лавецкі (старшыня), А.Карповіч, Леанід Каларажыо, Павел Вольскі, Мікалай Паўлаў, Іван Карыбскі, Васіль і Павел Кульбаковы, У.Печурыхін і іншыя. У стварэнні гэтага камітэта прымаў актыўны ўдзел член Бабруйскага камітэта РСДРП, потым член ЦК Кампартыі Беларусі П.М.Серабракоў. Услед за выбраннем рэўкома ў Жлобіне ствараецца партыйная арганізацыя. Першымі яе членамі сталі рабочыя паравознага дэпо і вагоннага ўчастка В.Кульбакоў, П.Вольскі, І.Карыбскі, Л.Каларажыо, Я.Карыбскі, М.Каліноўскі, А.Карповіч (сын А.М.Карповіча), П.Кульбакоў, М.Паўлаў, С.Камякоў, У.Паўлаў.

У сярэдзіне лістапада 1917 г. ў Жлобіне і навакольных вёсках адбыліся перавыбары Саветаў, у якія былі дэлегіраваны найбольш актыўныя ў грамадскім жыцці рабочыя і сяляне, салдаты. У склад Жлобінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў рабочыя накіравалі сваіх прадстаўнікоў Сяліцкага і Кульбакова, сяляне — Пашкоўскага і Пышакова. На 3-м абласным з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, які праходзіў у Мінску 19—21 лістапада, дэлегат ад Жлобіна ў сваім выступленні падкрэсліў, што «ўлада цалкам у руках Савета. Савет папулярны».

Савет неадкладна прыступіў да практычнага ажыццяўлення Дэкрэта аб зямлі, прынятага 2-м Усерасійскім з'ездам Саветаў, мерапрыемстваў па ўсталяванню савецкай улады на месцах. На працягу трох тыдняў памешчыцкае землекарыстанне на Жлобіншчыне было поўнасцю ліквідавана. Зямля і маёмасць памешчыкаў перайшлі ў распараджэнне сялянскіх Саветаў і камітэтаў. Па даручэнню рэўсавета Жлобіна справай размеркавання зямлі паміж тымі, хто раней батрачыў на памешчыка, кіраваў бальшавік С.І.Бондараў.

Наяўнасць рабочых і сялянскіх Саветаў паасобку стварала пэўныя нязручнасці ва ўстанаўленні і ўмацаванні ўлады, рашэнні надзённых задач. Жыццё патрабавала канцэнтрацыі кіраўніцтва. Таму на працягу студзеня 1918 г. адбылося аб'яднанне рабочых і сялянскіх Саветаў Жлобіншчыны.

Станаўленне Савецкай улады ў Жлобіне адбывалася ў складаных абставінах. Побач, у губернскім горадзе Магілёве, вакол царскай Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага канцэнтраваліся контррэвалюцыйныя сілы. У быхаўскай турме знаходзіўся арганізатар жніверьскага мяцяжу генерал Карнілаў, які даваў указанні па арганізацыі барацьбы супраць Савецкай улады, а Вярхоўны галоўнакамандуючы Духонін адмовіўся выконваць распараджэнні новага ўрада. Петраград прымае тэрміновыя меры па ліквідацыі контррэвалюцыйнага ачага, падаўленню сіл, якія выступілі супраць рэвалюцыі, пасылае ў Магілёў свае сілы. Праз Жлобін накіроўваюцца атрад рабочых і салдат у колькасці 500 чалавек, які быў сфарміраваны Палескім камітэтам РСДРП(б), а таксама атрад, які складаўся з 1-га рэвалюцыйнага палка імя Мінскага Савета, батальёна 6-га Сібірскага стралковага палка, браняпоезда, двух бронемашын, роты пяхоты і сапёраў. Гл. таксама артыкул «Браняпоезд ішоў з баямі».

Пасля заняцця рэвалюцыйнымі сіламі Стаўкі частка духонінскіх ударных войск мела намер адступаць на Гомель. 2—8 снежня ў

Мітынг у Жлобіне. 1918 г.

баях пад Жлобінам, у якіх прымалі ўдзел Гомельскі, Жлобінскі і Рэчыцкі атрады, яны былі разгромлены.

У пачатку 1918 г. ўзбунтаваліся польскія легіянеры. Створаны летам 1917 г. корпус генерала Доўбар-Мусніцкага прызначаўся для барацьбы з нарастаючым рэвалюцыйным рухам. У канцы 1917 г. ён налічваў звыш 25 тыс. салдат і дыслацыраваўся ў Магілёўскай і Мінскай губернях.

Паводле задумы генерала, да Польшчы павінны быць далучаны Магілёўская губерня і іншыя тэрыторыі. У сваіх загадах ён указваў: «Знесці з твару зямлі тую вёску, якая акажа супраціўленне польскім войскам...». 12.1.1918 г. часці корпуса захапілі Рагачоў, Бабруйск, а неўзабаве і Жлобін. Наступленне на Жлобін вялося з двух бакоў: Рагачова і Чырвонага Берага. Падзеі разгортваліся так. На досвітку легіянеры 2-га палка 2-й дывізіі мяцежнікаў знішчылі чырвонагвардзейскую заставу, што знаходзілася каля дарогі Жлобін—Рагачоў, і рушылі наперад. Ланцугі наступаючых заўважыў начны патруль, але ён не змог стрымаць націск палякаў. Хутка легіянеры ўварваліся на ўскраіны мястэчка. Жлобінская баявая дружына заняла абарону каля чыгуначнага пераезду непадалёку ад моста на р. Дняпро. Менавіта яго вораг імкнуўся захапіць і ўзарваць. Частка 6-га сібірскага палка сустрэла легіянераў, якія наступалі з боку Чырвонага Берага.

У 7 гадзін раніцы 2 польскія палкі ўварваліся на станцыю Жлобін. Чырвонагвардзейцы і рэвалюцыйныя салдаты мясцовага гарнізона аказалі ворагу ўпартае супраціўленне. Бой працягваўся ўвесь дзень. Савецкія часці прымянілі артылерыю і бранявікі. Праціўнік чапляўся за кожны дом, за кожны абарончы рубеж, але панёс цяжкія страты і быў выбіты са станцыі, адышоў на 10 км. Наступаючыя захапілі шмат палонных і ваенныя трафеі. «На працягу наступных дзён польскія войскі неаднаразова контратакавалі рэвалюцыйныя часці ў раёне Жлобіна, але ўсе атакі былі адбіты», — успамінаў потым удзельнік тых падзей Мікалай Сямкоў. Легіянеры вымушаны былі адступіць, пакінуўшы нават бліжэйшыя сельскія населеныя пункты.

Там, дзе ўсталявалася ўлада польскіх легіянераў, яны з жорсткасцю адносіліся да мірнага насельніцтва. «Івана Кашперава — жыхара в. Лукі польскія легіянеры арыштавалі за тое, што ён нібы быў вінаваты ў разгроме памешчыцкай сядзібы. Ён — былы салдат, які вярнуўся з фронту, даказваў, што ў той час не быў у вёсцы. Палякі зрабілі выгляд, быццам паверылі, і адпусцілі затрыманага дамоў. Кашпераў жыў за агародамі, на балоце, і накіраваўся дамоў па вузкай сцяжынцы. Двое палякаў з вінтоўкамі наперавес пайшлі следам. Кашпераў прайшоў зусім малую адлегласць, калі ворагі выстралілі яму ў спіну. Тры дні бандыты не дазвалялі хаваць Івана Кашперава. Яго цела ляжала на агародзе і акупанты зганялі сюды мужыкоў...» Так пісаў 21.3.1967 г. зямляк, палкоўнік Савецкай арміі Ц.В.Міронаў у пісьме навучэнцам Лукаўскай сярэдняй школы.

Жлобін, апынуўшыся на ваенным становішчы, якое было аб'яўлена з моманту наступлення польскіх легіянераў, перажываў трывожныя дні, рабіў усё для абароны. На дапамогу прыбылі чырвонагвардзейскі атрад з Го-

Чырвонагвардзейцы петраградскага завода «Новы Леснер» перад адпраўкай на фронт. 1 студзеня 1918 г.

Жлобінскі чырвонагвардзейскі атрад разам з прадстаўнікамі палітаддзела 10-й дывізіі 16-й арміі Заходняга фронту.

меля, браняпоезд пад кіраўніцтвам камісара Ольчака і чырвонагвардзейскі атрад рабочых петраградскага завода «Чырвоны Леснер». Аказваў дапамогу і баявы атрад, сфарміраваны ў Чырвоным Беразе ў першыя дні барацьбы з нашэсцем польскіх легіянераў.

Рашучыя дзеянні супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага пачаліся ў канцы студзеня — пачатку лютага 1918 г. баямі пад Жлобінам, Рагачовам, Бабруйскам, Рэчыцай, Доўскам. Аб гераічнай абароне Жлобіна газета «Солдатская правда» за 31.1.1918 г. пісала: «Жорсткі бой ідзе каля станцыі Жлобін. Бой ішоў каля кожнага дома ручнымі гранатамі на працягу 7 гадзін. Гарматны агонь працягваўся 50 гадзін, выпушчана шмат тысяч снарадаў. Перамаглі савецкія войскі. Жлобін заняты. Страты палякаў жудасныя... частка польскіх легіянераў далучылася да савецкіх войск. Становішча адступаючых легіянераў цяжкае».

7.2.1918 г. каля Жлобіна зноў адбыўся бой савецкіх войск і мясцовага чырвонагвардзейскага атрада з асобнымі часцямі польскага корпуса. У гэтым баі загінуў Уладзімір Якаўлевіч Печурыхін, слесар паравознага дэпо, бальшавік, чырвонагвардзеец.

13 лютага 1918 года Жлобін поўнасцю ачысцілі ад польскіх легіянераў.

Хутка корпус Доўбар-Мусніцкага быў разгромлены. Яго рэшткі потым дзейнічалі на баку кайзераўскай Германіі, у складзе польскай арміі вялі барацьбу супраць Савецкай улады.

Маладая савецкая рэспубліка імкнулася выйсці з вайны, але мірныя перагаворы ў Брэст-Літоўску не прынеслі жаданага, і войскі Германіі аднавілі наступленне. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікоў загадам № 6 ад 23 лютага 1918 г. прапанаваў «для перашкоды прасоўвання праціўніка за лінію Віцебск—Магілёў—Гомель назначыць Віцебскі, Аршанскі і Магілёўскі атрады і 2-ю рэвалюцыйную армію ...». «Высунуць частку гэтых атрадаў, — гаварылася ў загадзе, — да Полацка, Барысава, на Бабруйскі напрамак, да Жлобіна і Калінкавіч у выглядзе авангардаў для затрымкі праціўніка».

Акупацыйныя войскі рухаліся на Гомель 2 калонамі праз Жлобін і Мазыр. Першыя буйныя бітвы з імі адбыліся пад Калінкавічамі, Жлобінам, Доўскам, Горвалем, Рэчыцай; станцыі Буда-Кашалёва, Калінкавічы, Жлобін і Рэчыца некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Але захоп мястэчка і станцыі Жлобін так і не адбыўся. Толькі пасля вымушанага выхаду да Гомеля слаба ўзброеных воінскіх часцей і мясцовага чырвонагвардзейскага атрада 2.3.1918 г. нямецкія войскі акупіравалі Жлобін. У гэты ж дзень у данясенні Стаўкі з г. Арол адзначалася: «Сёння, у 12 гадз. 5 мін., Жлобін заняты немцамі пасля жорсткага бою пад Чырвоным Берагам, які працягваўся дзень 26 лютага. Немцаў, палякаў выбыла са строю каля 400 салдат і шмат параненых. Мы страцілі браневікі і некалькі забітых». У данясенні прызнавалася, што «састаў сіл праціўніка большы, чым у нас», і ў варожых атрадах акрамя немцаў знаходзіліся палякі і ўкраінцы.

За кароткі прамежак часу вялікая тэрыторыя Беларусі аказалася пад акупацыяй нямецкіх войск. Для насельніцтва наступілі чорныя дні. Акупанты забіралі жывёлу, тварылі тэрор і беззаконне. За нязначныя правіннасці — пабоі, ці нават, расстрэлы. Спальваліся цэлыя вёскі. Вёскі ізаляваліся адна ад другой. У адным з загадаў акупацыйных улад гаварылася: «Усім жыхарам хадзіць з адной вёскі ў другую строга забараняецца. Жыхары адной вёскі могуць свабодна хадзіць адзін да другога толькі днём... Усім жыхарам неабходна атрымаць пасведчанне асобы ў воласці, з унясеннем членаў сям'і і іх узросту. За невыкананне гэтага асобы будуць пакараны смерцю». Выкананне загаду кантралявалася патрулямі.

У тыле ворага разгарнулася партызанская вайна. У аператыўнай зводцы ваеннага камісарыята Маскоўскай вобласці ад 16 сакавіка 1918 г. паведамлялася: «У тыле немцаў узмоцнена дзейнічаюць нашы партызаны. Атрыманы паведамленні, што паміж Гомелем і Жлобінам узарваны нямецкі браніраваны поезд. Сяляне да немцаў настроены варожа і да сябе ў вёску без супраціўлення не пускаюць». Партызаны затрымлівалі саставы з хлебам, выводзілі са строю паравозы, арганізоўвалі дыверсіі на чыгунцы і іншых аб'ектах.

Кайзераўскія войскі паўсюдна ліквідавалі органы Савецкай улады, устанаўлівалі суровы акупацыйны рэжым. Вярталіся збегшыя памешчыкі і капіталісты.

Тым не менш унутрыпалітычнае жыццё не спынялася. Вясной 1918 г. ў Жлобіне створаны падпольны камітэт РКП(б), у маі — чэрвені 1918 г. — рэўком. Арганізуюцца буйныя падпольныя баявыя атрады. Але ў адкрытую дзейнічаць было немагчыма — перавага сіл заставалася на баку германскіх войск. Партыйная арганізацыя Жлобіна працавала ў падполлі. А.М.Карповіч па распараджэнні партыйных органаў выехаў з часткай жлобінскіх чырвонагвардзейцаў у Оршу, дзе тады праходзіла дэмаркацыйная лінія. Там ён працягваў партыйную работу і ўдзельнічаў у пар-

тызанскай барацьбе. У Жлобіне падпольную работу ўзначалілі Г.Тамкоў, М.Паўлаў, П.Кульбакоў. Падпольшчыкі здзяйснялі дыверсіі на чыгуначным вузле, узрывалі пуці і стрэлкі, зацягвалі рамонт паравозаў, вагонаў, затрымлівалі адпраўку нямецкіх эшалонаў.

«Гаспадаранне» кайзераўцаў суправаджалася жорсткім тэрорам, які ў поўную сілу зведаў чырвонагвардзеец Ф.М.Сімухін. Акупанты западозрылі яго ў правядзенні падпольнай работы, арыштавалі, дапрошвалі, патрабавалі назваць імёны саўдзельнікаў. Але мужны патрыёт нікога не выдаў. Пасля катаванняў ворагі выкалалі яму вочы, паламалі рукі, ногі і паўмёртвага расстралялі. Пахаванне Ф.М.Сімухіна адбылося пры вялікай колькасці насельніцтва Жлобіна. Яно перарасло ў акцыю палітычнай афарбоўкі, вылілася ў акт ганебнасці і нянавісці да акупантаў.

Быў загублены таксама актыўны чырвонагвардзеец, падпольшчык, матрос Балтыйскага флоту А.Кулік. Ворагі акружылі дом, дзе ён знаходзіўся. У перастрэлцы падпольшчык забіў 5 акупантаў, але яго схапілі і пасля катаванняў і здзекаў расстралялі.

Падпольшчыкі, якія заставаліся на волі, адпомсцілі за смерць таварышаў. Воінская часць карнікаў размяшчалася ў будынку царкоўнапрыходскай школы (у раёне вуліцы Карла Маркса, былой Царкоўнай, непадалёку ад новага храма). У велікодную красавіцкую ноч 1918 г. на тэрыторыі царквы сабралася шмат народу. Тут жа была работніца паравознага дэпо, член партыі бальшавікоў з 1917 г. Ф.С.Шумская. Кіраўніцтва падпольнай арганізацыі даручыла ёй падрыхтаваць куліч, яйкі, самагонку і знайсці магчымасць «пачаставаць» карнікаў. Разам са сваімі сябрамі Батурынай і М.Марозавай яна пазнаёмілася з патрулямі. Акупанты былі занадта задаволены, з ахвотай прынялі пачастунак. Яны ап'янелі і вырашылі адпачыць, пакінуўшы наглядаць за парадкам аднаго вартаўніка. Падпольшчыкі А.Карповіч і М.Каліноўскі, якія знаходзіліся ў засадзе, кінулі ў вокны школы гранаты. Узрывы знішчылі больш 20 акупантаў.

Так падпольшчыкі адпомсцілі за смерць Сімухіна і Куліка.

Акупанты адчувалі сябе ў Жлобіне неспакойна і спрабавалі напасці на след падпольшчыкаў. У маі 1918 г. яны арганізавалі аблаву. Воінскія часці акружылі тэрыторыю паравознага дэпо і вытворчыя аб'екты, што прылягалі да яго. Усіх рабочых сабралі каля паваротнага круга. За сталом размясцілася некалькі нямецкіх афіцэраў разам з начальнікам паравознага дэпо Штобе. У гэты час салдаты абшуквалі ўсе закуткі цэхаў, аглядвалі тэндары, топкі, дымавыя каробкі, паравозы, якія стаялі на рамонце, спрабавалі адшукаць рабочых-падпольшчыкаў, тых, хто займаецца прапагандай у калектыве. Потым правялі зверку прозвішчаў кожнага рабочага. Некаторыя падпольшчыкі ішлі на рызыку, называлі выдуманыя прозвішчы. І калі такога прозвішча ў спісе не было, адзін з нямецкіх афіцэраў звяртаўся да Штобе за ўдакладненнем. Той працаваў начальнікам паравознага і вагоннага дэпо яшчэ да рэвалюцыі, ведаў кожнага рабочага і служачага, аднак нікога не выдаў. Такім чынам многім удалося пазбегнуць арышту.

Жлобінскія падпольшчыкі арганізоўвалі дыверсіі на чыгунцы, затрымлівалі прасоўванне войск, адмаўляліся перавозіць нямецкія грузы, нарабаванае дабро. Пад уплывам падпольшчыкаў рабочыя і служачыя вузла адмаўляліся працаваць, арганізоўвалі забастоўкі.

Асаблівае значэнне для вузла мела забастоўка, якая пачалася 15 ліпеня 1918 г. і працягвалася каля месяца. Жлобінскія чыгуначнікі далучыліся да сваіх калег з Гомеля і ў знак салідарнасці з транспартнікамі Корасценя вылучылі патрабаванні да акупацыйных улад. У ходзе забастоўкі рух на лініях Жлобін—Бахмач—Калінкавічы—Унеча быў поўнасцю спынены. Баставаўшыя патрабавалі аднавіць норму выпрацоўкі і стаўкі заработнай платы, якія былі ўстаноўлены Саветам народных камісараў, стварыць рабочы харчовы камітэт для арганізацыі забеспячэння рабочых і служачых неабходнымі прадуктамі, знізіць цэны на галоўныя віды прадукцыі і ўстанавіць на іх цвёрдыя цэны, увесці 8-гадзінны рабочы дзень, вызваліць 12 заложнікаў, арыштаваных пры аблаве, зацвердзіць статус саюза чыгуначнікаў, забяспечыць поўную свабоду для прафсаюзаў. Для барацьбы з акупантамі на вузле быў створаны партызанскі атрад.

Нямецкае камандаванне імкнулася прымусіць баставаўшых працаваць. Працягвалася рабаванне народа. Член Рэўваенсавета Рэспублікі Аралаў у зводцы за 12—17.10.1918 г. паведамляў: «Са Жлобіна ў Кіеў былі адпраўлены 4 баржы з яблыкамі; гэтыя яблыкі былі рэквізаваны ў сялян нямецкімі ўладамі,

прычым рэквізіцыя праводзілася з прымяненнем узброенай сілы. Аплочвалі 6 руб. за пуд. У некаторых мясцовасцях вяліся арышты жыхароў за тое, што яны аказвалі супраціўленне пры рэквізіцыі. Немцы расплочваліся маркамі, якія прымаюцца вельмі неахвотна».

Сіла, пагрозы, зайграванне з народам, «аплата» за ўзятае ў яго не вялі да поўнага падпарадкавання насельніцтва акупантам. Паўсюдна вялася барацьба супраць захопнікаў, пакуль восенню яны не пачалі адыход з Беларусі. Начальнік аператыўнага ўпраўлення Заходняй Арміі з нагоды гэтага ў данясенні за 23.11.1918 г. ўспамінаў: «За 35 вёрст ад Жлобіна па Падольскай чыгунцы (накірунак Жлобін—Мазыр) была спроба з боку белагвардзейцаў узарваць мост праз р. Бярэзіна. Зроблена распараджэнне аб накіраванні туды роты 151-га палка 17-й стралковай дывізіі. Белагвардзейцы грабяць насельніцтва... Прасоўванне да Гомеля затрымліваецца з-за пашкоджання пуці. Сёння мяркуецца аднавіць пуць і заняць Гомель. У Жлобіне немцы пакінулі 105 паравозаў». 24.11.1918 г. Жлобін быў поўнасцю ачышчаны ад акупантаў. Ён становіцца цэнтрам накаплення сіл і прасоўвання іх за адыходзячым праціўнікам, месцам, дзе праходзілі перагаворы з нямецкімі салдацкімі камітэтамі па ўсіх пытаннях бесперашкоднага руху часцей Чырвонай Арміі далей на захад, устанаўлення новай дэмаркацыйнай лініі.

25 лістапада, як даносіў палітаддзелу дывізіі ваенком 3-й брыгады 17-й стралковай дывізіі А.Сазонаў, «па прыбыцці эшалонаў і штаба брыгады на станцыю Жлобін, разам з Бабруйскім ваенным саветам быў арганізаваны мітынг чырвонаармейцаў 151-га і 153-га стралковых палкоў і 7-й батарэі на тэму «Чырвоная Армія і Савецкая ўлада». На мітынгу прысутнічала шмат жыхароў, і словы кожнага прамоўцы сустракаліся бурнымі апладысментамі». Менавіта тады і пазней нямала жыхароў Жлобіна і навакольных населеных пунктаў добраахвотна папоўнілі баявыя падраздзяленні 17-й стралковай дывізіі, якія кватаравалі ў мястэчку і на станцыі.

Камандзір 3-й брыгады 17-й стралковай дывізіі Васільеў 29 лістапада даносіў са станцыі Жлобін: «...Разам са штабам і саветам 28 лістапада ў 3 гадзіны прыбыў са Жлобіна ў г. Бабруйск і сваім 153-м палком заняў пакінуты немцамі горад. Пры адступленні акупантаў часці Чырвонай Арміі захапілі тады ў Жлобіне і Бабруйску шмат класных і таварных вагонаў, 110 аўтамабіляў, 50 пантонаў, 4 тыс. пудоў дроту, некалькі тысяч пудоў каменнага вугалю». Данясенне заканчвалася словамі аб становішчы Жлобіна: «...Я са штабам брыгады і членам савета Марозавым вярнуўся ў Жлобін для канчатковага замацавання гэтага вузлавога пункта».

25 лістапада аднавілі сваю дзейнасць жлобінскія Ваенна-рэвалюцыйны камітэт і партыйная арганізацыя РКП(б). Абедзве арганізацыі ўзначаліў А.М.Карповіч. У склад ВРК зноў увайшлі П.Вольскі (ён быў таксама прызначаны камісарам чыгуначнага вузла), В.Г.Кульбакоў (камісар паравознага і вагоннага дэпо), Валасевіч (камісар паштова-тэлеграфнай сувязі), Дземяшчонак — машыніст Віцебскага паравознага дэпо (узначаліў ЧК), Л.Каларажыо, М.К.Паўлаў, І.Карыбскі, П.Д.Кульбакоў і інш.

Камендантам станцыі Жлобін быў прызначаны І.Івашкевіч. Была арганізавана баявая рабочая дружына (120 чалавек), якая перайшла на казарменнае становішча, несла караульную службу, навучалася ваеннай справе.

Надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй, сабатажам і спекуляцыяй, якая дзейнічала ў Жлобіне, камплектавалася з рабочых-камуністаў. У яе ўвайшлі С.Камякоў, П.Д.Кульбакоў, А.А.Карповіч, М.Г.Каліноўскі, Н.Корабаў і інш.

Зімой і вясной 1919 г. пачаліся ўцёкі з Петраграда былых царскіх афіцэраў, прадстаўнікоў буржуазіі, памешчыкаў і іншых, хто быў варожа настроены да Савецкай улады. Іх шлях ляжаў на поўдзень праз Жлобін, таму тут прыводзяцца ў баявую гатоўнасць баявая дружына, чэкісты, воінскія часці. У цягніках і на чыгуначнай станцыі арганізоўваецца строгая праверка дакументаў. Падазроныя асобы затрымліваліся. Вось адзін з эпізодаў таго часу. Супрацоўнікі «надзвычайкі» А.Карповіч і М.Каліноўскі заўважылі воддаль ад пасажырскага вакзала чалавека з двума чамаданамі, які сядзеў на траве каля нафтасклада. Незнаёмы прад'явіў дакументы на імя рабочага Пуцілаўскага завода. У дакументах указвалася, што ён едзе на Украіну для закупкі хлеба рабочым завода і яму неабходна ў гэты час аказваць усялякую дапамогу і падтрымку. Падазроную асобу даставілі ў ЧК. Па дарозе ён спрабаваў адкупіцца залатымі рэчамі. Потым у яго чамаданах, паміж двайным дном, былі выяўлены зліткі золата, а затрыманы аказаўся контррэвалюцыянерам, які меў намер пераправіць золата на Украіну

для арганізацыі выступленняў супраць Савецкай улады. Н.Корабаў (старшы канвою), М.Каліноўскі і А.Карповіч даставілі кантрабандыста і золата ў Маскву і здалі іх асабіста Ф.Э.Дзяржынскаму.

У пачатку сакавіка 1919 г. Жлобін накіроўвае ўзброены атрад з 200 чалавек у Рагачоў на падаўленне мяцежу 10-га пагранпалка. 24 сакавіка на экстранным пасяджэнні ВРК было прынята рашэнне аб тэрміновым камплектаванні ўзброенага атрада і накіраванні яго на падаўленне стракапытаўскага мяцежу ў Гомелі. Рабочыя паравознага і вагоннага дэпо абсталявалі таварны вагон, устанавілі на ім 4 кулямёты. Група байцоў атрада і чэкістаў, у т.л. Дземяшчонак, Вольскі, Каларджыо і Каліноўскі адправіліся ў разведку. За імі следаваў у бок Гомеля чыгуначны састаў з сфарміраваным у Жлобіне атрадам. Разведка без перашкод дабралася да станцыі Буда-Кашалёўская і прымусіла стрэлачніка адкрыць семафор, каб прапусціць Жлобінскі састаў. У гэты час на пероне станцыі трое ваенных (як потым высветлілася, гэта былі мяцежнікі, спецыяльна прысланыя сюды) праводзілі мітынг. Папярэджаныя разведчыкамі байцы Жлобінскага атрада выскачылі з вагонаў. Натоўп разбегся, а арганізатары зборышча былі арыштаваны. На допыце яны падрабязна расказалі аб падзеях, што праходзілі ў Гомелі.

29 сакавіка часці Чырвонай Арміі і атрад камуністаў занялі горад. Дземяшчонак з групай жлобінскіх чэкістаў і байцоў атрада прыйшоў на Гусеўскую вуліцу ў дом № 17, які належаў былому чыноўніку Гомельскай гарадской управы памешчыку Дамарацкаму і дзе знаходзіўся штаб паўстанцаў Стракапытава. Дом акружылі. Варта збегла. У час вобыску ў доме было знойдзена шмат залатых рэчаў, награбленых мяцежнікамі, залатая валюта царскай чаканкі. Арыштаваных штабістаў даставілі ў жлобінскую транспартную Надзвычайную камісію, а потым праз Магілёў адправілі ў Маскву.

У сакавіку 1919 г. ў Жлобінскую партыйную арганізацыю ўваходзіла 60 камуністаў і 45 спачуваючых. Арганізацыя хутка расла. 24 красавіка 1919 г. на пасяджэнні Рагачоўскага павятовага камітэта РКП(б), куды ўваходзіла тады Жлобінская партыйная арганізацыя, прынята рашэнне накіраваць на фронт 50% камуністаў. Са Жлобіна пайшлі ваяваць 82 камуністы і 200 спачуваючых.

Гэта быў цяжкі час для дзяржавы, якая першая ў свеце дэкларавала сваёй мэтай пабудову сацыялізму. Партыя бальшавікоў і ўрад прымалі ўсе меры, каб адстаяць заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі, пераадолець голад і разбурэнне. Менавіта ў гэты час па неакупіраваных беларускіх гарадах і вёсках з агітпоездам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» здзейсніў паездку М.І.Калінін — старшыня Усесаюзнага цэнтральнага выканаўчага камітэта Савецкай Расіі. 14 ліпеня 1919 г. поезд прыбыў у Жлобін, дзе прастаяў 17 гадзін 45 хвілін. У дэпо, якое было побач з мястэчкам і станцыяй, адбыўся мітынг, на якім прысутнічала каля 800 чыгуначнікаў, жыхароў мястэчка і навакольных вёсак, ваеннаслужачых. Усесаюзны староста (так называлі М.І.Калініна) выступіў з прамовай, заклікаў хутчэй аднавіць разбураную гаспадарку, арганізаваць бесперапынны рух на чыгуначным транспарце і тым самым садзейнічаць хутчэйшай перамозе савецкай улады. У Жлобіне М.І.Калінін выступіў яшчэ двойчы. З нагоды гэтага палітком агітпоезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» паслаў са Жлобіна тэлеграму ў Маскву на імя кіраўніка дзяржавы У.І.Леніна.

Утвораная ў красавіку 1919 г. Гомельская губерня, куды ўвайшоў і Жлобін, летам аказалася ў цяжкім становішчы. З поўдня сюды рухаліся войскі Дзянікіна, з захаду наступалі вайсковыя фарміраванні Польшчы. У канцы жніўня 1919 г. яны фарсіравалі раку Бярэзіна ў раёне Бабруйска і наступалі на Рагачоў і Жлобін.

Партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі праводзяць работу па мабілізацыі працоўных на барацьбу з ворагам. Гомельскі губернскі камітэт аб'явіў тыдзень уступлення ў РКП(б). У яго справаздачы 19.12.1919 г. ЦК паведамлялася: на працягу партыйнага тыдня толькі ў Жлобіне ўступіла ў партыю 92 чалавекі (34 рабочых і 58 чырвонаармейцаў). Амаль усё дарослае насельніцтва прыфрантавой паласы пайшло на збудаванне траншэй і акопаў.

Сур'ёзную дапамогу фронту аказваў партызанскі рух. Яго арганізатарам і кіраўніком у прыфрантавой паласе і блізкім тыле працаўніка стаў рэўком, які знаходзіўся каля станцыі Чырвоны Бераг. Для барацьбы з ворагам у Жлобіне ствараецца камуністычны атрад. 9.1.1920 г. ў мястэчку адбылося пахаванне сямі байцоў гэтага атрада, якія ўдзельнічалі ў адбіцці набегу польскіх легіянераў на станцыю Шацілкі.

Пасля разгрому войск Дзянікіна і Юдзеніча, рэшткаў калчакаўцаў у Сібіры, стабілізаа-

цыі фронту ў Беларусі ў канцы 1919 — пачатку 1920 гг. настала часовая перадышка. Пачалася барацьба з разрухай. Некаторыя прадпрыемсты Гомеля, Рагачова, Жлобіна пераводзяцца на выпуск прадметаў спажывання.

Аднак у пачатку сакавіка 1920 г. польскія войскі пачалі вайну супраць савецкай краіны: Наступленне вялося на Жлобін 4 групамі. Першая наступала па Рагачоўскай шашы, другая — з Бабруйска на Туркі, трэцяя — на Шчадрын, чацвёртая — на Плесавічы. 3.3.1920 г. палякі прарвалі фронт каля вёскі Радуша і павялі наступ на в. Казіміра. Часці Чырвонай Арміі пад напорам пераўзыходзячых сіл праціўніка вымушаны былі адыйсці. Над захопленымі ў палон чырвонаармейцамі акупанты ўчынілі дзікую расправу. Яны замучылі прыбыўшых напярэдадні са Смаленска штаба фронту памочніка ваенкома Адамовіча і начальніка мабілізацыйнага аддзела Шашынскага.

Разам з польскімі войскамі вярталіся ў свае маёнткі ранейшыя гаспадары. Напрыклад, у в. Бяльчо ў суправаджэнні атрада польскіх салдат прыбыў пан Прашаноўскі.

З Казіміра праціўнік наступаў на Жлобін, але беспаспяхова. Усе яго атакі былі адбіты. 72-і стралковы полк амаль поўнасцю знішчыў 2 польскія палкі, якія імкнуліся авалодаць мастом цераз р. Дабасна. Спробы інтэрвентаў захапіць в. Туркі таксама пацярпелі няўдачу. Праціўнік панёс вялікія страты і пачаў адступаць.

Каб адрэзаць захопнікам шлях да адыходу і разграміць іх, камандаванне Чырвонай Арміі накіравала ў варожы тыл 120 лепшых партызан і 60 чырвонаармейцаў з каманды браняпоезда імя Леніна. Атрад пераправіўся цераз раку Ала, зрабіў засаду каля в. Радуша і ў жорсткім баі разграміў вялікую калону адступаючых войск праціўніка. Камандзір славутага партызанскага батальёна Сямён Лазаравіч Вілюга так апісвае гэтую бітву: «Больш гадзіны працягваўся бой. У партызан канчаліся патроны, папоўніць іх было неадкуль. Адчуўшы аслабленне агню, палякі ўскочылі і кінуліся ў атаку. Адбіўшы яе ручнымі гранатамі, партызаны пачалі адступаць у глыбіню лесу. Адход прыкрываў кулямётчык Касценка. Схаваныя за дрэвамі партызаны білі без прамашкі». Хутка ім на дапамогу падаспела падраздзяленне Чырвонай Арміі. Пад згубным агнём чырвонаармейцаў і партызан легіянеры адступілі.

Як высветлілася пазней, партызаны, якіх было ўсяго 180 чалавек, вялі бой з адступаючымі інтэрвентамі, якія мелі 30 кулямётаў і 2 лёгкія батарэі.

Часта партызаны здаваліся няўлоўнымі, з'яўляліся перад ворагам нечакана і дабіваліся перамогі. Так, аднойчы партызанам стала вядома, што пяхотны полк праціўніка рыхтуецца пераправіцца цераз раку Бярэзіна, каб раптоўна зрабіць налёт на адзін з участкаў фронту. Падраздзяленне байцоў з браняпоезда імя Леніна сумесна з батальёнам партызан з Чырвонага Берага прабралася ноччу ў тыл ворага і зрабіла засаду ў лесе па дарозе з Парыч у Шчадрын. Ноччу з 10 на 11 красавіка 1920 г. пілсудчыкі пачалі пераправу. Партызаны і чырвонаармейцы раптоўна напалі на іх. У гэтым баі трохсоценны атрад чырвонаармейцаў і партызан ушчэнт разбіў цэлы варожы полк.

А тым часам у тыле людзі, аднаўляючы гаспадарку, працавалі з высокай энергіяй. Вось што расказвала газета «Правда» 17.4.1920 г.: «Жлобінскае чыгуначнае дэпо дзейнічае, нягледзячы на блізкасць фронту, даволі здавальняюча. У майстэрнях дэпо, дзе праводзіцца бягучы рамонт паравозаў і вагонаў, працуе 300 чыгуначных рабочых. Праца працягваецца круглыя суткі ў 3 змены. Выпадкі прагулаў упалі з 40—50% да 3—4%. Зводка работ за тыдзень (з 6 па 13 красавіка), дастаўленая ў чыгуначны палітаддзел, дае наступную табліцу: колькасць рабочых — 298, выпушчана паравозаў з бягучага рамонту — 119, вагонаў крытых — 29, платформ — 3, класных вагонаў — 2. У параўнанні з папярэднімі данымі наглядаецца значнае павышэнне прадукцыйнасці працы».

У канцы красавіка — пачатку мая 1920 г. легіянеры пачалі чарговае наступленне на Рэчыцу, Гомель і Жлобін. 16.5.1920 г. Гомельскі губрэўком звярнуўся да насельніцтва з заклікам прыкласці ўсе сілы і мабілізаваць усе сродкі для адпору ворагу. Амаль усё дарослае насельніцтва было мабілізавана на фронт і будаўніцтва ўмацаванняў. Баі былі вельмі жорсткімі. На подступах да Жлобіна, каля маёнтка Астрэманск, м. Стрэшын, в. Якімава Слабада разам з часцямі Чырвонай Арміі ў баях удзельнічаў баявы атрад камуністаў Жлобінскай партыйнай арганізацыі, якім камандаваў кацельшчык паравознага дэпо, былы матрос Балтыйскага флоту, камуніст Г.Тамкоў.

Першамайскі суботнік у Жлобіне. 1920 г.

Наступленне праціўніка на подступах да Гомеля і Жлобіна зноў было спынена.

У гэтых баях польскія войскі прымянялі авіяцыю, прысланую ім краінамі Захада. Так, 9.5.1920 г. ў раёне Жлобіна 3 варожыя аэрапланы бамбілі і абстрэльвалі з кулямётаў часці Чырвонай Арміі. Але ў гэты час у паветры з'явіліся 2 савецкія самалёты і смела атакавалі праціўніка. Адзін самалёт быў пашкоджаны савецкім лётчыкам Сапожнікавым і папаў у рукі чырвонаармейцаў.

Вялікую дапамогу фронту аказвалі камсамольцы Жлобіна. Яны арганізавалі атрад і суправаджалі эшалоны з воінскімі грузамі, ахоўвалі чыгуначныя пуці. Калі навісла пагроза самому Жлобіну, усе камсамольцы атрымалі зброю і перайшлі на казарменнае становішча. Грамадзянская вайна з'явілася асобнай старонкай у гісторыі чыгуначнага вузла. Нездарма напярэдадні 10-годдзя Чырвонай Арміі Прэзідыум ЦВК БССР 6.2.1928 г. пастанавіў узнагародзіць станцыю Жлобін Заходняй чыгункі ордэнам Чырвонага Сцяга. (На жаль, аб далейшым лёсе дакумента і прынятага рашэння больш нічога невядома.)

У 2-й палавіне чэрвеня 1920 г. войскі Заходняга фронта перайшлі ў контрнаступленне. Пачалося і праз невялікі час завяршылася выгнанне інтэрвентаў за межы нашай краіны. Яна пераходзіць да мірнага будаўніцтва.

П.Я.Кірычэнка.

Дакументы сведчаць

ЗАГАД РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ВЫКАНКОМАЎ У ВАЛРЭЎКОМЫ

11 кастрычніка 1919 г.

Ввиду близости фронта, требующего от Советской власти напряженной революционной работы, уревком постановил: волисполкомы в Тихиничах, Кистенях, Луках, Стрешине и м. Жлобине реорганизовать в ревкомы в составе: одного представителя от 8-й дивизии и двух от волисполкомов, причем председатель волревкома назначается урсвкомом. Отделы волисполкомов продолжают свою работу, во всех случаях подчиняясь волревкому. Волревком объявляется высшей гражданской властью в пределах своей волости и подчиняется уревкому, уездному воснкому и начальникам боевых участков фронта.

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г. — июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 207.

З АНКЕТЫ ІНФАРМАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА ПАДАДДЗЕЛА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА

не пазней 23 кастрычніка 1919 г.

8. Сельских Советов числится ... в Старо-Руднянской волости 28, Стрешинской 30, Луковской 28. Во всех этих волостях сельские Советы организованы удовлетворительно.

Революционные комитеты БССР

(ноябрь 1918 г. — июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 214—215.

СА СПРАВАЗДАЧЫ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ РАБОЦЕ ЗА ЛЮТЫ 1920

Отдел здравоохранения

... В целях борьбы с эпидемией предпринято было устройство бани в Жлобине. Для этого отпущены деньги и материалы...

Революционные комитеты БССР

(ноябрь 1918 г. — июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961.

Удзельнікі рэвалюцыйных падзей і грамадзянскай вайны на Жлобіншчыне

АЛЬШАНСКІ — старшыня Жлобінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

БАБРОЎСКІ.

БАРАНАЎ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1896 у Жлобіне, у 1919 рулявы мотакацера № 48 Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

БАРАНАЎ Піліп Якаўлевіч, чырвонаармеец 10-га пагранпалка.

БАТУРА Майсей Касьянавіч.

БАТУРЫНА Е.

БІРУКОЎ Фёдар Раманавіч, н. ў 1893 у в. Рэкта.

БОНДАРАЎ Ілья Рыгоравіч, н. ў 1895 у Жлобіне, у 1919—1920 матрос Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

БОНДАРАЎ Сяргей Іванавіч, н. ў жніўні 1896 у Жлобіне, грузчык, электраманцёр лесазавода, рабочы электрастанцыі чыгуначнага вузла, прадстаўнік рэўсавета Жлобіна па выкананні Дэкрэта аб зямлі.

ВАГІН, машыніст паравоза.

ВАЛАСЕВІЧ, камісар паштова-тэлеграфнай сувязі.

ВАСІЛЬЕЎ Г.А.

ВОЛЬСКІ Павел Канстанцінавіч, канторшчык па распарадчай частцы руху станцыі Жлобін, памочнік начальніка раз'езда 378, сакратар рэўкома.

ГАЎРЫЛАЎ Іван Карнсевіч (1893—1921), н. ў в. Беліца, з мая 1920 матрос вартавога судна «Арол» Дняпроўскай ваеннай флатыліі, ваяваў каля Ніжняй Албы, Стрэшына, Жлобіна, загінуў у аварыі.

Г.А.Васільеў, удзельнік трох рэвалюцый.

ДЗЕМЯШЧОНАК, старшыня Надзвычайнай камісіі.

ДЗЕПЯНЧУК.

ДЗІМЕНТМАН, адзін з кіраўнікоў падполля.

ДРАПЕЗА Трафім Андрэевіч, н. ў 1898, чырвонаармеец.

ДУДАРАЎ Сяргей Раманавіч, н. ў 1892 у в. Навікі.

ЕЛІСЕЕЎ Канстанцін Рыгоравіч, н. ў 1892 у в. Навікі, чыгуначнік.

ЕЛІСЕЕЎ Сяргей Гаўрылавіч, н. ў 1896 у в. Навікі, слесар паравознага дэпо.

М.П.Жураўлёў.

Л.С.Каларажыо.

С.Каларажыо.

М.Г.Каліноўскі.

ЖУРАЎЛЁЎ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1898 у в. Кіцін. Служыў матросам на караблі «Петрапаўлаўск». Удзельнічаў у Кастрычніцкім узброеным паўстанні. Арганізатар і старшыня камун у в. Старыя Сцепы і Бяльчо. Загінуў у 1944 г. ў Польшчы.

ІВАНЧУК Лука.

ІВАНЧУК Мітрафан.

ІВАШКЕВІЧ І., рабочы чыгуначнага вузла, камендант станцыі.

КАВАЛЁЎ А., салдат воінскага поезда і ваенных майстэрняў, чырвонагвардзеец.

КАВАЛЁЎ Аляксей Мітрафанавіч, н. ў 1896 у в. Малевіцкая Карма.

А.М.Кавалёў.

КАВАЛЁЎ Павел.

КАЗЛОЎ Рыгор Сідаравіч, н. ў 1900 у в. Лясань, чырвонаармеец.

КАЗЛОЎСКІ Пётр Яфрэмавіч, н. ў 1896 у в. Завад, на ваеннай службе з 1917, з 14.3.1918 разведчык 2-й роты 151-га сп 17-й сд.

КАЛАРАДЖЫО Лсанід Сцяпанавіч, н. ў 1891, рабочы, вёў вялікую арганізацыйную работу па ўсталяванню савецкай улады ў Жлобіне.

КАЛАРАДЖЫО Сцяпан, балгарын, рабочы станцыі Жлобін, адзін з кіраўнікоў забастоўкі чыгуначнікаў у снежні 1905.

КАЛІНОЎСКІ Мікалай Георгіевіч, н. ў 1902 г. ў Жлобіне. З 1917 г. рабочы паравознага дэпо, падпольшчык. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1937—38 гг. рэпрэсіраваны. У Вялікую Айчынную вайну баец Жлобінскага знішчальнага батальёна, потым на фронце. У 1944 г. накіраваны на працу на адпаўленні чыгункі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Ганаровай граматай Прэзідыума ЦВК БССР, залатым гадзіннікам, медалямі. *П.Я.Кірычэнка.*

КАМЯКОВА Настасся Спірыдонаўна, чыгуначніца, падпольшчыца.

КАМЯКОЎ С., чыгуначнік, чырвонагвардзеец.

КАНАПЛЁЎ І.П.

КАНАПЛЯНІКАЎ Павел Міхайлавіч, н. ў в. Грабск, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, станаўлення савецкай улады і калгаснага ладу.

КАНДРАЦЕНКА Даніла Іванавіч, н. ў в. Чырвоны Бераг, баец Жлобінскага рэвалюцыйнага атрада, потым палка.

КАНДРАЦЕНКА Іван Іванавіч, н. ў в. Чырвоны Бераг, баец Жлобінскага рэвалюцыйнага палка.

КАНДРАЦЕНКА Рыгор Іванавіч, н. ў в. Чырвоны Бераг, баец Жлобінскага рэвалюцыйнага палка, загінуў на фронце каля г. Арэнбург.

П.М.Канаплянікаў.

А.М.Карповіч.

М.К.Паўлаў.

КАРПОВІЧ Адам Мікаласвіч (1860—1937), машыніст паравоза, удзельнік рэвалюцыйных падзей 1905 у Пецярбургу, першы старшыня рэвалюцыйнага камітэта і партыйнай арганізацыі РКП(б) у Жлобіне (1918—20). Пахаваны ў Гомелі.

КАРПОВІЧ Адольф Адамавіч, н. ў 1901, слесар-меднік, чырвонагвардзеец, камісар чыгуначнай Надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй, з 1919 на фронце, потым машыніст паравоза. Памёр у лютым 1946 у г. Днепрапятроўск.

КАРЦАЎ Рыгор Мікітавіч, н. ў в. Лукі.

КАРЫБСКІ Іван, рабочы, член рэўкома.

КАРЫБСКІ М.В.

КАРЫБСКІ Яўсей Сцяфанавіч, н. ў 1884 у Жлобіне, земляроб, токар паравознага дэпо, інспектар, інжынер па тэхніцы бяспекі.

КАСТЭНКА, селянін, кулямётчык партызанскага атрада пад камандаваннем С.Вілюгі.

КІРАЎ Пілін Барысавіч, н. ў 1897 у Стрэшыне, сігналыпчык кананерскай лодкі «Грозны» Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

КІРЫЧЭНКА Васіль Дзям'янавіч, н. ў 1897 на Селіванаўскіх хутарах (Кіраўскі сельсавет), загінуў на фронце ў 1919.

КІРЫЧЭНКА Якаў Дзям'янавіч, н. ў 1899 на Селіванаўскіх хутарах (Кіраўскі сельсавет), чырвонаармеец.

КЛІЦКІ Аляксей Карпавіч, н. ў в. Малевічы, добраахвотнік, з 3.12.1918 санітар 151-га сп.

КЛІЦКІ Міхаіл Васілевіч, н. ў 1893 у в. Малевічы, з 2.12.1918 чырвонаармеец 5-й роты 151-га сп.

КОРАБАЎ Н., рабочы, супрацоўнік Надзвычайнай камісіі.

КОТАЎ Сідар Сідаравіч, н. ў 1900 у в. Малыя Казловічы.

КУЛІК А., чырвонагвардзеец, падпольшчык, расстраляны нямецкімі акупантамі ў 1918.

КУЛЬБАКОЎ Васіль Герасімавіч, н. ў 1882 у Жлобіне, рабочы, камісар паравознага і вагоннага дэпо.

КУЛЬБАКОЎ Павел Давыдавіч, н. ў 1893 у Жлобіне, слесар паравознага дэпо.

КУЧАНАЎ М., салдат воінскага поезда і ваенных майстэрань, чырвонагвардзеец.

ЛАВЕЦКІ, машыніст паравознага дэпо.

ЛАНЦОЎ Іван, н. ў Жлобіне, з 26.1.1919 чырвонаармеец 149-га сп 17-й сд.

ЛУПСЯКОЎ Яўхім.

МАРОЗАВА М.

ПАГОДЗІН Яўсей Фёдаравіч, н. ў 1895 у в. Лукі, матрос Балтыйскага флоту.

ПАЎЛАЎ Мікалай Каленікавіч, н. ў 1887 у Жлобіне, рабочы, член часовага рэўкома з 1917, рэпрэсіраваны ў 1937, рэабілітаваны ў 1958.

ПАЎЛАЎ Уладзімір Каленікавіч, рабочы, член рэўкома.

ПАШКОЎСКІ, член рэўсавета ад сялян.

ПАШКОЎСКІ Васіль Сямёнавіч, н. ў в. Лебядзёўка, з 15.12.1918 чырвонаармеец 6-й роты 151-га сп.

ПАШКОЎСКІ Кірыл Іванавіч, н. ў в. Лебядзёўка, з 15.12.1918 чырвонаармеец 6-й роты 151-га сп.

ПАШКОЎСКІ Пракоп Іванавіч, н. ў в. Лебядзёўка, з 15.12.1918 чырвонаармеец 6-й роты 151-га сп.

ПЕЧУРЫХІН В.А.

ПЕЧУРЫХІН Уладзімір Якаўлевіч, чырвонагвардзеец, загінуў у 1918.

ПІЛІПЕНКА Васіль Усцінавіч, н. ў в. Гарбачоўка.

ПІНЧУК Аляксандр Іванавіч, н. ў 1900 у в. Ніжняя Алба, з 23.5.1919 санітар 151-га сп.

ПЫШАКОЎ, член рэўсавета ад сялян.

А.Ф.Сумрач.

Ф.С.Шумская.

ПЯНЬКОЎСКІ В.Т.

РАМАНЕНКА Аляксей Якаўлевіч.

РАМАНЕНКА Гаўрыла Васілевіч, н. ў 1898 у в. Чырвоны Бераг.

РАМАНЕНКА Дзмітрый.

РАМАНЕНКА Лсан Апанасавіч, н. ў Жлобіне, удзельнік 1-й сусветнай вайны і рэвалюцый 1917, матрос лінкора «Севастопаль», ваяваў пад Нарвай у 1918, у 1919—20 на кананерскай лодцы «Грамавы» Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

РОЗЕНБЕРГ Якаў Абрамавіч, камандзір Жлобінскага чырвонагвардзейскага атрада, потым палка, памёр ад ран у кастрычніку 1919.

РУДКОЎСКІ Іван Якаўлевіч.

РУДКОЎСКІ Канстанцін Якаўлевіч.

СВІРЫДАЎ Е., рабочы чыгуначнага вузла.

СЕРАБРАКОЎ П.М., член Бабруйскага камітэта РСДРП(б).

СІМІНОЎСКІ Майсей Ісакавіч, н. ў 1900 у в. Мормаль.

СІМУХІН Фама Макаравіч, н. ў 1898 у Жлобіне, закатаваны нямецкімі акупантамі ў 1918.

СКВЕРНОК Аляксандр Данілавіч, н. ў 1892 у Жлобіне, добраахвотнік, з 10.11.1918 камандзір 3-га ўзвода 151-га сп.

СКВЕРНОК Сяргей Данілавіч, н. ў 1897 у Жлобіне, добраахвотнік, чырвонаармеец 151-га сп.

СУМРАЧ А.Ф.

СЯЛІЦКІ, рабочы.

ТАЛПІНСКІ С.І., машыніст паравоза.

ТАМКОЎ Г., кацельшчык паравознага дэпо, камандзір баявога атрада камуністаў Жлобінскай партыйнай арганізацыі.

ТКАЧОЎ Мікіта.

ТРЫФАНАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1895 у Жлобіне, у 1920—21 лоцман караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

ТУКМАЧОЎ Мікалай, былы матрос-артылерыст, намеснік камандзіра Жлобінскага чырвонагвардзейскага атрада, потым палка.

ФРАНЦУЗАЎ Сцяпан Уладзіміравіч, н. ў 1901 у Жлобіне, з 13.3.1919 памочнік пісьмавадзіцеля 2-й роты 151-га сп.

ХАМЕНКА А.М., член рэўкома.

ХАМЯКОЎ С.П., член рэўкома.

ХОХАЎ.

ЦІМАШЭНКА Рыгор Фаміч, н. ў 1900 у Жлобіне, загінуў у 1919.

ЦІТОК Яўген Канстанцінавіч, н. ў 1892 у в. Новыя Пірэвічы, удзельнік усталявання савецкай улады ў Сярэдняй Азіі.

ЧАРНЯК П., салдат воінскага поезда і ваенных майстэрняў, чырвонагвардзеец.

ЧАРЦОЎ Фадзей Лазаравіч, н. ў 1900 у в. Папаратнае, з 26.9.1918 пешы разведчык 151-га сп.

ШАБЕКА Мікалай Аўрамавіч, нарадзіўся 5.1.1895 г. ў Жлобіне. Удзельнік грамадзянскай вайны на Беларусі. Працаваў у чыгуначным дэпо ст. Жлобін. У 1-ю сусветную вайну на Паўднёва-Заходнім фронце. Са снежня 1918 г. ў Чырвонай Арміі. Вызначыўся 29.9.1919 г. ў баях супраць войск буржуазнай Польшчы каля мяст. Камень Лепельскага павета; узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1910 г. ўдзельнічаў у баях за Мінск, пад Варшавай, у разгроме банд Булак-Балаховіча, у 1922 г. — у баях з бандамі басмачоў у Сярэдняй Азіі. Пазней працаваў фельчарам на чыгуначным транспарце. Памёр 6.2.1979 г.

ШАЎЦОЎ Дзмітрый Пятровіч.

ШКІРМАН Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1899 у в. Чырвоны Бераг.

ШКРАДАЎ Макар Міхайлавіч, н. ў 1893, матрос.

ШУМСКАЯ Фсадосія Савельеўна (1901—56), рабочая паравознага дэпо, падпольшчыца, член партыі з 1917.

ШУМСКІ Ціхан Савельевіч, н. ў 1903 на ст. Кошары Лібава-Роменскай чыгункі.

ЮШКОЎСКІ Аляксандр, н. ў в. Чырвонабярэжская Слабодка, камандзір батарэі.

ЯРАШАЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў в. Чырвоны Бераг.

ЯРАШАЎ Ціт.

Спіс складзены на падставе кнігі Н.В.Кухарава «Жлобін» (Мн., 1975), матэрыялаў Жлобінскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея, газ. «Камуніст» (за 10.2.1990); супрацоўніка Цэнтральнага ваенна-марскога музея ў г. Санкт-Пецярбург І.Я.Краўцова.

Камісар Смольнага

Міхаіл Васілевіч **Прыгароўскі** нарадзіўся ў 1893 г. ў сям'і настаяцеля Старараруднянскай царквы айца Васіля.

М.В.Прыгароўскі.

Пасля заканчэння мясцовай царкоўнаприходскай школы паступіў на вучобу ў Магілёўскую гімназію. Празмерная цікавасць да «крамолы» не дазволіла закончыць гэту ўстанову. Вучобу прадоўжыў у прыватнай гімназіі Яўневіча ў Смаленску. Тут, у Смаленску, Міхась збліжаецца з сацыял-дэмакратамі, знаёміцца з нелегальнай літаратурай, прымае ўдзел у першамайскай дэманстрацыі. Потым вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце на юрыдычным факультэце, працягваў рэвалюцыйную дзейнасць.

У 1915 г. быў арыштаваны. 5.11.1915 г. газета «Студенческие годы» паведамляла, што Міхаіл Прыгароўскі ўсё яшчэ знаходзіўся пад аховай у Доме папярэдняга зняволення. Суд апраўдаў Міхася за недаказанасцю віны. Тым не менш Прыгароўскі быў выключаны з універсітэта. А ў маі 1916 г. ён быў залічаны юнкерам у 2-ю Пецяргофскую школу прапаршчыкаў. Пасля заканчэння яе праходзіў службу ў 159-м запасным пяхотным палку ў Гжацку. Тут ён сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю, быў выбраны вайскоўцамі старшынёй выканкома гарнізоннага Савета салдацкіх дэпутатаў і рэдактарам газеты «Голос солдата», якую выдаваў Савет. У красавіку 1917 г. Прыгароўскі здаў паўнамоцтвы і накіраваўся ў Петраград.

Свае шматлікія і разнастайныя функцыі ад'ютанта Каменданцкага ўпраўлення Цэнтральнага выканаўчага камітэта Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Прыгароўскі спалучаў з выступленнямі ў Саветах, у фабрычна-заводскіх камітэтах і на мітынгах, арганізацыяй вулічных шэсцяў.

У кастрычніку пры Петраградскім Савеце быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт. У яго разам з Антонавым-Аўсеенка, Дзяржынскім, Залуцкім, Падвойскім, Свярдловым і іншымі рэвалюцыянерамі ўвайшоў таксама Міхаіл Прыгароўскі. Такім чынам ён стаў членам штаба па падрыхтоўцы Кастрычніцкага ўзброенага паўстання.

Прыгароўскі быў прызначаны камісарам у Кексгольмскі полк, з якім ён прымаў удзел ва ўзброеным паўстанні. Атрад з салдат і матросаў пад камандаваннем Прыгароўскага займаў цэнтральную тэлефонную станцыю, Дзяржаўны банк, іншыя важныя аб'екты. У ноч з 25-га на 26-е кастрычніка ўдзельнічаў у асадзе і штурме Зімняга палаца.

28 кастрычніка Ваенна-рэвалюцыйны камітэт прызначыў Прыгароўскага камендантам Смольнага інстытута, Зімняга, Таўрычаскага і Марыінскага палацаў. Ім былі прыняты неабходныя меры па захаванні гістарычных каштоўнасцей. У «Звароце» ад салдат і матросаў ад імя камісараў па ахове музеяў гаварылася: «Мы призываем Вас немедленно обратиться с требованием к тем товарищам, которые по малосознательности или неразумению присвоили себе предметы исключительной художественной и исторической ценности, немедленно таковые вернуть в Комендантство Зимнего дворца. Мы верим, что все комитеты, равно и как отдельные товарищи, исполнят свой революционный долг и приложат все усилия к тому, чтобы вернуть народу его утраченные сокровища». (Петроградский Военно-революционный комитет. М., 1966. Т. 1. С. 265.)

У канцы кастрычніка на Петраград рушылі войскі Керанскага і Краснова; у самым горадзе становішча было вельмі напружаным. Для ўзмацнення аховы Смольнага, які з'яўляўся ўрадавай рэзідэнцыяй, Ваенна-рэвалюцыйны камітэт прызначыў чатырох камісараў. Галоўным камісарам Смольнага быў пастаўлены Прыгароўскі.

Хутка Петраградскі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт накіраваў на дапамогу маскоўскім рабочым чырвонагвардзейскі атрад, у якім Прыгароўскі быў прызначаны на пасаду камісара. Выканаўшы баявое заданне, атрад вярнуўся ў Петраград.

Для Прыгароўскага спакойных дзён не бывала. То ён выконваў даручэнне аб расследаванні дзейнасці распарадчага камітэта Дзяржаўнай думы, то займаўся іншымі спра-

вамі, а вечарамі, схіліўшыся над аркушам паперы, спрабаваў занатаваць свае думкі. У канцы лістапада (па старым стылі) Прыгароўскі быў прызначаны камендантам Таўрычаскага палаца.

Ішоў 1918 год. Дзве нямецкія дывізіі егераў і выдатна ўзброеныя белафінскія часці цяснілі фінскую Чырвоную гвардыю ў лясы і балоты з веткі фінляндскай чыгункі, якая злучала ўсходнюю Фінляндыю і поўнач Ладажскага возера з Петраградам. Рэвалюцыйная сталіца ў красавіку 1918 г. паслала на дапамогу ёй зводны атрад петраградскіх чырвонагвардзейцаў. Камандзірам атрада быў прызначаны М.Прыгароўскі.

Як і зборы, дарога была нядоўгай. Вось ужо і станцыя Рауту. Пададзена каманда выгружацца з цяплушак. Пад вечар завязаўся бой. Ён быў доўгі і люты.

Нарэшце ўсталявалася цішыня. А назаўтра і ў наступныя дні атакі накатваліся, як марскія хвалі. Белагвардзейцы акружылі станцыю. Становішча асаджаных было надзвычай цяжкім, дзве трэціх былі паранены ці забіты. Канчаліся боепрыпасы.

Ноччу ў штабе сабраліся камандзіры атрадаў. Выслухаўшы выказаныя думкі, Прыгароўскі спакойна і цвёрда заключыў: «Так і рашаем: прабівацца. Патронаў няма — ёсць штыкі і гранаты. Тры дні баёў паказалі, што мы не проста зводны атрад, а баявая адзінка. Асада, якую мы вытрымалі, не зламала наш дух, дык не зломіць нашу мужнасць і цяжкасць наступлення. У нас у Беларусі кажуць: «Няма страху наперадзе, калі страх той ззаду».

Нягледзячы на раненне, Прыгароўскі працягваў кіраваць баявымі дзеяннямі. Атрад пад яго камандаваннем у колькасці 600 чалавек, перайшоўшы ў наступленне, прарваў акружэнне. Аднак чырвонагвардзейцы хутка зноў былі акружаны падаспеўшым варожым рэзервам. У няроўным і цяжкім баі смерцю храбрых загінуў камандзір атрада М.В.Прыгароўскі.

ХРОНІКА. «В районе этой станции в марте — апреле 1918 года, защищая подступы к Петрограду, в боях с немецко-белофинскими войсками героически сражались петроградские, уральские и финские красногвардейцы. Многие из них погибли смертью храбрых. Среди погибших — командующий сводными силами красногвардейцев М.В.Пригоровский и начальник финского красногвардейского отряда Х.Мюллюс» (Мемарыяльная дошка на будынку вакзала станцыі Сасова (былая Рауту).

«После смерти Пригоровского осталась семья: жена Зинаида Андреевна и сын Андрей». (З даведкі народнага камісарыята па ваенных і марскіх справах СССР і Рэвалюцыйнага Савета № 50 579 ад 27 снежня 1927 г.)

П.Я.Кірычэнка.

Друкуецца паводле кнігі А.Капусціна «На хвалях Нявы». Мн., 1992 г.

Браняпоезд ішоў з баямі

Кастрычніцкая рэвалюцыя за кароткі тэрмін перамагла на большай частцы былой Расійскай імперыі, на Паўночным і Заходнім франтах. Аднак у Магілёве працягвала існаваць і ажыццяўляла сваю дзейнасць Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Да сярэдзіны лістапада 1917 г. яна ператварылася ў цэнтр мабілізацыі сіл для барацьбы з рэвалюцыяй. Спроба Савета Народных Камісараў прыцягнуць выконваючага пасаду вярхоўнага галоўнакамандуючага М.М.Духоніна для вырашэння паўстаўшых задач станоўчага водгуку не знайшла. Наадварот, у стаўку збіраліся контррэвалюцыйныя сілы, лідэры розных партый, і яна, па сутнасці, стала галоўнай перашкодай на шляху да перагавораў з германскім камандаваннем аб міры.

У такой абстаноўцы У.І.Ленін ад імя Савецкага ўрада адхіліў Духоніна ад займаемай пасады, на якую прызначаўся бальшавік М.В.Крыленка. На Магілёў пачалі наступ рэвалюцыйныя сілы з трох бакоў. На адным з маршрутаў знаходзіўся Жлобін. Праз яго з поўдня павінен быў рухацца атрад на чале з членам ВРК 2-й арміі Е.І.Лысяковым, у састаў якога павінен быў увайсці 1-ы мінскі рэвалюцыйны браняпоезд імя Леніна.

Гісторыя яго такая. Пабудаваны ў 1916 г. на Іжорскім заводзе пад Петраградам па асобаму заданню і прызначаўся для марскога ведамства. У чэрвені 1917 г. ўкамплектаваны маракамі Балтыйскага флоту (адсюль і якары на бартах). Браняпоезд серыі «Ян» быў унікальнай мадэлі, валодаў вялікай «цягавай» сілай і скорасцю, высокай манеўранасцю, за

што яго любоўна называлі «бегунок», меў моцную браню, 3 трохдзюймавыя і 3 38-міліметровыя хуткастрэльныя гарматы, 4 цяжкія кулямёты і 180 чалавек каманды. Гэта была сапраўдная крэпасць на калёсах. У кастрычніку 1917 г. браняпоезд перайшоў на бок рэвалюцыі.

Да вечара 20 лістапада 1-ы мінскі рэвалюцыйны браняпоезд імя Леніна прыбыў у Бабруйск. Яго камандзір Васіль Андрыянавіч Пралыгін атрымаў звесткі аб тым, што 9 батальёнаў «ударнікаў» быццам бы ішлі на Магілёў з мэтай выратавання Стаўкі. На самой жа справе старой Стаўкі ўжо не існавала. Духонін быў забіты, члены агульнаармейскага камітэта арыштаваны, некаторая частка верных Стаўцы вайсковых часцей і падраздзяленняў накіравалася на поўдзень — на Дон і Кубань. Вось на іх шляху і стаў атрад Пралыгіна.

У Бабруйску камандзір браняпоезда атрымаў пацвярджэнне аб распалажэнні варожых войск у Жлобіне. Камандаванне атрада прымае рашэнне ісці на сутыкненне з праціўнікам, і ў адну гадзіну ночы 21 лістапада браняпоезд рушыў наперад. У 9 гадзін разведка данесла: за 7—8 вёрст ад Жлобіна пуць узарваны. Камандзір меў звесткі, што праціўнік мае намер узарваць палатно ззаду браняпоезда, пазбавіць яго манеўру, а потым пачаць наступ і знішчыць баявую адзінку.

Каб не дапусціць гэтага, браняпоезд спынілі, у бок Жлобіна выслалі невялікую ахову. Праз некаторы час атрымалі данясенне ад разведкі, што з боку Жлобіна насустрач браняпоезду рухаюцца 2 варожыя ўдарныя батальёны. Былі прыняты меры перасцярогі, і галоўны эшалон у начной цемры стаў марудна прасоўвацца ў бок Жлобіна.

Раніцай паравоз-разведчык падышоў да Чырвонага Берага і даў умоўны сігнал асноўным сілам, якія ў гэты час знаходзіліся ззаду прыкладна за 21 вярсту. Тыя спыніліся. Хутка стала вядома, што станцыя і яе ваколіцы заняты пяхотай праціўніка. Адбылося сутыкненне супрацьстаячых сіл.

Бой працягваўся 5 гадзін і быў выйграны байцамі пралыгінскага атрада. Яны поўнасцю разграмілі 2 батальёны «ўдарнікаў». Не дапамаглі ім ні ўпартасць, ні нават здрада сына дарожнага майстра, які ў самы разгар бою спрабаваў употай правесці салдат праціўніка ў тыл наступаючых. Але камандзір браняпоезда быў папярэджаны пуцявым вартаўніком, і задуму ворага сарвалі. Здраднік разам з 60 варожымі афіцэрамі і салдатамі папаў у палон.

Палкавы салдацкі камітэт 3-га палка 2-й арміі заходняга фронту. У цэнтры — старшыня камітэта В.І.Пралыгін.

Аднак выйграны бой яшчэ не азначаў канца ваенных дзеянняў. Разведка паведамляла, што ў Жлобіне знаходзілася многа духонінскіх часцей, такіх жа стойкіх, як і разбітыя батальёны.

Пасля невялікага адпачынку пачаліся работы ў 2 змены па рамонту чыгуначнага пуці. Байцы стараліся хутчэй адкрыць дарогу на Жлобін. На досвітку камандаванне атрада атрымала паведамленне, што ў 2-й палове ночы, пад уздзеяннем звестак аб разгроме 2 батальёнаў у Чырвоным Беразе «ўдарнікі» ўзбунтаваліся, перабілі частку сваіх афіцэраў і ўцяклі са Жлобіна. 22 лістапада 1917 г. ў 10 гадзін браняпоезд прыбыў на станцыю. Байцы браняпоезда, пехацінцы і сапёры правяралі і рыхтавалі зброю і тэхніку, а тыя, хто ўжо справіўся з гэтым, хадзілі ўздоўж пуцей. Загад нікуды нікому не адлучацца выконваўся бездакорна. Тым часам камандзір са сваімі памочнікамі і невялікай групай байцоў наводзіў парадак на вакзале: адхіляў ад кіраўніцтва старое начальства, прызначаў новае. Дарэчы, не абыйшоў камандзір сваёй увагай пуцявога вартаўніка. Улічваючы яго адукаванасць, веданне справы, Пралыгін прызначыў яго пуцявым майстрам замест таго, сын якога дапамагаў «ударнікам», якія на той час аб'ядналіся для сумесных дзеянняў з польскім легіёнам са штабам у Рагачове.

У 12 гадзін дня ў Жлобін прыйшоў састаў, у якім з Магілёва ехалі матросы, а прыкладна праз 2 гадзіны з'явіўся эшалон Е.І.Лысякова — члена ВРК 2-й арміі, да якога павінен быў далучыцца браняпоезд. Е.І.Лысякову быў дадзены загад здаць камандаванне атрадам, а Пралыгіну ўзначаліць яго і накіравацца ў Гомель для затрымкі Карнілава.

Пачаліся зборы. Яны занялі амаль суткі, і байцы атрада Пралыгіна адправіліся са Жлобіна пасля абеду 23 лістапада. Эшалон матросаў накіраваўся ў паўднёвым напрамку.

Пакідаючы Жлобін, В.А.Пралыгін паклапаціўся аб узмацненні яго абароназдольнасці і для аховы чыгуначнага вузла перадаў батальён пяхоты і 2 зенітныя гарматы.

П.Я.Кірычэнка.

Друкуецца паводле дакументальнай аповесці М.А.Вінагорава «Ад Мінска да Сімбірска». Мн., 1980.

Першы жлобінскі рэвалюцыйны полк

Вестка аб Кастрычніцкай рэвалюцыі і звяржэнні Часовага ўрада хутка абляцела ўсе гарады і вёскі. У гэты час я служыў у лейбгвардыі Валынскім палку. У кастрычніку 1917 г. мяне накіравалі з сакрэтным пакетам у штаб асобай 12-й арміі, які знаходзіўся ў Гомелі. Але штаба там не аказалася. Сустрэўшыся з аднавяскоўцам Лузганавым, рашылі паехаць у Петраград. На станцыі Жлобін нас затрымалі.

Да нас падышоў малады чалавек у афіцэрскім мундзіры, але без пагон. Ён праверыў дакументы. Я падаў пакет. Прачытаўшы яго, ён пачаў расказваць аб рэвалюцыі і аб тым, што для яе заваёў абароны неабходны салдаты.

Параіўшыся з Лузганавым, мы засталіся ў Жлобіне. Чалавек у афіцэрскім мундзіры назваў сябе Крыленка, начальнікам штаба гарнізона і камендантам станцыі Жлобін. Нас накіравалі на ноч у вагон, які знаходзіўся непадалёку. У ім ужо было некалькі салдат.

На другі дзень па загаду камандзіра Салаўёва мы ўстанавілі 2 дальнабойныя гарматы непадалёку ад станцыі. Адну замацавалі за мной, другую даручыць не было каму. Я стаў наводчыкам, а мой сябра Лузганаў другім нумарам. Праз 2 дні Крыленка прыслаў яшчэ некалькі салдат. Два з іх былі са Жлобінскага раёна — матросы Лупсякоў і Новікаў.

З гэтага і пачалося новае франтавое жыццё. Мы сталі ваяваць за маладую Савецкую рэспубліку, за зямлю і волю.

Праз разведку стала вядома, што на Жлобін рыхтуюць напад польскія легіянеры, якія ў гэты час знаходзіліся ў Рагачове. З Петраграда да нас прыбыў невялікі атрад чырвонагвардзейцаў пад камандаваннем Бярэзіна. У пачатку снежня польскім легіянерам удалося ўварвацца ў Жлобін. Начальнік штаба Крыленка быў зверскі забіты.

На досвітку мы ўзялі паравоз, прычапілі да яго вагоны, на якіх устанавілі кулямёты, і паехалі ў Рагачоў. Пад'язджаючы да моста праз раку Друць, заўважылі, што палякі спакойна займаліся страявой падрыхтоўкай. Бярэзін, які знаходзіўся на паравозе, падаў каманду — і застракаталі кулямёты. Амаль усе палякі, якія знаходзіліся на плошчы, былі забіты.

На пахаванні Крыленкі мы далі клятву — змагацца з белагвардзейшчынай і контррэвалюцыяй. Быў створаны батарэйны савет. Старшынёй яго быў абраны Варонін. Я, Лузганаў, Лупсякоў, Салаўёў увайшлі ў склад савета. Тут жа далі назву батарэі — «1-я рэвалюцыйная».

Для забеспячэння нармальнага жыцця насельніцтва Жлобіна мы пагрузіліся ў вагоны і выехалі ў Чырвоны Бераг, дзе занялі агнявую пазіцыю і вялі абстрэл праціўніка. У гэты час у батарэю прыйшло многа чырвонабярэжскіх таварышаў: Ярашавы Андрэй і Павел, Кандраценкі Даніла, Іван і Пятро, Кавалёў Павел і іншыя. Рух паяздоў з Мінска і Рагачова і ў самім Жлобіне быў спынены. На чыгункі ўстанавілі ўзброеныя кантрольныя пасты.

1-я рэвалюцыйная батарэя стойка абаранялa рубяжы ад польскіх войск. Па чыгунцы з Мінска ў напрамку Жлобіна ішлі эшалоны з фронту. Многія салдаты заставаліся ў нашай батарэі.

Пасля баёў пад Чырвоным Берагам атрымалі загад выехаць у Жлобін, а затым у Гомель і далей у Бахмач, Бранск. Дзейнасць батарэі вядома галоўнаму камандаванню, і нам быў дадзены загад выехаць у горад Сызрань. Сызранскі рэўком аказаў неабходную дапамогу. У батарэю ўлілося многа новых людзей. Наспела неабходнасць стварыць полк цяжкай артылерыі. На батарэйным савеце было вырашана называць злучэнне Жлобінскім рэвалюцыйным

добраахвотным палком, паколькі ў яго складзе было многа жлабінчан.

Праз некалькі дзён полк атрымаў загад абяззброіць чэхаславацкі корпус, які знаходзіўся ў горадзе Самара. Гэтую аперацыю правялі паспяхова. Камандаваў палком Якаў Абрамавіч Розенберг. Я быў камандзірам першай батарэі і старшынёй палкавога савета.

Артылерыйскі полк рос і ўзбройваўся. Жорсткія баі ён вёў у Арэнбургу, у Ташкенце, Мерве з басмачамі, а таксама ў Акцюбінску і іншых гарадах Расіі.

У жніўні 1918 г. камандзір палка Я.А.Розенберг быў цяжка паранены. Урачы не змаглі выратаваць жыццё адважнага камандзіра. Яго пахавалі ў Ташкенце.

Баявыя справы Жлобінскага палка адлюстраваны ў кнігах «За Савецкі Туркестан» і «За Савецкі Туркменістан» (1963).

Дакументы аб Жлобінскім палку і яго камандзіры Я.А.Розенбергу захоўваліся ў былым партархіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Туркменіі. Імем Я.А.Розенберга названа адна з вуліц г. Арэнбург. За 50 км ад горада знаходзіцца чыгуначная станцыя імя адважнага камандзіра.

В.Дзямешка.

Пайшлі добраахвотнікамі

Ранняй вясной 1919 г. ў вёску Кабанаўка вярнуўся з фронту Пётр Ігнатавіч Свяршчэўскі. Ён добра разбіраўся ў палітыцы, ведаў пра справы на франтах грамадзянскай вайны, шмат чаго расказваў вяскоўцам. Іх найбольш хвалявала, зразумела, пытанне аб зямлі, далейшым жыцці. Часта размова заходзіла пра падзеі ў свеце, пра тое, што маладой Рэспубліцы Саветаў пагражалі ворагі. Моладзь вырашыла дапамагчы Леніну абараніць Савецкую ўладу. 26 хлопцаў з вёскі накіраваліся ў Рэчыцу (тады гэта быў цэнтр павета, у склад якога ўваходзіла вёска Кабанаўка). Хутка яны апынуліся на прызыўным пункце і заявілі ваеннаму камісару аб жаданні стаць чырвонымі байцамі. Усе яны ваявалі супраць арміі генерала Дзянікіна, не зганьбілі сваіх імён, да канца былі вернымі воінскай прысязе. Паразнаму складаўся іх лёс. Адзінаццаць маіх землякоў склалі свае галовы ў баях за новую долю, загінулі на грамадзянскай вайне, і іх светлы вобраз назаўсёды застаўся ў памяці і сэрцах вяскоўцаў. У ліку загінуўшых быў мой дзядзька Ануфрый Ермалаевіч Злынаў. Дзядзька Карп вярнуўся з фронту цяжка паранены.

Прайшлі гады, і кожны з тых, хто вясной 1919 г. добраахвотна пайшоў абараняць новую ўладу, зноў апынуўся ў ліку першых. Так, былы будзёнавец Майсей Касьянавіч Батура прыняў удзел у стварэнні калгаса, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся памочнікам народных мсціўцаў партызанскага атрада «Жалязняк». Пазней пайшоў змагацца з ворагам у дзеючую армію. Другі кавалерыст арміі Будзённага Павел Андрэевіч Антуськоў быў добрым земляробам. Ён загінуў на фронце Вялікай Айчыннай вайны, куды пайшоў таксама добраахвотна.

Былыя добраахвотнікі Цярэнцій Сяргеевіч Кілянкоў і Іван Іларыёнавіч Картаёў прайшлі праз гады калектывізацыі і ліхалецце Вялікай Айчыннай вайны, пакінулі добры след на зямлі.

Г.В.Злынаў.

У баях на Дняпры

У час баявых дзеянняў часцей 10-й і 57-й стралковых дывізій Чырвонай Арміі супраць польскіх войск наземныя войскі актыўна падтрымлівалі артылерыйскім агнём кананерскія лодкі Дняпроўскай ваеннай флатыліі «Грамавы», «Гарачы» і «Гучны» і бранякатэр № 4. Гэтыя караблі, пачынаючы з 28 красавіка 1920 г., знаходзіліся пад камандаваннем начальніка 2-га дывізіёна ваеннага марака Барыса Львовіча Дандрэ і камісара дывізіёна Васіля Іванавіча Дзядлоўскага і з 10 мая курсіравалі ў раёне вёсак Верхняя і Ніжняя Алба, наносілі артылерыйскія ўдары па пераправах і наступаючым праціўніку, які ім-

кнуўся захапіць Жлобін і Рагачоў. Знаходжанне караблёў на фронце ў адрыве ад баз забеспячэння стала небяспечным, і было вырашана зрабіць базай г. Рагачоў. Да таго ж на выпадак магчымай абароны горада караблі павінны былі стаць трывалай заслонай на шляху палякаў. Тым больш, што вышэй Рагачова судны з-за меляў і перакатаў падняцца не маглі.

Стаянка ў Рагачове не была пастаяннай, адсюль кананерскія лодкі адпраўляліся ў раён баявых дзеянняў. Так, канлодка «Гарачы» 19 мая накіравалася з Рагачова на фронт з запасам снарадаў, паліва і харчавання для вартавых суднаў «Арол», «Беркут» і судна сувязі «Літвінка». 20 мая па загаду камандзіра 29-й стралковай брыгады «Гарачы» вёў артылерыйскі абстрэл пазіцый, што знаходзіліся ля дарогі Шыхаў — Ніжняя Алба. У выніку інтэнсіўнай стральбы на кармавой гармаце трэснуў ствол: страляць стала немагчыма, і на другі дзень канлодка вярнулася ў Рагачоў. Камандзірам «Гарачага» быў марак-чарнаморац Іван Мацвеевіч Іваноў, камісарам — марак-балтыец Іван Якаўлевіч Сарапульцаў.

Судны флатыліі былі жахам для праціўніка, які панёс ад іх трапнага агню немалыя страты. З 18 па 23 мая стаянка караблёў у Рагачове і сам горад некалькі разоў былі бамбардзіраваны польскай авіяцыяй. Аднак зенітная артылерыя «Грамавога» і бранякатэра № 4 адбілі атаку варожых аэрапланаў. 24 мая на фронт з Рагачова была накіравана канлодка «Гучны», а на другі дзень са штаба 2-га дывізіёна караблёў — канлодка «Гарачы». 25 мая канлодкі вялі артылерыйскі агонь па праціўніку ў Горвалі, сарвалі спробу палякаў захапіць в. Ніжняя Алба.

30 мая каля Стрэшына палякі наладзілі засаду з мэтай знішчэння караблёў. Аднак, дзякуючы зладжаным дзеянням маракоў, пасля трохгадзіннага моцнага бою судны прарваліся праз заслону, дайшлі да Затона.

Гарачае і сухое лета выклікала моцнае абмяленне Дняпра, што не давала магчымасці лодкам пакінуць Рагачоўскі рэйд і накіравацца на фронт. Перыядычна з фронту ў Рагачоў прыбывалі і адплывалі вартавыя судны «Арол» і «Беркут», а таксама дапаможныя судны «Проня», «Слава», «Леў», «Бесядзь», «Эльза», «Магілёў», «Усход», судна сувязі флатыліі «Літвінка». Бранякатэр №4 з-за сур'ёзнай няспраўнасці матора ўвесь перыяд знаходзіўся ў Рагачове.

Аб далейшых дзеяннях караблёў паведамляецца ў рапарце Б.Л.Дандрэ ад 26 чэрвеня: «На суднах у Рагачове праводзяцца практычныя заняткі па артылерыі: разборка і зборка замкоў, гармат, кулямётаў, штодзённа заняткі з сігнальшчыкамі, практычная стральба з вінтовак і кулямётаў. Чытаюцца лекцыі па тактыцы. Фарватэр ад Рагачова да Жлобіна праходны, хоць і з цяжкасцю. У цяперашні час мной арганізавана дастаўка дроў у Рагачоў, Жлобін, Стрэшын. Дровы дастаўляюцца падводамі праз райлескантору Рагачова. У Рагачове стаіць баржа з дровамі (каля 25 кубаметраў), якую ў любы час можна адбуксіраваць у Жлобін або Стрэшын. Забеспячэнне харчаваннем здавальняючае: мяса, хлеб, бульбу атрымліваю з 10-й арміі, паўднёвую групу забяспечваю харчаваннем і артылерыйскімі запасамі дапаможным суднам «Эльза», а таксама дастаўляем дровы са Свержаня ў Рагачоў. Гаспадарчы, артылерыйскі і машынны склады перамешчаны на прысланы ў маё распараджэнне параход «Магілёў». З 6 па 10 чэрвеня канлодкі баёў не вялі з-за моцнага абмялення ракі ...». З 10 па 19 чэрвеня судны дывізіёна ўдзельнічалі ў баях каля Жлобіна, Ніжняй і Верхняй Албы, Горваля і Стрэшына.

7 ліпеня 1920 г. камандуючы 16-й арміяй загадаў караблям 2-га дывізіёна флатыліі адправіцца з Дняпра на Прыпяць, дзе яны ўдзельнічалі ў баях супраць адступаючых на захад польскіх войск. *І.Я.Краўцоў.*

Гаспадарчае будаўніцтва ў 1920-я — 30-я гады

З гісторыі адміністрацыйнага падзелу

Жлобінскі адміністрацыйны раён быў утвораны з тэрыторыі Жлобінскай і часткі Стрэшынскай воласцей.

Жлобінская воласць Рагачоўскага павета Гомельскай губерні заснавана 9.5.1923 г. з частак тэрыторый Гарадзецкай, Лукаўскай, Старарудняскай і Стрэшынскай воласцей.

Гарадзецкая, Лукаўская і Старарудняская воласці адносіліся да Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. 26.4.1919 г. яны ўвайшлі ў склад Гомельскай губерні, якая адносілася да Расійскай Федэрацыі. Лукаўская і Старарудн-



Макет браняпоезда ў Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

нянская воласці 9.5.1923 г. ліквідаваны, іх тэрыторыя размеркавана паміж Жлобінскай, Кашалёўскай і Рагачоўскай воласцямі.

Стрэшынская воласць уваходзіла ў склад Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, з 26.4.1919 г. — Гомельскай губерні, якая ўваходзіла ў склад РСФСР. 9.5.1923 г. да яе далучана тэрыторыя Якімава-Слабодскай воласці Рэчыцкага павета (Забярэзінскі ўчастак).

3.3.1924 г. ўсе воласці ўвайшлі ў склад БССР, 17.7.1924 г. ліквідаваны, іх тэрыторыя аднесена да Бабруйскай акругі.

За першыя 50 гадоў існавання тэхнікум выпусціў 4300 спецыялістаў.

У.С.Емяльяненка, В.А.Бычкова.

Першыя трактарысты Жлобінскай МТС

БІРУКОЎ Захар Раманавіч (в. Рэкта).
БОБРЫК Марыя Сафонаўна (в. Майскае).
ГЕРАСІМАЎ Антон Іосіфавіч (в. Святое).
ГЕРМАНОВІЧ Барыс Львовіч (в. Адраджэнне).
ДЗЯТЛАЎ Васіль Антонавіч (в. Змяёўка).
ІСАЕНКА Міхаіл Тарасавіч (в. Кароткавічы).
КАРУНЧЫК Міхаіл Іванавіч (в. Змяёўка).
ЛІЎШЫЦ Залман Абрамавіч (в. Адраджэнне).
ТАРАСАВА Варвара (в. Малевічы).
ЦЯРЭШЧАНКА Анісім Рыгоравіч (в. Плесавіцкая Слабодка).

А.Р.Цярэшчанка.

ЧАЙКОЎСКАЯ Марыя Рыгораўна (в. Змяёўка).
ЯРАШЭВІЧ Кузьма Харытонавіч (в. Змяёўка).

П.Я.Кірычэнка.

Дакументы сведчаць

З ПАСТАНОВЫ БЮРО ЦК ЛКСМБ І НАРКАМЗЕМА БССР «АБ ВЫНІКАХ СПАБОРНІЦТВА ЖАНОЧЫХ ТРАКТАРНЫХ БРЫГАД»

9 снежня 1936 г.

Прызнаць пераможцай у спаборніцтве брыгаду Жлобінскай МТС, якая выпрацавала на трактар 615 га і выканала вытворчае заданне на 154 працэнты.

Прызнаць лепшай трактарысткай рэспублікі Савельеву Марыю, выпрацоўка якой у перакладзе на мяккас ворыва склала 1015 га.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Ахвяры масавых палітычных рэпрэсій

Рэпрэсіі 1930-х гадоў не абмінулі Жлобіншчыну. Добрасумленныя людзі, поўныя сіл і жадання працаваць, расціць хлеб, дзяцей, раптам станавіліся «ворагамі народа», страчвалі свабоду, а часта і жыццё. Якія толькі абвінавачанні не прыпісваліся ім: і прыналежнасць да нацыяналістычных шпіёнскіх арганізацый, і антысавецкая прапаганда, і агітацыя супраць калгасаў. Многія з іх пасля былі рэабілітаваны, але застаюцца яшчэ і такія, чый лёс невядомы сёння. Ідзе работа ў архівах, людзям вяртаюцца іх чэсныя імёны. Ніжэй прыводзяцца прозвішчы рэпрэсіраваных і рэабілітаваных жыхароў Жлобінскага раёна, якія сталі вядомыя ў працэсе работы над кнігай «Памяць».

АВЕРКІН Савасцьян Барысавіч, н. ў 1884 у в. Ляды Кабанаўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 10.3.1938. Рэабілітаваны 30.5.1960.

АНДРУХАЎ Сямён Емяльянавіч.

АРЛОЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. ў 1887 у в. Майскае Майскага с/с, беларус, грузчык Рагачоўскага цагельнага завода. Рэпрэсіраваны 28.9.1937. Рэабілітаваны.

АРАХОВІЧ Павел Георгіевіч, н. ў г. Жлобін, працаваў стрэлачнікам на чыгуначнай станцыі. Рэпрэсіраваны 6.10.1937. Рэабілітаваны пасмяротна 9.3.1957.

АРЛОЎСКАЯ Эмілія Іосіфаўна, н. ў 1923 у в. Замен-Рыння Шчадрынскага с/с, беларуска. Рэпрэсіравана 26.5.1931. Разам з бацькам выслана ў п. Мель Чардынскага р-на Пермскай вобл. Знаходзілася ў ссылцы да 10.9.1940. Рэабілітавана 14.5.1993.

АРЛОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. ў 1892 у в. Замен-Рыння Шчадрынскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.5.1931. Высланы ў п. Мель Чардынскага р-на Пермскай вобл., дзе пражываў да 9.4.1947. Рэабілітаваны 14.5.1993.

АРЦЕЕЎ Іван Сцяпанавіч.

АСАДЧЫ Пётр Захаравіч, н. ў 1893 у в. Істопкі Салонскага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 10.1.1989.

АСМАЛОЎСКІ Лука Іосіфавіч, н. ў в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с.

АСМАЛОЎСКІ Харытон Іосіфавіч, н. ў 1884 у в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АСТАШОЎ Васіль Нічыпаравіч, н. ў 1883. Рэпрэсіраваны 26.6.1938. Рэабілітаваны пасмяротна 13.9.1989.

АЎСЯНІКАЎ Марцін Дзмітрыевіч, н. ў 1885 у в. Жырхаўка Навамаркавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.5.1933. Рэабілітаваны 22.5.1961.

АЎСЯНІКАЎ Рыгор Сцяпанавіч (н. ў 1867 у в. Грабск Акцябрскага с/с), беларус, селянін-аднаасобнік і яго жонка **Аўсянікава Марфа Іванаўна** (н. ў 1868). Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 22.12.1992.

АФАНЬКОЎ Пётр Іосіфавіч, аднаасобнік, рэпрэсіраваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 12.9.1960.

АХРАМЧУК Сцяпан Мацвеевіч, н. ў 1883 у в. Сельнае Дабрагашчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Рэабілітаваны 12.9.1960.

БАБКОЎ Іван Аляксандравіч.

БАБУШКІН Ісідар Рыгоравіч, н. ў 1896, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны.

БАБШУКОЎ Тарас Яўхімавіч, н. ў 1884 у в. Старая Рудня Старарудзянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Знаходзіўся ў ссылцы з 1933 да 2.1.1938. Рэабілітаваны 15.10.1993.

БАБШУКОЎ Яўхім Сазонавіч, н. ў в. Скепня Пірэвіцкага с/с, беларус.

БАЙДАКОЎ Майсей Канстанцінавіч, рэпрэсіраваны 7.8.1937. Рэабілітаваны 14.3.1960.

БАЙДАКОЎ Марк Канстанцінавіч, н. ў в. Чорная Вірня Майскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.11.1941. Рэабілітаваны 19.10.1990.

БАЙДАКОЎ Фёдар Канстанцінавіч, н. ў 1874 у в. Асінаўка Майскага с/с, беларус, працаваў у сваёй гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАЙДАЛАЎ Піліп.

БАЛЯНКОЎ Васіль Якаўлевіч, н. ў 1884 у в. Скепня Пірэвіцкага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАЛЯНКОЎ Фёдар Восіпавіч, н. ў 1892 у в. Скепня Пірэвіцкага с/с, беларус, калгаснік. Рэпрэсіраваны 10.4.1933. Рэабілітаваны 27.9.1960.

БАНДАРЭНКА Пётр Андрэевіч, н. ў 1893 у в. Селівонаўка Кіраўскага с/с, беларус. Асуджаны ў 1932. Рэпрэсіраваны 3 сакавіка і 16.4.1933. Рэабілітаваны 23.8.1988.

БАРАНОЎСКІ Аўгусцін Іосіфавіч, н. ў 1887 у в. Калінаўка Навамаркавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 17.12.1937. Рэабілітаваны пасмяротна 19.6.1958.

БАХУН Сцяпан Мікалаевіч, н. ў 1884 у в. Сельнае Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 9.4.1933. Рэабілітаваны 11.4.1960.

БАЯРЧУК Раман Ціханавіч, н. ў 1882 у в. Баршчоўка Хойніцкага р-на, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.7.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕЛЫ Апанас Антонавіч.

БЕЛЬЧЫКАЎ Трафім Рыгоравіч, н. ў 1881 у в. Кірава Кіраўскага с/с, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.8.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕРАСНЕЎ Андрэй Фёдаравіч, н. ў 1908 у пас. Горкі Акцябрскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.1.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕРАСНЕЎ Фёдар Ісаевіч, н. ў 1878 у в. Акцябр Акцябрскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25.1.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БІКАЦ Аляксандр Яўменавіч, н. ў 1896, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.1.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БОБРЫКАВА Еўдакія Дзямідаўна, н. ў 1893 у в. Майскае Майскага с/с, беларуска. Рэпрэсіравана ў 1931. Выслана ў Гайнскі р-н Пермскай вобл. Рэабілітавана 29.7.1993.

БОБРЫКАВА Эльвіра Сцяпанаўна, н. ў 1940 і пражывала з бацькамі на спецпасяленні ў Гайнскім р-не Пермскай вобл. Рэабілітавана 29.7.1993.

БОБРЫКАЎ Арсенцій Антонавіч, н. ў 1893 у в. Майскае Майскага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны ў 1931. Высланы ў Гайнскі р-н Пермскай вобл. Рэабілітаваны 29.7.1993.

БОБРЫКАЎ Сцяпан Арсеньевіч, н. ў 1913 у в. Майскае Майскага с/с, беларус. У 1931 выслa-

ны ў Гайнскі р-н Пермскай вобл., дзе знаходзіўся да 1947. Рэабілітаваны 29.7.1993.

БОГДАНАнуфрый Сяргеевіч, н. ў в. Кароткавічы Кароткавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік.

БОГУШ Іван Аляксандравіч, н. ў 1877 у в. Завад Старарудняншкага с/с, аднаасобнік, рэпрэсіраваны 3.11.1931. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БУКЕТАЎ Васіль Максімавіч, н. ў 1923 у в. Пірэвічы Пірэвіцкага с/с. Рэпрэсіраваны 16.10.1943. Да арышту курсант палкавой школы малодшых камандзіраў. Рэабілітаваны ваенным трыбуналам Уральскай ваеннай акругі 15.7.1975.

ВАЛЧКОЎ Емяльян Ануфрыевіч, н. ў 1890 у в. Кірава Кіраўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 10.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВАСІЛЕВІЧ Апанас Ермалаевіч, н. ў 1904 у в. Зарэчча Шчадрынскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 12.2.1992.

ВЕРАСАЎ Дзмітрый Рыгоравіч.

ВЕРАСАЎ Рыгор Савельевіч.

ВЕРАСАЎ Сяргей Аляксеевіч.

ВОЙТЧАК Вікенцій Якаўлевіч, н. ў 1889, старшыня калгаса. Рэпрэсіраваны ў 1937. Пасмяротна рэабілітаваны.

ВОРАНАЎ Іван Сафронавіч, н. ў 1892 у в. Шчытнае Пірэвіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 10.4.1933. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ВЯРБІЦКІ Максім Максімавіч.

ГАЛЬМАК Захар Ермалаевіч.

ГАЛЬМАК Іван Філімонавіч, н. ў 1903 у в. Плесавічы Кароткавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАНЧАРОЎ Юрый Іванавіч, н. ў 1886 у в. Верхняя Алба Верхне-Албянскага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны пасмяротна 11.10.1963.

ГАРАНКОЎ Арсенцій Фядотавіч, н. ў в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с.

ГАЎРЫЛЕНКА Апанас Якаўлевіч, н. ў в. Васілевічы Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 3.4.1933. Рэабілітаваны 14.11.1960.

ГЕРАСІМЕНКА Апанас Васілевіч, н. ў в. Селівонаўка Кіраўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930 г. Рэабілітаваны 20.9.1992.

ГОНЧАНКА Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1888 у в. Новая Баршчоўка Лоеўскага р-на, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 24.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДАЎГЯЛА Рыгор Станіслававіч, н. ў 1898 у в. Казімірава Малевіцкага сельсавета, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Рэабілітаваны 19.6.1958.

ЕЛІСЕЕЎ Іван Гаўрылавіч, н. ў 1895 у в. Навікі Малевіцкага с/с. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны пасмяротна.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Кірыла Пятровіч, н. ў 1876 у в. Дзяніскавічы Майскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. У сакавіку 1931 быў высланы і знаходзіўся на спецпасяленні да снежня 1942. Рэабілітаваны 11.12.1992.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Яфрэм Харытонавіч, н. ў 1894 у в. Дабрагошча Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.9.1938. Рэабілітаваны пасмяротна.

ЕРАФЕЕЎ Лявон Міхайлавіч, н. ў 1881 у в. Чорная Вірня Майскага с/с, беларус, селянін. 23.10.1937 зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.7.1960.

ЕЎДАКОЎ Іван Міхайлавіч.

ЕЎДАКОЎ Міхаіл Алімпіевіч, н. ў в. Старая Рудня Старарудняншкага с/с, беларус, селянін. Рэпрэсіраваны ў 1930—1931. Рэабілітаваны 13.8.1990.

ЕЎТУШЭНКА Мікалай Іванавіч, н. ў в. Вуглы Нараўлянскага р-на, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 6.6.1991.

ЖАЛТОК Валяр'ян Савасцьянавіч, беларус, селянін. Рэпрэсіраваны 8.1.1933. Рэабілітаваны пасмяротна 1.4.1958.

ЖДАНОВІЧ Аляксей Фёдаравіч, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 21.6.1961.

ЖУКАЎ Ілья Лявонавіч, н. ў в. Праскурні Акцябрскага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны 5.6.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЖУКАЎ Стафей Іосіфавіч, н. ў 1888, рускі. У 1930 высланы з сям'ёй у Кіраўскую вобл. Рэабілітаваны 18.10.1991.

ЗАВАДСКІ Антон Антонавіч, н. ў 1887 у в. Рэкта Луцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. У 1930 высланы за межы рэспублікі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 2.8.1993.

ЗАКРЖЭЎСКІ Іосіф Францавіч, н. ў в. Чарцёж Чырвонабярэжскага с/с, селянін. Рэпрэсіраваны 27.4.1933. Рэабілітаваны пасмяротна 1.4.1958.

ЗАКРЖЭЎСКІ Сцяпан Лявонавіч, н. ў 1899, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Рэабілітаваны пасмяротна.

ЗАКРЭЎСКІ Баляслаў Леанардавіч, н. ў в. Падхваёва Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 3.4.1933. Рэабілітаваны 14.11.1960.

ЗАЛЕСКІ Аляксандр Сцяпанавіч.

ЗАРУБА Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1902 у в. Затоп Акцябрскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЗЯЗЮЛІН Савелій Сцяпанавіч, н. ў 1877 у в. Рэкта Луцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны.

ІВАНЬКОЎ Іларыён Гаўрылавіч, н. ў 1888 у в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с, беларус. Рэпрэсіраваны 17.3.1933, зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ІЛЬІНА Анастасія Міхайлаўна, н. ў 1894, беларуска, сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана 28.9.1937. Рэабілітавана.

КАВАЛЁЎ Павел Лявонавіч, н. ў 1899 у в. Селівонаўка Кіраўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.12.1932. Рэабілітаваны 11.2.1957.

КАВАЛЬЧУК Васіль Фёдаравіч.

КАВАЛЬЧУК Іван Рыгоравіч, н. ў 1906 у в. Вялікі Лес Кабанаўскага с/с, беларус, працаваў у сваёй гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАЗЛОЎ Аляксей Якаўлевіч.

КАЗЛОЎ Елісей Іларыёнавіч, н. ў 1870 у в. Скепня Пірэвіцкага с/с, беларус, калгаснік. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАЛУПАХА Іосіф Рыгоравіч, н. ў 1877 у в. Кароткавічы Кароткавіцкага сельсавета, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 11.6.1962.

КАМАРОВА Акуліна Мартынаўна (н. ў 1900 у в. Шыхаў Верхне-Албянскага с/с) і **КАМАРОЎ Яфрэм Кандратавіч** (н. ў 1906 у в. Шыхаў Верхне-Албянскага с/с) у 1930 раскулачаны і высланы ў п. Бісер Пермскай вобл. Рэабілітаваны 14.10.1994.

КАНАПЛЯНІКАЎ Мікіта Ціханавіч, н. ў 1884 у в. Радуцін Стрэшынскага п/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.6.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАПСКІ Даніла Мікітавіч, н. ў 1874 у в. Адрубы Кабанаўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932 і асуджаны да зняволення ў папраўча-працоўны лагер на 3 гады. Рэабілітаваны 7.9.1989.

КАПСКІ Пётр Данілавіч.

КАШАВАРАЎ Прохар Ільіч, н. ў 1865 у в. Ляды Кабанаўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.8.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАШТАЛЬЯН Рыгор Фядосавіч, н. ў 1879 у в. Казіміраўская Слабодка Чырвонабярэжскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 6.8.1993.

КІЗЕЕЎ Кірыла Нічыпаравіч, н. ў 1897 у в. Папаратнас Папаратнянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.3.1933. Зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 4.4.1960.

КІКІНЁЎ Конан Міхайлавіч.

КІСЯЛЁВА Лідзія Паўлаўна, н. ў 1914 у в. Плесавіцкая Слабодка Кароткавіцкага с/с, беларуска, сялянка-аднаасобніца. 7.6.1931 выслана ў Дабранскі р-н Пермскай вобл. Рэабілітавана 19.8.1993.

КІСЯЛЁЎ Павел Раманавіч (н. ў 1894) і **КІСЯЛЁВА Хрысціна Рыгораўна** (н. ў 1894 у в. Плесавіцкая Слабодка Кароткавіцкага с/с), беларусы, сяляне-аднаасобнікі. 7.6.1931 высланы ў Дабранскі р-н Пермскай вобл. Рэабілітаваны 19.8.1993.

КЛАЧКОЎ Яўхім Дзмітрыевіч, н. ў в. Змяёўка Чырвонабярэжскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.2.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КОЛЕСНЕЎ Іван Герасімавіч, н. ў 1880, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.3.1930. Рэабілітаваны 22.10.1991.

КОРЗУН Міхаіл Амбросьевіч, н. ў 1867 у в. Чорная Вірня Майскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.3.1932. Рэабілітаваны 19.4.1932.

КРУЧЫШЫН Ісай Ігнатавіч, н. ў в. Александроў Салонскага с/с.

КАЛАГАЎ Якаў Андрэевіч, н. ў в. Вялікі Лес, Кабанаўскага с/с.

КУЛАЖАНКА Даніла Фадзеевіч, н. ў 1895 у в. Чорная Вірня Майскага сельсавета, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУПЦОВЫ Іван Якаўлевіч (н. ў 1882 у в. Лясань Салонскага с/с, селянін-аднаасобнік) і яго жонка **Аляксандра Іванаўна**, рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 30.7.1933.

КУРБАЦКІ Васіль Конанавіч, н. ў 1877 на хутары Люсін Старарудняскага с/с, беларус. У 1930 высланы ў Пермскую вобл. Разам з ім былі высланы жонка Феадосія Мікалаеўна і дзеці Сцяпан, Вольга, Мікалай, Людміла, Марыя, Аўгусціна. 18.10.1991 Курбацкі і яго сям'я рэабілітаваны.

КУЧЫНСКІ Антон Апалінаравіч, н. ў 1877 у в. Каменка (пераселена ў в. Сыцін) Шчадрынскага с/с. Асуджаны 26.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны (даведка № 5-10 ад 26.5.1988).

КУЧЫНСКІ Валяр'ян Адольфавіч, н. ў 1902 у в. Сцяпы Шчадрынскага с/с, беларус, калгаснік. Рэпрэсіраваны 28.12.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУЧЫНСКІ Вільгельм Іосіфавіч, н. ў 1902, да арышту — 25.8.1937 — сакратар Радушскага с/с Жлобінскага р-на, асуджаны 22.10.1937, памёр 14.11.1937. Рэабілітаваны 26.5.1988.

КУЧЫНСКІ Станіслаў Апалінар'евіч, н. ў 1888 у в. Малінаўка Шчадрынскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 29.10.1937, зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў. Рэабілітаваны 13.5.1960.

ЛАБІКАЎ Радзівон Лук'янавіч, н. ў 1889 у в. Старая Рудня Старарудняскага с/с. Рэпрэсіраваны 2.8.1941. Рэабілітаваны 9.8.1993.

ЛАПІЦКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1915 у в. Гуцішча Рагачоўскага р-на, беларус. Рэпрэсіраваны 20.3.1930. Рэабілітаваны 13.8.1990.

ЛАПІЦКІ Іван Сцяпанавіч.

ЛАПЦЕЎ Захар Фёдаравіч, н. ў в. Істопкі Салонскага с/с.

ЛІСУН Апанас Мікалаевіч, в. Дворышча Шчадрынскага с/с.

ЛІТВІНЕНКА Сяргей Піліпавіч, н. ў 1912 у в. Забродзе Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў красавіку 1930. Рэабілітаваны 29.4.1992.

ЛЯВОНАЎ Кандрат Іванавіч, н. ў в. Старына Дабрагошчанскага с/с, беларус.

ЛЯВОНЕНКА Дзяніс Яўцехавіч, н. ў 1899 у в. Адрубы Кабанаўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛЯВОНЕНКА Рыгор Андрэевіч, н. ў в. Забродзе Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 3.4.1933. Рэабілітаваны 14.11.1960.

ЛЯСНЕЎСКІ Вікенцій Антонавіч, н. ў в. Чарцёж Чырвонабярэжскага с/с. Рэпрэсіраваны 11.1.1933. Рэабілітаваны.

ЛЯСЮК Пётр Іванавіч, н. ў 1891 у в. Баранаўка Старарудняскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 21.3.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЛЯСЮК Фёдар Іванавіч.

МАНЬКО Ігнат Ільіч, н. ў в. Дабрагошча Дабрагошчанскага с/с, беларус.

МАРКАЎ Сцяпан Дзям'янавіч, рэпрэсіраваны 29.11.1933. Рэабілітаваны 15.8.1991.

МАЦЫГУЛ Андрэй Парфімавіч, н. ў 1901 у в. Сякерычы Петрыкаўскага р-на, пражываў у в. Сцяпы Шчадрынскага с/с. Рэпрэсіраваны, памёр 21.7.1938. Рэабілітаваны.

МАШНІЦКІ Аксент Харытонавіч, н. ў 1877 у в. Майскае Майскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. 23.10.1937 зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.7.1960.

МАШНІЦКІ Марк Сямёнавіч, н. ў в. Майскае. 22.10.1941 зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.10.1990.

МЕЗЯНКОЎ Іосіф Трыфанавіч, н. ў в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с.

МЕЛЬНІКАЎ І., н. ў в. Старая Рудня Старарудняскага с/с.

МЕХАНІКАЎ Дзмітрый Паўлавіч, н. ў в. Рэкта Луцкага с/с.

МІНЯНКОЎ Кірыла Самуілавіч, н. ў 1881 у в. Нівы Салонскага с/с, беларус, селянін. Рэпрэсіраваны 25.11.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МІХАЛЬЦОЎ Васіль Дзмітрыевіч, н. ў в. Зломнае Стрэшынскага п/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.5.1933 і 30.9.1937. Рэабілітаваны 29.7.1960.

МЯДЗВЕДЗЕВА Ганна Васілеўна.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Дзмітрый Трафімавіч, н. ў 1871 у в. Ніжняя Алба Верхне-Албянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 16.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НАВУМЕНКА Рыгор Іванавіч, н. ў 1885 у в. Гармавічы (злілася з в. Кароткавічы), Кароткавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.10.1937 і 10.12.1949. Рэабілітаваны 11.6.1962.

НЕКРАШЭВІЧ Іван, н. ў в. Навозы Шчадрынскага с/с.

НЕКРАШЭВІЧ Ісак Рыгоравіч, яго жонка **Еўдакія Іванаўна** і іх дзеці Антаніна, Іван, Соф'я, Фядот рэпрэсіраваны ў 1929. Рэабілітаваны 24.10.1991.

НІЖНІКАЎ Васіль Герасімавіч, н. ў 1881 у в. Антонаўка Кароткавіцкага с/с, беларус, селянін, займаўся асабістай падсобнай гаспадаркай. Рэпрэсіраваны 23.7.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НІЖНІКАЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1899 у в. Гармавічы (злілася з в. Кароткавічы), вартаўнік Ленваенгандлю ў г. Жлобін, арыштаваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 26.4.1989.

НІЖНІКАЎ Фёдар Ціханавіч, н. ў 1872 у в. Гармавічы, аднаасобнік, арыштаваны 18.7.1937. Расстраляны ў г. Магілёў 13.9.1937. Рэабілітаваны 26.4.1989.

НІЦЫЕЎСКІ Пётр Францавіч, н. ў 1902 у в. Дзяніскавічы Майскага с/с, машыніст лакаматыва дэпо ст. Фаянсавая. Рэпрэсіраваны. Загінуў 18.5.1938.

НУСАЎ Іван Іпалітавіч, н. ў 1881 у в. Чырвоная Слабада Чырвонабярэжскага с/с, беларус, свяшчэннаслужыцель. Рэпрэсіраваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАДВАЛЬНІКАЎ Лявон Аўрамавіч, н. ў 1908 у в. Новыя Маркавічы Навамаркавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.5.1933. Рэабілітаваны 22.5.1961.

ПАДШЫВАЛАЎ Ерамей Мікалаевіч, н. ў 1875 у в. Салоцін Шчадрынскага с/с, беларус, свяшчэннаслужыцель. Рэпрэсіраваны 25.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАДШЫВАЛАЎ Фёдар Панкратавіч, н. ў 1888 у в. Салоцін Шчадрынскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 15.4.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАЗНЯК Георгій Максімавіч, н. ў 1895 у в. Забродзе Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны 25.10.1991.

ПАЗНЯК Кірыла Сцяпанавіч, н. ў в. Дабрагошча Дабрагошчанскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 3.4.1933. Рэабілітаваны 11.4.1969.

ПАНІЗОВІЧ Пётр Ісакавіч, н. ў 1887 у в. Гелін Папаратнянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны 24.6.1974.

ПАРХАМОВІЧ Аляксандр Уладзіслававіч, н. ў 1898 у в. Сенажаткі Рагачоўскага р-на, беларус. Рэпрэсіраваны 22.9.1938. Рэабілітаваны 4.6.1959.

ПАРЭЦКІ Сямён Пятровіч, н. ў 1888 у в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с.

ПАТАПЧЫК Сцяпан Мікалаевіч.

ПАЎЛАЎ Мікалай Каленікавіч, н. ў 1887 у г. Жлобін. Дзяжурны па паравознаму дэпо. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ПАЦЯРУХІН Рыгор Іванавіч, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ПАШКОЎСКІ Мікіта Рыгоравіч, н. ў 1873 у в. Лебядзёўка Луцкага с/с, беларус. Да арышту працаваў возчыкам Дарбуда. Рэпрэсіраваны 28.9.1931. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПІКУНОЎ Іван Пятровіч, н. ў 1898, да арышту — дырэктар Папаратнянскай МТС. Рэпрэсіраваны 21.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957 пасмяротна.

ПУЗЫРЭЎСКІ Лявон Дзям'янавіч, н. ў 1877 у г. Жлобін, пражываў у в. Калінаўка Навамаркавіцкага с/с, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.1.1938. Расстраляны 11.3.1938 у г. Магілёў. Рэабілітаваны 17.8.1959.

ПУКІНСКІ Станіслаў Купрыянавіч, н. ў 1894 у в. Барацін Старарудняпскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 1.6.1931. Памёр у 1935 у ссылцы ў Пермскай вобл. Рэабілітаваны 3.11.1993.

ПУХАЛЬСКІ Іван Антонавіч, н. ў 1869, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 25.9.1937. Рэабілітаваны 30.3.1960.

ПЯКАРСКІ Анатоль Марцінавіч, майстар механічнага цэха лакаматыўнага дэпо ст. Фаянсавая, арыштаваны ў лютым 1938. Рэабілітаваны 1.3.1958 пасмяротна.

РАВІЧ Макар Цімафеевіч, н. ў в. Баранаўка Старарудняпскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік.

РАЖКОЎ Філат Іосіфавіч, н. ў 1877 у г. Стрэшын, беларус. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РАЯНКОЎ Марк Іўлевіч.

РОГАЎ Апанас Паўлавіч, н. ў в. Касакоўка Папаратнянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 13.3.1933. Рэабілітаваны 6.6.1991.

РОГАЎ Міхаіл Лук'янавіч.

РУБАХАЎ Сільвестр Сямёнавіч, н. ў 1862 у в. Вялікія Рагі Салонскага с/с, беларус, селянін. Рэпрэсіраваны 8.10.1937. Рэабілітаваны 13.10.1991.

РУДЗЯНКОВА Ганна Яўхімаўна. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 12.2.1992.

РУДЗЯНКОВА Соф'я Васілеўна, н. ў 1920, дачка селяніна-аднаасобніка. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 22.6.1993.

РУДЗЯНКОЎ Васіль Кузьміч.

РУДЗЯНКОЎ Міхаіл Карпавіч, н. ў 1903 у в. Кірава Кіраўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.8.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РУДЗЯНКОЎ Цімафей Сідаравіч, н. ў 1902 у в. Кірава Кіраўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 8.9.1992.

РУСАЛЕНКА Міхаіл Якаўлевіч, н. ў 1885 у в. Адрубы Кабанаўскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РЫМАРАЎ Асон Восіпавіч. Рэпрэсіраваны ў 1930.

РЫНЕЙСКІ Франц Купрыянавіч, н. ў 1881 у в. Замен-Рыння Шчадрынскага с/с, беларус, рэпрэсіраваны 26.8.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РЫПІНСКІ Фелікс Андрэевіч.

САВІЦКІ Сяргей Акулавіч, н. ў 1887 у в. Праскурні Акцябрскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 7.8.1937. Рэабілітаваны.

САКАЛОЎ Сцяпан Ананьевіч, н. ў в. Грабск Акцябрскага с/с. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 24.1.1994.

САМУСЕНКА Агаф'я Аляксандраўна, н. ў 1906 у в. Кірава Кіраўскага с/с, беларуска. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 22.10.1992.

САМУСЕНКА Анікей Кірылавіч.

САМУСЕНКА Ганна Аляксандраўна, н. ў 1908 у в. Кірава Кіраўскага с/с. Рэпрэсіравана ў 1939. Рэабілітавана 6.6.1991.

САМУСЕНКА Юля Лаўрэнцьеўна, беларуска, аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 22.10.1992.

САМУСЕЎ Сямён Яўцехавіч, н. ў в. Старая Рудня Старарудняпскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. 1.7.1931 высланы ў Прыгародны р-н Свярдлоўскай вобл. і знаходзіўся там да 12.5.1933. Рэабілітаваны 29.3.1993.

САЧЫЎКА Ульяна Назараўна, н. ў в. Грабск Акцябрскага с/с, беларуска, сялянка-аднаасобніца. Рэпрэсіравана ў 1930. У 1930 — 33 знаходзілася на спецпасяленні. Рэабілітавана 23.10.1991.

СЕЛІВАНАЎ Спірыдон Яўцехавіч, н. ў 1881, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 1.2.1933. Рэабілітаваны 5.9.1988.

СЕМЯНЕЦ Якаў Іосіфавіч, н. ў в. Дабравольшча Шчадрынскага с/с, беларус.

СІДАРЭНКА Фёдар Фёдаравіч (н. ў 1885) і яго жонка **Агрыпіна Еўдакімаўна** (н. ў 1888), беларусы, сяляне-аднаасобнікі. Рэпрэсіраваны 31.1.1930 і высланы ў г. Кіраўск Мурманскай вобл. Памерлі ў 1933. Рэабілітаваны 11.3.1994.

СІЛІН Сідар Сцяпанавіч.

СІЛЬЧАНКА Кірыла Савельевіч, н. ў 1885, рабочы Ленінградскага гандлёвага порта. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СОБАЛЕЎ Іларыён Васілевіч, н. ў в. Скарына Шчадрынскага с/с.

СОБАЛЕЎ Кірыла Фаміч.

СТАРАСЦЕНКА Васіль Мікалаевіч, н. ў 1897 у в. Прыбудак Навамаркавіцкага с/с, беларус, се-

лянін-аднаасобнік. 30.9.1937 зняволены ў папраўча-працоўны лагер на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.10.1959.

СТАРАСЦЕНКА Сямён Мікітавіч, н. ў в. Малевічы Малевіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.9.1937. Рэпрэсіраваны 30.9.1937. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СТУКАЧ Майсей Ігнатавіч, н. ў 1889 у в. Таўстыкі Навамаркавіцкага с/с, беларус, бакеншчык водна-транспартнага Днепра-Дзвінскага басейна на р. Бярэзіна. Рэпрэсіраваны 22.9.1938. Рэабілітаваны 5.10.1989.

ТАТАРЫНАЎ Марк Раманавіч.

ТАЎСЦЯЛЕВА Аўдоцця Міронаўна (н. ў 1870) і **ТАЎСЦЯЛЕЎ Рыгор Паўлавіч** (н. ў 1903), беларусы. Рэпрэсіраваны 26.1.1930. Рэабілітаваны 13.2.1990.

ТАЎСЦЯЛЕЎ Рыгор Паўлавіч, н. ў 1903 у в. Старая Рудня Старарудняскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны ў 1930. Прыгавор Бабруйскага акруговага суда ад 23.1.1930 адменены і справа за адсутнасцю саставу злачынства спынена. Таўсцялеў Р.П. па дадзенай справе рэабілітаваны.

ТКАЧОЎ Піліп Емяльянавіч, н. ў в. Малевіцкая Рудня Малевіцкага с/с.

ТРУБІЛАЎ Лявон Сцяпанавіч, н. ў 1890 у в. Праскурні Акцябрскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 5.6.1932. Рэабілітаваны 19.4.1965.

ТРЫФАНАЎ Іван Пракопавіч, н. ў 1867 у в. Беліца Луцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30.9.1937, асуджаны на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.6.1959.

УСІКАЎ Міхаіл Цімафеевіч, н. ў 1901.

ФАМЯНОК Лаўрэнцій Анісімавіч, н. ў в. Забродцзе Дабрагошчанскага с/с, беларус.

ФАМЯНОК Трафім Анісавіч, н. ў 1874 у в. Ляды Кабанаўскага с/с, працаваў у сваёй гаспадарцы. Арыштаваны і асуджаны 15.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ФЕДАСЕЕНКА Ерафей Міхайлавіч, н. ў 1893 у в. Верхняя Алба Верхне-Албянскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 20.3.1937.

ФРАЛОЎ Атон Іванавіч.

ХАЛАДЧУК Сяргей Іванавіч, н. ў 1868 у в. Антонаўка Кароткавіцкага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. 8.11.1931 высланы Магдагачынскі р-н Амурскай вобл., дзе знаходзіўся да 1947 г. Рэабілітаваны 5.4.1993.

ХАЛЕЦКІ Мікалай Іванавіч, н. ў 1886 у в. Жабіны Жлобінскага раёна. Працаваў матарыстам крана ў Мурманскім марскім гандлёвым порце. Арыштаваны 4.4.1938 і асуджаны 20.11.1938. Расстраляны 21.11.1938. Пахаваны на Левашоўскіх могілках у Санкт-Пецярбургу. Рэабілітаваны 18.4.1989.

ХАРАНЕКА Пракоп Антонавіч.

ХАРАНЕКА Якаў Андрэевіч, н. ў 1877 у в. Кіцін Шчадрынскага с/с, беларус, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937 і 25.9.1937. Рэабілітаваны 11.7.1966.

ХІЛЬКЕВІЧ Іван Кузьміч, н. ў 1888 на хутары Межавое былога Бабоўскага с/с, беларус, займаўся на сваёй гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЦІМАХОЎЦАЎ Фядос Макаравіч.

ЦІХІНСКІ Пётр Міхайлавіч і **ЦІХІНСКАЯ Вікторыя Фамінічна**, хутар Вадзіцкі. Рэпрэсіраваны ў лістападзе 1930. Рэабілітаваны 11.12.1992.

ЧАЙКОЎСКІ Рыгор Фёдаравіч, н. ў 1887 у в. Змяёўка Чырвонабярэжскага с/с, беларус, селянін-серадняк. 22.2.1933 прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 17.10.1958 пасмяротна.

ШАРАЕЎ Макар Васілевіч.

ШАЦІЛА Галіна Фларыянаўна, (н. ў 1931) і **ШАЦІЛА Іосіф Фларыянавіч** (н. ў 1932) з сакавіка 1930 разам з бацькамі знаходзіліся на спецпасяленні ў Пермскай вобл., пражывалі там да чэрвеня 1947. Рэабілітаваны 15.6.1944.

ШАЦІЛА Ігнат Іосіфавіч, н. ў 1895 у пас. Вярбічаў Луцкага с/с. Рэпрэсіраваны 15.3.1930 і высланы ў Чусаўскі р-н Пермскай вобл.

ШАЦІЛА Казімір Іосіфавіч.

ШАЦІЛА Уладзімір Ігнатавіч і **ШАЦІЛА Эмілія Ігнатаўна**, нарадзіліся ў ссылцы ў Чусаўскім р-не Пермскай вобл. адпаведна ў 1930 і 1936 і жылі з бацькамі.

ШАЦІЛА Фларыян Ізафатавіч, н. ў 1896 у в. Вярбічаў Луцкага с/с. Рэпрэсіраваны ў сакавіку 1930. Знаходзіўся на спецпасяленні ў Пермскай вобл. да чэрвеня 1947. Рэабілітаваны 15.6.1994.

ШКРАДАЎ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1896, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 30.8.1937. Рэабілітаваны.

ШУБАРАЎ Дзмітрый Яўхімавіч, н. ў 1906 у в. Баршчоўка Чырвонабярэжскага с/с, рускі, цясляр «Белдзяржбуда», г. Мінск. Рэпрэсіраваны 17.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Казімір Рафаілавіч, н. ў в. Навозы Шчадрынскага с/с, беларус.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Уладзімір Станіслававіч.

ШЫКУНОЎ Клім Савельевіч, н. ў в. Зломнас Стрэшынскага п/с, беларус, працаваў у сваёй гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 13.5.1933. Рэабілітаваны 22.5.1961.

ШЫКУНОЎ Яўсей Антонавіч, н. ў 1881 у в. Зломнас Стрэшынскага п/с, аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 23.5.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЫНКЕВІЧ Піліп Пятровіч, н. ў 1891 у в. Пякалічы Шчадрынскага сельсавета. Рэпрэсіраваны ў верасні 1937. Асуджаны 25.9.1937. Рэабілітаваны 11.4.1960.

ЮХО Алена Францаўна, н. ў 1884. Рэпрэсірована ў 1930. Рэабілітавана 26.8.1992 пасмяротна.

ЯКУШАЎ Павел Максімавіч, н. ў 1912.

Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг.

ГОРАД ЖЛОБІН

АГРАНАЎ Гдаля Давыдавіч, н. ў 1910, прапаў без вестак у 1939.

АГРАНАЎ Рыгор Юдкавіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

ВАЙЦАХОЎСКІ Канстанцін Георгіевіч, н. ў 1904, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

ЖЛОБІНСКІ РАЁН

ДУБАДЗЕЛАЎ Андрэй, загінуў.

ПУЦЕНІЧ Уладзімір, загінуў.

ТРЫФАНАЎ Васіль, загінуў.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАТОН

ЗАРУБАЎ Спірыдон Трыфанавіч, н. ў 1904, загінуў 19.2.1940.

ПАКРОЎСКІ Панцялей Адамавіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, рад. 115-га сп, загінуў 23.2.1940.

ВЕРХНЕ-АЛБЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НІЖНЯЯ АЛБА

ГЛАЗІНАЎ Аляксандр Антонавіч, н. ў 1914, рад., 151-га сп 8-й сд, загінуў 14.2.1940.

ВЁСКА ШЫХАЎ

РОГАЎ Мірон Іванавіч, н. ў 1907, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 22.2.1940.

ДАБРАГОШЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАХУН Карп Макаравіч, н. ў 1904, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў 17.2.1940.

ВЁСКА ДАБРАГОШЧА

АНДРУШЭНКА Марк Іларыёнавіч, н. ў 1918, у Чырв. Арміі з 1938, загінуў.

КРУГАЛЬ Трыфан Платонавіч, н. ў 1907, у Чырв. Арміі з 1939, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 12.3.1940.

ШУХ Нічыпар Уевіч, н. ў 1910, загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА ДАРАГІНЬ

ШЧЫГЕЛЬСКІ Станіслаў Людвігавіч, загінуў.

ВЁСКА ЯШЧЫЦЫ

КРЫШНЁЎ Ісак Піменавіч, н. ў 1912, рад., загінуў у студзені 1940.

ЯЎЗРЭЗАЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1906, загінуў у 1940.

КАБАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АДРУБЫ

АМЕЛЬЧАНКА Даніла.

ГАЎРЫЛЕНКА Мікіта Трафімавіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ВЁСКА ЛЯДЫ

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Савелій, н. ў 1907, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ФАМЯНОК Захар Рыгоравіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939.

К.Г.Вайцахоўскі.

А.Дубадзелаў.

У.Пуценіч.

В.Трыфанаў.

КАРОТКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАРОТКАВІЧЫ

ІСАЕНКА Аляксей Трафімавіч, у Чырв. Арміі з 1939, прапаў без вестак.

ВЁСКА КРАСНОЎКА (не існуе)

КАЛУПАХА Марцін Навумавіч, н. ў 1909, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ВЁСКА ПЛЕСАВІЦКАЯ СЛАБОДКА

КОЛЕСНЕЎ Яўхім Сцяпанавіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, радавы.

ВЁСКА ПЛЕСАВІЧЫ

ДАМАРАЦКІ Васіль Гаўрылавіч, н. ў 1908, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

КОЛЕСНЕЎ Пётр Піліпавіч, н. ў 1911, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 24.2.1940.

КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КІРАВА

БАГАМАЗАЎ Андрэй Фёдаравіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

ЗАШЧЫТАЎ Арцём Аляксеевіч, н. ў 1909, у Чырв. Арміі з 1939, памёр ад ран у 1939.

КАВАЛЁЎ Ягор Фёдаравіч, н. ў 1905, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

КАРАБЦОЎ Сцяпан Яфімавіч, н. ў 1910, прапаў без вестак.

КУЛІЧКОЎ Іван Кузьміч, н. ў 1909, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

МУРАВЕЙНІКАЎ Іван, загінуў у 1939.

МУРАВЕЙНІКАЎ Сцяпан, загінуў у 1940.

ПАРФЕНЧЫКАЎ Сяргей Фадзеевіч, н. ў 1903, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

РАМАНЧЫКАЎ Нічыпар Міронавіч, н. ў 1908, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

ВЁСКА ПІЦЕРАЎКА

СЦЕПАНЦОЎ Кузьма Карнеевіч, н. ў 1920, у Чырв. Арміі з 1939, прапаў без вестак.

ВЁСКА СЕЛІВОНАЎКА

ІВАНЧЫКАЎ Павел Тарасавіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

РУБАНАЎ Сцяпан Пятровіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ВЁСКА ШАПАРНЯ

КАЗЛОЎ Кірыл Іосіфавіч, н. ў 1911, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў 7.12.1939.

ТАЛКАЧОЎ Міна Лазаравіч, н. ў 1910, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

МАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНТОНАЎКА

ФАМІН Павел Іванавіч, н. ў 1915, у Чырв. Арміі з 1939, мал. лейт., загінуў у 1940.

ПАСЁЛАК АСОЕ

ЛЕВАНЧУКОЎ Трафім Кузьміч, загінуў у 1940.

ВЁСКА ДЗЯНІСКАВІЧЫ

БАБАНЬКОЎ Мікалай Яўстратавіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

БАБАНЬКОЎ Міхаіл Яўстратавіч, н. ў 1920, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ВЁСКА МАЙСКАЕ

СТАНІСЛАВАЎ Іосіф Кірылавіч, н. ў 1910, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЧОРНАЯ ВІРНЯ

БЫКАЎ Іван Ісакавіч, н. ў 1908, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў у 1939.

ДЗЕГЦЯРОЎ Сцяпан Данілавіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

МАЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЗІМІРАВА

КІСЯЛЁЎ Мікалай Андрэевіч.

ВЁСКА МАЛЕВІЦКАЯ РУДНЯ

БАРЭКА Іван Кузьміч, н. ў 1917, у Чырв. Арміі з 1938, загінуў у 1939.

ГРАНКОЎ Фёдар Арсенцьевіч, н. ў 1919, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

НАВАМАРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДА (не існуе)

СЦЕПАВЫ Пётр Купрэевіч, н. ў 1912, у Чырв. Арміі з 1939, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА ВІТАЎ (не існуе)

МЯДЗВЕДЗЕЎ Архіп Дзмітрыевіч, н. ў 1912, загінуў у 1940.

ВЁСКА КАВАЛЁЎКА

АРХІПЕНКА Ілья Ільіч, н. ў 1905, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў у 1939.

АРХІПЕНКА Сцяпан Ільіч, н. ў 1914, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў у 1940.

ВЁСКА ПРЫБУДАК

БЫКАЎ Іван Ісакавіч, н. ў 1907, у Чырв. Арміі з 1939, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 16.2.1940.

ПАПАРАТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АДРАДЖЭННЕ

БАЛЯНКОЎ Іван Паўлавіч, загінуў 25.2.1940.

ВЁСКА ГЕЛІН

КАВАЛЕЎСКІ Канстанцін Мікалаевіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ВЁСКА КАСАКОЎКА

ЖУКАЎ Мікіта Калінікавіч, н. ў 1900, загінуў 22.2.1940.

КУЗНЯЦОЎ Ціхан Мацвеевіч, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў.

РОГАЎ Анупрэй Анісімавіч, загінуў 11.2.1940.

РОГАЎ Стратон Паўлавіч.

ВЁСКА НОВАЯ КАРМА

ГРЫЦКОЎ Іван Ахрэмавіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў.

ПРАМАШКОЎ Сямён Іванавіч, н. ў 1918, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў 14.2.1940.

РАМАНЕНКА Павел Дзмітрыевіч, н. ў 1904, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў 21.2.1940.

ПІРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРУГАВЕЦ

САМУСЕНКА Іван Лук'янавіч, н. ў 1908, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 21.2.1940.

ВЁСКА СКЕПНЯ

АБРАМОВІЧ Пётр Лявонавіч.

КАЗЛОЎ Павел Дзмітрыевіч, н. ў 1913, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў 17.2.1940.

САЛОНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРОЎ

БАРЭКА Мітрафан Макаравіч, н. ў 1905, у Чырв. Арміі з 1939, рад., загінуў у 1939.

СТАРАРУДНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА СТАРАЯ РУДНЯ

І.Л.Самусенка.

ГУЗЕЕЎ Мікалай Фаміч, н. ў 1910, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

КАПУСЦІН Іосіф Фаміч, н. ў 1903, у Чырв. Арміі з 1940, рад., загінуў у 1940.

СВЯТЧАНКА Ягор Пятровіч, н. ў 1912, участковы аддзялення міліцыі, мал. лейт., прапаў без вестак.

ХУДАЛЕЙ Цімафей Апанасавіч, н. ў 1909, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

СТРЭШЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК СТРЭШЫН

СІНЯКОЎ Сідар Нічыпаравіч, н. ў 1906, рад. 151-га сп 8-й сд, загінуў 22.2.1940.

ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА РАДУША

АРЭШКА Мікалай Паўлавіч, н. ў 1919, у Чырв. Арміі з 1940, рад., загінуў у 1940.

БАЯРСКІ Мікалай Раманавіч, н. ў 1919, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1939.

БРУШКОЎ Іван Рыгоравіч, н. ў 1906, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ШЧАДРЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА СЦЯПЫ

ЖУРАЎЛЁЎ Іван Іванавіч, н. ў 1910, у Чырв. Арміі з 1939, мал. лейт., загінуў у 1940.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Хроніка падзей

3 ліпеня 1941 г. Жлобін і заходняя частка раёна акупіраваны нямецка-фашысцкімі войскамі.

6 ліпеня 1941 г. ў ходзе наступальнай аперацыі воіны 117-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік Іван Лукіч Хіжняк) у ходзе разведкі боем выбілі акупантаў з горада. Аднак перад пераўзыходзячымі сіламі праціўніка вымушаны былі адысці на зыходны рубеж.

13 ліпеня 1941 г. байцы 154-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік Якаў Сцяпанавіч Факанаў) у складзе войск 63-га стралковага корпуса (камандзір камкор Леанід Рыгоравіч Пятроўскі) 21-й арміі Заходняга фронту штурмам авалодалі горадам, адкінулі ворага на захад на 20—30 км.

У гонар тых падзей цэнтральная плошча Жлобіна названа плошчай вызваліцеляў і на ёй збудаваны помнік-абеліск воінам-вызваліцелям 1941 г.

14 жніўня 1941 г. Жлобін зноў акупіраваны гітлераўскімі войскамі.

Войскі, якія прымалі ўдзел у абароне Жлобіна і раёна ў ліпені—жніўні 1941 г.

21-я армія Заходняга, з 24.7.1941 г. — Цэнтральнага франтоў.

63-і стралковы корпус (камкор, з канца ліпеня 1941 г. — генерал-лейтэнант Леанід Рыгоравіч Пятроўскі).

Стралковыя дывізіі: 117-я (палкоўнік, пасля генерал-маёр, ганаровы грамадзянін Жлобіна Іван Лукіч Хіжняк), 154-я (палкоўнік, з канца ліпеня 1941 г. — генерал-маёр Якаў Сцяпанавіч Факанаў).

Жлобінскі знішчальны батальён (камандзір Уладзімір Арцёмавіч Міронаў).

Так пачыналася вайна

22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна. Новыя абставіны вылучылі і новыя задачы. З 18 гадзін 24.6.1941 г. Жлобінскі вузел, як і ўвесь чыгуначны транспарт прыфрантавой зоны, перайшоў на спецыяльны графік работы.

На трэці дзень вайны па ініцыятыве камітэта Чырвонага Крыжа чыгунак на станцыі Жлобін сфарміравалася санітарная дружына з 40 чалавек, у склад якой увайшло нямала хатніх гаспадынь. Сандружынніцы дзяжурылі на пункце супрацьпаветранай абароны, у

час налётаў варожых бамбардзіроўшчыкаў аказвалі першую медыцынскую дапамогу пацярпелым.

27 чэрвеня вайна прыйшла на парог чыгуначнага вузла. У гэты дзень яго першы раз бамбіла фашысцкая авіяцыя, і ў горадзе першай ахвярай вайны стаў слесар водазабеспячэння вузла Іван Савіч Гайдук.

Па ініцыятыве мясцовых чыгуначнікаў за кароткі тэрмін у дэпо на базе 4-хвоснай платформы быў пабудаваны браняпоезд. Праз 6 дзён ён ужо ўдзельнічаў у баях супраць гітлераўцаў на станцыі Свіслач (участак Асіповічы—Магілёў).

На вузле актыўна прайшоў збор сродкаў у фонд абароны, выраблялiся санітарныя лятучкі, хлебапякарні на колах. На пункты візуальнага агляду на станцыі Чырвоны Бераг, Шацілкі, Хальч былі накіраваны для работы аглядчыкі вагонаў і слесары.

На падставе рашэння дырэктыўных органаў рэспублікі ў Жлобіне быў створаны і дзейнічаў эвакапункт. Разам з іншымі чыгуначнікі падтрымлівалі парадак, арганізоўвалі харчаванне людзей, пасадку іх у вагоны, прымалі меры па аказанню матэрыяльнай дапамогі. З вузла на ўсход былі адпраўлены тысячы мясцовых жыхароў і насельніцтва заходніх раёнаў рэспублікі.

Спецыяльная група на чале са старшынёй раённага савета прафсаюза чыгуначнікаў Аляксандрам Мікалаевічам Лажковым, у якую ўвайшлі І.Е.Волкаў, М.М.Гельфер і іншыя, займалася эвакуацыяй вузла і вывазам абсталявання, усіх матэрыяльных каштоўнасцей на станцыю Кіраў. Умела кіравалі пагрузачнымі работамі і своечасовай адпраўкай эшалонаў на ўсход начальнік Жлобінскага аддзялення чыгункі Іван Андрэевіч Сіманенка, начальнік станцыі Жлобін І.С.Даронін і начальнік вагоннага дэпо І.Б.Герчыкаў. У пастаянных клопатах былі работнікі пасажырскай службы Н.М.Угалеў, В.П.Маладзькоў і інш.

Каля 100 чыгуначнікаў уваходзілі ў спецгрупу, створаную ў канцы чэрвеня 1941 г., яны сачылі за парадкам на станцыі, выяўлялі варожых лазутчыкаў, папярэджвалі раскраданне маёмасці, дапамагалі эвакуіраваць у тыл людзей і матэрыяльныя каштоўнасці.

Многія чыгуначнікі былі прызваны ў армію. На розных франтах змагаліся з ворагам рабочыя паравознага дэпо А.А.Міхайлоўскі, А.С.Андрухоў, І.І.Здараўцоў, П.Г.Шчыгельскі, Б.А.Мілоў, Н.І.Асмалоўскі, М.П.Глазкоў, Я.А.Пякарскі і інш. У калонах асабовага рэзерву Міністэрства шляхоў зносін забяспечвалі франтавыя перавозкі Ф.П.Майсякоў, С.І.Буднікаў, Н.С.Сяргееў, П.А.Шарц, П.А.Кудраўцаў, Е.М.Забелін, І.В.Мержыеўскі, В.А.Акацэвіч; дзяжурным лінейнай станцыі ў прыфрантавой паласе працаваў Павел Емяльянавіч Бушкевіч...

Не ўсе працаўнікі вузла дажылі да перамогі. У гады вайны загінулі машыністы-інструктары Ілья Сіманенка, Н.М.Сяліцкі, Н.П.Байдакоў, качагар паравознага дэпо Ф.Кісялёў, рабочы вагоннага дэпо Ф.Пашкоўскі і інш.

На тэрыторыі горада і раёна ў чэрвені—жніўні 1941 г. дзейнічалі Жлобінскі і Стрэшынскі знішчальныя батальёны і атрады самааховы.

П.Я.Кірычэнка.

Рагачоўска-Жлобінская аперацыя 1941 г. (контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку)

Праведзена 63-м стралковым корпусам (камкор Л.Р.Пятроўскі) 21-й арміі Заходняга (з 24.7.1941 Цэнтральны) фронту 13 ліпеня — 17 жніўня; састаўная частка Смаленскай бітвы 1941. Корпус [117-я (да 7 ліпеня), 154-я, 167-я, 61-я стралковыя дывізіі, 387-ы, 503-і і 318-ы гаўбічныя артпалкі] займаў абарону на левым беразе Дняпра на рубяжы Збароў—Гадзілавічы—Рагачоў—Жлобін—Стрэшын працягласцю 70 км. 6 ліпеня часці 117-й дывізіі правялі разведку боем, у час якой аваладалі Жлобінам і прасунуліся на ПнЗ уздоўж Бабруйскай шашы; пад націскам праціўніка, які тэрмінова падцягнуў на гэты напрамак матарызаваную і пяхотную дывізіі, адышлі на зыходныя рубяжы, нанеслі ў жорсткіх баях праціўніку вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы і сарвалі разлікі камандавання нямецкай групы армій «Цэнтр» з ходу фарсіраваць Дняпро на гэтым участку фронту. 12 ліпеня камандуючы Заходнім фронтам Маршал Савецкага Саюза С.К.Ці-

Карта-схема контрудару 63-га стралковага корпуса. Ліпень 1941 г.

машэнка загадаў 21-й арміі сіламі 63-га і 66-га (генерал-маёр Ф.Дз.Рубцоў) стралковых карпусоў нанесці на Бабруйскім напрамку, 67-му стралковаму корпусу (камбрыг П.Ф.Жмачэнка) наступаць ад Збарова ўздоўж Дняпра на Пн з мэтай знішчыць групоўку ворага, якая прарвалася ў раёне Быхава. 13 ліпеня войскі 21-й арміі перайшлі ў контрнаступленне. 63-і корпус фарсіраваў Дняпро, вызваліў Жлобін, Рагачоў і развіў наступленне на Бабруйск. Да канца ліпеня корпус уклініўся да 30 км у размяшчэнне ворага. Праціўнік кінуў супраць яго 8 дывізій. 14 жніўня нямецкія войскі прарвалі абарону і зайшлі ў тыл корпуса. Па загаду ваеннага савета фронту з 17 жніўня часці корпуса з баямі выходзілі з акружэння ў напрамку Гомеля. (Гл. таксама артыкул «Контрудар на Дняпры».)

У аперацыі разам з савецкімі войскамі ўдзельнічалі байцы Жлобінскага (камандзір В.А.Міронаў) і Рагачоўскага (М.І.Калінковіч) знішчальных батальёнаў. Створаныя ў Жлобіне і Жлобінскім раёне групы народнага апалчэння вялі разведку ў тыле ворага, удзельнічалі ў баях. У выніку Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі 1941 ворагу нанесены значныя страты, затрымана яго прасоўванне на Усход.

У.І.Лемяшонак.

Контрудар на Дняпры

63-і стралковы корпус, які ў чэрвені 1941 г. прыбыў у раён Гомеля для папаўнення войск Асобай Беларускай ваеннай акругі, увайшоў у склад 21-й арміі. Ён атрымаў задачу разгарнуцца на ўсходнім беразе Дняпра на фронце Гадзілавічы—Рагачоў—Жлобін—Стрэшын, канцэнтруючы асноўныя намаганні на правым флангу, з мэтай адкінуць нямецка-фашысцкія войскі, калі яны паспрабуюць пераправіцца цераз Дняпро. Гатоўнасць абароны — 16.00 3 ліпеня 1941 г. Працягласць фронту абароны корпуса складала 70 км замест 16—24, якія прадугледжваліся нарматывамі статутаў. Акрамя таго, сілы корпуса павінны былі ахоўваць участак на ўсходнім беразе Дняпра ад Гадзілавіч да Шапчыцаў, пакуль туды падыйдуць іншыя часці.

Раніцай 3 ліпеня гітлераўцы, якія падышлі да Дняпра напярэдадні, паспрабавалі каля вёскі Збароў фарсіраваць раку, прарваць абарону войск 21-й арміі і выйсці на аператыўны прастор, але сустрэлі моцнае супраціўленне. Больш таго, камандзір 63-га стралковага корпуса Леанід Рыгоравіч Пятроўскі арганізаваў контратаку, у выніку чаго праціўніку былі нанесены адчувальныя страты.

Да зыходу дня 3 ліпеня нямецка-фашысцкія войскі занялі горад Жлобін.

Становішча ўскладнілася. Пагроза наступу ворага павялічылася, і было вырашана апярэдзіць праціўніка. Па рашэнні камкора Л.Р.Пятроўскага 6 ліпеня была зроблена разведка боем на левым флангу корпуса сіламі 117-й стралковай дывізіі, падтрыманая агнём 322-га і 707-га гаўбічных артылерыйскіх пал-

Карта-схема канцэнтрацыі войск 21-й арміі. Жнівень 1941 г.



Кулямётны разлік у час бою каля Жлобіна. Ліпень 1941 г.

коў. 240-ы стралковы полк першым фарсіраваў Дняпро, атакаваў праціўніка і, авалодаўшы Жлобінам, рушыў да Бабруйска. Гітлераўцы не чакалі такога ўдару і спешна пачалі адыходзіць. На правы бераг ракі пераправіўся яшчэ адзін полк — 275-ы стралковы. Але праз некаторы час вораг кінуў супраць наступаўшых 2 свае дывізіі, імкнуўся адрэзаць іх ад адзінай у раёне Жлобіна пераправы цераз Дняпро.

У раёне пераправы стварылася крытычнае становішча. У гэты момант тут з'явіўся камандзір корпуса. Неадкладна была разгорнута бліжэйшая батарэя 76-міліметровых гарматаў. Леанід Рыгоравіч Пятроўскі быццам не заўважаў агню варожых танкаў і самаходных гармат. Ён стаяў у поўны рост і сачыў за паядынкам батарэі з фашысцкімі танкамі, зрэдку аддаючы кароткія і дакладныя загады яе камандзіру. Пасля 15—20-хвіліннай артылерыйскай перастрэлкі некалькі нямецкіх танкаў былі падбіты, астатнія адышлі. Толькі пасля гэтага Л.Р.Пятроўскі пакінуў пераправу і накіраваўся ў Жлобін на перадавы камандны пункт камандзіра дывізіі. 240-ы і 275-ы стралковыя палкі да пачатку цемры працягвалі адбіваць контратакі варожых мотамехчасцей.

Удзельнік тых падзей Г.В.Гвоздзеў успамінаў: «Калі скончыліся снарады, а танкі ворага зноў атакавалі рубеж 240-га стралковага палка, артылерысты адбіваліся звязкамі гранат».

Выканаўшы пастаўленую перад імі задачу, па загаду камандзіра корпуса, пастаянна адбіваючы насядаўшых матарызаваную і пяхотную дывізіі праціўніка, ноччу абодва палкі адышлі на левы бераг Дняпра.

Баявая актыўнасць войск 21-й арміі ў 1-й дэкадзе ліпеня на рубяжы Дняпра прымусіла камандаванне групы армій «Цэнтр» 6 ліпеня паведаміць у Берлін: «Праціўнік перад 2-й танкавай групай узмацніў сваю групоўку за кошт падкідкі новых часцей у напрамку Гомеля. Удары праціўніка ад Жлобіна ў напрамку Бабруйска, а таксама ў раёне Беразіно дазваляюць меркаваць, што ён мае намер стрымаць наступаючыя цераз Бярэзіну нашы танкавыя сілы для таго, каб арганізаваць сваю абарону па рацэ Дняпро».

Праз некаторы час 117-я стралковая дывізія была знята са Жлобінскага ўчастка і перадыслацыравана ў раён Доўск—Зімніца. На яе месца прыбыла 154-я стралковая дывізія, якая заняла абарону на лініі Цупер—Жлобін—Стрэшын.

12 ліпеня ў 12 гадзін 63-і стралковы корпус атрымаў загад праз суткі фарсіраваць Дняпро і пачаць наступленне з правага берага ракі. Разам з корпусам у наступленні ўдзельнічала таксама кавалерыйская група колькасцю да 1000 чал., якая была сфарміравана ў першыя дні ліпеня 1941 г. Палескім абкомам КП(б)Б, абласным і гарадскім ваенкаматамі.

Дзень 13 ліпеня быў спякотны. Разамлелыя гітлераўцы шукалі цяньку. Не чакаючы наступлення войск 63-га стралковага корпуса, яны знялі з сябе зброю, а некаторыя і абмундзіраванне. Першы артылерыйскі налёт аша-

Байцы 63-га стралковага корпуса ў атацы. Ліпень 1941 г.

ламіў ворага, і ён на першым часе нават не аказаў арганізаванага супраціўлення.

154-я стралковая дывізія (камандзір палкоўнік Я.С.Факанаў) вяла наступленне трыма стралковымі палкамі — 437, 473 і 510-м (паводле задумы камкора корпус наступаў у адзін эшалон). Дывізіі была пастаўлена задача фарсіраваць Дняпро ў паласе Лебядзёўка—Жлобін, авалодаць горадам і развіваць наступ уздоўж чыгуначнай лініі Жлобін—Бабруйск.

Другі стралковы батальён 437-га стралковага палка пад камандаваннем капітана Ф.А.Баталава, які наступаў на Жлобін з паўднёвага захаду, падтрымліваў 580-ы гаўбічны артполк (камандзір маёр Далгаполаў) з удзелам групы байцоў малодшых лейтэнантаў П.Каваленкі і Ю.Шматкова, разведатрада Жлобінскага знішчальнага батальёна на чале з А.П.Ткачовым.

Байцы Жлобінскага знішчальнага батальёна вялі пастаянную разведку не толькі на пярэднім краі праціўніка, але і ў глыбіні яго абароны, былі праваднікамі. 28 чэрвеня 1964 г. газета «Знамя юности» ў артыкуле «Гэтых дзён не змоўкне слава» пісала: «10—13 ліпеня маладыя разведчыкі Жлобінскага знішчальнага батальёна камсамольцы Уладзімір Разгуляеў, Анатоль Валько, Віктар Сіліцкі, Аркадзь Нікалаеў, Іван Ісаенка, Мікалай Мікша па заданні камандавання 154-й стралковай дывізіі вялі разведку ў тыле ворага. Іх звесткі былі выкарыстаны ў час контрнаступлення нашых войск на Бабруйскім напрамку ў сярэдзіне ліпеня 1941 г.»

Выкарыстаўшы паўразбураны чыгуначны мост, байцы батальёна пераадолелі Дняпро і ўварваліся ў Жлобін. Праціўнік сустрэў атакуючых агнём артылерыі і кулямётаў і змог адбіць першую атаку. Камандзіры вывелі байцоў з-пад шквальнага кулямётна-мінамётнага агню і ўкрылі іх за дамамі прылеглых вуліц.

У гэты час камандзіру 437-га палка стала вядома, што ў праціўніка слаба прыкрыты флангі, а ў глыбіні на агнявых пазіцыях знаходзяцца дзве—тры мінамётныя і артылерыйскія батарэі. І ён прымае рашэнне накіраваць у тыл абароны ворага 3 узводы, узмацніўшы іх станковымі кулямётамі і 50-міліметровымі мінамётамі. Перад байцамі была пастаўлена задача скаваць гітлераўцаў на флангах і ў тыле.

Камандзір разведчыкаў знішчальнага батальёна Ткачоў ведаў, што пранікнуць у варожы тыл справа даволі няпростая, асабліва, калі не ведаеш горада. Ён вырашыў сам павесці вызначаную групу, у складзе якой знаходзіўся ўзвод малодшага лейтэнанта А.Е.Ярохіна. Захоўваючы ўсе меры перасцярогі, байцы непрыкметна выйшлі ў зададзены раён, хутка абсталявалі пазіцыі і адкрылі раптоўны агонь са станковых кулямётаў і мінамётаў. Мінамётчыкі білі таксама па гітлераўскіх батарэях, размешчаных у цэнтры горада. З паўночна-ўсходняй часткі Жлобіна паспяхова атакавала ворага стралковая рота лейтэнанта Кандакова. Батальён капітана Ф.А.Баталава, нягледзячы на моцны агонь фашыстаў, упарта прабіваўся ад Дняпра ўздоўж вуліцы Першамайскай да Паўночнага дэпо. Калі наступнай раніцай вораг паспрабаваў акружыць батальён, воіны-баталаўцы не толькі не адступілі, але зноў прымусілі гітлераўцаў уцякаць. Праціўнік спачатку ўхіліўся ад зацяжнога бою і адступіў. Аднак яму ўда-

лося ў паўночна-заходняй частцы горада заняць выгадны рубеж. Таму прасоўванне атакуючых рот 437-га палка прыпынілася.

510-ы стралковы полк пад камандаваннем маёра Карамушкі, фарсіраваўшы Дняпро, выйшаў на поўнач ад Жлобіна каля в. Лебядзёўка, а 473-і стралковы полк на чале з палкоўнікам Барадзіным, пацясніўшы ворага каля Стрэшына, паспяхова наступаў на поўдзень ад Жлобіна ў напрамку вёскі Малевіцкая Рудня.

На працягу ўсяго дня 13 ліпеня 154, 61, 167-я стралковыя дывізіі 63-га корпуса нанеслі магутны контрудар па праціўніку. Камандзір корпуса Л.Р.Пятроўскі ў ходзе контрудару манеўраваў сваім рэзервам, накіроўваючы яго на самыя важныя і небяспечныя ўчасткі.

Праціўнік аказваў моцнае супраціўленне, уводзіў у бой танкі, узнімаў у паветра авіяцыю. Але нішто не магло спыніць наступальнага парыву байцоў 63-га стралковага корпуса. Гітлераўскія часці 24-га механізаванага корпуса 2-й танкавай групы не вытрымалі націску і адступілі. Ворагу быў нанесены вялікі ўрон. Воіны 154-й дывізіі захапілі 20 гармат, 25 аўтамашын, 5 танкаў, вялікую колькасць кулямётаў, вінтовак і інш. зброі. 167-я стралковая дывізія ўзяла ў якасці трафеяў некалькі сот аўтаматаў, кулямётаў, больш 100 грузавых аўтамашын, тысячы мін і снарадаў, шмат палявога кабеля і іншай ваеннай маёмасці.

Контрудар, які нанеслі часці і злучэнні левага фланга Заходняга фронту, вельмі занепакоіў гітлераўскае камандаванне. Для іх наступленне савецкіх войск аказалася поўнай нечаканасцю. Камандуючы 2-й танкавай групай Г.Гудэрыян пазней пісаў: «13 ліпеня пачаліся бязлітасныя контратакі рускіх з напрамку Гомель на правы фланг танкавай групы. Наступала каля 20 дывізій».

Аналізуючы наступленне дывізій Заходняга фронту ў напрамку на Бабруйск і іншыя беларускія гарады, фашысцкі генерал трывожыўся за адкрыты фланг групы армій «Цэнтр». І гэта не выпадкова. Толькі за адзін дзень 13 ліпеня савецкія войскі фарсіравалі Дняпро, штурмам авалодалі Жлобінам і Рагачовам і адкінулі ворага на 15—20 км на захад, развіваючы наступ на Бабруйск, каб выйсці ў тыл магілёўскай групоўкі праціўніка.

Асаблівая роля ў гэтым адводзілася 63-му стралковаму корпусу... У ноч на 24 ліпеня 437-ы полк рыхтаваўся да бою. Афіцэры штаба займаліся вывучэннем атрыманых разведданых аб праціўніку, размяркоўвалі новае папаўненне па батальёнах. Адпрацавалі план прадстаячага бою. У тую ж ноч у распараджэнне 437-га палка прыбыў 5-ы асобны мінамётны дывізіён, у якім налічвалася 36 новых 120-міліметровых мінамётаў. Камандзір падраздзялення маёр Іваноў праінфармаваў штаб палка аб тым, што ў дывізіёне паўтара баявых камплекта мін. Падмацавалі 437-ы полк і танкі 239-га асобнага разведвальнага батальёна 154-й дывізіі. Баявая задача была даведзена да ўсяго асабовага састава. У цэнтры паласы наступлення 437-га палка на світанку сканцэнтраваўся 2-і батальён пад камандаваннем капітана Ф.А.Баталава, справа — 3-і, злева — 1-ы батальёны. Наглядальны пункт палка абсталявалі на гарышчы будынка школы, якая знаходзілася на ўскраіне Жлобіна (былая сярэдняя школа № 20 па вул. Рабочай. У вайну знішчана).

Наступленне пачалося магутнай артылерыйскай падрыхтоўкай. Услед за ёй у бой пайшлі танкі, а за імі — стралковыя батальёны. Нягледзячы на ўзмоцненую агнявую і тэхнічную моц, у штабе 437-га палка турбаваліся за вынік бою, бо вораг на працягу ночы таксама ўмацоўваў свой рубеж абароны, удасканальваў агнявую сістэму, падцягваў рэзервы.

У раёне вёсак Прыдарожжа і Заваднае Малевіцкага сельсавета, на поўнач ад чыгуначнага насыпу, акапаліся 2 батальёны пра-

Мемарыяльная дошка ў гонар воінаў 21-й арміі.

ціўніка. Па іх адкрыў агонь 580-ы гаўбічны артылерыйскі полк. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі ў атаку пайшоў 2-і батальён на чале з камандзірам. Вораг прымяніў заграджальны агонь. Капітан Ф.А.Баталаў знайшоў процідзеянне тактыцы праціўніка: ён вёў батальён кідкамі, да моманту пачатку заградагня паспяваў вывесці байцоў на бяспечны рубеж. Шэсць шквальных агнявых заграджальных налётаў праціўніка не спынілі атакуючае падраздзяленне. Вузел супраціўлення ворага ў вёсках Прыдарожжа і Заваднае быў узяты штурмам. У баі вызначаліся кулямётчыкі і іх камандзір малодшы лейтэнант Аляксандр Юхачоў. Кулямётны ўзвод, якім ён камандаваў, надзейна падтрымліваў атаку батальёна. Калі вораг адкрыў агонь у фланг наступаўшым ротам, баец Вейс трапнымі чэргамі знішчыў кулямёт гітлераўцаў. Узвод Харунжага кінуўся наперад і дабіў фашыстаў.

437-ы полк з баямі прасоўваўся на захад, вызваліў вёскі Кабанаўка і Курганне, а 18 ліпеня перадавыя падраздзяленні ўвайшлі ў раён Новамазалаў—Ухватаўка. Другі батальён капітана Баталава, які займаў сярэдзіну абароны палка, асядлаў дарогу Бабруйск—Жлобін і не даваў фашыстам магчымасці пусціць танкі па шашы. У наваколлі, дзе былі балоты, яны не маглі прайсці. Справа і злева ад яго дзейнічалі 3-і батальён старшага лейтэнанта Гусева і батальён капітана А.А.Васільева.

Устрывожанае ўдарамі савецкіх войск пад Бабруйскам, гітлераўскае камандаванне павярнула сюды частку сваіх рэзерваў, якія наступалі на Смаленск. Супраць 437-га палка вораг кінуў пяхотную дывізію. Падцягнуўшы сілы, гітлераўцы штодзённа па некалькі разоў прадпрымалі атакі на нашу абарону. 19—20 ліпеня вораг 6 разоў наступаў у паласе абароны 437-га палка. На досвітку 20 ліпеня праціўнік кінуў танкі і аўтаматчыкаў на рубяжы 2-га батальёна і пацясніў яго.

«У касцы, плашч-накідцы, з вынутым пісталетам з'явіўся перад намі Фёдар Аляксеевіч Баталаў, — успамінаў былы начальнік штаба, а потым камандзір гэтага палка генерал-маёр Б.Г.Вайнтрауб. — Коратка далажыў аб праціўніку. Папрасіў чалавек 30 для ўзмацнення і крыху аганьку для «прыкуркі» фрыцу».

Камандзір палка накіраваў рэзервовы ўзвод на папаўненне падраздзялення Баталава. Артылерыйская батарэя высунула гарматы і адкрыла агонь па пяхоце праціўніка. Па ворагу нанесла ўдар палкавая артылерыйская група. Дапамог батальёну капітана Баталава і сусед — 3-і батальён 437-га палка. Актыўным ружэйна-кулямётным агнём з фланга ён прымусіў гітлераўцаў залегчы, а потым адкінуў іх на зыходны рубеж. Батальён Баталава, дзякуючы дапамозе суседзяў, працягваў утрымліваць ключавую пазіцыю.

У ліпеньскіх наступленнях 63-га стралковага корпуса яго байцы і камандзіры праявілі масавы гераізм, смеласць і адвагу. Вось некаторыя прыклады. Смяротна паранены ў першы дзень наступлення камандзір узвода малодшы лейтэнант А.Е.Ярохін не пакінуў поле бою, а працягваў камандаваць падначаленымі. Ён пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Камандзір 6-й роты 437-га стралковага палка лейтэнант П.Гарнага, паранены 20 ліпеня, працягваў мужна змагацца і кіраваць сваім падраздзяленнем. 21 ліпеня камандзір батарэі 154-й стралковай дывізіі лейтэнант Барада з свайго наглядальнага пункта выявіў на полі бою варожую супрацьтанкавую гармату і неадкладна адкрыў па ёй беглы агонь. Некалькі разарваўшыхся снарадаў прымусілі гітлераўцаў шукаць паратунку. Лейтэнант Барада з некалькімі байцамі захапіў гармату і, развярнуўшы яе, адкрыў агонь па праціўніку.

Малодшы сяржант Суранаў з 473-га стралковага палка 154-й стралковай дывізіі з групай байцоў вёў разведку і 21 ліпеня сустрэўся з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Каб не папасці ў акружэнне, група пачала адыход. Суранаў прыкрываў адыход таварышаў. Паранены, ён да апошніх сіл працягваў стрымліваць ворага. Уся група выйшла з акружэння. Ад цяжкіх ран Суранаў памёр.

Прыклады адвагі і гераізму праяўляліся як у паласе наступлення 154-й стралковай, так і іншых дывізій корпуса.

Нанесены контрудар і паспешлівае адступленне фашыстаў на гэтым участку савецка-германскага фронту ўсялялі надзею на змену абставін, аб чым сведчаць пісьмы некаторых воінаў Чырвонай Арміі. 29 ліпеня 1941 г. ваеннаслужачы Цяраеў з дзеючай арміі пісаў І.А.Балотнікавай: «Знаходжуся на фронце не ў якасці адступаючага, а ў якасці наступаючага (маецца на ўвазе контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку). Даволі, хопіць. На нашым участку немец адступае, хаця яшчэ марудна. Што будзе далей, пабачым. Калі мы адыходзілі, балюча было глядзець на мясцовых жыхароў, якім даводзілася заставацца, іх чакала жыццё пад уладай фашыстаў. Са слязамі на вачах праводзілі яны нас, але мы

нічога не маглі зрабіць. Цяпер наша артылерыя і авіяцыя пануюць, і немцы вымушаны свае танкі закопваць у зямлю. У гэтым месяцы адбыліся буйныя змены (мы нанеслі фашыстам моцны ўдар), і калі Англія больш дапаможа (утворыць Заходні фронт), то ўжо ў гэтым годзе слава фашызму можа застацца аднымі ўспамінамі».

Але спраўдзіцца надзеям не было дадзена. За паўмесяца наступальных баёў войскі 63-га стралковага корпуса месцамі прасунуліся наперад да 30 км. Утварыўся вялікі выступ у адносінах да суседа справа — 67-га стралковага корпуса. Да таго ж праціўнік пачаў канцэнтрацыю сваіх войск на гэтым напрамку. Таму камандуючы 21-й арміяй 30 ліпеня аддаў загад 63-му стралковаму корпусу спыніць наступленне і перайсці да абароны.

На наступны дзень прыйшло паведамленне аб тым, што за ўмелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі падначаленых войск камандуючаму 63-м стралковым корпусам Л.Р.Пятроўскаму прысвоена званне генерал-лейтэнанта, а камандзірам дывізій Я.С.Факанаву, В.С.Ракоўскаму, Н.А.Прышчэпе — званне генерал-маёра.

Тым часам праціўнік нарошчваў сілы. Супраць войск 63-га стралковага корпуса, які фашысты за адвагу, смеласць, рашучасць на полі бою называлі «чорным корпусам», вораг сканцэнтраваў 8 пяхотных дывізій, значную колькасць спецыяльных падраздзяленняў. Войскі былі падмацаваны танкамі. Пачасціліся налёты авіяцыі. Пачынаючы з 5 жніўня, праціўнік упарта шукаў слабыя месцы ў абароне савецкіх войск. 13 жніўня ён выйшаў у раён вёскі Меркулавічы і стаў прасоўвацца ў напрамку Чачэрска, ствараючы пагрозу акружэння 63-га стралковага корпуса. К гэтаму часу вораг адкінуў часці генерала В.І.Нярэціна і фарсіраваў Дняпро вышэй Стрэшына. Раніцай 14 жніўня праціўнік авалодаў Чачэрскам, у наваколлі якога знаходзіўся штаб 21-й арміі. Яго асабовы склад з боем выходзіў з акружэння. Неўзабаве гітлераўцы ўступілі ў Буда-Кашалёва. 13.8.1941 г. нямецкія войскі знаходзіліся ў раёне Рагачова, Жлобіна, Стрэшына. 467-ы і 487-ы пяхотныя палкі немцаў наступалі ў напрамку райцэнтра Стрэшын і в. Затон. Гітлераўцы фарсіравалі Дняпро, занялі вёскі Пірэвічы і Скепня, злучыліся з 20-й танкавай дывізіяй немцаў. Да вечара 14 жніўня 63-і стралковы корпус быў акружаны поўнасцю.

Удзельнік тых падзей Георгій Пятровіч Куляшоў пісаў: «Сувязь 63-га стралковага корпуса са штабам 21-й арміі перарвалася. Генерал-лейтэнанту Л.Р.Пятроўскаму давялося кіраваць баявымі дзеяннямі, не маючы ніякіх звестак аб становішчы на суседніх участках фронту. У вельмі складанай абстаноўцы ён змог арганізаваць адрыў корпуса ад праціўніка і да зыходу 14 жніўня пераправіў дывізіі на ўсходні бераг Дняпра. У ноч на 15 жніўня яны пачалі адыходзіць на рубеж Стоўпня, Гарадзец, Жлобін з тым, каб нанесці ўдар па ворагу і адкінуць яго за Дняпро.

Камандны пункт корпуса раніцай 15 жніўня быў пераведзены ў вёску Святое (Кірава). Але нямецкія рухомыя часці адрэзалі штаб і некаторыя часці корпуса (307-ы стралковы полк 61-й стралковай дывізіі і 1-ы дывізіён 318-га гаўбічнага артылерыйскага палка вялікай магутнасці) ад яго асноўных сіл. Тады генерал-лейтэнант Пятроўскі з групай камандзіраў штаба ўзначаліў атаку падраздзяленняў, каб прарваць акружэнне. Імклівы ўдар прымусіў гітлераўцаў адступіць. Л.Р.Пятроўскі павёў часці на паўднёвы захад і ў той жа дзень прыбыў у размяшчэнне 154-й стралковай дывізіі і іншых войск корпуса.

Сустрэча адбылася ў лесе. Тут ішоў напружаны бой з ворагам, які сціскаў кола акружэння. Азнаёміўшыся з абстаноўкай, камандзір корпуса неадкладна арганізаваў разведку і прыступіў да падрыхтоўкі прарыву з акружэння. 16 жніўня ў 12 гадзін ён аддаў загад, нацэліўшы асноўны ўдар у напрамку Скепня, Губічы, г.зн. на паўднёвы захад, а не на паўднёвы ўсход, як таго мог чакаць праціўнік. Прыкладна ў 19 гадзін на камандным пункце 154-й стралковай дывізіі ў раёне лесу паўночна-ўсходней в. Чацвярня (15 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Жлобіна) Л.Р.Пятроўскі ўдакладніў задачы дывізіі. Камандзір корпуса даў указанне намесніку начальніка штаба дывізіі дадаткова ўключыць у загад наступны пункт: «Усяму каманднаму складу, незалежна ад звання і пасады, у перыяд начной атакі, аж да злучэння часцей корпуса з часцямі Чырвонай Арміі, знаходзіцца ў перадавых ланцугах, маючы пры сабе эфектыўную зброю, з задачай аб'яднаць вакол сябе ўвесь асабовы састаў дывізіі...» Леанід Рыгоравіч таксама ўказаў, што ён разам з групай камандзіраў штаба корпуса будзе рухацца з 154-й стралковай дывізіяй.

Апоўначы 17 жніўня на паўночны ўсход ад в. Чацвярня, каля другой прасекі лесу, выходзячай да вёскі Завад, камандаванне корпуса і дывізіі сабралася на нараду. Яшчэ раз удакладнілі ўсе пытанні, потым раз'ехаліся па часцях. Начальнік штаба дывізіі палкоўнік



Помнік у гонар воінаў 63-га стралковага корпуса 21-й арміі ў г. Жлобін.

М.К.Агеўнін з групай камандзіраў адправіўся для падрыхтоўкі атакі ў трэцюю прасеку, дзе ў цэнтры баявога парадку займаў зыходнае становішча 473-і стралковы полк. З гэтай жа мэтай у 510-ы стралковы полк накіраваўся начальнік палітаддзела корпуса палкавы камісар Н.Воранаў.

Роўна ў 3 гадзіны 17 жніўня 1941 г. пасля кароткага, але магутнага артылерыйскага налёту 473-і стралковы полк пачаў прарыў. За ім пачалі атакі ўсе астатнія часці дывізіі. Наступленне застала праціўніка знянацку, і часці 154-й стралковай дывізіі, параўнальна лёгка прарваўшы кола варожага акружэння, хутка накіраваліся наперад. У населеным пункце Губічы яны разгромілі штаб 134-й нямецкай пяхотнай дывізіі і захапілі яе баявыя дакументы.

Такім чынам, кола блакіруючых войск было прарвана. Генерал Л.Р.Пятроўскі меў усе падставы паследаваць за палкамі, якія рухаліся, і выйсці з акружэння. Аднак ён вырашыў вярнуцца назад да часцей, якія прыкрывалі выхад з акружэння. Пачуццё доўгу і глыбокай адказнасці за жыццё даручаных яму камандзіраў і байцоў прымусіла яго паступіць так. Камандзір 154-й стралковай дывізіі генерал-маёр Я.С.Факанаў і іншыя таварышы спрабавалі ўгаварыць Л.Р.Пятроўскага не вяртацца. «Тут мне ўжо няма чаго рабіць, — рашуча сказаў ён. — Наперадзе спакойна, а там... праклятый немец насядае на нашых». І, жадаючы падбадзёрыць і заспакоіць камандзіраў, смеючыся, сказаў: «Страшнае мінавала», а потым сур'ёзна і цвёрда, быццам загадваючы, дабавіў: «А вы спяшайцеся да войскаў, па магчымасці хутчэй прывядзіце іх у парадак, ды будзьце гатовы адбіць атакі немцаў, асабліва з боку Рэчыцы. Я хутка вярнуся».

І камандзір корпуса з групай камандзіраў штаба і рэзервам накіраваўся туды, дзе ішоў жорсткі бой, каб асабістым кіраўніцтвам забяспечыць адрыў сіл прыкрыцця ад насядаючага праціўніка, паскорыць іх далучэнне да дывізій, скараціць па магчымасці страты. Але вораг, падцягнуўшы свежыя часці, зноў стаў замыкаць кола акружэння. Прарвацца ў другі раз было ўжо значна цяжэй.

Прарваўшыся ў адным месцы, падраздзяленні папалі ў яшчэ больш складаныя абставіны каля в. Скепня, дзе праходзіла другая лінія варожага кола. Тут загінуў ад'ютант камандзіра корпуса лейтэнант В.Колесаў. Л.Р.Пятроўскі, паранены ў руку, працягваў кіраваць боем».

Прызначаны камандуючым 21-й арміяй, генерал Пятроўскі з дазволу камандавання Цэнтральнага фронту заставаўся з войскамі 63-га стралковага корпуса да канца, імкнуўся як мага больш байцоў вывесці з акружэння і ў той жа час нанесці адчувальныя ўдары па ворагу. Леанід Пятровіч загінуў непадалёку ад в. Рудзенка. У 1944 г. яго астанкі былі перанесены і пахаваны ў брацкай магіле ў в. Старая Рудня. Там жа зараз узвышаецца бронзавы бюст адважнага генерала.

Контрудар на Дняпры адыграў вялікую ролю ў пачатковым перыядзе вайны, сарваў актыўнае наступленне праціўніка на Маскоўскім напрамку, прыкметна аслабіў войскі правага крыла групы арміі «Цэнтр». Ён з'яўляецца сведчаннем таго, што нават у тых цяжкіх умовах часці Чырвонай Арміі маглі не толькі стойка абараняцца, але і даволі паспяхова весці наступальныя аперацыі.

П.Я.Кірычэнка.

Дакументы сведчаць

АД САВЕЦКАГА ІНФАРМБЮРО
(вячэрняе паведамленне ад 13 ліпеня)

На Заходнім напрамку нашы войскі зноў авалодалі гарадамі Жлобін і Рагачоў. На асобных участках гэтага накірунку ўвесь дзень адбываліся жорсткія баі з буйнымі сіламі пяхоты і танкаў праціўніка.

«Правда», 14.7.1941 г.

БОЙ ЗА ЖЛОБІН
(Дзеючая армія, 16 ліпеня, спец. карэспандэнт ТАСС)

Глыбокай ноччу на правы бераг Дняпра ў стан ворага, засеўшага ў Жлобіне, прабраліся адважныя групы нашых разведчыкаў, якімі кіравалі малодшыя лейтэнанты Шматкоў і Каваленка. Вызначыўшы сілы і месцазнаходжанне праціўніка, разведчыкі разам з групай байцоў пад камандай капітана Чысцякова атакавалі ворага, пасеялі ў яго стане паніку.

Тым часам на беразе байцы будавалі пераправу. Пад няспынным мінамётным і артылерыйскім агнём ворага яны вязалі плыты.

Выдатна дзейнічаў капітан Даневі̆ч, які праявіў шмат знаходлівасці і вынаходлівасці ў збудаванні пераправы. Група за групай байцы падраздзялення маёра Карамушкі пераправаўляліся на другі бераг і цяснілі фашысцкіх бандытаў.

Зенітчыкі — камандзір гарматы Жураўлёў і дальнамершчык Данішак — знішчылі два варожыя самалёты, якія спрабавалі перашкодзіць пераправе.

Бязлітасны бой разгарэўся на заходняй ускраіне Жлобіна. Нашы артылерысты падавілі агнявыя кропкі ворага, адрэзалі частку яго войск ад асноўных сіл праціўніка.

У Жлобіне байцы ўбачылі крывавыя сляды гаспадарання фашысцкіх варвараў. Усюды тырчаць абпаленыя трубы. Большасць дамоў спалена ці разбурана. На вуліцах валяецца маёмасць мірнага насельніцтва, горы бітага посуду з-пад віна.

Фашысцкія налётчыкі п'янствавалі, абрабаваўшы вінныя магазіны.

З прыходам у горад Чырвонай Арміі з лясоў вяртаюцца савецкія грамадзяне. Калгаснік Іван Іванавіч Сакольскі і работніца пякарні Надзея Рыгораўна Цяганава расказваюць аб дзікіх злачынствах фашысцкіх вылюдкаў, насіллях над мірным насельніцтвам.

У горадзе аднаўляецца парадак, наладжваецца сувязь. Знішчальны атрад ачышчае мясцовасць ад дыверсантаў, што замаскіраваліся. У баі за Жлобін, як і ў баі за Рагачоў, Чырвонай Арміяй захоплена вялікая колькасць палонных. Ваеннапалонны Карл Дзюпфер — былы кельнер рэстарана ў Дрэздэне — прызнаў, што яго рота панесла вялікія страты. «Нямногія з нас выходзяць жывымі з бою, — сказаў Карл Дзюпфер. — З кожным днём нам, нямецкім салдатам, становіцца зразумела, што гітлераўскія правіцелі гоняць нас на верную смерць».

Г. Крылоў.

«Правда», 17.7.1941 г.

АД САВЕЦКАГА ІНФАРМБЮРО
(ранішняе паведамленне ад 20 ліпеня)

Паблізу Жлобіна добраахвотна здаліся ў палон 35 нямецкіх салдат і адзін унтэр-афіцэр. Перабежчыкі ў адзін голас заявілі: «Мы смяротна стаміліся, нас пакідаюць апошнія сілы. Многія нямецкія салдаты хочуць вырвацца з клешчаў гітлераўскай ваеннай машыны, каб захаваць сваё жыццё». Унтэр-афіцэр Рыхард П. заявіў, што «пераважная, дзе салдаты ўпэўнены, што сярод іх няма даносчыкаў, вядуць гутаркі на адну тэму: «Калі скончыцца вайна». Усіх нямецкіх салдат хвалююць сумныя пісьмы родных і блізкіх, пакінутых дома». «Апошнія пісьмы ад родных з Гамбурга, якія я атрымаў, — расказвае перабежчык Фрыдрых Б.,— гэта лямант людзей, задзёраных частымі бамбардзіроўкамі, падломленых вайной і голадам». З такімі пісьмамі ў рацы, стомлены, змарнелы і незадаволены салдат не можа, ды і не хоча ваяваць.

«Правда», 21.7.1941 г.

З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ ЦК КП(б)Б АБ СТАНОВІШЧЫ СПРАЎ У ЖЛОБІНСКІМ РАЁНЕ

В районе создан истребительный батальон в количестве 150 человек, из них членов ВКП(б) 95 и членов КСМ 26 человек.

Вооружение отряда: у каждого винтовка, две гранаты, в отряде имеется до 15 тыс. патронов и пять ручных пулеметов.

В сельсоветах по левую сторону Днепра в пяти сельсоветах созданы отряды народного ополчения — Старо-Руднянском, Бобовском, Перевичском, Майском, Четвернянском с составом в количестве до 600 человек. Отряды народного ополчения слабо вооружены. Имеют 200 винтовок и незначительное количество гранат.

В оккупированных сельсоветах (Красный Берег, Роктянском, Казимировском, Радушском), по данным Жлобинского райкома, отряды не созданы, периодически туда посылаются товарищи, знакомые с местностью, с заданиями отряда и командования.

Рогатый скот и овцы из района эвакуированы. На станции Солтановка еще имеется 17 тракторов и 5 комбайновых моторов, для эвакуации требуется подать 5 платформ.

На Перевичском спиртзаводе в 3 км от ст. Солтановка имеется 500 тонн проса, которое в настоящем вывозится к станции транспортом завода и населения.

В птицесовхозе имеется до 7 тысяч птицы разной, которую выдают воинским частям...

Руководство Жлобинского района просит подкрепить вооружение отряда автоматами в количестве 75 штук, несколько станковых пулеметов, 200 шт. запалов, подрывн. вещества, 2 грузовые автомашины и обувь, одежду на 200 человек.

С воинскими частями связь у них налажена хорошо.

Следует особо подчеркнуть необходимость укрепления левого берега Днепра, а также постройку нескольких паромов через Днепр, ибо единственный плотовой мост не в состоянии обеспечить передвижение.

Горелик
Кильбин
26.7.41 г.
г. Гомель

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 29, спр. 3, л. 128—129.

Падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

Жлобінскі знішчальны батальён

Фарміраванне знішчальных батальёнаў на тэрыторыі тых раёнаў Беларусі, якія апынуліся ў прыфрантавой паласе, праводзілася па рашэнні партыйных і савецкіх органаў. Яны вялі разведку, барацьбу з дыверсантамі, шпіёнамі, дапамагалі рэгулярным часцям Чырвонай Арміі, мясцовай адміністрацыі ў эвакуацыі людзей і матэрыяльных каштоўнасцей, падтрымлівалі парадак і дысцыпліну. У выпадку акупацыі тэрыторыі ворагам гэтыя батальёны павінны былі пераходзіць да партызанскай барацьбы, арганізоўваць падполле і патрыятычны рух.

Жлобінскі знішчальны батальён пачаў фарміравацца 27.6.1941 г. з партыйных і савецкіх работнікаў, актывістаў, камсамольцаў і моладзі райцэнтра, калгаснікаў прыгарадных гаспадарак. Сярод іх было 95 камуністаў і 26 камсамольцаў. Камандзірам батальёна быў прызначаны інструктар ЦК КП(б)Б Уладзімір Арцёмавіч Міронаў. Абавязкі камісара ўсклалі на першага сакратара райкома партыі Майсея Давыдавіча Шапіру. Але паколькі ў яго не ўсё добра было са здароўем і шмат часу ішло на асноўную работу, звязаную з адпраўкай у тыл насельніцтва, тэхнікі, абсталявання, жывёлы і г.д., функцыі камісара батальёна па сутнасці выконваў загадчык ваеннага аддзела райкома партыі Георгій Васілевіч Злынаў. Начальнікам штаба стаў удзельнік партызанскага руху часоў грамадзянскай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, Аляксандр Міхайлавіч Ярашаў з Чырвонага Берага.

Першымі байцамі знішчальнага батальёна былі залічаны тыя, хто рэкамендаваўся для падпольнай работы, — інструктар райкома партыі М.І.Губянкоў, старшыня калгаса «Чырвоны бор» С.П.Захарошка, загадчык склада канторы па нарыхтоўцы жывёлы



Помнік воінам Жлобінскага знішчальнага батальёна ў в. Завад.

Н.І.Бецікаў, ветэрынарны ўрач вучэбнай гаспадаркі Д.К.Капчанава, Рабцаў, Стрыжакоў і інш. Пазней байцамі батальёна сталі інструктар Брэсцкага гаркома партыі Карней Васілевіч Шаптуноў, капітан войск НКУС Севярын, іншыя работнікі арганізацый заходніх абласцей рэспублікі.

Штаб батальёна па першым часе размяшчаўся ў будынку райкома партыі, які знаходзіўся на вул. Першамайскай побач з райвыканкомам і рэдакцыяй газеты «Шлях сацыялізму», непадалёк ад вакзала. Байцы батальёна здалі партыйныя і іншыя дакументы. Напачатку яны жылі ў гасцініцы. Потым штаб батальёна перадыслацыраваўся на вул. Карпілаўская ў дом грамадзяніна Лямцава.

Апрача знішчальнага батальёна існавалі атрады і групы народнага апалчэння. На чыгуначным вузле такі атрад налічваў амаль 100 чал., у групах в. Саланое і на торфазаводзе — па 25 чал., в. Чацвярня — 20 чал. Наогул у населеных пунктах Майскага, Падольскага, Пірэвіцкага, Старарудняскага, Бабоўскага і іншых сельсаветаў каля 600 народных апалчэнцаў ахоўвалі народную маёмасць і населеныя пункты, дапамагалі вяскоўцам збіраць і адпраўляць дзяржаве хлеб, прадукты харчавання для ваенных лазарэтаў і шпіталяў, вялі барацьбу з дыверсантамі гітлераўскіх войск. Усе байцы мелі зброю. Паміж знішчальным батальёнам і створанымі групамі апалчэння існавалі цесная ўзаемасувязь і ўзаемадзеянні, асобныя задачы вырашаліся агульнымі сіламі.

Асаблівая ўвага звярталася на эвакуацыю ў тыл людзей, абсталявання і маёмасці чыгуначнага вузла, прадпрыемстваў, трактараў са Жлобінскай і Хальчанскай машынна-трактарных станцый, калгаснай буйной рагатай жывёлы і г.д.

На гэтым участку старанна працавалі старшыня гарвыканкома Парфірый Іванавіч Вожык, Архіп Раманавіч Харамецкі, Георгій Мікалаевіч Равіч, Спевак і іншыя. У выніку толькі за 4 дні ўдалося адправіць у тыл звыш 5 тон мукі, круп, цукру і іншых прадуктаў харчавання. Але з-за недахопу вагонаў не ўдалося поўнасцю вывезці прадукцыю з мясакамбіната, і яна магла папасці ў рукі ворага. Каб гэтага не здарылася, Айзік Іосіфавіч Зярніцкі і Вінаградаў «апрацавалі» дзверы склада мазутам і напісалі: «Атручана». Гітлераўцы пры першым захопе Жлобіна не рызыкнулі ўскрываць склады. Пазней прадукцыя была часткова вывезена, астатняя перададзена ваеннаму ведамству.

Байцы знішчальнага батальёна былі надзейнымі памочнікамі вайскоўцаў. Як пісала газета «Известия» 8 жніўня 1941 г., байцы батальёна не раз дапамагалі часцям Чырвонай Арміі граміць ворага і ачагі яго абароны. Так, удзельнік грамадзянскай вайны М.Л.Трыфанаў, 1897 г. нараджэння, забяспечыў пераправу праз Дняпро 15 армейскіх разведчыкаў, якія потым нечакана напалі на ахову моста ў раёне в. Малыя Рагі, знішчылі вартавых і танкетку, што стаяла там. На наступную ноч (адбывалася гэта ў пачатку ліпе-

ня) Мірон Лук'янавіч правёў разведчыкаў у в. Праскурні. Ворага тут не аказалася. Аб гэтым даклалі камандаванню. У выніку была паспяхова ажыццёўлена аперацыя па пераправе стралковага палка на правы бераг Дняпра. Байцы палка 9 ліпеня нанеслі флангавы ўдар па нямецкім войскам у раёне вёсак Грабск і Саланое, станцыі Жлобін-Падольскі, што аказала станоўчы ўплыў на агульную абстаноўку ў раёне Жлобіна.

Удала дзейнічаў камандзір групы Дзмітрый Удавіч Леванцоў, які высачыў і абяшкодзіў варожага лазутчыка. Той тайком прабраўся ў горад, добра замаскіраваўся на дрэве і вёў прыцэльны агонь. Выстраламі з ручнога кулямёта яго паранілі, а потым даставілі да камандзіра батальёна. Але немец аказаўся не з палахлівых: у час допыту ён кінуўся на дзяўчыну, што прысутнічала тут, спрабаваў знішчыць яе. Але гэта спасцігла яго самога.

Той жа Леванцоў 14 жніўня перашкодзіў нямецкай разведцы дачасна пранікнуць у горад. Замаскіраваўшыся на зручнай агнявой пазіцыі (у жалезабетоннай вадасточнай трубе пад чыгуначным палатном), трапнымі кулямётнымі стрэламі ён забіў двух матацыкліstaў. Астатнія павярнулі назад. Трафеі дасталіся пераможцу, а потым былі дастаўлены ў батальён.

Неяк у межах горада з'явіўся варожы разведвальны самалёт. Агнём зенітнай батарэі ён быў падбіты і ўпаў непадалёк. Група байцоў батальёна затрымала лётчыка і перадала яго вайскоўцам.

Па просьбе камандавання корпуса і 154-й стралковай дывізіі (камандзір — палкоўнік Я.С.Факанаў) байцы батальёна вялі разведку ў бліжэйшых і дальніх тылах праціўніка, прыносілі каштоўныя звесткі, якія дапамагалі лепш арганізоўваць абарону на прыдняпроўскіх рубяжах. Адноўчы байцы ўзвода А.П.Ткачова, які да вайны займаў пасаду старшыні спартыўнага таварыства «Лакаматыў», ведучы разведку, выйшлі на развілку дарог каля в. Саланое і замаскіраваліся. Неўзабаве на дарозе затарахцеў матацыкл, якім кіраваў варожы салдат, другі вайсковец сядзеў у калясцы. Разведчыкі трапным агнём знішчылі няпрошаных гасцей, матацыкл і трупы адцягнулі ў кусты, захапілі картупланшэт і працягвалі выкананне баявой задачы — нагляданне за станам ворага.

Разведкай займаліся дарослыя і ўчарашнія школьнікі, і кожны выконваў даручаную справу сумленна. Асабліва вызначыліся браты Мікалай і Уладзімір Сяргеевічы Разгуляевы, Мікалай Мікалаевіч Маркевіч, Барыс і Яўген Яўцехавічы Самчанкі, Анатоль Анісімавіч Валько, Міхаіл Іванавіч Елісееў, Яўген і Юрый Купрыянавічы Рыжковы, Іван Аляксеевіч Жлоба, Алёна Паўлаўна Цямінская, Леанід Мікалаевіч Маркевіч, Уладзімір Канстанцінавіч Федасеенка і іншыя. Яны вялі разведку ў Мормалі, Каротковічах, Плесавіцкай Слабодцы, Нівах, Лясані, Чырвоным Беразе. Дзякуючы ім, савецкая артылерыя з раёна пасёлка Ветка-Вір дакладна пападала ў цэль. У той час было падаўлена шмат агнявых кропак, а ў в. Саланое разгромлены штаб гітлераўскай дывізіі.

Аднак не абыходзілася і без бяды. Неяк група разведчыкаў-пастушкоў (ім лягчэй было прабірацца на тэрыторыі ворага) была затрымана ў раёне в. Каротковічы. Пасля допыту, які нічога станоўчага гітлераўцам не даў, яны пасадзілі Мішу Елісеева, Толю Валько, Ваню Жлобу і Юру Рыжкова (яму тады было 11 год) у гумно і паставілі побач ахову. Ноччу хлопцы зрабілі пад сцяной падкоп і ўцяклі. На вялікі жаль, паміж вёскамі Лясань і Нівы яны напароліся на немцаў і былі абстраляны. Ваня Жлоба і Юра Рыжкоў загінулі на месцы. Міша Елісееў і Анатоль Валько пасля амаль сутачнага знаходжання ў рэчцы Дабасна, дзе, прыкрыўшы галовы лістамі лопуху і дыхаючы праз трысцінкі, пераседзелі пастаянны абстрэл аўтаматчыкаў, адарваліся ад праследавання, дабраліся да месца прызначэння і прынеслі каштоўныя звесткі.

Важным звяном у дзейнасці знішчальнага батальёна быў правод у варожы тыл спецгруп, якія накіроўваліся туды па заданню ваеннага камандавання. 7 груп было перапраўлена праз баявыя парадкі фашыстаў, і ўсе яны потым дзейнічалі на камунікацыях ворага.

За баявы ўклад у справу барацьбы з фашыстамі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1941 г. былі ўзнагароджаны: ордэнам Чырвонага Сцяга — камандзір батальёна Уладзімір Арцёмавіч Міронаў і другі сакратар райкома партыі Пётр Навумавіч Тамкоў, начальнік штаба Аляксандр Міхайлавіч Ярашаў, ордэнам Чырвонай Зоркі — камандзір узвода разведчыкаў Антон Пятровіч Ткачоў (расстраляны акупантамі ў кастрычніку 1941 г.), першы сакратар райкома КП(б)Б Майсей Давідавіч Шапіра, медалём «За адвагу» — баец Рыгор Львовіч Шэндаровіч.

14 жніўня 154-я стралковая дывізія адышла на левы бераг Дняпра. Туды ж перадыслацыраваўся і знішчальны батальён, які размясціўся ва ўрочышчы Сыры Алёс (непадалёк ад Веткі-Вір).

17 жніўня акупанты рушылі на в. Чацвярня, і ў другой палове дня батальён уступіў у бой. Батальён меў дзевяць аўтамашын з маёмасцю, і каб яны не сталі трафеямі ворага, па загаду камандавання байцы К.В.Шаптуноў, Мікалай Кучынскі і Мікалай Радзевіч узарвалі іх. У гэтым баі вызначыліся многія байцы батальёна, асабліва кулямётчык Мікалай Іванавіч Мікша. Толькі пасля цяжкага раненя, нанёсшы ворагу адчувальны ўрон, ён пакінуў агнявую пазіцыю. Будучы інвалідам і цяжка хворым, ён памёр у 1993 г.

Неўзабаве ў батальёне адбыўся сход, які вырашыў яго далейшы лёс. Частка байцоў на чале з У.А.Міронавым пайшла на ўсход, перайшла лінію фронту і ўлілася ў склад дзеючай арміі. Астатнія накіраваліся ў Жлобін для арганізацыі работы ў падполлі. Байцы батальёна са смуткам і жалем памянулі сваіх загінуўшых таварышаў — першага сакратара райкома партыі Давіда Майсеевіча Шапіру, Рыгора Львовіча Шэндаровіча, Абрама Уравіча Рубінштэйна, Леаніда Мікалаевіча Маркелава, Юру Жмудзецкага, Лазара Іосіфавіча Мяцеліцу, юных разведчыкаў Ваню Жлобу і Юру Рыжкова.

Па-рознаму склаўся лёс байцоў знішчальнага батальёна. Адны прайшлі дарогамі вайны і дажылі да перамогі, другія загінулі ў барацьбе з ворагам і спяць вечным сном у брацкіх і адзіночных магілах, трэція змагаліся з акупантамі ў шэрагах народных мсціўцаў і ў падполлі. Былы баец батальёна Пётр Андрэевіч Карыбскі закончыў вайну камандзірам батальёна, штурмаваў імперскую канцылярыю ў Берліне, пасля служыў у арміі, працаваў на мірным фронце.

Старшыня райвыканкома Леанід Іосіфавіч Дзігірэўскі застаўся ў Гомелі, да вясны 1942 г. стварыў падпольную групу і накіроўваў яе дзейнасць. Перабраўся ў абласны цэнтр Мажэйка. З.С.Парашчанка і Г.В.Злынаў пасяліліся ў Стрэшынскім раёне, старшыня гарвыканкома П.І.Вожык перабраўся ў Горацкі раён. Другі сакратар Іоў Апанасавіч Крышнёў з-за пастаяннага праследавання фашыстамі пайшоў за лінію фронту, 6 снежня 1941 г. перасёк яе ў раёне Старога Аскола і прыбыў у ЦК КП(б)Б. Потым ён вярнуўся ў раён і быў першым сакратаром падпольнага райкома партыі.

У верасні—кастрычніку 1941 г. ворагу ўдалося захапіць больш 20 патрыётаў, у ліку якіх былі народны суддзя Міхаіл Міхайлавіч Якімовіч, дырэктар Чырвонабярэжскага варэнневарачнага завода Яўсей Андрэевіч Гаранкоў, старшыня мясцовага камітэта станцыі Жлобін Мікалай Лявонавіч Халько. Сярод захопленых, закатаваных, расстраляных было нямала байцоў знішчальнага батальёна.

У розны час ад рук гітлераўцаў загінулі былыя байцы знішчальнага батальёна Айзік Іосіфавіч Зярніцкі, Аляксей Аляксандравіч Шчукін, інструктары райкома партыі Андрэй Ісакавіч Здараўцоў, Мікалай Іосіфавіч Губянкоў, Рыгор Еўдакімавіч Сачыўка. Пры вызваленні Прыбалтыкі загінуў Яўген Купрыянавіч Рыжкоў.

Усюды — на фронце і ў тыле, у падполлі і партызанскіх атрадах байцы знішчальнага батальёна паказвалі прыклады сумлення, з гонарам выконвалі ўскладзеныя на іх абавязкі. Іх подзвіг не забыты. У 35-ю гадавіну вызвалення Жлобіна і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на 79-м кіламетры шашы Гомель—Жлобін, дзе адбыўся апошні сход байцоў батальёна, непадалёк ад вёскі Завад адкрыты мемарыяльны знак. На ім здалёк відны словы: «Жлобінскаму знішчальнаму батальёну. Чэрвень—жнівень 1941 г.».

П.Я.Кірычэнка.

Стрэшынскія атрад народнага апалчэння і знішчальны батальён

Актыўную дапамогу байцам Чырвонай Арміі, якія займалі абарону на дняпроўскіх рубяжах летам 1941 г., аказвалі Стрэшынскія атрад народнага апалчэння і знішчальны батальён, створаныя на базе райаддзела міліцыі з ліку партыйных і савецкіх работнікаў, кіраўнікоў гаспадарчых падраздзяленняў, камсамольцаў і беспартыйных. У склад знішчальнага батальёна ўваходзілі Дзмітрый Цімафеевіч Шыбінскі — сакратар райкома партыі, Дубаў — загадчык арганізацыйнага аддзела райкома, Мікалай Гаўрылавіч Да-

рошка — загадчык райфінаддзела, Мікалай Іванавіч Генаў — старшыня райспажыўсаюза, Дзікан — старшыня райвыканкома, Пётр Кандратавіч Захаранка — старшы падатковы інспектар, Сяргей Аляксандравіч Фокін — начальнік аддзела НКУС, М.Гарадзецкі — старшыня Стрэшынскага сельскага спажывецкага таварыства, Чарняк — старшы інспектар Дзяржстраху, Васіль Іванавіч Затаўка — загадчык аддзела прапаганды райкома партыі, Соф'я Сіманоўская — тэхнічны сакратар райкома, Года Герцаўна Раскіна — загадчыца раённага аддзела аховы здароўя, Т.Рагаўцоў, В.Н.Марчэўскі, Камароў, С.А.Стукач, К.М.Русаленка, Ф.Бадзілоўскі, М.Гарадзецкі, Л.Гольдзін, Верасаў і многія іншыя.

На падставе добраахвотнасці фарміраваліся таксама групы абаронцаў у вёсках. Іх узначалілі старшыня Новамаркавіцкага сельсавета К.Е.Будніцкі, а таксама Д.А.Мазурэнка, І.Маскаленка, Халькоў і інш.

Камандаваць знішчальным батальёнам даручылі Ткачэнку, а атрадам апалчэнцаў Герасімаву, які працаваў раней дырэктарам Каменскай МТС.

Камісарам абодвух фарміраванняў стаў загадчык ваеннага аддзела Стрэшынскага райкома КП(б)Б І.С.Савасцеенка.

Група, у якую ўваходзілі сакратар райкома камсамола Марыя Барысаўна Богдан, рахункавод райкома партыі Марыя Харытонаўна Ражкова (у замужжы Бегунова) і інструктар-статыст райкома Наталля Рыгораўна Урганава, спачатку забяспечвала работу прызыўнога пункта райваенкамата, а потым арганізавала дзяжурства і падтрымлівала пастаянную сувязь паміж кіраўніцтвам раёна і сфарміраванымі падраздзяленнямі.

Байцам выдалі зброю, з імі наладзілі вучобу. Яны пастаянна кантактавалі з воінскімі часцямі, арганізоўвалі сумесныя дзяжурствы і засады, выконвалі разведвальныя функцыі і інш.

І тым не менш фашысцкі «візіт» у Стрэшын адбыўся знянацку. У пачатку ліпеня 1941 г. тры бронемашыны гітлераўцаў, не сустрэўшы супраціўлення на дарозе, якая вяла з в. Адраджэнне, прыехалі ў гарадскі пасёлак, абстралялі задняпроўскую зону і раённую бальніцу, дзе ў той час знаходзілася шмат параненых чырвонаармейцаў і хворых грамадзянскіх асоб. Гэта, відаць, была варожая разведка, бо яна тут жа павярнула назад. На зваротным шляху гітлераўцы прыхапілі з сабой следчага райпракуратуры, якому ўдалося ўцячы і вярнуцца ў Стрэшын.

Гэты інцыдэнт стаў прадметам сур'ёзнай размовы на нарадзе штаба абароны, якую неадкладна склікалі па ініцыятыве першага сакратара райкома партыі Яфіма Ягоравіча Грыцкова. Разам з ваеннымі намецілі план канкрэтных дзеянняў. Пры ўездзе ў Стрэшын паставілі гармату, арганізавалі ўзмоцненую засаду.

Няпрошаных гасцей доўга чакаць не прышлося. Каля поўдня пачуўся рокат матораў, а потым паказаліся варожыя бронемашыны. Агнём з усіх відаў зброі іх падбілі. Толькі аднаму з членаў экіпажа пашчасціла застацца ў жывых.

Трагічным для батальёна быў дзень 6 ліпеня 1941 г. Раніцай у Стрэшын паступілі звесткі, што з в. Адраджэнне ў напрамку гарадскога пасёлка выехала нямецкая разведка на матацыклах. Байцоў паднялі па трывозе і выслалі насустрач ворагу. Прыкладна за 3 км ад райцэнтра яны сустрэлі гітлераўцаў. Бой быў цяжкім, жорсткім і скончыўся з цяжкімі стратамі для батальёна. Тады загінулі першы сакратар райкома партыі Я.Я.Грыцкоў, С.А.Фокін, П.К.Захаранка і адзін ваеннаслужачы (прозвішча не ўстаноўлена).

16 ліпеня добраахвотнікі трымалі бой пад Мормалем. Сумесна з воінскім падраздзяленнем, якое мела на ўзбраенні гармату, яны ўступілі ў бой з 6 бронемашынамі ворага. Праціўнік адступіў, пакінуўшы падбітую машыну з важнымі дакументамі.

У той жа дзень на тэрыторыі Мормальскага сельсавета з'явіліся атрады матацыклістаў і кавалерыі. Аднак прасунуцца ў бок Стрэшына ім не ўдалося.

Наступныя два дні — 17 і 18 ліпеня — воіны-добраахвотнікі дзейнічалі разам з армейскімі разведчыкамі, самастойна арганізоўвалі рэйды, уступалі ў бой з авангардным групамі фашыстаў. У адной з сутычак 2 нямецкія салдаты былі забіты і адзін паранены, 17 гітле-

Я.Я.Грыцкоў.

раўцаў папалі ў палон. У якасці трафеяў дасталася аўтамашына і 4 матацыклы.

28 ліпеня стала вядома, што ў напрамку райцэнтра едуць 5 бронемашын, у якіх цеснымі радамі сядзелі гітлераўскія салдаты. У іх распараджэнні былі невялікія гарматы, буйнакаліберныя кулямёты, мінамёты, аўтаматы і гранаты. Сілы былі не на карысць апалчэнцаў. Але яны смела ўступілі ў бой. Хутка падаспела дапамога рухомага воінскага атрада, які адкрыў агонь па варожых бронемашынах з 45-міліметровых гармат. Бронемашыны загарэліся, і фашысты пакінулі іх. Але тут жа папалі пад агонь кулямётаў і вінтовак добраахвотнікаў. Адзін з гітлераўцаў здаўся ў палон. Яго перадалі воінскаму атраду, які накіраваўся ў напрамку Жлобіна.

Воіны-апалчэнцы паглыбілі акопы, паставілі кулямёты і размясцілі іх каля дарогі. Хутка аб з'яўленні ворага паведаміў трэск аўтаматаў. Гітлераўцы ведалі аб засадах і стралянінай падбадзёрвалі сябе. Падпусціўшы бліжэй няпрошаных гасцей, добраахвотнікі адкрылі дружны агонь. Гітлераўцы, нібы натыкнуўшыся на сцяну, спыніліся і на момант перасталі страляць. Калі яны ўбачылі згарэўшыя раней бронемашыны, то мабыць, вырашылі, што сустрэліся з пераўзыходзячымі сіламі савецкіх войск і павярнулі назад.

Яшчэ не паспелі гітлераўцы схавацца за паваротам дарогі, як паступілі звесткі, што каля в. Ляды з'явіўся нямецкі атрад. Тэрмінова частка апалчэнцаў рушыла туды. Добраахвотнікі паспелі ў час. Там ужо ішоў бой, і савецкія воіны ўпарта адбівалі націск ворага. Кулямётчык апалчэння Т.Рагаўцоў знішчыў некалькі фашыстаў. Гітлераўцы па-ранейшаму наступалі. Асабліва наступ узмацніўся, калі ім на дапамогу прыбылі матацыклісты. Бой працягваўся каля 2 гадзін. Савецкія воіны і добраахвотнікі ўтрымалі свае пазіцыі і адбілі ўсе атакі ворага. Пры гэтым вызначыліся работнік пашпартнага стала Зотаў, К.Е.Будніцкі. Кожны баец праявіў сябе з лепшага боку, не спалохаўся, не падвёў таварышаў, трымаўся стойка, як і належыць абаронцу, які адстойвае сваю Радзіму.

М.Х.Бегунова, Н.Р.Урганава.

183-і медыка-санітарны батальён

У пачатку чэрвеня 1941 г. 154-я стралковая дывізія, яшчэ не поўнасцю адмабілізаваная, была ўключана ў склад 63-га стралковага корпуса, які накіроўваўся на папаўненне Асобай Беларускай ваеннай акругі. Вайна застала часці корпуса ў шляху. Разгрузіліся на станцыі Добруш і сваім ходам накіраваліся займаць абарону на ўсходнім беразе Дняп-

Жанчыны на тэрыторыі медсанбата. 1941 г.

ра. У складзе стралковай дывізіі рухаўся 183-і медыка-санітарны батальён, які ў званні ваенурача 2-га рангу ўзначальваў аўтар гэтых радкоў. Пасля пераходу размясціліся непадалёк ад в. Лугавая Вірня.

За месяц баявых дзеянняў на дняпроўскіх рубяжах у медсанбат паступіла каля 6 тыс. параненых байцоў і камандзіраў. Сярод іх нямала з суседніх часцей, дзе медыцынскае абслугоўванне было слабейшым.

Але і 183-і медыка-санітарны батальён не быў поўнасцю ўкамплектаваны. У штаце знаходзілася толькі 8 урачоў, 16 медсясцёр, 3 фельчары (адзін з іх за аказанне дапамогі параненым у ходзе баёў у Жлобіне і яго навакольлях быў потым узнагароджаны ордэнам Леніна), 12 санітараў. У распараджэнні медыкаў знаходзіліся 2 спецмашыны і 6 грузавых аўтамабіляў.

Тым не менш, работа па аказанню медыцынскай дапамогі праводзілася вялікая. Раны апрацоўвалі два маладыя ўрачы (тэрміновай службы), тэрапеўт і фізіятэрапеўт. Складаныя аперацыі рабілі хірургі Сухінін, Уласаў і я. Эвакуацыяй раненых і бежанцаў са Жлобіна, якія прыбывалі ў распалажэнне мадсанбатальёна, займаўся камісар Грэйскоп. Ён выставіў пікеты, якія спынялі папутныя аўтамашыны, падводы, уладкоўваў параненых, адпраўляў у тыл не толькі іх, але і дзяцей, жанчын, старых. Здаровыя людзі ішлі толькі пешшу. Лёгка параненыя, як правіла, ад эвакуацыі адмаўляліся.

Медыцынскія работнікі не лічыліся з цяжкасцямі, працавалі напружана і ўдзень, і ноччу. Для асвятлення аперацыйных і іншых палатак выкарыстоўваліся акумулятарныя батарэі, аўтамабілі пры пастаяннай рабоце іх рухавікоў. Маскіроўка была здавальняючай. Практычна наладзілася і харчаванне медперсаналу, а вось часу для адпачынку не было. Толькі пасля атрымання папаўнення з Ульянаўска крыху палягчэла. Да таго ж з аўтароты корпуса атрымалі машыны, сталі больш выкарыстоўваць транспарт, які рухаўся ў тыл за боепрыпасамі.

Часта прыходзілася бываць у штабе сваёй 154-й. Разам з камандзірам дывізіі Я.С.Факанавым я асабіста наведваў перадавыя пазіцыі палкоў і батальёнаў, дзе заўсёды знаходзіліся справы па медыцынскай частцы.

Калі ў пачатку 2-й дэкады жніўня 1941 г. з'явілася пагроза акружэння на дняпроўскім рубяжы, быў атрыманы загад перадыслацыраваць медсанбат на паўночны ўсход ад Старой Рудні. Раніцай 11 жніўня медсанбат спыніўся каля в. Селівонаўка. Але гэта нікога не радавала, бо ўкрыцця не было, немцы пастаянна бамбілі, не давалі разгарнуць нармальную работу. Прыйшлося тэрмінова пакінуць гэта месца, шукаць паратунку ў Салтанаўцы. Тут батальён затрымаўся да наступлення цемры, а на досвітку наступнага дня частка яго размясцілася ў гаі каля вёскі Негаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Было паслана данясенне аб месцы новай дыслакацыі, і 12 жніўня батальён сабраўся ў поўным складзе. Вечарам выканалі паступіўшы загад: адправіць 40 узброеных чалавек з ліку санітараў і абслугоўваючага персаналу для папаўнення страявых часцей.

Сувязны, пасланы з данясеннем, назад у размяшчэнне медсанбата не вярнуўся. Але мы меркавалі, што камандаванне дывізіі ведае пра нас. Выставілі ахову, раненых адправілі ў армейскі шпіталь. Поўнасцю не разварочваліся, толькі падрыхтавалі аперацыйныя палаткі, перавязачны матэрыял і медыкаменты. Асноўнае — у машынах.

У ноч на 14 жніўня ў раён медсанбата прыбыў ветэрынарны лазарэт нашай стралковай дывізіі.

Далейшы лёс надзвычай цяжкі. У поўным акружэнні асабовы састаў батальёна і лазарэта застаўся верным прысязе, праявіў мужнасць, высокую свядомасць, да канца выканаў воінскі абавязак. У няроўнай схватцы з ворагам, які пераўзыходзіў па колькасці і ўзбраенню, загінулі ўрач Мікалай Самойлавіч Сухінін, старшая медсястра Кацярына Іванаўна, атрымаў смяротнае раненне камісар Грэйскоп... 120 жыццяў каштаваў той бой каля в. Негаўка. Увогуле людзі мірнай справы, па сутнасці бяззбройныя, у надзвычайнай абстаноўцы, яны на пэўны час затрымалі прасоўванне ворага да Гомеля, тым самым дапамаглі іншым больш дакладна выканаць пастаўленыя перад імі задачы. Некаторым жанчынам пашчасціла застацца ў жывых, потым уліцца ў рады народных мсціўцаў. Іх выратавалі і схавалі ад чужых вачэй мясцовыя жыхары, за што ім наш нізкі паклон. Частка медыкаў не па сваёй волі папала ў палон і зведала ўсе мукі ада.

Медыкі 183-га медсанбата ў ліпені—жніўні цяжкага 1941 г. на левабярэжжы Дняпра выратавалі жыццё многім байцам і камандзірам, хто ў баях за Жлобін у той час паказаў узоры мужнасці і гераізму, адданасці Айчыне.

Ф.А.Вялічка.

Талісман генерала

Горача разгараўся жніверьскі дзень. У голлі дрэў трапятала музыка сонечных промняў. Над наваколлем запанавала цішыня.

Пятроўскі зварухнуўся. Ціха? Чаму?.. Перш чым як след дайшоў да памяці, недзе ў падсвядомасці на момант устрывожыўся, яго застрашыла цішыня: бой жа ідзе!.. Расплюшчыў вочы.

Ён ляжаў на жываце. Скурчаныя пальцы ўчапіліся ў дзёран. Паварушыў правай, здаровай рукой — слухалася. Памкнуўся сесці. Востры боль разануў жывот, працяў усё цела. Цяжар наваліўся на павекі, але ён з усёй сілы намогся, каб не апусціць іх: разумеў, заплюшчыць вочы — і зноў праваліцца ў чорную бездань. Каб у тую хвіліну ён змог здзівіцца — здзівіўся б: у яго яшчэ знайшліся сілы сказаць сабе сумна-жартаўлівае: «Пакуль ты жывы, ты яшчэ не памёр».

Гэты жарт ён пачуў ад Джона Рыда. Сустрэліся яны пад час асады Зімняга палаца. Але пагутарыць тады з разгаворлівым яснавокім чужаземцам яму не давялося: гарматны стрэл з боку Нявы даў загад, і ён павёў сваё аддзяленне ў атрадзе няўрымслівых чырвонагвардзейцаў на штурм палаца. Зноў пабачыліся яны ноччу ў калідоры Зімняга. Джон Рыд размаўляў з чырвонагвардзейцамі, запісваў, што пачуў і пабачыў, у блакнот. Потым, размахваючы шыракаполым капелюшом, які трымаў у руцэ, горача расказваў пра мексіканскую рэвалюцыю, пра кіраўніка сялянскіх партызанскіх атрадаў Франсіска Вілью... На хвіліну задумаўся, сказаў сур'ёзна: «Рэвалюцыянер змагаецца, пакуль жывы. — І жартам дадаў: — А пакуль ты жывы, ты яшчэ не памёр».

«Жывы ж...» Пятроўскі прыўзняў галаву. Зараз ён падымецца, пойдзе... Толькі ў які бок ісці?.. Побач ніц ляжаў Калістратавіч, шафёр. Трэба яго расштурхаць — і разам... Ці, можа, машына завядзецца?..

Недалёка раптам пабачыў дзве постаці. Адкуль яны з'явіліся, не было ж!.. Як з зямлі выраслі... Прывід? Паплюскаў вачамі, пакруціў галавой, каб адагнаць прывід. Не, постаці ішлі, набліжаліся... Ён палапаў рукою ўзбоч — намацаў пісталет. А колькі там патронаў? Шчоўкнула спружына. У абойме былі два патроны. Ага, і ў ствале адзін...

Цяпер ён добра разглядзеў — немцы. Адзін — даўгалыгі, другі — невысокі, таўсматы, як цяльпук. На шыі — аўтаматы... Вось яны ўжо зусім блізка... Ён прыцэліўся, націснуў на спускавы кручок. Стрэл... Другі... Цяльпук упаў. Даўгалыгі рвануў з шыі аўтамат. А ён прыклаў да скроні дула пісталета...

Даўгалыгі даў чаргу. Падышоў да нерухомага цела. Раптам спуджана крутнуўся: а што, калі ў спіну яму?!. Вунь колькі іх!.. Дык і гэты ж ляжаў, як забіты...

Потым ён хутка пачаў аглядваць легкавік. Залез у кабіну, націснуў на стартэр. Машына завялася. Ён выскачыў, згроб цельпука. На заднім сядзенні ляжаў шынель. Даўгалыгі паклаў забітага на шынель і ўключыў скорасць.

Камандзір роты обер-лейтэнант Брамер, якому салдат далажыў аб падзеі, агледзеў шынель. На пятліцах былі знакі адрознення вышэйшага каманднага саставу, якіх яму не даводзілася бачыць.

— Добра запомніў тое месца? — Ён пільна ўставіўся ў парабацінены ластаўчыннем твар салдата.

— Запомніў, пан обер-лейтэнант! — ляснуў даўгалыгі абцасамі.

— Хадзем да палкоўніка.

Камандзір палка палкоўнік Хоэкер агледзеў шынель, зазірнуў у даведнік знакаў адрознення ваеннаслужачых Чырвонай Арміі.

— Гэта шынель генерал-лейтэнанта! — Словы яго, прамоўленыя сухім рэзкім голасам, як стралялі. Хвіліну ён пазіраў на салдата, і ў вачах, што застылі ў глыбокіх вачніцах на выцягнутым твары, разгаралася злая радасць. — Ваша прозвішча?

— Радавы Шэндзекютэ! — выструніўся салдат.

— Едзем! — Палкоўнік нацягнуў на рукі тонкія шэрыя пальчаткі.

Пятроўскі ляжаў на ўзлеску сярод патаптаных палявых красак. Гімнасцёрка яго была ўся ў крыві. Кроў запяклася на скроні і на твары. Крывёю набрыняла густая цёмная пасма валасоў, што ўпала на лоб.

Обер-лейтэнант Брамер дастаў з кішэні гімнасцёркі забітага невялікую чырвоную кніжачку, аддаў палкоўніку. Пальцы яго намацалі яшчэ штосьці — цвёрдае, прадаўгаватае...

Палкоўнік стаяў холадна-жорсткі, зацяты, разгарнуў кніжачку. Хвіліну з цяжкасцю

ўчытваўся ў незнаёмыя словы. Вочы яго круглелі, большалі...

— Петрофскі!.. — Калматыя бровы ўскінуліся, сухі голас прагучаў на самай, бадай, высокай ноце, якую мог узяць.

Хоэкер яшчэ патрымаў кніжачку, нібы стараўся пераканаць сябе, што — так, гэта пасведчанне генерал-лейтэнанта Пятроўскага, і паклаў у кішэню фрэнча.

— Што там яшчэ! — звярнуўся да Брамера, заўважыўшы яго нерашучасць.

Обер-лейтэнант працягнуў яму жолуд.

— Талісман? — Палкоўнік перакідваў жолуд з рукі на руку, усё роўна як узважваў. — Камуністы вераць у талісман? — Пагардліва ўхмыльнуўся, шпурнуў яго ўбок. Але некаторы час яшчэ пазіраў туды, дзе жолуд упаў у траву. Потым агледзеўся навокал, твар яго змяніўся, стаў задумлівы.

— Аднак непрыемнасцей вы нам нарабілі не мала, генерал. Нават фюрэра ўзрушылі... — Немаладога веку палкоўнік марудна, як стомлена, павярнуўся:

— Обер-лейтэнант!

— Яволь, пан палкоўнік.

— Прадстаўце радавога Шэндзекютэ да ўзнагароды. — Кароткая паўза — і яшчэ загад: — Усіх забітых тут — пахаваць. Генерал-лейтэнанта — асобна. Паставіць яму крыж і падпісаць!

Палкоўнік Хоэкер казырнуў і сеў у машыну.

Апоўдні цела Пятроўскага, пакладзенае на чырвонаармейскі шынель і накрытае плашч-палаткай, аддалі зямлі.

Хто ведае, можа, якраз тым часам Надзея Васілеўна Пятроўская чытала пісьмо мужа. «...Хачу павіншаваць цябе з днём нараджэння. Думаю, што маё пісьмо ты якраз атрымаеш пад гэты час. Вось падарыць нічога не змагу. Была ў мяне плітка шакаладу, ды я з'яеў яе.

Сядзім у лесе, гарады, што вакол нас, спалены. Адны коміны тырчаць, і купіць што няма дзе. Але падарунак будзе за мною. За мной, як за каменнай сцяной, — не прападзе.

Моцна вас цалую. Цябе і Олю».



Помнік на месцы гібелі Л.Р.Пятроўскага ў в. Рудзенка.

«Л.Р.Пятроўскага я добра ведаў як аднаго з таленавіцейшых і адукаваных ваеначальнікаў і, калі б не дачасная гібель, думаю, што ён стаў бы камандзірам буйнога маштабу», — так сказаў аб камандзіры 63-га стралковага корпуса 21-й арміі былы намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, камандуючы 1-м Беларускім фронтам Маршал Савецкага Саюза Г.К.Жукаў.

Друкуецца паводле кнігі Аляксандра Капусціна «Цвіў бэз, іграла скрыпка...» Мн., 1992. С. 81—86.

Ратуючы жыццё камандзіра

...6 ліпеня 1941 г. Ідуць жорсткія баі з ворагам непадалёк ад Жлобіна. Агнявы ўзвод 3-й батарэі 321-га зенітнага артылерыйскага дывізіёна 117-й стралковай дывізіі рухаўся самастойнай калонай да новай агнявой пазіцыі, калі яго атакавалі фашысты. Узводам камандаваў лейтэнант Бурлакоў (прыбыў у батарэю ў маі 1941 г. пасля заканчэння Арэнбургскага вучылішча зенітнай артылерыі). Агнявікі разгарнуліся і прынялі бой. Праз некаторы час камандзір дывізіёна маёр Дземяшкевіч загадаў Бурлакову адысці да Жлобіна.

Узводу ставілася задача перагарадзіць шлях фашысцкім танкам і аўтаматчыкам, якія рваліся да Жлобіна з паўночнага захаду.

На шашу паспелі выехаць тры гарматы, калі раптам з-за насыпу чыгункі з'явіліся варожыя танкі. Ва ўзводзе былі такія гарматы, з якіх у паходным стане нельга было зрабіць ніводнага стрэла. А для таго, каб прывесці гарматы ў баявы стан, патрабавалася мінімум дзве хвіліны. У агнявікоў іх не было. Таму Бурлакоў падаў сігнал: «Наперад!» і ўскочыў у цягач першай гарматы сяржанта Жукава.

Другой у калоне ішла гармата сяржанта Сяргеева. Чырвонаармеец Кузняцоў з гэтага разліку з карабінам за плячыма ўскочыў у кузаў цягача гарматы ў апошняе імгненне. Выстралы танкавых гармат, кулямётныя чэргі, разрывы снарадаў і віск асколкаў і куль зліваліся ў суцэльны гул. Раптам цягач уздрыгнуўся ад разрыву снарада, але працягваў рух наперад. Праз раздроблены борт цягача Кузняцоў убачыў паўсарваную дзверку кабіны і завісшага на ёй сяржанта Сяргеева. Праз імгненне Сяргееў пачаў валіцца ўлева і знік. «Здаецца, сарваўся», — падумаў Кузняцоў і рыўком перамахнуў цераз борт. Ён моцна ўдарыўся, але болю не адчуў. Схапіў нерухома ляжачага Сяргеева і скаціўся з ім у кювет. Амаль у тую ж хвіліну побач прагрукацела трэцяя гармата, а за ёй — фашысцкія танкі. Кузняцоў зняў карабін і падрыхтаваўся да бою: маглі з'явіцца аўтаматчыкі. Але за танкамі іх не было.

Кузняцоў схіліўся над Сяргеевым. Сяржант быў акрываўлены, цяжка дыхаў. Кузняцоў адзначыў: значыць жывы! Ён узваліў яго на сябе. Сергееў застагнаў.

— Пацярпіце, таварыш сяржант, — сказаў Кузняцоў і паціху папоўз у жыта.

Напарадзе віднелася лагчына. У гэты час данёсся гулкі ўзрыў. Напарадзе, каля Жлобіна, узняўся дым, штосьці гарэла. «Няўжо падпалілі цягач?» — з горыччу падумаў ён.

Але гэта гарэў фашысцкі танк. На падыходзе да Жлобіна калона зенітчыкаў дагнала 152-міліметровую пушку-гаўбіцу. Камандзір разліку палявой гарматы, выкарыстаўшы трактар, навёў гармату на пярэдні танк ворага, які паступова набліжаўся. Прапусціўшы зенітчыкаў, расстраляў яго амаль ва ўпор, з адлегласці не больш паўсотні метраў. Трохпудовы снарад папаў пад башню. Раздаўся вялікай сілы ўзрыў. Танк запалаў і перагарадзіў дарогу астатнім варожым машынам. Зенітчыкі цяпер былі па-за небяспекай.

Але аб гэтым Кузняцоў даведаўся пазней. А цяпер ён дацягнуў Сяргеева да якойсьці ямы і агледзеўся. З дарогі іх не было бачна, хаця яна і праходзіла непадалёк. Ён асцярожна зняў з Сяргеева акрываўленую кашулю, перавязаў раны. Крывацёк спыніўся, цяпер можна было прабірацца да сваіх. Ён паспрабаваў з'арыентавацца. На поўнач, метраў за шасцьсот, размяшчалася іх апошняя агнявая пазіцыя. «Так, туды ісці бессэнсоўна, наўрад ці хто застаўся жывы», — падумаў Кузняцоў і вырашыў прабірацца да Дняпра. Зноў узваліў на сябе камандзіра, папоўз на ўсход.

Бязлітасна пякло сонца. Страшэнна хацелася піць, але вады не было. Ён упарта поўз, хаваючыся ў жыце. Некалькі разоў зусім блізка раздаваліся аўтаматныя чэргі і трасканя матацыклаў. Ён залягаў з карабінам, рыхтуючыся дорага аддаць сваё і Сяргеева жыццё.

Сяржант часта страчваў прытомнасць і ў забыцці штосьці гаварыў. Прыходзячы ж у сябе, болей маўчаў, імкнуўся стрымаць стогны. Але аднойчы не вытрымаў і сказаў Кузняцову, каб той яго пакінуў, маўляў, усё роўна яны не змогуць удваіх выйсці да сваіх. Кузняцоў прамаўчаў. Калі ж Сяргееў паўтарыў гэта ў другі, а потым і ў трэці раз, коратка, але выразна адказаў:

— Выйдзем удваіх. Абавязкова выйдзем...

Да гэтага пытання больш не вярталіся.

Да Дняпра дабраліся паўночней Жлобіна, калі пачало ўжо цямнець. Колькі за гэты дзень давялося пераадолець кіламетраў, ён так і не мог потым успомніць, як не мог успомніць свой звілісты маршрут. Кузняцоў паднёс Сяргеева да вады і апласнуў яго твар. Сяргееў апрытомнеў. Яны доўга пілі дняпроўскую ваду, адчуваючы, як да іх вяртаюцца сілы. Тут жа, на пяску, крыху адпачылі. Потым Кузняцоў асцярожна пайшоў па беразе, спадзеючыся адшукаць якую-небудзь лодку. Над вадой узнімаўся лёгкі туман, на небе блішчэў серп луны. У баку Жлобіна шугалі пажары ды зрэдку раздавалася страляніна. На жаль, пошукі аказаліся безвыніковымі. Кузняцоў вярнуўся і сказаў:

— Прыйдзецца ісці да Жлобіна. Там і пераправімся...

Узваліўшы Сяргеева на плечы, ён ужо ва ўвесь рост зашагаў з ім да горада. Падышоўшы да паўночнай ускраіны, Кузняцоў пакінуў сяржанта ў кустах і, трымаючы карабін на пагатове, накіраваўся да бліжэйшага домік. Цяпер страляніна ў горадзе чулася выразней. Штосьці гарэла каля ўзарванага чыгуначнага моста.

Раптам раздаўся старэчы кашаль. Кузняцоў накіраваўся на яго і хутка распазнаў сядзеўшых каля доміка старога і старую.

— Добры вечар, — хрыпла сказаў Кузняцоў. — Фашысты ёсць?

— Добры вечар, сынку, — не здзівіліся яго з'яўленню старыя. — Так, прыйшоў супастат, але пайшоў адсюль да моста. Заходзь у дом.

— Я не адзін, са мной паранены таварыш. Схаджу за ім...

Стары дапамог унесці Сяргеева ў дом. Занавесілі вокны і запалілі лямпу. Сяржант быў у непрытомнасці. Старая прыхілілася да яго і ўсхліпнула.

Цяпер Кузняцоў добра іх разгледзеў. Стары быў высокі і жылісты, валасы на галаве і барада зусім белыя. Маленькая і хударлявая старая была такая ж сівая. Яна сабрала на стол ежу і падала Кузняцову лыжку:

— Паеш, сынок. А я пакармлю твайго таварыша.

Падышоў стары з нейкай бутэлькай у руках:

— Настой на бярозавых пупышках. Лепшыя лекі ад ран. Ён змачыў віскі Сяргеева, уліў крыху ў рот. Сяржант апрытомнеў, і абрадаваная старая пачала яго карміць. А потым яны заняліся перавязкай. З'явілася цёплая вада, знайшліся чыстыя палатняныя бінты.

А потым Кузняцоў і стары выйшлі на вуліцу, селі на прызбе:

— Патрэбна лодка. Знойдзецца? — спытаў Кузняцоў.

— Лодак няма, іх угналі нашы на той бок, — адказаў стары.

— Хаця... Есць вельмі старая. Толькі яна, як рэшата.

Лодка знаходзілася каля хлева. Яна сапраўды даўно адслужыла свой тэрмін. Прыйшлося яе канапаціць і лапіць дзіркі. Для валжаніна Кузняцова справа была звычная. Як маглі, палаталі лодку і аднеслі яе да ракі. Стары прынёс адно вясло і міску — вычэрпваць ваду. Потым пайшлі за Сяргеевым. Перанеслі яго ў лодку. Стары і старая прыхінуліся да Кузняцова. У іх парыве было столькі безысходнага адчаю, што ў яго, здавалася, сэрца спынілася. Расчулены, ён цалаваў мокрыя ад слёз шчокі стаўшых для яго такімі роднымі і дарагімі людзьмі.

— Едзьце, сыны мае, — нарэшце адарваўся стары. — І хутчэй вяртайцеся. Мы вас чакаем...

Кузняцоў адпіхнуў лодку. Калі ён аглянўўся, у тумане ні берага, ні людзей ужо не ўбачыў. Адным вяслом было цяжка грэбсці. Да таго ж лодка працякала, і час ад часу прыходзілася вычэрпваць ваду. Усё ж ён прычаліў да левага берага. Тут сустрэў байцоў са сваёй дывізіі і з іх дапамогай даставіў Сяргеева ў медсанбат. Урачы ахнулі: у Сяргеева было пятнаццаць ран. Да таго ж ён страціў шмат крыві. Яму аказалі дапамогу і адправілі ў тыл.

Да сваёй батарэі Кузняцоў дабраўся толькі ў другой палове дня і скупа далажыў, што затрымаўся, дастаўляючы параненага сяржанта Сяргеева ў медсанбат. Пазней з вялікімі цяжкасцямі байцы атрымалі ад яго некаторыя падрабязнасці. На пытанне, чаму ён выскачыў з цягача пад агнём танкаў ворага, Кузняцоў адказаў:

— Убачыў свайго камандзіра ў небяспецы. Нельга ж было пакідаць яго.

Праз некалькі дзён пасля паспяховага контрудару нашых войск Жлобін быў вызвалены ад фашыстаў. На дарозе да горада мы ўбачылі згарэўшы фашысцкі танк. У раёне агнявой пазіцыі падабралі сваіх таварышаў, загінуўшых 6 ліпеня 1941 г., і пахавалі іх з пашанай каля шашы Жлобін—Бабруйск. Вось іх імёны: Конрадзі, Іскакаў, Нікіфараў, Батракоў, Домашнеў...

Друкуецца паводле артыкула генерал-лейтэнанта артылерыі запаса В.Гадуна «Спасая жизнь командира». Газета «Красная звезда». 23.6.1983 г.

Боепрыпасы дайшлі па прызначэнню

Досвітак 22 чэрвеня 1941 г. разам з падначаленымі мне байцамі сустрэлі непадалёк ад тагачаснай дзяржаўнай заходняй мяжы былога СССР. Наш спецыяльны эшалон, у якім везлі боепрыпасы, спынілі на станцыі Ломжа. Вагоны адчапілі, а нам — яго ахове — загадалі вяртацца да месца службы.

Зрабіць гэта было не так лёгка, бо туды ляжалі сотні кіламетраў. Дабірацца было патрэбна да Жлобіна ці Калінкавіч, а адтуль ужо на станцыю Яшчыцы і ў ваенны гарадок, што раскінуўся ў лясным масіве за в. Дуброва.

У гэтыя мясціны я папаў пасля заканчэння Ленінградскага тэхнічнага артылерыйскага

вучылішча ў званні лейтэнанта тэхнічнай службы. Тады тут знаходзіліся велізарныя армейскія склады, дзе захоўваліся боепрыпасы: артылерыйскія снарады і міны розных калібраў і інш., я займаў пасаду піратэхніка. Напярэдадні пачатку вайны мне з групай чырвонаармейцаў даручылі суправаджаць эшалон з боепрыпасамі, якія прызначаліся войскам, што стаялі каля заходняй граніцы ў межах Асобай Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

...Уздоўж граніцы грымела кананада. Мы не ведалі, што да чаго, але добра ўсвядомілі: скончылася мірнае жыццё, пачалася вайна. На паравозе, які пакінулі ў нашым распараджэнні, мы пачалі рух на ўсход. Хутка сустрэлі чырвонаармейцаў са зброяй у руках і без яе. Кожны з іх імкнуўся папасці да нас. Паколькі старшых па воінскім званні не было, мне прыйшлося прымаць канчатковае рашэнне. Бралі да сябе толькі тых вайскоўцаў, якія мелі зброю. За кароткі тэрмін такіх набралася шмат. На паравозе ўжо цяжка было адшукаць свабоднае месца. Думалася, што гэтыя людзі будуць добрай падмогай у паляпшэнні аховы складоў боепрыпасаў і самога ваеннага гарадка.

На станцыі Баранавічы заправіць лакаматыў вадой не ўдалося. Літаральна перад нашым з'яўленнем была ўзарвана вадакачка. Нам нічога не заставалася, як накіравацца далей. Праз некаторы час апынуліся каля нейкай рэчкі. Спыніліся. Ад паравоза да ўрэзу вады выстраілі два ланцугі байцоў. Прадпрынялі спробу кацялкамі заправіць вадой паравоз. Але машыніст, паглядзеўшы на гэтую выдумку, назваў яе дзіцячай забавай і крыкнуў: «Канчайце, толькі час марна трацім! Едзем далей!»

Але ехаць далёка не давялося. Хутка паравоз запаволіў ход, а потым зусім спыніўся: у катле скончылася вада і не стала пару. Мы спешыліся. Да Мінска было яшчэ далёка. На гарызонце былі бачныя слупы дыму. Што і дзе гарэла і чаму, было невядома. Усе стаялі ў роспачы, кожнага абгортвалі невясёлыя думкі. «Магу адсюль вывесці групу ў раён Пухавіч, мінуючы Мінск», — пачуўся голас. Ён належаў машыністу нашага паравоза (на жаль, не памятаю ўжо яго імя).

Мы ўтаропіліся ў яго і потым, пераглянуўшыся паміж сабой, моўчкі, нястройнай калонай рушылі за ім. Арганізавалі нагляд за навакольлем. Ісці было цяжка, людзей пакідалі апошнія сілы, паколькі яны ўжо доўгі час знаходзіліся ў дарозе без ежы і адпачынку. Нарэшце ўдалечыні паказаліся пабудовы. Аказалася, што мы выйшлі да Асіповіч. Байцы крыху павесялелі, загаманілі аб тым, што хутка здабудуць харчаванне і адпачнуць.

Мяне таксама не пакідала думка аб тым, як накарміць людзей. Цяпер я — камандзір і значыць у адказе за кожнага члена групы. Знаходжу памяшканне ваеннага каменданта. Невядомы старшы лейтэнант сустрэў цікавым позіркам. Звяртаюся па ўсёй форме, тлумачу, што і да чаго. «Колькі вас тут?» — «Ды вунь стаяць», — адказваю і ківаю на вакно.

«Пайшлі за мной», — і ён накіраваўся з пакоя. Прыйшлі на склад, які раней належаў чыгуначнаму рэстарану, адчынілі дзверы.

— Бярыце ўсё, што можаце і колькі хочаце, бо хутка яго знішчым. Фашысты вось-вось войдуць у горад.

Вяртаюся да байцоў, тлумачу становішча. Разам ідзем на склад... Пасля 10-кіламетровага маршу нарэшце, выбраўшы ўтульнае месца, спыніліся на прывал і прыём ежы.

Мяне непакоіла думка, што байцы, пабываўшы на складзе, могуць злоўжыць спіртным, якога там было ўдосталь. Браў яго хто, ці не, я не ведаў. Аднак усё абышлося. Ні ў дарозе, ні на прывале ні адзін чалавек спіртное не ўжываў. На маю думку, у экстрэмальных умовах спрацавала абвостранае пачуццё воінскага і чалавечага абавязку, самадысцыпліна. Я і цяпер з павагай успамінаю тых воінаў.

Да Бабруйска ішлі ўздоўж чыгуначнага палатна. Часам было бачна, як на тым баку, па паралсльна ідучай шашы, уперад і назад праскоквалі варожыя матацыклісты, ішлі аўтамашыны з салдатамі. Да гэтага часу не разумею, чаму яны не праследавалі нас. Можа, лічылі за сваіх, ці то было іх нахабства, першыя лёгкія перамогі і спадзяванні, што мы ўсё роўна нікуды не дзенемся? Так ці не, але мы без затрымкі і перашкод дабраліся да Бярэзіны.

Каля ракі групу затрымалі. Гэта, відаць, былі людзі з загараджальнага атрада. Праверылі дакументы, выслухалі наш даклад — расказ і накіравалі байцоў «майго» падраздзялення на абарону горада Бабруйск. Мяне і чатырох камандзіраваных са мною байцоў затрымліваць не сталі: маўляў, дабірайцеся да сваёй часці.

Пераправіліся праз раку на падручных сродках і накіраваліся ў бок Жлобіна. Нарэшце прыбылі ў свой ваенны гарадок, дзе нас фактычна ўжо не чакалі.

Некалькі пазней, калі гітлераўскія войскі захапілі Жлобін, у часць вярнуўся камісар Мызянкоў. Гэта быў смелы і мужны воін з лепшымі чалавечымі рысамі. Кавалер ордэна Чырвонага Сцяга, удзельнік грамадзянскай вайны і наступных падзей на Далёкаўсходніх граніцах, ён пэўны час працаваў у лагеры японскіх ваеннапалонных, а потым прыбыў у нашу часць. Ён яўляў сабой прыклад служэння і выканання патрабаванняў воінскай прысягі, з бацькоўскай адказнасцю клапаціўся аб падначаленых. Памятаецца такі выпадак. У час бамбёжкі артскладоў адна з авіябомб не ўзарвалася. Засела глыбока ў зямлі. Я прапанаваў дастаць яе з дапамогай трактара і троса, палез у варонку. Адтуль камісар выцягнуў мяне літаральна за ногі і так прабраў, што я і сёння добра памятаю тую прачуханку: «Няма чаго праяўляць дурасць, грэбаваць правіламі і рызыкаваць без неабходнай на тое патрэбы».

У першы дзень, калі пачалася вайна, ён перапыніў свой водпуск і накіраваўся ў часць. Але дабраўся да Веткі — Вір. Далей паязды не хадзілі: масты на Дняпры былі ўзарваны. Камісар уплаў перабраўся цераз Дняпро і яшчэ ў невысахшым абмундзіраванні з'явіўся ў часці.

А хутка ён яшчэ раз паказаў свае лепшыя рысы. Да гарадка прарваліся нямецкія матацыклісты. Заўважылі іх позна, магла пачацца паніка. Камісар, які з'арыентаваўся лепш іншых камандзіраў, прыняў меры і папярэдзіў непажаданае становішча.

На дняпроўскіх рубяжах кіпела бітва. А мы невялікім асабовым складам у шалёным тэмпе адпраўлялі боепрыпасы. Дзякуючы дзеянням воінаў 63-га стралковага корпуса праз станцыю Яшчыцы і Калінкавіцкі чыгуначны вузел нам удалося адправіць на фронт звыш 5 тысяч вагонаў з боепрыпасамі. Маёмасць ваеннага гарадка таксама не дасталася акупантам.

М.Л.Маскалёў.

Яны абаранялі Радзіму

БАТАЛАЎ Фёдар Аляксеевіч. Нарадзіўся 29.8(11.9).1900 г. ў Казані. Рускі. З рабочых. У 1918 г. пачаў службу ў Чырвонай Арміі, удзельнічаў у ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу чэхаславацкага корпуса пад Самарай і Сімбірскам, змагаўся з дзянікінцамі пад Царыцынам, з басмачамі ў Сярэдняй Азіі. У 1927 г. закончыў ваенную школу ў Казані, а ў 1939 г. — курсы «Выстрал». Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. 13 ліпеня 1941 г. 2-і батальён 437-га стралковага палка пад камандаваннем капітана Ф.А.Баталава ў час агульнага наступлення 63-га стралковага корпуса ўдала пераправіўся цераз Дняпро, злама ў упартае супраціўленне праціўніка, захапіў Паўночнае і Паўднёвае дэпо ст. Жлобін.

17—18 ліпеня выбіў гітлераўцаў з вёсак Заграддзе, Прыдарожжа, Заваднае Малевіцкага сельсавета. Вораг прымяніў загараджальны агонь, але камбат знайшоў процідзеянне: ён вёў батальён кідкамі, паспяваў вывесці байцоў на бяспечны рубеж. Шэсць разоў узнімаў Баталаў байцоў у атаку і шэсць шквальных агнявых налётаў ворага не спынілі атакуючых, і перамога была дасягнута.

Мемарыяльная дошка Ф.А.Баталаву.

За праяўлены гераізм Фёдар Аляксеевіч 9.8.1941 г. быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Яму было прысвоена чарговае званне — маёр, даручана камандаваць 473-м стралковым палком 154-й дывізіі, з якой Баталаў прыйшоў на берагі Дняпра. Прапаў без вестак у верасні 1941 г.

Імем Ф.А.Баталава ў Жлобіне названа гарадская вуліца (былая Вакзальная). На будынку выканкома райсавета ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Яму прысвечана дакументальная аповесць «Салёная раса» беларускага празаіка Аляксандра Капусціна, выдадзеная асобнай кніжкай на радзіме героя ў 1984 г.

Подзвіг капітана Ф.А.Баталава знайшоў адлюстраванне ў песні невядомых аўтараў, якая летам 1942 года прыйшла да беларускіх партызан з Вялікай зямлі:

ФРОНТОВАЯ

Слушают отряды песню фронтовую,
Сдвинутые брови, твердые сердца.
Родина послала в бурю огневую,
К бою снарядила верного бойца.

На прощанье сына мать поцеловала.
На прощанье мужа обняла жена.
Долго не сходила с мостика вокзала,
Взглядом провожала милого она.

Вот они в дороге, в зареве тревоги.
У бойца на сердце спрятано письмо.
Лучше смерть на поле, чем позор в неволе,
Лучше злая пуля, чем раба клеймо.

Бомба разорвется, почва затрясется.
Но трястись от бомб смелым не к лицу.
Сердце разорвется, кровью обольется —
Перейдет винтовка к новому бойцу.

Но пока что пуля мимо пролетела.
Но пока что подступ смертью отдален.
И опять в атаку капитан Баталов
На геройский подвиг поднял батальон.

Шел боец в атаку, показал отвагу,
На гранатной ручке не дрожит рука.
Приходилось туго гитлеровским слугам
От его стального острого штыка.

Почтальон приходит, письмецо приносит.
И знакомый почерк узнает семья.
Расскажите людям, если кто расспросит,
Что не зря послала Родина меня.

Ох, какая встреча будет у вокзала!
В день, когда победой кончится война.
И письмо родное мать поцеловала,
И на самом сердце спрятала жена.

ГЕРАСІМАВА Валянціна Андрэеўна, фельчар. З Гомельскай камсамольскай гарадской арганізацыі. У час баёў пад Жлобінам летам 1941 г., будучы параненай, не пакінула перадавую, працягвала аказваць медыцынскую дапамогу і выратавала жыццё 12 воінам. У палявым шпіталі аддала сваю кроў параненаму байцу.

ГУБАРАЎ Антон. Нарадзіўся 8.3.1928 г. ў Жлобіне. Да вайны вучыўся ў сярэдняй школе № 1. З чэрвеня 1941 г. баец Жлобінскага знішчальнага батальёна, быў разведчыкам, здабываў каштоўныя звесткі. Смелага, мужнага і надзвычай кемлівага хлопчыка вельмі паважалі байцы і камандзіры.

Аднойчы ён у складзе групы падрыўнікоў пайшоў на «жалезку», каб пусціць пад адхон варожы эшалон. Чыгунка моцна ахоўвалася немцамі. Пасля выканання задання пры адыходзе Антон быў цяжка паранены і ў непрытомным стане папаў у рукі фашыстаў, якія вельмі здзекаваліся над ім. Але дарэмна яны дапытваліся ў яго, хто яго паслаў. Ён, сцяўшы зубы, маўчаў. Тады ворагі павалаклі яго да выкапанай ямы. У той дзень адным светлым жыццём на зямлі стала менш. Антон яшчэ дыхаў, калі на яго ў яму пасыпаўся жвір.

Імем адважнага хлопца Антона Губарава быў названы пакетавоз-кантэйнеравоз у Латвійскім марскім параходстве. Судна было пабудавана па заказу былога Савецкага Саюза карабеламі Румыніі. *А.П.Капусцін.*

МІРОНАЎ Уладзімір Арцёмавіч. Нарадзіўся 21.11.1908 г. ў Бабруйску. З рабочых. Скончыў рабфак, Віцебскі ветэрынарны інстытут, працаваў выкладчыкам у Быхаўскім веттэхнікуме. У 1930-х гг. у Кітаі займаўся ліквідацыяй эпідэміялагічных захворванняў. Потым скончыў камвуз, вучыўся на кафедры зоаветэрынарыі. У 1939 г. ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, капітан ветсанслужбы. Працаваў інструктарам ЦК КП(б)Б. Раніцай 22.6.1941 г. вярнуўся з камандзіроўкі ў Мінск і атрымаў заданне выехаць у Жлобін, дзе 27.6.1941 г. быў зацверджаны камандзірам мясцовага знішчальнага батальёна. За ўмелае кіраўніцтва батальёнам, актыўную яго дзейнасць супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6.8.1941 г. ў ліку іншых узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У жніўні—верасні 1941 г. вывеў частку батальёна з акупіраванай тэрыторыі. Пасля справаздачы ў ЦК КП(б)Б у званні батальённага камісара У.А.Міронаў прызначаецца начальнікам палітаддзела 5-й знішчальнай брыгады. Загінуў на фронце 14.6.1942 г. Месца пахавання невядома.

ПЯТРОЎСКІ Леанід Рыгоравіч. Нарадзіўся 12.6.1902 г. ў пас. Нелепа Бахмуцкага

Л.Р.Пятроўскі, камандзір 63-га стралковага корпуса.



Апошняе пісьмо Л.Р.Пятроўскага да жонкі. Жнівень 1941 г.

пав. Екацярынаслаўскай губ. Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Генерал-лейтэнант (1941). Скончыў Акадэмію Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі (1922). З чэрвеня 1917 г. ў Чырвонай Гвардыі, потым у Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны на Паўночным, Усходнім, Паўднёвым і Заходнім франтах — камандзір роты, батальёна, палка. У 1937 г. камандзір корпуса ў БВА. У Айчынную вайну камандзір 63-га стралковага корпуса, які з ліпеня 1941 г. абараняў Дняпроўскі рубеж на лініі Рагачоў—Жлобін—Стрэшын.

13.7.1941 г. корпус на шырокім фронце перайшоў у контрнаступленне, фарсіраваў Дняпро, вызваліў г.г. Жлобін, Рагачоў і прасунуўся на Захад да 30 км. Гітлераўцы кінулі супраць корпуса 7 дывізій. У цяжкіх баях з ворагам каля в. Скепня загінуў 17.8.1941 г. Пахаваны ў в. Старая Рудня, яго імем названа мясцовая школа.

Я.С.Факанаў.

ФАКАНАЎ Якаў Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1899 г. ў сялянскай сям'і ў в. Конанава Усцюжанскага раёна Валагодскай вобласці. У 1919 г. чырвонаармеец атрада лыжнікаў Петраградска-

Бронзавы бюст І.Л.Хіжняка. Трацякоўская галерэя, Масква.

га гарнізона. З гэтага часу ўсё яго жыццё звязана з Узброенымі Сіламі СССР, дзе ён прайшоў шлях ад радавога да генерал-лейтэнанта. Ужо напярэдадні вайны Я.С.Факанаў камандаваў палком, брыгадай, дывізіяй.

12.7.1941 г. 154-я стралковая дывізія, якой камандаваў палкоўнік Факанаў, атрымала загад перадыслацыравацца ў раён Жлобіна. Яна выбіла праціўніка са Жлобіна, а разам з горадам вызваліла 12 іншых населеных пунктаў. І ўтрымлівала іх амаль да 17 жніўня.

Да мая 1945 г. Я.С.Факанаў у складзе войск Заходняга, Бранскага, Паўднёва-Заходняга, 3-га Украінскага, 1-га і 3-га Беларускіх франтоў удзельнічаў у разгроме гітлераўскіх захопнікаў. Памёр 9.11.1985 г.

ХІЖНЯК Іван Лукіч. У 1941 г. камандзір 117-й стралковай дывізіі, якая 6.7.1941 г. правяла разведку боем і вызваліла горад Жлобін і некалькі сельскіх населеных пунктаў.

У 1976 г. ў Маскве выйшаў 1-ы том калектыўнага зборніка «Вайна. Народ. Перамога», сярод іншых матэрыялаў, змешчаных у ім, прыцягвалі ўвагу і ўспаміны І.Л.Хіжняка «Гарачае лета». Якраз пра гэты, жлобінскі перыяд у яго біяграфіі. Памёр І.Л.Хіжняк у 1977 г.

ЯРОХІН Аляксандр Яфімавіч. У 1941 г. малодшы лейтэнант 4-й роты 2-га стралковага батальёна 437-га палка 154-й дывізіі. Вызначыўся ў 1941 г. ў баях пад Жлобінам.

Узвод, з якім ваяваў малодшы лейтэнант Ярохін, выйшаў на фланг і ў тыл да немцаў. Раптоўны шквальны агонь трох ручных і аднаго станковага кулямёта і мінамётаў пасеяў паніку сярод гітлераўцаў і забяспечыў поспех бою. Асабліва жорсткая бітва разгарнулася ў раёне чыгункі і хлебазавода. У гэтым баі Аляксандр Яфімавіч, ужо будучы цяжка параненым, замяніў забітага кулямётчыка. Мужны камандзір і воін загінуў на полі бою, да канца выканаўшы прысягу і абавязак перад Радзімай і народам.

Пасля бою ў нагруднай кішэні яго гімнасцёркі знайшлі фатакартку. На ёй маладая жанчына з прыемнай усмешкай і дзіцем на руках.

Захавалася 7 пісем А.Я.Ярохіна. У адным з іх ён пісаў: «Ліда, разлучыў мяне з табой лёс неймаверны, але гэта разлука, я лічу, не назаўсёды. Клянуся, не забуду цябе да канца майго жыцця. Разлучыць нас з табой, мабыць, толькі смерць — больш нішто...»

М.В.Шуканаў.

Байцы знішчальнага батальёна, сфарміраванага Жлобінскім РК КП(б)Б 27.6.1941 г.

БАРКОЎСКАЯ П.М.

БЕЦІКАЎ Н.І., загадчык склада канторы па падрыхтоўцы жывёлы.

БОБРЫКАЎ Д.Н.

БОБРЫКАЎ З.Т.

БОНДАРАЎ Уладзімір.

БЯРКОВІЧ Года.

ВАЛЬКО Анатоль, школьнік, разведчык.

ВАСІЛЬЧЫК М.В., тэхнічны кіраўнік Чырвонабярэжскага варэнневарачнага завода.

ВІНАГРАДАЎ.

ВОЖЫК Парфірый Іванавіч, старшыня гарвыканкома.

ГАРАНКОЎ Яўсей А., дырэктар Чырвонабярэжскага крухмальнага завода.

ГРЫШКО Аляксандр, школьнік, разведчык.

ГУБАРАЎ Антон, школьнік.

ГУБЯНКОЎ Мікалай Іосіфавіч, інструктар райкома партыі.

ДАЙНЕКА.

ДЗІГІРЭЎСКІ Леанід Іванавіч, старшыня райвыканкома.

ДРАЧОЎ, райпракурор.

ЕЛІСЕЕЎ Міхаіл Іванавіч, школьнік, разведчык.

ЖЛОБА Іван Аляксеевіч, школьнік, разведчык. Загінуў.

ЖМУДЗЕЦКІ Юрый, загінуў у жніўні 1941 г.

ЗАХАРЫШКА С.П., старшыня калгаса «Чырвоны Бор».

ЗДАРАЎЦОЎ Андрэй Ісакавіч, інструктар райкома партыі.

ЗЕНЬКОВІЧ М.

ЗЛЫНАЎ Георгій Васільевіч, загадчык ваеннага аддзела райкома партыі, выконваў абавязкі камісара батальёна.

ЗЯРНІЦКІ Айзік Іосіфавіч.

ІСАЕНКА Іван, школьнік, разведчык.

КАЛІНОЎСКІ Мікалай.

КАПЧАНАВА Д.К., ветэрынарны ўрач вучэбнай гаспадаркі.

КАРЫБСКІ Пётр Андрэевіч.

КРЫШНЁЎ Іоў Апанасавіч, другі сакратар райкома КП(б)Б.

КУЛЬБАКОЎ.

КУПЦОЎ Дзям'ян Захаравіч, дырэктар Чорнавірнянскай школы.

КУЧЫНСКІ Мікалай.

ЛЕВАНЦОЎ Дзмітрый Удавіч.

ЛІТВІНКА П.С., сакратар Радушскага сельсавета.

МАЖЭЙКА.

МАРКЕВІЧ Мікалай Мікалаевіч.

МАРКЕЛАЎ Леанід Мікалаевіч, загінуў у жніўні 1941 г.

МІКША Мікалай Іванавіч, інструктар палітаддзела Жлобінскага аддзялення чыгункі, кулямётчык.

МІРОНАЎ Уладзімір Арцёмавіч, інструктар ЦК КП(б)Б, камандзір батальёна. Гл. біяграфію на стар. 135.

МЯЦЕЛІЦА Лазар Іосіфавіч, загінуў у жніўні 1941 г.

НІКАЛАЕЎ Аркадзь.

НІКІТКОВА Наташа, школьніца, разведчыца.

ПАРАШЧАНКА А.

ПАРАШЧАНКА З.С.

ПЕТРУШЭНКА Е.

ПРАКАПОВІЧ В. Загінуў у жніўні 1941 г.

ПУГАЧОЎ Піліп Якаўлевіч, дырэктар Жлобінскай МТС.

РАБЦАЎ.

РАВІЧ Георгій Мікалаевіч.

РАДЗЕВІЧ Мікалай.

РАЗГУЛЯЕВЫ Мікалай і **Уладзімір**, браты, школьнікі, разведчыкі.

РАМІСЬКА Васіль Іосіфавіч, разведчык.

РУБІНШТЭЙН Абрам Уравіч, 1922 г., разведчык. Загінуў у жніўні 1941 г.

РЫЖКОВЫ Юрый (загінуў у жніўні 1941 г.) і **Яўген Купрыянавічы**, браты.

САЛАДОЎНІКАЎ Павел Сафронавіч, старшыня калгаса «Праўда».

САМЧАНКІ Барыс і **Яўген**, школьнікі, разведчыкі.

САСНОВІЧ Аляксандр.

САЧЫЎКА Рыгор Еўдакімавіч, інструктар райкома.

СЕВЯРЫН, капітан НКУС, з заходніх абласцей.

СЁМЧАНКА Фама Міхайлавіч, старшыня калгаса «Рассвет».

СІМАНЕНКА Іван Андрэевіч, начальнік Жлобінскага аддзялення чыгункі.

СКВАРЧЭЎСКІ Павел, сакратар вузлавога чыгуначнага камітэта камсамола.

СОНЦАЎ Уладзімір Пятровіч, сяржант.

СПЕВАК.

СТРЫЖАКОЎ.

СЯЛІЦКАЯ Ніна Іванаўна.

СЯЛІЦКІ Віктар Іванавіч.

ТАМКОЎ Г.

ТАМКОЎ Пётр Навумавіч, баец, сакратар райкома партыі. 6.8.1941 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ТКАЧОЎ Антон Пятровіч, камандзір узвода разведкі батальёна. 6.8.1941 узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ТРЫФАНАЎ Мірон Лук'янавіч.

ФЕДАСЕЕНКА Уладзімір Канстанцінавіч, школьнік, в. Мормаль.

ХАРАМЕЦКІ Архіп Раманавіч.

ХАЛЬКО Мікалай Лявонавіч, старшыня мясцовага камітэта станцыі Жлобін.

ЦЯМІНСКАЯ Алёна Паўлаўна.

І.Ісаенка.

Л.М.Маркелаў.

У.А.Міронаў.

П.Н.Тамкоў.

ЧАША Іван Францавіч, работнік школы.

ЧУЖОЎ В.Ю., інструктар райсавета Асаавіяхіма.

ЮРКІН Міша.

ШАІН Генадзь, загінуў.

ШАПІРА Майсей Давыдавіч, камісар батальёна, першы сакратар Жлобінскага райкома КП(б)Б. Загінуў у жніўні 1941 г. 6.8.1941 узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ШАПТУНОЎ Карней Васілевіч, інструктар Брэсцкага гаркома партыі.

ШЧУКІН Аляксей Аляксандравіч.

ШЭНДАРОВІЧ Марыя.

ШЭНДАРОВІЧ Рыгор Львовіч. Загінуў у жніўні 1941 г. 6.8.1941 узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ШЭНДАРОВІЧ Якаў, разведчык.

ЯКІМОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, народны суддзя.

М.М.Якімовіч.

А.М.Ярашаў.

ЯРАШАЎ Аляксандр Міхайлавіч, начальнік штаба батальёна, чырвоны партызан у грамадзянскую вайну. 6.8.1941 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго кірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументах, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.3.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення народаў СССР, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за ўчыненыя злачынствы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі кіраўнікі трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнічна цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк—Барысаў на ўсходзе, Старыя Да-

рогі — возера Чырвонае на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (на 4.12.1941 г.). Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі ад акругі «Беласток», якая была далучана да Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці (у т.л. Жлобіншчыну) аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Акупіраваная тэрыторыя (акрамя раёнаў, дзе вяліся баявыя дзеянні) была падзелена на рэйхскамісарыяты, якія складаліся з генеральных акруг, абласцей (гебітаў), акруг, раёнаў, валасцей. На чале гэтых нямецка-фашысцкіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак былі пастаўлены рэйхскамісары, генеральныя, гебіт- і раённыя камісары. У кожным раёне, а іншы раз і ў воласці, ствараліся ўправы, пры якіх меліся ваенная ахова самакіравання на чале з бургамістрамі і старастамі. Акупацыйны рэжым побач з акупацыйнымі органамі здзяйснялі таксама ахоўныя дывізіі, гестапа, контрразведка, палявая жандармерыя, спецыяльныя атрады і каманды для барацьбы з партызанамі, паліцэйскія фарміраванні. У многіх населеных пунктах знаходзіліся карныя органы акупантаў, у вёсках — паліцэйскія, у буйных населеных пунктах — падраздзяленні СС і ахоўныя часці.

Гітлераўцы ператваралі ў развалiны ўсё, ганьбавалі людзей. Каля станцыі Салтанаўка восенню 1941 г. існаваў канцлагер для ваеннапалонных. На чыгуначнай станцыі Вірскі фашысты расстралялі заложнікаў з саставу, у якім перавозіліся ваеннапалонныя і адкуль частка іх уцякла. Два лагеры для ваеннапалонных існавалі на тэрыторыі Жлобіна. У адным знаходзіліся, паводле расказаў цывільных, параненыя байцы. Больш «здаровыя» выкарыстоўваліся на фізічнай працы. Палонныя не атрымлівалі медыцынскай дапамогі, утрымліваліся ў холадзе і голадзе, паміралі ад хвароб, катаванняў. Бывалі выпадкі, калі знясіленных ваеннапалонных яшчэ жывымі закопвалі ў зямлю. Спробы гараджан даць ежу ваеннапалонным або аказаць ім медыцынскую дапамогу заканчваліся няўдачай: кожны раз фашысты адганялі патрыётаў, нярэдка стралялі ў іх. Толькі нямногім ваеннапалонным з цягам часу ўдалося ўцячы. Яны ў асноўным папоўнілі рады народных мсціўцаў.

Нямецка-фашысцкія захопнікі метадычна і планамерна рабавалі, катавалі людзей, паздбаўлялі іх жыцця. Напрыклад, зондэрфюрэр Жлобінскага раёна, а потым сельгаскамендант у Бабруйску пад выглядам паставак бязлітасна рабаваў насельніцтва, адбіраў у яго жывёлу і сельгаспрадукты. За несвоечасовыя пастаўкі насельніцтва заганялі ў лагеры і адпраўлялі на катаржныя работы ў Германію, перадавалі карнікам. Паводле ўказанняў зондэрфюрэра на тэрыторыі Чырвонабярэжскага сельсавета разграблена і спустошана 5 калгасаў, 2 заводы, сельскагаспадарчы тэхнікум, спалена 132 пабудовы, у тым ліку 3 школы, 2 аптэкі, бальніца, клуб, 3 бібліятэкі, знішчана і вывезена ў Германію 3673 галавы жывёлы. Сярод зладзейскіх намераў па знішчэнню сялян асаблівае месца займала шырокае выкарыстанне сельскага насельніцтва для так званага разміноўвання дарог. Акупанты сілай зброі выганялі з дамоў жыхароў вёсак і прымушалі іх шчыльнымі шарэнгамі пратаптваць мініраваныя партызанамі дарогі ці цягаць па іх бораны. У выніку многія грамадзяне падрываліся на мінах. Толькі ў вёсцы Жырхаўка з-за гэтага загінула 17 чалавек.

У верасні 1942 г. з вёсак Радуша, Сцяпы і Шчадрын гітлераўцы забралі каля 300 чалавек, пераважна старых, жанчын, дзяцей. Іх прыгналі ў Парычы і змясцілі ў памяшканне былой школы. Праз тыдзень гэтых людзей, як сведчыў Рыгор Рыгоравіч Новік (1900 года нараджэння, беспартыйны, былы настаўнік), вывелі і пастроілі ў дварыі школы. Сюды прыйшоў камендант Парыч Мол, які з'явіўся тут у пачатку 1942 г. і быў прыкладна да сакавіка 1943 г., потым — камендант Бабруйска. Гэты перыяд быў самым жудасным за ўвесь час нямецкай акупацыі. Вызначаўся ён асаблівым насіллем, расправамі і зверствам. Перакладчыкам быў паліцэйскі Гарбер. Праз яго камендант і прыбыўшыя з ім звярталіся да арыштаваных з прапановай, каб мужчыны

сярэдніх год запісваліся ў паліцыю, інакш яны будуць разглядацца як партызаны.

Частка людзей ад страху (ведалі аб звярыных адносінах немцаў да партызан), баючыся расправы, згадзіліся пайсці на службу ў паліцыю. Але большасць адмовілася ад прапановы.

Людзей некалькі дзён трымалі ў школе, а потым частку адправілі дамоў. Чалавек 10—12 накіравалі ў турму, адкуль яны не вярнуліся. Пераважную большасць заложнікаў, асабліва моладзь і дзяцей, адправілі на катаргу ў Германію.

Камендант Мол не пазбег пакарання. Перад судом яму прыйшлося трымаць адказ за ўсе свае злачынствы. У ходзе папярэдняга следства і судовага разбірацельства было высветлена таксама і тое, што пад выглядам барацьбы з партызанамі была праведзена карная аперацыя на в. Шчадрын. Ахоўны батальён пад камандаваннем намесніка Мола капітана Найгаўза ачапіў вёску, усё мужчынскае насельніцтва забралі і даставілі ў Парычы.

Жыхар в. Вялікі Лес М.Антуськоў расказваў: «У снежні 1942 г. нас дваіх акупанты ўзялі без усялякіх на тое падстаў і гадзін у пяць вечара даставілі ў Стрэшын, адразу кінулі ў камеру, дзе знаходзілася столькі людзей, што легчы не было ніякай магчымасці. У кутку ляжаў Верасаў Іван. Але ён быў настолькі змардаваны, што не мог ні павярушыцца, ні гаварыць...» Аўтару пісьма пашчасціла вырвацца з фашысцкай катавальні. А названы вышэй жыхар вёскі Дуброва (родам з вёскі Курган) і Лазараў з вёскі Мормаль па даносу здрадніка пасля катаванняў у гестапа былі расстраляны ў Жлобіне.

27.9.1943 г. да пас. Верны (Пірэвіцкі сельсавет) фашысты па чыгункі падагналі бронепоезд і з адлегласці ў адзін кіламетр прамой наводкай з гарматы адкрылі агонь па населенаму пункту. Пасля трохгадзіннага абстрэлу яны акружылі пасёлак, загналі частку жыхароў у хлеў, а потым расстралялі іх з кулямёта. Карнікі разграбілі жыллё, забралі жывёлу і маёмасць насельніцтва. А каб схаваць сляды злачынства, спалілі ўвесь пасёлак.

13.10.1943 г. жыхара в. Стары Мазаляў Івана Карнеевіча Сцяпанчыкава без усялякай правіннасці немцы прывязалі за ногі да санак, запрэжаных конямі, і валаклі да таго часу, пакуль ён не страціў прытомнасць, а потым забілі.

1.12.1943 г. карны атрад фашыстаў акружыў в. Цупер. Гітлераўцы пачалі выганяць жыхароў на вуліцу, дзе потым вялі расстрэл. Перад уходам падпалілі вёску.

Асаблівыя цяжкасці выпалі на долю гараджан і сельскага насельніцтва акупіраванай часткі Жлобінскага раёна на заключным этапе знаходжання нямецка-фашысцкіх войск на тэрыторыі Беларусі. Ды і не толькі на іх долю. Тут у той час знаходзілася нямала цывільных з раёнаў Гомельскай, Смаленскай, Арлоўскай абласцей, іншых рэгіёнаў, адкуль акупанты выгналі людзей перад сваім адступленнем.

Камісія ваеннаслужачых Чырвонай Арміі і грамадзянскага насельніцтва па пытаннях аб масавым знішчэнні гітлераўцамі старых, жанчын і дзяцей у канцлагерах каля вёсак Холма і Мядзведаў Даманавіцкага раёна Палескай вобласці, у склад якой уваходзіў 60-гадовы ўраджэнец Жлобіна Пётр Савіч Астапенка, сведчыла: «Паводле паказанняў саміх зняволеных, у пачатку сакавіка іх прымусова сагналі і этапным парадкам адправілі на ст. Жлобін, адкуль, пагрузіўшы ў 3 таварныя неатапліваемыя эшалоны, павезлі ў невядомым накірунку. Эшалоны прыбылі на ст. Старушкі...»

Тут зняволеных выгрузілі і пешшу пагналі ў лагер. Гітлераўцы рабілі ўсё, каб іх знішчыць. Ахова сачыла, каб зняволеныя не датыкаліся да дроту, якім быў абнесены лагер. Калі ж жанчына ці дзіця неспадзявана рабілі гэта, то варта страляла без папярэджвання. Да такіх ахвяр дабаўляліся іншыя — пры дотыку да дроту, на якім віселі міны, апошнія ўзрываліся і ранілі, забівалі тых, хто знаходзіўся побач. Ахвярай стала і наша зямлячка — жыхарка в. Беліца Базехава (магчыма, Бежалева).

Частка насельніцтва Жлобіна і раёна была вывезена ў тры канцэнтрацыйныя лагеры ў раёне населенага пункта Азарычы. Першы размяшчаўся на балоце каля пасёлка Дзерць, другі — у 2-х км на паўночны захад ад м. Азарычы, трэці — на балоце, за 2 км заходней в. Падасіннікі. Тут знаходзілася звыш 33 тыс. дзяцей, непрацаздольных жанчын і старых, з іх былі замучаны, расстраляны, загінулі ад холаду, голаду і хвароб каля 9 тыс. чалавек. Сюды ў перыяд з 9 па 13 сакавіка 1944 г. пад узмоцненым канвоем СС і ахоўнай паліцыі былі дастаўлены тыя, хто знахо-

дзіўся на перасылачных пунктах на станцыях Рабкор, Чырвоны Бераг і інш.

У Жлобіне нямецкая камендатура аб'явіла па радыё наступны зварот да насельніцтва: «Грамадзяне г. Жлобіна, германскае камандаванне адпраўляе вас у глыбокі тыл, бо чырвонаармейцы вас будуць абстрэльваць з артылерыі і мінамётаў. Жадаючы выратаваць вас ад бальшавіцкіх зверстваў, мы эвакуіруем вас у глыбокі тыл. Бярыце з сабой усе рэчы, коней, колы, жывёлу. Бярыце з сабой кацялкі і лыжкі, бо па дарозе вы будзеце забяспечаны гарачай ежай. Слухайцеся нямецкага салдата, не хавайцеся і не ўцякайце. Увесь горад ачэплены нямецкімі войскамі. Кожны, хто паспрабуе схавацца або збегчы, будзе застрэлены. Выходзьце на вуліцу і рухайцеся, куды вам пакажуць нямецкія салдаты».

Л.Пякарская, якая была вызвалена з лагера, сведчыла: «12 сакавіка 1944 г. пад вечар нас, жыхароў г. Жлобіна, прымусілі сабрацца на працягу паўгадзіны на станцыі Жлобін-Паўднёвы. Тут немцы адабралі маладых і павялі іх. Немцы загналі нас у цяплушкі і наглуха зачынілі дзверы. Куды нас вязуць, мы не ведалі, але ўсе прадчувалі нядобрае. Як потым аказалася, нас везлі па рудабелкаўскай ветцы і разгрузілі пад вечар 15 сакавіка. Ноччу па калена ў ліпкай гразі нас пагналі ў лагер. З гэтага лагера нас перагналі ў другі. У дарозе немцы білі нас, адстаўшых расстрэльвалі. Вось ідзе жанчына з трыма дзецьмі. Адзін малы ўпаў, немцы страляюць у яго. Калі ж маці і двое яе дзяцей абарочваюцца, салдаты-зверы па чарзе страляюць у іх. Маці ўзнімае крык, і гэты крык абрываецца выстралам ва ўпор.

Ідуць маці і сын Бондаравы. Дзіцё не вытрымала стомнага пуці і ўпала. Маці нахіляецца над ім, яна хоча ўцешыць яго словам, але ні сын, ні маці больш не ўсталі, не ўбачылі блакітнага неба — немцы застрэлілі іх».

Па дарозе ў лагер салдаты сцягвалі з жанчын хусткі, паліто, абутак, адбіралі скарб і каштоўнасці, усяляк здзекваліся.

У гэтым лагеры смерці акупанты спадзяваліся заразіць людзей сыпным тыфам, які, на іх думку, потым унясе тысячы жыццяў і перакінецца на воінаў-вызваліцеляў, калі яны паімкнуцца аказаць дапамогу хворым пры іх вызваленні. З гэтай мэтай гітлераўцы звозілі ў лагер сыпнатыфозных з Палескай, Мінскай, Гомельскай і іншых абласцей рэспублікі.

Паводле слоў Г.С.Шырокага, жыхара Жлобіна, 12 сакавіка з чыгуначнай бальніцы было вывезена 200 чалавек хворых сыпным тыфам. Усіх даставілі ў лагер. Аб гэтым жа паведаміла П.С.Мітраховіч. Жыхарка в. Радуша А.С.Грыжкова захварэла тыфам ужо ў канцлагеры.

Месца «жыхарства» зняволеным было вызначана на балоце, пад адкрытым небам, у рэдкім лесе. Людзям не было дзе абагрэцца, прылегчы. Ім не давалі ежы і вады. Фашысты ўсяляк здзекваліся над вязнямі. Як потым сведчыў Лука Лаўрэнавіч Зайцаў — 72-гадовы жыхар в. Беліца — у лагеры № 1 штодзённа паміралі да 60 чалавек, у лагеры № 2 — да 100 чалавек.

Жыхара Жлобіна 82-гадовага Івана Глускага фашысты расстралялі за тое, што ён хацеў развесці касцёр, каб абагрэць малых унукаў. У Апалінарыі Максімаўны Пагодзінай захварэлі дзеці. Яна пачала патрабаваць дапамогі. У адказ фашысты расстралялі маці з двумя дзецьмі.

Практычна ўсе зняволеныя неаднойчы пераганяліся з адной зоны ў другую, не ведалі спакою ні ўдзень, ні ноччу і былі асуджаны на смерць. І толькі дзякуючы байцам Чырвонай Арміі яны былі вызвалены з палону 18 сакавіка 1944 г. Пасля вызвалення з 19 па 31 сакавіка 1944 г. было шпіталізавана 4052 чал., з іх 2370 дзяцей ва ўзросце да 13 год. А колькі іх, невядомых, лягло ў зямлю па дарозе ў канцлагер і ў ім самім, ніхто дакладна не скажа.

На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі гітлераўскімі злачынцамі матэрыялы аб Азарыцкім лагеры смерці сведчылі аб жудасных справах фашыстаў.

Але самым страшэнным злом быў дзіцячы канцлагер, створаны акупантамі на тэрыторыі саўгаса-тэхнікума ў 1944 г. Сюды са Жлобінскага, Рагачоўскага і іншых раёнаў дастаўляліся дзеці ва ўзросце 8—14 гадоў. Іх кроў павінна была пайсці для параненых салдат і афіцэраў вермахта... У Германію было вывезена шмат падлеткаў, і лёс многіх з іх невядомы. *У.І.Лемяшонак, П.Я.Кірычэнка.*

ЗВЕСТКІ
аб знішчэнні пабудоў і насельніцтва раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945)
(без уліку загінуўшых на франтах і ў партызанскіх атрадах)

Назва населеных пунктаў	на чэрвень 1941		знішчана	
	двароў	чалавек	двароў	чалавек
1	2	3	4	5
АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АКЦЯБР	170	470	166	64
ГОРКІ	70	350	70	
ГРАБСК	61	185	58	4
ЗАТОН	140	432	10	5
ПРАСКУРНІ	220	847	216	230
ДОБРАГОШЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
БОР	15	70	15	4
ВАСІЛЕВІЧЫ	227	920	13	23
ДАБРАГОШЧА	80	400	80	10
КУРГАН	80	350	80	8
МОРМАЛЬ	285	900	285	78
СЕЛЬНАЕ	120	480	7	5
ЯШЧЫЦЫ	85	370	85	33
КАБАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АДРУБЫ	120	405	23	2
ЛЯДЫ	153	530	19	1
КАРОТКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АНТОНАЎКА	93	402	93	112
БРАТКІ	10	52	10	27
ВАДЗІЦКІ	16	80	4	
ВАСХОД	22	115	22	47
ГАЛЫ	19	76		3
ГАРМАВІЧЫ	114	484	114	16
ГРУШКА	11	39	11	20
ДУБРОВА	26	133	26	31
ЗАБАЛОЦЦЕ	38	195	34	6
ЗАЛЕССЕ	17	70	17	23
ЗАЛУЖЖА	4	21	4	15
ЗАМОСЦЕ	10	40	10	
КАРОТКАВІЧЫ	267	787	265	331
КАСТРЫЧНІК	7	42	7	19
КРАСНАЎКА	10	69	10	45
ПЛЕСАВІЦКАЯ СЛАБОДКА	90	428	87	16
ПЛЕСАВІЧЫ	125	541	122	30
КІРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
КІРАВА	535	2675	108	5
ПІЦЕРАЎКА	30	122	12	5
СЕЛІВОНАЎКА	140	500	9	2
ЛУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ				
БЕЛІЦА	148	720	32	8

1	2	3	4	5
ГРАЧУХІ	21	98	16	4
ГРУШАЧКА	19	95	14	3
ГУЛЯЙ-ПОЛЕ	19	93	18	8
ДУБРОВА	21	104	8	5
ЗЯЛЁНАЯ ДАЛІНА	13	89	13	3
КАБАНАЎКА	108	450	27	3
КРАСНАЯ ЗВЯЗДА	24	95	23	
КРАСНЫ РОГ	65	325	55	2
ЛЕБЯДЗЁЎКА	181	697	163	37
ЛІСІ ЛОГ	26	118	25	5
ЛУКІ	134	604	56	5
ЛУЦКІ	19	490	17	
НАДЗЕЖДА	26	115	22	
НОВЫЯ ЛУКІ	20	81	20	
РЭКТА	137	548	29	17
ТАПІЛА	27	125	27	1
МАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АНТОНАЎКА	86	500	44	5
АСОЕ	28	125	28	1
БАБОЎКА	142	600	133	16
ДАЛІНА	44	180	39	2
ДЗЯНІСКАВІЧЫ-І	77	362	70	55
ДЗЯНІСКАВІЧЫ-ІІ	71	305	32	7
ЛУГАВАЯ ВІРНЯ	131	558	48	67
МАЙСКАЕ	242	1201	218	24
МАЛЫЯ КАЗЛОВІЧЫ	89	326	28	35
ПАДЛЕССЕ	27	110	27	
ХЛЕБАРОБ	34	173	34	16
ЦУПЕР	73	292	73	70
ЧОРНАЯ ВІРНЯ	177	962	112	105
МАЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ				
ВЯЗОК	30	95	14	7
МАЛЕВІЦКАЯ РУДНЯ	163	490	53	24
МАЛЕВІЧЫ	192	768	192	56
НАВІКІ	48	149	48	13
НАВАМАРКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ				
МІКУЛІЧЫ	38	192	7	
НОВЫЯ МАРКАВІЧЫ	112	532	33	
ТАЎСТЫКІ	126	554	86	15
ПАПАРАТНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АДРАДЖЭННЕ	80	353	40	30
ДУБОВАЯ ГРАДА	25	95	23	
КАСАКОЎКА	193	530	7	16
НОВАЯ КАРМА	48	253	36	10
ПАПАРАТНАЕ	240	905	238	60
ПІРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ				
ВЕРНЫ	32	123	32	56
КОЛАС	34	115	17	

1	2	3	4	5
НОВАЯ СЛАБАДА	24	79	7	
ПІРЭВІЧЫ	135	350	35	17
СКЕПНЯ	275	1075	23	
САЛОНСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
АЛЕКСАНДРОЎ	45	250	45	8
ВЯЛКІЯ РАП	107	449	16	37
ІСТОПКІ	134	624	128	3
КАЗЁЛ	29	129	29	
ЛЯСАНЬ	25	126	25	23
МАЛЫЯ РАП	32	158	32	19
НІВЫ	106	483	100	40
САЛАНОЕ	269	1278	175	55
СТАРАРУДНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
БАРАНАЎКА	24	100	22	2
ГЛУШЫЦА	20	85	17	
ЗАВАД	50	210	47	2
КАЛЫБАЎКА	85	350	83	3
САВЕЦКІ	12	51	11	2
СТАРАЯ РУДНЯ	405	1700	49	17
ХАЛЬЧ	58	240	16	8
ЧАЦВЯРНЯ	230	966	57	5
ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
РАДУША	340	1420	32	
ЧАРЦЁЖ	110	290	34	2
ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКАЯ СЛАБОДКА	41	178	6	
ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА	39	117	13	5
ШЧАДРЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ				
ЗАМЕН-РЫННЯ	62	250	62	
КІЦІН	320	1420	110	2
ЛЮДГАРДАЎКА	49	238	7	
СЕЛІШЧА	76	360	6	
СЦЯПЫ	94	470	30	3
ШЧАДРЫН			100	1000

Звесткі падрыхтаваны на падставе матэрыялаў занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Жлобін.

Вываз на фашысцкую катаргу

Часткай злачыннага акупацыйнага рэжыму з'яўляўся вываз працаздольнага насельніцтва з Беларусі на катаржныя работы ў Германію ў якасці дармавой рабочай сілы. Правал планаў «маланкавай вайны», значныя страты ў жывой сіле на савецка-германскім фронце патрабавалі мабілізацыі ў вермахт усё больш чалавечых рэсурсаў, што пазбаўляла прамысловасць і сельскую гаспадарку фашысцкай Германіі рабочых рук. Гэты недахоп гітлераўскія правіцелі імкнуліся папоўніць за кошт асоб, гвалтоўна вывезеных з акупіраванай тэрыторыі СССР.

Ужо ў лістападзе 1941 г. было дадзена ўказанне па выкарыстанні «рускай рабочай сілы» ў Германіі. У пачатку 1942 г. была пас-

таўлена задача вывезці на прымусовыя работы ў Германію з акупіраваных абласцей СССР 15 млн. чалавек. Гаспадарчай інспекцыі групы «Цэнтр» і генеральнай акрузе «Беларусь» прадпісвалася штодзённа пасылаць у рэйх па 500—1000 рабочых.

Спачатку вярбоўка насельніцтва ў Германію вялася на добраахвотнай аснове. Аднак у спецыяльных разнарадках па валасцях указвалася, колькі чалавек і ў які тэрмін воласць павінна паставіць. У сувязі з ростам колькасці асоб, якія адмаўляліся ад вярбоўкі, гітлераўцы перайшлі да гвалтоўных метадаў. На ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку на Жлобіншчыне, акупанты пачалі шырока ўжываць метад масавых аблаў. Ачаплялiся цэлыя гарадскія раёны, кварталы, вуліцы, базары, вакзалы, вёскі. Напрыклад, разам з памагатымі фашысцкія ўлады шырока разрэкламавалі, што на гарадскі базар у Жлобіне вывозіцца шмат прамысловых тавараў для свабоднага продажу насельніцтву. Калі ж там сабралася шмат народу, гітлераўцы і паліцэйскія акружылі натоўп і пачалі вылоўліваць моладзь для адпраўкі яе ў Германію. Ішло сапраўднае паляванне на людзей, асабліва ў перыяд правядзення карных аперацый супраць партызан.

Вываз на фашысцкую катаргу ажыццяўлялі спецыяльныя ведамствы на чале з генеральным упаўнаважаным па выкарыстанні рабочай сілы, войскі і паліцыя. Працаздольных мужчын, жанчын і падлеткаў пад канвоем адпраўлялі ў перасыльныя лагеры, жорстка здзекаваліся над імі. У цэлым гітлераўцам удалося захапіць і вывезці ў Германію з акупіраваных абласцей СССР каля 5 млн. чалавек, у тым ліку з Беларусі каля 380 тысяч. З Жлобінскага раёна было вывезена 818 чалавек. Дамоў вярнуліся толькі 227.

Умовы жыцця і працы савецкіх людзей у Германіі былі выключна цяжкімі. Яны рэгламентаваліся спецыяльнай інструкцыяй, у якой гаварылася, што «ўсе рабочыя павінны атрымліваць такую ежу і такое жыллё і падвяргацца такому абыходжанню, якія давалі б магчымасць эксплуатаваць іх у самай высокай ступені і пры самых мінімальных затратах». Непасільная праца, голад, антысанітарыя прыводзілі да шматлікіх захворванняў сярод вывезеных і вялікай смяротнасці.

Жыхарка раёна, якая ў рабстве насіла № 206, пісала: «Працуем ад 6 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара... Калі ідзем на работу, даюць кубак чаю салодкага, 200 грамаў хлеба. На абед прыходзім у 12 гадзін дня, даюць 5 бульбін, грамаў 200 варанай капусты; паабедаеш, вылезеш з-за стала, дык бы яшчэ сабаку з'еў. Вечарам прыходзім з работы, таксама даюць чатыры бульбіны і сырую капусту — вось як нам выпала жыць. Вельмі схуднелі, калі б прыехалі дамоў, то вы б нас не пазналі. Дамоў не ведаем калі вернемся, будзем жывыя — вернемся, калі з голаду не памрэм. Вы аба мне не журыцеся, я не адна тут гарую, а нас 230 чалавек. Шліце мне пасылку, калі можна, дайце мне падтрымку».

Ратаванне савецкіх людзей ад вывазу ў фашысцкае рабства было адной з важнейшых задач падпольных партыйных органаў, партызан і падпольшчыкаў.

У.І.Лемяшонак, П.Я.Кірычэнка.

«Вырашэнне яўрэйскага пытання»

Арганізацыя Валянціны Худалей і падпольная група Тамары Раміська разам з камсамольцамі Зінай Старавойтавай, Верай Капусцінай (пасля замужжа — Маркушавай) і іншымі дабыла і даставіла ў партызанскі атрад станковы і 2 ручныя кулямёты, ротны мінамёт, 32 кг толу, скрынку гранат, 47 вінтовак, 10 тыс. патронаў. Апрача гэтага члены арганізацыі сабралі нямала каштоўных звестак пра асабовы састаў гітлераўскіх гарнізонаў, іх узбраенні, аб прасоўванні эшалонаў і грузах у іх. Яны нават ухітрыліся перахоплівацъ радыёграмы і перадаваць іх змест камандаванню партызан.

Гэта далёка няпоўны пералік спраў дзяўчат-падпольшчыц. Яны рабілі, на першы пог-

ляд, нябачную, вельмі небяспечную справу, якая кожную хвіліну магла прывесці да бяды. Тым не менш камсамольцы і моладзь праяўлялі смеласць, дабіваліся поспеху, садзейнічалі старэйшым. *В.П.Махнач.*

Па загаду сэрца

Сям'я Жлобаў была вялікая — бацька, маці і сямёра дзяцей. Дзеці паміж сабой былі вельмі дружныя. Жыццё не балавала іх, таму і стараліся адзін аднаму ва ўсім дапамагчы.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна і вораг вельмі блізка падышоў да Жлобіна, бацька Лёні разам з іншымі камуністамі пайшоў у падполле, а неўзабаве ў адной з аперацый загінуў.

Старэйшы брат Іван таксама пайшоў абараняць Радзіму. Семнаццацігадовы юнак стаў разведчыкам Жлобінскага знішчальнага батальёна. Загінуў у ліпені 1941 г.

Пагроза расправы навісла над усёй сям'ёй. Малодшых братоў і сясцёр адправілі да сваякоў. Сястра Жэня стала партызанкай 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады. Хутка і Лёня прыйшоў у партызанскі атрад 10-й Журавіцкай брыгады. Спачатку не хацелі браць хлапчука, баяліся за яго жыццё, але той дамогся свайго.

Паміж Жлобінам і Буда-Кашалёвам атраду, у якім быў Лёня, неабходна было ўзарваць варожы эшалон, які ішоў на фронт. Гэта аперацыя была праведзена ў складаных умовах, з вялікай рызыкай.

Асабліва цяжка давялося атраду ў сакавіку 1943 г. Лёня з двума таварышамі застаўся для прыкрыцця. Група без асаблівых перашкод адышла. Але як адарвацца ад фашыстаў тром смельчакам? З'явілася дзёрзкая ідэя: адплыць ад месца бою на адной з ільдзін, што шалёна несліся па хуткай рацэ. Рабяты ўскочылі на яе, аднак доўга пратрымацца не змаглі: льдзіна перакулілася. Халодная вада партызан не палохала, плавалі яны добра. Фашыстаў абхітрылі, засталіся жывымі і ўдала вярнуліся ў атрад.

У канцы красавіка быў Лозаўскі бой, дзе Лёню кантузіла. Партызаны адправілі хлопчыка для лячэння ў родную вёску. Дамоў яго прывезлі ноччу, але сярод аднавяскоўцаў знайшоўся здраднік, які высачыў Лёню і данёс на хлопчыка нямецкім уладам.

Лёню арыштавалі, кінулі ў халодную, сырую камеру. Сваім знешнім выглядам ён быў мала падобны на партызана: звычайны хударлявы вясковы хлопчык у старым парваным адзенні, да таго ж ніякіх выкрывальных фактаў здраднік не ведаў.

Немцы жорстка яго збілі і скінулі з ганка, лічачы, што з ім усё скончана.

Сабраўшы апошнія сілы, хлопчык пералез цераз плот і дапоўз да бліжэйшага дома. Добрыя людзі дапамаглі яму дабрацца да бацькоўскай хаты.

Калі Лёня паправіўся, ён зноў пайшоў у атрад, дзе яго чакалі таварышы.

У канцы 1943 г. адбылася радасная сустрэча партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Аднак старая кантузія, якая ўсё яшчэ напамінала пра сябе, не дазволіла Л.А.Жлобе стаць у рады байцоў, і ён застаўся дома.

Друкуецца паводле кн.: Шакаров С.Ф., Лещинский М.П. «Юные герои Гомельщины». Мн., 1991. С. 62—63.

Подзвіг электрыка

У той летні дзень 1943 г. наша дыверсійная група знаходзілася ў вёсцы Вадзіцкае (былы Стрэшынскі раён), калі сюды завітаў чалавек з сівой барадой разам з малалетняй дзяўчынкай. Як высветлілася потым, гэта быў электрык Лука Апанасавіч Раманцоў, які на той час працаваў на электрастанцыі ў акупіраваным немцамі Жлобіне.

Паведаміўшы нам пра абстаноўку ў горадзе, Лука Апанасавіч выказаў намер здзейсніць дыверсію на электрастанцыі і папрасіў узрыўчатку. Я і мой паплечнік па дыверсійнай справе Сяргей Агеевіч Каваленка падтрымалі ініцыятыву, праінструктавалі патрыёта. Мы перадалі яму так званую маламагнітную

міну запаволенага дзеяння, якую замаскіравалі ў бохане хлеба.

Задуманая аперацыя была праведзена паспяхова. Але аб тым, як канкрэтна яна была здзейснена, я даведаўся толькі пасля вайны, калі зноў сустрэўся з Лукой Апанасавічам. Ён паведаміў, што заклаў міну пад топку з такім разлікам, каб яна спрацавала роўна праз гадзіну. Сам жа пакінуў электрастанцыю і на беразе Дняпра стаў чакаць вынікаў. Выбух адбыўся строга ў тэрмін. Яго ўзрыўная хваля была настолькі моцнай, што паліцая-ахоўніка нават выкінула праз акно. На шчасце, немцы так і не знайшлі вінаватых. Аб дыверсіі ўжо на наступны дзень праз сувязных Т.Макоўскую і Д.Абраменка стала вядома сакратару падпольнага райкома партыі І.А.Крышнёву.

А.С.Смолкін.

Смерць і ўваскрэсенне партызана Ячына

Ішоў пераможны 1945 год. У кабінеце сакратара Стрэшынскага райкома партыі сабралася група былых партызан. Камісар брыгады запрасіў сваіх байцоў па вельмі надзвычайнаму выпадку — атрымана пісьмо ад Ячына, былога народнага мсціўца. Само пісьмо — як пісьмо, нікога не здзівіла. Цікавым быў яго аўтар. Бо яго ж у верасні сорак трэцяга расстралялі ў Стрэшыне. Усе ўспомнілі, як у страі давалі клятву адпомсціць ворагу за свайго баявога таварыша. Усплыла ў памяці і заметка, змешчаная ў тыя дні ў падпольнай газеце.

«Партызан Ячын. Для рабавання насельніцтва ў вёсцы Н.К. (Новая Каменка — *расшыфроўка аўтара*) прыехала 35 паліцэйскіх. Не ведаючы пра гэта, сюды ж, выконваючы баявое заданне, прыбыў камандзір узвода камуніст Міхаіл Іванавіч Ячын. Аказаўшыся ў пастцы ворага, партызан не разгубіўся. Ён смела прыняў навязаны яму няроўны бой. З блізкай дыстанцыі Міхаіл біўся да апошняга патрона. Нямецкія халуі не маглі ўзяць адважнага партызана жывым.

Але вось у героя-камуніста паранена адна рука, потым другая. Партызан выхапіў гранату і кінуў яе. Адбіваць больш не было чым. Ячын кінуўся ўцякаць. Але яго схапілі. Ад параненага і збітага партызана паліцаі спрабавалі дабіцца звестак аб атрадзе. Народны мсціўец з пагардай і нянавісцю паглядзеў на нямецкіх саўдзельнікаў і слабым, але цвёрдым голасам адказаў: «Нічога я вам не скажу!»

І не сказаў. Нягледзячы на катаванні, ворагам так і не ўдалося дабіцца ад Ячына — куйбышаўскага калгасніка, беларускага партызана-героя — ніводнага слова аб народных мсціўцах.

«Мы не забудзем цябе, Міхаіл! Мы адпомсцім за цябе, Міхаіл! Мы назаўсёды захаваем ў нашых сэрцах светлую памяць пра цябе, наш герой, наш таварыш. Твае баявыя сябры, рады якіх бесперапынна растуць, клянуцца бязлітасна помсціць ворагу за цябе і за ўсе страшныя, незлічоныя здзекі фашысцкіх людаедаў над мірным нашым насельніцтвам. Е.Садавы. Атрад «Смерць фашызму». Так заканчвалася тая заметка аб гібелі адважнага партызана.

Загадка была складанай, і адгадаць яе ніхто не мог. Удакладнілі толькі тое, што было ўстаноўлена раней, калі Ячына схапілі паліцэйскія. Потым яго збітага правезлі па вуліцах Стрэшына і здалі сельгаскаменданту. Пасля кароткага допыту пасадзілі ў падвал, паабяцалі раніцай павесіць. На другі дзень, гэта бачылі людзі, партызана павезлі на падводзе за Стрэшын, дзе і расстралялі.

Аднак усё аказался не так. Допыт з пагрозамі нічога не даў стрэшынскаму каменданту. Тады ён вырашыў атрымаць параду з гестапа ў Жлобіне. Адтуль парэкамендавалі накіраваць партызана ім, імітуючы расстрэл. Так Ячын аказаўся, дзе ляжалі параненыя чырвонаармейцы. У гестапаўцаў быў свой план. Паранены і змучаны партызан нічога не скажа. Яго неабходна падлячыць, вярнуць жаданне жыць, а потым прымусіць выдаць усё, што патрабуецца. Палоннаму ўрачу было загадана абавязкова вылечыць параненага. Вось гэта і насцярожыла ўрача. Ён ціха распытаў Ячына і прыняў сваё рашэнне.

Тым часам фронт набліжаўся да Жлобіна. Фашыстам стала не да партызана. Гэта і выкарыстаў урач. Народны мсціўец апынуўся ў спісах памерлых. Гестапа перабралася ў Бабруйск. Туды перавезлі і палонных. Сярод іх апынуўся і Ячын. У камандзе выздараўліваючых яго ўжо не выганялі на работу. Збегчы, аднак, ніяк не ўдавалася. А хутка партызан разам з іншымі аказаўся ў вагоне, які наклі-

роўваўся на захад. Дзесьці за Мінскам у ліку некалькіх чалавек Ячыну ўдалося ўцячы.

Нямала яму прыйшлося павандраваць, пагаладаць, пакуль дабраўся да партызан. Разам з новымі сябрамі прымаў актыўны ўдзел у «рэйкавай вайне», выконваў іншыя баявыя заданні.

Летам сорак чацвёртага Міхаіл Ячын — баец Савецкай арміі. Ён дайшоў да Берліна.

Пры сустрэчы з Ячыным у Стрэшыне нехта з партызан заспяваў знаёмую песню: «И в воде мы не утонем, и в огне мы не сгорим!» Хутка наш герой выехаў на Радзіму. Далейшы лёс адважнага і мужнага партызана невядомы.

М.Б.Логвін.

Вызваленне

Хроніка вызвалення населеных пунктаў Жлобіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Дата	Назва населенага пункта	Хто вызваляў
29 лістапада 1943 г.	г.п. Стрэшын, пасёлкі Ліпы, Дружны, Садовы, Марс, Першамайскі, вёскі Касакоўка, Шыхаў	194-я сд
2 снежня 1943 г.	вёскі Пірэвічы, Салтанаўка	323-я сд
2 снежня	в. Скепня	4-я сд
4 снежня	в. Чацвярня	260-я сд
4 снежня	в. Старая Рудня	323-я сд
4 снежня	в. Чорная Вірня	287-я сд
4 снежня	в. Бабоўка	96-я сд
23 лютага 1944 г.	в. Майскае	115-ы УР
26 чэрвеня	г. Жлобін, в. Гармавічы, Кароткавічы, Плесавічы, Радуша	73-я сд
27 чэрвеня	в. Забалоцце	73-я сд
27 чэрвеня	в. Дворышча, Пякалічы, Шчадрын	96-я сд
27 чэрвеня	в. Кіцін	17-я сд

Занальны Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці, г.Жлобін.

Войскі, якія прымалі ўдзел у вызваленні Жлобіна і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

ЛІСТАПАД 1943 г. — ЧЭРВЕНЬ 1944 г.

Асноўныя баявыя дзеянні па вызваленні Жлобіншчыны вялі воіны Беларускага, з 17.04.1944 г. — 1-га Беларускага франтоў і, у прыватнасці, 48-й арміі (генерал-лейтэнант Пракоп Логвінавіч Раманенка). На правым флангу ім дапамаглі байцы 3-й арміі (генерал-лейтэнант Аляксандр Васілевіч Гарбатаў, на левым — 65-й арміі (генерал-лейтэнант Павел Іванавіч Батаў), 16 паветранай арміі (генерал-лейтэнант Сяргей Ігнатавіч Рудэнка).

Паводле звестак архіва былога Міністэрства абароны СССР (дакумент № 48716 ад 5.5.1965) на ўчастку Праскурні—Затон—Мормаль—Папаратнае з лістапада 1943 г. да чэрвеня 1944 г. прымалі ўдзел у баявых дзеяннях і знаходзіліся стралковыя дывізіі:

4-я Бежыцкая ордэна Суворава (палкоўнік Дзмітрый Дзям'янавіч Вараб'ёў); 17-я Бабруйская Чырванасцяжная (палкоўнік Аляксандр Паўлавіч Лукін); 37-я гвардзейская Рэчыцкая двойчы Чырванасцяжная ордэнаў Суворава і Кутузава (гвардыі палкоўнік Яўген Рыгоравіч Ушакоў); 73-я Навазыбкаўская Чырванасцяжная ордэна Суворава (палкоўнік Сцяпан Фёдаравіч Пятроўскі); 137-я Бабруйская (палкоўнік Сяргей Міхайлавіч Тарасаў, пасля — генерал-маёр Ф.Н.Жабрэеў); 170-я Рэчыцкая ордэна Суво-

рава (палкоўнік А.М.Пузырэўскі, з 21.07.1944 г. — палкоўнік Сямён Рыгоравіч Цыплянкоў); 175-я (палкоўнік Мікалай Мікалаевіч Драздоў); 194-я Рэчыцкая Чырванасцяжная (палкоўнік Павел Пракопавіч Апякін); 197-я (палкоўнік Сяргей Андрэевіч Вдовін); 217-я Унечская Чырванасцяжная ордэна Суворава (палкоўнік Мікалай Паўлавіч Масонаў, з 18.07.1944 г. — генерал-маёр А.І.Сурчанка); 273-я (палкоўнік Аляксей Іванавіч Валюшын); 399-я Навазыбкаўская ордэна Суворава (генерал-маёр Д.В.Казакевіч).

У вызваленні Жлобіна і раёна прымалі таксама ўдзел стралковыя дывізіі: 96-я Гомельская ордэна Суворава (генерал-маёр Ф.Г.Булатаў); 102-я Далёкаўсходняя Ноўгарад-Северная Чырванасцяжная ордэна Суворава (палкоўнік М.П.Паграбняк); 121-я гвардзейская Гомельская (генерал-маёр Л.Д.Чырвоній); 250-я Бабруйская Чырванасцяжная (палкоўнік М.А.Грэкаў, з 14.7.1944 г. — палкоўнік М.Р.Абілаў); 260-я, 287-я, 323-я (генерал-маёр В.Т.Маслаў); 115-ы (генерал-маёр Фёдар Піліпавіч Пічугін) і 161-ы (генерал-маёр Павел Дзмітрыевіч Дзмітрыеў) умацаваныя раёны.

У небе і на палях Жлобіншчыны вялі баі воіны дывізій: авіяцыйных штурмавых — 2-й гвардзейскай Чарнігаўска-Рэчыцкай Чырванасцяжнай ордэна Суворава (генерал-маёр авіяцыі Г.І.Камароў); 196-й Жлобінскай (падпалкоўнік Кірыл Канстанцінавіч Грышчанка); 299-й Нежынскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава, з 19.08.1944 г. — 11-я гвардзейская (генерал-маёр авіяцыі І.В.Крупскі); бамбардзіровачных — 241-й Рэчыцкай (палкоўнік І.Г.Курыленка); 271-й (начной) Сталінградска-Рэчыцкай ордэна Суворава, з 19.08.1944 г. — 9-я гвардзейская НБАД (палкоўнік К.І.Расказаў), знішчальнай — 283-й (палкоўнік С.Н.Чырва); артылерыйскай (прарыву) — 22-й Гомельскай 4АКП (палкоўнік Д.З.Зражэўскі); брыгад: мотастралковай — 8-й Бабруйскай Чырванасцяжнай (падпалкоўнік П.І.Трушкін); артылерыйскай 68-й пушачнай Сеўска-Рэчыцкай ордэна Суворава (палкоўнік З.Х.Траўкін); танкавых — 15-й гвардзейскай Рэчыцкай ордэна Суворава (палкоўнік К.Г.Кажанаў); 23-й асобнай Глухаўска-Рэчыцкай ордэна Суворава (падпалкоўнік М.С.Дзямідаў); 95-й Бабруйскай Чырванасцяжнай (палкоўнік А.І.Кузняцоў); 108-й Бабруйскай Чырванасцяжнай (падпалкоўнік Б.Н.Баранюк); асобных палкоў: 220-га гвардзейскага артылерыйскага знішчальна-супрацьтанкавага Рэчыцкага Чырванасцяжнага ордэна Аляксандра Неўскага (маёр П.М.Бублікаў); 36-га танкавага Рагачоўскага Чырванасцяжнага (падпалкоўнік М.В.Макаркін), 4-га Жлобінскага матарызаванага пантонна-маставога (падпалкоўнік Пётр Ісакавіч Масік).

Жлобінскія вайсковыя злучэнні і часць

За вызваленне г. Жлобін (26.6.1944) у ходзе Бабруйскай аперацыі 1944 паводле загада ВГК ад 2.7.1944 найменне «Жлобінскіх» атрымалі 2 вайсковыя злучэнні і 1 вайсковая часць 48-й і 16-й паветранай армій 1-га Беларускага фронту.

Часць і злучэнні, якім нададзены найменні «Жлобінскіх»: 196-я штурмавая авіяцыйная дывізія (падпалкоўнік К.К.Грышчанка) 4-га штурмавога авіяцыйнага корпуса, 115-ы ўмацаваны раён 48-й арміі (камендант генерал-маёр Ф.П.Пічугін) і 4-ы асобны матарызаваны пантонна-маставы полк (падпалкоўнік П.І.Масік). Войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Жлобіна, загадам ВГК ад 26.6.1944 аб'яўлена падзяка, у Маскве дадзены салют 12 артылерыйскімі залпамі з 124 гармат. *М.І.Камінскі.*

Пачатак вызвалення

22 лістапада 1943 г. палкі 194-й стралковай дывізіі (палкоўнік П.П.Апякін) на завяршаючым этапе Гомельска-Рэчыцкай аперацыі дасягнулі р. Бярэзіна ў раёне мястэчка Горваль. На наступны дзень яны былі ўжо на супрацьлеглым беразе. Рашуча дзейнічаў пры гэтым перадавы атрад 954-га стралковага палка на чале з камандзірам роты лейтэнантам Мураўёвым і камсоргам батальёна сяржантам Холадам, які на досвітку 23 лістапада перапраўіўся цераз раку і раптоўна атакаваў пра-ціўніка ў в. Верхняя Алба. Гітлераўцы, якія займалі вёску, лічылі сябе ў глыбокім тыле, і таму атака атрада з'явілася для іх нечаканай.

Не прыняўшы бою, яны ў паніцы пабеглі. Заняўшы вёску, атрад Мураўёва забяспечыў галоўным сілам дывізіі магчымасць бесперашкоднай пераправы праз Бярэзіну. Паспяховаму фарсіраванню дывізіяй ракі дапамог і трафейны пераправачны парк, які захапіў атрад у Верхняй Албе. Поспеху пераадолення Бярэзіны садзейнічалі дапамога партызан, дакладная арганізацыя пераправы, якую ажыццяўляла камандаванне дывізіі і палкоў, а таксама зладжаныя дзеянні на пераправе воінаў 158-га асобнага сапёрнага батальёна на чале з камандзірам капітанам Г.І.Панамарэнкам і намеснікам па палітчастцы Н.А.Кухарскім.

Дывізія наступала ў паўночным напрамку, уздоўж правага берага Дняпра. Яна вызваліла райцэнтр Стрэшын, в. Шыхаў, пасёлкі Дружны і Садовы. Далейшае прасоўванне дывізіі было спынена каля в. Грымячы Мох. Неаднаразовыя спробы прабіцца да Жлобіна аказваліся безвыніковымі.

Па загадзе камандуючага 48-й арміяй дывізія была перакінута з гэтага рубяжа ў раён в. Мормаль, дзе неаднойчы спрабавала прарваць абарону праціўніка з мэтай выйсці да Жлобіна. Але, сустрэўшы ўпартае супраціўленне ворага, перайшла да абароны.

У канцы снежня 1943 г. ўзнікла пагроза контрудару праціўніка ў стык паміж 65-й арміяй, якая наступала на захад ад Бярэзіны і прасунулася далёка наперад, і 48-й арміяй, што змагалася ў міжрэччы Бярэзіны і Дняпра. У сувязі з гэтым дывізія была тэрмінова перакінута на правы бераг Бярэзіны і там удзельнічала ў баях.

У канцы 1943 г. злучэнні Беларускага фронту дасягнулі рубяжа Чавусы, Новы Быхаў, на У ад Рагачова і Мазыра, на Пд ад Ельска. Тут фронт стабілізаваўся да 1944 г. Былі створаны спрыяльныя ўмовы для далейшага вызвалення Беларусі.

РАГАЧОЎСКА-ЖЛОБІНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944 ГОДА

Наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Беларускага фронту (генерал арміі К.К.Ракасоўскі) 21—26 лютага.

Удзельнічалі арміі: 3-я (генерал-лейтэнант А.В.*Гарбатаў*), частка сіл 50-й (генерал І.В.*Болдзін*) і 48-й (генерал-лейтэнант С.Л.*Рамаценка*), 16-я паветр. (генерал-лейтэнант авіяцыі С.І.*Рудэнка*). Мэта аперацыі — разграміць групоўкі праціўніка ў раёне Рагачова, Жлобіна і стварыць спрыяльныя ўмовы для наступлення на бабруйскім напрамку. Войскам фронту процістаяла 9-я армія нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр», якая займала падрыхтаваную абарону (2 умацаваныя палосы), у моцныя вузлы супраціўлення былі ператвораны Рагачоў і Жлобін. Галоўная роля надавалася 3-й арміі, якая павінна была нанесці ўдар з Пн у абход Рагачова, авалодаць ім і развіваць наступленне на Бабруйск.

21 лютага войскі 3-й арміі перайшлі ў наступленне, на працягу 2 дзён прарвалі абарону праціўніка, фарсіравалі па лёдзе р. Дняпро, перарэзалі чыгунку Магілёў—Рагачоў, 23 лютага выйшлі на подступы да Рагачова з ПнУ і ПдУ. Камандаванне групы армій «Цэнтр» падцягнула да Рагачова 5-ю танкавую дывізію, частку сіл 4-й танкавай дывізіі, з-пад Віцебска — 20-ю танкавую дывізію. Адбіўшы контратакі праціўніка, войскі 3-й арміі ноччу 24 лютага штурмам вызвалілі Рагачоў, на Пн ад яго прасунуліся да р. Друць, захапілі на правым беразе Дняпра паміж Новым Быхавам і Рагачовам плацдарм каля 60 км па фронту і да 25 км у глыбіню, ліквідавалі на Пд ад Рагачова плацдарм праціўніка на левым беразе Дняпра і выйшлі на подступы да Жлобіна. Войскі 50-й арміі, падтрымліваючы з Пн наступленне 3-й арміі, перайшлі у наступленне 22 лютага левафланговымі злучэннямі і ў ходзе ўпартых баёў авалодалі невялікім плацдармам. Далейшага развіцця аперацыя не атрымала. 26 лютага войскі правага крыла фронту перайшлі да абароны. У выніку аперацыі савецкія войскі нанеслі сур'ёзнае паражэнне 9-й арміі праціўніка, стварылі ўмовы для наступлення на бабруйскім напрамку. 13 злучэнняў і часцей атрымалі ганаровыя найменні «Рагачоўскіх».

БАБРУЙСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 1944 ГОДА

Наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Бел. фронту (генерал арміі К.К.Ракасоўскі) 24—29.6.1944 г. састаўная частка Беларускай аперацыі 1944 г.

У аперацыі ўдзельнічалі 3-я, 28, 48, 65-я арміі (генерал-лейтэнанты А.В.Гарбатаў, А.А.Лучынскі, П.Л.Раманенка, П.І.Батаў), конна-механізаваная група (генерал-лейтэнант І.А.Пліеў), 16-я паветраная армія (генерал-палкоўнік авіяцыі С.І.Рудэнка). Дняпроўская ваенная флатылія (капітан 1-га рангу В.В.Грыгор'еў), злучэнні авіяцыі далёкага дзеяння.

Задача аперацыі — ударамі з раёна Рагачова ў напрамку Бабруйск—Асіповічы (3-я і

48-я арміі) і з раёна на Пд ад Парыч у напрамку Старыя Дарогі—Слуцк (65-я, 28-я арміі і конна-механізаваная група) акружыць і разграміць бабруйскую групоўку ворага; развіць наступленне цераз Асіповічы—Пухавічы на Мінск і цераз Слуцк на Баранавічы. Савецкім войскам процістаялі 9-я нямецкая армія (10 пяхотных дывізій) і 2 дывізіі 4-й арміі. Праціўнік стварыў на Бабруйскім напрамку моцную, глыбока эшаланіраваную абарону, у т.л. на р. Дабрыца, Дабасна, Ала, Бярэзіна і вакол Бабруйска.

24 чэрвеня войскі 65-й і 28-й армій прарвалі абарону праціўніка. Уведзены ў прарыў 1-ы гвардзейскі танкавы корпус (генерал-маёр М.Ф.Паноў) паглыбіўся ў напрамку Бабруйска да 20 км і выйшаў у тыл парыцкай групоўкі ворага; 25 чэрвеня ў наступленне ўведзена конна-механізаваная група, якая 26 чэрвеня выйшла ў раёне Глуска да р. Пціч і месцамі фарсіравала яе. 26 чэрвеня 65-я армія выйшла да р. Бярэзіна на Пд ад Бабруйска, перарэзала шашу Бабруйск—Слуцк, 28-я армія 27 чэрвеня вызваліла Глуск і цэнтр Акцябрскага раёна — в. Карпілаўка. У ноч на 27 чэрвеня 1-ы гвардзейскі танкавы корпус перарэзаў шляхі на З і ПдЗ ад Бабруйска. Наступленне 3-й і 48-й армій развівалася з вялікімі цяжкасцямі. Толькі пасля магутных бомбавых удараў 16-й паветранай арміі і ўводу буйных танкавых сіл абарона немцаў была зломлена. 26 чэрвеня часці 48-й арміі вызвалілі Жлобін. Уведзены ў наступленне з раёна на Пн ад Рагачова 9-ы танкавы корпус (генерал-маёр Б.С.Бахараў) абышоў Бабруйск з Пн і 27 чэрвеня злучыўся з 1-м гвардзейскім танкавым корпусам, закончыўшы акружэнне 40-тысячнай групоўкі ворага ў раёне на ПдУ ад Бабруйска і ў горадзе. Утварыўся т.зв. бабруйскі «кацёл», ліквідаваны 28 чэрвеня сіламі армій 48-й, 65-й і 16-й паветранай. Галоўныя сілы наступалі ў напрамку на Мінск і Слуцк. 28 чэрвеня вызвалены Асіповічы і Старыя Дарогі, 29 чэрвеня — Бабруйск. Дняпроўская ваенная флатылія падтрымлівала сухапутныя войскі агнём, перапраўляла байцоў і тэхніку цераз Бярэзіну. Савецкім войскам дапамагалі партызаны: захоплівалі пераправы, вялі разведку ў тыле ворага, удзельнічалі ў баях. У ходзе аперацыі разбіты галоўныя сілы 9-й нямецкай арміі, ліквідавана бабруйская групоўка ворага (знішчана каля 50 тыс., узята ў палон больш за 23 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў, падбіта і захоплена 366 танкаў, больш за 5 тыс. гармат і мінамётаў, каля 16 тыс. аўтамашын і інш.); стварыліся спрыяльныя ўмовы для наступлення на Мінск і Баранавічы. 20 вайсковым часцям і злучэнням нададзены ганаровыя найменні «Бабруйскіх», 3 — «Жлобінскіх».

Р.М.Шавяла.

Вызваленне Жлобіна

Воіны 1-га Беларускага фронту рыхтаваліся да летняга наступлення. Прадстаялі нялёгкія баі. На Бабруйскім напрамку абараняліся 9-я армія праціўніка, 11 пяхотных дывізій і 2 дывізіі 4-й арміі, якія мелі добра падрыхтаваную, трывалую, глыбокаэшаланіраваную абарону. Апрача таго, па рэках Дабасна, Ала, Бярэзіна, а таксама вакол Бабруйска былі загадзя падрыхтаваны абарончыя рубяжы.

Напагатове былі і воіны 115-га ўмацаванага раёна 48-й арміі. Перад імі быў Жлобін, а далей — шлях на захад, вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкай пачвары.

24 чэрвеня 1944 г. задоўга да світання сапёры зрабілі праходы ў варожых дротавых загародах і мінных палях... І вось «загаманілі» гарматы і мінамёты. Дзве гадзіны і пяць мінут працягваўся агнявы налёт. Ад першай траншэі фашыстаў амаль нічога не засталося. Камандзіры падраздзяленняў 73-й і 217-й стралковых дывізій увялі ў бой свае галоўныя сілы.

Воіны 102-й стралковай дывізіі хутка захапілі першую і другую варожыя траншэі, а перад трэцяй атакуючых затрымалі частыя контратакі і моцны агонь гітлераўцаў. Пачалося новае ўдакладненне агнявой сістэмы праціўніка там, дзе праходзіла трэцяя траншэя, для чаго спатрэбілася больш 2 гадзін. Тым часам гітлераўцы атакавалі адкрыты левы фланг 102-й стралковай дывізіі палкоўніка М.П.Пагрэбняка. Адкінуць контратакуючых удалося з дапамогай артылерыстаў і танкасамаходнага палка. На зыходзе 24 чэрвеня палкі дывізіі выйшлі да сучаснага саўгасатэхнікума, а на наступны дзень, пасля артпадрыхтоўкі, авалодалі чыгуначнай станцыяй і населеным пунктам Чырвоны Бераг. Шлях да адступлення са Жлобіна на Бабруйск фашысцкім войскам быў адрэзаны.

Жорсткія баі не сціхалі. Справа даходзіла да рукапашнай. Нашы часці, як і вораг, неслі страты, але настойліва прасоўваліся наперад. Хутка байцы 2-га ўзвода 9-й роты 471-га стралковага палка на чале з малодшым лейтэнантам Журанковым і камсоргам Кузьміным, якія першымі прарваліся ў цэнтр, узнялі чырвоны сцяг над будынкам гарадскога Савета. Да вечара рота пад камандаваннем капітана Уласава штурмам захапіла гарадскую электрастанцыю.

Падраздзяленні лейтэнанта Гельві і старшага сяржанта Глухава першымі ўварваліся ва ўсходнюю частку горада, знішчылі тут 3 агнявыя кропкі праціўніка, да 30 фашыстаў, узялі ў палон афіцэра і сваімі дзеяннямі забяспечылі паспяховае наступленне суседзяў.

Умела кіраваў боем і неаднаразова паднімаў свой батальён у атаку камандзір батальёна капітан Нагарнюк.

Мужнасць, геройства, высокае воінскае майстэрства праявіла група лейтэнанта Георгія Васілевіча Навумава. У яе складзе было 4 гарматы і ўзвод пяхоты. Сяржант Міхненка і малодшы сяржант Іванькоў арганізавалі дзеянне разлікаў так, што гарматы пастаянна падтрымлівалі артылерыйскім агнём наступаючую пяхоту і пракладвалі ёй шлях наперад. Вечарам першага дня баёў за Жлобін, калі да Навумава прыбыло папаўненне, ён атрымаў загад выйсці на паўднёвую ўскраіну горада. Загад быў выкананы, а групай знішчана 6 варожых танкаў, 3 бронетранспарцёры, дзве гарматы праціўніка.

Камандзір 105-га асобнага батальёна з 115-га ўмацаванага раёна маёр Нарышкін са сваімі падначаленымі захапіў чыгуначны вузел, а дакладней, тое, што засталося ад яго пасля гаспадарання акупантаў і 4 эшалоны з тэхнікай, боепрыпасамі, амуніцыяй, харчаваннем.

217-я стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка М.П.Масонава вяла баі на паўночна-ўсходняй ускраіне горада. Тут асабліва вызначыліся чырвонаармеец Зінкевіч і яфрэйтар М.Белы, аб подзвігах якіх пісалі ў тыя дні дывізіённая і франтавая газеты.

У ліку першых у раёне чыгуначнага маста пераправілася цераз Днепр і ступіла на зямлю Жлобіна група аўтаматчыкаў малодшага лейтэнанта Рыбкі, украінец радавы Уладзімір Іванавіч Шпіленка і іх таварышы.

Жорсткія баі ішлі ў паласе 73-й стралковай дывізіі. Фашысты шмат разоў контратакавалі наступаючыя часці, але спыніць іх рух наперад не маглі. На фоне масавага гераізму ўсіх палкоў і батальёнаў дывізіі асабліва вызначыўся стралковы батальён маёра Міхалёва. На працягу 10 гадзін ён трымаў на сабе асноўны цяжар варожых атак. Сілы гітлераўцаў пераўзыходзілі сілы нашых байцоў, але вораг не змог зламаць мужнасць і стойкасць савецкіх салдат. Батальён адстаяў заваяваны рубеж, забяспечыў наступленне іншых падраздзяленняў і знішчыў пры гэтым вялікую колькасць жывой сілы праціўніка.

Пры вызваленні горада вызначыліся артылерысты 115-га ўмацаванага раёна. 1348-ы стралковы полк 399-й дывізіі (камандзір генерал-маёр Д.В.Казакевіч) вёў інтэнсіўны агонь па праціўніку, потым ад чыгуначнага моста з баямі прасоўваўся ў напрамку Рабочага пасёлка і далей на Малевічы.

Артылерысты капітана С.Ц.Пабядзінскага з 508-га асобнага кулямётна-артылерыйскага батальёна 115-га УРа, які «зімаваў» у раёне в. Чацвярня, наступалі з боку сучаснага льнозавода. Але ў горад яны не зайшлі, бо па загадзе камандавання гарматы былі перанацэлены ў напрамку Чырвоны Бераг—Туркі—Бабруйск.

Калі вораг быў выбіты з горада і часці пайшлі далей на захад, пры выездзе са Жлобіна на адным з вялікіх дрэў быў прыбіты ліст фанеры. На ім — «лістоўка-маланка» з загалоўкам: «Яны першыя ўварваліся ў Жлобін». Гэта былі байцы падраздзялення малодшага лейтэнанта Б.Сцяпанава.

Цяжка было глядзець на горад. Яго практычна не існавала — вакол папялішчы і развалiны, зараснікі пустазелля. Тое, што не згарэла раней у агні, фашысты ўзарвалі. Нідзе не было бачна людзей.

М.І.Панчанка, удзельнік вызвалення Жлобіна.

Дакументы сведчаць

СА ШТОДЗЁННАЙ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ ГАЗЕТЫ «СЛОВО БОЙЦА» ЗА 13 ЛЮТАГА 1944 г.

ТАВАРЫШ БАЕЦ!
Ты чуеш стогн дзяцей, жанчын, старых, якія пакутуюць пад фашысцкай пятой.
Цябе чакаюць: Мінск, Адэса, Бабруйск і Жлобін.

Разбураны Жлобін. Прадпрыемствы разгромлены, раскрадзены, абсталяванне і сыравіна вывезены ў Германію.

Адэса, Мінск, Львоў, Бабруйск, Жлобін і сотні іншых гарадоў і сёл чакаюць цябе, таварыш баец. Час помсты настаў. Блізіцца дзень грознай расплаты за вялікае гора і пакуты.

Уперад!

ЗАГАД ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА ГЕНЕРАЛУ АРМІІ РАКАСОЎСКАМУ

26 чэрвеня 1944 г.

Войскі 1-га Беларускага фронту, працягваючы паспяховае наступленне, сёння, 26 чэрвеня, авалодалі горадам і буйным чыгуначным вузлом Жлобін — важным апорным пунктам абароны немцаў на Бабруйскім напрамку.

У баях за авалоданне горадам Жлобін вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта Раманенкі, генерал-маёра Пічугіна, палкоўніка Пятроўскага, палкоўніка Масонава, артылерысты палкоўніка Траўкіна, падпалкоўніка Бублікава; лётчыкі падпалкоўніка Грышчанкі і пантанёры падпалкоўніка Масіка.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за вызваленне горада Жлобін, прадставіць да прысваення назвы «Жлобінскіх» і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 26 чэрвеня, у 23 гадзіны сталіца нашай Радзімы Масква ад імя Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Беларускага фронту, якія авалодалі горадам Жлобін, 12 артылерыйскімі залпамі з 124 гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за авалоданне горадам Жлобін.

Вечная слава героям, загінуўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Савецкага Саюза І.Сталін.

«Правда», 27.6.1944 г.

194-я стралковая дывізія

28.1.1944 194-я стралковая дывізія ўвайшла ў аператыўнае падпарадкаванне 161-га ўмацаванага раёна, амаль месяц абараняла рубеж Мормаль — рака Бярэзіна. 20.2.1944 г. яе ўключылі ў склад 25-га стралковага корпуса, і яна атрымала задачу прарваць абарону праціўніка на ўчастку в. Старына, Масткі, весці наступ у напрамку Кораўча—Дуброва (Светлагорскі раён).

На працягу 10 сутак (пачынаючы з 27 лютага) дывізія вяла цяжкі бой за в. Плесавічы. Аднак, з прычыны шматразовай перавагі праціўніка ў жывой сіле і артылерыі, сваёй задачы поўнасцю не выканала.

Дывізія прымала ўдзел у баях за в. Каруткавічы. Тут вызначыўся радавы 616-га стралковага палка Дз.М.Зюзькоў. Калі пяхота ўзнялася ў атаку, з добра замаскіраванага варожага дзота ўдарыў варожы кулямёт і прыціснуў наступаючых да зямлі. Храбры кулямётчык з свайго «Дзегцярова» адкрыў агонь па дзоце, чым адцягнуў увагу гітлераўцаў на сябе. Выкарыстаўшы агнявую падтрымку кулямётчыка, стралкі падняліся і рушылі далей, а Зюзькоў кінуў гранату ў варожы дзот. Вырашыўшы, што з кулямётчыкамі праціўніка скончана, баец заняў траншэю, але быў паранены. Пасля шпіталя воін вярнуўся ў родны полк.

На месцы вёсак, вызваленых дывізіяй у ходзе студзеньскіх і лютаўскіх наступальных баёў, чарнелі адны папялішчы. Незадоўга да прыходу савецкіх войск гітлераўцы загубілі жыхароў невялікай лясной вёсачкі Ала, размешчанай на аднайменным прытоку Бярэзіны. У гэтай вогненнай вёсцы было знішчана таксама нямала жыхароў вёсак Каруткавічы, Плесавічы, Антонаўка і іншых населеных пунктаў. Вестка аб жудасным злачынстве фашыстаў узрушыла воінаў дывізіі.

У канцы сакавіка 194-я стралковая дывізія здала свой участак пад Плесавічамі іншым фарміраванням, пасля чаго больш месяца знаходзілася ў другім эшалоне корпуса. 11 мая яна заняла абарону на поўдзень ад Жлобіна на рубяжы Затон, Мормаль, адкуль 9 чэрвеня была выведзена ў другі эшалон 48-й арміі. *П.Я.Кірычэнка.*

115-ы ўмацаваны раён

115-ы ўмацаваны раён быў сфарміраваны ў другі раз у студзені—лютым 1943 г. ў Маскве. У яго ўвайшло 6 асобных кулямётна-артылерыйскіх батальёнаў: 45-ы, 504-ы, 506-ы, 508-ы, 510-ы і 511-ы.

Такія раёны палявога тыпу фарміраваліся ўжо ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны. Яны прызначаліся для абароны рубяжоў, адкуль знімаліся мабільныя часці для манеўру і контрнаступлення. Камплектаваліся яны па штатах дывізіі: 5—6 асобных кулямётна-артылерыйскіх батальёнаў на правах палкоў, у кожны з якіх уваходзіла 4 кулямётныя роты, артылерыйскі дывізіён 76-міліметровых гармат, рота 45-міліметровых гармат, мінамётная рота і рота супрацьтанкавых ружжаў, па аднаму ўзводу сапёраў, разведкі, сувязі і санітарны, іншыя падраздзяленні тылу і забеспячэння.

Укамплектаваны асабовым саставам, новай тэхнікай і ўзбраеннем, у сакавіку таго ж года 115-ы ўмацаваны раён быў высунуты на адзін з абарончых участкаў Курскай дугі ў напрамку горада Сеўск. Пасля прарыву абароны фашыстаў і паспяховага наступлення войск Цэнтральнага фронту ён быў перададзены 48-й арміі. У канцы 1943 г. ён заняў абарону на ўсходнім беразе Дняпра, а 21—26 лютага 1944 г. прыняў удзел у Рагачоўска-Жлобінскай наступальнай аперацыі войск правага крыла 1-га Беларускага фронту, якая праводзілася з мэтай разгрому групіроўкі праціўніка ў раёне Рагачова, Жлобіна і стварэння добрых умоў для наступлення на бабруйскім напрамку. У выніку гэтай аперацыі

Байцы і камандзіры 115-га Жлобінскага ўмацаванага раёна. 1945 г.

П.М.Манусаў (у цэнтры).

быў ліквідаваны існаваўшы на левабярэжжы плацдарм гітлераўцаў. Воіны 115-га ўмацаванага раёна выйшлі да ўрэзу вады берагавой лініі і замацаваліся ад чыгуначнага моста ўверх па Дняпры на працягу больш 10 км.

У пачатку правядзення летняй наступальнай аперацыі «Баграціён» усе батальёны ўмацаванага раёна прымалі актыўны ўдзел у вызваленні Жлобіна і часткі тэрыторыі раёна.

За паспяхова праведзеную баявую аперацыю многія воіны ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, усяму асабоваму складу ўручаны пісьмы-падзякі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, а 115-му ўмацаванаму раёну (камандзір генерал-маёр Фёдар Піліпавіч Пічугін) прысвоена назва «Жлобінскі».

Пасля гэтага воінскае злучэнне знаходзілася на адпачынку ў Калінкавічах, ваявала ў складзе 69-й арміі 1-га Беларускага фронту. Баявы шлях закончыўся ў Берліне і на Эльбе. У канцы 1946 г. ўмацаваны раён расфарміраваны. *П.М.Манусаў.*

33-і асобны франтавы штрафны батальён на Жлобіншчыне

33-і асобны штрафны батальён паспяхова здзейсніў начны марш з захаваннем усіх мер перасцярогі і светамаскіроўкі і выйшаў у вызначаны раён за 20—25 км на ўсход ад Жлобіна. Перад воінамі стаяла задача вызваліць вёскі Майскае, Малыя Казловічы, Антонаўка і ў наступным асядлаць шашэйную дарогу, што ідзе з Майскага на Жлобін.

На пярэднім краі насупраць батальёна вораг меў суцэльную траншэю, абсталяваную кулямётнымі пляцоўкамі, бліндажамі для ўкрыцця. За першай траншэяй у глыбіні абароны былі другая і трэцяя. Усяго ў паласе наступлення батальёна праціўнік меў пяцьдзесят кулямётных пляцовак, шэсць дзотаў з цяжкім перакрыццем. Перад пярэднім краем знаходзілася дротавая загарода ў 2—3 рады, супрацьпяхотныя і супрацьтанкавыя міны. Свой пярэдні край гітлераўцы прыстралялі артылерыйска-мінамётным агнём. Мясцовасць адкрытая. Атакаваць ворага было нялёгка.

На досвітку 22.12.1943 г. ўсё было гатова для ўдара. Магутная артылерыйская падрыхтоўка і залпы «Кацюш» пачаліся ў сем гадзін раніцы. Пад прыкрыццем агня падраздзяленні батальёна скрытна для праціўніка падышлі ўшчыльную да яго пярэдняй траншэі. Як толькі артылерыя перанесла агонь у глыбіню абароны, у паветра ўзляцелі чырвоныя ракеты — сігнал для пераходу ў атаку. Воіны вялі агонь на хаду з усіх відаў стралковай зброі, таксама пусцілі ў ход «кішэнную артылерыю» — гранаты, закідваючы імі траншэі праціўніка і знішчаючы яго жывую сілу.

Першая рота, якой камандаваў В.І.Козыраў, смела і напорыста атакавала абараняўшыхся і імкліва ўварвалася ў траншэю, агнём і гранатамі пракладвала шлях наперад і штурмам авалодала вёскай Майскае, уклінілася ў абарону праціўніка, што стварыла ўмовы для паспяховага прасоўвання ўсяго батальёна. Ад ворага была ачышчана і трэцяя траншэя, з суседзямі ўстаноўлена трывалая сувязь і асядлана шашэйная дарога, што вяла з Майскага на Жлобін.

Камандзір батальёна маёр Мурза прыняў рашэнне: нязначнай колькасцю байцоў атакаваць праціўніка ў в. Малыя Казловічы ў «лоб», а асноўнымі сіламі наступаць на населены пункт справа і злева. Задума была паспяхова вырашана, і Малыя Казловічы вызвалены ад гітлераўцаў.

На ўсход ад в. Антонаўка батальён злучыўся з танкамі, якія выйшлі ў гэты раён. Разам захапілі населены пункт.

Але праціўнік імкнуўся ўсімі сіламі вярнуць страчаныя рубяжы і пусціў танкі. Быў паранены камандзір роты В.І.Козыраў. Яго замяніў лейтэнант Іван Гардзееў.

На дапамогу пяхоце паспяшаліся артылерысты. Першым жа залпам яны падбілі 2 танкі ворага і павялі па іх інтэнсіўны агонь.

Падбадзёраныя артылерыяй, воіны роты Гардзеева акружылі варожую батарэю, перабілі яе разлік і захапілі 4 гарматы. У гэтым баі асабліва вызначыўся стралок Ягор Прохараў. Калі варожыя танкі ішлі на пазіцыі роты Івана Гардзеева, ён папоўз ім насустрач з бутэлькамі, напоўненымі гаручай сумессю. Але тут яго спасцігла няўдача: ці то шалёная куля, ці то кавалак асколка разбілі бутэльку, і з яе брызнула сумесь і полымя агню, якія папалі на адзенне. Салдат ператварыўся ў факел, але не спалохаўся, не павярнуў назад. Ён устаў ва ўвесь рост і жывым вогненным

факелам ірвануўся насустрач танку, разбіў аб яго браню другую бутэльку з запальваемай сумессю і сам упаў на машыну.

Ваенны савет Беларускага фронту адзначыў гераізм і мужнасць асабовага складу 33-га асобнага франтавога штрафнога батальёна пры вызваленні населеных пунктаў Антонаўка, Майскае, Малыя Казловічы і зняў судзімасць па прыгаворах судоў. Байцам былі адноўлены воінскія званні, і яны размеркаваны па часцях, афіцэры — з назначэннем на камандныя пасады.

У снежаньскіх баях на Жлобіншчыне 33-і асобны штрафны батальён забяспечыў поспех 348-й стралковай дывізіі. *Б.К.Андрушкевіч.*

102-я Далёкаўсходняя стралковая дывізія

«Пасля ўзяцця Гомеля дывізія атрымала загад зрабіць марш, выйсці ў міжрэчча Дняпра і Бярэзіны ў раён населенага пункта Мормаль»,— піша ў сваіх мемуарах Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік А.М.Андрэеў.

Андрэй Мацвеевіч сустрэў Вялікую Айчынную вайну на пасадзе начальніка 5-га пагранічнага Чырванасцяжнага атрада Ленінградскай ваеннай акругі, на якую ён быў прызначаны пасля заканчэння Ваеннай акадэміі імя М.В.Фрунзе. Камандаваў атрадамі народнага апалчэння і арганізоўваў ачыстку ад ворага паўночнай ускраіны горада Сестрарэцк, яго абарону, камандаваў 43-й Чырванасцяжнай і 86-й стралковымі дывізіямі пад Ленінградам. У канцы 1942 года ўзначаліў фарміруемае на Далёкім Усходзе злучэнне воінаў-пагранічнікаў. 5 лютага 1943 г. загадам Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання Далёкаўсходняя стралковая дывізія войск НКУС была ўключана ў склад Чырвонай Арміі і атрымала канчатковую назву —102-я Далёкаўсходняя стралковая дывізія, з 15.2.1943 г. знаходзілася ў складзе 70-й арміі Цэнтральнага фронту. З сакавіка 1943 г. вяла напружаныя абарончыя і наступальныя баі на Жлобіншчыне. У жніўні 1943 г. дывізія была выведзена са складу 70-й і перапарадкавана 48-й арміі.

Да 9.3.1944 года дывізія правяла шэраг паспяховых баёў. Асабліва памятны подзвіг малодшага сяржанта Андрэя Караткова.

У час наступлення адна з батарэй заняла агнявыя пазіцыі на вельмі выгаднай вышыні ў глыбіні абароны гітлераўцаў. Наводчык гарматы малодшы сяржант Караткоў, расчышчаючы дарогу пехацінцам, у час бою за гэтую вышыню падбіў 2 цяжкія танкі, знішчыў 3 ручныя кулямёты ворага, прамым трапленнем у амбразуру прымусіў замоўкнуць дзот.

Але вышыня мела вялікае тактычнае значэнне, і немцы не хацелі яе страціць. На наступны дзень раніцай яны вырашылі аднавіць становішча і пайшлі ў контратаку, якую падтрымлівалі танкі. Наперадзе ішоў цяжкі танк «тыгр», а ўслед за ім некалькі сярэдніх танкаў.

Першым адкрыў агонь па танках гарматны разлік старшага сяржанта Карабаева. На яго ішлі 3 нямецкія танкі, у тым ліку «тыгр».

Танкі ішлі на пазіцыю Карабаева, падставіўшы свае барты гармаце Караткова. Той разумеў, што разлік Карабаева вось-вось апынецца ў цяжкім становішчы, але патрэбна было выйграць час, каб ударыць беспамылкова. Калі першы танк быў ад яго не далей 300 м, Караткоў адкрыў агонь. Першы снарад трапіў у цэль, і «тыгр» загарэўся. Але другі танк працягваў рухацца да гарматы Караткова, ведучы агонь на хаду. Здавалася, што пройдзе яшчэ імгненне, і агнявая пазіцыя Карабаева будзе знішчана яго гусеніцамі, але Караткоў змог трапным выстралам падбіць і другі танк, а трэці паспешліва рэціраваўся.

Гітлераўскія танкісты разабраліся ў абстаноўцы і, мабыць, вырашылі акружыць гармату Караткова. Яны адкрылі моцны агонь па агнявой пазіцыі Караткова і атакавалі яго вышыню з розных накірункаў.

Першы нямецкі танк, які ўзняўся на вышыню, Караткоў расстраляў ва ўпор. У гэты час адважнага артылерыста кантузіла. Таварышы яго былі ўжо паранены або загінулі. Малодшы сяржант застаўся адзін. Ён знайшоў у сабе сілы для працягу бою. Сам разварочваў гармату, наводзіў і страляў. Знішчыў яшчэ 2 танкі. А ўсяго ў тым памятным баі ён знішчыў 5 гітлераўскіх браніраваных машын.

Па загаду камандуючага 48-й арміі генерал-лейтэнанта П.Л.Раманенкі 29-ы стралковы корпус пакінуў 73-ю стралковую дывізію на раней займаемых пазіцыях — Жлобін—Мормаль. Сіламі 102-й і 217-й стралковых дывізій, рухаючыся толькі ноччу з захаваннем усіх мер маскіроўкі, корпус зрабіў марш

на поўнач у раён Рагачова з паўднёва-ўсходняга боку. Рыхтаваліся ложныя пераправы. На другасных участках імітавалася канцэнтраванне артылерыі. Толькі на ўчастку 48-й арміі на поўдзень ад Рагачова было выстаўлена больш 200 макетаў ложных артылерыйскіх і мінамётных батарэй.

У канцы чэрвеня ў 102-й стралковай дывізіі, якая знаходзілася ў другім эшалоне арміі, на спецыяльна падабранай мясцовасці былі праведзены батальённыя і палкавыя вучэнні па фарсіраванні Друці і прарыву глыбока эшаланіраванай абароны гітлераўцаў.

...Марудна, нібы неахвотна, займаўся досвітак 24 чэрвеня 1944 г. Усё выразней праглядаліся контуры пагоркаў, дзе працягнуліся варожыя траншэі. Ужо гатовыя праходы ў мінных палях. Быццам сціснутая спружына трымае ў напружанні палкі і дывізіі, кожнага байца.

У чатыры гадзіны раніцы ўздрыганулася, застагнала зямля. Адначасова, зліваючыся ў адзіны агнявы паток, ударылі сотні нашых гармат і мінамётаў. Дзве гадзіны пяць мінут працягвалася артылерыйская падрыхтоўка.

Яшчэ бушаваў агнявы ўраган, а пярэдні край абароны ворага ўжо зацягнула пылам і дымам. Штурмавыя батальёны імклівым кідком пераадолелі забалочаную пойму Друці, следуючы ўшчыльную за агнявым валам, уварваліся ў першую траншэю гітлераўцаў.

Захапіўшы першую траншэю, байцы паспяхова пераадолелі другую, а перад трэцяй, сабраўшы сілы, праціўнік спыніў наступаючых. Больш двух гадзін было страчана для ўдакладнення агнявой сістэмы трэцяй траншэі ворага, перагрупіроўкі гармат непасрэднага суправаджэння пяхоты. У гэты час гітлераўцы атакавалі адкрыты левы фланг 102-й стралковай дывізіі. Адкінуць іх на зыходныя пазіцыі ўдалося толькі з дапамогай артылерыйскага знішчальнага палка, які дзейнічаў ва ўзаемадзеянні з танкасамаходным палком.

За адвагу і мужнасць пры фарсіраванні Друці і прарыву моцна ўмацаванай доўгачасовай абароны на бабруйскім напрамку ў ліку іншых высокае званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена радавому Сяргею Пятровічу Анішчанку, былому партызану, ураджэнцу в. Сцяпы.

Пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, 30-ы стралковы Хасанскі полк 24 чэрвеня выйшаў да ўсходняй ускраіны Чырвонабярэжскага саўгаса-тэхнікума, дзе змог замацавацца на занятых рубяжах. 25 чэрвеня пасля артпадрыхтоўкі полк штурмам авалодаў цэнтральнай сядзібай саўгаса-тэхнікума, які гітлераўцы пераўтварылі ў моцны апорны пункт. *П.Я.Кірычэнка.*

Не давалі ворагу перадыху

Завяршалася Гомельска-Рэчыцкая баявая аперацыя, і войскі 48-й арміі павярнулі на захад. 53-му стралковаму корпусу было загадана праследаваць праціўніка ўздоўж чыгункі на Жлобін. 96-я стралковая дывізія дзейнічала на лініі Радзееўка—Буда-Кашалёва—Шарыбаўка. Побач ішлі 197-я і 323-я стралковыя дывізіі 3-й арміі.

На досвітку 4.12.1943 г. зямлю ахутаў густы туман, надвор'е не абяцала быць добрым. Выкарыстаўшы момант, нямецка-фашысцкія войскі пачалі адыход, спадзеючыся, што змогуць незаўважана адарвацца ад нашых перадавых часцей. Але армейская разведка не дрямала і задуму праціўніка своечасова раскрыла. Ворага пагналі далей, не давалі яму перадыху і да 10 гадзін раніцы дасягнулі рубяжа, які быў вызначаны загадам вышэйшага камандавання. Полк Мамонава завязаў бой на ўсходняй ускраіне вёскі Бабоўка, а падраздзяленні Абрамава нацэліліся на Баршчоўку.

Разгарнуліся баі каля станцыі Хальч. Тут воіны дывізіі сустрэлі ўпартае супраціўленне 134-й пяхотнай дывізіі праціўніка, але пад націскам наступаючых паступова здавалі свае пазіцыі. Камандзір варожай дывізіі наогул уцёк з поля бітвы. Гітлераўцы ў гэтым раёне бязлітасна супраціўляліся. У такіх умовах без неабходнай падрыхтоўкі весці кровапралітныя баі было проста бессэнсоўна. Зыходзячы з новай абстаноўкі, часці дывізіі часова спынілі рух і прыступілі да ўмацавання сваіх пазіцый у раёне в. Калыбаўка. Як паказалі далейшыя падзеі, гэта было зроблена своечасова.

Набліжаўся Новы год, і неяк ноччу 26 снежня байцы дывізіі каля в. Калыбаўка натыкнуліся на двух прышэльцаў з-за лініі фронту. Гэта былі маці і сын, якія ледзь трымаліся на нагах, знясіленыя ад голаду. Яны

расказалі аб тым, што на пачатку месяца амаль усё насельніцтва Калыбаўкі фашысты пагналі ў Германію. Ім пашчасціла ўцячы, і да гэтага часу яны хаваліся ў лесе, непадалёку ад роднай вёскі. Заходзіць у яе было небяспечна. А потым акопы падзялілі тэрыторыю наваколля на 2 паловы. Мясцовыя жыхары паведамілі вайскоўцам нямала карыснага. Участак чыгункі ад Калыбаўкі да станцыі Ветка-Вір аказаўся цалкам разбураны, і паязды хадзілі толькі дагэтуль. Непадалёку ад вёскі фашысты ўзводзілі абарончыя збудаванні. Відаць, рыхтаваліся да доўгай зімы і меркавалі спыніць наступ рускіх.

Пра тое ж самае паведамілі і 11 партызан, якія яшчэ 20 снежня перасеклі лінію фронту ў палосе абароны дывізіі.

12.1.1944 г. загадам камандуючага арміяй 260-я і 323-я стралковыя дывізіі былі выведзены з саставу 53-га стралковага корпуса і накіраваны ва Уваравічы, дзе яны папаўняліся асабовым саставам, зброяй і тэхнікай, асвойвалі новае ў вядзенні наступальных аперацый.

...Паводле рашэння камандуючага корпуса 96-я дывізія павінна была ўзаемадзейнічаць з часцямі 17-й стралковай дывізіі справа і Дняпроўскай ваеннай флаціліяй злева. Галоўны ўдар наносіўся ў напрамку Замен-Рыння. Патрабавалася прарваць абарону праціўніка і да зыходу першага дня выйсці на рубеж: адзнака 145,5 — возера Селішча. Полк Мамонава атрымаў заданне ў цеснай сувязі з палком Касцяніцына ўдарыць на Замен-Рынню і авалодаць вёскай. Далей дывізія ва ўзаемадзеянні з часцямі 17-й стралковай дывізіі павінна развіваць наступ у напрамку Шчадрына. Раён гэтага населенага пункта і г. Бабруйск з 12 гадзін пачала бамбіць наша авіяцыя.

Перадавыя падраздзяленні дывізіі прарвалі абарону праціўніка з поўдня і паўднёвага захаду і ўварваліся ў Замен-Рынню. Частка байцоў ачышчала вёску ад чужынцаў, другая абышла яе і рушыла наперад.

Літаратура: *Ф.Г.Булатов. Будни фронтовых лет. Казань, 1984.* *П.Я.Кірычэнка.*

Бой за Гарадок

194-я стралковая дывізія фарсіравала р. Бярэзіна, вызваліла вёскі Ніжняя Алба і Верхняя Алба, потым Шыхаў, Гарадок...

Праціўнік, выкарыстаўшы асаблівасці мясцовасці, ператварыў Гарадок у моцны вузел супраціўлення, спадзяваўся затрымацца тут доўгі час. Таму для захопу вёскі была створана спецыяльная штурмавая група, у склад якой залічылі і мяне.

Без артылерыйскай падрыхтоўкі, выкарыстоўваючы прыцемкі, група (больш за 100 байцоў) 29.11.1943 г. накіравалася да населенага пункта. Разгарнуліся ў ланцуг, скрытна дасягнулі вёскі. Аднак немцы выявілі нас раней, чым пачалася атака. Асвятліўшы ракетамі наступаючыя ланцугі нашых салдат, гітлераўцы адкрылі знішчальны агонь з усіх відаў зброі. Асабліва моцна абстрэльваўся левы фланг наступаючых. Пад свінцовым дажджом кулямётаў нашы салдаты вымушаны былі залегчы. Але баявы дух не быў страчаны, і яны актыўна пачалі весці агонь па нямецкіх агнявых кропках.

Я быў першым нумарам процітанкавага ружжа (ПТР), і ў адпаведнасці з атрыманым загадам пачаў весці агонь па кулямётах праціўніка. У цемры, не маючы магчымасці разгледзець прыцэльны прыбор, страляў і страляў па выбранай цэлі, якая была там, дзе наглядаліся ўспышкі. Толькі тады, калі куля папала ў кулямёт, ён замоўк. Але ж і мы дэмаскіравалі сваю агнявую пазіцыю. Выкарыстаўшы гэта, немцы адкрылі ўраганны агонь па маёй бранябойцы.

У гэтым баі загінуў мой другі нумар Мікалай Данільчык. З яго кішэні я дастаў прабіты куляй камсамольскі білет і перадаў камсоргу 616-га стралковага палка Мікалаю Салунову.

Бой працягваўся ўсю ноч і наступны дзень. У тым баі загінулі больш 30 воінаў штурмавой групы. Група марудна, але ўпарта пракладвала шлях наперад. Толькі ў канцы наступнага дня вёска Гарадок была поўнасцю ачышчана ад ворага.

У далейшым давялося ўдзельнічаць у баях за Стрэшын, Мормаль, пад Плесавічамі і Кароткавічамі, дзе 7.3.1944 г. быў цяжка паранены. Але той бой за Гарадок памятаю заўжды. Менавіта там пацярпела маё ружжо. Адна куля фашыста збіла мушку на ім. Другая куля заклініла амартызацыйнае ўстройства. Пасля бою ружжо давялося здаць у рамонтную майстэрню. Сам у баі не пацярпеў, хаця кулямі была зроблена не адна дзірка ў шынялі. *Дзмітрый Зюзькоў.*

Вызваленне Старой Рудні

Спроба ўзяць Старую Рудню з ходу поспеху не мела. Падраздзяленні 197-й стралковай дывізіі (сфарміравана 8.5.1943 г. ў Венеўскім раёне Тульскай вобласці з часцей 120-й Чапаеўскай і 147-й курсанцкай брыгад, з 22 ліпеня ў складзе 53-га стралковага корпуса ўдзельнічала ў баях) былі сустрэты моцным ружэйна-кулямётным агнём, заляглі і пачалі акопвацца. У праціўніка была перавага ў жывой сіле і тэхніцы. Галоўны ўдар наносілі 828-ы і 889-ы стралковыя палкі. Батальёны 862-га стралковага палка пад прыкрыццём артылерыі і танкаў пайшлі ў атаку. Знішчальна-супрацьтанкавыя гарматы паўзводна рухаліся ў баявых парадках стралковых рот. Знішчалі агнявыя кропкі і жывую сілу праціўніка, пракладаючы шлях пяхоце. Пехацінцы дапамагалі артылерыстам выцягваць гарматы з залітых вадой канаў і воронак.

Схватка разыгралася ў першай траншэі. У рукапашнай удзельнічалі нават камандзіры батальёнаў.

Цяжка адзначыць, хто лепш біўся за авалоданне Старой Рудняй. Усе дзейнічалі ўмела, рашуча. У паступаючых у штаб данясеннях пералічвалася шмат прозвішчаў вызначыўшыхся салдат, сяржантаў, афіцэраў.

Узвод малодшага лейтэнанта Паўла Краўцова фашысты адрэзалі ад роты. Больш гадзіны малады афіцэр адбіваў атакі пераўзыходзячых сіл ворага. Калі ж на зыходзе былі боепрыпасы, малодшы лейтэнант прыняў рашэнне на прарыў і павёў байцоў у атаку. Гранатамі, агнём аўтаматаў пехацінцы прабілі сабе шлях, злучыліся з ротай і даставілі на насілках смяротна параненага камандзіра.

Гарматны разлік пад камандаваннем сяржанта Івана Масквіна знішчыў 2 агнявыя кропкі праціўніка. Артылерысты ўступілі ў паядынак з разлікам фашысцкай штурмавой гарматы. Лік ішоў на хвіліны — хто апярэдзіць у выстрале. Нашы пушкары аказаліся спрытнейшымі. Нямецкая браніраваная махіна была падбіта.

Мінамётны разлік сяржанта Аляксея Сакалова агнём вырашыў зыход контратакі гітлераўцаў. Адважны воін да апошняга імгнення свайго жыцця працягваў кіраваць боем. Старшы сяржант Цімох Дзянісаў у ходзе наступу знаходзіўся ў баявым парадку стралковай роты. Карэкціраваў агонь узвода, які знішчыў 3 кулямёты і звыш дзесятка гітлераўцаў.

Ураджэнцы і жыхары вёскі, калгасныя актывісты, якія былі загублены ў верасні 1941 г.

ВЯДЗЬГУН Ганна Макараўна, н. ў 1922, студэнтка Гомельскага медтэхнікума.

ВЯДЗЬГУН Макар Усцінавіч, н. ў 1877, калгаснік.

ДАЙНЕКА Сяргей Паўлавіч, калгаснік.

ДАНІЛЕНКА Піліп Сцяпанавіч, н. ў 1911, старшыня калгаса.

ПРЫМАК Антон Данілавіч, калгаснік.

ПРЫМАК Міна Халімонавіч, н. ў 1890, калгаснік.

РОГАЎ Васіль Паўлавіч, н. ў 1909, член праўлення калгаса.

РУСАЛЕНКА Адам Максімавіч, н. ў 1910, загадчык магазіна.

РУСАЛЕНКА Канстанцін Максімавіч, н. ў 1908, старшыня калгаса «Прагрэс».

САВАСЦЕЕНКА Міхаіл Данілавіч, старшыня Кабанаўскага сельвыканкома.

СІМІНЕНКА Іван Мікалаевіч, падатковы інспектар.

СТУКАЧ Сцяпан Антонавіч, н. ў 1918, бухгалтар калгаса «Прагрэс».

ПІРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ВЕРНЫ

Мірныя жыхары, якія былі расстраляны 27 верасня 1943 г.

АГАЖЭЛЬСКАЯ Фядосся Рыгораўна, н. ў 1908.

АГАЖЭЛЬСКІ Яўген Станіслававіч, н. ў 1927.

ГАЎРЫЛЕНКА Рыгор Трафімавіч, н. ў 1883.

ГАЎРЫЛЕНКА Яўтен Самсонавіч, н. ў 1888.

ЖУКАВА Варвара Рыгораўна, н. ў 1894.

ЖУКАЎ Емяльян Міхайлавіч, н. ў 1890.

ЖУКАЎ Іван Калінікавіч, н. ў 1896.

ЗАІЧКОВА Акуліна Міхайлаўна, н. ў 1904.

ЗАІЧКОВА Варвара Сцяпанаўна, н. ў 1913.

ЗАІЧКОВА Людміла Данілаўна, н. ў 1934.

ЗАІЧКОВА Ніна Рыгораўна, н. ў 1939.

ЗАІЧКОВА Ульяна Лявонаўна, н. ў 1893.

ЗАІЧКОВА Фядосся, н. ў 1883.

ЗАІЧКОЎ Аляксей Міхайлавіч, н. ў 1873.

ЗАІЧКОЎ Кірыла Міхайлавіч, н. ў 1880.

ЗАІЧКОЎ Мікалай Кірылавіч, н. ў 1931.

ЗАІЧКОЎ Рыгор Рыгоравіч, н. ў 1931.

КАЛЯДЗЕНКА Яўхім Тарасавіч, н. ў 1890.

КАРАЛЁЎ Іван Самсонавіч, н. ў 1909.

КОТАВА Зінаіда Васілеўна, н. ў 1940.

КОТАВА Ульяна Самсонаўна, н. ў 1910.

КОТАЎ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1929.

ЛУК'ЯНЕНКА Аляксандра Ісаеўна, н. ў 1890.

В.Р.Жукава.

І.К.Жукаў.

ЛУК'ЯНЕНКА Вольга Раманаўна, н. ў 1930.
ЛУК'ЯНЕНКА Ганна Міхайлаўна, н. ў 1903.
ЛУК'ЯНЕНКА Зінаіда Раманаўна, н. ў 1923.
ЛУК'ЯНЕНКА Ніна Данілаўна, н. ў 1924.
ЛУК'ЯНЕНКА Піліп Ананьевіч, н. ў 1883.
ЛУК'ЯНЕНКА Прося Анісімаўна, н. ў 1885.
ЛУК'ЯНЕНКА Раман Ананьевіч, н. ў 1881.
МЕЧЫКАЎ Герасім Міхайлавіч, н. ў 1883.
МЯДЗВЕДЗЕВА Валянціна Лазараўна, н. ў 1937.
МЯДЗВЕДЗЕВА Марыя Цімафееўна, н. ў 1893.
ПАЛЯКОВА Лідзія Сямёнаўна, н. ў 1938.
ПАЛЯКОВА Марыя Сцяпанаўна, н. ў 1918.
ПАЛЯКОВА Ульяна Тарасаўна, н. ў 1885.
ПОЛАЎЦАВА Варвара Парфенаўна, н. ў 1898.
ПОЛАЎЦАВА Ганна Мінаўна, н. ў 1923.
ПУПАЧОЎ Іван Раманавіч, н. ў 1936.
ПУПАЧОЎ Леанід Раманавіч, н. ў 1930.
ПУПАЧОЎ Раман Фёдаравіч, н. ў 1886.
ЦЕРАШКОВА Валянціна Сяргееўна, н. ў 1941.
ЦЕРАШКОВА Зінаіда Сяргееўна, н. ў 1935.
ЦЕРАШКОВА Таццяна Кірылаўна, н. ў 1910.
ШЭНДРЫКАВА Аляксандра Яўхімаўна, н. ў 1904.
ШЭНДРЫКАВА Таццяна Аляксееўна, н. ў 1880.
ШЭНДРЫКАЎ Піліп Андрэевіч, н. ў 1873.

СТРЭШЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК СТРЭШЫН

Мірныя жыхары, якія былі расстраляны 14 краевіка 1942 г.

АСНІН Рафаіл, н. ў 1919.
АСНІНА Роза, н. ў 1921.
АСНІНА Сара, н. ў 1931.
ГАРАДЗЕЦКІ Мендэль і яго жонка Зэлда.
ГОЛЬДЗІНА Доба.
ГУРЭВІЧ Маня.
ГУРЭВІЧ Рыва.
ГУРЭВІЧ Хая Абрамаўна.
ГУРЭВІЧ Элька Абрамаўна і дзве дачкі.
ГУЦІН Янкель, яго жонка і чацвёра дзяцей.
ДВОРКІНА Броня.
ДУБАВА Сара Пейсіхаўна.
ЗІЛЬБЕРТ Нісель.
ЗІЛЬБЕРТ Хая.
КАРАСІК Арон, яго жонка і двое дзяцей.
КАРЛАН Арон Бенцыянавіч.
КОТЛЯР Абрам Евелевіч, н. ў 1891.
КОТЛЯР Бейля Ісакаўна.
КОТЛЯР Міхаіл Ісакавіч.
КОТЛЯР Цыля, н. ў 1893.
КУРЦЭР Бенцыян Аронавіч, н. ў 1929.
КУРЦЭР Роза, н. ў 1899.
КУРЦЭР Соня Аронаўна, н. ў 1931.
МАКСОН.
МЕЛАМЕД Роза Вульфаўна, н. ў 1895.
МЕЛАМЕД Рувім Абрамавіч, н. ў 1882.
ОКУНЬ Абрам, н. ў 1929.
ПАДОШАВА Раіса.
ПЛОТКІН Захар Нафтольевіч, н. ў 1882.
ПЛОТКІН Натан Захаравіч, н. ў 1925.
ПЛОТКІНА Сіма Захараўна, н. ў 1924.
ПЛОТКІНА Цыпа Захараўна, н. ў 1927.
РАБІНОВІЧ Барыс Пейсахавіч, н. ў 1876.
РАБІНОВІЧ Хая, н. ў 1880.
РУТМАН Абрам, н. ў 1929.
РУТМАН Бенцыян, н. ў 1929.
РУТМАН Барыс.
РУТМАН Геня.
РУТМАН Гірша Фрэдлавіч, н. ў 1880.
РУТМАН Ківа Абрамавіч.
РУТМАН Ківа Гіршавіч, н. ў 1865.
РУТМАН Лейба.
РУТМАН Ліза.
РУТМАН Ліза, н. ў 1883.
РУТМАН Меер.
РУТМАН Соня, н. ў 1927.
РУТМАН Фаня Лейбаўна, н. ў 1927.
РУТМАН Цыля Лейбаўна, н. ў 1930.
РУТМАН Шлёма, н. ў 1860.
РУТМАН Шэйна-Хана, н. ў 1862.
РЫЎКІН Хаім-Мейлая, н. ў 1887.
РЫЎКІНА Сіма, н. ў 1896.
РЫЎКІНА Софія, н. ў 1930.
РЭЎЗІН Абрам Хаімавіч, н. ў 1880.
РЭЎЗІН Абрам Шэвелевіч, н. ў 1879.
РЭЎЗІН Борух Абрамавіч, н. ў 1876.
РЭЎЗІН Міхаіл Навумавіч, н. ў 1926.
РЭЎЗІН Рахміэль і яго жонка Хая.
РЭЎЗІН Сімон, яго жонка і тры дачкі.
РЭЎЗІНА Ася Барысаўна, н. ў 1884.
РЭЎЗІНА Бейля Хаім-Мейлахаўна, н. ў 1858.
РЭЎЗІНА Зінаіда Герцаўна, н. ў 1882.
РЭЎЗІНА Мехля Абрамаўна, н. ў 1919, і яе дзіця.
РЭЎЗІНА Хая Абрамаўна, н. ў 1914.
РЭЎЗІНА Хая Абрамаўна, н. ў 1924.
РЭЎЗІНА Хая Гельцаўна, н. ў 1894.
РЭЎЗІНА-ЗЕЛЬДОВІЧ Маня Абрамаўна, н. ў 1898.
СВАРДЛОВА Ніхама Рыгораўна, двое дзяцей і маці.
СІМАНОЎСКАЯ Соня, н. ў 1922.

СІМАНОЎСКІ Лейбік, яго жонка Хая і трое дзяцей.
СЛАВІН Айзік.
СЛАВІНА Рыва.
СЛАВІНА Хая.
СОРКІНА Хася, н. ў 1880.
СТАНБЛЕР Броня.
СТАНБЛЕР Роза.
ФІДЭЛЬМАН Бася.
ФІДЭЛЬМАН Ісак.
ФІДЭЛЬМАН Фроім.
ФІДЭЛЬМАН Яўсей.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Наха Хаймаўна, н. ў 1870.
ФРАДКІНА Хася Беркаўна.
ФРЭЙНКЛАХ Айзік Эфроймавіч, н. ў 1870.
ФРЭЙНКЛАХ Фрыда Хаімаўна, н. ў 1880.
ХАСІН Азрыель Хацкілевіч, н. ў 1927.
ХАСІН Моцік.
ХАСІН Хацкіль.
ХАСІНА Асна.
ХАСІНА Бася.
ХАСІНА Соня.
ХАСІНА Соня Хацкілеўна, н. ў 1923.
ХАСІНА Х'ена.
ХАСІНА Яхна Хацкілеўна, н. ў 1920.
ШАНДАЛАВА Берта Гіляраўна, н. ў 1922.
ШАНДАЛАВА Гіта, н. ў 1897.
ШАНДАЛАВА Сіма Гіляраўна, н. ў 1920.
ШАНДАЛАВА Фрума Львоўна, н. ў 1860.
ШАНДАЛАЎ Сімон Давыдавіч, н. ў 1858.
ШАНДАЛАЎ Гіля, н. ў 1895.
ШУБ Мейла.
ШУБ Рыва.
ЭРЫНБУРГ Самуіл.
ЭРЫНБУРГ Святлана.

ШЧАДРЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ШЧАДРЫН І ІНШЫЯ

Мірныя жыхары, якія былі расстраляны 8—10 сакавіка 1942 г.

АЙЗЕНШТАТ Берл Гіршавіч.
АЙЗЕНШТАТ Гірш Зелікавіч, н. ў 1875.
АЙЗЕНШТАТ Любоў Навумаўна.
АЙЗЕНШТАТ Мая Навумаўна.
АЙЗЕНШТАТ Міхля Навумаўна.
АЙЗЕНШТАТ Муся Навумаўна.
АЙЗЕНШТАТ Навум Львовіч і яго жонка.
АЙЗЕНШТАТ Перле Навумаўна.
АЙЗЕНШТАТ Фаня Лазараўна, н. ў 1888.
АЙЗЕНШТАТ Фейга Гіршавіч.
АЙЗЕНШТАТ Шмулік Навумавіч.
АЛЬШАНСКАЯ Бася Львоўна, н. ў 1901.
АЛЬШАНСКАЯ Блюма.
АЛЬШАНСКАЯ Голда.
АЛЬШАНСКАЯ Зіна Іосіфаўна, н. ў 1934.
АЛЬШАНСКАЯ Іта.
АЛЬШАНСКАЯ Рыва.
АЛЬШАНСКАЯ Эстэр Зімелеўна, н. ў 1872.
АЛЬШАНСКІ Арон, н. ў 1903.
АЛЬШАНСКІ Гендэль, н. ў 1908.
БАС Абрам Львовіч, н. ў 1920, яго жонка і двое дзяцей.
БАС Барыс Львовіч, н. ў 1909.
БАС Дора Залманаўна.
БАС Зяма, н. ў 1912.
БАС Рахіль Львоўна, н. ў 1909.
БАС Роза Барысаўна, н. ў 1882.
БАРЫМАН Барман, н. ў 1914, яго жонка Рахіль і дачка.
БЕЛКІН Яўхім Барысавіч, н. ў 1936.
БЕЛКІНА Гіта Барысаўна, н. ў 1938.
БЕЛКІНА Песя Барысаўна, н. ў 1912.
БЛЯХЕР Ганель Майсееўна, н. ў 1887.
БРУК Арон, н. ў 1896, і яго жонка Песя, н. ў 1895.
БРУК Цалер Аронавіч, н. ў 1936.
БРУК Якаў Аронавіч, н. ў 1938.
ВАЛЬФСОН Танэ, н. ў 1904, яго жонка і трое дзяцей.
ВЕКСЛЕР Гіта, н. ў 1868.
ВЕКСЛЕР Дода, н. ў 1897.
ВЕКСЛЕР Зелік Копельевіч, н. ў 1890, і яго жонка, н. ў 1894.
ВЕКСЛЕР Зяма, н. ў 1923.
ВЕКСЛЕР Ісак Копелевіч, н. ў 1896.
ВЕКСЛЕР Копл, н. ў 1870.
ВЕКСЛЕР Лейба, н. ў 1893.
ВЕКСЛЕР Майсей Рувімавіч, н. ў 1926.
ВЕКСЛЕР Міня, н. ў 1894.
ВЕКСЛЕР Навум Львовіч, н. ў 1907, яго жонка Тэме і двое дзяцей.
ВЕКСЛЕР Рувім Копелевіч, н. ў 1892, і яго маці.
ВЕКСЛЕР Соня, н. ў 1902.
ВЕКСЛЕР Х'ена, н. ў 1895.
ВЕКСЛЕР Эльке, н. ў 1900.
ВЕКСЛЕР Юдэль Зелікавіч, н. ў 1913.
ВЕЛІКІНА Міна, н. ў 1924.
ВЕРТКІН Арон, н. ў 1905, яго жонка Ніхама і двое дзяцей.
ВЕРТКІНА Зельда, н. ў 1903, і двое дзяцей.
ВЕРТКІНА Хана, н. ў 1887.
ВЕТКІН Меер, н. ў 1900.
ВІТКІН Арон, н. ў 1894, і яго жонка, н. ў 1897.
ВІТКІН Віталін, н. ў 1889.
ВІТКІН Міхаіл Аронавіч, н. ў 1918, і двое дзяцей.
ВІТКІНА Броня Юдэлеўна.

ВІТЛІН Меер, н. ў 1887.
ВІТЛІН Міхаіл Мееравіч, н. ў 1916.
ВІХНІН Давід Натанавіч, н. ў 1880, і яго жонка, н. ў 1882.
ГАЛЕРКІН Ісак Ісакавіч, н. ў 1909.
ГАЛКІН Аўрам, н. ў 1880.
ГАЛКІН Берл Аўрамавіч, н. ў 1926.
ГАЛКІНА Бася Аўрамаўна, н. ў 1928.
ГАЛКІНА Гіся Аўрамаўна, н. ў 1925.
ГАЛКІНА Фейга Абрамаўна, н. ў 1890.
ГАЛЬДШТЭЙН Майсей, н. ў 1873, яго жонка, н. ў 1876, і двое ўнукаў.
ГАНДЗМАН Давід Іосіфавіч, н. ў 1990.
ГАНДЗМАН Ейсіф-Гірш, н. ў 1875.
ГАНДЗМАН Нойма Давідавіч, н. ў 1927.
ГАНДЗМАН Цыўе Яўхімаўна, н. ў 1903.
ГАНДЗМАН Шолам Давідавіч, н. ў 1924.
ГАНКІНА Марчэла Евелеўна, н. ў 1882.
ГАНКІНА Соша, н. ў 1922.
ГАНКІНА Элька, н. ў 1894.
ГАРБУЦ Уладзімір і яго жонка.
ГАРОХАЎ Арон, н. ў 1890.
ГАРЭЛІК Арон і яго жонка.
ГАРЭЛІК Аўрам Іосіфавіч і двое дзяцей.
ГАРЭЛІК Барыс, яго жонка і двое дзяцей.
ГАРЭЛІК Брайна Мендэлеўна, н. ў 1924.
ГАРЭЛІК Герц.
ГАРЭЛІК Гецл Лазаравіч.
ГАРЭЛІК Гінда Гіршаўна, н. ў 1887.
ГАРЭЛІК Даша Лазараўна.
ГАРЭЛІК Дора Нісаўна, н. ў 1920.
ГАРЭЛІК Еша.
ГАРЭЛІК Зяма.
ГАРЭЛІК Іосіф і яго жонка.
ГАРЭЛІК Ісак Мотэлевіч, н. ў 1912.
ГАРЭЛІК Ісрол.
ГАРЭЛІК Ішые, яго жонка, сын з жонкай і двое дзяцей.
ГАРЭЛІК Лейба Давідавіч.
ГАРЭЛІК Лейвік Майсеевіч, н. ў 1921.
ГАРЭЛІК Ліба Барысаўна, н. ў 1922.
ГАРЭЛІК Майсей Хаітавіч, н. ў 1913.
ГАРЭЛІК Маня, н. ў 1899.
ГАРЭЛІК Мендэль Моўшавіч, н. ў 1885.
ГАРЭЛІК Міня.
ГАРЭЛІК Міхаіл.
ГАРЭЛІК Муля Хлаўневіч, н. ў 1921.
ГАРЭЛІК Нема і яго жонка.
ГАРЭЛІК Нісон Абрамавіч.
ГАРЭЛІК Нохім Лазаравіч.
ГАРЭЛІК Ноша Майсеевіч, н. ў 1919.
ГАРЭЛІК Песя.
ГАРЭЛІК Піня.
ГАРЭЛІК Рахіль.
ГАРЭЛІК Саза.
ГАРЭЛІК Сара.
ГАРЭЛІК Сейна Ісрольеўна.
ГАРЭЛІК Сендэр.
ГАРЭЛІК Слава.
ГАРЭЛІК Соня Іосіфаўна.
ГАРЭЛІК Сорэ-Фейга Цалераўна, н. ў 1885.
ГАРЭЛІК Стыся Нісаўна, н. ў 1928.
ГАРЭЛІК Фейгул, н. ў 1900.
ГАРЭЛІК Хаіл, н. ў 1919.
ГАРЭЛІК Хаім Майсеевіч, н. ў 1913.
ГАРЭЛІК Хася.
ГАРЭЛІК Хася Барысаўна, н. ў 1927.
ГАРЭЛІК Хая.
ГАРЭЛІК Хлаўне і яго жонка.
ГАРЭЛІК Шолам.
ГАРЭЛІК Янкель, яго жонка і маці.
ГАРЭЛІК Янкель Львовіч і яго двое дзяцей.
ГАРЭЛІК-КОФМАН, н. ў 1897.
ГЕЛЬФАНД Бейле, н. ў 1898.
ГЕЛЬФАНД Блюма Ізраілеўна, н. ў 1912.
ГЕЛЬФАНД Веньямін, яго жонка і дзве дачкі.
ГЕЛЬФАНД Геся Нейахаўна, н. ў 1917.
ГЕЛЬФАНД Дора Нейахаўна, н. ў 1925.
ГЕЛЬФАНД Ехе Мендэлеўна.
ГЕЛЬФАНД Ізраіль Мотэлевіч.
ГЕЛЬФАНД Мордухай Ейханавіч, н. ў 1885, і яго жонка, н. ў 1890.
ГЕЛЬФАНД Мотэль Нейахавіч, н. ў 1910.
ГЕЛЬФАНД Нейах Барысавіч, н. ў 1885.
ГЕЛЬФАНД Нехаме Мордухаўна, н. ў 1890.
ГЕЛЬФАНД Песя Нейахаўна, н. ў 1921.
ГЕЛЬФАНД Сара Мотэлеўна, н. ў 1939.
ГЕЛЬФАНД Сейне Нейахаўна, н. ў 1924.
ГЕЛЬФАНД Фрума Мотэлеўна.
ГЕЛЬФАНД Хася Нісаўна, н. ў 1882.
ГЕРЧЫКАВА Рашэ, н. ў 1884.
ГЕРЧЫКАЎ Залман, н. ў 1882.
ГЛІДЭР Двейра, н. ў 1889.
ГЛІДЭР Мейша, н. ў 1872, і яго жонка, н. ў 1876.
ГЛІДЭР Рувім Майсеевіч, н. ў 1881.
ГЛІДЭР Тайбл Рувімаўна, н. ў 1918, і яе дзіця.
ГОЛАСМАН Зяма, н. ў 1926.
ГОЛАСМАН Фейгл, н. ў 1901.
ГОЛАСМАН Хая, н. ў 1924.
ГОСІН Арон, н. ў 1895.
ГОСІН Янкель Аронавіч, н. ў 1915.
ГРЫНБЕРГ Барыс Іцкавіч, н. ў 1890.
ГРЫНБЕРГ Берка, яго жонка і дачка.
ГРЫНБЕРГ Геня Аронаўна, н. ў 1923, сын і дачка.
ГРЫНБЕРГ Груня, н. ў 1889.
ГРЫНБЕРГ Зельда Нохімаўна, н. ў 1923.

ГРЫНБЕРГ Зельда Эле-Гершаўна, н. ў 1937.
ГРЫНБЕРГ Іона, н. ў 1915.
ГРЫНБЕРГ Копл, н. ў 1930.
ГРЫНБЕРГ Лейба Нохімавіч, н. ў 1931.
ГРЫНБЕРГ Малка Нохімаўна, н. ў 1926.
ГРЫНБЕРГ Мейер, н. ў 1914.
ГРЫНБЕРГ Мейша-Меер, н. ў 1914.
ГРЫНБЕРГ Нохім Нахмонавіч, н. ў 1887, і яго жонка Блюма.
ГРЫНБЕРГ Райне, н. ў 1888.
ГРЫНБЕРГ Рышэ, н. ў 1906.
ГРЫНБЕРГ Рэйза, н. ў 1880.
ГРЫНБЕРГ Сейна Нохімаўна, н. ў 1877.
ГРЫНБЕРГ Сіма Эле-Гіршаўна, н. ў 1932.
ГРЫНБЕРГ Соня Эле-Гіршаўна, н. ў 1930.
ГРЫНБЕРГ Цале, н. ў 1908.
ГРЫНБЕРГ Эле-Гіршаўна, н. ў 1904.
ГРЫНБЕРГ Эстэр, н. ў 1913, і трое дзяцей.
ГРЭСМАН Геня, н. ў 1899.
ГРЭСМАН Неха-Бася, н. ў 1887.
ДЗЕМБУРГ Мая, н. ў 1890, і яго жонка, н. ў 1893.
ДЗІМІХОЎСКІ, н. ў 1892, жонка і яго дачка.
ДУБРОЎСКАЯ Матля Барысаўна, н. ў 1921.
ДУБРОЎСКАЯ Рыва, н. ў 1894.
ДУБРОЎСКАЯ Этэль, н. ў 1910.
ДУБРОЎСКІ Саламон, н. ў 1929.
ДУБРОЎСКІ Ізя, н. ў 1938.
ДУБРОЎСКІ Тэвель, н. ў 1915.
ДЫСКІН Абрам, н. ў 1900.
ДЫСКІН Залман, н. ў 1891.
ДЫСКІН Шыфра, н. ў 1896.
ДЫСКІНА Геня, н. ў 1902.
ЕРЭНБУРГ Алтэр Калманавіч.
ЕРЭНБУРГ Барыс Барысавіч, н. ў 1910.
ЕРЭНБУРГ Берл Лейбавіч, н. ў 1928.
ЕРЭНБУРГ Віця Бенцыянаўна, н. ў 1881.
ЕРЭНБУРГ Зіна Ісераўна і яе сын.
ЕРЭНБУРГ Зяма Калманавіч.
ЕРЭНБУРГ Ісер і яго жонка.
ЕРЭНБУРГ Калман, н. ў 1895.
ЕРЭНБУРГ Лейба Шаевіч, н. ў 1888, і яго жонка Фейга.
ЕРЭНБУРГ Мотэль Лейбавіч, н. ў 1926.
ЕРЭНБУРГ Мотэль Нохімавіч, н. ў 1932.
ЕРЭНБУРГ Нохім, н. ў 1909, і яго жонка, н. ў 1912.
ЕРЭНБУРГ Нохім, н. ў 1900, і яго жонка Рыва, н. ў 1901.
ЕРЭНБУРГ Піня і яго жонка.
ЕРЭНБУРГ Рахіль Нохімаўна, н. ў 1925.
ЕРЭНБУРГ Сара Лейбаўна, н. ў 1924.
ЕРЭНБУРГ Сара Нохімаўна, н. ў 1929.
ЕРЭНБУРГ Сошэ Лейбаўна, н. ў 1923.
ЕРЭНБУРГ Хаім Нохімавіч, н. ў 1940.
ЕРЭНБУРГ Хая-Сорэ, н. ў 1897.
ЕРЭНБУРГ Шая Нохімавіч, н. ў 1925.
ЕРЭНБУРГ Шая Нохімавіч, н. ў 1937.
ЕРЭНБУРГ Эстэр Нохімавіч, н. ў 1934.
ЗЕЛЬДЗІН Іда Мейлахаўна, н. ў 1923.
ЗЕЛЬДЗІН Майсей Мейлахавіч, н. ў 1925.
ЗЕЛЬДЗІН Мейлах, н. ў 1885, і яго жонка Хая.
ЗЕЛЬДЗІНА Рыва Мейлахаўна, н. ў 1927.
ЗЕЛЬДЗІНА Сіма Мейлахаўна, н. ў 1930.
ЗЕЛЬДЗІНА Хася Майсееўна, н. ў 1898.
ЗЕЛЬЦЭР Майсей Гіршавіч, н. ў 1903.
ЗЕЛЬЦЭР Мейлах Барысавіч, н. ў 1885.
ЗУБЕР Ася Мендэлеўна, н. ў 1928.
ЗУБЕР Лейба Мендэлевіч, н. ў 1905, і яго жонка Лія, н. ў 1903.
ЗУБЕР Мейер Мендэлеўна, н. ў 1932.
ЗУБЕР Мендэль Мендэлевіч, н. ў 1939.
ЗУБЕР Песя, н. ў 1870.
ЗЭЛІКМАН Ары, н. ў 1891, і яго жонка, н. ў 1892.
ЗЭЛІКМАН Аўрам Майсеевіч, н. ў 1929.
ЗЭЛІКМАН Аўрам-Іосіф, н. ў 1885.
ЗЭЛІКМАН Берл, н. ў 1931.
ЗЭЛІКМАН Гіршл, н. ў 1880.
ЗЭЛІКМАН Голда Майсееўна, н. ў 1933.
ЗЭЛІКМАН Дайха, н. ў 1928.
ЗЭЛІКМАН Двейра, н. ў 1888.
ЗЭЛІКМАН Двейра Саламонаўна, н. ў 1910.
ЗЭЛІКМАН Зіна Абрамаўна, н. ў 1913.
ЗЭЛІКМАН Зіна Аўрамаўна, н. ў 1915, і яе муж.
ЗЭЛІКМАН Іда Аронаўна, н. ў 1912, яе муж і двое дзяцей.
ЗЭЛІКМАН Іосель, н. ў 1892.
ЗЭЛІКМАН Іосіф Давідавіч, н. ў 1923.
ЗЭЛІКМАН Ківа Аронавіч, н. ў 1923.
ЗЭЛІКМАН Лейба Гіршавіч, н. ў 1897.
ЗЭЛІКМАН Меер Майсеевіч, н. ў 1931.
ЗЭЛІКМАН Мендэль, н. ў 1914.
ЗЭЛІКМАН Мендэль Хаімавіч, н. ў 1911.
ЗЭЛІКМАН Міня Майсееўна, н. ў 1918.
ЗЭЛІКМАН Мойша, н. ў 1886, і яго жонка.
ЗЭЛІКМАН Мотэль Майсеевіч, н. ў 1925.
ЗЭЛІКМАН Навум, н. ў 1937.
ЗЭЛІКМАН Навум Львовіч, н. ў 1939.
ЗЭЛІКМАН Ода, н. ў 1881, яго жонка, н. ў 1884, і дзесяць дзяцей.
ЗЭЛІКМАН Перле Майсееўна, н. ў 1927.
ЗЭЛІКМАН Рася, н. ў 1884.
ЗЭЛІКМАН Рахіль Майсееўна, н. ў 1920.
ЗЭЛІКМАН Роша Іоселеўна, н. ў 1884.
ЗЭЛІКМАН Рыва.

ЗЭЛІКМАН Рыгор Львовіч, н. ў 1935.
ЗЭЛІКМАН Сёма Гіршавіч, н. ў 1930.
ЗЭЛІКМАН Соня Юдкаўна, н. ў 1921.
ЗЭЛІКМАН Сося.
ЗЭЛІКМАН Уладзімір Львовіч, н. ў 1939.
ЗЭЛІКМАН Фале Мошавіч, н. ў 1934.
ЗЭЛІКМАН Фіма, н. ў 1935.
ЗЭЛІКМАН Фрума, н. ў 1886.
ЗЭЛІКМАН Хаім, н. ў 1885, і яго жонка, н. ў 1887.
ЗЭЛІКМАН Хане Залманаўна, н. ў 1883.
ЗЭЛІКМАН Хане-Лея, н. ў 1908.
ЗЭЛІКМАН Хая, н. ў 1932.
ЗЭЛІКМАН Хая-Бейла, н. ў 1912.
ЗЭЛІКМАН Шмерл Сэндаравіч, н. ў 1878, яго жонка і дачка.
ЗЭЛІКМАН Эстэр Гіршаўна, н. ў 1913, і яе дзве дачкі.
ЗЭЛІКМАН Юда-Лейзер Зэлікавіч, н. ў 1881.
ЗЭЛІКМАН Янкель Хаімавіч, н. ў 1914.
ІЗРАІЛЬ Майсей Гіршавіч, н. ў 1899.
КАВАЛЕРЧЫК Берл Міхайлавіч.
КАВАЛЕРЧЫК Борах Міхайлавіч.
КАВАЛЕРЧЫК Ітэ Міхайлаўна.
КАВАЛЕРЧЫК Міхель і яго жонка Блюма.
КАВАЛЕРЧЫК Фаня Міхайлаўна.
КАВАЛЕРЧЫК Хаве Міхайлаўна.
КАГАН Вольга Гілераўна, н. ў 1938.
КАГАН Гане Юдаўна, н. ў 1905.
КАГАН Гілер Саламонавіч, н. ў 1903.
КАГАН Ліза Гілераўна, н. ў 1938.
КАГАН Сёма Гілеравіч, н. ў 1929.
КАГАН Фіма Гілеравіч, 1933.
КАЗАКОВА Двойра Аўрамаўна, н. ў 1898, і яе муж Юдэль.
КАЗАКОВА Фейга, н. ў 1876.
КАЗАКОЎ Берл Юдэлевіч, н. ў 1927.
КАЗАКОЎ Ківа Юдэлевіч, н. ў 1923.
КАЗАКОЎ Лейба Юдэлевіч, н. ў 1925.
КАМІСАРЧЫК Гірша.
КАМІСАРЧЫК Іга.
КАМІСАРЧЫК Нохім.
КАМІСАРЧЫК Рая.
КАМІСАРЧЫК Хася.
КАМСКАЯ Цыля Міхайлаўна, н. ў 1935.
КАНУТКІН Шлойме, яго жонка і чацвёра дзяцей.
КАПЕЛЬЯН Аўрам Мордухавіч, н. ў 1860, і яго жонка, н. ў 1865.
КАПЕЛЬЯН Ісер Аўрамавіч, н. ў 1900, і яго жонка, н. ў 1903.
КАПЕЛЬЯН Калман Аўрамавіч, н. ў 1929.
КАПЕЛЬЯН Хая Аўрамаўна, н. ў 1924.
КАПЛАН Малка Пейсахаўна, н. ў 1910, і двое дзяцей.
КАРАСІК Барыс Бенцыянавіч, н. ў 1928.
КАРАСІК Геня Мендэлеўна, н. ў 1894.
КАШТАН Рашэ, н. ў 1889.
КІМАІН Двося Зімелеўна, н. ў 1893.
КІМЕЛЬМАН Бейлька Зімелеўна, н. ў 1926.
КІМЕЛЬМАН Бенцыян Эльевіч, н. ў 1889.
КІМЕЛЬМАН Зімель Эльевіч, н. ў 1892, і яго жонка Малка.
КІМЕЛЬМАН Ішарэ, н. ў 1885.
КІМЕЛЬМАН Нотэ Бенцыянавіч, н. ў 1925.
КІМЕЛЬМАН Хая-Шыфра, н. ў 1887.
КІМЕЛЬМАН Эле Міхайлавіч, н. ў 1871, і яго жонка, н. ў 1875.
КУРЦЭР Алтэр.
КУРЦЭР Бенца, н. ў 1889.
КУРЦЭР Ісак Эльевіч, н. ў 1927.
КУРЦЭР Мейша-Хаім, яго жонка Бася і чацвёра дзяцей.
КУРЦЭР Мотэ-Хаім, яго жонка Сара і дзеці Блюма, Мотэ.
КУРЦЭР Сара Эльеўна, н. ў 1915.
КУРЦЭР Соня Нохімаўна.
КУРЦЭР Тайба Майсееўна.
КУРЦЭР Фейга, н. ў 1891, і трое дзяцей.
КУРЦЭР Хая Ізраілеўна, н. ў 1888.
ЛАПІДУС Міня Майсееўна, н. ў 1884.
ЛІСАВЕЦ Зэльда.
ЛІСАВЕЦ Муля.
ЛІСАВЕЦ Хая і яе сястра.
ЛЯХАВІЦКАЯ Сара Хаімаўна.
ЛЯХАВІЦКІ Мойша Хаімавіч.
ЛЯХАВІЦКІ Хаім і яго жонка.
МАДОРСКАЯ Геня Фальеўна, н. ў 1891, і яе ўнучка.
МАДОРСКАЯ Стыся.
МАДОРСКАЯ Фала.
МАДОРСКАЯ Фаня.
МАДОРСКАЯ Фейгул.
МАДОРСКАЯ Этэль.
МАДОРСКІ Іша Эльевіч, н. ў 1926.
МАДОРСКІ Лейба Нохімавіч, н. ў 1920, і яго жонка.
МАДОРСКІ Нохім, н. ў 1898, і яго жонка, н. ў 1902.
МАДОРСКІ Фіма.
МАДОРСКІ Эле Янкелевіч, н. ў 1892, і яго жонка Бася.
МАЛЫЙ Ісер Ісакавіч, н. ў 1894, яго жонка Бася і трое дзяцей.
МАРГОЛІН Абрам Ізраілевіч, н. ў 1882.
МАРГОЛІН Ірма Ізраілевіч, н. ў 1880, і яго жонка Роза, н. ў 1885.
МАРГОЛІН Лейба Ізраілевіч, н. ў 1884, і яго дачка.
МАРГОЛІН Лейба Ірмавіч, н. ў 1912.

МАРГОЛІН Навум Ірмавіч, н. ў 1902.

МАХЦІН, н. ў 1926.

МАХЦІН, н. ў 1928.

МАХЦІН, н. ў 1930.

МАХЦІН, н. ў 1934.

МАХЦІН Арон, н. ў 1892, і яго жонка, н. ў 1896.

МАХЦІН Майсей, н. ў 1906, і двое дзяцей.

НІСЕНБАЎМ Ісак і яго жонка Рашэ.

НІСЕНБАЎМ Мойша, яго жонка Фейга і двое дзяцей.

НІСЕНБАЎМ Нёма Ісакавіч.

НОРКІНА Сошэ.

НОРКІНА Хана-Элька.

НОРМАН Ісак Ісакавіч.

ОКУНЬ, н. ў 1913.

ОКУНЬ Алтэр, н. ў 1909.

ОКУНЬ Аўрам, н. ў 1920.

ОКУНЬ Барыс Зушавіч, н. ў 1921, яго жонка і дзіця.

ОКУНЬ Бейля Ізраілеўна, н. ў 1922.

ОКУНЬ Берл Шаевіч, н. ў 1915.

ОКУНЬ Блюме, н. ў 1918.

ОКУНЬ Бушэ, н. ў 1880.

ОКУНЬ Гіра, н. ў 1900.

ОКУНЬ Ейжа, н. ў 1896.

ОКУНЬ Зушэ, н. ў 1901, і яго жонка, н. ў 1903.

ОКУНЬ Ізраіль Цолеравіч, н. ў 1889.

ОКУНЬ Ішэ, н. ў 1924.

ОКУНЬ Лейзер, н. ў 1914.

ОКУНЬ Малка, н. ў 1890.

ОКУНЬ Нохім, н. ў 1900, і яго жонка.

ОКУНЬ Паліна, н. ў 1892.

ОКУНЬ Сошэ, н. ў 1870.

ОКУНЬ Фейга, н. ў 1891.

ОКУНЬ Хаім Ейжавіч, н. ў 1919.

ОКУНЬ Шая, н. ў 1890.

ОКУНЬ Эстэр, н. ў 1922.

ОРКІН Ісак Пейсахавіч, н. ў 1904, і двое дзяцей.

ОРКІНА Маргола, н. ў 1892.

ОРКІНА Сара, н. ў 1907.

ПАРТОН Аўрам Барысавіч, н. ў 1925.

ПАРТОН Барыс Віхонавіч, н. ў 1900, і яго жонка, н. ў 1903.

ПАРТОН Борах Барысавіч, н. ў 1922.

ПАРТОН Гіта Барысаўна, н. ў 1935.

ПЕРСКАЯ Сара Мордухаўна, н. ў 1928.

ПЕРСКАЯ Тэма Мееравна, н. ў 1914.

ПЕРСКІ, н. ў 1934.

ПЕРСКІ, н. ў 1936.

ПЕРСКІ, н. ў 1939.

ПЕРСКІ Іосіф Мордухавіч, н. ў 1921.

ПЕРСКІ Мордух Тэлевіч, н. ў 1895, і яго жонка Кейля.

ПЕЎЗНЕР Залман, н. ў 1888, і яго жонка.

ПІНСКАЯ Хася Евелеўна, н. ў 1866.

ПІНТАЎ Пейсах, н. ў 1896, яго жонка Хася, тры дачкі і сын.

РАСКІН Лейзер Давідавіч, н. ў 1886.

РАСКІН Шолам Лазаравіч, н. ў 1909, і яго жонка, н. ў 1909.

РАСКІНА Зэльда Шаеўна, н. ў 1888.

РАСКІНА Сара Лазараўна, н. ў 1927.

РАСКІНА Сара Шоламаўна, н. ў 1939.

РАСКІНА Сейна, н. ў 1913, яе муж і трое дзяцей.

РАСКІНА Хася Шоламаўна, н. ў 1931.

РАСКІНА Этэль Шоламаўна, н. ў 1935.

РОЗІНА, н. ў 1935.

РОЗІНА Шыфра, н. ў 1909.

РУБІНШТЭЙН Бенца, н. ў 1909, і яго жонка, н. ў 1911.

РУБІНШТЭЙН Додзік Бенцыянавіч, н. ў 1934.

РУБІНШТЭЙН Ірухім Бенцыянавіч, н. ў 1931.

РУБІНШТЭЙН Сіма, н. ў 1917.

РЫЎКІН Барыс Шлоймавіч, н. ў 1920.

РЫЎКІН Веля Шлоймавіч, н. ў 1925.

РЫЎКІН Шлойм, н. ў 1888, яго жонка, н. ў 1895, і пяцёра дзяцей.

РЫЎКІН Янкель, н. ў 1893, і яго жонка, н. ў 1895.

САЛАВЕЙЧЫК Аўрам, н. ў 1880, і яго жонка, н. ў 1882.

СКІТУНОЎ Мікалай Еўдакімавіч, н. ў 1904.

СКОРМАН, н. ў 1881, і яго жонка, н. ў 1884.

СКОРМАН Рыва, н. ў 1917.

ТАРШЫЦ Навум Шоламавіч, н. ў 1912, і яго брат, н. ў 1909.

ТАРШЫЦ Шолам-Меер, н. ў 1892.

ТРЫГУБАЎ Хемя, н. ў 1895, і яго жонка, н. ў 1898.

ФАЙНШМІД Лейзер Залманавіч, н. ў 1879.

ФАЙНШМІД Міра, н. ў 1886.

ФАЙНШТЭЙН Генах, н. ў 1926.

ФАЙНШТЭЙН Гецл і яго маці, н. ў 1899.

ФАЙНШТЭЙН Кейля, н. ў 1929.

ФАЙНШТЭЙН Цыпа, н. ў 1907.

ФІНКЕЛЬШТЭЙН Маша, н. ў 1923.

ФІНКЕЛЬШТЭЙН Сіма, н. ў 1903.

ФІНКЕЛЬШТЭЙН Цыпа, н. ў 1907.

ФІНКЕЛЬШТЭЙН Юдэль, н. ў 1916.

ФРАДКІН Берл Самуілавіч, н. ў 1925.

ФРАДКІН Лейба Самуілавіч, н. ў 1928.

ФРАДКІН Самуіл, н. ў 1890, і яго жонка Тайбл, н. ў 1891.

ФРАДКІН Фроім Самуілавіч, н. ў 1918.
ФРАДКІНА Песя Самуілаўна, н. ў 1930.
ФРАДКІНА Рая Самуілаўна, н. ў 1920.
ФРЫДЛЯНД, н. ў 1933.
ФРЫДЛЯНД Ерухім Шымянавіч, н. ў 1930.
ФРЫДЛЯНД Міня Шыманаўна, н. ў 1923.
ФРЫДЛЯНД Хайка Шыманаўна, н. ў 1926.
ФРЫДЛЯНД Шымен, н. ў 1901, і яго жонка Эльке, н. ў 1902.
ХАЙКМАН Ізя Мотэлевіч, н. ў 1916.
ХАЙКМАН Моця, н. ў 1889, і яго жонка, н. ў 1893.
ХАРХУРЫН Абрам Майсеевіч, н. ў 1938.
ХАРХУРЫН Давід Майсеевіч, н. ў 1936.
ХАРХУРЫН Майсей, н. ў 1909.
ХАРХУРЫНА Ліза, н. ў 1911.
ХАЎКІН, н. ў 1931.
ХАЎКІН, н. ў 1928.
ХАЎКІНА, н. ў 1905.
ХАЎКІНА Злата, н. ў 1906.
ХАЎКІНА Міхля, н. ў 1911.
ХЕЙФЕЦ Аркадзь, н. ў 1890, і яго жонка Соня, н. ў 1893.
ЦЫРЛІН, н. ў 1935.
ЦЫРЛІН Давід Лейбавіч, н. ў 1918.
ЦЫРЛІН Ізя Лейбавіч, н. ў 1914.
ЦЫРЛІН Лейба, н. ў 1884.
ЦЫРЛІН Меер Лейбавіч, н. ў 1916.
ЦЫРЛІН Шолам, н. ў 1878.
ЦЫРЛІНА Фрада Лейбаўна, н. ў 1935.
ЦЫРЛІНА Хая, н. ў 1880.
ЦЫЎКІН Ілья Сямёнавіч, н. ў 1926.
ЦЫЎКІН Рыгор Сямёнавіч, н. ў 1928.
ЦЫЎКІН Сямён Львовіч, н. ў 1888.
ЦЫЎКІНА Злата Майсееўна, н. ў 1890.
ЦЭЙТЛІН Барыс Шмулевіч, н. ў 1912.
ЦЭЙТЛІН Шлойм Шмулевіч, н. ў 1910.
ЦЭЙТЛІН Шмул, н. ў 1888, і яго жонка Бейля, н. ў 1890.
ШАДУР Гірша Мотэлевіч, н. ў 1917.
ШАДУР Зяма Мотэлевіч, н. ў 1911.
ШАДУР Касрыэл, н. ў 1870, і яго жонка Бейля, н. ў 1870.
ШАДУР Моця, н. ў 1886, і яго жонка, н. ў 1887.
ШАНДАРОВІЧ Ехе, н. ў 1882.
ШАНДАРОВІЧ Двейра, н. ў 1908.
ШАНДАРОВІЧ Кейля, н. ў 1905.
ШАНДАРОВІЧ Нохім Абрамавіч, н. ў 1880.
ШАНДАРОВІЧ Хаім, н. ў 1920.
ШАПІРА Песя, н. ў 1868.
ШТЭЙНБУК Самсон, н. ў 1918.
ШТЭЙНБУК Фейгл, н. ў 1905.
ШТЭЙНБУК Хая Алтэраўна, н. ў 1925.
ШТЭЙНБУК Эстэр, н. ў 1870.
ШТЭЙНБУК Якаў, н. ў 1904.
ШУБ Бася Самуілаўна, н. ў 1913.
ШУБ Лія, н. ў 1899.
ШУБ Самуіл, н. ў 1897.
ШУБ Хана, н. ў 1900.
ЭЛЬ Гершын, н. ў 1900, і яго жонка, н. ў 1900, і трое дзяцей.
ЭЛЬ Іосіф, н. ў 1900, яго жонка Моця.
ЭЛЬ Фаня Іосіфаўна.
ЭЛЬКІН Бенца, н. ў 1895.
ЭЛЬКІН Іосіф, н. ў 1917.
ЭЛЬКІН Рахіль, н. ў 1915.
ЭЛЬКІНА, н. ў 1925.
ЭПШТЭЙН Геша, н. ў 1880.
ЭПШТЭЙН Ізя-Нохім, н. ў 1875.
ЭПШТЭЙН Самуіл Іцкавіч, н. ў 1891.
ЭСТРЫН Давід, н. ў 1927.
ЭСТРЫНА Бася, н. ў 1898.
ЭСТРЫНА Лія, н. ў 1939.
ЭСТРЫНА Міня, н. ў 1930.

Мірныя жыхары, якія загінулі ў Азарыцкіх лагерах смерці ў сакавіку 1944 г.

ГОРАД ЖЛОБІН

ВЯРБІЦКАЯ Ліля, н. ў 1939.
ВЯРБІЦКІ Эдуард, н. ў 1941.
ГАПОНАВА Вера Фёдараўна, н. ў 1936.
ГЛУЦКІ Іван, н. ў 1862.
КАЎПАЕЎ Арсен Іванавіч, н. ў 1885.
КАЎПАЕЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1879.
ЛАВЕЦКІ Сяргей Якаўлевіч, н. ў 1879.
ЛІПСКАЯ Леакадзія Лявонаўна, н. ў 1880.
ЛІПСКІ Браніслаў Вітальевіч, н. ў 1875.
ЛЯХОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. ў 1940.
МАЛЯЎКА Валянціна Уладзіміраўна, н. ў 1940.
МАЛЯЎКА Ірына Уладзіміраўна, н. ў 1937.
МАЛЯЎКА Кацярына Уладзіміраўна, н. ў 1937.
МАРОЗАВА Агафія Іванаўна, н. ў 1867.
МУРАШКІНА Серафіма Ягораўна і яе дачка Галя.
ПУЦЭНІЧ Ілья Мікітавіч, н. ў 1902.
РУТКОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1940.
СКАРАБАГАТАЯ Валянціна С., н. ў 1928.
ХАЦЬКО Валерый Пятровіч, н. ў 1937.
ХАЦЬКО Людміла Пятроўна, н. ў 1936.
ХАЦЬКО Рая Пятроўна, н. ў 1941.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАТОН

РАГАЎЦОВА Марыя Сілаўна, н. ў 1904.

ВЁСКА ПРАСКУРНІ

КІЗЕЕВА Настасся Пятроўна, н. ў 1878.

ДАБРАГОШЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МОРМАЛЬ

МЯДЗВЕДЗЕВА Надзея Лявонаўна, н. ў 1937.

КАРОТКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАРОТКАВІЧЫ

ЕРАШЭВІЧ Мікалай Рыгоравіч.
ЛАЗАРАВА Таццяна Іванаўна, н. ў 1936.
ЛОГВІНАВА Варвара Апанасаўна, н. ў 1907.

ЛУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛІЦА

ЗАЙЦАЎ Віктар.
ЗАЙЦАЎ Мікалай.
ЗАХАРЧАНКА Таццяна Мікітаўна і яе сын Міша.
ІГНАТАЎ Васіль Цімафеевіч, н. ў 1913.

ВЁСКА ЧЫРВОНЫ РОГ (не існуе)

СЁМЧЫНА Таццяна Фёдараўна, н. ў 1890.

МАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЧОРНАЯ ВІРНЯ

ГІРЫЛОВІЧ Люба Паўлаўна, н. ў 1941.
МУРАШКІНА Валянціна.

МАЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ПРЫДАРОЖЖА (не існуе)

ПЛЯВАКА Пелагея Емяльянаўна.
СЫРЫЦА Люба Мікалаеўна.
СЫРЫЦА Мікалай Мікалаевіч.

САЛОНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРОЎ

КУРЧЫШЫН Пракоп Ігнатавіч, н. ў 1883.
МІНЯНКОЎ Пётр Дзямідавіч, н. ў 1926.
ШАБЕКА Антоля Фёдараўна, н. ў 1927.

ВЁСКА НІВЫ

ГУЗАЎ Сямён Аляксандравіч, н. ў 1908.
ЗАРЭЦКІ Міхаіл Трафімавіч, н. ў 1928.
КІВАДЛА Тамара Макараўна, н. ў 1942.
КІВАДЛА Уладзімір Маркавіч, н. ў 1939.
МАЛАШКОВА Надзея Ігнатаўна, н. ў 1942.
ПЯКУРЫН Аляксандр Апанасавіч, н. ў 1925.

Н.В.Шыбінская.

ПЯКУРЫН Цімафей Аляксандравіч, н. ў 1921.
ТАТАРЫНАВА Марыя Аляксандраўна, н. ў 1938.
ЧЫКІЛЁЎ Максім Пятровіч, н. ў 1928.
ШАБЕКА Тамара Міхайлаўна, н. ў 1939.

ВЁСКА САЛАНОЕ

ВІШНЕЎСКІ Рыгор Фёдаравіч, н. ў 1870.
ШЫБІНСКАЯ Нэлі Васілеўна, н. ў 1940.

СТАРАРУДНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЛЫБАЎКА

АЛЯКСЕЕВА Макрына.
АЛЯКСЕЕЎ Уладзімір.
ВАРАНКОВА Фрося.
ДЗЕМІДЗЕНКА Васіль Рыгоравіч, н. ў 1941.
ДЗЯМКОЎ Кірыла.
ДЗЯМКОЎ Мікалай Кірылавіч.
МІРАНЦОЎ Сяргей Сцяпанавіч, н. ў 1939.
МІРАНЦОЎ Эдуард Сцяпанавіч, н. ў 1940.
СМОЛЬСКАЯ Ала Іванаўна, н. ў 1940.
СМОЛЬСКАЯ Зінаіда Іванаўна, н. ў 1936.

ЧЫРВОНАБЯРЭЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗМЯЁЎКА

ЧАЙКОЎСКІ Дзмітрый Аляксандравіч, н. ў 1936.
ЧАЙКОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. ў 1940.

ВЁСКА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ

СТРАЦЭЎСКАЯ Людміла Уладзіміраўна, н. ў 1940.

ШЧАДРЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА САЛОЦІН

АСТАШОЎ Сямён Сямёнавіч.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Раны вайны

За перыяд Вялікай Айчыннай вайны народная гаспадарка Жлобінскага раёна (у даваенных межах) і яе асобна ўзятыя галіны панеслі вялікія страты. Так, былі знішчаны гасцініца, Дом калгасніка, 51 дом, які належыў гаркамунгасу, 2800 прыватных дамоў у горадзе і 3077 у вёсцы.

Да вайны ў раёне дзейнічалі Луцкі тарфяны, Пірэвіцкі спіртавы, Чырвонабярэжскі варэневарачны і крухмальны, смалакурнашкіпінарны і 3 масларобныя заводы, птушка- і хлебакамбінаты, 2 механічныя млыны ў Жлобіне і 3 нафтавыя млыны ў вёсках, некалькі арцеляў. Прамысловы сектар быў разбураны на 97,3%, разбураны і знішчаны 2 лесапільныя, цагельны і завод безалкагольных напіткаў, млынпрам — і птушкакамбінаты, 2 металаапрацоўчыя, швейныя і абутковыя майстэрні, 2 электрастанцыі, 2 паравозныя дэпо (Паўночнае і Паўднёвае), масла- і хлебазаводы, чыгуначная станцыя, вагонарамонтнае дэпо, 315 буйных і сярэдніх тэхнічна-службовых будынкаў, культурна-асветныя і ўстановы аховы здароўя, 5 сярэдніх школ. Гарадскія прамысловыя прадпрыемствы і жыллёвакамунальны фонд быў знішчаны на 80—90%.

Вялікія страты нанесены сельскай гаспадарцы. Акупанты знішчылі 5 машынна-трактарных станцый (Жлобінскую, Хальчанскую, Каменскую, Папаратнянскую і Шчадрынскую), забралі станкі і абсталяванне, інвентар, жывёлу, птушку. Потым чарга дайшла да жывёлы, якая знаходзілася ва ўласнасці ў насельніцтва.

Практычна нічога не засталося ад 60 клубаў, 2 гарадскіх кінатэатраў, сельгастэхнікума, 10 сярэдніх, 9 няпоўных сярэдніх і 41 пачатковай школ.

Паменшылася колькасць насельніцтва. Калі ў 1941 г. ў вёсках жылі 36 715 чалавек, то пасля вайны — 26 989 чалавек. Скараціліся пасяўныя плошчы, не хапала цягла. На пачатак вайны ў калгасах знаходзіўся 4591 конь, а ў 1945 г. — 1823, уключаючы маладняк, племянных коней і пастаўкі для арміі. У перыяд вайны з 13 025 галоў буйной рагатай жывёлы 12 306 галоў было знішчана ці ўгнана. У 1945 г. калгасы мелі ў наяўнасці толькі 1312 галоў рагатай жывёлы. Сума страт калгасаў за перыяд акупацыі склала 438 473,2 тыс. руб., а насельніцтва сельскай мясцовасці 1 323 529,7 тыс. руб.

Паводле падлікаў Надзвычайных камісій па расследаванню злачынстваў нямецка-фа-

Праваслаўная царква ў Жлобіне, якая была знішчана ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

шысцкіх акупантаў, усяго за перыяд акупацыі матэрыяльныя страты па Жлобінскім раёне склалі 2 243 753 700 руб., па Стрэшынскім — 1 764 921 110 руб. А калі дабавіць суму страт па Шчадрынскім сельсавеце былога Парыцкага раёна, то ліхаімцы аднялі ў насельніцтва горада і раёна (у сучасных межах) матэрыяльных каштоўнасцей на суму амаль 4,5 млрд. руб. (у цэнах таго часу).

М.А.Алейнікава.

Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі

У снежні 1943 г. войскі Беларускага фронту вызвалілі частку задняпроўскай зоны Жлобінскага раёна: Пірэвіцкі, Старарудняскі і Чацвярнянскі сельсаветы. Рубеж нашых войск пралёг па лініі вёсак: Калыбаўка, Чорная Вірня, Майскае.

28 месяцаў цягнулася акупацыя задняпроўя, якая прынесла гора і пакуты. Загінулі тысячы жыхароў. Фашысты вывезлі ў Германію хатнюю жывёлу, знішчылі гаспадарчы інвентар і грамадскія пабудовы. Голад і галеча стукаліся ў дзверы жылля, якое засталося. Абарваныя дзеці таўкліся каля салдацкіх кухань. Старыя і жанчыны разбіралі разваліны былога жылля, выбіраючы ўцалелыя прадметы гаспадарчага ўжытку. Па рашэнню ЦК КП(б)Б у раёне былі пакінуты і накіраваны на савецкую, партыйную і гаспадарчую работу некалькі дзесяткаў мясцовых актывістаў з партызан і падпольшчыкаў. Раённую партыйную арганізацыю ўзначаліў былы сакратар падпольнага райкома партыі А.І.Крышнёў. Г.В.Злынаў (былы камісар партызанскай брыгады «Жалязняк») стаў другім сакратаром райкома партыі. Камандзір гэтай брыгады В.І.Шаруда быў прызначаны старшынёй райвыканкома. Раённыя арганізацыі часова размясціліся ў в. Пірэвічы, іншых населеных пунктах. Але яшчэ 7 месяцаў заставалася да поўнага вызвалення раёна.

Камсамольскую арганізацыю раёна ўзначаліла Вера Пятроўна Махнач. Другім сакратаром райкома ЛКСМБ стаў Павел Скварчэўскі.

Усе цяжкасці аднаўлення спаленай, разбуранай і разрабаванай грамадскай і асабістай гаспадаркі ляглі на плечы жанчын, старых і дзяцей, перажыўшых акупацыю. Гэта яны — галодныя, пазбаўленыя жылля і адпачынку, засынаючы на будоўлі, сенакосе і ў баразне, пасылалі фронту апошні хлеб, мяса, малако, свята выконваючы запаведзь ваеннага часу: «Усё для фронта, усё для перамогі!»

Ужо ў сакавіку 1944 г. былі адноўлены калгасы імя Леніна, «Пралетарый», «16 год РСЧА», «Першамайскі», імя Будзённага, «Колас» Пірэвіцкага сельсавета, імя Кірава, «Чырвоная Рудзенка» Старарудняскага сельсавета, імя Сталіна, «VII з'езд Саветаў», «Камінтэрн» Чацвярнянскага сельсавета. Садзейнічала аднаўленню грамадскіх гаспадарак зарэчнай часткі раёна прынятае выканаўчым камітэтам 26.12.1943 г. на першым пасляваенным пасяджэнні рашэнне «Аб вяртанні грамадскай маёмасці калгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў, расцягнутага і ўзятага на захоўванне мясцовымі жыхарамі». Гэта значна ўмацавала матэрыяльную базу грамадскіх гаспадарак, што дазволіла своечасова правесці веснавую сяўбу.

Яшчэ вакол грымела вайна, але людзі верылі ў перамогу і вырашалі зусім мірныя пытанні. Так, 9.2.1944 г. на пасяджэнні райвыканкома было вырашана пытанне аб адкрыцці дзіцячага дома ў в. Пірэвічы.

У першы месяц пасля вызвалення ў раёне былі адноўлены і дзейнічалі 4 прамысловыя прадпрыемствы. Дала ток электрастанцыя, змантаваная на базе торфапрадпрыемства «Лукскае», далі сваю прадукцыю спіртзавод і млын. Прадукцыя адноўленых прадпрыемстваў ішла не толькі на патрэбы народнай гаспадаркі, але і на патрэбы фронту. Воінскім часцям накіроўваліся шпалы, тэлеграфныя слупы, піламатэрыял, мука, мяса, малочныя прадукты. Жыхары раёна збіралі грошы на будаўніцтва самалёта. Жлобін быў яшчэ пад немцамі, калі Міхаіл Міхайлавіч Сушынскі быў прызначаны дырэктарам будучага хлебазавода. Да вызвалення Жлобіна пяклі хлеб у вёсках Пірэвічы і Калыбаўка. Тэхналогію выкарыстоўвалі лясной хлебапякарні партызанскай брыгады «Жалязняк». І вось доўгачаканы свой хлеб (хто жыў у той час, той памятае, як гэта было важна) з'явіўся ў горадзе. У першы ж дзень у прыстасаваным памяшканні, у наспех зробленых печах за 3

разы выпеклі 3 т хлеба. Памятаю, успамінае М.М.Сушынскі, што першы хлеб я панёс свайму былому камісару брыгады, які працаваў сакратаром РК КП(б)Б Г.В.Злынаву. І той, пабачыўшы хлеб, не вытрымаў, заплакаў. З часам слава аб жлобінскім хлебе дайшла да Мінска. Штодзённа частку хлеба адпраўлялі ў Мінск. Чатыры гады выпякалі хлеб па спрошчанай тэхналогіі, якая была палепшана толькі ў 1948 г. з пускам новага хлебазавода, на якім 31 год (да выхаду на пенсію) працаваў дырэктарам М.М.Сушынскі.

Ураджай зерневых у 1944 г. не перавышаў 7 ц з га. На ўборцы панавала ручная праца. Асноўным прыстасаваннем з'яўляўся серп. На падбор каласкоў выходзілі старыя і дзеці.

Пачаліся лесанарыхтоўкі. Больш паловы насельніцтва раёна не мела даху над галавой, а лес у той час з'яўляўся асноўным будаўнічым матэрыялам. У калгасах былі створаны брыгады лесарубаў.

Краіна Саветаў усебакова дапамагала Беларусі, якая пакутавала ў гады вайны. На будаўніцтва жылля і абзавядзенне гаспадаркай для насельніцтва горада і сяла былі выдзелены грашовыя пазыкі на 500 тыс. руб., 50 тыс. $м^3$ лесу, аказвалася дапамога ў набыцці іншых будаўнічых матэрыялаў. Рабочыя і сяляне саюзных рэспублік прысылалі на Жлобіншчыну прадметы першай неабходнасці: соль, запалкі, медыкаменты, адзенне, абутак, прадукты, тэхніку, кнігі. Старажылы памятаюць і бязвыплатную дапамогу з-за мяжы. Амерыканцы, напрыклад, высыпалі кантэйнеры-рацыёны, у якіх былі цыгарэты, запалкі, цукеркі, пячэнне, галеты, кансерваваныя мясныя і рыбныя прадукты, адзенне і абутак.

Год вялікай перамогі савецкага народа над гітлераўскай Германіяй прыкметна вызначаўся арганізаванасцю. У раёне паўсюдна аднаўлялі работу органы савецкай улады: раённы, гарадскі і 13 мясцовых Саветаў, 60 даваенных калгасаў, Жлобінская і Хальчанская МТС, пашыралася сетка школ, лячэбных і культурна-асветных устаноў, наладжваліся гандаль і бытавое абслугоўванне, адкрыў дзверы Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Але цяжкасці аднаўленчага перыяду не змяншаліся. Ускапаныя 2 тыс. га уручную пад сяўбу 1945 г. склалі толькі 4% агульнай пасяўной плошчы і не маглі істотна ўплываць на сітуацыю.

Вестка аб заканчэнні вайны імгненна разнеслася па раёну. Узнікалі стыхійныя мітынгі. Жлобіншчына не святкавала, а хутчэй аплаквала незаменныя страты. Дарагую цану заплацілі за перамогу. У раёне поўнасцю або часткова было знішчана 103 вёскі. На геаграфічнай карце сем з іх знікла бясследна.

Паступова змянялася аблічча горада. З кожным днём станавілася менш развалін. На іх месцы будаваліся жылыя дамы, прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы, добраўпарадкоўваліся вуліцы. Больш тысячы дамоў узвялі індывідуальныя забудоўшчыкі. Да канца 1945 г. было адноўлена 6 арцеляў; у зямлянках заставалася толькі 672 сям'і.

Вялікую работу па мабілізацыі моладзі на аднаўленне народнай гаспадаркі праводзіў камсамол Жлобіншчыны, які налічваў больш 500 юнакоў і дзяўчат. Гэта маладое пакаленне саракавых мае поўнае права лічыць сябе непакораным палымяным стваральнікам пасляваеннага адраджэння. Пры камсамольскіх арганізацыях ствараліся чаркасаўскія брыгады, якія працавалі на расчыстцы развалін, на будаўнічых пляцоўках і добраўпарадкаванні горада. Ветэран працы, былы сакратар камсамольскай арганізацыі Чырвонабярэжскага тэхнікума Віктар Макаравіч Хромаў успамінаў, што камсамольцы і моладзь тэхнікума прымалі актыўны ўдзел у адраджэнні горада і раёна. У суботнія і нядзельныя дні навучэнцы накіроўваліся на гаспадарчыя работы па нарыхтоўцы лесу, на будаўніцтва грамадскіх і вытворчых памяшканняў. Вялікую работу камсамольская арганізацыя прарабіла па добраўпарадкаванню і азеляненню горада. Высаджаны дзесяткі тысяч дрэў і кустарнікаў. Па закліку камітэта камсамола моладзь ішла на самыя цяжкія ўчасткі.

У канцы 1940-х г. у калгасах раёна пачалі вырошчваць кок-сагыз. Усе работы па вырошчванні новай культуры рабіліся ўручную. Пад кок-сагыз адводзіліся ў калгасах лепшыя землі, ствараліся спецыяльныя брыгады. За вырошчванне гэтай каўчуканоснай стратэгічнай культуры былы старшыня калгаса Аляксандр Прохаравіч Петухоў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. У краіне хутка расла вытворчасць каўчуканоснай прадукцыі. Гэта адчулі і жыхары нашага раёна. У продаж у неабмежаванай колькасці з'явіліся глыбокія, мяккія гумавыя галёшы (у народзе іх называлі бахілы, чуні і г.д.), якія насілі ў дождж, снег, холад і адлігу, у будні і святы. Гэты абутак гадамі заставаўся нязменным сярод сялян.

У 1950 г. землі раёна пашырыліся за лік тэрыторыі Кіраўскага сельсавета, які раней

уваходзіў у склад Рагачоўскага раёна. Калгас імя Свярдлова пасля аб'яднання з калгасамі «Чырвоны гай» і «За Радзіму» ў 1950 г. меў 670 галоў буйной рагатай жывёлы, 158 свіней, 343 авечкі, 170 коней і больш 6 тыс. га зямельных угоддзяў. Ураджайнасць зерневых была не вышэй 5 ц з га.

Але і ў гэтых цяжкіх умовах эканоміка раёна набірала тэмпы, ствараючы неабходны патэнцыял развіцця калгасаў. Прыкметна пашырыўся раённы механічны парк. Калгасы павялічвалі пагалоўе коней і валоў. На веснавой сяўбе 1945 г. ў зоне Жлобінскай МТС (дырэктар Р.Н.Клімянкоў) працавалі 58 трактароў, а Хальчанскай МТС (дырэктар А.А.Хадановіч) — 54. Гэта дазволіла правесці веснавую сяўбу ў аптымальныя тэрміны, палепшыць перадпасяўную апрацоўку глебы, пашырыць пасяўны клін і своечасова прыступіць да зяблевага ворыва. Усё гэта стварала аб'ектыўныя ўмовы гаспадарчай стабільнасці на вёсцы. Раслі пагалоўе грамадскага статка і яго прадукцыйнасць. Больш важкім станавіўся хлебны колас на калгасным полі.

У 1950 г. ў Жлобіне ствараецца луга-меліяратыўная станцыя. Яе першым дырэктарам быў прызначаны Яфім Сцяпанавіч Сідараў. Стварэнне станцыі абяцала раёну вялікую выгаду. 49 тыс. га каштоўных тарфяна-балотных зямель нізіннага тыпу, якія валодалі высокай урадлівасцю, ляжалі мёртвым капіталам. Іх асваенне не толькі дазваляла значна расшырыць пасяўныя плошчы, але і стварыць трывалую кармавую базу для грамадскай жывёлагадоўлі. Праблема асушэння і асваення балот і забалочаных зямель мела важнае значэнне яшчэ і таму, што больш палавіны сенажацяў і пашы (34 284 га) не маглі быць выкарыстаны без правядзення гідратэхнічных мерапрыемстваў. Асваенне ў 1-й палавіне 1950-х гадоў 13 892 га балот стварала добры пачатак для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці. Прадукцыйнасць меліярыраванага гектара ў 1,5—3 разы перавышала прадукцыйнасць зямель. З пашырэннем меліяратыўных работ хутка расла і ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, умацоўвалася эканоміка гаспадарак раёна. Значны ўклад у асваенне новых зямель унеслі меліяратары А.С.Вярхоўскі, І.Д.Кандрацьеў, Г.І.Гарбанос, Я.П.Разнічэнка, П.А.Шчукін.

Аднак ні механізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, ні дабратворны ўплыў меліяратыўных работ, ні дзяржаўныя ўліванні ў эканоміку калгасаў не прыносілі жаданых выніка-каў. Ураджайнасць збожжавых вагалася ў межах 7—10 ц з га, надоі не перавышалі 1500 кг малака ад каровы. Яўным тормазам з'яўляліся раздробленасць гаспадарак, дробная контурнасць палёў, якая значна зніжала эфектыўнасць прымянення трактароў, бездарожжа і інш. У выніку праведзенага ўзбуйнення былі сфарміраваны 33 калгасы і саўгасы.

Пяцідзесятыя гады — гэта цяжкія гады аднаўлення сяла, умацавання эканомікі калгаснай вытворчасці, гэта гады рэформ і стабілізацыі грамадскай працы, гады ўмацавання сялянскага падвор'я і паляпшэння сямейнага дабрабыту.

З дапамогай народаў брацкіх рэспублік аднаўляўся разбураны горад. За гады 1-й пасляваеннай пяцігодкі (1946—50) магутнасць прамысловых прадпрыемстваў раёна дасягнула даваеннага ўзроўню. У 1953 г. здадзена ў эксплуатацыю Лукская сярэдняя школа, пачата аднаўленне сярэдняй школы № 5 у Жлобіне. Будавалася школа ў Майскім сельсавеце. Здадзены ў эксплуатацыю кінатэатр у Жлобіне і дзесяцікватэрны дом. Заканчвалася будаўніцтва другога такога ж дома. У гэтым жа годзе пачата будаўніцтва бальнічнага гарадка агульным коштам 4,5 млн. руб., узводзіўся будынак райвыканкома.

Да канца 5-й пяцігодкі аб'ём дзяржаўных капіталаўкладанняў у народную гаспадарку раёна перавысіў 16,5 млн. руб. Павялічыўся продаж шарсцяных і шаўковых вырабаў, абутку, мэблі, бытавой тэхнікі, масла, малака, мяса і інш. У 1958 г. выкананы значныя работы па паляпшэнню сувязі. У Жлобіне, Стрэшыне і ў вёсках раёна ўстанавілі 1248 радыёкропак, тэлефанізаваны шэраг калгасаў, здадзена звыш 2 тыс. м^2 жылля. У 1959 г. Жлобін і раён падключаны да энергасістэмы Васілевіцкай ДРЭС.

Асвета, культура, ахова здароўя. З першых дзён вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў аддзел народнай адукацыі (загадчык Іван Рыгоравіч Краснеўскі) прыняў на сябе ўсе клопаты аб беспрытульных дзецях. Многім з іх дапамаглі адшукаць сваіх бацькоў, частку сірот уладкавалі ў дзіцячыя дамы, частку перадалі бліжэйшым родзічам, апекунам.

Вучэбны працэс быў наладжаны ў 1944 г. Вучыцца даводзілася ў прыстасаваных наёмных памяшканнях. Не хапала настаўнікаў, школьных прыналежнасцяў. Пяцідзесятыя гады характэрныя тым, што ўпершыню ў раё-

не школа ад пачатковых да вышэйшых яе ступеняў стала даступнай для ўсіх. Да 1953 г. ў раёне пабудавалі і аднавілі 6 сярэдніх, 15 сямігадовых і 30 пачатковых школ. На іх базе працавалі 6 школ рабочай і сельскай моладзі. У школах раёна навучалася 9113 чалавек, працавала 370 настаўнікаў. 22 школы туліліся ў наёмных памяшканнях. Адчуваўся недахоп сродкаў на будаўніцтва новых школ. Было прынята рашэнне пачаць будаўніцтва пачатковых школ на сяле метадам народнай будоўлі.

У сувязі з пастановай аб пераходзе ад сямігадовай да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ў шэрагу сямігадовых школ адкрываюцца восьмыя класы. На адукацыю ў 1958 г. выдзелена 11 635 тыс. руб. Асаблівая ўвага ўдзялялася політэхнічнаму навучанню, умацаванню сувязі школы з жыццём.

Да пачатку 50-х гадоў усе даваенныя культасветустановы былі поўнасцю адноўлены. У 1952 г. на сяле працавалі 13 хат-чытальняў, 17 калгасных і 84 ведамасныя бібліятэкі з кніжным фондам больш 100 тыс. экзэмпляраў. Усяго ў раёне налічвалася 140 культасветустаноў, сетка якіх пашыралася. У 1954 г. на іх утрыманне асігнавана 585 300 руб.

Асабліва важнае значэнне ў 50-х гадах надавалася кіно як магутнаму сродку ідэалагічнага выхавання працоўных. Толькі на будаўніцтва кінатэатра «Радзіма» ў Жлобіне было затрачана 1280 тыс. руб. У раёне працавалі 8 сельскіх кінастацыянараў, 4 гужавых і адна аўтакінаперасоўка (кінамеханік Іван Рыгоравіч Дз'ячэнка, шафёр-матарыст Міхаіл Іванавіч Шышоў). Разам з ёй свята перамяшчалася ад вёскі да вёскі. Змест карціны доўга абмяркоўваўся сярод аднагодкаў, у калектывах брыгад, часам выносіўся на абмеркаванне камсамольскіх сходаў, перадаваўся з вуснаў у вусны, выхоўваў патрыятызм, бязмежную любоў да Радзімы.

Асаблівае значэнне надавалася лекцыйнай прапагандзе. У раёне працавалі 11 аб'яднанняў лектараў, у склад якіх уваходзілі 84 чалавекі: урачы, настаўнікі, кіраўнікі і спецыялісты народнай гаспадаркі. Не заставалася без увагі масавая работа ў 55 розных гуртках па інтарэсах. Тут была магчымасць праявіць сябе, свае здольнасці адораным маладым людзям. Немалаважнае значэнне надавалася насценнаму друку. За год выпускалася больш 800 насценных газет і «баявых лісткоў». Культура таго часу трывала стаяла на дзяржаўнай аснове. Рос лік аматараў кнігі.

Цяжкае становішча перажывала ахова здароўя. Пакінутая фашыстамі спадчына заключалася не толькі ў матэрыяльных стратах, лютавалі інфекцыйныя захворванні. Адноўленыя медустановы на сяле размяшчаліся ў непрыстасаваных наёмных памяшканнях. Раённая бальніца тулілася ў наспех пераабсталяваным бараку на беразе Дняпра.

У 1953 г. медустановам раёна выдзелена 2582,3 тыс. руб., што склала 22% усіх расходаў раённага бюджэту. У гэтым жа годзе пачата будаўніцтва новай бальніцы, значна пашырылася сетка ФАПаў на сяле, у горадзе пабудавана лазня. Клопаты аб здароўі людзей у 5-й пяцігодцы з'яўляліся неад'емнай часткай сацыяльнай праграмы.

Пяцідзесятыя гады з'явіліся кузняй кіруючых кадраў, якія ў цяжкі перыяд вытрымалі выпрабаванне на трываласць. Сярод іх В.І.Аляхновіч, І.А.Артамонаў, У.П.Бабіч, С.М.Балыкоў, Р.Д.Бегуноў, І.І.Бондараў, Б.С.Бычкоў, І.Ц.Гарбенка, І.В.Гранкова, М.М.Далгіцкі, В.І.Дубіна, А.С.Елісееў, М.К.Елісееў, І.П.Жукаў, Г.П.Завадскі, Д.М.Загорскі, Д.А.Залатароў, М.Р.Каўпаеў, А.С.Кірыенка, П.І.Кірачэнка, С.М.Круцялёва, В.М.Лабанаў, М.Г.Маршын, М.М.Мікуліч, А.П.Петухоў, В.В.Пракопаў, Г.М.Равіч, А.Я.Селіванаў, В.М.Сівуха, М.М.Стукач, В.В.Сушкевіч, Ф.І.Сцефановіч, І.Ф.Талкачоў, М.В.Таўсцялёў, В.І.Федаровіч, В.М.Хромаў, М.М.Чарняўскі, В.І.Шаруда і многія іншыя, хто многае зрабіў для эканамічнага развіцця раёна ў той час.

А.А.Лявоненка.

Аднаўленне чыгуначнага вузла

На момант вызвалення горада чыгуначнага вузла амаль не было. Гітлераўцы вывезлі ўсе ўцалелыя рэйкі, шпалы, стрэлкі, знішчылі вакзал, станцыйныя будынкі, жылыя дамы, іншыя пабудовы. Даваенны і першы пасляваенны начальнік станцыі Жлобін Іван Сямёнавіч Даронін гаварыў, што ў чэрвені 1944 г. ўсё прыйшлося пачынаць з нуля.

Задачы па аднаўленню чыгункі вызначыла сесія Вярхоўнага Савета БССР, якая адбыла-

ся 21—24 сакавіка 1944 г. ў Гомелі. І хоць не заўсёды хапала інструментаў, мацаванняў, слупоў для ліній сувязі, многага іншага, на чыгункі пастаянна нарошчваліся тэмпы аднаўленчых работ і перавозак. Працягласць штосутачнага адноўленага пуці дасягала звыш 10 км.

У мэтах хутчэйшага ўводу ў дзеянне чыгуначнага моста цераз Дняпро і пуцей на вузле ў Жлобіне была праведзена мабілізацыя працаздольнага насельніцтва ў колькасці 5500 чалавек. У выніку мост пабудаваны за 10 сутак. Пад кіраўніцтвам кацельнага майстра В.С.Ткачова і механіка С.А.Іванова ў памяшканні дэпо, якое яшчэ будавалася, манціравалася абсталяванне цёплай прамыўкі паравозаў. Намеснік начальніка дэпо А.Э.Крум і майстар М.Ф.Кізееў кіравалі ўстаноўкай станочнага абсталявання на часовых фундаментах. У выніку самаадданай працы вярнуўшыхся з эвакуацыі чыгуначнікаў, мясцовага насельніцтва і войск спецыяльнага прызначэння да канца 1945 г. на вузле было ўведзена ў эксплуатацыю 26 станцыйных пуцей.

У лакаматыўным дэпо збудавалі 3 ямы для цёплай прамыўкі паравозаў. На кожную яму пры прамывачным рамонце станавіліся 3 машыны, што выклікала нязручнасці пры перастаноўцы адрамантаваных паравозаў. Так, на жаль, было да змены профілю дэпо, калі сюды прыйшлі цеплавозы.

Адначасова вырашалася кадравае пытанне. Да канца 1944 г. ў паравозным дэпо працавалі 27 машыністаў і 20 памочнікаў машыніста, 8 качагараў паравозаў. Дэфіцыт рабочай сілы складаў 135 машыністаў, столькі ж памочнікаў і 90 качагараў. Таму ў былым памяшканні адпачынку паравозных брыгад (дзе зараз знаходзіцца чыгуначная бальніца), пасля яго тэрміновага аднаўлення, з кастрычніка 1944 г. была адкрыта тэхнічная школа, якая рыхтавала памочнікаў машыністаў, слесараў, станочнікаў, кацельшчыкаў, электразваршчыкаў. Да сярэдзіны 1947 г. школа падрыхтавала 155 памочнікаў машыніста, 135 качагараў, па службе сувязі — 17 электраманцёраў, 12 тэлеграфістаў, 6 манцёраў. У ліку першых выпускнікоў тэхшколы былі Анатоль Пятровіч Шабуняеў (будучы Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэна Леніна), К.Н.Мышасты, Л.Ф.Байкачоў — будучыя машыністы лакаматываў, многія іншыя спецыялісты чыгункі. Семнаццацігадовы партызан Андрэй Сяргеевіч Елісееў стаў вучнем, а потым машыністам турбіны чыгуначнай электрастанцыі, закончыў Гродзенскі чыгуначны тэхнікум, прайшоў ступені памочніка машыніста і машыніста, брыгадзіра і майстра па рамонту, намесніка начальніка лакаматыўнага дэпо і апошні час кіраваў гэтым дэпо. Пасля ўзначальваў гарадскі Савет ветэранскіх арганізацый.

Непасрэдна на вытворчасці стараўся кожны, і праца прыносіла добры плён. Напрыклад, пункт рамонту і тэхнічнага агляду паравозаў на працягу ўсяго 1945 г. быў лепшым на чыгунцы. Аглядчыкі вагонаў Б.Тамкоў, П.Елісееў, В.Мядзведзеў дамагліся 100-працэнтнай адпраўкі вагонаў па вузлу. З гонарам называліся імёны слесараў Д.Маргунова, Ф.Руднікава, каваля Андросава, дзяжурных па станцыі Ляхоўскага і Равякава, маняўровых дыспетчараў Шульгова і Гараўцова, іншых працаўнікоў вузла. Калектыў станцыі

Разбуранае фашыстамі чыгуначнае дэпо ў Жлобіне.

Жлобін за датэрміновае выкананне норм па прыёму і адпраўленню паяздоў у 1947 г. быў узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ВЦСПС і Міністэрства шляхоў зносін. Паўторна такой узнагароды калектыў станцыі ўдастойваўся ў пачатку 50-х гадоў. Павялічваўся штосутачны прабег лакаматываў. Паравозныя брыгады ў трэцім годзе першай пасляваеннай пяцігодкі сэканомілі па гаспразліку 40 тыс. рублёў дзяржаўных сродкаў, зберагліі 282 т паліва. Машыністы Шарц, Буднікаў, Міхайлоўскі, іх памочнікі Говар, Губянкоў, Лісюк, качагары Кавальчук і Аўсяннікаў прымалі актыўны ўдзел у прамывачным рамонце паравозаў. Славай перадавікоў карысталіся старшы стрэлачнік Н.С.Барадаўка, вагонны майстар С.С.Капітонаў, аглядчык вагонаў А.А.Хаменка, інжынер станцыі В.П.Гарбацікава, маладыя чыгуначнікі машыніст Рыгор Марушкевіч, аператар Зарэцкая, стрэлачнік Л.Аляшкевіч, саставіцель паяздоў А.Пякурын.

Пятага мая з аблвыканкома мне задалі па тэлефоне пытанне: колькі дзяцей з пацярпелых раёнаў можа прыняць Жлобінскі раён і размясціць іх у больш-менш нармальных умовах? Мы далі звесткі: дзесьці каля 400 чалавек. Праз некаторы час паступіла паведамленне, што аўтобусная калона з дзецьмі прыбудзе ў другой палове дня.

Аўтобусы з Нараўлянскага раёна прыбылі пад раніцу. Самых маленькіх дзяцей размясцілі ў Шчадрынскім прышкольным інтэрнаце, старэйшых уладкавалі пры Чырвонабярэжскай сярэдняй школе і ў тэхнікуме. Вось тады і пачало нараджацца ўсведамленне вялікай бяды, што спасцігла Гомельшчыну. Мясцовыя педагогі і жыхары сустрэлі дзяцей гасцінна і прыветліва, клапаціліся аб іх да таго

моманту, пакуль маленькія чарнобыльцы не адправіліся далей — у піянерскія лагеры і санаторыі рэспублікі.

Першы этап перасялення насельніцтва праходзіў фактычна ў пацярпелай зоне, унутры рэгіёнаў. Вёскі з паўднёвай часткі забруджанай радыенуклідамі зоны перамяшчаліся ў паўночную частку тых жа раёнаў, хаця гэта, як потым высветлілася і было папраўлена, не вырашала праблему бяспекі людзей. Так, напрыклад, адбылося з вёскай Белая Сарока Нараўлянскага раёна, якую перасялілі ў іншую вёску — Грушаўку таго ж раёна. Пазней жыхары вёскі былі адселены на Жлобіншчыну, у вёску Бабоўка. Цяжка было пакідаць малую радзіму, край, дзе ты нарадзіўся, вырас, дзе застаюцца на могілках твае продкі. Цяпер перасяленцы свабодна ездзяць у забароненую зону на адзін дзень — Радуніцу.

Новы этап работы па перасяленню насельніцтва з радыяцыйнай зоны пачаўся ў верасні 1986 г., калі надышла чарга перамяшчэння людзей з населеных пунктаў т.зв. зоны эвакуацыі. Распараджэннем старшыні Жлобінскага райвыканкома Мікалая Фёдаравіча Шэкава былі створаны 2 эвакуацыйныя камісіі. Адну з іх (па Нараўлянскаму раёну) узначаліў я, другую (па Хойніцкаму раёну) намеснік старшыні райвыканкома па эканоміцы Мікалай Уладзіміравіч Казятнікаў. Гарком кампартыі (які ведаў і раёнам) на чале з першым сакратаром Анатолем Аўрамавічам Зайцавым пастаянна кантраляваў работу па эвакуацыі людзей з забруджанай зоны, сачыў за размяшчэннем іх на нашай тэрыторыі, аказваў дапамогу ў вырашэнні ўсіх пытанняў.

Напружаным быў той час. На вуліцы верасень, вядзецца ўборка бульбы, транспарт патрэбны як ніколі, а тут неабходна эвакуіраваць цэлы саўгас «Партызанскі» — вялікая гаспадарка на Нараўляншчыне з буйной цэнтральнай сядзібай — вёскай Вуглы і 10 населенымі пунктамі: Акопы, Баравічы, Дуброва, Ленпасёлак, Ліцава, Міхайлаўка, Радомля, Чапаеўка, Ціхін, Ясенок.

Упершыню ў Нароўлю з кіраўнікамі раёна і кіраўнікамі 12 гаспадарак Жлобіншчыны мы выехалі 28 жніўня. Адбылася сустрэча з кіраўніцтвам Нараўлянскага раёна, адміністрацыяй саўгаса «Партызанскі» (дырэктар Гарадзіскі Аляксей Іванавіч), старшынёй сельвыканкома. Ім, дарэчы, быў тады Уладзімір Мартынавіч Мазур, які потым працаваў старшынёй калгаса «Чырвоная Зорка» на Жлобіншчыне, на землі якога ён быў эвакуіраваны з аднавяскоўцамі. На нарадзе было прынята рашэнне раздзяліць саўгас на 12 частак, па ліку прымаючых гаспадарак Жлобіншчыны. Імі сталі калгасы «Праўда», «Звязда», «Бярэзіна», «Камуніст», «Іскра», «50 год БССР», «Чырвоная Зорка», імя Кірава, а таксама саўгасы «Нівы», «Лукскі», «Рэкцянскі» і калгас імя Энгельса (цяпер вытворчы ўчастак калгаса «Радзіма»). Вёску Вуглы, у якой было звыш 300 двароў, размеркавалі паміж 6 гаспадаркамі. Пазнейшы погляд на такое размеркаванне дае падставу сцвярджаць, што не трэба было так драбіць, разрываць жыццёвыя і вытворчыя, сваяцкія і іншыя сувязі.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР аб трэцім этапе эвакуацыі да 10 верасня 1986 г. на бяспечныя тэрыторыі павінны былі перасяліцца сем'і з дзецьмі, да 1 кастрычніка — усе астатнія.

4 верасня каля 7 гадзін раніцы са Жлобіна на Палессе адправілася першая аўтамабільная калона, якая складалася з машын аўтатранспартнага прадпрыемства № 25, аграпрамтэхнікі. Частку транспарту прадаставілі прымаючыя перасяленцаў гаспадаркі нашага раёна. Потым такія калоны колькасцю 40—50 транспартных адзінак адпраўляліся тройчы ў тыдзень аж да 1-га кастрычніка. Калоны ўзначальвалі машыны дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі (ДАІ). У кожнай з іх рухаліся 3—4 аўтобусы, 2—3 спецмашыны для перавозкі жывёлы. Абавязковым было суправаджэнне калоны машынай «хуткай дапамогі». Амаль у кожным аўтобусе прысутнічалі фельчары сельскіх фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Для запраўкі аўтамашын у калоне ішоў бензавоз з гаручым.

Першы раз мы паспрабавалі ўправіцца за адзін дзень, але не атрымалася. Таму прынялі наступны парадак. Машыны загружаліся вечарам прыкладна з 17 да 22—23 гадзін. Пераначаваўшы разам з гаспадарамі, ранкам вадзіцелі бралі курс у бок Жлобіна. Зразумела, вывезці ўдалося не ўсё. Не дазвалялася браць з сабой доўгашэрсных жывёлін — коз, кошак, сабак. Але гаспадары спрабавалі абыйсці любыя забароны, і многія бралі сваіх любімцаў. Больш за ўсё нараўлянцы даражылі дровамі. Таму і здараліся кур'ёзныя выпадкі, калі людзі загружалі аўтамашыны амаль толькі дровамі (у гэтым лясным краі іншага паліва не ведалі). Цяжка было назіраць перасяленне. Людзі плакалі. Здаралася, што старых прыходзілася садзіць у аўтобусы ледзь

не сілай. Апошняя калона выйшла на Жлобіншчыну 1 кастрычніка. 21 суткі прабыў я на забруджанай тэрыторыі Нараўлянскага раёна, куды папаў не па добрай волі. Потым яшчэ вырашаліся розныя праблемы, звязаныя з перасяленцамі, але ранейшых цяжкасцей і таго нервовага напружання ўжо не ўзнікала.

«Вялікае перасяленне» зрабілі жыхары в. Пагоннае Хойніцкага раёна. Новае месца жыхарства яны знайшлі ў вёсках Кірава і Чырвоны Бераг. Жыхары в. Аравічы таго ж раёна перасяліліся на цэнтральную сядзібу калгаса «Радзіма» — у в. Кароткавічы. Жыхары в. Хвашчоўка сталі членамі калгаса «Ленінец», жывуць у в. Антонаўка Майскага сельсавета. Пазней да перасяленцаў паўднёвых раёнаў (Нараўлянскага і Хойніцкага) далучыліся жыхары Кармянскага і Чачэрскага раёнаў. Іх пасялілі ў Стрэшыне, Шчадрыне, Рэкце, Папаратным, іншых вёсках. Разам з карэннымі жыхарамі прыдняпроўскага краю, ва ўзаемнай дружбе і павазе яны вырашаюць задачы грамадскага будаўніцтва, трывала стаяць на зямлі, якая стала для іх другой радзімай.

В.В.Саўдур.

З разуменнем доўгу

Падзеі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі 26 красавіка 1986 г. назаўсёды чорнай плямай застануцца ў сэрцах многіх маіх таварышаў і супрацоўнікаў аддзела ўнутраных спраў, якія былі мабілізаваны на «вайну са злым і небяспечным драконам». Назаўсёды застанецца ў памяці старшы лейтэнант Пётр Рыгоравіч Бабкоў, які нёс варту ў небяспечнай зоне (памёр у 1994).

А 11 супрацоўнікаў, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы, ахоўвалі дзяржаўную і асабістую ўласнасць, забяспечвалі грамадскі парадак у зоне адсялення, кантрольна-прапускны рэжым, і цяпер знаходзяцца на міліцэйскім дзяжурстве. Да іх адносіцца капітан міліцыі Юрый Целясфоравіч Чабелка. У першыя дні катастрофы ў 200-метровай зоне ад рэактара ён выконваў работы па аднаўленню чыгуначных пуцей (тады служыў у часцях чыгуначных войскаў). Работы па эвакуацыі дзяржаўнай уласнасці, людзей з зоны першачарговага адсялення выконваў малодшы інспектар аддзела, прапаршчык міліцыі Мікалай Рыгоравіч Міхаленка — былы жыхар Хойніцкага раёна. Актыўна дзейнічаў па ліквідацыі пажараў каля рэактара, у лясах і балотах Брагінскага раёна старшына міліцыі Сяргей Міхайлавіч Балацько, які раней праходзіў службу ў ваенізаванай пажарнай часці.

Патруляванне ў мэтах падтрымання правапарадку выконвалі маёр міліцыі Аляксей Рыгоравіч Рабкоў, старшы лейтэнант міліцыі Валерый Міхайлавіч Балашоў, прапаршчык міліцыі Аляксандр Пятровіч Васількоў, старшыны міліцыі Пётр Рыгоравіч Новікаў, Міхаіл Аляксеевіч Міхалка, Віктар Іванавіч Ракаў, Віктар Мікалаевіч Тытараў. Актыўны ўдзел у вырашэнні задач, што паўставалі ў небяспечным раёне каля АЭС, прымаў старшы сяржант міліцыі Сяргей Пятровіч Казлоў, у зоне адсялення ён правёў 38 сутак на першым этапе і 125 сутак потым.

Па хадайніцтву рэспубліканскай асацыяцыі праваахоўных органаў «Шчыт Чарнобылю» перад кіраўніцтвам МУС Беларусі ў аддзелах унутраных спраў, у тым ліку і ў Жлобіне, створана пярвічная арганізацыя ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы. Старшынёй яе выбраны маёр міліцыі А.Р.Рабкоў, намеснікам — старшы лейтэнант міліцыі В.М.Балашоў. Задача арганізацыі ў тым, каб разам аказваць дапамогу кожнаму ліквідатару ў вырашэнні сацыяльна-бытавых праблем, медыка-аздараўленчых пытанняў, падтрымліваць кантакт з ветэранамі аддзела ўнутраных спраў. Нашы ветэраны — Мікалай Іванавіч Хаткевіч, Мікалай Мацвеевіч Лагімахаў, Анатоль Міхайлавіч Крышнёў, Леанід Паўлавіч Ляўкоў, якіх мы не забываем.

На ліквідацыю аварыі на Чарнобыльскай АЭС супрацоўнікі міліцыі накіроўваліся не толькі па загаду камандзіраў. Імі кіравала пачуццё вялікай адказнасці, воінскага і грамадзянскага доўгу перад народам, прага перамогі над нябачным небяспечным ворагам. Яны зрабілі ўсё, што было ў іх сілах. Імі і сёння кіруе пачуццё высокай адказнасці за выкананне службовага абавязку, яны падтрымліваюць правапарадак, забяспечваюць належную ахову аб'ектаў і насельніцтва.

А.І.Пінчук.

Заглядваючы ў дзень заўтрашні

Жлобіншчына — прыгожы край з багатай гісторыяй, напоўненай падзеямі і фактамі старажытнасці і сучаснасці. Яна з'яўляецца візітнай карткай Гомельскай вобласці на ўездзе ў яе з боку сталіцы рэспублікі — Мінска. Гісторыю краю рабілі нашы далёкія і блізкія продкі, суайчыннікі, якія заўсёды паказвалі прыклады мужнасці і гераізму у барацьбе з нашэсцямі чужынцаў, адстойвалі сваё права на існаванне. На абсягах раёна ў больш чым дзве тысячы квадратных кіламетраў знаходзіцца каля 100 помнікаў археалогіі, гісторыі і культуры, цякуць вялікія і малыя рэкі, ёсць азёры, зелянеюць лясы і гаі, існуюць непаўторныя мясціны, якія прывабліваюць да сябе і вандроўніка, і карэннага жыхара.

Галоўнай воднай магістраллю з'яўляецца р. Дняпро, якая цячэ з поўначы на поўдзень і падзяляе тэрыторыю раёна на 2 часткі, бярэ пачатак у Расіі і заканчвае свой бег на Украіне, нібы сімвалізуючы яднанне і непарыўную сувязь трох брацкіх славянскіх народаў. На водным шляху «з варагаў у грэкі» нашы далёкія продкі аблюбавалі унікальнае ў многіх адносінах месца і стварылі тут паселішча. Пракладка чыгункі ў канцы 19 ст. садзейнічала далейшаму развіццю Жлобіна, які толькі ў 1923 г. становіцца цэнтрам аднайменнай воласці, а праз 2 гады атрымлівае статус горада.

Арэнай вялікай бітвы з нямецка-фашысцкімі акупантамі была Жлобіншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Тут у ходзе контрнаступу 21-й арміі вораг быў адкінуты ад дняпроўскіх рубяжоў на захад. Гэта была адна з першых перамог над захопнікамі, аб чым напамінае, бадай, адзіны ў сваім родзе абеліск-помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў 1941 г., што ўзведзены на цэнтральнай плошчы горада. З 2000 г. яна носіць назву «Плошча вызваліцеляў». Побач — вуліцы легендарнага камкора Л.Р.Пятроўскага, мужнага і храбрага камбата Ф.А.Баталава. У больш чым 40 пахаваннях — каля 11 тыс. беларусаў, рускіх, украінцаў, татараў, казахаў, таджыкаў, прадстаўнікоў іншых народаў, салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ў барацьбе з ворагам. На алтар Перамогі Жлобіншчына паклала жыцці амаль 10 тыс. сваіх сыноў і дачок.

З дапамогай брацкіх народаў былога СССР жыхары прыдняпроўскага краю хутка аднавілі разбураную вайной гаспадарку, прадоўжылі развіццё эканомікі. Будаўніцтва фабрыкі штучнага футра і металургічнага завода надалі Жлобіну другое дыханне. Спрадвечны горад чыгуначнікаў становіцца горадам металургаў, пашырае свае межы, узводзіць жыллё, аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння. Праяўляючы гасціннасць і дабразычлівасць, ён сабраў пад сваім дахам шмат прадстаўнікоў рэспублік былога СССР. Толькі на Беларускім металургічным заводзе працуюць пасланцы 24 нацыянальнасцей. У апошні час завод выйшаў на сусветную арэну і падтрымлівае сувязі з 25 краінамі блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх Украіна і Расія, Аўстрыя і Германія, Кітай, Ізраіль, Францыя, Англія.

У Жлобінскім раёне 156 населеных пунктаў, у тым ліку г.п. Стрэшын, які калісьці з'яўляўся фарпостам абароны беларускай зямлі. У кожнага паселішча свой узрост, лёс.

Асобным радком у нашу гісторыю ўпісана перасяленне жыхароў з населеных пунктаў, што пацярпелі ў выніку наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Перасяленцаў жлабінчане сустрэлі з душэўнай цеплынёй, акружылі іх клопатамі, далі на першым часе жыллё, работу. Цяпер яны жывуць адной сям'ёй, вырашаюць агульныя задачы, здзяйсняючы сённяшняе, думаюць пра дзень заўтрашні.

У аснову далейшага развіцця Жлобіна кладзецца рэалізацыя генеральнага плана. Прадугледжваецца асваенне новых тэрыторый, развіццё паўднёвай часткі горада, стварэнне культурнага цэнтра і расшырэнне экспазіцыі гісторыка-краязнаўчага музея. Прадугледжваецца развіццё транспартнай сістэмы, будаўніцтва аб'ектаў аховы здароўя, культуры, спорту, камунальнай гаспадаркі, гандлю, добраўпарадкаванне, азеляненне і асвятленне вуліц.

Аграпрамысловы комплекс раёна з'яўляецца ў Гомельскай вобласці адным з буйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, займаецца прамысловай перапрацоўкай малака, мяса, ільну, бульбы. На павестку дня пастаўлены іншы падыход да вёскі, змяненне яе сацыяльнага аблічча. Узяты накірунак на будаўніцтва жылых дамоў новага пакалення, прымяненне для гэтага сучасных матэрыялаў, інжынерных камунікацый, пашыраецца газіфікацыя вёсак. Робіцца іншае, каб значна па-

лепшыць бытавыя ўмовы і пражыванне сельскага насельніцтва.

У бліжэйшым будучым патрэбна пераадолець сацыяльную неўладкаванасць і эканамічную нестабільнасць, змяніць вытворчыя адносіны, падыход да ўладання зямлёй, павысіць узровень усёй вытворчасці і рэнтабельнасць кожнай гаспадаркі, павялічыць выхад прадукцыі з палёў і фермаў, устанавіць справядлівыя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Будуць добраўпарадкоўвацца населеныя пункты, машынныя двары, фермы, будавацца дарогі.

Пашыраюцца шэфскія сувязі паміж калектывамі прамысловых прадпрыемстваў і сельскімі працаўнікамі, і не толькі ў час напружаных палявых работ.

Жлобін — буйны чыгуначны вузел, знаходзіцца на перакрыжаванні важных шашэйных дарог. Для забеспячэння рытмічнай, зладжанай работы транспарту робіцца нямала, а будзе зроблена яшчэ больш, каб папоўніць парк новымі машынамі, палепшыць перавозкі насельніцтва і грузаў, адкрыць новыя маршруты руху аўтобусаў, зрабіць устойлівай тэлефонную сувязь і якаснае радыёвяшчанне.

Разгортваецца работа па паляпшэнню культурнага абслугоўвання насельніцтва, прыцягненню маладога пакалення да фізкультуры і спорту, правядзенню разнастайных спаборніцтваў, конкурсаў, інш., што служыць усебаковаму развіццю асобы.

Палепшана і больш разнастайнай становіцца база для падрыхтоўкі кадраў. Іх рыхтуюць Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы і металургічны тэхнікумы, вышэйшае прафесійнае аграрна-тэхнічнае сельскагаспадарчае, а таксама тэхнічнае вучылішча № 143 тэкстыльшчыкаў. Адкрыты філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

Падсумаваўшы ў гэтай кнізе часцінку таго, што адбылося ў нашым краі за доўгі час яго існавання, мы пачынаем ствараць новую гісторыю. У новае тысячагоддзе жыхары Жлобіншчыны ідуць з думкамі і планамі, якія ў многім адрозніваюцца ад старога ўяўлення аб жыцці грамадства і яго членаў. Кожны жыхар, працаўнік, чалавек любога ўзросту, думаецца, зробіць так, каб наша будучая гісторыя была больш цікавай і насычанай новымі імёнамі і падзеямі, станоўчымі прыкладамі і фактамі.

У.К.Ерафееў, В.Ф.Бяльковіч.

Беларускі металургічны завод

У распрацоўцы праекта, пастаўцы абсталявання і будаўніцтве завода прымалі ўдзел больш за 30 фірм Аўстрыі, Германіі, Швецыі, Італіі, Венгрыі і іншых краін. У якасці асноўнага субпадрадчыка выступала італьянская фірма «Даніэлі», а кантракт на праекціроўку і будаўніцтва «пад ключ» БМЗ быў падпісаны з аўстрыйскай фірмай «Фэст — Альпінэ».

Беларускі металургічны завод у 2000 г. — гэта 1500 тыс. т сталі, 718 тыс. т пракату, 49,4 тыс. т металакорду, дрота РМЛ 23,7 тыс. т, бартавога — 7 тыс. т, сталёвага — 28,7 тыс. т, гэта стабільная праца для 14, 7 тыс. чалавек.

Прадукцыя завода прызнана ў Расіі і на Украіне, фірмамі «Кантыненталь» і «Гудзіер» (Германія), «Матадор» (Славакія), карыстаецца попытам у іншых краінах Еўропы, Азіі, Блізкага Усходу, ёсць пастаўкі ў Амерыку.

(старонкі гісторыі)

1981 г., люты	Дырэктарам БМЗ прызначаны Д.Л.Акопаў.
1982 г., 19 сакавіка	У Маскве падпісаны кантракт на будаўніцтва прадпрыемства.
8 красавіка	Адкрыццё будаўнічай пляцоўкі.
1983 г., 1 чэрвеня	Пачаты мантаж канструкцый электрасталеплавільнага цэха.
1984 г., студзень	Пачаты масавы набор кадраў.
Ліпень—жнівень	Халодныя выпрабаванні абсталявання. Навучанне кадраў.
15 кастрычніка	Першая плаўка, пуск электрасталеплавільнага цэха.
5 лістапада	Першы пракат, пуск сортапракатнага цэха.
25 лістапада	Афіцыйнае падпісанне акта прыёмкі-здачы ў эксплуатацыю Беларускага металургічнага завода. Акт падпісалі першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР І.А.Архіпаў і Федэральны канцлер Аўстрыі Ф.Зінавец.

1985 г., красавік—май	Пачата будаўніцтва комплекса металакорда.
Жнівень	Дырэктарам завода прызначаны Міхаіл Рыгоравіч Ціханоўскі.
19 снежня	Атэстацыя першых 7 відаў прадукцыі на 1-ю катэгорыю якасці.
1986 г., 6 жніўня	Беларускаму пракату прысвоены дзяржаўны Знак якасці.
19 верасня	Выпушчана мільённая тона беларускай сталі.
1987 г., 29 ліпеня	Выпушчана мільённая тона беларускага пракату.
20 жніўня	Пробны пуск травільнай установкі сталедротавага цэха № 1. Пачатак пускавых работ першага комплекса беларускага корда.
21 лістапада	Пуск комплекса металакорду.
1989 г., 12 мая	Дырэктарам завода выбраны Ю.В.Феакцістаў.
1990 г., май	Выхад прадукцыі завода на сусветны рынак (металакорд і бартавы дрот).
5 лістапада	Пуск дугавой сталеплавільнай печы № 3.
1991 г., 1 сакавіка	Пуск комплекса металакорду № 2.
1994 г., кастрычнік	На заводзе распрацавана і пачалося ўкараненне сістэмы забеспячэння якасці прадукцыі, зацвярджэнне беларускага корда на рынках Германіі, Швецыі, Венгрыі, Чэхіі.
1995 г., 10 жніўня	Рабочы візіт на завод Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.
1996 г., верасень	Адкрыты тэхнікум Беларускага металургічнага завода.
1998 г., 1 верасня	Адкрыты Жлобінскі філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.В.Сухога.
1999 г., 6 кастрычніка	Дырэктарам завода прызначаны Вадзім Уладзіміравіч Філіпаў.
2000 г., 15 верасня	Рэканструкцыя стана 320/150, па сутнасці стварэнне новай лініі па вытворчасці катанкі.

Пастаянна ўдзяляецца ўвага сацыяльнай сферы. Першыя наваселлі адбыліся ў красавіку 1984 г., цяпер заводскі жыллёвы фонд складае 552 тыс. м². Працуюць фізкультурна-аздараўленчы комплекс, Палац культуры, 4 агульнаадукацыйныя школы, 9 дзіцячых садкоў. Сістэма грамадскага харчавання ахоплівае 6 сталовых на заводзе, 2 кафэ і кафэ-рэстаран, 8 харчовых і прамтаварных магазінаў, 7 буфетаў. *Віктар Кухарэнка.*



Беларускі металургічны завод у Жлобіне.

Акцыянернае таварыства «Белфа».

Адкрытае акцыянернае таварыства «БелФА»

Першая чарга галаўнога прадпрыемства акцыянернага таварыства «БелФА» — Жлобінскай фабрыкі штучнага футра — была пабудавана ў канцы 1978 г., трэцяя — у 1985 г. З 1984 г. вытворчае аб'яднанне, з 1996 г. адкрытае акцыянернае таварыства. Прадпрыемства разлічана на выраб 30 млн. м^2 штучнага футра. З'яўляецца адным з буйнейшых у Еўропе прадпрыемстваў па вытворчасці трыкатажнага штучнага футра для адзення, абутку, галаўных убораў і іншых вырабаў.

Жлобінская фабрыка мастацкай інкрустацыі

Створана ў 1961 г. на базе цэха інкрустацыі саломкай Гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Значную ролю ў арганізацыі фабрыкі адыгралі майстры аплікацыі саломкай В.Н. і М.В.Дзехцярэнкі. Асноўная прадукцыя — разнастайныя шкатулкі, куфэркі, пано, аздобленыя саломкай. Лепшыя вырабы фабрыкі адметныя цікавымі і разнастайнымі арнаментальнымі і сюжэтнымі кампазіцыйнымі вырашэннямі, самастойнай дэкаратыўнасцю саломкі. Выпускае таксама такарныя вырабы, пано з разьбой на чорным фоне. Па-мастацку аздобленыя трохгранна-выемчатай разьбой шкатулкі адраджаюць старадаўні прыём апрацоўкі дрэва. Створаны ўчастак строчана-вышытых вырабаў, у Светлагорску адкрыты апорны пункт па выпуску аздобленых саломкай вырабаў. Сярод майстроў фабрыкі Дзехцярэнкі, Т.А.Аляксеева, В.П.Котаў (галоўны мастак). Вырабы фабрыкі экспанаваліся на выстаўках у краіне і за мяжой, экспартуюцца ў 17 краін свету, у т.л. ў Германію, Чэхію, Аўстрыю, Італію, Індыю, Японію і інш.

Пірэвіцкі завод

Уведзены ў в. Пірэвічы больш стагоддзя таму назад. Уяўляў комплекс пабудоў з дрэва, дзе была наладжана вінакурная справа. Пасля пажару адбудаваны з цэглы. Да 1917 г. на заводзе выраблялі спірт-сырэц, які вазілі ў суседнюю Старую Рудню, дзе працаваў рэктыфікацыйны завод.

Пасля рэвалюцыі Пірэвіцкі завод быў зачынены, адноўлены ў 1925 г. Знайшліся майстры, якія здолелі зноў запусціць паравую машыну «Фрэйзер-Рыга» выпуску 1893 года. Паступова завод рэканструяваўся.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўсе дакументы завода былі спалены, а спіртзавод эвакуіраваны ў Пензу. Абсталяванне, якое засталося (кацёл, цыстэрны, чаны, дымавая труба), было замініравана. Завод планавалася ўзарваць, калі б немцы вырашылі аднавіць яго дзейнасць. Пасля вызвалення вёскі савецкімі войскамі франтавыя сапёры абясшкодзілі прадпрыемства ад смяротнай пагрозы. Цяпер завод дзейнічае. У 1962 г. аб'яднаны з мясцовым саўгасам «Пірэвіцкі».

В.Ф.Самусенка.

Жлобінская метэаралагічная станцыя

Знаходзіцца на паўночнай ускраіне горада. Заснавана ў 1924 г. З 1930 г. працуе па праграме метэастанцый 2-га разраду. Матэрыялы назіранняў паказальныя для тэрыторыі на 25—35 км вакол станцыі. Працягласць перыяду з сярэднесутачнымі тэмпературамі вышэй за 0 °С 238 сутак, вегетацыйны перыяд 193 дні, безмарозны — 161 сут. Апошні замаразак у паветры ў сярэднім 27-га красавіка, першы — 6-га кастрычніка. Сярэднемесячная тэмпература паветра ў студзені ад 0,7 (1975) да -15 °С (1950), у ліпені ад 15,3 (1979) да 23,3 °С (1936). Гадавы абсалютны мінімум тэмпературы паветра ніжэй за -36 °С, абс. максімум вышэй за 36 °С раз у 20 гадоў. Адзін раз у 20—30 гадоў тэмпература паверхні глебы апускаецца да -38 °С. Раз у 8 гадоў назіраюцца павышана-вільготныя гады (ападкаў больш за 710 мм); у асобныя засушлівыя гады не больш за 400 мм ападкаў. Сярэдняя максімальная вышыня снегу за зіму 15 см, у асобныя гады да 33 см. Вільготных дзён (з адноснай вільготнасцю 80%) за год 125, сухіх (з вільготнасцю за адзін з тэрмінаў назірання 30%) — 12. Сярэдняя колькасць сутак з мяцеліцай за год 16, максімальная — 29, з туманам 50 і 81, з навальніцай 24 і 38, з градам 2 і 6. За год у сярэднім бывае 12 сутак з галалёдам і 18 сутак з шэранню.

«Энцыклапедыя прыроды Беларусі». Мн., 1983. С. 283.

Лукаўская сярэдняя школа

Адкрыта 15.10.1875 г. Пад яе быў выкарыстаны стары будынак царквы, які перавезлі з в. Азераны (15 × 8 метраў), дзе і пачало функцыяніраваць народнае вучылішча. Паводле «Памятнай кніжкі Віленскай навучальнай акругі на 1880/81 навучальны год» на яго ўтрыманне адпускалася 250 рублёў з дзяржаўнай казны і 145 рублёў ад сялянскага грамадства. Навучэнцаў — 21 хлопчык. Настаўнікам быў Міхаіл Палікарповіч, які скончыў курс Магілёўскай духоўнай семінарыі, меў жалаванне 200 рублёў і кватэру.

Нягледзячы на вялікі памер дома ў ім існаваў толькі адзін класны пакой з трыма радамі лавак, на кожным з іх займаўся адзін клас. У 1877—1905 гг. школу наведвала ад 25 да 85 дзяцей, амаль з усяго наваколля. Для 1—2 класаў навучальны год працягваўся з 15 кастрычніка і да Вялікадня, для трэцяга, выпускнога класа, заканчваўся на два тыдні пазней. Дзеці авалодвалі чытаннем, пісьмом і арыфметыкай. Асноўны прадмет — «Закон Божы». Падручнікаў не было. У 1895 г. Лукаўскае народнае вучылішча перайшло на чатырохгадовы тэрмін навучання, дзеля чаго арандаваўся яшчэ адзін будынак у Авяр'яна Бежалева.

У 1904—07 гг. для вучняў 8—11-гадовага ўзросту была ўведзена ваенная справа. На 100 вучняў было ўсяго 2 дзяўчынкі, якіх вучылі не столькі грамаце, колькі ўменню весці дамашнюю гаспадарку. З 1906 да 1917 г. ў народным вучылішчы працавалі настаўнікамі Вольга Пятроўна Загорская, дваюрадныя сёстры Настасся Цімафееўна і Ганна Фёдараўна Завішы, Людміла Іванаўна Сухабокава, Ганна Георгіеўна Радоманская, жонка мясцовага святара Закрэўская, якая праславілася дрэнным выкладаннем прадметаў і біццём навучэнцаў, а таксама яе дачка.

Хоць валасны будынак меў шмат пакояў, вучылішча было раскідана па ўсёй вёсцы, што значна ўскладняла вучэбны працэс. У 1913 г. пад яго наймаўся трэці будынак у грамадзяніна Сямёнава.

У 1921 г. народнае вучылішча пераўтворана ў школу рабочай моладзі. З таго моманту да 1924 г. школу ўзначальваў Копач (вучылася больш за 200 хлопчыкаў і дзяўчынак). З 1924 г. загадчыкам школы працаваў Кузьма Рыгоравіч Казлоўскі, настаўнікамі — Казлоўская, Іонас і інш. Было ўведзена працоўнае навучанне.

У 1931 г. пры сельскай школе арганізавана вячэрняя. У кожнай вёсцы і на пасёлках ствараліся яе філіялы, ці інакш лікбезы. У наступныя гады школа стала сямігадовай, перайшла на двухзменныя заняткі. Яе дырэктарам быў спачатку Цімох Аляксеевіч Гручанкоў (загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны), потым Аляксей Прохаравіч Пракудовіч

(загінуў у 1941 г. пад Бранскам). У школе працавалі выдатныя спецыялісты Ціхан Васілевіч Дражын, Вітольд Яўгенавіч Мядзведзька, Рыгор Сафронавіч Алексяйкоў, Таццяна Васілеўна Данілава, Варвара Яфімаўна Кавалькова, Марыя Дзмітрыеўна Шынкевіч і інш.

У 1939—40 гг. школа стала сярэдняй (дырэктар — Глуздакоў, настаўнікі — Балянкоў, Марозаў, Рыгор Паўлаў, Вольга Краснеўская і інш.). У 1941 г. ў школе было 7 класных пакояў, 14 класакамплектаў з агульнай колькасцю вучняў 392. Меркавалася ўзвесці новы будынак школы, але гэтаму перашкодзіла вайна. Спроба акупантаў адкрыць школу ў 1942 г. не ўвянчалася поспехам. Асноўная маса дзяцей не наведвала яе, многія старшакласнікі сталі партызанамі. У гады вайны з былых 266 вучняў школы 166 чалавек загінулі. Школьныя будынкі былі разбураны.

Пасля вайны, у чэрвені 1944 г., на пасаду дырэктара быў прызначаны І.К.Шэметаў, былы выпускнік школы. Былі і навучэнцы, але адсутнічаў будынак, не хапала парт, падручнікаў, пісьмовых прылад. Давялося арандаваць дамы ў жыхароў вёскі. Сёмы клас наведвалі юнакі і дзяўчаты 17—18-гадовага ўзросту. Пераросткі былі і ў іншых класах.

У 1951 г. была пабудавана новая сярэдняя школа, першы выпуск якой адбыўся ў 1954 г. Атэстаты аб сярэдняй адукацыі атрымалі 53 чалавекі. З таго часу 635 юнакоў і дзяўчат атрымалі пуцёўку ў жыццё. Сярод былых выхаванцаў высокакваліфікаваныя спецыялісты розных галін народнай гаспадаркі.

А.П.Іванчыкаў.

Майская сярэдняя школа

Адкрыта ў лістападзе 1896 г. ў сялянскай хаце Фёдара Зубава. Першым настаўнікам быў Цвяткоў. Пазней працаваў Міна Ціханавіч Міхаленка, якога з павагай успамінаюць былыя выпускнікі школы.

У 1904 г. ў в. Шапілава (так да 1924 г. называлася Майскае) адкрыта двухкласнае народнае вучылішча з 6 аддзяленнямі. Для гэтай мэты былі выкарыстаны грошы, адпушчаныя казной і мясцовым панам Шапілавым. Паводле ўспамінаў настаўніка Цыкунова, які працаваў у 1904—16 гг. (за педагагічную дзейнасць узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна), у вучылішчы займалася тады 100—120 вясковых дзяцей.

Пасля 1917 г. школа была пачатковай, у 1929 г. яна (цяпер ужо сямігодка) пераўтворана ў школу калгаснай моладзі. У 1930-я гады колькасць выпускнікоў складала штогод каля 25 чалавек. У 1939 г. ў школе быў адкрыты восьмы клас.

У гады вайны ўсе школьныя пабудовы былі знішчаны, а абсталяванне, вучэбныя і наглядныя дапаможнікі, бібліятэка разграблены нямецка-фашысцкімі акупантамі. Пасля вызвалення вёскі ў 1944 г. дзейнасць школы аднавілася.

У 1956 г. здадзена ў эксплуатацыю цяперашняя двухпавярховая цагляная школьная пабудова.

М.В.Шуканаў.

Жлобінскае аграрна-тэхнічнае вышэйшае прафесійнае вучылішча

Адкрыта 18.5.1977 г. Называлася спачатку Жлобінскае сельскае сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 57. Падрыхтоўка навучэнцаў пачалася ў 1978 г. па спецыяльнасці — трактарыст-машыніст шырокага профілю. На першым курсе былі сфарміраваны 6 вучэбных груп (залічаны 205 юнакоў і 1 дзяўчына). У лютым 1979 г. ўзведзены 5-павярховы будынак інтэрната. У 1981 г. адбыўся першы выпуск (180 чалавек). У 1985 г. вучылішча змяніла назву і нумарацыю. Некалькі гадоў яно было сярэднім прафесійна-тэхнічным вучылішчам № 187. Паступова пашырылася кола спецыяльнасцей: майстар-плодаагароднінавод-кветкавод, лабарант хіміка-бактэрыялагічнага аналізу, вадзіцель аўтамабіля, газаэлектразварщчык, прадавец плодаагароднінай прадукцыі.

Была створана вучэбная гаспадарка, узведзена цяпліца, пачаты работы па будаўніцтве

дома для работнікаў установы. У 1987 г. закладзены сад на 2 тыс. пладовых дрэў. У 1989 г. вучылішчу перададзены вучэбна-курсавы камбінат райсельгаспрода, які стаў яго структурным падраздзяленнем. Было падрыхтавана і перападрыхтавана больш як 3 тыс. спецыялістаў. У 1990 г. закладзены фундамент новага вучэбнага корпуса, таксама абсталявана памяшканне для вырошчвання грыбоў-вешанак (гэтай справай займаецца майстар вытворчага навучання І.Ф.Аганоўскі). Тады ж пачалася падрыхтоўка юнакоў па комплекснай спецыяльнасці пад агульнай назвай — майстар сельскагаспадарчай вытворчасці, якая ўключае ў сябе наступныя прафесіі: трактарыст, вадзіцель аўтамабіля, электрык, газаэлектразваршчык, слесар па абслугоўванні аўтатрактарнай тэхнікі. Дзяўчаты вучацца па спецыяльнасці — гаспадыня сядзібы, якая ўключае ў сябе прафесіі: майстар-плодаагароднінавод, повар, а таксама набываюць практычныя навыкі па рукадзеллі, кройцы і шыцці, машынапісе, бухгалтарскім уліку, доглядзе за дзіцем.

З 1 верасня 1992 г. вучылішча набыло статус аграрна-тэхнічнага вышэйшага прафесійнага вучылішча. Навучэнцы, якія найбольш паспяхова спраўляюцца з вучэбнай праграмай, пакідаюцца на чацвёрты год навучання і атрымліваюць адначасова з сяроднеспецыяльнай адукацыяй прафесію механіка сельскагаспадарчай вытворчасці (юнакі) і бухгалтара сельскагаспадарчага прадпрыемства (дзяўчаты). У 1992 г. здадзены ў эксплуатацыю 36-кватэрны жылы дом для інжынерна-педагагічных работнікаў, у 1993 г. — капцільня, агароднінасховішча на 200 т, пачаты капітальны рамонт 5-павярховага будынка інтэрната, адрамантавана памяшканне і набыта абсталяванне для атрымання льнянога масла. Закладзены пітомнік лекавых і чайных траў, востра-духмяных раслін для прыпраў, жэньшэнарый. Адрамантаваны і ўведзены ў эксплуатацыю 5-ы паверх інтэрната. У 1995 г. ўпершыню 15 навучэнцаў залічаны на 4 курс па спецыяльнасці — механік сельскагаспадарчай вытворчасці.

Вучылішча падрыхтавала 3975 трактарыстаў-машыністаў шырокага профілю і вадзіцеляў аўтамабіляў, 329 майстроў-плодаагароднінаводаў, 785 майстроў сельскагаспадарчай вытворчасці, 168 гаспадынь сядзібы, 60 прадаўцоў сельскагаспадарчай прадукцыі, 51 лабарантку хіміка-бактэрыялагічнага аналізу, 110 тэхнікаў-механікаў, 98 бухгалтараў, 65 электразваршчыкаў, 100 слесароў-рамонтнікаў.

Л.М.Канцавая.

Раённая газета

Выдаецца з 5.6.1931 г. Спачатку выходзіла як орган Жлобінскага райкома КП(б)Б, райвыканкома і райпрафсавета пад назвай «Шлях сацыялізму» (першы выконваючы абавязкі рэдактара І.Краўчанка). Газета расказвала аб ролі і задачах партыйных ячэек у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі і культурным будаўніцтве на вёсцы, асвятляла ход палявых работ у калгасах, давала іншую інфармацыю саюзнага і мясцовага значэння.

Са жніўня 1941 г. да ліпеня 1943 г. газета не выходзіла. 22 ліпеня выйшаў першы нумар падпольнай газеты «Шлях сацыялізму». Над выпускам яе працавалі рэдактар Мікалай Мікалаевіч Целяпнеў, адказны сакратар Іван Гаўрылавіч Тунякоў, карэктар А.Някрасаў, наборшчыца Надзея Кавальчук. Першыя газеты невялікага фармату былі адразу накіраваны ў партызанскія атрады, горад Жлобін і населеныя пункты раёна. Пасля вызвалення Жлобіна і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 26.6.1944 г. выпуск газеты быў адноўлены.

З 1.4.1952 г. раённая газета пачала выходзіць на 4 старонках (рэдактар І.Ф.Вул). Пасля ў газеце працавалі і ўзначальвалі ў розныя гады П.І.Кірачэнка, В.М.Філіянаў, П.Я.Кірычэнка, К.В.Ніжнікаў, У.В.Штапенка, П.Ф.Шутаў, Шабан і інш. 21.4.1962 г. выпуск газеты спынены. Была створана міжраённая газета «Камуніст» — орган абкома КПБ і аблвыканкома пры Жлобінскім тэрытарыяльна-вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні.

Зноў газета аднавілася 1.1.1965 г. як орган Жлобінскага райкома КПБ і раённага Савета дэпутатаў працоўных. Са снежня 1976 г. яна з'яўлялася органам гаркома КПБ, гарадскога і раённага Саветаў дэпутатаў працоўных, а з 7.10.1977 г. — Жлобінскага гаркома КПБ, гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў. З 1.1.1991 г. газета выдаецца пад назвай «Новы дзень». Заснавальнікі яе раённы і гарадскі выканаўчыя камітэты, раённы і гарадскі Саветы народных дэпутатаў, калектыў рэдакцыі.

В.В.Краснабаеў.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

Героі Сацыялістычнай Працы

ВІШНЕЎСКАЯ Марыя Фёдараўна. Нарадзілася 1.8.1915 г. ў в. Саланое Жлобінскага раёна. Працавала на птушкафабрыцы. Узнагароджана ордэнам Леніна, залатым, сярэбраным і 4 бронзавымі медалямі ВДНГ СССР. У 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

КАЗЛОЎ Мікалай Рыгоравіч. Герой Сацыялістычнай Працы (1967). Нарадзіўся 2.1.1930 г. ў в. Кірава Жлобінскага раёна. Пасля сканчэння Пермскага сельскагаспадарчага інстытута працаваў спачатку аграномам-землеўпарадчыкам ва Усходне-Казахстанскай вобласці, потым у 1958—64 гг. галоўным інжынерам, начальнікам зямельнай экспедыцыі, першым намеснікам начальніка ўпраўлення вытворчасці і нарыхтовак сельгаспрадуктаў Кустанайскай вобласці. З 1965 г. дырэктар самага буйнога ў вобласці саўгаса «Буравеснік», у якім атрымалі шырокае прымяненне перадавая глебаахоўная сістэма земляробства, навейшыя дасягненні агранамічнай навукі. Па ініцыятыве М.Р.Казлова было створана больш за 10 вялізных азёр, вельмі патрэбных на цалінных землях для атрымання высокіх ураджаяў, а таксама для адпачынку працаўнікоў саўгаса. Ужо ў 1967 г. саўгас прадаў дзяржаве 4 млн. пудоў хлеба, за што М.Р.Казлову было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У 1976 г. ў саўгасе сабрана 6,1 млн. пудоў хлеба. За працоўныя поспехі і атрыманне рэкордных ураджаяў М.Р.Казлоў быў узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі.

Памёр 22.7.1977 г. На ўшанаванне яго памяці на плошчы цэнтральнай сядзібы саўгаса, дзе ён пахаваны, пастаўлены помнік, а саўгас «Буравеснік» перайменаваны ў саўгас імя М.Р.Казлова. *У.П.Савачкін.*

КАНАПЛЯНІКАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 15.1.1929 г. ў в. Саланое Жлобінскага раёна. Скончыў курсы трактарыстаў пры Жлобінскай МТС. З 1945 г. працаваў у калгасе. У 1976 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1977). Памёр у 1994 г.

ЛІТАШ Настасся Іванаўна. Нарадзілася 25.11.1919 г. ў в. Забродзе Жлобінскага раёна. Працавала паляводам, з 1939 г. — свінаркай, з 1948 г. — даяркай. У 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памерла ў 1998 г.

МАРШЫН Міхаіл Герасімавіч. Нарадзіўся 23.10.1910 г. ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна. Працаваў брыгадзірам, загадчыкам фермы, намеснікам старшыні мясцовай гаспадаркі, старшынёй Старарудняскага сельвыканкома. У гады Вялікай Айчыннай вайны падпольшчык, партызан, камісар партызанскага атрада і член Жлобінскага падпольнага райкома партыі. У 1944 г. ўпаўнаважаны наркамата нарыхтовак, потым старшыня Пірэвіцкага і Старарудняскага сельвыканкомаў. З 1948 г. старшыня калгаса імя Кірава. За поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1966 г. прысвоена зван-

М.Ф.Вішнеўская.

М.Р.Казлоў.

А.Дз.Канаплянікаў.

Н.І.Літаш.

не Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны 3 сярэбранымі медалямі ВДНГ СССР.

ПЕТУХОЎ Аляксандр Прохаравіч. Нарадзіўся 22.5.1917 г. ў в. Пякалічы Жлобінскага раёна. Працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады, механікам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. У 1946—79 гг. старшыня калгаса. У 1951 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памёр у кастрычніку 1991 г.

РУДЭНКА (РУДЗЯНКОЎ) Мікалай Васілевіч. Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Кірава Жлобінскага раёна. Скончыў Магілёўскае фабрычна-заводскае вучылішча. Працаваў на лесазаводзе ў г. Днепрапятроўск. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—47 гг. вучыўся ў Магілёўскай школе механікаў, працаваў у Тураўскай МТС. У калгасе «Новае жыццё» ўзначальваў брыгаду механізатараў. У 1958 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Заслужаны механізатар Беларусі.

ШАБУНЯЁЎ Анатоль Пятровіч. Нарадзіўся 8.1.1928 г. ў в. Новая Карма Жлобінскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну быў партызанам. У 1946 г. скончыў Жлобінскае чыгуначнае вучылішча № 4. Працаваў машыністам паравоза ў Жлобіне, узначальваў камсамольска-маладзёжную брыгаду, якая ў ліку першых пачала вадзіць цяжкавагавыя паязды. У 1958 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Жыве ў Жлобіне.

Я.В.Карцаў.

Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі

ПІЦЯКОВА Ганна Францаўна. Нарадзілася 8.5.1944 г. ў в. Малінаўка Жлобінскага раёна. Скончыла Бабруйскі лесатэхнікум. Працавала ў вытворчым аб'яднанні «Бабруйскдрэў». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1989).

СВІРКО Уладзімір Маркавіч. Нарадзіўся 5.2.1947 г. ў в. Дабрагошча Жлобінскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў на Светлагорскім заводзе штучнага валакна. З 1977 г. электраманцёр камбіната хлебапрадуктаў у Бабруйску. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай славы 2-й і 3-й ступеней. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Заслужаныя работнікі Беларусі

АРЛОЎ Анатоль Макаравіч. Старшы аглядчык вагонаў Жлобінскага вагоннага дэпо. Заслужаны работнік транспарту Беларусі.

АРЛОЎ Васіль Іванавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. Працаваў у СШ № 5 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі.

АРТАМОНАЎ Іван Андрэевіч. Нарадзіўся 15.3.1920 г. Працаваў начальнікам Жлобінскага вагоннага дэпо. Ганаровы чыгуначнік (1977). Заслужаны работнік транспарту Беларусі (1980).

БАЙКАЧОВА Тамара Пятроўна. Нарадзілася 1.1.1947 г. Працавала дырэктарам СШ № 10 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1990).

БАРАНОВІЧ Іван Мацвеевіч. Нарадзіўся 15.1.1926 г. ў в. Антушы Рагачоўскага раёна. Скончыў БДУ. Працаваў настаўнікам, дырэктарам дзіцячага дома, школы-інтэрната, загадчыкам райана. Заслужаны настаўнік Беларусі (1968). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Бела-

М.Г.Маршын.

А.П.Петухоў.

М.В.Рудэнка.

А.П.Шабуняеў.

З.І.Варшаўская.

В.А.Кармілiна.

А.С.Кецко.

М.П.Косцеў.

русі, Ганаровай граматай прэзідыума Акадэміі педагагічных навук Беларусі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

БЕЛЯНКОЎ Міхаіл Якаўлевіч. Нарадзіўся 5.12.1922 г. Працаваў інспектарам раённага аддзела народнай асветы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1964). Памёр у 1993 г.

БРЫКО Уладзімір Рыгоравіч. Нарадзіўся 19.8.1929 г. Працаваў лесніком Дварышчанскага лясніцтва Жлобінскага лясгаса. Лепшы ляснік вобласці (1986). Лепшы ляснік лясной гаспадаркі Беларусі (1987).

БУДНІЦКАЯ Антаніна Барысаўна. Нарадзілася 20.12.1931 г. Працавала настаўніцай пачатковых класаў СШ № 8 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1976).

ВАРШАЎСКАЯ Зінаіда Іванаўна. Нарадзілася 8.7.1938 г. ў г. Гомель. У 1956 г. скончыла Нясвіжскае педагагічнае вучылішча імя Я.Коласа. Працавала ў Ніўскай сярэдняй школе. Заслужаны настаўнік Беларусі (1978). Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

ВЯРХОЎСКІ Аляксей Сяргеевіч. Нарадзіўся 20.11.1911 г. Працаваў начальнікам перасоўнай механізаванай калоны № 71 у Жлобіне. Заслужаны меліяратар Беларусі (1969). Памёр у 1987 г.

ГАРБЕНКА Іван Ціханавіч. Галоўны аграном раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Памёр у 1992 г.

ГРЫБАЛЁВА Алёна Трафімаўна. Нарадзілася 10.6.1930 г. Працавала таваразнаўцам гархарчпрамгандлю. Заслужаны работнік гандлю Беларусі (1979).

ГУБАРЭВІЧ Апалінарый Вільгельмавіч. Нарадзіўся 19.7.1919 г. Заслужаны ветэрынарны ўрач Беларусі (1966).

ДАЙНЕКА Іосіф Міхайлавіч. Нарадзіўся 19.11.1936 г. Працаваў трактарыстам-машыністам раённага аб'яднання «Сельгастэхніка». Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1977).

ДЗЕМІДЗЕНКА Зінаіда Уладзіміраўна. Нарадзілася 27.9.1927 г. Працавала загадчыцай навучальнай часткі Кіраўскай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1970).

ДРАЖЫН Ціхан Васілевіч. Нарадзіўся 16.8.1916 г. Працаваў дырэктарам Лебядзёўскай пачатковай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967).

ІСАЕВА Валянціна Іванаўна. Нарадзілася 10.2.1934 г. Працавала настаўніцай хіміі СШ № 9 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1978).

КАНДРАЦЬЕЎ Іван Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 7.1.1928 г. Працаваў начальнікам перасоўнай механізаванай калоны № 71 у Жлобіне. Заслужаны меліяратар Беларусі (1987).

КАРМІЛІНА Вольга Аляксандраўна. Нарадзілася 1.3.1924 г. на станцыі Міхайлаўская Разанскай вобласці. У 1949 г. скончыла Нальчынскі педагагічны інстытут. Працавала ў Нальчынскім педвучылішчы, выкладала рускую мову і літаратуру, потым дырэктар Юркавіцкай, Хутарской, Шчадрынскай сярэдніх школ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

КЕЦКО Аляксандр Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Замагілле Салігорскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, лётчык. Мае вышэйшую адукацыю. Працаваў на партыйнай і савецкай рабоце, потым дырэктарам Пірэвіцкай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1964). Узнагароджаны 4 ордэнамі, медалямі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

КОСЦЕВА Валянціна Вацлаваўна. Нарадзілася 19.4.1929 г. Працавала загадчыцай метадычнага кабінета Жлобінскага гарадскога аддзела народнай асветы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1971).

КОСЦЕЎ Міхаіл Парфір'евіч. Нарадзіўся 29.11.1923 г. Працаваў дырэктарам СШ № 6 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1970).

КРЭЗ Яўген Емяльянавіч. Нарадзіўся 15.1.1926 г. ў в. Броннае Рагачоўскага раёна. Скончыў Маскоўскі кааператыўны інстытут. Працаваў намеснікам, старшынёй сельскага спажывецкага таварыства, дырэктарам гандлёвай базы і старшынёй райспажыўсаюза. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларусі (1967). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені.

ЛЕЎЧЫК Сямён Іванавіч. Нарадзіўся 3.2.1909 г. Працаваў дырэктарам Навамаркавіцкай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967). Памёр у 1986 г.

ЛІПАТНІКАВА Тамара Савельеўна. Нарадзілася 20.3.1939 г. Працавала кантрольным майстрам мэблевай фабрыкі ў Жлобіне. Заслужаны работнік прамысловасці Беларусі (1990).

ЛОГВІН Валерый Мікалаевіч. Нарадзіўся 20.9.1945 г. ў г.п. Стрэшын. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1982), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1975). Працаваў карэспандэнтам, адказным сакратаром гомельскай раённай газеты «Маяк», намеснікам рэдактара, рэдактарам добрушскай раённай газеты «Ленінец». У 1989—91 гг. — загадчык сектара сродкаў масавай інфармацыі і вывучэння грамадскай думкі Гомельскага абкома КПБ. З 1991 г. — галоўны рэдактар абласной газеты «Гомельская праўда». Дэпутат Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 23-га склікання. Старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1998).

МАЛАШАНКА Сцяпан Мацвеевіч. Нарадзіўся 13.8.1927 г. Працаваў галоўным інжынерам райсельгастэхнікі. Заслужаны механізатар Беларусі (1966). Памёр у 1990 г.

МАРЦІНОВІЧ Іван Фёдаравіч. Нарадзіўся 19.1.1923 г. Працаваў настаўнікам Старарудняншай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965).

МАТУС Васіль Іванавіч. Нарадзіўся 27.11.1915 г. Працаваў настаўнікам Стрэшынскай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1973). Памёр у 1981 г.

Я.Е.Крэз.

В.М.Логвін.

Д.В.Прастаквашын.

НОВІКАВА Клаўдзія Андрэеўна. Загадчыца Беліцкай пачатковай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1959). Памерла ў 1989 г.

ПАЛТАРАН Павел Сямёнавіч. Працаваў у Стрэшынскай СШ. Заслужаны настаўнік Беларусі.

ПАЛУБАН Варвара Іосіфаўна. Нарадзілася 16.12.1935 г. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Малевіцкай васьмігадовай школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1974).

ПРАСТАКВАШЫН Дзмітрый Васілевіч. Нарадзіўся ў 1934 г. ў с. Стральцы Тамбоўскай вобл. Скончыў Гомельскі педінстытут. Працаваў у СШ № 7 Жлобіна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1977).

РАДЧАНКА Дзмітрый Касьянавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. на Украіне. Працаваў загадчыкам аддзела фізкультуры і спорту райвыканкома. Заслужаны трэнер Рэспублікі Бе-

І.М.Сіманенка.

Г.І.Станіслававa.

Н.Я.Сямак.

А.Ц.Татарынаў.

А.С.Тужыкаў.

І.М.Шведаў.

ларусь. Памёр у 1987 г., пахаваны ў Жлобіне.

СІМАНЕНКА Іван Мікалаевіч. Нарадзіўся 22.6.1921 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1954 г. працаваў у раённым аддзеле народнай асветы, потым выкладчык гісторыі і загадчык вучэбнай часткі Кіраўскай сярэдняй школы, дырэктар Затонскай сямігадовай, Стараруднянскай сярэдняй школ. Заслужаны настаўнік Беларусі (1977). Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета Беларусі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі». Памёр у 1984 г.

СТАНІСЛАВАВА Галіна Іванаўна. Нарадзілася 7.10.1934 г. ў Гомелі. Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, хормайстар. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980). Скончыла Гомельскае музычнае вучылішча (1954). У 1954—80 гг. метадыст Жлобінскага раённага Дома культуры. Стваральнік і кіраўнік Жлобінскага народнага хору, які дасягнуў пад яе кіраўніцтвам значнага выканаўчага майстэрства.

СЯМАК Ніна Якаўлеўна. Нарадзілася 14.11.1919 г. ў в. Бацэвічы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобл. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. У Вялікую Айчынную вайну была доктарам у партызанскім атрадзе. Працавала ў цэнтральнай раённай бальніцы, галоўным урачом Чырвонабярэжскай участковай бальніцы. Заслужаны ўрач Беларусі (1964). Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ТАТАРЫНАЎ Аляксандр Цярэнцьевіч. Нарадзіўся 23.8.1922 г. ў в. Нівы Жлобінскага раёна. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. Кандытат медыцынскіх навук. Працаваў загадчыкам хірургічнага аддзялення цэнтральнай раённай бальніцы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Заслужаны ўрач Беларусі (1968). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі.

ТУЖЫКАВА Настасся Мікалаеўна. Нарадзілася 18.10.1918 г. Працавала настаўніцай матэматыкі Чырвонабярэжскай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967).

ТУЖЫКАЎ Анатоль Сцяпанавіч. Нарадзіўся 30.6.1923 г. Працаваў майстрам вагоннага дэпо. Заслужаны работнік транспарту Беларусі (1980).

ШАЎЦОЎ Анатоль Паўлавіч. Нарадзіўся 25.2.1929 г. Працаваў майстрам аўтаканторольнага пункта вагоннага дэпо. Заслужаны рацыяналізатар Беларусі (1964).

ШВЕДАЎ Іван Мінавіч. Нарадзіўся ў 1915 г. ў Гомелі. Па адукацыі хімік-біёлаг. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946

г. працаваў настаўнікам хіміі, біялогіі і арганізатарам пазакласнай работы ў Пірэвіцкай сярэдняй школе, з 1956 г. ўзначальваў вучэбна-вытворчую школьную брыгаду. Заслужаны настаўнік Беларусі (1976). Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, значком «Выдатнік народнай асветы Беларусі».

ШЧУКІН Павел Авяр'янавіч. Нарадзіўся 14.10.1924 г. Працаваў механікам перасоўнай механізаванай калоны № 71. Заслужаны меліяратар Беларусі (1980). Памёр у 1982 г.

Ардэнаносцы

Узнагароджаныя Ордэнам Леніна

(у дужках прыведзены даты ўзнагароджання)

АБРАМЧУК Ануфрый Іосіфавіч.

АРЛОЎ Анатоль Макаравіч. Старшы аглядчык вагонаў.

АСМАЛОЎСКІ Мікалай Ільіч. Начальнік чыгуначных электрасетак.

АЎСЯННІКАЎ Васіль Сцяпанавіч. Нарадзіўся 29.9.1924 г. Брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Жданава (1972). Памёр у 1980 г.

БАЙКАЧОЎ Леанід Фокіевіч. Машыніст паравознага дэпо.

БАРАНАЎ Іван Акімавіч. Нарадзіўся ў 1879 г. Машыніст паравознага дэпо (1951). Памёр у 1957 г.

БРЫКЕТ Фелікс Антонавіч. Нарадзіўся 28.6.1928. Дырэктар саўгаса «Ждановічы».

БУШКЕВІЧ Павел Емяльянавіч. Нарадзіўся 1.7.1903 г. Памочнік начальніка чыгуначнай станцыі Жлобін (1951). Памёр у 1991 г.

БЫКАЎ Рыгор Архіпавіч. Начальнік Жлобінскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

ВАГІН Леанід Іванавіч. Старшы аглядчык вагонаў.

ВАСІЛЬЧАНКА Васіль Патапавіч.

У некаторых хатах Стрэшына абраз знаходзіцца ў адным з куткоў кухні, за фіранкай, і ў гэтым адбіваюцца захады ідэалогіі ваяўнічага атэізму, які прымушаў вернікаў ісці на хітрыкі.

На падлозе ў вясковай хаце ляжаць ходнікі: шырокія прамысловага гатунку, самаробныя тканыя ў гарызантальныя паскі, сшытыя з кавалачкаў тканіны, або сплеценыя кручком — шыдэлкам з рыззя.

На ложках ляжаць велізарныя падушкі, пакрытыя бялюсенькімі сурвэткамі, або спецыяльныя накідкі з гардзіннага палатна. Ложкі засланы пакрываламі прамысловага гатунку, радзей — саматканымі посцілкамі.

Сціплае аздабленне абразоў у сучасных вёсках з'яўляецца адгалоскам традыцый

асобнага віду народнай творчасці — выразанак з паперы, ці выцінанак. Гісторыя выразанак бярэ пачатак з тых часоў, як беларусы навучыліся вырабляць паперу, таму мы не выпадкова шукалі на Жлобіншчыне вытокі і такога рамяства. Асартымент рэчаў з паперы ў народным побыце быў даволі разнастайны: фіранкі, сурвэткі, кветкі, стужкі, галаўныя ўборы, цацкі на ёлку, калядныя зоркі, абажуры. Такі від народнай творчасці сёння на Жлобіншчыне існуе, нягледзячы на тое, што даўно не выстрыгаюць фіранак. Ён паціху зіхаціць каляровай паперай у аздабленні абразоў па ўсіх вёсках, у тым ліку і ў Абольцах. Гэтае традыцыйнае рамяство не перарасло тут у промысел, як сталася з аплікацыяй саломкай, і не атрымала далейшага распаўсюджвання як асобны жанр народнага сучаснага мастацтва. Ручнікі на абразах, самаробныя посцілкі на ложках, ходнікі на падлозе сведчаць пра развіццё ткацтва. Некалі ткацтва з'яўлялася адным з самых распаўсюджаных рамёстваў. У Дзянісавічах, Кабанаўцы, Шчадрыне і цяпер жывуць умельцы, якія ў маладосці ткалі і нават такі занятак лічылі сваім адпачынкам пасля цяжкай працы ў полі. У в. Васілевічы прызнанымі аўтарытэтамі ткацтва лічаць Кацярыну Лябядзька, Валянціну Дзямбіцкую, Ксеню Рудзянок.

Самыя старыя з захаваўшыхся ручнікі вытканы тут у 2 ніты, палатняным перапляценнем і толькі некалькі тканых ці вышываных каляровых пасак упрыгожваюць іх канцы. Ручнікі і абрусы, што ткала ў маладосці стогадовая Фёкла Кавалёва з в. Майскае, вытканы «ў ёлачку».

Даўжыня ручнікоў Жлобіншчыны ад 180 да 300 см, шырыня — 45—48 см. Можна меркаваць, што да 19 ст. ткалі старадаўняй тэхнікай «брань», аб чым сведчаць ручнікі з в. Касакоўка з арнаментам, які мае назву «сонейка ўзыходзячае» і «сонейка заходзячае».

Недахоп лёну ў гэтай мясцовасці імкнуліся кампенсаваць за кошт ткацтва сеткавых абрусаў. Аснову пракідвалі ў бярдо праз пэўныя інтэрвалы і пры ткацтве атрымоўвалася сеткавае палатно. Выткаўшы пэўны адрэзак, бралі іголку з ніткай і перапляталі ёй ніці вутка і асновы ў пэўных месцах, з'ядноўваючы іх — рабілі мярэжку. Такія сеткавыя рэчы мелі не толькі прыгожы выгляд, але і моц, ніколі не гублялі свой першапачатковы выгляд. Калі абрусы былі вытканы нават у 2 ніты, то яны мелі таксама знак сваёй мастацкай вартасці — 2 палавінкі (бёрды былі вузкія) з'ядноўвалі нешырокай палоскай звязаных шыдэлкам карунак, а з чатырох бакоў прышывалі самаробныя кутасы ці таксама карункі. Варта нагадаць, што беларускія кабеты ніколі не засцілалі стол кавалкам палатна, а заўсёды рупіліся прыдаць рэчы закончаны самастойны выгляд, уносячы сюды элементы пэўнай эстэтычнай вартасці.

Посцілкі тут у асноўным чатырох- і шасцінітовыя, маюць у аснове льняныя ніці, а вуток — воўна. Пераборныя посцілкі ў в. Васілевічы называюць «накладанне», яны маюць чорны фон і шматкаляровы ўзор. Такой тэхнікай пачалі ткаць з канца 19 ст. ў панскіх маёнтках, а потым перанялі яе і вясковыя кабеты. У 1950—70 гг. квяцістыя посцілкі лічыліся вельмі моднымі.

Некалі даводзілася майстрыхам вырабляць самастойна тканіну і для пашыву адзення, для сподняга — у аснове і вутку былі ніці льняныя, а для верхняга — аснова — лён, вуток — воўна. Таму, напрыклад, мужчынскія штаны з саматкнага сукна ў Стрэшыне называліся «суконнікі».

Ткацтва Жлобіншчыны прыкметна ўступае па тэхналогіі, арнаменту, асартыменту ад такога ж рамяства, напрыклад, Міншчыны. І тут сказаўся не недахоп талентаў, а пастаянная занятасць жанчыны на рабоце ў калгасе ды праблема сыравіны. Са слоў жанчын в. Майскае, лён ужо ў канцы 1920-х г. не сеялі на сваіх сотках, яго мелі права ўзяць тыя, хто апрацаваў яго ў калгасе. А вось у в. Васілевічы аж да вайны кожны гаспадар сеяў лён, сушыў яго ў печы.

Выткаўшы палатно, майстрыхі вышывалі на ім ўзоры. Вышытыя рэчы па вёсках сустракаюцца старыя і новыя, зробленыя ўручную і на машыне. Асартымент першых: ручнікі, абрусы, накідкі на падушкі, а другіх — фіранкі на вокны, накідкі на падушкі. Рэчы ручной вышыўкі заўсёды рыхтавалі майстрыцы кожная для сябе, а на машынную прымалі заказы, у тым ліку і ў в. Дворышча. У в. Чарцёж аднавяскоўцы лічаць самым лепшым майстрам гатавання і вязання Аляксандру Шацілу. А ў хаце Франі Давыдзенкі з в. Кіцін — сапраўдны маленькі музейчык: тут усе рэчы яна вышыла сваімі рукамі, хоць доўгія гады працавала свінаркай.

Самыя старыя з ацалелых вырабаў маюць узор са спалучэння чырвонага і чорнага колераў, а з 1950-х гг. стала моднай шматкаляровая гама. Тэхніка распаўсюджаных тут вышытых рэчаў: крыжык, гладзь, сцяжок, а ма-

шыннай — валік. Новая модная тэхніка вышыўкі стала распаўсюджвацца па вёсках Жлобіншчыны з 1980-х гг. — пачалі майстраваць дываны спецыяльнай іголкай, якая давала магчымасць атрымаць узор з неразрэзаных петляў. Такія дываны вышываe, напрыклад, Валянціна Рогава з в. Касакоўка.

У большасці вышытыя ўзоры крыжыкам запазычаны з альбомаў, якія выпускалі ў пачатку 20 ст. фірмы «Брокар і К°», «Рале і К°», і нават з абгортачнай паперы тых часоў. Прадукцыя гэтых фірм прыўнесла ў беларускі нацыянальны арнамент чужыя элементы і матывы. Сярод вышытых узораў таксама можна ўбачыць малюнкі, якія прапаноўваў часопіс «Работніца і сялянка» ў 1950-х гг. У Жлобіне прызнанымі аўтарытэтамі вышыўкі лічаць настаўніцу Алену Ген і журналістку Людмілу Шадукаеву, першая любіць вышываць гладдзю, другая — крыжыкам.

Пры ўваходзе ў кожную вясковую хату на падворку, плоце ці ў сенцах можна заўважыць кошыкі, сплеценыя з лазы. Лазапляценне — адзін з старадаўніх відаў народнай творчасці, які ўзнік раней чым, нават, апрацоўка дрэва — так лічаць археолагі. Умовы гаспадарання прымушалі беларусаў ствараць рэчы сваімі рукамі, карыстаючыся мясцовай сыравінай, таму не магла застацца па-за ўвагай і лаза, карэнні, кара, ляшчына, маздра дрэў, з якіх плялі патрэбныя ў хатнім побыце рэчы. У наш час асартымент лазяпляцення па вёсках захаваўся адзін — плятуць кошыкі з лазы для бульбы, а займаюцца такім рамяством тут у асноўным старыя. Майстры такой катэгорыі ёсць у в. Баршчоўка — Хомка Падшывалаў, Цімафей Сяргееў; у в. Ляды называюць Уладзіміра Сергіенку, Уладзіміра Рамянка, а ў в. Мормаль — Віктара Шатава. У в. Папаратнае з лазы плятуць бондары Віктар Шарнік, Павел Герцаў, якія могуць на заказ змайстраваць любую рэч і нават лапці. Лапці ў экспазіцыі невялічкага пакойчыка — музея пры сельскай бібліятэцы в. Папаратнае глядзяцца сівой архаікай і выклікаюць усмешку ў дзяцей. А вось была б тут інфармацыя аб тэхніцы лазапляцення, вядомай у Беларусі: паслойнае, простае, радамі, квадратнае, вяровачкай, ажурнае, спіральнае, крыжападобнае, — і паказана, якія з іх характэрны для сваёй мясцовасці, да таго ж хоць раз у месяц каб сюды запрасілі старэнькага майстра на гадзіну-другую, каб ён паказаў, як плясці, тады б не ў аднаго дзіцяняці ўзнікла б жаданне самому спасцігнуць сакрэты рамяства. Сёння ёсць па вёсках адзінкі такіх умельцаў, як Віктар Лапіцкі ў в. Рэкта, Аляксей Карпаў у в. Навозы. Асартымент іх вырабаў даволі разнастайны: вазы, цукерніцы, рамкі, кошычкі і іншыя. Да канца 1950-х гг. у Шчадрыне дзейнічала арцель па вырабу рэчаў з лазы. Сыравіны для такога рамяства хапала — лаза расла па берагах рэк, на заліўных лугах. Арцель у свой час лічылася значнай з'явай у культурным жыцці раёна.

Мясцовую сыравіну — гліну людзі выкарыстоўвалі пры вырабе ганчарных рэчаў і глінянай дзіцячай цацкі. Багатыя залежы на правым беразе Дняпра садзейнічалі росквіту ганчарнага рамяства. Можна меркаваць, што такое майстэрства тут існавала спрадвеку. Пісьмовыя крыніцы нагадваюць, што ў 1600 г. ў Стрэшыне існавалі цэхі ганчароў, якія налічвалі адных толькі ганчароў 27 чалавек. Гэта сведчыць, што на ганчарныя вырабы меўся значны попыт.

У канцы 1920-х гг. на Жлобіншчыне працавала 12 майстроў, а ў 1930-я гг. — 2. Цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады садзейнічалі адраджэнню гэтага рамяства. У Жлобіне і Стрэшыне былі створаны майстэрні ганчароў. Як успамінае вядомы беларускі пісьменнік, тэлежурналіст, ураджэнец в. Мормаль Уладзімір Содаль, у пасляваенныя гады ў Жлобіне на кірмашы ён бачыў мноства ганчарнага посуду, і яму запомнілася, як спявалі хорам збаны.

Апошнім таленавітым ганчаром ў Стрэшыне, які памёр у 1980-х гг., быў Андрэй Яненка. Сакрэты яго ўмельства пераняў Уладзімір Пакроўскі, які жыве ў в. Затон. Добра ведае традыцыі мясцовага ганчарства і Юзаф Марчэўскі.

У былых цэнтрах ганчарнага рамяства сёння працуюць толькі цагельныя заводы ў Стрэшыне, Змяёўцы і інш.

Не магла застацца па-за ўвагай умельцаў такая сыравіна, як дрэва, паколькі Беларусь спрадвеку славіцца лясамі. Разьба па дрэву заўсёды лічылася мужчынскім заняткам. З дрэва будавалі хаты, майстравалі мэблю, рэчы хатняга ўжытку, музычныя інструменты. На запыт аб мясцовых лепшых столярах жыхары в. Чырвоны Бераг назвалі Івана Жураўлёва, Уладзіміра Літвінку, у в. Чарцёж — Міхаіла Ліпніцкага. Мастацкі ўзровень прац столяраў в. Майскае Сямёна Кавалёва, Пятра Селіванава бачны ў аздабленні хат гэтай мясцовасці, а першы яшчэ размалёўваў прасніцы, ложкі, сані. Так, у в. Абольцы ляснік

Віктар Гаўрыленка адмысловы столяр і пячнік.

У наш час адна катэгорыя столяраў працуе ў калгасных і саўгасных майстэрнях. Тут іх творчыя захады стрымліваюцца нормамі дзяржстандарту. Нягледзячы на гэта, іх працы ў пэўным сэнсе маюць навуковую каштоўнасць, бо яны паўтараюць мясцовыя традыцыі. Другая катэгорыя ўмельцаў — настаўнікі працы, малявання, чарчэння агульнаадукацыйных школ, вучылішчаў, якія закончылі навучальныя ўстановы, дзе пазнаёміліся з апрацоўкай дрэва. Так, у школе в. Радуша ў свой час працавалі настаўнікі Міхаіл Паркалаў, Драздоў. Іх хаты адразу прыцягваюць увагу сваім аздабленнем. Уяўляе цікавасць творчасць Пятра Лісава са Жлобіна. Ён не толькі адмыслова аздобіў сваімі рукамі хату, але майструе на такарным станку скульптурную пластыку малых форм: фігуркі звяроў, падсвечнікі і інш. Адным з вядомых разьбяроў Жлобіншчыны, які ў сваёй творчасці імкнуўся спаборнічаць з прафесійнымі скульптарамі, быў Міхаіл Івінскі. Ён пачаў займацца разьбой яшчэ ў 1930-я гг. З партрэтнай работай «Варашылаў на манеўрах» прымаў удзел у дэкаднай выставе беларускага мастацтва ў Маскве ў 1940 г. У рэльефе ён выканаў некалькі тэматычных кампазіцый, сярод якіх «Разведка», «У абарону міру», «Рэйкавая вайна», «Наша артылерыя». У 1970-х гг. майстэрства разьбяра дасягнула значнага ўзроўню, яго работа «Партызан» знаходзіцца ў экспазіцыі Жлобінскага краязнаўчага музея.

За стагоддзі ўзнік асобны від народнага мастацтва — пісанкі, размаляваныя ўзорамі чырвоныя велікодныя яйкі. На Жлобіншчыне ўсюды, дзе мы былі, старыя людзі казалі аб крашанках, г.зн. яйках, пафарбаваных у лушпінні цыбулі, а ў в. Навозы кажуць «цыбульніку», у Майскім — «шалушкай», у Васілевічах — «шалупкамі». Лушпінне цыбулі на ноч замочвалі, а назаўтра ў ім варылі яйкі. Каб колер быў ярчэйшым, у в. Чырвоны Бераг сюды дадавалі расол ад кіслых буракоў.

На Жлобіншчыне была вядома такая тэхніка пісанак, як аплікацыя, калі лісточкі ад маладзенькай бярозкі, парэчак прыкладвалі да яйка, загортвалі ў марлю і варылі ў лушпінні цыбулі, на чырвоным яйку атрымоўваліся белыя ўзоры.

Такая народная творчасць, як пекарская пластыка мае непарыўную сувязь з вясельным абрадам, двума хрысціянскімі святамі — Дабравешчаннем (Звеставаннем) і Пяцідзесятніцай. Цеста з мукі — прыдатная сыравіна для выяўлення скульптурных здольнасцей жанчын. Беларускія майстрыцы імкнуліся спячы не толькі смачныя пірагі, булачкі, пернікі, але клапаціліся і аб іх аздабленні. Нават у такім жанры народнай творчасці магчыма прасачыць, як даюць аб сабе знаць мясцовыя традыцыі, дзе пэўны тып аздаблення паўтараецца толькі ў адной або некалькіх суседніх вёсках. Свае адметныя рысы мае пекарская пластыка і па вёсках Жлобіншчыны. Напрыклад, у рэгіёне Чырвонага Берага рабілі некалі для дзяцей булачкі ў выглядзе птушачкі, якія называлі «сарокамі». Майстравалі іх так: раскатвалі цеста ў круглы пасак даўжынёй 6—8 см. Адзін канец прыўзнімалі і ляпілі галоўку з дзюбкай, другі — таксама прыўзнімалі, загіналі ў адваротны бок, потым наразалі нажніцамі, што імітавала хвост птушкі. Вясельныя караваі таксама ўпрыгожвалі птушачкамі такой жа формы, толькі спярша па краі размяркоўвалі круглыя шарыкі і «садзілі» на іх сарок. Да Дабравешчання і Пяцідзесятніцы пяклі пернікі, булачкі, якія таксама мелі выяву птушачак.

Народная кулінарыя — таксама сур'ёзны аб'ект у справе навуковага даследавання культуры. Майстэрства прыгатавання ежы — кухня — з'яўляецца адным з элементаў матэрыяльнай культуры. Пры даследаванні пытанняў народнай кулінарыі яна цікавая ў першую чаргу як тыповая з'ява, што знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі элементамі культуры, напрыклад, з мастацтвам: пісанкі, пекарская пластыка. Народная кухня гэтага рэгіёна дазваляе прасачыць, як многія характэрныя асаблівасці ежы ўстойліва захоўваюцца нават тысячагоддзямі, маючы цесную сувязь з рэлігіяй. Цікава было пачуць па вёсках Жлобіншчыны пра 3 розныя рэцэпты прыгатавання ежы, названай адным і тым жа тэрмінам — клёцкі. Першы рэцэпт — дзерлі бульбу, адцэджвалі, дадавалі мукі ці крухмалу, качалі ў далонях невялікія галушкі і кідалі варыць у кіпячонае малако. Другі — у сярэдзіну галушак, толькі большага памеру, закладвалі мясны фарш і варылі ці тушылі. У вёсках Чыровны Бераг, Майскае іх называюць яшчэ «калдунамі». Трэцяя — пяклі тоненькія блінчыкі з крухмалу, наразалі і варылі ў малацэ, такую ежу ў в. Чарцёж таксама называлі клёцкамі.

Да складаных стравы патрэбна аднесці мачанку. Адны рыхтавалі так: варылі свіное мяса, рэбры, костачкі, каўбасу і ў такі навар да-

баўлялі некалькі лыжак мукі, потым прыправы: цыбулю, кмен. Мачалі бульбянымі бліна-мі — дранікамі. Для мучных бліноў рэцэпт мачанкі быў іншы: сушаны сыр разбівалі на кавалачкі, дадавалі смятаны, масла і тушылі ў печы. Яўрэі рабілі мачанку з курынага ці трусінага мяса.

У святочныя дні, у тым ліку і нядзелю, гатавалі ежу не такую, як на кожны дзень. Напрыклад, раніцой кожнага дня маглі для мужчын хутка спячы снеданне з падсмажанага сала, куды ўбівалі некалькі яек. На абед у святочныя дні з яек рыхтавалі яешню: разбівалі іх дзесятак ці два, залівалі свежым малаком, дадавалі масла, цукар, соль і пяклі ў печы пасля таго, як пагараць усе дровы. Тут у яешню не дадавалі мукі, як, напрыклад, у Смаргонскім раёне.

У большасці дзеці елі малочнае і тое, што і дарослыя, але для іх рыхтавалі і спецыяльную страву. Так, напрыклад, адзін са значных прысмакаў у в. Пякалічы рыхтавалі наступным чынам. Варылі каліну, цёрлі, адцэджвалі, жмых выкідвалі. Асобна варылі нарэзаны кавалкамі гарбуз, адцэджвалі, таўклі і дадавалі калінавы сок. Усё перамешвалі, салілі, сыпалі, калі меўся цукар, клалі масла і ставілі ў печ тушыць.

Усюды па рэспубліцы варылі абабраную бульбу, таўклі, запраўлялі падсмажаным салам з цыбуляй ці маслам і свежым малаком. Гэтую страву на Жлобіншчыне называюць «топчанка».

За доўгія стагоддзі беларусы паназапасілі значны вопыт народнай медыцыны. Карысталіся нашы продкі травамі, выкарыстоўвалі для гэтай мэты і агародніну, хлеб, сала, ягады, самастойна рыхтавалі мазі. За час паездкі па вёсках Жлобіншчыны давялося пачуць ад людзей сталага ўзросту рэцэпты лекаў у вёсках Чырвонабярэжская Слабодка, Чарцёж, Чырвоны Бераг, г.п. Стрэшын. Народная медыцына Жлобіншчыны, так як і наогул усёй Беларусі амаль недаследавана.

Па вёсках Жлобіншчыны некалі мелася катэгорыя ўмельцаў, якія самі майстравалі музычныя інструменты з дрэва, кары, рогу, саломы, пер'я, гліны, скуры. Нам не ўдалося сустрэць майстра такой катэгорыі, але памяць пра іх захавалася сярод аднавяскоўцаў. У большасці самі майстры былі і музыкантамі. Так, у в. Селішча балалайкі майстраваў яшчэ пасля вайны Андрэй Сіманенка, а ў Майскім у 1930-я гг. вырабляў гармонікі, балалайкі столяр Фёдар Кавалёў. Яшчэ да вайны рэдка можна было сустрэць вёску, дзе не жыло б сваіх музыкаў. Так, у в. Навозы на працягу 1940—80-х гг. жылі музыканты Ян Казлоўскі (іграў на скрыпцы), Юзік Каліноўскі (на баяне, а яго бацька на гармоніку), Павел Некрашэвіч і Андрэй Шчыгельскі (на гармоніку). Кожны з музыкаў меў яшчэ барабан. У вёсцы Чарцёж прыпамінаюць свайго музыку Лявона Ліпніцкага, а ў Чырвонабярэжскай Слабодцы іграў на гармоніку і меў бубен Міхаіл Руткоўскі, у в. Зломнае — Барыс Сасноўскі, у Чырвоным Беразе — Майсей Кісялёў. У Стрэшыне пасля вайны жылі музыкі Гаўрыла Шыхаў і Аляксандр Рагаўцоў, сёння тут 7 гарманістаў, столькі ж баяністаў, адзін балалаечнік, жыве тут самадзейны кампазітар Валерый Міхальцоў. У 1960-х гг. меўся духавы аркестр. Гісторыя музычнай культуры Стрэшына чакае сваіх даследчыкаў, адсюль выйшлі многія музыканты, настаўнікі спеваў. Ілля Сімановіч з Чырвонага Берага іграе на гармоніку, піша вершы, малюе карціны алеем на рэлігійную тэматыку, якія можна пабачыць у храмах Стрэшына і в. Побалава Рагачоўскага раёна.

Адзін з яскравых здабыткаў нацыянальнай культуры — народны касцюм. Некалі кожная жанчына павінна была не толькі ўмець выткаць палатно, але і пашыць бялізну для сябе, мужа, дзяцей. Прастата крою рабіла гэтую задачу пасільнай нават для самых няздатных да такога рамяства. Верхняе адзенне звычайна неслі шыць майстрам: шаўцам, краўцам. Існуе магчымасць узнавіць касцюм Жлобіншчыны на працягу апошніх 100 гадоў па здымках, якія ёсць у кожнай хаце. Асобныя дэталі шляхетнага касцюма захаваліся ў в. Навозы.

Іншы бок мастацкай творчасці на Жлобіншчыне раскрываюць печнікі. Цудоўны атрымаўся б альбом, калі б музей дадумаўся сфатаграфаваць печы, печкі, пліты ў вёсках і мястэчках, тым больш, што сам час падганяе парупіцца такое зрабіць — газ прыйшоў і ў сельскую мясцовасць, старыя формы печы разбураюцца. У пабудове такіх рэчаў адлюстроўваюцца мясцовыя традыцыі, адчуваецца стыль работы кожнага майстра, яго вынаходства. Па вёсках бачна — адной формы печы стаяць у кухні з цэглы, іншай — у зале часам з кафлі. Мастацтва тут дае аб сабе знаць у суразмернасці, прапарцыянальнасці асобных дэталяў да цэлага памеру формы печы.

Умельству кавалёў некалі вучыліся не менш года. Усе кавалі цяпер працуюць на

прадпрыемствах ці ў калгасе, дзе іх сфера дзейнасці зводзіцца да рамонту і вырабу дэталяў для сельскагаспадарчых машын, але можна быць упэўненым: многія з іх так, як і іх продкі, змаглі б змайстраваць і плуг, і жырандоль. Вядомыя кавалі Аляксей Пазняк з в. Забродзе, Іван Дашкоўскі з Чырвонага Берага.

Сёння ў кожнай вёсцы можна налічыць не менш дзесятка кабет, якія вяжуць. Прызнаным аўтарытэтам па вязанні з'яўляюцца Ядвіга Новікава і Аляксандра Пазнякова з в. Чырвоны Бераг, Марфа Аляксеева з в. Баршчоўка. У в. Радуша вядомы майстры Галіна Малашанка, Наташа Горцава, Раіса Кардаш.

Пасля такога кароткага агляду работы носьбітаў матэрыяльнай культуры Жлобіншчыны зразумела, што таленты ў раёне не перавяліся, ён можа па праву ганарыцца перад усім светам творчым патэнцыялам сваіх людзей і эстэтычным узроўнем мясцовай культуры. Жыццё падказвае — наспеў час неадкладна парупіцца занатаваць беларускі фальклор кожнай вёскі, невялікага гарадка.

М.П.Жабінская.

Мова Жлобінскага раёна

Народная мова Жлобінскага раёна — беларуская. Народныя гаворкі на тэрыторыі Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці маюць свае адрозненні ад беларускай літаратурнай мовы, з якой яны вельмі блізкія. Моўныя мясцовыя адрозненні абумоўлены гісторыяй краю, яго геаграфічным становішчам.

Паводле «Этнографической карты белорусского племени» (1903) акадэміка Я.Ф.Карскага, жлобінскія гаворкі ў міжрэчы Бярэзіны і Дняпра характарызаваліся **ўмераным аканнем і вымаўленнем цвёрдага гуку** *р*. На «Диалектологической карте русского языка в Европе» (1914, складзена Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй) яны адносіліся да **паўднёва-заходняга дыялектнага масіву**. Беларускі лексікограф І.І.Насовіч і вядомы этнограф, фалькларыст Е.Р.Раманаў лічылі беларускія гаворкі спачатку адзіным масівам, які адчуў уплывы суседніх моў з усіх бакоў. На поўдні І.І.Насовіч (1850) вылучаў зону ўплыву ўкраінскай мовы ў Беліцкім павеце (сучасны Гомельскі раён). Е.Р.Раманаў вылучае абшар гаворак ад Нёмана і ад Прыпяці да Дзвіны і на захад ад Сажа на аснове сямі фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей як цэнтральныя (1918). Сюды ўваходзіць і абшар Жлобіншчыны. Значны працэнт наяўнасці ўкраінізмаў у Жлобіне ён тлумачыць наяўнасцю воднага шляху па Дняпры.

Мясцовыя гаворкі Жлобінскага раёна паводле групоўкі дыялектаў (1969) на тэрыторыі Беларусі адносяцца даследчыкамі да паўднёвай групы гаворак, той яе пагранічнай часткі, якая цалкам увахо-дзіць у склад сярэднебеларускіх гаворак. Апошнія займаюць сярэдняе становішча паміж паўночна-ўсходнім дыялектам і паўднёва-заходнім. Адзначаецца тут і паралельнае ўжыванне асаблівасцей слоў паўднёва-заходняга дыялекту і паўночна-ўсходняга. Пашырэнне моўных з'яў, назваў прадметаў, з'яў у жлобінскіх гаворках з'яўляецца пагранічным, ускраінай паўднёва-заходняга ці паўночна-ўсходняга дыялекту. Радзей адзначаюцца мясцовыя рысы, мясцовыя назвы, якія пашыраны толькі на тэрыторыі Жлобіншчыны. Часта словы ці моўныя асаблівасці маюць толькі ўсходняе пашырэнне ў складзе сярэднебеларускіх гаворак.

Фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, часткова лексічныя асаблівасці і наогул уся моўная сістэма Жлобінскага раёна вывучалася пасля Вялікай Айчыннай вайны. Усё гэта адлюстравана ў матэрыялах і картах «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963), у якім даецца мова шасці населеных пунктаў: Ра́душа, Навікі́, Каро́ткавічы, Чо́рная Ві́рня, Праскурні́, Шы́хаў. Мова в. Шыхаў вывучалася ў 1970 г. па праграме «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа», рукапіс якога захоўваецца ў Інстытуце мовазнаўства НАНБ. У выніку 20-гадовага (з 1971) вывучэння слоў (назваў) на тэрыторыі Беларусі сабрана вялікая колькасць слоў па 56 тэматычных групах, складзены «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак у пяці тамах» (т. 1—2, 1993, 1994; т. 3—5, 1996—98). Абследаваны гаворкі двух населеных пунктаў — вёсак Шыхаў, Каротквічы. У ат-

ласе больш за 25 000 слоўнікавых адзінак, 1801 карта, дзе паказана пашырэнне слоўназваў. Матэрыялам для выдання атласа з'явіліся каля 4000 найменняў прадметаў, прыкмет, працэсаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Па кожным найменні або паняцці складзена асобная карта ўжывання, пашырэння слоў.

***

Тэмп мовы ў людзей Жлобінскага раёна павольны, вельмі выразны, скарагаворкі няма. Усе галосныя вымаўляюцца як падвоеныя тыпу *маладáя — мааладаадаиаа*. У гаворках Жлобінскага раёна, як і ў беларускай літаратурнай мове, старажытныя галосныя *о*, *а* не пад націскам, у першым складзе перад націскам *а* заўсёды пасля цвёрдых зычных вымаўляюцца як *а* (*вадá*, *смалá*, *самá*, *казáць*). Ва ўсіх іншых складах перад націскам і пасля націску ненаціскныя галосныя *о*, *а* супадаюць у вельмі выразным гуку *а* незалежна ад якасці націскнога галоснага і суседніх зычных. Напрыклад: першы склад перад націскам — *насíць*, *бяры́*, *кадýшка*, *вазóк*; другі склад перад націскам — *садавíк*, *малаціць*, *кажаны́*, *саладýха*, *чарапóк*; далейшыя склады перад націскам — *напапарабíлі*, *напалавалачы́лі* (дабра); абсалютны пачатак слова — *агарóд*, *агóнь*, *агадáць*, *агінáць*, *ачужáцца*; паслянаціскны неканцавы адкрыты склад — *мíлая*, *чáшачка*; канцавы і неканцавы закрыты склад — *мáмачка*, *я́блыкаў*, *вéдаць*, *гóрад*. Такое вымаўленне *а* без змены галосных у розных становішчах (у залежнасці ад націску, перад ім і пасля яго) называецца н е д ы с і м і л я т ы ў н а е п о ў н а е (м о ц н а е) а к а н н е.

Для гаворак Жлобінскага раёна характэрна моцнае яканне. Пасля мяккіх зычных вымаўляецца гук *'а(я)* ва ўсіх пазіцыях на месцы старажытных *е* і *а* і незалежна ад націскнога галоснага: першы склад перад націскам — *вяснá*, *бядá*, *бягóм*, *сядзéць*, *спяліць*, *мякíна*, *сянны́*, *пярýн*; другі склад перад націскам — *вяснавы́*, *спялавáты*, *вясялýн*, *ляснікóў*, *вясялéнькі*; трэці склад перад націскам — *зялянкавáты*, *вярацянó*, *сямянніковы*; абсалютны пачатак слова — *ягадзінка*, *якрáз*, *ясянёвы*; паслянаціскны неканцавы адкрыты склад — *вóзяра*, *сёлята*; канцавы і неканцавы закрыты склад — *вóсень*, *хлóпец*, *вíшням*; канцавы адкрыты склад у назоўным і вінавальным склоне адзіночнага ліку назоўнікаў ніякага роду з мяккай асновай — *камéння*, *вéцця*.

Аднак пры моцным яканні па жаданні гаворачага адзначаецца часам вымаўленне ў гэтых становішчах гуку *е*, як у масіве паўднёва-заходняга дыялекту, напрыклад: *веснá*, *верацянó*, *зеленавáты*, *вóсень*, *хлóпец*. У прыстаўцы *пера-* вымаўляецца гук *е* і скарочаны варыянт гуку *ъ*: *перамы́ць*, *пераня́ць*, *пьерапёлка*, *пъраня́ць*, *пърайéхаць*. У канцовым адкрытым складзе ў канчатку меснага склону адзіночнага ліку, напрыклад у в. Радуша, паралельна адзначаецца вымаўленне *е* (у *хáце*, у *лéсе*) ці як у вёсках Чорная Вірня, Шыхаў — *і* (*у хáці*, *у лéсі*). Вымаўленне з *і* пашырана па ўсёй Беларусі, а вымаўленне з *е* найбольш канцэнтруецца ў паўднёва-заходнім дыялекце. У в. Шыхаў адзначаецца я к а н н е д ы с і м і л я т ы ў н а е б е л а р у с к а г а т ы п у (жыздрынскае), калі перад націскным *а* на месцы старажытнага *е*, *ѣ* вымаўляецца *і* (*німá*, *вíснá*, *пітá*, *зíмля*). Перад іншымі націскнымі галоснымі вымаўляецца *'а(я)* (*сядзéць*, *вядзí*, *нясí*, *нясý*, *бярóм*, *бяры́*). Такое вымаўленне, відаць, абумоўлена пагранічным становішчам гаворкі.

Гаворкі Жлобінскага раёна, як у масіве сярэднебеларускіх гаворак, маюць свае мясцовыя асаблівасці. Напрыклад, на месцы старажытнага *у* вымаўляецца *ы*: *сыбóта* (вёскі Кароткавічы, Навікі, Праскурні, Радуша, Чорная Вірня, Шыхаў).

Можна адзначыць вымаўленне гуку *у* на месцы старажытнага *ы* ў форме дзеяслова *былá* (была — вёскі Чорная Вірня, Шыхаў). Спалучэнні з санорнымі патрабуюць ва ўсіх жлобінскіх гаворках з'яўлення ў пачатку слова прыстаўнога і тыпу *іржаны́*, *ільняны́*. Па жаданні пачатковы галосны можа не вымаўляцца (*льняны́*). У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра, каля Шыхава, на левым беразе Бярэзіны, у суседняй в. Горваль Рэчыцкага раёна, паралельна з агульнабеларускім вымаўленнем *даў*, *казáў* ужываецца форма *доў*, *прóўда*, *казóў*, *узёў*. Паводле даследавання Н.Т.Вайтовіч (в. Лучын Рагачоўскага раёна) і іншых назіранняў такое вымаўленне адзначаецца і ў традыцыйных гаворках Слаўгарадчыны (Пасожжа): *тра́ўка — тро́ўка*, *кляў — клёў*. Відаць, гэта рэшткі агульнабеларускай старажытнай рысы. На правабярэжжы Бярэзіны і Дняпра, а таксама па Прыпяці да р. Случ і на захад ад Убраці пераход *е* ў *ё* не адзначаецца. Вельмі пашыранае вымаўленне слова *бёрда* на паўночным усходзе

рэспублікі ў жлобінскіх гаворках (вёскі Праскурні і Шыхаў) мае паралельнае ўжыванне формы і без ё (*бе́рда*). Дзве формы — *бе́рда* і *бёрда* — суцэльным масівам пашыраны ў басейне Прыпяці. Літаратурная форма слова *далёка* пашырана ў жлобінскіх гаворках, але ўжо на правабярэжжы Бярэзіны (і ніжэй Дняпра) вымаўляецца амаль толькі *далёка*. І зноў жа ў басейне Прыпяці пануе форма *далёка* паралельна з *дале́ка*.

У словах **лес**, **хлеб**, **на назе́** не адзначана наяўнасць закрытых галосных на месцы старажытнага яця (ѣ) пад націскам. З паўднёвага захаду да Жлобіншчыны падыходзіць пашырэнне закрытых галосных (звужанае вымаўленне *е*, на слых з і-падобным прыступам) — *лёс*, *хлёб*, *на назе́*. Басейн Прыпяці з вымаўленнем «закрытых» (*кёнь*, *дём*) блізка падыходзіць да Бярэзіны і Дняпра. У гаворках Жлобінскага раёна пашырана агульнабеларуская форма дзеясловаў з націскной галоснай пасля шыпячых у інфінітыве і формах прошлага часу тыпу *маўча́ць*. На паўночным усходзе адзначаецца масіў з паралельным ужываннем формаў з націскным галосным *э* тыпу *маўча́ць*. Як і ў большасці беларускіх гаворак, пашырана вымаўленне займеннікаў *мы*, *вы*. Аднак ужо на правабярэжжы Бярэзіны і Дняпра, у басейне Пцічы, Случы, ніжняй Прыпяці адзначаюцца паралельныя формы *му*, *ву*. Побач з агульнапашыраным словам *быў* адзначаецца вымаўленне *буў*. На месцы старажытнага *ы* пасля губных зычных у канчатках назоўнікаў мужчынскага роду назоўнага склону множнага ліку вымаўляецца толькі *ы*: *паграбы*, *хлявы*. Вельмі блізка да Бярэзіны пашырана вымаўленне *у* замест *ы*: *паграбу́*, *хляву́*.

Характэрнай асаблівасцю для Жлобіншчыны з'яўляецца вымаўленне цвёрдага *р*. Праз вёскі Праскурні і Шыхаў Жлобінскага раёна і Сведскае Рэчыцкага раёна праходзіць размыты пояс вымаўлення *р* цвёрдага і *р'* мяккага. Цягнецца ён з Брэстчыны, пераважна з правабярэжжа Прыпяці, на ўсходзе Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Гук *ф* у запазычаных словах замяняецца гукам *х*, *п*, спалучэннем *кв*, *хв* і інш. Пашырана, напрыклад, вымаўленне слова *квасо́ля* (*фасо́ль*). На ўсходзе да Дняпра падступае ўжо паўночна-ўсходні масіў пашырэння формы *квасо́ль*.

Адрозніваюцца таксама глухія і звонкія ў канцы слова: *хлеб*, *нож*, *луг*, але: *кот*, *наш*, *мох*. На паўночным захадзе ад Жлобіншчыны — на Бабруйшчыне і ў бліжэйшай в. Дворышчы Светлагорскага раёна паралельна адзначаецца вымаўленне глухіх-звонкіх у канцы слова: *хлеп*, *нош*, *плух*, *кот*, *мох*. Ёсць выпадкі, калі звонкія зычныя не адрозніваюцца ў сярэдзіне слова: *каска*, *загатка*, *кошка*, *шапка* (в. Праскурні).

Перад націскнымі *о*, *у* ўжываецца зычны *в* (*во́зера*, *ву́ха*). Як і ва ўсіх гаворках Беларусі на Жлобіншчыне ва ўказальных займеннікаў *гэ́ты*, *гэ́ны* пануе прыстаўны зычны *г*(γ). Паралельна з *гэ́ты*, *гэ́ны* пашырана вымаўленне займеннікаў *э́ты*, *э́ны*.

З'яўленне зычнага ёта *j*(*й*) пасля спрадвечных мяккіх губных *б*, *п*, *в* ушчыльную падыходзіць да правага берага р. Бярэзіна: *п'яць*, *в'я́не*, *жэрэб'я́* (*пйаць*, *вйа́не*, *жэрэбйа́*). У гаворках Жлобінскага раёна, як у літаратурнай мове і ў большасці беларускіх гаворак, такое з'яўленне зычнага ёта *j*(*й*) перад *а* не адзначаецца.

Для Жлобіншчыны характэрна наяўнасць мяккіх *ць* ці *дзь* у пазіцыі перад старажытным *е*, *і*, *ѣ* (*цень*, *дзень*, *ці́ха*; *дзед*, *це́ста*).

У гаворках раёна мае месца спалучэнне *шн* у словах тыпу *мало́шны*. У правабярэжжы Бярэзіны больш частым, нават пануючым з'яўляецца спалучэнне *чн* тыпу *мало́чны*. Такое ж становішча і са спалучэннем *шн* у вымаўленні слова *рушні́к*. На паўднёвым захадзе пашырана форма *ручні́к*.

Граматыка. Марфалагічныя асаблівасці. Назоўнік. На Жлобіншчыне, як і ў гаворках паўночнага ўсходу левабярэжжа Дняпра, побач з агульнабеларускім націскным канчаткам *-ы* у месным склоне адзіночнага ліку неадушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду з зацвярдзелай асновай маюць найбольшае пашырэнне (*на канцы́*, *на ключы́*). Вельмі пашыраны канчатак *-у* тыпу *на канцу́*, *на ключу́*. Радзей ужываецца *-э* тыпу *на канцэ́*, *на ключэ́*. Такі ж малюнак у неадушаўлёных назоўніках мужчынскага роду з мяккай асновай: *на пні* (пануе), *на пню* (як і на р. Сож), *на пне*.

Ненаціскны канчатак меснага склону адзіночнага ліку адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду з цвёрдай асновай мае канчатак *-у*: *аб сы́ну* (пануе) і менш пашыраны канчатак *-е*: *аб сы́не*.

Ненаціскны канчатак творнага склону адзіночнага ліку назоўніка *гусь* мае форму (пануючую) *гу́ссю*. На правабярэжжы Бярэзіны, як і ў паўднёва-заходнім дыялекце, пашыраны формы *гусёю*,

гу́сяй, *гу́сяю*. Такое ж пашырэнне мае форма адзіночнага ліку назоўніка *мыш*: *мы́шшу*. На захадзе ад Бярэзіны пашыраны як паралельныя формы *мышо́ю*.

У назоўным склоне адзіночнага ліку назоўнікі, якія азначаюць маладых істот, маюць форму паўднёва-заходняга дыялекту *цяля́*, *парася́*. Тут жа назіраецца паралельнае ўжыванне, напластаванне паўночна-ўсходняй формы: *цялёнак*, *парасёнак*, а таксама *дзіцёнак* на пануючае пашырэнне формаў тыпу *дзіця́*.

Для творнага склону характэрна форма назвы маладых істот паўночна-ўсходняга дыялекту: *цялёнкам*, *парасёнкам*, якая паралельная да пануючай Маладзечанскай—Мінскай—Бабруйскай формы *цялём*, *парасём*. Да правабярэжжа Бярэзіны прымыкае «тураўская» зона пашырэння формы тыпу *цяля́м*.

У месным склоне паралельна ўжываюцца формы паўночна-ўсходняга дыялекту: *аб цялёнку* і паўднёва-заходняга дыялекту: *аб цяля́ці*.

На Жлобіншчыне мае пашырэнне слова *ма́тка* паўночна-ўсходняга дыялекту; форма *ма́ці*, якая цяпер пануе ў паўднёва-заходнім дыялекце, таксама паралельна адзначаецца, як больш старажытная, на тэрыторыі міжрэчча Бярэзіны і Дняпра.

Множны лік. У назоўным склоне пануе агульнабеларускі націскны канчатак *-ы* ў назоўнікаў мужчынскага роду з цвёрдай асновай (*ствалы́*, *дубы́*, *лагі́*). Падыходзіць пашырэнне з паўночнага захаду да Жлобіншчыны (в. Здудзічы Светлагорскага раёна) формаў тыпу *сталы́*, *дубы́*.

Пасля мяккіх і зацвярдзелых зычных канчатак *-і*, *-ы* (*кавалі́*, *нажы́*). З захаду да Бярэзіны наступае Нёманска-Прыпяцка-Бярэзінскі масіў, дзе паралельна ўжываюцца агульнабеларускія формы на *-е*, *-э*: *кавале́*, *нажы́*.

Пашырана форма *бало́та*, але на правабярэжжы Бярэзіны больш часта адзначаюцца формы назоўнага склону множнага ліку *бало́та*, *балата́*.

З асновай на *к* у назоўным склоне множнага ліку ўжываецца агульнабеларускі ненаціскны канчатак *-і*: *дзеўкі*, *хусткі*. Да Бярэзіны з захаду падыходзіць масіў канчатка (паралельны) ужо пад націскам: *дзяўкі́*, *хусткі́*.

У родным склоне множнага ліку назоўнікі жаночага роду з цвёрдай асновай маюць дзве формы, як і на астатняй тэрыторыі Беларусі (*хат*, *сцен* і *ха́таў*, *сце́наў*).

У давальным склоне множнага ліку адзначаны толькі назоўнікі мужчынскага роду з цвёрдай і зацвярдзелай асновай з націскным канчаткам *-ам*: *дубам́*, *лугам́*, *нажам́* і няма раней пашыранага канчатка давальнага склону *-ом*: *дубо́м*, *луго́м*, *нажо́м*, якія больш сустракаюцца на паўднёвым захадзе рэспублікі.

Пры пануючым агульнабеларускім двухскладовым канчатку творнага склону множнага ліку назоўнікаў *-мі* (*за дама́мі*) на Жлобіншчыне адзначаны канчатак *-амы* (*за дама́мы*).

У месным склоне множнага ліку назоўнікі мужчынскага роду з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычны маюць агульнабеларускі канчатак *-ах* (*у ляса́х*, *на нажа́х*) і рэдка адзначаны націскны канчатак *-ох*, які тут быў пашыраны раней: у *ляcóх*, *на нажо́х*.

У месным склоне множнага ліку адзначаны таксама агульнабеларускі канчатак *-ях* (*аб людзя́х*, *у грудзя́х*) і форма з націскам на першым складзе (*аб лю́дзях*, *у гру́дзях*).

У гаворках Жлобінскага раёна пашырана ўтварэнне мужчынскага роду *я́блык*, як і ў Мінска-Гродзенска-Полацка-Віцебска-Бабруйскім кліне, а таксама пашырана ўтварэнне назоўніка ніякага роду *я́блыка*, якое пашырана ў Гродзенска-Бабруйска-Магілёўска-Віцебскім поясе. Тут адзначаецца *маё брыва́*, *маё брыво́*, як у паўднёва-заходнім дыялекце, а таксама *маё брывіна́*, *маё броў*, як у паўночна-заходнім дыялекце.

Прыметнік. Гаворкі Жлобіншчыны маюць націскны канчатак *-ы* мужчынскага роду тыпу *малады́* і ненаціскны — *но́вы*.

У прыметніках жаночага роду пад націскам канчатак *-ая* (*маладая́*) і не пад націскам таксама *-ая* (*но́вая*), як і ў літаратурнай мове. Толькі ў асобных населеных пунктах адзначаецца сцягнутая кароткая форма *маладá*, *но́ва* і *но́вая*.

Прыметнікі ніякага роду маюць пад націскам агульнабеларускі канчатак *-ое* (*маладо́е*) і не пад націскам агульнабеларускі канчатак *-ае* (*но́вае*).

У месным склоне пад націскам пашыраны агульнабеларускі і літаратурны канчатак *-ым* (*аб малады́м*) і паўднёва-беларускага (Гродна—Мінск—Рагачоў—Крычаў) абшару *-ом* (*аб маладо́м*).

Большасць склонавых формаў прыметнікаў у гаворках Жлобінскага раёна такія ж, як у беларускай літаратурнай мове. У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра знаходзяць пашырэнне «дрыгавіцкія» формы адноснага мясцовага прыметніка ад слова *карóва* — *карóвяча*, *карóўяча* (в. Праскурні Жлобінскага раёна і Горваль Рэчыцкага раёна). Прыметнік *карóўя мáсла* трэба лічыць запазычаным з усходу.

Пашыраны агульнабеларускія і літаратурныя формы адносных прыметнікаў *свіны́*, *гусі́ны*, *курыны́*.

Займеннік. Той. Найбольш з усходу, на левабярэжжы Дняпра (ад в. Майсееўка Светлагорскага раёна) паралельна ўжываюцца формы *той* і *тэй*.

Усе. На тэрыторыі Жлобіншчыны праходзіць размыты пояс (палеска-віцебска-магілёўскі) пашырэння формы назоўнага склону множнага ліку азначальнага займенніка *увесь* (в. Чэрнін Светлагорскага раёна, в. Навікі Жлобінскага раёна) — *усі́*. Недалёка на захадзе і поўдні адзначаецца форма *усе́* з закрытым *е́*. Пануючай з'яўляецца агульнабеларуская і літаратурная форма *усе́*.

Наш. Ваш. Пашыраны аднаскладовы канчатак займеннікаў *наш*, *ваш*, *нáша*, *вáша* (*хáта*), але з правабярэжжа Бярэзіны і з поўначы ўшчыльную набліжаны масіў з наяўнасцю двухскладовых канчаткаў: *нáшая хáта*, *вáшая хáта*. Пры пашыраным агульнабеларускім займеннікуў *гэ́ты* ўжываюцца формы займеннікаў *йі́хні*, *йі́хны*.

Лічэбнік. У р о д н ы м і давальным склонах лічэбнік *два* мае літаратурныя і агульнабеларускія формы *двух*, *двум*, а таксама паўднёвую (Гродна—Мінск—Магілёў) — *двох*, *двом*. Такое пашырэнне апошніх формаў схематычна супадае з тэрыторыяй рассялення дрыгавічоў, і толькі Пасожжа не ахоплена дрыгавічамі.

У творным склоне ва ўсіх жлобінскіх гаворках, як і ў літаратурнай мове, пануе форма *двумá*. Толькі на поўначы, у міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (в. Дварэц Рагачоўскага раёна, в. Плёсы Бабруйскага раёна) і на левабярэжжы Дняпра (в. Забаб'е Буда-Кашалёўскага раёна) ужо больш пашырана, паралельна з формай *двумá* — *двумя́*.

Форма ж творнага склону *трымá* лічэбніка *тры*, якая характэрна для літаратурнай мовы і большасці беларускіх гаворак, не адзначана на Жлобіншчыне, у міжрэччы Бярэзіны і Дняпра. Тут пашыраны паўночна-ўсходні дыялект — *трымя́*, *трымі́* і нават *тремá*.

Дзеяслоў. Форма 3-й асобы адзіночнага ліку дзеяслова I спражэння з націскам на канчатку ў гаворках Жлобіншчыны пануе без- *ць*. На левабярэжжы Дняпра адзначана паралельная форма з *-ць* паўночна-ўсходняга дыялекту: *ідзе́ць*, *бярэ́ць*.

З націскам на аснове без канчатка *-ць* 3-й асобы адзіночнага ліку пашыраны дзеясловы I спражэння тыпу *кáжа*, *мéле*, *грэ́бе*. Адзначаюцца толькі паралельныя адзінкавыя формы з *-ць*: *коліць* (в. Праскурні Жлобінскага раёна), *не можыць* (в. Горваль Рэчыцкага раёна).

У 1-й асобе множнага ліку цяперашняга часу дзеясловаў I спражэння застаецца цвёрды зычны асновы і націскны галосны тыпу *ідóм*, *кладóм*, *нясóм*. Тэрыторыя пашырэння такога вымаўлення (Слаўгарад—Магілёў—Мінск—Баранавічы—Пінск) гістарычна адпавядае тэрыторыі былой Тураўскай зямлі. Гэта асаблівасць паўднёва-заходняга дыялекту і часткова пагранічча на поўдні сярэднебеларускіх гаворак. У ненаціскным канчатку пашыраны канчатак *-ям* (*мéлям*, *знáям*), а таксама *-ем*: *мéлем*, *знаéм*.

У 2-й асобе множнага ліку ў жлобінскіх гаворках існуе націскны галосны паўднёва-заходняга дыялекту тыпу *несяцё*, *ідзяцё*, і толькі ў в. Радуша Жлобінскага раёна, в. Дварэц Рагачоўскага раёна і на левабярэжжы Дняпра — націскны канчатак тыпу *нясіцё*, *ідзіцё*, які характэрны для паўночна-ўсходняга дыялекту.

У 3-й асобе адзіночнага ліку дзеяслова II спражэння з націскам на аснове характэрны агульнабеларускі канчатак *-іць*: *ён нóсіць*, *хóдзіць* і паралельна сярэднебеларуская форма без *-ць*: *нóся*, *хóдзя* (в. Навікі Жлобінскага раёна).

1-я асоба множнага ліку цяперашняга часу дзеясловаў II спражэння мае націскны канчатак *-ім* (*сядзі́м*). 2-я асоба — націскны канчатак *-іцé* (*сядзіцé*), толькі на левабярэжжы Дняпра пашырана паўночна-ўсходняя форма з канчаткам *-ицё* (*сідзіцё*).

У 3-й асобе множнага ліку пануе ненаціскны канчатак *-яць* (*хóдзяць*); толькі за Дняпром, на ўсходзе знаходзіцца масіў з канчаткам *-юць* (*нóсюць*).

Жлобінскія гаворкі знаходзяцца ў масіве, дзе ў парадыгме заднеязычных *г*, *к*, *х* чаргуецца з *ж* толькі ў 2-й асобе множнага ліку тыпу *стрыгу́*, *стрыжэ́ш*, *стрыго́м*, *стрыгу́ць*.

Гэта зона схематычна накладваецца на тэрыторыю былой Тураўскай зямлі.

Пры агульнабеларускай форме 3-й асобы множнага ліку нетэматычнага дзеяслова *е́сці — ядзе́ць* у басейне Бярэзіны фіксуецца пашыраная форма *ядзя́ць*.

На Жлобіншчыне пануе агульнабеларуская форма 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу дзеясловаў I спражэння тыпу *ідзі́ця, нясі́ця*. Тут адзначаецца таксама пашырэнне з-за Дняпра формы інфінітыва тыпу *несць* і паралельнае ўжыванне формы тыпу *не́сці*, а таксама больш пашыранай формы з націскам на канчатку *нясці́*, якая найбольш часта ўжываецца на захадзе, поўначы і поўдні ад Мінска.

Формы дзеясловаў з асновай на *г* і на *к* прыпяцкай канцэнтрацыі тыпу *берагці́, пе́кці* маюць суцэльнае пашырэнне і знаходзяцца на самым пагранічча з вельмі густа пашыранымі формамі на поўначы тыпу *берагчы́, пячы́* і інш.

Дзеепрыметнік. У гаворках Жлобінскага раёна ад дзеясловаў *замкну́ць, замыка́ць* утвараецца дзеепрыметнік *замкну́ты*. У зоне ад Лані, да Дняпра і Бярэзіны побач з формай *замкну́ты* пашырана форма *замы́каны*. Гэта тэрыторыя схематычна супадае з тэрыторыяй Тураўскай зямлі (13 ст.). Зрэдку адзначаецца ўтварэнне *замкнёны*.

Дзеепрыслоўе. Ужываецца агульнабеларуская і літаратурная форма дзеепрыслоўяў цяперашняга часу ад дзеясловаў II спражэння тыпу *хо́дзячы, но́сячы*.

Словаўтварэнне і націск

Характэрны толькі агульнабеларускія формы з націскам на аснове: *ве́рба, ву́гал, ву́галь, зага́дка, засе́к, ро́шчына, ары́хі*. Агульнабеларускае месца націску на канчатку — *жнівó, нагу́* (В. скл. адз. л. ж. р.), *малы́*.

З паўночна-ўсходняга масіву пашыраны формы тыпу *таўсты́, ма́лы, прасты́, вясёла, хало́дна, прыхаджу́*.

Сінтаксічныя асаблівасці

Пашырана агульнабеларуская і літаратурная форма назоўнікаў ніякага роду ў спалучэнні з лічэбнікамі *два, дзве, тры, чаты́ры вакны́*. І толькі на захадзе, за Бярэзінай, на былой тэрыторыі рассялення дрыгавічоў аррача папярэдняга спалучэння вельмі часта ўжываюцца паралельныя спалучэнні тыпу *два* (*дзве, тры, чатыры*) *вакне* і *два* (*дзве, тры, чатыры*) *вакна́*, як *балата́* і інш.

Ёсць таксама формы жаночага роду *дзве* (*тры, чаты́ры*) *хаце*. Такое ж спалучэнне дзеясловаў з формамі вінавальнага склону множнага ліку адушаўлёных назоўнікаў жаночага роду, якія абазначаюць жывёл, пры агульнабеларускіх і літаратурных формах *падаі́ла каро́ў*.

Уся Жлобіншчына ўваходзіць у масіў заходне-паўднёвага пашырэння спалучэння *вучы́ца за до́хтара* і з'яўляецца пагранічнай тэрыторыяй з такім жа густым пашырэннем на паўночным усходзе спалучэння *вучы́ца на до́хтара*.

Тут жа сутыкаецца агульнабеларускае спалучэнне прыназоўніка *па* з вінавальным склонам назоўніка тыпу *па ба́цьку* са спалучэннем з адушаўлёнымі назоўнікамі ў творным склоне, які мае пашырэнне на паўночным усходзе, — *за ба́цькам*.

Такое ж пашырэнне мае спалучэнне *ісці́ за вадо́й* пры агульнабеларускім пашырэнні выразу *ісці́ па ваду́*.

Паводле «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963) на Жлобіншчыне пашыраны наступныя назвы:

Адры́на. Тое, што *пуня*. *Азярóд*. Прыстасаванне ў выглядзе лесвіцы для сушэння снапоў, вікі, гароху і канюшыны (у межах дрыгавіцкага рассялення, фіксуецца да Дняпра). *Ба́ба*. Саха ў студні з жураўлём (в. Навікі Жлобінскага раёна). *Вязёнкі*. Шарсцяныя рукавіцы з адным пальцам. *Гарбу́знік* і *гарбузо́ўнік*. Сцяблы і лісце гарбузоў. *Гурко́ўнік*. Сцяблы і лісце агуркоў. Тое, што *агурэ́чнік*. *Карто́фля*. Слова *бульба* стала ўжывацца ў 18 ст. пры нямецкім пасрэдніцтве (на правабярэжжы Бярэзіны і на ўсёй тэрыторыі рассялення дрыгавічоў). *Квако́ха*. Курыца з куранятамі і *квактуха*. *Лемяша́* (у плузе), *сашні́к* (басейн Прыпяці). *Ца́мра, цэ́мра*. Зруб у студні (вёскі Навікі, Радуша Жлобінскага раёна). *Цёсь-цёсь*. Падзыванне кароў.

У «Лексічным атласе беларускіх народных гаворак у пяці тамах» (1993—98) таксама адлюстроўваецца пагранічча паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх беларускіх гавораk на Жлобіншчыне.

Паўночна-ўсходні дыялект і прымыкаючыя да яго гаворкі Жлобінскага раёна як пагранічныя з паўднёва-заходнім дыялектам. *Табу́н* у значэнні 'табун коней' — *чарда́*; *ра́бая — раба́я*; *скаба́ка, заскабіць — стрэ́мка, застраміць*; *селязе́нь — качар*; *кнігаўка — кніга*; *вуці́нае пе́р'е — качы́нае пе́р'е*; *дуплё — дупле́*; *цяпло́* (касцёр, вогнішча) — *агóнь*; *васілёк* (кветка); *валóшка* —

валóшка; *макрыца* (трава) — *макрэц*; *сурáвéжка — сыраéжка*; *скалíць* (разведваць — пра пчол) — *скаляваць*; *прарасло́* (насенне) — *пахрасцíлася*; *зніцéлі* ці *зніцелі* (зрабіліся тонкімі, квольмі) — *сцяклí* (буракі ў траве); *хрáпка* (сарцавіна качана) — *хрáпа*; *лапáтка*, *лапáтачка* (ручная веялка, якая мае форму шуфліка) — *вéялка*; *зярно́* (адно зерне) — *зéрне*; *катóк* (у возе) — *кóла*; *вóжкі — лéйцы*; *грыбáты* (з тоўстымі губамі); *барадáўкі* (цвёрдая нарасць на скуры чалавека) — *барóдаўкі*; *братавáя* (братава жонка) — *браціха*; *сярэ́дні сын — серадэ́льшы*; *зáсек — засéк*; *шы́бка* (аконнае шкло) — *шы́ба*; *вóсеньскі — асéнні*; *закáп(а)ваць — закóп(а)ваць*.

Паўночна-заходні дыялект і прымыкаючыя да яго гаворкі Жлобінскага раёна як пагранічныя з паўночна-ўсходнім дыялектам. *Стáда авéчак — табýн авéчак*; *грабýць грáды — дзярýць грáды*; *рахмáная кýрыца — ручнáя*, *рукáстая кýрыца*; *пýдкая кýрыца — дзíкая кýрыца*; *гусянí — гусёнак*, *гусянёнак*; *хвóя — сасна́*; *ялóвец — ялéнец*; *крапівá — крапíва*; *канапéлькі — мядýлькі*; *жы́жка — жыгýчка*; *ваўчкí — сабáчкі*; *асакá — сакá*; *краснагалóвік — падасíнавік маслю́к — казёл*; *адлéга — адлíга*; *гýра* (снегу) — *сугрóб*, *хýра*; *хрáпа* (мёрзлая зямля) — *грýда*; *разóра — баразна́*; *вяно́к цыбýлі — пляцёнка*; *сенажáць* (сенакосныя ўгоддзі) — *луг*; *пацярýха — патрýха*; *стаўпéц* (у граблях) — *брусóк*; *ручка* (дзяржанне ў лапаце) — *цаўё*; *цýглі*, *цýглі* (у аброці) — *груздзíлы*, *грýздзіла*; *лупáты — вірлавóкі*; *манá — брахня́*; *шлакатáць*, *слакатáць — шчыкатáць*; *серадóльная — сярэ́дняя*; *глёўкі* (хлеб) — *ацéслівы*; *скварóк сáла — шквáрка*.

Гаворкі Жлобінскага раёна, якія паводле пашырэння ўжывання некаторых слоў адносяцца да сяраднебеларускіх. *Адóнак* (стагавішча), *дабрáк*, *дóбрык*, *дóбры грыб* (баравік), *ікóл* (у свіней), *калóчанка* (трасянка), *капанíчыць* (мачыць бульбу), *сёлетак* (веснавое цяля), *скалля́* (пчолы-разведчыкі) і інш.

І.Я.Яшкін.

Жлобінскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей

Спробы стварыць музей у Жлобіне прадпрымаліся даўно. У 1971 г. ў невялікім драўляным аднапавярховым доме па вул. Першамайская быў адкрыты музей «Народнай славы». Некаторыя матэрыялы, рэчы, фатаграфіі для музея былі сабраны і перададзены Іванам Фёдаравічам Талкачовым, былым дырэктарам Жлобінскай сярэдняй школы № 1, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны.

У верасні 1989 г. для музея было выдзелена новае памяшканне. Адкрыты для наведвальнікаў 15.2.1992 г. Дырэктарам музея стаў Яўген Васілевіч Карцаў. У музеі сабрана больш за 4 тыс. экспанатаў. Мае аддзелы: дарэвалюцыйнага перыяду, перадваенных гадоў, Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага і партызанскага руху, сучаснасці, этнаграфіі. Экспазіцыйная плошча 243 м^2. Вялікую дапамогу музею аказалі старшыня Жлобінскага гарвыканкома Уладзімір Канстанцінавіч Ерафееў, намеснік дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны Генадзь Іванавіч Баркун і загадчыца аддзела фондаў гэтага ж музея Ірына Юр'еўна Варанкова, Мінскі мастацка-вытворчы камбінат мастацкага фонда Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам мастака Валерыя Паўлавіча Храмцэвіча, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН РБ Ігар Мікалаевіч Язэпенка і інш. І.М.Язэпенка, напрыклад, перадаў музею калекцыю крамянёвых вырабаў перыяду неаліту, рэшткаў керамічнага посуду, іншыя матэрыялы, якія расказваюць пра ўмовы жыцця далёкіх прашчураў. У экспазіцыі музея знаходзіцца бівень і косці маманта, знойдзеныя ў 1990 г. пры здабычы фармовачнага пяску за 4 км на поўдзень ад Жлобіна, узоры нафты са свідравін, якія дзейнічаюць каля в. Васілевічы, іншых выкапняў.

У музеі захоўваюцца матэрыялы пра будаўніцтва ўчасткаў чыгункі Мінск—Гомель, Віцебск—Жлобін, развіццё сялянскіх гаспадарак пасля грамадзянскай вайны і першых гадоў калектывізацыі, перапіска аб продажы Кіеўскаму арсеналу двух медных гармат, рукапісны дзённік сакратара падпольнага райкома партыі І.А.Крышнёва і інш. Экспануюцца фатаграфіі і рэчы вядомых людзей Жлобіншчыны і ганаровых грамадзян горада, кнігі пісьменнікаў-землякоў, узоры прадукцыі мясцовых прадпрыемстваў, вырабы самабытных майстроў-умельцаў (пляценне з лазы, вышыўка і карункі ручной работы, разьба па дрэве і інш.).

Р.В.Дзмітрыеў.

У Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Музей народнай славы Чырвонабярэжскага саўгаса-тэхнікума

Захоўвае дакументы, фотаматэрыялы, успаміны ветэранаў 102-й і 73-й стралковых дывізій, якія вызвалялі Чырвонабярэжскі сельсавет і станцыю Чырвоны Бераг ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пошукавую работу ўзначальвае выкладчык І.І.Грунтоў.

М.В.Шуканаў.

Народныя калектывы Жлобіна

Агітбрыгада раённага Дома культуры. Створана ў 1961 г., з 1979 г. мае званне народнай. Кіраўнікі Э.Зракава (з 1961), Т.Каваленка (з 1978). У рэпертуары больш за 40 праграм грамадзянска-патрыятычнай, працоўнай, лірычнай тэматыкі. Сярод лепшых: «Сур'ёзная размова», «Памяць сэрца», «Высокае слова — работа», «Хлеб — гэта жыццё», «Сёння ў нумары», «За культуру абслугоўвання», «За добры настрой», «Справы казачныя» і інш. Выступала на ВДНГ у Маскве (1965; дыплом Міністэрства культуры СССР). Лаўрэат 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975—77). Калектыў гастралірує па рэспубліцы.

Ансамбль песні і танца «Крыніца» Палаца культуры Беларускага металургічнага завода. Створаны ў 1989 г., з 1994 г. мае званне народны. Кіраўнік Н.І.Горбаба. У складзе ансамбля аркестр народных інструментаў, харэаграфічная і вакальная групы. У рэпертуары беларускія, рускія, украінскія народныя песні і танцы. Лаўрэат Міжнароднага маладзёжнага фестывалю «Арт-сесія» (1996), лаўрэат 1-га Рэспубліканскага фестывалю ансамбляў песні і танца (г. Ліда), дыпламант 1-га Міжнароднага фестывалю харэаграфіі «Сожскі карагод», лаўрэат 1-га Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці «Беларусь — мая песня» (1998). *Л.І.Рынейская.*

Аркестр народных інструментаў дзіцячай музычнай школы. Мае званне народнага. Кіраўнік І.У.Борбут. У рэпертуары апрацоўкі беларускіх народных мелодый «Зорка Ве-

нера», творы «Полька», «Кадрыля» Я.Цікоцкага і інш.

Тэатр гарадскога Дома культуры. Створаны ў 1959 г., з 1967 г. мае званне народнага. Кіраўнікі Э.Зракава (з 1959), Т.Кісялёва (з 1977). У рэпертуары п'есы беларускіх і іншых савецкіх драматургаў, рускай і зарубежнай класікі. Сярод пастановак: «Партызаны» К.Крапівы, «Трыбунал» А.Макаёнка, «Браняпоезд 14-69» У.Іванова, «Эшалон» і «Спяшайцеся рабіць дабро» М.Рошчына, «Да трэціх пеўняў» і «Энергічныя людзі» В.Шукшына, «Разлом» Б.Лаўранёва, «Боская камедыя» І.Штока, «З любімымі не расставайцеся» А.Валодзіна, «Леа» Ю.Смуула, «На людным месцы» і «Не было ні граша, ды раптам шастак» А.Астроўскага, «Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай, «Дом Бернарды Альбы» Ф.Гарсія Лоркі. Пры тэатры працуе дзіцячая драматычная студыя.

Хор раённага Дома культуры. Створаны ў 1962 г., з 1979 г. мае званне народнага. Арганізатар і кіраўнік заслужаны работнік культуры Беларусі Г.Станіслававa (з 1962). Хор мяшаны, шматталосы, манера выканання акадэмічная. У рэпертуары апрацоўкі беларускіх («Ой, сівы конь бяжыць», «Ці ўсе горы зелянеюць», «Ой, на гары ды каліна», «У месяцы верасні»), рускіх, латышскіх і іншых народных песень, творы савецкіх, у т.л. беларускіх кампазітараў («Ён нарадзіўся вясной» І.Лучанка, «Сонца свеціць нам» Р.Шчадрына, «Песня аб далёкай Радзіме» М.Тарывердзіева, «Дадзім шар зямны дзецям» Д.Тухманава, «Мір усім, хто працуе» А.Пятрова), музычнай класікі («Вясна нам з табой прыносіць кветкі» К.Сен-Санса і інш.). У складзе хору вакальны квартэт. Калектыў гастраліруе па рэспубліцы.

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ЖЛОБІНШЧЫНЫ

ЖЛОБІН (Жлобін), горад, цэнтр Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Прыстань на правым беразе Дняпра. За 83 км на паўночны захад ад Гомеля. Вузел чыгуначных напрамкаў на Гомель, Магілёў, Мінск, Калінкавічы, на аўтадарогах Гомель—Бабруйск, Рагачоў—Светлагорск.

Жлобін вядомы з 15 ст. ў ВКЛ, належаў Хадкевічам. Некаторыя крыніцы падаюць, што старажытнае паселішча на месцы Жлобіна існавала значна раней. З сярэдзіны 16 ст. знаходзіўся ў складзе Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. У 15—17 ст. існаваў Жлобінскі замак, які размяшчаўся на правым беразе Дняпра і быў умацаваны земляным валам і драўлянымі сценамі-гароднямі з вежамі і брамамі. У 1535 г. Жлобін і замак былі разбураны ў ходзе ваенных дзеянняў вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1534—37 гг., але праз пэўны час аднавіліся. У 1566 г. Жлобін лічыўся адным з буйнейшых пасяленняў Рэчыцкага павета. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 гг. у ліпені 1654 г. замак быў спалены войскамі гетмана ўкраінскага казацкага войска І.Залатарэнкі, аб чым ён 15.7.1654 г. даносіў цару Аляксею Міхайлавічу. 14.10.1654 г. ў данясенні магілёўскага ваяводы М.Ваейкава цару Злобін названы мястэчкам. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай з 1793 г. Жлобін у Расійскай імперыі, мястэчка Лукаўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні.

У Айчынную вайну 1812 г. 20.7.1812 г. Жлобін захоплены напалеонаўскай арміяй. Вызвалены расійскімі казакамі ў 2-й палавіне верасня 1812 г. Паводле архіўных крыніц у 1862 г. ў Жлобіне 110 дамоў, каля 700 жыхароў, з іх: сялян 630, дваран 11, мяпчан 18 чалавек. «Геаграфічна-статыстычны слоўнік Расійскай імперыі» за 1865 г. сведчыць, што ў гэтым годзе ў Жлобіне была праваслаўная царква, яўрэйская сінагога, паштовая станцыя. Штогод з 1 кастрычніка праводзіўся Пакроўскі кірмаш, які доўжыўся 2 тыдні. У 1868 г. ў Жлобіне было адкрыта пачатковае народнае вучылішча, дзе пачаткі пісьменнасці і Закон Божы асвойвалі 39 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак.

У 1873 г. каля Жлобіна пралягла Лібава-Роменская чыгунка. Прыкладна за 1 км на захад ад мястэчка былі пабудаваны казармы для чыгуначнікаў, паравознае дэпо на 9 таварных паравозаў, вагонныя майстэрні, памяшканне для пасажыраў і інш. У лістападзе пачаўся рэгулярны чыгуначны рух на ўчастку Бабруйск—Гомель. Першы цягнік прыбыў на станцыю Жлобін 16 лістапада 1873 г.

А.С.Дэмбавецкі ў «Апісанні прамысловых і населеных пунктаў Магілёўскай губерні за 1880—1881 гг.» пісаў пра Жлобін, што ў мястэчку лічылася 904 душы мужскога і 1064 жаночага полу. Усе пабудовы былі драўляныя, дамоў — 392, крамаў — 67. Мелася праваслаўная царква, пабудаваная ў 1863 г., і 5 яў-

рэйскіх малітоўных школ. Галоўнымі заняткамі жыхароў былі земляробства і саматужныя промыслы. 13.5.1880 г. вялікі пажар знішчыў у Жлобіне 359 дамоў, 65 крамаў з таварамі, хлебазапасны магазін, народнае вучылішча, царкву.

Даведнік «Воласці і важнейшыя сяленні Еўрапейскай Расіі» за 1886 г. сведчыў, што ў Жлобіне было 160 двароў, 752 жыхары, праваслаўная царква, рымска-каталіцкая капліца, 2 яўрэйскія малітоўныя дамы, школа, 2 ветраныя млыны, 53 крамы, чыгуначная станцыя. У чэрвені 1886 г. жлобінскія чыгуначнікі прынялі ўдзел у забастоўцы рабочых механічных майстэрняў Лібава-Роменскай чыгункі.

З 1890 г. ў мястэчку пачаў працаваць дыпламаваны ўрач. Паводле ўсерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г. ў Жлобіне 3228 жыхароў: 1605 мужчын, 1623 жанчыны, у іх ліку 1760 яўрэяў. Было 725 двароў. Дзейнічалі цагельнае, гарбарнае, крупадзёрнае прадпрыемствы. Меліся 2 праваслаўныя царквы, 2 рымска-каталіцкія капліцы, 4 яўрэйскія малітоўныя дамы, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, 2 свечачныя заводы, гандлёвыя рады, 3 ветраныя млыны, гасцініца, тракцір, 3 піцейныя дамы. 24 снежня 1902 г. адкрыты рух на ўчастку Віцебск—Жлобін, а 2 лістапада 1915 г. на ўчастку Жлобін—Шапятоўка чыгункі Пецярбург—Адэса.

У 1905 г. насельніцтва Жлобіна складала 4170 чалавек, у іх ліку 2030 мужчын і 2140 жанчын; дваран 7, купцоў 2, мяшчан 1607 мужчын і 1624 жанчыны, сялян 420 мужчын і 510 жанчын. Па веравызнанні праваслаўных было 937 чалавек (422 мужчыны і 515 жанчын), яўрэяў 3233 чалавекі (1608 мужчын і 1625 жанчын). Агульная плошча мястэчка складала 43 дзесяціны, з якіх 23 дзесяціны надзельнай сялянскай зямлі і 20 дзесяцін землеўладальніцы В.П.Сазановіч. Налічваліся 293 сялянскія дамы і 196 дамоў іншых саслоўяў. Мураваных грамадскіх будынкаў 9, мураваных дамоў 2, драўляных — 509. Мелася праваслаўная царква, народнае вучылішча, мяшчанская ўправа, пажарнае таварыства, булачная, хлебапякарні, крупадзёркі з агульным гадавым абаротам 5240 руб., вінная і піўная крамы. Раз у год праводзіўся кірмаш з абаротам каля 15 000 руб. У час рэвалюцыі 1905—07 гг. летам 1905 г. ў Жлобіне былі арганізаваны баявыя дружыны, якія ўзялі на сябе функцыі па ахове і падтрыманні парадку на чыгуначнай станцыі. У кастрычніку—лістападзе 1905 г. ў Жлобіне ўзніклі прафсаюзныя арганізацыі. 12 кастрычніка 1905 г. чыгуначнікі Жлобіна спынілі рух паяздоў і забаставалі, быў створаны стачачны камітэт. У разгар рэвалюцыйных падзей 1905 г. хваляванні жлобінскіх чыгуначнікаў працягваліся з 8 па 29 снежня.

У 1909 г. Жлобін амаль цалкам знішчаны пажарам, але хутка адбудаваўся. У 1910 г. мястэчка Лукаўскай воласці, 4270 жыхароў, з якіх хрысціян 1937, яўрэяў 2333, дваран і чыноўнікаў 7, асоб духоўнага звання 11, купцоў 3, мяшчан 3739, сялян 510. Пабудоў мураваных 1, драўляных — 613.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў канцы сакавіка 1917 г. ў Жлобіне ўзнік Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў, адноўлена дзейнасць прафсаюзных арганізацый. На ўсіх прадпрыемствах устаноўлены 8-гадзінны працоўны дзень.

6(19) лістапада 1917 г. ў Жлобіне абвешчана аб усталяванні Савецкай улады. У студзені—лютым 1918 г. Жлобін заняты легіянерамі 1-га польскага корпуса І.Р.Доўбар-Мусніцкага. 13.2.1918 г. вызвалены ад польскіх войск. 2.3.1918 г. акупіраваны германскімі войскамі. Вызвалены Чырвонай Арміяй 24.11.1918 г.

З 26.4.1919 г. Жлобін у складзе Гомельскай губерні РСФСР, з 9.5.1923 г. цэнтр Жлобінскай воласці Рагачоўскага павета. З 3.3.1924 г. ў складзе БССР, з 17.7.1924 г. цэнтр Жлобінскага раёна, 9691 жыхар. У 1924—30 г. раён уваходзіў у Бабруйскую акругу. З 3.7.1925 г. горад, 19,3 тыс. жыхароў. З 20.2.1938 г. ў Гомельскай вобласці.

5.6.1931 г. ў Жлобіне выйшаў 1-ы нумар раённай газеты «Шлях сацыялізму» (з 1991 г. носіць назву «Новы дзень»).

У Вялікую Айчынную вайну 3.7.1941 г. Жлобін ахоплены нямецка-фашысцкімі войскамі. 6 ліпеня ў ходзе наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі воіны 117-й стралковай дывізіі выбілі праціўніка з горада, аднак перад пераўзыходзячымі сіламі ворага былі вымушаны адысці на зыходны рубеж па ўсходняму берагу Дняпра. 13 ліпеня байцы 154-й стралковай дывізіі 63-га стралковага корпуса 21-й арміі Заходняга фронту штурмам авалодалі Жлобінам, адкінулі немцаў на захад на 20—30 км і ўтрымлівалі горад да 14.8.1941 г., калі ён зноў быў акупіраваны гітлераўцамі. На тэрыторыі горада і раёна ў чэрвені—жніўні 1941 г. дзейнічалі знішчальныя батальёны і атрады самааховы. У акупіраваным Жлобіне і раёне са снежня 1941 г. да лістапада 1943 г. дзейнічала патрыятычнае падполле, якое аб'ядноўвала больш за 200 падпольшчыкаў у 24 групах. У іх ліку ў Жлобіне дзейнічалі групы ў паравозным дэпо, у друкарні, у раённай бальніцы і інш. Патрыёты распаўсюджва-

лі зводкі Саўінфармбюро, збіралі зброю для партызан, у жніўні 1943 г. ўзарвалі галоўную магістраль водаправода, якая забяспечвала дэпо вадой. У выніку было пашкоджана дэпо, выведзена са строю 50 паравозаў, на некалькі дзён паралізавана дзейнасць чыгуначнага вузла.

Вызваленне тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў войскамі 48-й арміі 1-га Беларускага фронту пачалося 23 лістапада 1943 г. Жлобін вызвалены 26.6.1944 г. ў ходзе наступальнай Бабруйскай аперацыі. Войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Жлобіна, загадам Вярхоўнага галоўнакамандуючага ад 26.6.1944 г. аб'яўлена падзяка, вечарам таго ж дня ў іх гонар у Маскве дадзены салют 12 артылерыйскімі залпамі з 124 гармат. Паводле загада Вярхоўнага галоўнакамандуючага ад 2.7.1944 г. за вызваленне г. Жлобін ганаровае найменне «Жлобінскіх» прысвоена 115-му ўмацаванаму раёну 48-й арміі, 196-й штурмавой авіяцыйнай дывізіі 4-га штурмавога авіяцыйнага корпуса 16-й паветранай арміі і 4-му асобнаму матарызаванаму пантонна-маставому палку.

Акупанты знішчылі ў Жлобіне і раёне больш 3 тыс. чалавек, горад быў амаль цалкам разбураны. Калі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 г. ў Жлобіне пражывала звыш 19 тыс. чалавек, то праз некаторы час пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ім зафіксавана 3763 жыхары. Толькі ў 1959 г. колькасць насельніцтва Жлобіна практычна дасягнула даваеннага ўзроўню і склала 19,2 тыс. чалавек.

За 2 пасляваенныя гады (1946—47) у Жлобіне на чыгуначным вузле былі адноўлены прыёма-адправачныя пуці, майстэрні па рамонту паравозаў і вагонаў. У горадзе пачалі дзейнічаць машынна-трактарная станцыя, радыёвузел, пошта, тэлеграф, некалькі бібліятэк, кінатэатр, торфазавод, хлебакамбінат.

7.3.1963 г. Жлобін аднесены да гарадоў абласнога падпарадкавання. У 1970 г. ў горадзе налічвалася 25,4 тыс. жыхароў. Паступова развівалася прамысловасць Жлобіна. У 1961 г. на базе цэха інкрустацыі саломкай Гомельскай фабрыкі мастацкіх вырабаў створана Жлобінская фабрыка мастацкай інкрустацыі. У 1977 г. ў Жлобіне было адкрыта аграрнае прафесійнае вучылішча. У канцы 1978 г. прынята ў эксплуатацыю фабрыка штучнага футра і адкрыта вучылішча тэкстыльшчыкаў. 19.3.1982 г. падпісаны кантракт на будаўніцтва ў Жлобіне Беларускага металургічнага завода, 15.10.1984 г. адбылася першая плаўка і пуск электраплавільнага цэха, у красавіку—маі 1985 г. пачалося будаўніцтва комплексу металакорду, у маі 1990 г. прадукцыя завода выйшла на сусветны рынак (металакорд і бартавы дрот). Для падрыхтоўкі кадраў для Беларускага металургічнага завода ў верасні 1996 г. ў Жлобіне быў адкрыты металургічны тэхнікум, а з верасня 1998 г. пачаў працу філіял Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

У 1989 г. заснаваны, а ў 1992 г. адкрыты Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музей, які налічвае зараз больш 6 тыс. экспанатаў асноўнага фонду. У 1995 г. ў Жлобіне 68 тыс. жыхароў, у 1997 г. — 69,8 тыс., у 2000 г. — 71,7 тыс. жыхароў. У горадзе дзейнічаюць Беларускі металургічны, рамонтна-механічны заводы, мясакамбінат, хлебазавод, малочны, камбікормавы, плодаагароднінны заводы, ільнозавод, мэбле-

Вуліца Я.С.Факанава ў Жлобіне.

Вуліца М.У.Барташова ў Жлобіне.

вая, 2 швейныя, мастацкай інкрустацыі фабрыкі. 11 сярэдніх, 3 пачатковыя, музычная школы, школа мастацтваў, школа-інтэрнат, 2 прафтэхвучылішчы, тэхнікум, філіял Гомельскага тэхнічнага універсітэта, 2 бальніцы, 2 паліклінікі, Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музей, Палац і Дом культуры, кінатэатр. Выдаецца газета «Новы дзень». Дзейнічае праваслаўны храм, ёсць каталіцкая капліца. Помнік воінам 63-га стралковага корпуса 21-й арміі, якія ў ліпені—жніўні 1941 г. часова вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; за 1 км ад Жлобіна магіла ахвяр фашызму, вайсковыя могілкі, дзе пахаваны савецкія воіны і партызаны, загінуўшыя пры абароне і вызваленні горада і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

АБОЛЬЦЫ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Уперад». Назва ад літоўскага слова абеліс — яблыня. У 1909 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 31 двор, 135 жыхароў. На 2000 г. 27 двароў, 48 жыхароў.

АДРАДЖЭННЕ (да 5.8.1968 Эрштэрмай, раней Остэрманск), вёска ў Папаратнянскім сельсавеце, у калгасе «Іскра». На 2000 г. 98 двароў, 196 жыхароў. Стрэшынскі вытворчы ўчастак Чырвонабярэжскага крухмала-патачнага завода, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Брацкая магіла 333 савецкіх воінаў (вул. Заводская), якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1952 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У цэнтры вёскі ў 1967 пастаўлены помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

АДРУБЫ, вёска ў Кабанаўскім сельсавеце, у калгасе «Камуніст». У 1897 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 49 двароў, 326 жыхароў; прыстань, крама. На 2000 г. 43 двары, 66 жыхароў. Магазін. Брацкая магіла 15 савецкіх воінаў (на грамадзянскіх могілках), якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены помнік.

АКЦЯБР (да 1936 г. Папкі), вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Акцябр». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 97 двароў, 528 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі. У 1907 г. 109 двароў, 860 жыхароў. У 1910 г. 103 двары, 897 жыхароў. На 2000 г. 272 двары, 640 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая агульнаадукацыйная школа, сельскі Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны. Брацкая магіла 169 савецкіх воінаў і партызан (у цэнтры вёскі), якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

АЛЕКСАНДРОЎ, вёска ў Салонскім сельсавеце, у саўгасе-камбінаце «Нівы». На 2000 г. 23 двары, 31 жыхар. Магазін.

АЛЯКСАНДРАЎКА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. На 2000 г. 15 двароў, 23 жыхары.

АЛЯКСАНДРАЎКА, пасёлак у Майскім сельсавеце, у калгасе «Ленінец». На 2000 г. 4 двары, 5 жыхароў. За 0,8 км на З ад вёскі, каля шашы Жлобін—Гомель абеліск на месцы гібелі лётчыка М.Р.Марушчанкі, які загінуў у канцы 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. За 0,5 км на ПдУ ад вёскі помнік 266-му партызанскаму атраду. У 1983 г. замест абеліска (1972 г.) на пастаменце зроблена збудаванне ў выглядзе разгорнутага сцяга, на якім зорка і надпіс: «Партызанскаму атраду імя М.В.Фрунзе».

АНТОНАЎКА, вёска ў Кароткавіцкім сельсавеце, у калгасе «Радзіма». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 45 двароў, 293 жыхары; збожжазапасны магазін, кузня, 4 ветракі. У 1910 г. 59 двароў, 425 жыхароў. На 2000 г. 21 двор, 29 жыхароў. Брацкая магіла 221 савецкага воіна і партызан (на паўночнай ускраіне вёскі), якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. За 1 км на Пн ад вёскі ў 1975 г. пастаўлены помнік партызанскаму атраду «Смерць фашызму».

АНТОНАЎКА, вёска ў Майскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Ленінец». На 2000 г. 177 двароў, 464 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа-сад, клуб, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазін. Брацкая магіла 9 савецкіх воінаў, якія загінулі ў лютым 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

АСІНАВІЦА, пасёлак у Старарудняскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 2000 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

АСІНАЎКА, вёска ў Майскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі». На 2000 г. 15 двароў, 25 жыхароў.

АСОЕ, пасёлак у Майскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». Назва, магчыма, ад слова асаў — бераг ракі. У 2000 г. 7 двароў, 8 жыхароў.

БАБОЎКА, вёска ў Майскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Бабоўскі». У 1897 г. вёска Старарудняскай воласці, 60 двароў, 323 жыхары; збожжазапасны магазін, 2 ветракі, піцейны дом. У 1907 г. 68 двароў, 362 жыхары, школа пісьменнасці (34 вучні). На 2000 г. 307 двароў, 933 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны. Брацкая магіла 82 савецкіх воінаў, байцоў Жлобінскага зніштчальнага батальёна і партызан (на цэнтральнай вуліцы), якія загінулі і памерлі ад ран пры абароне раёна ў жніўні 1941 г., вызваленні яго ў снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

БАРАВУХА, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

БАРАНАЎКА, вёска ў Старарудняскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1897 г. аколіца Старарудняскай воласці, 19 двароў, 152 жыхары. У 1910 г. 6 двароў, 40 жыхароў. На 2000 г. 8 двароў, 11 жыхароў.

БАРШЧОЎКА, вёска ў Майскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі». На 2000 г. 4 двары, 6 жыхароў.

БАРШЧОЎКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. На 2000 г. 62 двары, 125 жыхароў. Магазін. За 0,5 км на ПдЗ ад вёскі брацкая магіла. Пахаваны лётчык і 4 мірныя жыхары. У 1983 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БАРЭЦ, пасёлак у Папаратнянскім сельсавеце, у калгасе «Шлях Леніна». На 2000 г. 4 двары, 10 жыхароў.

БЕЛІЦА, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». Назва, магчыма, ад слова беліца — невялікае мохавае балота верхавога тыпу. На 2000 г. 163 двары, 383 жыхары. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, пачатковая школа, клуб, бібліятэка, 2 магазіны.

БРАТКІ, вёска. Не існуе. Знаходзілася за 2,5 км на Пд ад в. Кароткавічы. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 27 яе жыхароў і спалілі вёску (10 двароў). Пасля вайны вёска не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». У 1977 г. на месцы спаленай вёскі пастаўлена стэла.

БРУСАВА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. На 2000 г. 12 двароў, 23 жыхары.

БЯЛЬЧО, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. Назва, магчыма, ад слова бель — верхавое балота з белымі імхамі, крывалессем. У 1897 г. хутар Сцепскай воласці, 5 двароў, 23 жыхары. На 2000 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ВАСІЛЕВІЧЫ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». У 1897 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 35 двароў, 233 жыхары; піцейны дом. На 2000 г. 54 двары, 79 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка. Брацкая магіла 245 савецкіх воінаў (на грамадзянскіх могілках), якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзе-

ні—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ВЕРНЫ, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 16 двароў, 26 жыхароў. На ўсходняй ускраіне пасёлка магіла ахвяр фашызму. Пахавана 56 жыхароў, якія загінулі 27.9.1943 г. ад рук нямецка-фашысцкіх карнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЕРХНЯЯ АЛБА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». У 1886 г. вёска Стрэшынскай воласці, 88 двароў, 522 жыхары; капліца, вятрак. У 1897 г. 137 двароў, 1078 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 4 ветракі. У 1910 г. 167 двароў, 1334 жыхары. На 2000 г. 179 двароў, 434 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін. У цэнтры вёскі мемарыяльны комплекс. У брацкай магіле пахаваны 389 савецкіх воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У 1980 г. збудавана мемарыяльная сцяна, на якую занесены прозвішчы жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЯЗОК, пасёлак у Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя Казлова. На 2000 г. 6 двароў, 6 жыхароў.

ВЯЛІКІ ЛЕС, вёска ў Кабанаўскім сельсавеце, у калгасе «Шлях Леніна». На 2000 г. 73 двары, 141 жыхар. Аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, магазін. Брацкая магіла 53 савецкіх воінаў і партызан (у цэнтры вёскі), якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1987 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЯЛІКІЯ РАГІ, вёска ў Салонскім сельсавеце. У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 41 двор, 304 жыхары; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, цагельны завод. На 2000 г. 269 двароў, 806 жыхароў. Пачатковая школа, магазін.

ВЯРБІЧАЎ, пасёлак у Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». У 1897 г. аколіца Лукаўскай воласці, 26 двароў, 155 жыхароў. На 2000 г. 25 двароў, 52 жыхары.

ВЯСЁЛЫ, пасёлак у Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя Казлова. На 2000 г. 9 двароў, 13 жыхароў.



Буравая вышка на нафтавым месцанараджэнні каля в. Васілевічы.

ГАРАДОК, вёска ў Верхне-Албянскім сельсавеце, у калгасе «Праўда». На 2000 г. 12 двароў, 18 жыхароў.

ГАРБАЧОЎКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе-тэхнікуме. На 2000 г. 43 двары, 73 жыхары. Магазін.

ГЕЛІН, вёска ў Папаратнянскім сельсавеце, у калгасе «Іскра». На 2000 г. 40 двароў, 84 жыхары. Магазін. За 0,6 км на ПдУ ад вёскі брацкая магіла 482 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. На паўночнай ускраіне вёскі помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. пастаўлена скульптура жанчыны.

ГЛУШЫЦА, пасёлак у Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Звязда». На 2000 г. 1 двор, 2 жыхары.

ГЛУШЫЦА, пасёлак у Старарудняскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. На 2000 г. 3 двары, 6 жыхароў.

ГОРКІ, пасёлак у Акцябрскім сельсавеце, у калгасе «Акцябр». На 2000 г. 16 двароў, 22 жыхары.

ГРАБСК (да 1932 г. Грабскія хутары), вёска ў Акцябрскім сельсавеце, у калгасе «Акцябр». На 2000 г. 62 двары, 139 жыхароў. Магазін.

ГРАЧУХІ, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Рэкцянскі». На 2000 г. 7 двароў, 9 жыхароў. На будынку школы ў 1976 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка ўраджэнцу вёскі, Герою Савецкага Саюза П.А.Странакову, які вызначыўся ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

ГРУШАЧКА, пасёлак у Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». На 2000 г. 13 двароў, 19 жыхароў.

ГРУШКА, вёска. Не існуе. Знаходзілася за 2 км на Пд ад в. Кароткавічы. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты загубілі 20 яе жыхароў і спалілі вёску (11 двароў). Вёска не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ДАБРАВОЛЬШЧА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. У 1886 г. сяло Сцепскай воласці, 20 двароў, 196 жыхароў. У 1897 г. 47 двароў, 329 жыхароў; царкоўна-прыходская школа, збожжазапасны магазін. На 2000 г. 64 двары, 114 жыхароў. Магазін.

ДАБРАГОШЧА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Мормаль». У 1897 г. вёска Якіма-Слабадской воласці, 38 двароў, 294 жыхары, збожжазапасны магазін. У 1909 г. 31 двор, 246 жыхароў. На 2000 г. 229 двароў, 605 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны. Брацкая магіла 1117 савецкіх воінаў і 5 партызан (на вуліцы Школьная), якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў час партызанскага руху. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці жыхароў вёсак Васілевічы, Дабрагошча, Сельнае, Старына, Яшчыцы, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. пастаўлена стэла з барэльефнай выявай воіна, на стэле — прозвішчы загінуўшых.

ДАЛІНА, вёска ў Майскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі». На 2000 г. 10 двароў, 13 жыхароў.

ДАРАГІНЬ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Уперад». На 2000 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Леніна. У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 54 двары, 372 жыхары. У 1909 г. 57 двароў, 437 жыхароў. На 2000 г. 182 двары, 423 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа-сад, бібліятэка, магазін, лясніцтва, цэх па перапрацоўцы драўніны. У цэнтры вёскі брацкая магіла 41 савецкага воіна і партызан, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў час партызанскага руху. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ДЗЯНІСКАВІЧЫ, вёска ў Майскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». У 1886 г. сяло Гарадзецкай воласці, 60 двароў, 487 жыхароў; царква, школа, вадзяны млын. У 1897 г. 121 двор, 718 жыхароў, царква, народнае вучылішча, 2 збожжазапасныя магазіны, крама, 2 ветракі, вадзяны млын. У 1907 г. 138 двароў, 934 жыхары. У 1910 г. 126 двароў, 889 жыхароў. На 2000 г. 64 двары, 103 жыхары. Клуб, магазін.

ДУБОВАЯ ГРАДА, пасёлак у Папаратнянскім сельсавеце, у калгасе «Іскра». У 2000 г. 7 двароў, 8 жыхароў.

ДУБРОВА, вёска ў Кароткавіцкім сельсавеце, у калгасе «Радзіма». У 2000 г. 12 двароў, 13 жыхароў.

ДУБРОВА, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Рэкцянскі». На 2000 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

ЖЫРХАЎКА, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Бярэзіна». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 84 двары, 659 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, піцейны дом. У 1907 г. 102 двары, 800 жыхароў, у 1910 г. 104 двары, 803 жыхары. На 2000 г. 49 двароў, 89 жыхароў. Магазін.

ЗАБАЛОЦЦЕ, вёска ў Кароткавіцкім сельсавеце, у калгасе «Радзіма». У 1897 г. сяло Сцепскай воласці, 181 двор, 1289 жыхароў; царква, народнае вучылішча, збожжазапасны магазін, 4 ветракі. На 2000 г. 21 двор, 28 жыхароў.

ЗАБРОДДЗЕ, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Мормаль». На 2000 г. 56 двароў, 94 жыхары. Магазін.

ЗАВАД, вёска ў Старарудняскім сельсавеце, у калгасе імя Кірава. У 1897 г. 30 двароў, 188 жыхароў, вадзяны млын, сукнавальня. На 2000 г. 30 двароў, 59 жыхароў. Магазін. На грамадзянскіх могілках магіла партызана А.Ф.Іванова, які загінуў у кастрычніку 1942 г. За 1 км на ПдУ ад вёскі, каля дарогі Жлобін—Гомель у чэрвені 1979 г. ўстаноўлены помнік Жлобінскаму знішчальнаму батальёну.

ЗАЛЕССЕ, вёска. Не існуе. Знаходзілася за 1 км на У ад в. Дубрава. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты загубілі

23 яе жыхары і спалілі вёску (17 двароў). Пасля вайны вёска не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ЗАМЕН-РЫННЯ, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. У аснове назвы, магчыма, слова рэнь — водмель, нізкі бераг, востраў на балоце; палоска дрыгвы, заросшая травой. У 1897 г. аколіца Сцепскай воласці, 61 двор, 365 жыхароў, капліца. У 1909 г. 21 двор, 211 жыхароў. На 2000 г. 16 двароў, 18 жыхароў.

ЗАМОСЦЕ, вёска. Не існуе. Знаходзілася за 1 км на З ад в. Плесавічы. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты загубілі 4 яе жыхароў і спалілі вёску (10 двароў). Пасля вайны вёска не адрадзілася.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Прагрэс». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 46 двароў, 269 жыхароў. На 2000 г. 50 двароў, 100 жыхароў. Магазін.

ЗАТОН, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, у калгасе «50 год БССР». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 93 двары, 771 жыхар; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 3 ветракі. У 1907 г. 112 двароў, 945 жыхароў. У 1910 г. 117 двароў, 957 жыхароў. На 2000 г. 76 двароў, 138 жыхароў. Магазін.

ЗЛОМНАЕ, вёска ў Стрэшынскім пасялковым Савеце, у калгасе «1-е Мая». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 74 двары, 500 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, 2 ветракі. У 1907 г. 65 двароў, 660 жыхароў. На 2000 г. 62 двары, 119 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. У цэнтры вёскі брацкая магіла 59 савецкіх воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, і 12 жыхароў в. Таўстыкі — ахвяр фашызму, загубленых карнікамі ў верасні 1941 г. У 1984 г. замест абеліска (1968 г.) на магіле пастаўлены помнік-пліта.

ЗМЯЁЎКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 44 двары, 318 жыхароў, збожжазапасны магазін. На 2000 г. 30 двароў, 51 жыхар.

ЗЯЛЁНАЯ ДАЛІНА, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». На 2000 г. 29 двароў, 46 жыхароў. Чыгуначная станцыя.

ЗЯЛЁНЫ КРАЖ, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Рэкцянскі». На 2000 г. 30 двароў, 52 жыхары. Магазін.

ЗЯЛЁНЫ РОГ, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі».

ІСТОПКІ, вёска ў Салонскім сельсавеце, у саўгасе-камбінаце «Нівы». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 57 двароў, 427 жыхароў; школа пісьменнасці, 2 ветракі. У 1907 г. 71 двор, 571 жыхар. На 2000 г. 103 двары, 165 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт. Магазін. Чыгуначны прыпынак.

Студня з жураўлём у в. Завад.

КАБАНАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Камуніст». На 2000 г. 141 двор, 404 жыхары. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа-сад, Дом культуры, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт, магазін, Прыбярэзінскае лясніцтва. На ПдЗ ускраіне вёскі брацкая магіла 59 савецкіх воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. На грамадзянскіх могілках брацкая магіла 101 савецкага воіна і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у лістападзе—снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў час партызанскага руху. У 1987 замест абеліска (1949 г.) на магіле пастаўлены помнік-пліта.

КАБАНАЎКА, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Рэкцянскі». На 2000 г. 112 двароў, 219 жыхароў. Магазін.

КАЗЁЛ, вёска ў Салонскім сельсавеце, у саўгасе-камбінаце «Нівы».

КАЗІМІРАВА, вёска ў Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя В.І.Казлова. У 1886 г. мястэчка Сцепскай воласці; царква, вятрак, 12 крам, кірмаш 15 жніўня. У 1897 г. 58 двароў, 423 жыхары, царква, яўрэйскі малітоўны дом, 7 крам, кірмаш. На 2000 г. 67 двароў, 112 жыхароў. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Каля могілак брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі і супрацоўнікаў ваенкамата. Пахаваны 39 воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў ліпені—жніўні 1941 г. пры абароне і ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1990 г. замест стэлы (1956 г.) устаноўлены помнік-пліта.

КАЗІМІРАЎСКАЯ СЛАБОДКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе «Чырвонабярэжскі». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 34 двары, 243 жыхары, збожжазапасны магазін. На 2000 г. 55 двароў, 83 жыхары.

КАЛІНАЎКА, вёска ў Навамаркавіцкім сельсавеце, у калгасе «Звязда». У 1897 г. пасёлак Якіма-Слабадской воласці, 23 двары, 138 жыхароў. У 1909 г. 41 двор, 135 жыхароў.

КАЛЫБАЎКА, вёска ў Старараўднянскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі». У 1897 г. вёска Старараўднянскай воласці, 51 двор, 248 жыхароў; збожжазапасны магазін, піцейны дом. У 1907 г. 58 двароў, 442 жыхары, школа пісьменнасці (41 вучань). На 2000 г. 52 двары, 108 жыхароў. Магазін, чыгуначны раз'езд.

КАРОТКАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». У 1886 г. вёска Сцепскай воласці, 58 двароў, 510 жыхароў. У 1897 г. 159 двароў, 1031 жыхар, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, заезны двор. У 1909 г. 121 двор, 1083 жыхары; маёнтак, 1 двор, 12 жыхароў. На 2000 г. 306 двароў, 739 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, урачэбны ўчастак, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, 2 магазіны, лясніцтва. У цэнтры вёскі брацкая магіла 812 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1953 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. Помнік спаленым вёскам. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёскі Браткі, Грушка, Залессе, Замосце, Краснаўка. Пасля вайны вёскі не адрадзіліся. Памяць аб іх увасоблена ў мемарыяле, які збудаваны ў 1976 г.

Брацкая магіла савецкіх воінаў у в. Казіміра.

КАСАКОЎКА, вёска ў Папаратнянскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Шлях Леніна». У 1897 г. вёска Стрэшынскай воласці, 75 двароў, 577 жыхароў; школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін. У 1910 г. 103 двары, 754 жыхары. На 2000 г. 149 двароў, 410 жыхароў. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, 2 магазіны. Каля канторы калгаса помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Пастаўлены ў 1980 г.

КІРАВА (да 20.4.1939 г. С в я т о е), вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Свярдлова. У 1886 г. сяло Гарадзецкай воласці, 93 двары, 660 жыхароў, царква, школа, вятрак і вадзяны млын. У 1897 г. 175 двароў, 1254 жыхары; царква, народнае вучылішча, 2 збожжазапасныя магазіны, 2 кузні, 4 ветракі, карчма. У 1907 г. 215 двароў, 1509 жыхароў. У 1910 г. 290 двароў, 1577 жыхароў. На 2000 г. 401 двор, 1067 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая. У цэнтры вёскі мемарыяльны комплекс. У брацкай магіле пахавана 114 савецкіх воінаў і 2 партызаны, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзе-

Помнік спаленым вёскам у в. Кароткавічы.

Царква ў в. Кірава. Знішчана ў 1963.

ні—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата. Побач з магілай у 1976 г. збудавана мемарыяльная сцяна, на якую занесены прозвішчы жыхароў вёсак Кірава, Піцераўка, Селівонаўка, Шапарня, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Помнік Я.М.Свярдлову (каля будынка Кіраўскага сельсавета і праўлення калгаса, які носіць яго імя). Бюст устаноўлены ў 1976 г.

КІЦІН, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце. Назва, магчыма, ад літоўскага слова кіцеці — змяняецца. У 1886 г. сяло Сцепскай воласці, 29 двароў, 330 жыхароў, царква. У 1897 г. 89 двароў, 672 жыхары, капліца, збожжазапасны магазін. У 2000 г. 216 двароў, 546 жыхароў. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, клуб, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і тавараў паўсядзённага попыту, сталовая. У цэнтры вёскі ў 1985 г. ўстаноўлены помнік (абеліск і мемарыяльная сцяна) на ўшанаванне жыхароў вёсак Кіцін і Людгардаўка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

КЛІМАЎКА, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе «Чырвонабярэжскі». На 2000 г. 2 двары, 4 жыхары.

КОЛАС, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 4 двары, 4 жыхары.

КРАСНАЎКА, вёска. Не існуе. Знаходзілася за 2 км на ПдУ ад в. Кароткавічы. У кастрычніку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 45 яе жыхароў і спалілі вёску (10 двароў). Пасля вайны вёска не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

КРУГАВЕЦ, вёска ў Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». У 1897 г. вёска Стараруднянскай воласці, 64 двары, 482 жыхары, 3 ветракі. У 1907 г. 55 двароў, 625 жыхароў. На 2000 г. 127 двароў, 264 жыхары. Магазін.

КРУГІ, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. На 2000 г. 31 двор, 64 жыхары.

КУРГАН, вёска ў Дабрагошчанскім сельсавеце, у саўгасе «Уперад». На 2000 г. 30 двароў, 52 жыхары.

КУРГАННЕ, вёска ў Чырвонабярэжскім сельсавеце, у саўгасе «Чырвонабярэжскі». На 2000 г. 19 двароў, 29 жыхароў.

ЛЕБЯДЗЁЎКА, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». У 1897 г. вёска Лукаў-

скай воласці, 66 двароў, 481 жыхар, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, піцейны дом. У 1907 г. 69 двароў, 472 жыхары. На 2000 г. 346 двароў, 940 жыхароў. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, пачатковая школа, 2 магазіны.

ЛОБСК, пасёлак у Чырвонабярэжскім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. На 2000 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ЛУГАВАЯ ВІРНЯ, вёска ў Майскім сельсавеце, у саўгасе «Бабоўскі». У 1886 г. сяло Старараўняскай воласці, 35 двароў, 149 жыхароў, царква. У 1897 г. 55 двароў, 319 жыхароў; царква, школа пісьменнасці, збожжазапасны магазін, вадзяны млын, піцейны дом. У 1907 г. 62 двары, 384 жыхары, царкоўна-прыходская школа (55 вучняў). На 2000 г. 115 двароў, 269 жыхароў. Фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, лясніцтва. За 0,6 км на У ад вёскі, каля дарогі Жлобін—Гомель помнік падпольшчыкам і партызанам Жлобіншчыны. Устаноўлены ў 1973 г., уяўляе абеліск з барэльефнай выявай партызана з аўтаматам, надпісам «Партызанам і падпольшчыкам Жлобіншчыны» (аўтар і выканаўца самадзейны мастак-скульптар М.А.Івінскі).

ЛУКІ, вёска ў Лукскім сельсавеце, у саўгасе «Лукскі». У 1886 г. сяло, 103 двары, 719 жыхароў, валасное праўленне, царква. У 1897 г. 187 двароў, 1447 жыхароў, народнае вучылішча, збожжазапасны магазін, 4 ветракі, піцейны дом. На 2000 г. 154 двары, 287 жыхароў, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, магазін. У цэнтры вёскі брацкая магіла 218 савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені—жніўні 1941 г. і чэрвені 1944 г. пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ЛУКСКІ, пасёлак, цэнтр сельсавета. На 2000 г. 633 гаспадаркі, 1768 жыхароў. Торфабрыкетны завод, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сярэдняя школа-сад, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая.

ЛЮБОЎ, пасёлак у Пірэвіцкім сельсавеце, у саўгасе «Пірэвіцкі». На 2000 г. 42 двары, 62 жыхары.

ЛЮДГАРДАЎКА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная Зорка». У 1897 г. вёска Сцепскай воласці, 24 двары, 177 жыхароў. На 2000 г. 24 двары, 47 жыхароў.

ЛЯДЫ, вёска ў Кабанаўскім сельсавеце, у калгасе «Камуніст». У 1897 г. вёска Якімаслабадской воласці, 37 двароў, 245 жыхароў, збожжазапасны магазін. На 2000 г. 72 двары, 109 жыхароў. Магазін. На грамадзянскіх могілках 3 брацкія магілы воінаў Чырвонай Арміі, у якіх пахаваны адпаведна 36, 35 і 28 воінаў, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Замест абеліскаў (1949 г.) на магілах у 1987 г. пастаўлены помнікі-пліты. На ПдЗ ускраіне вёскі ветраны млын, пабудаваны ў канцы 19 ст. з дрэва.

ЛЯСАНЬ, вёска ў Салонскім сельсавеце, у саўгасе-камбінаце «Нівы». У 1897 г. хутар Стрэшынскай воласці, 12 двароў, 51 жыхар. На 2000 г. 14 двароў, 27 жыхароў. Магазін.

МАЙСКАЕ (да 1924 г. Шапілава), вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Рассвет». На 2000 г. 223 двары, 571 жыхар. Аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аптэка, участковая бальніца, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, магазіны прамысловых і харчовых тавараў. Каля Дома культуры воінскія могілкі. Пахаваны 1179 савецкіх воінаў і партызаны, якія загінулі і памерлі ад ран у снежні 1943 г., студзені—чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і ў час партызанскага руху. У 1955 г. на могілках пастаўлены помнік — скульптура воіна, у 1991 г. дадаткова — стэла. На заходняй ускраіне вёскі ў 1967 г. пастаўлены помнік на ўшанаванне жыхароў вёсак Аляксандраўка, Асое, Дзяніскавічы, Майскае, Чорная Вірня, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і першага старшыні калгаса «Рассвет» І.І.Прыцава, які забіты ў 1924 г.

МАЛЕВІЦКАЯ РУДНЯ, вёска ў Малевіцкім сельсавеце, у саўгасе імя В.І.Казлова. На 2000 г. 91 двор, 137 жыхароў. Магазін.

МАЛЕВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса імя В.І.Казлова. У 1886 г. сяло Лукаўскай воласці, 52 двары, 300 жыхароў; царква, школа, вятрак. У 1897 г. 93 двары, 618 жыхароў, царква, народнае вучылішча, збожжазапасны магазін, піцейны дом. У 1907 г. 98 двароў, 654 жыхары. На 2000 г. 297 двароў, 698 жыхароў. Аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, кінаўстаноўка, магазіны прамысловых і харчовых тавараў, сталовая, чыгуначны раз'езд. У цэнтры вёскі брацкая магіла 22 савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені—жніўні 1941 г. і чэрвені 1944 г. пры абароне і вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура салдата.

МАЛІНАЎКА, вёска ў Шчадрынскім сельсавеце, у калгасе імя Варашылава. У 1897 г. засценак Сцепскай воласці, 20 двароў,



Магіла невядомага салдата ў в. Малінаўка.

140 жыхароў. У 1909 г. 29 двароў, 159 жыхароў. На 2000 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

